Пераклад Кодэкса адобраны экспертным саветам па пытаннях перакладу заканадаўчых актаў на беларускую мову (пратакол ад 11.04.2023 № 1)

# КОДЭКС РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ АБ АДУКАЦЫІ

13 студзеня 2011 г. № 243-З

*Прыняты Палатай прадстаўнікоў 2 снежня 2010 года*
*Адобраны Саветам Рэспублікі 22 снежня 2010 года*

Змяненні і дапаўненні:

Закон Рэспублікі Беларусь ад 13 снежня 2011 г. № 325-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2011 г., № 140, 2/1877);

Закон Рэспублікі Беларусь ад 26 мая 2012 г. № 376-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2012 г., № 62, 2/1928);

Закон Рэспублікі Беларусь ад 4 студзеня 2014 г. № 126-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 17.01.2014, 2/2124);

Закон Рэспублікі Беларусь ад 18 ліпеня 2016 г. № 404-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 21.07.2016, 2/2402);

Закон Рэспублікі Беларусь ад 18 ліпеня 2019 г. № 219-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 27.07.2019, 2/2658) - **уступае ў сілу 28 студзеня 2020 г.**;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 23 ліпеня 2019 г. № 231-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 30.07.2019, 2/2669);

Закон Рэспублікі Беларусь ад 14 студзеня 2022 г. № 154-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 31.01.2022, 2/2874) - унесены змяненні і дапаўненні, якія ўступілі ў сілу 1 лютага 2022 г., за выключэннем змяненняў і дапаўненняў, якія ўступяць у сілу 1 сакавіка 2022 г. і 1 верасня 2022 г.;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 14 студзеня 2022 г. № 154-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 31.01.2022, 2/2874) - унесены змяненні і дапаўненні, якія ўступілі ў сілу 1 лютага 2022 г. і 1 сакавіка 2022 г., за выключэннем змяненняў і дапаўненняў, якія ўступяць у сілу 1 верасня 2022 г.;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 14 студзеня 2022 г. № 154-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 31.01.2022, 2/2874) – **новая рэдакцыя** - унесены змяненні і дапаўненні, якія ўступілі ў сілу 1 лютага 2022 г., 1 сакавіка 2022 г. і 1 верасня 2022 г.

Закон Рэспублікі Беларусь ад 6 марта 2023 г. № 257-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 21.03.2023, 2/2977)

## ЗМЕСТ

АГУЛЬНАЯ ЧАСТКА
РАЗДЗЕЛ I. АСНОВЫ ПРАВАВОГА РЭГУЛЯВАННЯ Ў СФЕРЫ АДУКАЦЫІ
ГЛАВА 1. АСНОЎНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

Артыкул 1. Асноўныя тэрміны, якія прымяняюцца ў гэтым Кодэксе, і іх азначэнні
Артыкул 2. Асновы дзяржаўнай палітыкі ў сферы адукацыі
Артыкул 3. Дзяржаўныя гарантыі правоў у сферы адукацыі
Артыкул 4. Адносіны, якія рэгулююцца гэтым Кодэксам
Артыкул 5. Суб’екты адукацыйных адносін, суб’екты грамадскіх адносін, звязаных з адукацыйнымі адносінамі
ГЛАВА 2. ПРАВАВОЕ РЭГУЛЯВАННЕ АДНОСІН У СФЕРЫ АДУКАЦЫІ
Артыкул 6. Прававое рэгуляванне адносін у сферы адукацыі
Артыкул 7. Мэты і прынцыпы заканадаўства аб адукацыі
Артыкул 8. Дзеянне заканадаўства аб адукацыі ў часе, у прасторы і па коле асоб
Артыкул 9. Прымяненне заканадаўства аб адукацыі па аналогіі
ГЛАВА 3. СІСТЭМА АДУКАЦЫІ
Артыкул 10. Сістэма адукацыі
Артыкул 11. Асноўная адукацыя
Артыкул 12. Дадатковая адукацыя
Артыкул 13. Спецыяльная адукацыя
Артыкул 14. Атрыманне асноўнай і дадатковай адукацыі навучэнцамі з асаблівымі індывідуальнымі адукацыйнымі патрэбамі
Артыкул 15. Адукацыйныя праграмы
Артыкул 16. Формы атрымання адукацыі, прымяненне дыстанцыйных адукацыйных тэхналогій
Артыкул 17. Выхаванне ў сістэме адукацыі
РАЗДЗЕЛ II. СУБ’ЕКТЫ АДУКАЦЫЙНЫХ АДНОСІН
ГЛАВА 4. УСТАНОВЫ АДУКАЦЫІ, АРГАНІЗАЦЫІ, ШТО РЭАЛІЗУЮЦЬ АДУКАЦЫЙНЫЯ ПРАГРАМЫ НАВУКОВА-АРЫЕНТАВАНАЙ АДУКАЦЫІ, ІНШЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ, ІНДЫВІДУАЛЬНЫЯ ПРАДПРЫМАЛЬНІКІ, ШТО АЖЫЦЦЯЎЛЯЮЦЬ АДУКАЦЫЙНУЮ ДЗЕЙНАСЦЬ
Артыкул 18. Установы адукацыі
Артыкул 19. Правы і абавязкі ўстаноў адукацыі
Артыкул 20. Стварэнне, рэарганізацыя і ліквідацыя ўстаноў адукацыі
Артыкул 21. Статут установы адукацыі
Артыкул 22. Структура ўстаноў адукацыі
Артыкул 23. Змяненне віду ўстановы адукацыі
Артыкул 24. Кіраванне ўстановай адукацыі
Артыкул 25. Паўнамоцтвы кіраўніка ўстановы адукацыі
Артыкул 26. Арганізацыі, што рэалізуюць адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, іншыя арганізацыі, індывідуальныя прадпрымальнікі, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць
Артыкул 27. Правы і абавязкі арганізацый, што рэалізуюць адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, іншых арганізацый, індывідуальных прадпрымальнікаў, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць
Артыкул 28. Дзяржаўная акрэдытацыя ўстаноў адукацыі, іншых арганізацый, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, пацвярджэнне дзяржаўнай акрэдытацыі
ГЛАВА 5. НАВУЧЭНЦЫ, ЗАКОННЫЯ ПРАДСТАЎНІКІ НЕПАЎНАЛЕТНІХ НАВУЧЭНЦАЎ. САЦЫЯЛЬНАЯ АБАРОНА НАВУЧЭНЦАЎ, ПАДТРЫМКА ВЫПУСКНІКОЎ
Артыкул 29. Навучэнцы. Дакументы, якія пацвярджаюць статус навучэнца
Артыкул 30. Асноўныя правы навучэнцаў
Артыкул 31. Асноўныя абавязкі навучэнцаў
Артыкул 32. Законныя прадстаўнікі непаўналетніх навучэнцаў
Артыкул 33. Асноўныя правы законных прадстаўнікоў непаўналетніх навучэнцаў
Артыкул 34. Асноўныя абавязкі законных прадстаўнікоў непаўналетніх навучэнцаў
Артыкул 35. Камісія па вырашэнні канфлікту інтарэсаў педагагічнага работніка
Артыкул 36. Сацыяльная абарона навучэнцаў, падтрымка выпускнікоў
Артыкул 37. Прынцыпы сацыяльнай абароны навучэнцаў
Артыкул 38. Меры сацыяльнай абароны навучэнцаў
Артыкул 39. Карыстанне падручнікамі і вучэбнымі дапаможнікамі
Артыкул 40. Забеспячэнне харчаваннем
Артыкул 41. Ахова жыцця і здароўя

Артыкул 42. Стыпендыі, матэрыяльная дапамога і іншыя грашовыя выплаты
Артыкул 43. Забеспячэнне адзеннем, абуткам і іншымі неабходнымі сродкамі і прадметамі першай неабходнасці
Артыкул 44. Прадастаўленне жылых памяшканняў (іх частак) у інтэрнаце
Артыкул 45. Забеспячэнне месцамі для пражывання ў дзяржаўных школах-інтэрнатах для дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекавання бацькоў, санаторных школах-інтэрнатах, спецыяльных школах-інтэрнатах, сацыяльна-педагагічных установах, спецыяльных навучальна-выхаваўчых установах, спецыяльных лячэбна-выхаваўчых установах
Артыкул 46. Прадастаўленне крэдыту на льготных умовах для аплаты першай вышэйшай адукацыі
Артыкул 47. Транспартнае забеспячэнне
Артыкул 48. Гарантыі і кампенсацыі выпускнікам
Артыкул 49. Водпускі
ГЛАВА 6. ПЕДАГАГІЧНЫЯ РАБОТНІКІ. ІНШЫЯ РАБОТНІКІ ЎСТАНОЎ АДУКАЦЫІ
Артыкул 50. Педагагічныя работнікі
Артыкул 51. Патрабаванні, якія прад'яўляюцца да педагагічных работнікаў
Артыкул 52. Правы педагагічных работнікаў
Артыкул 53. Абавязкі педагагічных работнікаў
Артыкул 54. Іншыя работнікі ўстаноў адукацыі, іх правы і абавязкі
РАЗДЗЕЛ III. АДУКАЦЫЙНЫЯ АДНОСІНЫ
ГЛАВА 7. УЗНІКНЕННЕ, ЗМЯНЕННЕ І СПЫНЕННЕ АДУКАЦЫЙНЫХ АДНОСІН
Артыкул 55. Узнікненне адукацыйных адносін ва ўстанове адукацыі, арганізацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі
Артыкул 56. Узнікненне адукацыйных адносін у іншай арганізацыі, у індывідуальнага прадпрымальніка, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць
Артыкул 57. Агульныя патрабаванні да парадку прыёму (залічэння) асоб для атрымання адукацыі ва ўстанову адукацыі, арганізацыю, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі
Артыкул 58. Патрабаванні да парадку прыёму (залічэння) асоб для атрымання адукацыі ў іншую арганізацыю, да індывідуальнага прадпрымальніка, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць
Артыкул 59. Дагаворы ў сферы адукацыі
Артыкул 60. Дагавор аб падрыхтоўцы спецыяліста з вышэйшай адукацыяй, спецыяліста (рабочага) з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, рабочага (служачага) з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй за кошт сродкаў рэспубліканскага (мясцовага) бюджэту
Артыкул 61. Дагавор аб мэтавай падрыхтоўцы спецыяліста з вышэйшай адукацыяй, спецыяліста (рабочага) з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, рабочага (служачага) з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй
Артыкул 62. Дагавор аб падрыхтоўцы спецыяліста з вышэйшай адукацыяй, спецыяліста (рабочага) з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, рабочага (служачага) з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй на платнай аснове
Артыкул 63. Дагавор аб падрыхтоўцы навуковага работніка вышэйшай кваліфікацыі за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту
Артыкул 64. Дагавор аб падрыхтоўцы навуковага работніка вышэйшай кваліфікацыі на платнай аснове
Артыкул 65. Дагавор аб прафесійнай падрыхтоўцы, перападрыхтоўцы, павышэнні кваліфікацыі рабочага (служачага) у іншай арганізацыі, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, за кошт сродкаў іншай арганізацыі, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, або па заяўцы арганізацыі – заказчыка кадраў за кошт сродкаў арганізацыі – заказчыка кадраў
Артыкул 66. Дагавор аб аказанні паслуг пры рэалізацыі адукацыйных праграм на платнай аснове
Артыкул 67. Змяненне адукацыйных адносін
Артыкул 68. Спыненне адукацыйных адносін (адлічэнне)
Артыкул 69. Аднаўленне для працягу атрымання адукацыі
ГЛАВА 8. ГРАМАДСКІЯ АДНОСІНЫ, ЗВЯЗАНЫЯ З АДУКАЦЫЙНЫМІ АДНОСІНАМІ
Артыкул 70. Грамадскія адносіны, звязаныя з адукацыйнымі адносінамі
Артыкул 71. Дзяржаўныя арганізацыі адукацыі, якія забяспечваюць функцыянаванне сістэмы адукацыі

Артыкул 72. Размеркаванне выпускнікоў
Артыкул 73. Працаўладкаванне ў лік броні
Артыкул 74. Пераразмеркаванне выпускнікоў, маладых спецыялістаў, маладых рабочых (служачых)
Артыкул 75. Накіраванне на працу выпускнікоў
Артыкул 76. Перанакіраванне на працу выпускнікоў, маладых спецыялістаў, маладых рабочых (служачых)
Артыкул 77. Прадастаўленне выпускнікам, маладым спецыялістам, маладым рабочым (служачым) права на самастойнае працаўладкаванне
Артыкул 78. Пакрыццё ў рэспубліканскі і (або) мясцовыя бюджэты сродкаў, затрачаных дзяржавай на падрыхтоўку навуковага работніка вышэйшай кваліфікацыі, спецыяліста, рабочага, служачага
Артыкул 79. Страта статусу маладога спецыяліста, маладога рабочага (служачага)
Артыкул 80. Атрыманне адукацыі (навучанне) у замежных арганізацыях, пакрыццё ў рэспубліканскі бюджэт сродкаў, затрачаных дзяржавай на падрыхтоўку навуковых работнікаў вышэйшай кваліфікацыі, спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй у замежных арганізацыях
ГЛАВА 9. АГУЛЬНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА АДУКАЦЫЙНАГА ПРАЦЭСУ
Артыкул 81. Адукацыйны працэс
Артыкул 82. Мова навучання і выхавання. Вывучэнне моў ва ўстановах адукацыі
Артыкул 83. Асноўныя патрабаванні да арганізацыі адукацыйнага працэсу
Артыкул 84. Адукацыйныя стандарты
Артыкул 85. Атэстацыя навучэнцаў
Артыкул 86. Навукова-метадычнае забеспячэнне адукацыі
Артыкул 87. Праграмна-планавальная дакументацыя выхавання
Артыкул 88. Сацыяльна-педагагічная падтрымка навучэнцаў і аказанне ім псіхалагічнай дапамогі
Артыкул 89. Эксперыментальная і інавацыйная дзейнасць у сферы адукацыі
ГЛАВА 10. ДАКУМЕНТЫ АБ АДУКАЦЫІ. ДАКУМЕНТЫ АБ НАВУЧАННІ
Артыкул 90. Дакументы аб адукацыі
Артыкул 91. Дакументы аб навучанні
Артыкул 92. Юрыдычнае значэнне дакументаў аб адукацыі, дакументаў аб навучанні
Артыкул 93. Падставы для выдачы дакументаў аб адукацыі, дакументаў аб навучанні
Артыкул 94. Прызнанне дакументаў аб адукацыі, выдадзеных у замежных дзяржавах, і ўстанаўленне іх эквівалентнасці (адпаведнасці) дакументам аб адукацыі Рэспублікі Беларусь
Артыкул 95. Дублікат дакумента аб адукацыі, дублікат дадатку да дакумента аб адукацыі, дублікат дакумента аб навучанні
Артыкул 96. Парадак і падставы для адмены рашэння аб выдачы асобе дакумента аб адукацыі, дакумента аб навучанні
РАЗДЗЕЛ IV. КІРАВАННЕ І МІЖНАРОДНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА Ў СФЕРЫ АДУКАЦЫІ. КАНТРОЛЬ І САМАКАНТРОЛЬ ЗА ЗАБЕСПЯЧЭННЕМ ЯКАСЦІ АДУКАЦЫІ
ГЛАВА 11. КІРАВАННЕ Ў СФЕРЫ АДУКАЦЫІ
Артыкул 97. Прынцыпы і мэты кіравання ў сферы адукацыі
Артыкул 98. Дзяржаўнае кіраванне ў сферы адукацыі
Артыкул 99. Паўнамоцтвы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у сферы адукацыі
Артыкул 100. Паўнамоцтвы Урада Рэспублікі Беларусь у сферы адукацыі
Артыкул 101. Паўнамоцтвы Міністэрства адукацыі ў сферы адукацыі
Артыкул 102. Паўнамоцтвы дзяржаўных органаў, падпарадкаваных і (або) падсправаздачных Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, іншых дзяржаўных арганізацый, падпарадкаваных Ураду Рэспублікі Беларусь, у сферы адукацыі
Артыкул 103. Паўнамоцтвы мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў у сферы адукацыі
Артыкул 104. Ліцэнзаванне адукацыйнай дзейнасці
Артыкул 105. Прагназаванне развіцця сістэмы адукацыі
Артыкул 106. Улік у сферы адукацыі
Артыкул 107. Інфармацыйнае забеспячэнне ў сферы адукацыі
Артыкул 108. Каардынацыйныя і іншыя саветы ў сферы адукацыі

Артыкул 109. Грамадскія аб’яднанні ў сферы адукацыі
ГЛАВА 12. МІЖНАРОДНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА Ў СФЕРЫ АДУКАЦЫІ
Артыкул 110. Міжнароднае супрацоўніцтва ў сферы адукацыі
Артыкул 111. Знешнегандлёвая дзейнасць у сферы адукацыі
Артыкул 112. Атрыманне адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь замежнымі грамадзянамі і асобамі без грамадзянства, якія пастаянна пражываюць за межамі Рэспублікі Беларусь
Артыкул 113. Акадэмічная мабільнасць
Артыкул 114. Прызнанне і ўстанаўленне адпаведнасці перыядаў навучання ў замежных арганізацыях
Артыкул 115. Адукацыйная дзейнасць устаноў адукацыі Рэспублікі Беларусь і іх філіялаў на тэрыторыі замежных дзяржаў, замежных арганізацый і іх філіялаў, міжнародных арганізацый у Рэспубліцы Беларусь
ГЛАВА 13. КАНТРОЛЬ І САМАКАНТРОЛЬ ЗА ЗАБЕСПЯЧЭННЕМ ЯКАСЦІ АДУКАЦЫІ
Артыкул 116. Кантроль за забеспячэннем якасці адукацыі
Артыкул 117. Самакантроль за забеспячэннем якасці адукацыі
РАЗДЗЕЛ V. ДЫСЦЫПЛІНАРНАЯ АДКАЗНАСЦЬ НАВУЧЭНЦАЎ
ГЛАВА 14. ПАДСТАВЫ ДЛЯ ПРЫЦЯГНЕННЯ НАВУЧЭНЦАЎ ДА ДЫСЦЫПЛІНАРНАЙ АДКАЗНАСЦІ. МЕРЫ ДЫСЦЫПЛІНАРНАГА СПАГНАННЯ
Артыкул 118. Падставы для прыцягнення навучэнцаў да дысцыплінарнай адказнасці
Артыкул 119. Узрост, па дасягненні якога наступае дысцыплінарная адказнасць
Артыкул 120. Меры дысцыплінарнага спагнання
Артыкул 121. Дысцыплінарная адказнасць навучэнцаў з ліку ваеннаслужачых, асоб начальніцкага і радавога складу ваенізаваных арганізацый
ГЛАВА 15. ПРЫМЯНЕННЕ МЕР ДЫСЦЫПЛІНАРНАГА СПАГНАННЯ
Артыкул 122. Прэзумпцыя невінаватасці навучэнца, які прыцягваецца да дысцыплінарнай адказнасці
Артыкул 123. Правы навучэнца, які прыцягваецца да дысцыплінарнай адказнасці, законнага прадстаўніка непаўналетняга навучэнца, які прыцягваецца да дысцыплінарнай адказнасці
Артыкул 124. Парадак прымянення мер дысцыплінарнага спагнання
Артыкул 125. Тэрміны прымянення мер дысцыплінарнага спагнання
Артыкул 126. Аб’яўленне рашэння аб прымяненні меры дысцыплінарнага спагнання да навучэнца
Артыкул 127. Абскарджанне рашэння аб прымяненні меры дысцыплінарнага спагнання да навучэнца
Артыкул 128. Парадак зняцця і пагашэння мер дысцыплінарнага спагнання ў выглядзе заўвагі або вымовы
РАЗДЗЕЛ VI. ФІНАНСАВАННЕ, МАТЭРЫЯЛЬНА-ТЭХНІЧНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ Ў СФЕРЫ АДУКАЦЫІ
ГЛАВА 16. ФІНАНСАВАННЕ Ў СФЕРЫ АДУКАЦЫІ
Артыкул 129. Фінансаванне ўстаноў адукацыі, дзяржаўных арганізацый адукацыі, якія забяспечваюць функцыянаванне сістэмы адукацыі, іншых арганізацый, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць
Артыкул 130. Дзейнасць устаноў адукацыі, якая прыносіць даходы
ГЛАВА 17. МАТЭРЫЯЛЬНА-ТЭХНІЧНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ Ў СФЕРЫ АДУКАЦЫІ
Артыкул 131. Матэрыяльна-тэхнічная база ўстаноў адукацыі
Артыкул 132. Развіццё матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстаноў адукацыі
АСАБЛІВАЯ ЧАСТКА
РАЗДЗЕЛ VII. ДАШКОЛЬНАЯ АДУКАЦЫЯ
ГЛАВА 18. СІСТЭМА ДАШКОЛЬНАЙ АДУКАЦЫІ
Артыкул 133. Сістэма дашкольнай адукацыі
Артыкул 134. Адукацыйная праграма дашкольнай адукацыі
Артыкул 135. Адукацыйны стандарт дашкольнай адукацыі
Артыкул 136. Тэрмін атрымання дашкольнай адукацыі
Артыкул 137. Установы дашкольнай адукацыі
Артыкул 138. Кіраванне ўстановай дашкольнай адукацыі
ГЛАВА 19. АРГАНІЗАЦЫЯ АДУКАЦЫЙНАГА ПРАЦЭСУ ПРЫ РЭАЛІЗАЦЫІ АДУКАЦЫЙНАЙ ПРАГРАМЫ ДАШКОЛЬНАЙ АДУКАЦЫІ

Артыкул 139. Агульныя патрабаванні да арганізацыі адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі
Артыкул 140. Агульныя патрабаванні да прыёму (залічэння) асоб для атрымання дашкольнай адукацыі
Артыкул 141. Засваенне зместу адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі дома, у санаторна-курортных і аздараўленчых арганізацыях, спалучэнне заняткаў дома і ва ўстанове адукацыі
ГЛАВА 20. НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ ДАШКОЛЬНАЙ АДУКАЦЫІ
Артыкул 142. Сістэма навукова-метадычнага забеспячэння дашкольнай адукацыі
Артыкул 143. Вучэбна-праграмная дакументацыя адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі
РАЗДЗЕЛ VIII. АГУЛЬНАЯ СЯРЭДНЯЯ АДУКАЦЫЯ
ГЛАВА 21. СІСТЭМА АГУЛЬНАЙ СЯРЭДНЯЙ АДУКАЦЫІ
Артыкул 144. Сістэма агульнай сярэдняй адукацыі
Артыкул 145. Адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі
Артыкул 146. Адукацыйныя стандарты агульнай сярэдняй адукацыі
Артыкул 147. Тэрмін атрымання агульнай сярэдняй адукацыі
Артыкул 148. Установы агульнай сярэдняй адукацыі
Артыкул 149. Кіраванне ўстановай агульнай сярэдняй адукацыі
ГЛАВА 22. АРГАНІЗАЦЫЯ АДУКАЦЫЙНАГА ПРАЦЭСУ ПРЫ РЭАЛІЗАЦЫІ АДУКАЦЫЙНЫХ ПРАГРАМ АГУЛЬНАЙ СЯРЭДНЯЙ АДУКАЦЫІ
Артыкул 150. Агульныя патрабаванні да арганізацыі адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі
Артыкул 151. Агульныя патрабаванні да прыёму (залічэння) асоб для атрымання агульнай сярэдняй адукацыі ва ўстановах адукацыі
Артыкул 152. Засваенне зместу адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі дома, спалучэнне вучэбных заняткаў дома і ва ўстанове адукацыі
Артыкул 153. Навучанне і выхаванне навучэнцаў у арганізацыях аховы здароўя
Артыкул 154. Навучанне і выхаванне навучэнцаў у санаторна-курортных і аздараўленчых арганізацыях
Артыкул 155. Навучанне і выхаванне навучэнцаў, якія прымаюць удзел у спартыўных мерапрыемствах
Артыкул 156. Навучанне і выхаванне навучэнцаў, якія засвойваюць змест адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі
Артыкул 157. Навучанне і выхаванне навучэнцаў, якія ўтрымліваюцца пад вартай у следчых ізалятарах, пад вартай у папраўчых установах
ГЛАВА 23. АТЭСТАЦЫЯ НАВУЧЭНЦАЎ ПРЫ ЗАСВАЕННІ ЗМЕСТУ АДУКАЦЫЙНЫХ ПРАГРАМ АГУЛЬНАЙ СЯРЭДНЯЙ АДУКАЦЫІ
Артыкул 158. Агульныя патрабаванні да атэстацыі навучэнцаў пры засваенні зместу адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі
Артыкул 159. Атэстацыя экстэрнаў
Артыкул 160. Бягучая і прамежкавая атэстацыя навучэнцаў пры засваенні зместу адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі
Артыкул 161. Выніковая атэстацыя навучэнцаў пры засваенні зместу адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі
ГЛАВА 24. НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ АГУЛЬНАЙ СЯРЭДНЯЙ АДУКАЦЫІ
Артыкул 162. Сістэма навукова-метадычнага забеспячэння агульнай сярэдняй адукацыі
Артыкул 163. Вучэбна-праграмная дакументацыя адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі
Артыкул 164. Вучэбна-метадычныя аб’яднанні ў сферы агульнай сярэдняй адукацыі
РАЗДЗЕЛ IX. ПРАФЕСІЙНА-ТЭХНІЧНАЯ АДУКАЦЫЯ
ГЛАВА 25. СІСТЭМА ПРАФЕСІЙНА-ТЭХНІЧНАЙ АДУКАЦЫІ
Артыкул 165. Сістэма прафесійна-тэхнічнай адукацыі
Артыкул 166. Удзельнікі адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адукацыйных праграм прафесійна-тэхнічнай адукацыі
Артыкул 167. Адукацыйныя праграмы прафесійна-тэхнічнай адукацыі
Артыкул 168. Адукацыйныя стандарты прафесійна-тэхнічнай адукацыі

Артыкул 169. Тэрмін атрымання прафесійна-тэхнічнай адукацыі
ГЛАВА 26. УСТАНОВЫ АДУКАЦЫІ, ШТО РЭАЛІЗУЮЦЬ АДУКАЦЫЙНЫЯ ПРАГРАМЫ ПРАФЕСІЙНА-ТЭХНІЧНАЙ АДУКАЦЫІ. УЗАЕМАДЗЕЯННЕ ЎСТАНОЎ АДУКАЦЫІ ПРЫ РЭАЛІЗАЦЫІ ПРАФЕСІЙНА-ТЭХНІЧНАЙ АДУКАЦЫІ З АРГАНІЗАЦЫЯМІ – ЗАКАЗЧЫКАМІ КАДРАЎ
Артыкул 170. Установы адукацыі, што рэалізуюць адукацыйныя праграмы прафесійна-тэхнічнай адукацыі
Артыкул 171. Статус установы адукацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы прафесійна-тэхнічнай адукацыі
Артыкул 172. Узаемадзеянне ўстаноў адукацыі пры рэалізацыі адукацыйных праграм прафесійна-тэхнічнай адукацыі з арганізацыямі – заказчыкамі кадраў
ГЛАВА 27. АРГАНІЗАЦЫЯ АДУКАЦЫЙНАГА ПРАЦЭСУ ПРЫ РЭАЛІЗАЦЫІ АДУКАЦЫЙНЫХ ПРАГРАМ ПРАФЕСІЙНА-ТЭХНІЧНАЙ АДУКАЦЫІ
Артыкул 173. Агульныя патрабаванні да арганізацыі адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адукацыйных праграм прафесійна-тэхнічнай адукацыі
Артыкул 174. Агульныя патрабаванні да прыёму (залічэння) асоб для атрымання прафесійна-тэхнічнай адукацыі
Артыкул 175. Ільготы пры прыёме (залічэнні) асоб для атрымання прафесійна-тэхнічнай адукацыі
Артыкул 176. Атрыманне прафесійна-тэхнічнай адукацыі дома
ГЛАВА 28. АТЭСТАЦЫЯ НАВУЧЭНЦАЎ, КУРСАНТАЎ ПРЫ ЗАСВАЕННІ ЗМЕСТУ АДУКАЦЫЙНЫХ ПРАГРАМ ПРАФЕСІЙНА-ТЭХНІЧНАЙ АДУКАЦЫІ
Артыкул 177. Бягучая і прамежкавая атэстацыя навучэнцаў, курсантаў пры засваенні зместу адукацыйных праграм прафесійна-тэхнічнай адукацыі
Артыкул 178. Выніковая атэстацыя навучэнцаў, курсантаў пры засваенні зместу адукацыйных праграм прафесійна-тэхнічнай адукацыі
ГЛАВА 29. НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ ПРАФЕСІЙНА-ТЭХНІЧНАЙ АДУКАЦЫІ
Артыкул 179. Сістэма навукова-метадычнага забеспячэння прафесійна-тэхнічнай адукацыі
Артыкул 180. Вучэбна-праграмная дакументацыя адукацыйных праграм прафесійна-тэхнічнай адукацыі
Артыкул 181. Вучэбна-метадычныя аб’яднанні ў сферы прафесійна-тэхнічнай адукацыі
РАЗДЗЕЛ X. СЯРЭДНЯЯ СПЕЦЫЯЛЬНАЯ АДУКАЦЫЯ
ГЛАВА 30. СІСТЭМА СЯРЭДНЯЙ СПЕЦЫЯЛЬНАЙ АДУКАЦЫІ
Артыкул 182. Сістэма сярэдняй спецыяльнай адукацыі
Артыкул 183. Удзельнікі адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адукацыйных праграм сярэдняй спецыяльнай адукацыі
Артыкул 184. Адукацыйныя праграмы сярэдняй спецыяльнай адукацыі
Артыкул 185. Адукацыйныя стандарты сярэдняй спецыяльнай адукацыі
Артыкул 186. Тэрмін атрымання сярэдняй спецыяльнай адукацыі
ГЛАВА 31. УСТАНОВЫ СЯРЭДНЯЙ СПЕЦЫЯЛЬНАЙ АДУКАЦЫІ. УЗАЕМАДЗЕЯННЕ ЎСТАНОЎ АДУКАЦЫІ ПРЫ РЭАЛІЗАЦЫІ АДУКАЦЫЙНЫХ ПРАГРАМ СЯРЭДНЯЙ СПЕЦЫЯЛЬНАЙ АДУКАЦЫІ З АРГАНІЗАЦЫЯМІ – ЗАКАЗЧЫКАМІ КАДРАЎ
Артыкул 187. Установы сярэдняй спецыяльнай адукацыі
Артыкул 188. Кіраванне ўстановай сярэдняй спецыяльнай адукацыі
Артыкул 189. Статус установы адукацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы сярэдняй спецыяльнай адукацыі
Артыкул 190. Узаемадзеянне ўстаноў адукацыі пры рэалізацыі адукацыйных праграм сярэдняй спецыяльнай адукацыі з арганізацыямі – заказчыкамі кадраў
ГЛАВА 32. АРГАНІЗАЦЫЯ АДУКАЦЫЙНАГА ПРАЦЭСУ ПРЫ РЭАЛІЗАЦЫІ АДУКАЦЫЙНЫХ ПРАГРАМ СЯРЭДНЯЙ СПЕЦЫЯЛЬНАЙ АДУКАЦЫІ
Артыкул 191. Агульныя патрабаванні да арганізацыі адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адукацыйных праграм сярэдняй спецыяльнай адукацыі
Артыкул 192. Агульныя патрабаванні да прыёму (залічэння) асоб для атрымання сярэдняй спецыяльнай адукацыі
ГЛАВА 33. АТЭСТАЦЫЯ НАВУЧЭНЦАЎ, КУРСАНТАЎ ПРЫ ЗАСВАЕННІ ЗМЕСТУ АДУКАЦЫЙНЫХ ПРАГРАМ СЯРЭДНЯЙ СПЕЦЫЯЛЬНАЙ АДУКАЦЫІ

Артыкул 193. Бягучая і прамежкавая атэстацыя навучэнцаў, курсантаў пры засваенні зместу адукацыйных праграм сярэдняй спецыяльнай адукацыі
Артыкул 194. Выніковая атэстацыя навучэнцаў, курсантаў пры засваенні зместу адукацыйных праграм сярэдняй спецыяльнай адукацыі
ГЛАВА 34. НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ СЯРЭДНЯЙ СПЕЦЫЯЛЬНАЙ АДУКАЦЫІ
Артыкул 195. Сістэма навукова-метадычнага забеспячэння сярэдняй спецыяльнай адукацыі
Артыкул 196. Вучэбна-праграмная дакументацыя адукацыйных праграм сярэдняй спецыяльнай адукацыі
Артыкул 197. Вучэбна-метадычныя аб’яднанні ў сферы сярэдняй спецыяльнай адукацыі
РАЗДЗЕЛ XI. ВЫШЭЙШАЯ АДУКАЦЫЯ
ГЛАВА 35. СІСТЭМА ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ
Артыкул 198. Сістэма вышэйшай адукацыі
Артыкул 199. Удзельнікі адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі
Артыкул 200. Адукацыйныя праграмы вышэйшай адукацыі
Артыкул 201. Адукацыйныя стандарты вышэйшай адукацыі
Артыкул 202. Тэрмін атрымання вышэйшай адукацыі
ГЛАВА 36. УСТАНОВЫ ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ. УЗАЕМАДЗЕЯННЕ ЎСТАНОЎ ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ ПРЫ РЭАЛІЗАЦЫІ АДУКАЦЫЙНЫХ ПРАГРАМ ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ З АРГАНІЗАЦЫЯМІ – ЗАКАЗЧЫКАМІ КАДРАЎ
Артыкул 203. Установы вышэйшай адукацыі
Артыкул 204. Кіраванне ўстановай вышэйшай адукацыі
Артыкул 205. Статус установы вышэйшай адукацыі
Артыкул 206. Узаемадзеянне ўстаноў вышэйшай адукацыі пры рэалізацыі праграм вышэйшай адукацыі з арганізацыямі – заказчыкамі кадраў
ГЛАВА 37. АРГАНІЗАЦЫЯ АДУКАЦЫЙНАГА ПРАЦЭСУ ПРЫ РЭАЛІЗАЦЫІ АДУКАЦЫЙНЫХ ПРАГРАМ ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ
Артыкул 207. Агульныя патрабаванні да арганізацыі адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі
Артыкул 208. Агульныя патрабаванні да прыёму (залічэння) асоб для атрымання вышэйшай адукацыі
ГЛАВА 38. АТЭСТАЦЫЯ СТУДЭНТАЎ, КУРСАНТАЎ, СЛУХАЧОЎ ПРЫ ЗАСВАЕННІ ЗМЕСТУ АДУКАЦЫЙНЫХ ПРАГРАМ ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ
Артыкул 209. Бягучая і прамежкавая атэстацыя студэнтаў, курсантаў, слухачоў пры засваенні зместу адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі
Артыкул 210. Выніковая атэстацыя студэнтаў, курсантаў, слухачоў пры засваенні зместу адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі
ГЛАВА 39. НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ
Артыкул 211. Сістэма навукова-метадычнага забеспячэння вышэйшай адукацыі
Артыкул 212. Вучэбна-праграмная дакументацыя адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі
Артыкул 213. Вучэбна-метадычныя аб’яднанні ў сферы вышэйшай адукацыі
РАЗДЗЕЛ XII. НАВУКОВА-АРЫЕНТАВАНАЯ АДУКАЦЫЯ
ГЛАВА 40. СІСТЭМА НАВУКОВА-АРЫЕНТАВАНАЙ АДУКАЦЫІ
Артыкул 214. Сістэма навукова-арыентаванай адукацыі
Артыкул 215. Адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі
Артыкул 216. Тэрмін атрымання навукова-арыентаванай адукацыі
Артыкул 217. Установы адукацыі, арганізацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі
ГЛАВА 41. АРГАНІЗАЦЫЯ АДУКАЦЫЙНАГА ПРАЦЭСУ ПРЫ РЭАЛІЗАЦЫІ АДУКАЦЫЙНЫХ ПРАГРАМ НАВУКОВА-АРЫЕНТАВАНАЙ АДУКАЦЫІ, ЯЕ ЎДЗЕЛЬНІКІ
Артыкул 218. Агульныя патрабаванні да арганізацыі адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адукацыйных праграм навукова-арыентаванай адукацыі
Артыкул 219. Удзельнікі адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адукацыйных праграм навукова-арыентаванай адукацыі. Парадак устанаўлення відаў педагагічнай і навуковай дзейнасці і іх нармаванне для педагагічных работнікаў

ГЛАВА 42. АТЭСТАЦЫЯ АСПІРАНТАЎ, АД’ЮНКТАЎ, ДАКТАРАНТАЎ, СAІСКАЛЬНІКАЎ ПРЫ ЗАСВАЕННІ ЗМЕСТУ АДУКАЦЫЙНЫХ ПРАГРАМ НАВУКОВА-АРЫЕНТАВАНАЙ АДУКАЦЫІ
Артыкул 220. Прамежкавая атэстацыя аспірантаў, ад’юнктаў, дактарантаў, саіскальнікаў пры засваенні зместу адукацыйных праграм навукова-арыентаванай адукацыі
Артыкул 221. Выніковая атэстацыя аспірантаў, ад’юнктаў, дактарантаў, саіскальнікаў пры засваенні зместу адукацыйных праграм навукова-арыентаванай адукацыі
ГЛАВА 43. НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ НАВУКОВА-АРЫЕНТАВАНАЙ АДУКАЦЫІ
Артыкул 222. Сістэма навукова-метадычнага забеспячэння навукова-арыентаванай адукацыі
Артыкул 223. Вучэбна-праграмная дакументацыя адукацыйных праграм навукова-арыентаванай адукацыі
РАЗДЗЕЛ XIII. ДАДАТКОВАЯ АДУКАЦЫЯ ДЗЯЦЕЙ І МОЛАДЗІ
ГЛАВА 44. СІСТЭМА ДАДАТКОВАЙ АДУКАЦЫІ ДЗЯЦЕЙ І МОЛАДЗІ
Артыкул 224. Сістэма дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі
Артыкул 225. Адукацыйная праграма дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі
Артыкул 226. Тэрмін атрымання дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі
ГЛАВА 45. УСТАНОВЫ ДАДАТКОВАЙ АДУКАЦЫІ ДЗЯЦЕЙ І МОЛАДЗІ. КІРАВАННЕ ЎСТАНОВАЙ ДАДАТКОВАЙ АДУКАЦЫІ ДЗЯЦЕЙ І МОЛАДЗІ
Артыкул 227. Установы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі
Артыкул 228. Кіраванне ўстановай дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі
ГЛАВА 46. АРГАНІЗАЦЫЯ АДУКАЦЫЙНАГА ПРАЦЭСУ ПРЫ РЭАЛІЗАЦЫІ АДУКАЦЫЙНАЙ ПРАГРАМЫ ДАДАТКОВАЙ АДУКАЦЫІ ДЗЯЦЕЙ І МОЛАДЗІ
Артыкул 229. Агульныя патрабаванні да арганізацыі адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі
Артыкул 230. Агульныя патрабаванні да прыёму (залічэння) асоб для атрымання дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі
Артыкул 231. Атрыманне дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі дома
Артыкул 232. Атрыманне дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі ў санаторна-курортных і аздараўленчых арганізацыях
Артыкул 233. Атэстацыя навучэнцаў пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі
ГЛАВА 47. НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ ДАДАТКОВАЙ АДУКАЦЫІ ДЗЯЦЕЙ І МОЛАДЗІ
Артыкул 234. Сістэма навукова-метадычнага забеспячэння дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі
Артыкул 235. Вучэбна-праграмная дакументацыя адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі
РАЗДЗЕЛ XIV. ДАДАТКОВАЯ АДУКАЦЫЯ АДОРАНЫХ ДЗЯЦЕЙ І МОЛАДЗІ
ГЛАВА 48. СІСТЭМА ДАДАТКОВАЙ АДУКАЦЫІ АДОРАНЫХ ДЗЯЦЕЙ І МОЛАДЗІ
Артыкул 236. Сістэма дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі
Артыкул 237. Удзельнікі адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі
Артыкул 238. Адукацыйная праграма дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі
Артыкул 239. Тэрмін атрымання дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі
ГЛАВА 49. УСТАНОВЫ ДАДАТКОВАЙ АДУКАЦЫІ АДОРАНЫХ ДЗЯЦЕЙ І МОЛАДЗІ
Артыкул 240. Установы дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі
Артыкул 241. Кіраванне ўстановай дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі. Наглядальны савет
ГЛАВА 50. АРГАНІЗАЦЫЯ АДУКАЦЫЙНАГА ПРАЦЭСУ ПРЫ РЭАЛІЗАЦЫІ АДУКАЦЫЙНАЙ ПРАГРАМЫ ДАДАТКОВАЙ АДУКАЦЫІ АДОРАНЫХ ДЗЯЦЕЙ І МОЛАДЗІ
Артыкул 242. Агульныя патрабаванні да арганізацыі адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі
Артыкул 243. Агульныя патрабаванні да прыёму (залічэння) асоб для атрымання дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі
ГЛАВА 51. НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ ДАДАТКОВАЙ АДУКАЦЫІ АДОРАНЫХ ДЗЯЦЕЙ І МОЛАДЗІ

Артыкул 244. Навукова-метадычнае забеспячэнне дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі
Артыкул 245. Вучэбна-праграмная дакументацыя адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі
РАЗДЗЕЛ XV. ДАДАТКОВАЯ АДУКАЦЫЯ ДАРОСЛЫХ
ГЛАВА 52. СІСТЭМА ДАДАТКОВАЙ АДУКАЦЫІ ДАРОСЛЫХ
Артыкул 246. Сістэма дадатковай адукацыі дарослых
Артыкул 247. Удзельнікі адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адукацыйных праграм дадатковай адукацыі дарослых
Артыкул 248. Адукацыйныя праграмы дадатковай адукацыі дарослых
Артыкул 249. Адукацыйныя стандарты перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць вышэйшую адукацыю, кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць сярэднюю спецыяльную адукацыю
Артыкул 250. Тэрмін атрымання дадатковай адукацыі дарослых
ГЛАВА 53. УСТАНОВЫ ДАДАТКОВАЙ АДУКАЦЫІ ДАРОСЛЫХ, ІНШЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ, ІНДЫВІДУАЛЬНЫЯ ПРАДПРЫМАЛЬНІКІ, ШТО АЖЫЦЦЯЎЛЯЮЦЬ АДУКАЦЫЙНУЮ ДЗЕЙНАСЦЬ, ЯКІЯ РЭАЛІЗУЮЦЬ АДУКАЦЫЙНЫЯ ПРАГРАМЫ ДАДАТКОВАЙ АДУКАЦЫІ ДАРОСЛЫХ
Артыкул 251. Установы дадатковай адукацыі дарослых
Артыкул 252. Іншыя арганізацыі, індывідуальныя прадпрымальнікі, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы дадатковай адукацыі дарослых
Артыкул 253. Кіраванне ўстановай дадатковай адукацыі дарослых
Артыкул 254. Статус установы адукацыі, якая рэалізуе адукацыйныя праграмы дадатковай адукацыі дарослых
ГЛАВА 54. АРГАНІЗАЦЫЯ АДУКАЦЫЙНАГА ПРАЦЭСУ ПРЫ РЭАЛІЗАЦЫІ АДУКАЦЫЙНЫХ ПРАГРАМ ДАДАТКОВАЙ АДУКАЦЫІ ДАРОСЛЫХ
Артыкул 255. Агульныя патрабаванні да арганізацыі адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адукацыйных праграм дадатковай адукацыі дарослых, да прыёму (залічэння) асоб для атрымання дадатковай адукацыі дарослых
Артыкул 256. Атрыманне дадатковай адукацыі дарослых дома
ГЛАВА 55. АТЭСТАЦЫЯ СЛУХАЧОЎ, СТАЖОРАЎ ПРЫ ЗАСВАЕННІ ЗМЕСТУ АДУКАЦЫЙНЫХ ПРАГРАМ ДАДАТКОВАЙ АДУКАЦЫІ ДАРОСЛЫХ
Артыкул 257. Бягучая і прамежкавая атэстацыя слухачоў пры засваенні зместу адукацыйных праграм дадатковай адукацыі дарослых
Артыкул 258. Выніковая атэстацыя слухачоў, стажораў пры засваенні зместу адукацыйных праграм дадатковай адукацыі дарослых
ГЛАВА 56. НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ ДАДАТКОВАЙ АДУКАЦЫІ ДАРОСЛЫХ
Артыкул 259. Сістэма навукова-метадычнага забеспячэння дадатковай адукацыі дарослых
Артыкул 260. Вучэбна-праграмная дакументацыя адукацыйных праграм дадатковай адукацыі дарослых
Артыкул 261. Вучэбна-метадычныя аб’яднанні ў сферы дадатковай адукацыі дарослых
РАЗДЗЕЛ XVI. СПЕЦЫЯЛЬНАЯ АДУКАЦЫЯ
ГЛАВА 57. СІСТЭМА СПЕЦЫЯЛЬНАЙ АДУКАЦЫІ
Артыкул 262. Сістэма спецыяльнай адукацыі
Артыкул 263. Адукацыйныя праграмы спецыяльнай адукацыі
Артыкул 264. Адукацыйныя стандарты спецыяльнай адукацыі
Артыкул 265. Тэрмін атрымання адукацыі асобамі, якія засвойваюць змест адукацыйных праграм спецыяльнай адукацыі
ГЛАВА 58. УСТАНОВЫ АДУКАЦЫІ, ІНШЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ, ІНДЫВІДУАЛЬНЫЯ ПРАДПРЫМАЛЬНІКІ, ШТО АЖЫЦЦЯЎЛЯЮЦЬ АДУКАЦЫЙНУЮ ДЗЕЙНАСЦЬ, ЯКІЯ РЭАЛІЗУЮЦЬ АДУКАЦЫЙНЫЯ ПРАГРАМЫ СПЕЦЫЯЛЬНАЙ АДУКАЦЫІ
Артыкул 266. Установы адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы спецыяльнай адукацыі
Артыкул 267. Установы спецыяльнай адукацыі
Артыкул 268. Спецыяльны дзіцячы сад
Артыкул 269. Спецыяльная школа, спецыяльная школа-інтэрнат
Артыкул 270. Цэнтр карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі

Артыкул 271. Іншыя ўстановы адукацыі, іншыя арганізацыі, індывідуальныя прадпрымальнікі, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы спецыяльнай адукацыі
Артыкул 272. Кіраванне ўстановай спецыяльнай адукацыі
ГЛАВА 59. АРГАНІЗАЦЫЯ АДУКАЦЫЙНАГА ПРАЦЭСУ ПРЫ РЭАЛІЗАЦЫІ АДУКАЦЫЙНЫХ ПРАГРАМ СПЕЦЫЯЛЬНАЙ АДУКАЦЫІ
Артыкул 273. Агульныя патрабаванні да арганізацыі адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адукацыйных праграм спецыяльнай адукацыі
Артыкул 274. Агульныя патрабаванні да прыёму (залічэння) асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця для засваення зместу адукацыйных праграм спецыяльнай адукацыі
Артыкул 275. Атрыманне спецыяльнай адукацыі дома, спалучэнне вучэбных заняткаў, заняткаў дома і ва ўстанове адукацыі
Артыкул 276. Навучанне і выхаванне асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, аказанне карэкцыйна-педагагічнай дапамогі ў арганізацыях аховы здароўя
Артыкул 277. Навучанне і выхаванне асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця ў санаторна-курортных і аздараўленчых арганізацыях
Артыкул 278. Атрыманне спецыяльнай адукацыі асобамі з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, якія знаходзяцца ва ўстановах сацыяльнага абслугоўвання, аказанне ім карэкцыйна-педагагічнай дапамогі
ГЛАВА 60. АТЭСТАЦЫЯ АСОБ З АСАБЛІВАСЦЯМІ ПСІХАФІЗІЧНАГА РАЗВІЦЦЯ ПРЫ ЗАСВАЕННІ ЗМЕСТУ АДУКАЦЫЙНЫХ ПРАГРАМ СПЕЦЫЯЛЬНАЙ АДУКАЦЫІ
Артыкул 279. Атэстацыя асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця пры засваенні зместу адукацыйных праграм спецыяльнай адукацыі
Артыкул 280. Асаблівасці выніковай атэстацыі навучэнцаў пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі
Артыкул 281. Асаблівасці атэстацыі навучэнцаў пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю
ГЛАВА 61. НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ СПЕЦЫЯЛЬНАЙ АДУКАЦЫІ
Артыкул 282. Сістэма навукова-метадычнага забеспячэння спецыяльнай адукацыі
Артыкул 283. Вучэбна-праграмная дакументацыя адукацыйных праграм спецыяльнай адукацыі
Артыкул 284. Вучэбна-метадычныя аб'яднанні ў сферы спецыяльнай адукацыі
РАЗДЗЕЛ XVII. ПАДТРЫМКА ДЗЯЦЕЙ, ЯКІЯ ДАСЯГНУЛІ ВЫСОКІХ ПАКАЗЧЫКАЎ У ВУЧЭБНАЙ І ГРАМАДСКАЙ ДЗЕЙНАСЦІ, ДЗЯЦЕЙ, ШТО МАЮЦЬ ПАТРЭБУ Ў АЗДАРАЎЛЕННІ, ДЗЯЦЕЙ, ПРЫЗНАНЫХ ДЗЕЦЬМІ, ЯКІЯ ЗНАХОДЗЯЦЦА Ў САЦЫЯЛЬНА НЕБЯСПЕЧНЫМ СТАНОВІШЧЫ, ДЗЯЦЕЙ, ПРЫЗНАНЫХ ДЗЕЦЬМІ, ШТО МАЮЦЬ ПАТРЭБУ Ў ДЗЯРЖАЎНАЙ АБАРОНЕ, І ДЗЯЦЕЙ, ШТО МАЮЦЬ ПАТРЭБУ Ў АСАБЛІВЫХ УМОВАХ ВЫХАВАННЯ
ГЛАВА 62. СІСТЭМА ПРАЦЫ ПА ПАДТРЫМЦЫ ДЗЯЦЕЙ, ЯКІЯ ДАСЯГНУЛІ ВЫСОКІХ ПАКАЗЧЫКАЎ У ВУЧЭБНАЙ І ГРАМАДСКАЙ ДЗЕЙНАСЦІ, ДЗЯЦЕЙ, ШТО МАЮЦЬ ПАТРЭБУ Ў АЗДАРАЎЛЕННІ, ДЗЯЦЕЙ, ПРЫЗНАНЫХ ДЗЕЦЬМІ, ЯКІЯ ЗНАХОДЗЯЦЦА Ў САЦЫЯЛЬНА НЕБЯСПЕЧНЫМ СТАНОВІШЧЫ, ДЗЯЦЕЙ, ПРЫЗНАНЫХ ДЗЕЦЬМІ, ШТО МАЮЦЬ ПАТРЭБУ Ў ДЗЯРЖАЎНАЙ АБАРОНЕ, І ДЗЯЦЕЙ, ШТО МАЮЦЬ ПАТРЭБУ Ў АСАБЛІВЫХ УМОВАХ ВЫХАВАННЯ
Артыкул 285. Сістэма працы па падтрымцы дзяцей, якія дасягнулі высокіх паказчыкаў у вучэбнай і грамадскай дзейнасці, дзяцей, што маюць патрэбу ў аздараўленні, дзяцей, прызнаных дзецьмі, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы, дзяцей, прызнаных дзецьмі, што маюць патрэбу ў дзяржаўнай абароне, і дзяцей, што маюць патрэбу ў асаблівых умовах выхавання
Артыкул 286. Дзяржаўная палітыка па падтрымцы дзяцей, якія дасягнулі высокіх паказчыкаў у вучэбнай і грамадскай дзейнасці, дзяцей, што маюць патрэбу ў аздараўленні, дзяцей, прызнаных дзецьмі, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы, дзяцей, прызнаных дзецьмі, што маюць патрэбу ў дзяржаўнай абароне, і дзяцей, што маюць патрэбу ў асаблівых умовах выхавання
Артыкул 287. Выяўленне і ўлік дзяцей, якія дасягнулі высокіх паказчыкаў у вучэбнай і грамадскай дзейнасці, дзяцей, прызнаных дзецьмі, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным

становішчы, дзяцей, прызнаных дзецьмі, што маюць патрэбу ў дзяржаўнай абароне, і дзяцей, што маюць патрэбу ў асаблівых умовах выхавання
Артыкул 288. Праграмы выхавання і план абароны правоў і законных інтарэсаў дзіцяці
ГЛАВА 63. УСТАНОВЫ АДУКАЦЫІ, ЯКІЯ РЭАЛІЗУЮЦЬ ПРАГРАМЫ ВЫХАВАННЯ, ПРЫМАЮЦЬ УДЗЕЛ У РЭАЛІЗАЦЫІ МЕРАПРЫЕМСТВАЎ ПА ЛІКВІДАЦЫІ ПРЫЧЫН І ЎМОЎ, ШТО ВЫКЛІКАЛІ СТВАРЭННЕ НЕСПРЫЯЛЬНАЙ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ АБСТАНОЎКІ, У РЭАЛІЗАЦЫІ ПЛАНА АБАРОНЫ ПРАВОЎ І ЗАКОННЫХ ІНТАРЭСАЎ ДЗІЦЯЦІ, ІНШЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ, ЯКІМ У АДПАВЕДНАСЦІ З ЗАКАНАДАЎСТВАМ ПРАДАСТАЎЛЕНА ПРАВА АЖЫЦЦЯЎЛЯЦЬ РЭАЛІЗАЦЫЮ ПРАГРАМЫ ВЫХАВАННЯ ДЗЯЦЕЙ, ШТО МАЮЦЬ ПАТРЭБУ Ў АЗДАРАЎЛЕННІ
Артыкул 289. Установы адукацыі, якія рэалізуюць праграмы выхавання, прымаюць удзел у рэалізацыі мерапрыемстваў па ліквідацыі прычын і ўмоў, што выклікалі стварэнне неспрыяльнай для дзяцей абстаноўкі, у рэалізацыі плана абароны правоў і законных інтарэсаў дзіцяці, іншыя арганізацыі, якім у адпаведнасці з заканадаўствам прадастаўлена права ажыццяўляць рэалізацыю праграмы выхавання дзяцей, што маюць патрэбу ў аздараўленні
Артыкул 290. Правы і абавязкі ўстаноў адукацыі, іншых арганізацый, якім у адпаведнасці з заканадаўствам прадастаўлена права ажыццяўляць рэалізацыю праграмы выхавання дзяцей, што маюць патрэбу ў аздараўленні, пры рэалізацыі праграм выхавання
Артыкул 291. Кіраванне выхаваўча-аздараўленчай установай адукацыі, сацыяльна-педагагічнай установай, спецыяльнай навучальна-выхаваўчай установай, спецыяльнай лячэбна-выхаваўчай установай
ГЛАВА 64. АДУКАЦЫЙНЫ ПРАЦЭС, НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ АДУКАЦЫІ Ў ВЫХАВАЎЧА-АЗДАРАЎЛЕНЧЫХ УСТАНОВАХ АДУКАЦЫІ, САЦЫЯЛЬНА-ПЕДАГАГІЧНЫХ УСТАНОВАХ, СПЕЦЫЯЛЬНЫХ НАВУЧАЛЬНА-ВЫХАВАЎЧЫХ УСТАНОВАХ, СПЕЦЫЯЛЬНЫХ ЛЯЧЭБНА-ВЫХАВАЎЧЫХ УСТАНОВАХ. АСОБЫ, ЯКІЯ ЗАСВОЙВАЮЦЬ ПРАГРАМЫ ВЫХАВАННЯ, АСОБЫ, У ДАЧЫНЕННІ ДА ЯКІХ РЭАЛІЗУЮЦЦА ПЛАНЫ АБАРОНЫ ПРАВОЎ І ЗАКОННЫХ ІНТАРЭСАЎ ДЗЯЦЕЙ, ІХ ПРАВЫ І АБАВЯЗКІ. ВЫХАВАЎЧЫ ПРАЦЭС. НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ ПРАГРАМ ВЫХАВАННЯ
Артыкул 292. Адукацыйны працэс у выхаваўча-аздараўленчых установах адукацыі, сацыяльна-педагагічных установах, спецыяльных навучальна-выхаваўчых установах, спецыяльных лячэбна-выхаваўчых установах
Артыкул 293. Навукова-метадычнае забеспячэнне адукацыі ў выхаваўча-аздараўленчых установах адукацыі, сацыяльна-педагагічных установах, спецыяльных навучальна-выхаваўчых установах, спецыяльных лячэбна-выхаваўчых установах
Артыкул 294. Асобы, якія засвойваюць праграмы выхавання, і асобы, у дачыненні да якіх рэалізуюцца планы абароны правоў і законных інтарэсаў дзяцей, іх правы і абавязкі
Артыкул 295. Выхаваўчы працэс
Артыкул 296. Навукова-метадычнае забеспячэнне праграм выхавання, планавальная дакументацыя па працы з дзецьмі, прызнанымі дзецьмі, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы, дзецьмі, прызнанымі дзецьмі, што маюць патрэбу ў дзяржаўнай абароне, і дзецьмі, што маюць патрэбу ў асаблівых умовах выхавання
Артыкул 297. Асаблівасці планавальнай дакументацыі праграм выхавання, планавальнай дакументацыі па працы з дзецьмі, прызнанымі дзецьмі, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы, дзецьмі, прызнанымі дзецьмі, што маюць патрэбу ў дзяржаўнай абароне, і дзецьмі, што маюць патрэбу ў асаблівых умовах выхавання

## АГУЛЬНАЯ ЧАСТКА

## РАЗДЗЕЛ I
## АСНОВЫ ПРАВАВОГА РЭГУЛЯВАННЯ Ў СФЕРЫ АДУКАЦЫІ

### ГЛАВА 1
### АСНОЎНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

**Артыкул 1. Асноўныя тэрміны, якія прымяняюцца ў гэтым Кодэксе, і іх азначэнні**

1. У гэтым Кодэксе прымяняюцца наступныя асноўныя тэрміны і іх азначэнні:

1.1. абітурыент – асоба, якая звярнулася для атрымання адукацыі ва ўстанову адукацыі, арганізацыю, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, іншую арганізацыю, да індывідуальнага прадпрымальніка, якім у адпаведнасці з заканадаўствам прадастаўлена права ажыццяўляць адукацыйную дзейнасць, у выпадку правядзення адбору асоб, найбольш падрыхтаваных для засваення зместу адукацыйных праграм;

1.2. бакалаўр – ступень, што прысвойваецца асобам, якія засвоілі змест адукацыйнай праграмы бакалаўрыяту і атрымалі агульную вышэйшую адукацыю;

1.3. выхаванне – мэтанакіраваны працэс фарміравання рознабакова развітой, маральна сталай, творчай асобы навучэнца;

1.4. выпускнік – асоба, якая атрымала адукацыю;

1.5. грант на навучанне – сродкі з рэспубліканскага бюджэту, якія штогод выдзяляюцца з мэтай засваення замежнымі грамадзянамі і асобамі без грамадзянства, якія пастаянна пражываюць за межамі Рэспублікі Беларусь, зместу адукацыйных праграм вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў дзяржаўных установах вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі;

1.6. іншая арганізацыя, якой у адпаведнасці з заканадаўствам прадастаўлена права ажыццяўляць адукацыйную дзейнасць (далей – іншая арганізацыя, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць), – юрыдычная асоба, адной з мэт дзейнасці якой з’яўляецца ажыццяўленне адукацыйнай дзейнасці ў ходзе рэалізацыі адукацыйных праграм, якія вызначаюцца гэтым Кодэксам;

1.7. індывідуальны прадпрымальнік, якому ў адпаведнасці з заканадаўствам прадастаўлена права ажыццяўляць адукацыйную дзейнасць (далей – індывідуальны прадпрымальнік, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць), – індывідуальны прадпрымальнік, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць у ходзе рэалізацыі адукацыйных праграм, якія вызначаюцца гэтым Кодэксам;

1.8. канікулы – планавыя перапынкі для адпачынку пры засваенні зместу адукацыйных праграм у вочнай форме атрымання адукацыі, акрамя ўказаных у падпункце 1.9 гэтага пункта;

1.9. канікулярныя водпускі – планавыя перапынкі для адпачынку пры засваенні зместу адукацыйных праграм прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай, вышэйшай і навукова-арыентаванай адукацыі пры падрыхтоўцы кадраў па спецыяльнасцях для Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь, транспартных войскаў, унутраных войскаў Міністэрства ўнутраных спраў, органаў дзяржаўнай бяспекі, органаў пагранічнай службы, Службы бяспекі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Аператыўна-аналітычнага цэнтра пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь (далей, калі не вызначана іншае, – воінскія фарміраванні), органаў унутраных спраў, Следчага камітэта, Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз, органаў фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю, органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях (далей, калі не вызначана іншае, – ваенізаваныя арганізацыі);

1.10. якасць адукацыі – адпаведнасць адукацыі патрабаванням адукацыйнага стандарту, вучэбна-праграмнай дакументацыі адпаведнай адукацыйнай праграмы, іншым патрабаванням, прадугледжаным гэтым Кодэксам і іншымі актамі заканадаўства;

1.11. кампетэнцыі – здольнасці ажыццяўляць дзейнасць у адпаведнасці з атрыманай адукацыяй, якія набываюцца ў працэсе навучання і выхавання;

1.12. канфлікт інтарэсаў педагагічнага работніка – сітуацыя, пры якой у педагагічнага работніка пры ажыццяўленні ім педагагічнай дзейнасці ўзнікае зацікаўленасць у атрыманні маёмасці або іншай выгады і якая ўплывае або можа паўплываць на належнае выкананне педагагічным работнікам прафесійных абавязкаў з прычыны супярэчнасці паміж яго асабістай зацікаўленасцю і інтарэсамі навучэнцаў, законных прадстаўнікоў непаўналетніх навучэнцаў;

1.13. карэкцыйна-педагагічная дапамога – від педагагічнай дапамогі, які ўключае ў сябе педагагічныя мерапрыемствы (лагапедычныя, тыфлапедагагічныя, сурдапедагагічныя і іншыя) і садзейнічае засваенню зместу адукацыйных праграм асноўнай адукацыі на ўзроўнях дашкольнай, агульнай сярэдняй, прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі, спецыяльнай адукацыі асобамі з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, якія маюць стойкія або часовыя цяжкасці ў яго засваенні;

1.14. карэкцыйныя заняткі – заняткі, якія накіраваны на пераадоленне, аслабленне, кампенсацыю парушэнняў у фізічным і (або) псіхічным развіцці навучэнцаў з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця і спрыяюць іх сацыяльнаму развіццю;

1.15. асоба з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця – асоба, якая мае парушэнні ў фізічным і (або) псіхічным развіцці, што абмяжоўваюць яе сацыяльную дзейнасць і патрабуюць стварэння спецыяльных умоў для атрымання адукацыі;

1.16. магістр – ступень, што прысвойваецца асобам, якія засвоілі змест адукацыйнай праграмы магістратуры або бесперапыннай адукацыйнай праграмы вышэйшай адукацыі і атрымалі адпаведна паглыбленую вышэйшую або спецыяльную вышэйшую адукацыю;

1.17. модуль – тэмы, раздзелы вучэбных прадметаў, вучэбных дысцыплін, практык, вучэбныя прадметы, вучэбныя дысцыпліны, практыкі, згрупаваныя ў блок з мэтай фарміравання ў навучэнцаў адной або некалькіх кампетэнцый;

1.18. адукацыя – навучанне і выхаванне ў інтарэсах асобы, грамадства і дзяржавы, накіраваныя на інтэлектуальнае, духоўна-маральнае, творчае, фізічнае і прафесійнае развіццё асобы, задавальненне яе адукацыйных патрэб і інтарэсаў, а таксама сукупнасць набытых ведаў, уменняў, навыкаў і кампетэнцый пэўнага аб’ёму і складанасці;

1.19. адукацыйная дзейнасць – дзейнасць па навучанні і выхаванні, якая ажыццяўляецца ўстановай адукацыі, арганізацыяй, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, іншай арганізацыяй, індывідуальным прадпрымальнікам, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, у ходзе рэалізацыі адукацыйных праграм;

1.20. адукацыйная праграма – сукупнасць дакументацыі, якая рэгламентуе адукацыйны працэс, і патрабаванняў да ўмоў, неабходных для атрымання ў адпаведнасці з чаканымі вынікамі пэўнага ўзроўню асноўнай адукацыі або пэўнага віду дадатковай адукацыі, а таксама спецыяльнай адукацыі;

1.21. адукацыйны працэс – навучанне і выхаванне, арганізаваныя ўстановай адукацыі, арганізацыяй, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, іншай арганізацыяй, індывідуальным прадпрымальнікам, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, з мэтай засваення навучэнцамі зместу адукацыйных праграм;

1.22. адукацыйны стандарт – тэхнічны нарматыўны прававы акт, які вызначае змест адукацыйнай праграмы пры дапамозе ўстанаўлення патрабаванняў да адукацыйнага працэсу і вынікаў засваення яе зместу;

1.23. навучэнец – асоба, прынятая (залічаная) для засваення зместу адукацыйнай праграмы, праходжання атэстацыі ў парадку экстэрнату;

1.24. навучанне – мэтанакіраваны працэс арганізацыі і стымулявання вучэбнай дзейнасці навучэнцаў па аваладанні імі ведамі, уменнямі, навыкамі, фарміраванні ў іх кампетэнцый, развіцці іх творчых здольнасцей;

1.25. арганізацыя – заказчык кадраў – арганізацыя, якая заявіла аб сваёй патрэбе ў кадрах шляхам заключэння дагавора аб узаемадзеянні або аднаго з відаў дагавораў у сферы адукацыі, што заключаюцца пры атрыманні адукацыі, ці шляхам падачы заяўкі на падрыхтоўку спецыялістаў, рабочых, служачых;

1.26. арганізацыя, якая ўдзельнічае ў рэалізацыі адукацыйнай праграмы праз сеткавую форму ўзаемадзеяння, – арганізацыя, якая прадастаўляе рэсурсы, неабходныя для арганізацыі адукацыйнага працэсу ў адпаведнасці з вучэбна-праграмнай дакументацыяй адукацыйнай праграмы з мэтай засваення яе зместу навучэнцамі;

1.27. падрыхтоўка кадраў па спецыяльнасцях для воінскіх фарміраванняў і ваенізаваных арганізацый, мытных органаў – падрыхтоўка кадраў з прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай, вышэйшай, навукова-арыентаванай адукацыяй для воінскіх фарміраванняў і ваенізаваных арганізацый, мытных органаў;

1.28. атрыманне адукацыі – засваенне зместу адукацыйнай праграмы навучэнцамі, якое ў выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам, пацвярджаецца дакументам аб адукацыі або дакументам аб навучанні;

1.29. атрыманне адукацыі дома – арганізацыя адукацыйнага працэсу, пры якім засваенне зместу адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі, адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі, адукацыйных праграм прафесійна-тэхнічнай, спецыяльнай адукацыі, адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, адукацыйнай праграмы прафесійнай падрыхтоўкі рабочых (служачых) навучэнцамі, якія часова або пастаянна не могуць наведваць установы адукацыі, ажыццяўляецца дома;

1.30. Рэспубліканскае інфармацыйна-адукацыйнае асяроддзе – сукупнасць дзяржаўных аўтаматызаваных інфармацыйных сістэм (рэсурсаў) у сферы адукацыі, якія забяспечваюць узаемадзеянне дзяржаўных органаў і арганізацый, устаноў адукацыі і іншых суб’ектаў адукацыйных адносін і задавальненне іх інфармацыйных патрэб;

1.31. сеткавая форма ўзаемадзеяння – форма ўзаемадзеяння паміж установай адукацыі, арганізацыяй, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, іншай арганізацыяй, індывідуальным прадпрымальнікам, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, і арганізацыяй, якая ўдзельнічае ў рэалізацыі адукацыйнай праграмы праз сеткавую форму ўзаемадзеяння, што дазваляе выкарыстоўваць рэсурсы гэтай арганізацыі, неабходныя для арганізацыі адукацыйнага працэсу ў адпаведнасці з вучэбна-праграмнай дакументацыяй адукацыйнай праграмы з мэтай засваення яе зместу навучэнцамі;

1.32. спецыяліст – асоба, якая атрымала навукова-арыентаваную, вышэйшую або сярэднюю спецыяльную адукацыю, акрамя асобы, якой прысвоена кваліфікацыя рабочага з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй;

1.33. спецыяльныя ўмовы – арганізацыя педагагічнай, медыцынскай, сацыяльнай, псіхалагічнай і іншых відаў дапамогі, без якіх немагчыма або ўскладнена засваенне зместу адукацыйных праграм асноўнай, дадатковай і спецыяльнай адукацыі асобамі з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, у тым ліку выкарыстанне тэхнічных сродкаў сацыяльнай рэабілітацыі, спецыяльных вучэбных выданняў, спецыяльных метадаў навучання і выхавання, інфармацыйных тэхналогій, адаптацыя матэрыяльных аб’ектаў;

1.34. ступень адукацыі – завершаны этап навучання і выхавання на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі, які забяспечвае працяг атрымання адукацыі на больш высокай ступені гэтага ўзроўню адукацыі або сведчыць аб атрыманні агульнай сярэдняй адукацыі;

1.35. узровень асноўнай адукацыі – завершаны этап засваення зместу адной або некалькіх адукацыйных праграм асноўнай адукацыі, які забяспечвае працяг атрымання адукацыі на больш высокім узроўні адукацыі і (або) занятак прафесійнай дзейнасцю;

1.36. удзельнікі адукацыйнага працэсу – навучэнцы, законныя прадстаўнікі непаўналетніх навучэнцаў, педагагічныя работнікі;

1.37. вучэбна-метадычнае аб’яднанне ў сферы адукацыі – дарадчы орган, які ствараецца на грамадскіх пачатках з мэтай выпрацоўкі прапаноў па пытаннях удасканалення навукова-метадычнага забеспячэння адукацыі, падрыхтоўкі спецыялістаў, рабочых, служачых;

1.38. установа адукацыі – юрыдычная асоба ў арганізацыйна-прававой форме ўстановы, асноўнай мэтай дзейнасці якой з’яўляецца ажыццяўленне адукацыйнай дзейнасці;

1.39. мэтавая падрыхтоўка спецыялістаў, рабочых, служачых – падрыхтоўка спецыялістаў з вышэйшай, сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, рабочых з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, рабочых (служачых) з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй за кошт сродкаў рэспубліканскага і (або) мясцовых бюджэтаў у дзённай форме атрымання адукацыі з мэтай задавальнення кадравых патрэб арганізацый Рэспублікі Беларусь за кошт персанальнага прыцягнення асоб з ліку грамадзян Рэспублікі Беларусь, якія пражываюць у Рэспубліцы Беларусь, замежных грамадзян і асоб без грамадзянства, якія пастаянна пражываюць у Рэспубліцы Беларусь, з’яўляюцца выпускнікамі ўстаноў адукацыі Рэспублікі Беларусь, што ажыццяўляецца ў адпаведнасці з дагаворам аб мэтавай падрыхтоўцы спецыяліста з вышэйшай адукацыяй, спецыяліста (рабочага) з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, рабочага (служачага) з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй.

2. Азначэнні іншых тэрмінаў утрымліваюцца ў асобных артыкулах гэтага Кодэкса.

**Артыкул 2. Асновы дзяржаўнай палітыкі ў сферы адукацыі**

1. Дзяржаўная палітыка ў сферы адукацыі грунтуецца на прынцыпах:

1.1. прыярытэту адукацыі;

1.2. прыярытэту агульначалавечых каштоўнасцей, правоў чалавека, гуманістычнага характару адукацыі;

1.3. гарантыі канстытуцыйнага права кожнага на адукацыю, духоўнае, маральнае і фізічнае развіццё;

1.4. інклюзіі ў адукацыі, якая забяспечвае роўны доступ да атрымання адукацыі для ўсіх навучэнцаў з улікам разнастайнасці асаблівых індывідуальных адукацыйных патрэб і індывідуальных магчымасцей кожнага навучэнца (адоранага, таленавітага, навучэнца, індывідуальныя патрэбы якога абумоўлены яго жыццёвай сітуацыяй, станам здароўя, іншымі акалічнасцямі);

1.5. абавязковасці агульнай сярэдняй адукацыі;

1.6. інтэграцыі ў сусветную адукацыйную прастору пры захаванні і развіцці традыцый нацыянальнай сістэмы адукацыі;

1.7. забеспячэння ўключэння ў змест адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі, адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі, адукацыйных праграм прафесійна-тэхнічнай адукацыі, адукацыйных праграм сярэдняй спецыяльнай адукацыі, адукацыйных праграм спецыяльнай адукацыі і адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі асноў ведаў у сферы аховы навакольнага асяроддзя і прыродакарыстання, бяспекі жыццядзейнасці;

1.8. падтрымкі і развіцця адукацыі з улікам задач устойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця дзяржавы;

1.9. дзяржаўна-грамадскага характару кіравання адукацыяй;

1.10. свецкага характару адукацыі.

2. Асноўнымі напрамкамі дзяржаўнай палітыкі ў сферы адукацыі з’яўляюцца:

2.1. забеспячэнне правоў, свабод і законных інтарэсаў грамадзян у сферы адукацыі, у тым ліку права на атрыманне адукацыі як за кошт сродкаў рэспубліканскага і (або) мясцовых бюджэтаў, так і на платнай аснове;

2.2. забеспячэнне права на адукацыю на працягу ўсяго жыцця ў адпаведнасці з патрэбамі асобы, адаптыўнасць сістэмы адукацыі да ўзроўню падрыхтоўкі, асаблівасцей развіцця, здольнасцей і інтарэсаў чалавека;

2.3. забеспячэнне даступнасці адукацыі, аб'ектаў матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстаноў адукацыі, іншых арганізацый, індывідуальных прадпрымальнікаў, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, у тым ліку асобам з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, з улікам стану здароўя навучэнцаў, іх пазнавальных магчымасцей на ўсіх узроўнях асноўнай адукацыі і пры атрыманні дадатковай адукацыі, спецыяльнай адукацыі;

2.4. стварэнне спецыяльных умоў для атрымання адукацыі асобамі з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця і аказанне гэтым асобам карэкцыйна-педагагічнай дапамогі;

2.5. стварэнне неабходных умоў для задавальнення запатрабаванняў асобы ў адукацыі, патрэб грамадства і дзяржавы ў фарміраванні асобы, падрыхтоўцы кваліфікаваных кадраў;

2.6. рэалізацыя прынцыпу інклюзіі ў адукацыі;

2.7. забеспячэнне ўдзелу дзяржаўных органаў і іншых арганізацый, у тым ліку грамадскіх аб'яднанняў, у развіцці сістэмы адукацыі;

2.8. ажыццяўленне мэтавай падрыхтоўкі спецыялістаў, рабочых, служачых;

2.9. забеспячэнне пераемнасці і бесперапыннасці ўзроўняў асноўнай адукацыі, ступеней адукацыі ў рамках агульнай сярэдняй адукацыі;

2.10. забеспячэнне роўнасці беларускай і рускай моў;

2.11. забеспячэнне дзейнасці ўстаноў адукацыі па ажыццяўленні выхавання, у тым ліку па фарміраванні ў навучэнцаў грамадзянскасці, патрыятызму, духоўна-маральных каштоўнасцей, здаровага ладу жыцця, адказнасці, працавітасці.

3. Ва ўстановах адукацыі не дапускаюцца стварэнне і дзейнасць палітычных партый, а таксама стварэнне, ананімная або іншая супярэчная заканадаўству дзейнасць рэлігійных арганізацый.

4. Установы адукацыі ў пытаннях выхавання на падставе пісьмовых заяў навучэнцаў, законных прадстаўнікоў непаўналетніх навучэнцаў у невучэбны час могуць узаемадзейнічаць з зарэгістраванымі рэлігійнымі арганізацыямі з улікам іх уплыву на фарміраванне духоўных, культурных і дзяржаўных традыцый беларускага народа. Парадак, умовы, змест і формы такога ўзаемадзеяння вызначаюцца Урадам Рэспублікі Беларусь па ўзгадненні з Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

5. Арганізацыйнай асновай ажыццяўлення дзяржаўнай палітыкі ў сферы адукацыі з'яўляецца дзяржаўная праграма развіцця сістэмы адукацыі, якая зацвярджаецца Урадам Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з актамі заканадаўства.

### Артыкул 3. Дзяржаўныя гарантыі правоў у сферы адукацыі

1. Кожны грамадзянін Рэспублікі Беларусь мае права на адукацыю.

2. Грамадзяне Рэспублікі Беларусь незалежна ад полу, расы, узросту, нацыянальнасці, мовы, паходжання, маёмаснага, сацыяльнага і службовага становішча, месца жыхарства, адносін да рэлігіі, перакананняў, прыналежнасці да грамадскіх аб'яднанняў, а таксама ад іншых акалічнасцей маюць права на атрыманне ў дзяржаўных установах адукацыі, дзяржаўных арганізацыях, што рэалізуюць адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, бясплатнай дашкольнай, агульнай сярэдняй, прафесійна-тэхнічнай, спецыяльнай адукацыі, дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі (акрамя дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, якая атрымліваецца ў дзяржаўных дзіцячых школах мастацтваў), дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі, дадатковай адукацыі дарослых, якая атрымліваецца пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, адукацыйнай праграмы павышэння кваліфікацыі рабочых (служачых), адукацыйнай праграмы перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць вышэйшую адукацыю, адукацыйнай праграмы перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць сярэднюю спецыяльную адукацыю, адукацыйнай

праграмы перападрыхтоўкі рабочых (служачых), адукацыйнай праграмы прафесійнай падрыхтоўкі рабочых (служачых), адукацыйнай праграмы стажыроўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, адукацыйнай праграмы спецыяльнай падрыхтоўкі, неабходнай для займання асобных пасад служачых, а таксама пры засваенні іншых адукацыйных праграм, калі гэта прадугледжана заканадаўчымі актамі, а на конкурснай аснове – бясплатнай сярэдняй спецыяльнай, вышэйшай, навукова-арыентаванай адукацыі, калі адпаведную адукацыю за кошт сродкаў рэспубліканскага і (або) мясцовых бюджэтаў яны атрымліваюць упершыню.

Катэгорыі асоб, якія атрымалі сярэднюю спецыяльную, вышэйшую адукацыю за кошт сродкаў рэспубліканскага і (або) мясцовых бюджэтаў і маюць права на атрыманне другой і наступнай адпаведна сярэдняй спецыяльнай, вышэйшай адукацыі за кошт сродкаў рэспубліканскага і (або) мясцовых бюджэтаў, вызначаюцца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

Асобы, якія атрымлівалі навукова-арыентаваную адукацыю, з якімі адукацыйныя адносіны спынены на падставах, устаноўленых Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, не маюць права на паступленне ва ўстановы адукацыі і арганізацыі, што рэалізуюць адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, для атрымання навукова-арыентаванай адукацыі за кошт сродкаў рэспубліканскага і (або) мясцовых бюджэтаў.

Асобы, якія атрымалі першую вышэйшую, навукова-арыентаваную адукацыю за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту, могуць накіроўвацца ў замежныя арганізацыі для атрымання вышэйшай, навукова-арыентаванай адукацыі за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту па спецыяльнасцях, неабходных для Рэспублікі Беларусь, падрыхтоўка па якіх у Рэспубліцы Беларусь не ажыццяўляецца.

Грамадзяне па іх жаданні, а непаўналетнія грамадзяне таксама са згоды аднаго з іх законных прадстаўнікоў могуць атрымаць адпаведную адукацыю на платнай аснове ў дзяржаўных установах адукацыі, дзяржаўных арганізацыях, што рэалізуюць адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, калі ў іх ажыццяўляецца рэалізацыя адукацыйных праграм на платнай аснове.

3. Другая і наступная прафесійна-тэхнічная, сярэдняя спецыяльная, вышэйшая, навукова-арыентаваная адукацыя, дадатковая адукацыя дарослых, якая атрымліваецца пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць вышэйшую адукацыю, адукацыйнай праграмы перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць сярэднюю спецыяльную адукацыю, адукацыйнай праграмы перападрыхтоўкі рабочых (служачых), могуць быць атрыманы пры ўмове навучання па іншай спецыяльнасці, прафесіі рабочага, пасадзе служачага.

4. Асобам з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця пры атрыманні адукацыі аказваецца карэкцыйна-педагагічная дапамога і ствараюцца спецыяльныя ўмовы для атрымання адукацыі з улікам асаблівасцей іх псіхафізічнага развіцця.

5. Замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства, якія пастаянна пражываюць у Рэспубліцы Беларусь, замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства, якія самі або іх сваякі па прамой узыходзячай лініі нарадзіліся або пражывалі на тэрыторыі сучаснай Рэспублікі Беларусь, што пастаянна пражываюць на тэрыторыі замежных дзяржаў, а таксама замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства, якім прадастаўлены статус бежанца або прытулак у Рэспубліцы Беларусь, маюць роўнае з грамадзянамі Рэспублікі Беларусь права на адукацыю, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўчымі актамі, міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь. Непаўналетнія замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства, якія часова пражываюць у Рэспубліцы Беларусь, а таксама непаўналетнія замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства, якім прадастаўлены статус бежанца, дадатковая абарона або прытулак у Рэспубліцы Беларусь або якія хадайнічаюць аб прадастаўленні статусу бежанца, дадатковай абароны або прытулку ў Рэспубліцы Беларусь, маюць права на дашкольную, агульную сярэднюю і спецыяльную адукацыю нароўні з непаўналетнімі грамадзянамі Рэспублікі Беларусь.

6. Для атрымання адукацыі па спецыяльнасцях для воінскіх фарміраванняў і ваенізаваных арганізацый, мытных органаў прымаюцца толькі грамадзяне Рэспублікі Беларусь, калі іншае не ўстаноўлена міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь.

Падрыхтоўка кадраў па спецыяльнасцях для воінскіх фарміраванняў і ваенізаваных арганізацый, мытных органаў фінансуецца за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту.

7. Права грамадзян Рэспублікі Беларусь на адукацыю забяспечваецца:

7.1. развіццём сеткі ўстаноў адукацыі;

7.2. стварэннем сацыяльна-эканамічных умоў для атрымання адукацыі ў дзяржаўных установах адукацыі, дзяржаўных арганізацыях, што рэалізуюць адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, у тым ліку бясплатнай;

7.3. фінансаваннем за кошт сродкаў рэспубліканскага і (або) мясцовых бюджэтаў функцыянавання дзяржаўных устаноў адукацыі, дзяржаўных арганізацый, што рэалізуюць адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, дзяржаўных арганізацый адукацыі, якія забяспечваюць функцыянаванне сістэмы адукацыі;

7.4. наяўнасцю ў дзяржаўных установах адукацыі, дзяржаўных арганізацыях, што рэалізуюць адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, месцаў, прызначаных для атрымання грамадзянамі адукацыі, фінансаванне якой ажыццяўляецца за кошт сродкаў рэспубліканскага і (або) мясцовых бюджэтаў;

7.5. устанаўленнем штогод кантрольных лічбаў прыёму для атрымання адукацыі за кошт сродкаў рэспубліканскага і (або) мясцовых бюджэтаў;

7.6. стварэннем умоў для атрымання адукацыі з улікам нацыянальных традыцый, а таксама індывідуальных патрэб, здольнасцей і запатрабаванняў навучэнцаў;

7.7. прадастаўленнем магчымасці выбару ўстановы адукацыі, спецыяльнасці, формы атрымання адукацыі, узроўню вывучэння вучэбных прадметаў, вучэбных дысцыплін, адукацыйных галін, тэм;

7.8. стварэннем неабходнай колькасці месцаў у арганізацыях для праходжання практыкі, вытворчага навучання навучэнцаў;

7.9. стварэннем асобам з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця спецыяльных умоў для атрымання адукацыі, якія забяспечваюць іх сацыяльную інтэграцыю;

7.10. развіццём сістэмы крэдытавання грамадзян, якія атрымліваюць адукацыю на платнай аснове.

**Артыкул 4. Адносіны, якія рэгулююцца гэтым Кодэксам**

1. Гэтым Кодэксам рэгулююцца грамадскія адносіны ў сферы адукацыі, якія ўключаюць у сябе:

1.1. грамадскія адносіны па рэалізацыі права грамадзян на адукацыю, мэтай якіх з’яўляецца засваенне навучэнцамі зместу адукацыйных праграм (адукацыйныя адносіны);

1.2. грамадскія адносіны, звязаныя з адукацыйнымі адносінамі, мэтай якіх з’яўляецца стварэнне ўмоў для рэалізацыі права грамадзян на адукацыю, а таксама звязаныя з працаўладкаваннем пры размеркаванні, у лік броні, пры пераразмеркаванні, накіраванні на працу, перанакіраванні на працу выпускнікоў, пераразмеркаванні і перанакіраванні на працу маладых спецыялістаў, маладых рабочых (служачых).

2. Да грамадскіх адносін у сферы адукацыі ў частцы, не ўрэгуляванай гэтым Кодэксам, прымяняецца грамадзянскае і іншае заканадаўства.

**Артыкул 5. Суб’екты адукацыйных адносін, суб’екты грамадскіх адносін, звязаных з адукацыйнымі адносінамі**

1. Суб’ектамі адукацыйных адносін з’яўляюцца ўдзельнікі адукацыйнага працэсу, установы адукацыі, арганізацыі, што рэалізуюць адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, арганізацыі, якія ўдзельнічаюць у рэалізацыі адукацыйных праграм

праз сеткавую форму ўзаемадзеяння, а таксама іншыя арганізацыі, індывідуальныя прадпрымальнікі, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць.

2. Суб'ектамі грамадскіх адносін, звязаных з адукацыйнымі адносінамі, з'яўляюцца абітурыенты, выпускнікі, законныя прадстаўнікі непаўналетніх абітурыентаў, выпускнікоў, маладыя спецыялісты, маладыя рабочыя (служачыя), дзяржаўныя арганізацыі адукацыі, якія забяспечваюць функцыянаванне сістэмы адукацыі, установы адукацыі, арганізацыі, што рэалізуюць адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, іншыя арганізацыі, індывідуальныя прадпрымальнікі, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, арганізацыі – заказчыкі кадраў і іншыя арганізацыі і індывідуальныя прадпрымальнікі, якія ўдзельнічаюць у грамадскіх адносінах, звязаных з адукацыйнымі адносінамі.

## ГЛАВА 2
## ПРАВАВОЕ РЭГУЛЯВАННЕ АДНОСІН У СФЕРЫ АДУКАЦЫІ

### Артыкул 6. Прававое рэгуляванне адносін у сферы адукацыі

1. Грамадскія адносіны ў сферы адукацыі рэгулююцца заканадаўствам аб адукацыі, а таксама міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь і іншымі міжнародна-прававымі актамі, якія ўтрымліваюць абавязацельствы Рэспублікі Беларусь.

Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь могуць устанаўлівацца асаблівасці прававога рэгулявання адносін, рэгламентаваных гэтым Кодэксам.

2. Калі міжнародным дагаворам Рэспублікі Беларусь установлены іншыя правілы, чым тыя, якія ўтрымліваюцца ў гэтым Кодэксе, то прымяняюцца правілы міжнароднага дагавора.

### Артыкул 7. Мэты і прынцыпы заканадаўства аб адукацыі

1. Мэтамі заканадаўства аб адукацыі з'яўляюцца забеспячэнне рэалізацыі канстытуцыйнага права грамадзян на адукацыю і рэгуляванне грамадскіх адносін у сферы адукацыі.

2. Заканадаўства аб адукацыі грунтуецца на наступных прынцыпах:

2.1. адпаведнасць Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь;

2.2. адпаведнасць агульнапрызнаным прынцыпам міжнароднага права;

2.3. забеспячэнне рэалізацыі права грамадзян на адукацыю;

2.4. забеспячэнне даступнасці адукацыі;

2.5. забеспячэнне якасці адукацыі;

2.6. устанаўленне адказнасці за невыкананне заканадаўства аб адукацыі.

### Артыкул 8. Дзеянне заканадаўства аб адукацыі ў часе, у прасторы і па коле асоб

1. Акты заканадаўства аб адукацыі, калі іншае не ўстаноўлена Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь і прынятымі ў адпаведнасці з ёй іншымі заканадаўчымі актамі, не маюць зваротнай сілы і прымяняюцца да адносін, якія ўзніклі:

1.1. пасля ўвядзення іх у дзеянне;

1.2. да ўвядзення іх у дзеянне ў частцы правоў і абавязкаў, узніклых пасля ўвядзення іх у дзеянне.

2. Гэты Кодэкс, іншыя нарматыўныя прававыя акты, якія рэгулююць грамадскія адносіны ў сферы адукацыі, маюць абавязковую сілу на ўсёй тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, калі дзеянне нарматыўных прававых актаў у прасторы не абмежавана гэтымі нарматыўнымі прававымі актамі, нарматыўныя прававыя акты мясцовых Саветаў дэпутатаў, выканаўчых і распарадчых органаў – на адпаведнай тэрыторыі.

3. Дзеянне актаў заканадаўства аб адукацыі распаўсюджваецца на грамадзян, юрыдычныя асобы і іншыя арганізацыі Рэспублікі Беларусь, замежныя юрыдычныя асобы і іншыя замежныя арганізацыі, на якія распаўсюджваецца права Рэспублікі Беларусь, дыпламатычныя прадстаўніцтвы і консульскія ўстановы замежных дзяржаў, размешчаныя на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, а таксама на прадстаўніцтвы і органы міжнародных арганізацый і міждзяржаўных утварэнняў, акрэдытаваныя ў Рэспубліцы Беларусь, калі іншае не прадугледжана гэтымі актамі, міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь і іншымі міжнародна-прававымі актамі, якія ўтрымліваюць абавязацельствы Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 9. Прымяненне заканадаўства аб адукацыі па аналогіі**

1. У выпадках, калі грамадскія адносіны ў сферы адукацыі непасрэдна не ўрэгуляваны актамі заканадаўства аб адукацыі, да такіх адносін прымяняецца норма заканадаўства, якая рэгулюе падобныя грамадскія адносіны (аналогія закона).

2. Пры немагчымасці выкарыстання аналогіі закона правы і абавязкі бакоў у сферы адукацыі вызначаюцца зыходзячы з агульных пачаткаў, сэнсу заканадаўства, прынцыпаў заканадаўства аб адукацыі, міжгаліновых і агульнаправавых прынцыпаў (аналогія права).

3. Не дапускаецца прымяненне па аналогіі нормаў, якія абмяжоўваюць правы, устанаўліваюць абавязкі і адказнасць у сферы адукацыі.

## ГЛАВА 3
## СІСТЭМА АДУКАЦЫІ

**Артыкул 10. Сістэма адукацыі**

1. Сістэма адукацыі – сукупнасць кампанентаў, якія ўзаемадзейнічаюць і накіраваны на дасягненне мэт адукацыі.

2. Мэтамі адукацыі з'яўляюцца фарміраванне грамадзянскасці і патрыятызму, інтэлектуальнае, духоўна-маральнае, творчае, фізічнае і прафесійнае развіццё асобы навучэнца, фарміраванне ў яго ведаў, уменняў, навыкаў і кампетэнцый.

3. Кампанентамі сістэмы адукацыі з'яўляюцца:

3.1. удзельнікі адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адукацыйных праграм;

3.2. адукацыйныя праграмы;

3.3. установы адукацыі;

3.4. арганізацыі, што рэалізуюць адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі;

3.5. іншыя арганізацыі, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць;

3.6. індывідуальныя прадпрымальнікі, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць;

3.7. дзяржаўныя арганізацыі адукацыі, якія забяспечваюць функцыянаванне сістэмы адукацыі;

3.8. вучэбна-метадычныя аб'яднанні ў сферы адукацыі;

3.9. арганізацыі, якія забяспечваюць правядзенне практычных заняткаў, праходжанне практыкі, вытворчага навучання навучэнцамі;

3.10. арганізацыі, якія ўдзельнічаюць у рэалізацыі адукацыйных праграм праз сеткавую форму ўзаемадзеяння;

3.11. арганізацыі – заказчыкі кадраў;

3.12. арганізацыі, якія накіроўваюць работнікаў для засваення зместу адукацыйных праграм дадатковай адукацыі дарослых;

3.13. дзяржаўныя органы, падпарадкаваныя і (або) падсправаздачныя Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь, Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, рэспубліканскія органы дзяржаўнага кіравання, іншыя арганізацыі, падпарадкаваныя Ураду Рэспублікі Беларусь,

мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы, іншыя арганізацыі ў межах іх паўнамоцтваў у сферы адукацыі.

4. Адукацыя падзяляецца на асноўную, дадатковую і спецыяльную.

5. Сістэма адукацыі ўключае ў сябе сістэму дашкольнай адукацыі, сістэму агульнай сярэдняй адукацыі, сістэму прафесійна-тэхнічнай адукацыі, сістэму сярэдняй спецыяльнай адукацыі, сістэму вышэйшай адукацыі, сістэму навукова-арыентаванай адукацыі, сістэму дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, сістэму дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі, сістэму дадатковай адукацыі дарослых, сістэму спецыяльнай адукацыі.

**Артыкул 11. Асноўная адукацыя**

1. Асноўная адукацыя – навучанне і выхаванне навучэнцаў пры дапамозе рэалізацыі адукацыйных праграм асноўнай адукацыі.

2. Асноўная адукацыя ў Рэспубліцы Беларусь уключае ў сябе наступныя ўзроўні:

2.1. дашкольная адукацыя;

2.2. агульная сярэдняя адукацыя;

2.3. прафесійна-тэхнічная адукацыя;

2.4. сярэдняя спецыяльная адукацыя;

2.5. вышэйшая адукацыя;

2.6. навукова-арыентаваная адукацыя.

3. Адзінства і бесперапыннасць асноўнай адукацыі забяспечваюцца пераемнасцю яе ўзроўняў і ўзгодненасцю зместу адукацыйных праграм асноўнай адукацыі.

**Артыкул 12. Дадатковая адукацыя**

1. Дадатковая адукацыя – навучанне і выхаванне навучэнцаў пры дапамозе рэалізацыі адукацыйных праграм дадатковай адукацыі.

2. Дадатковая адукацыя падзяляецца на наступныя віды:

2.1. дадатковая адукацыя дзяцей і моладзі;

2.2. дадатковая адукацыя адораных дзяцей і моладзі;

2.3. дадатковая адукацыя дарослых.

**Артыкул 13. Спецыяльная адукацыя**

1. Спецыяльная адукацыя – навучанне і выхаванне навучэнцаў, якія з’яўляюцца асобамі з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, пры дапамозе рэалізацыі адукацыйных праграм спецыяльнай адукацыі на ўзроўнях дашкольнай, агульнай сярэдняй адукацыі.

Адукацыйныя праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўнях дашкольнай, агульнай сярэдняй адукацыі распрацоўваюцца на аснове адукацыйнай праграмы дашкольнай і адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі з улікам асаблівасцей псіхафізічнага развіцця навучэнцаў, іх індывідуальных магчымасцей і пры неабходнасці забяспечваюць карэкцыю парушэнняў развіцця, сацыяльнае развіццё і інтэграцыю ў грамадства асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця.

2. Асобам з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, якія засвоілі змест адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі і паспяхова прайшлі выніковую атэстацыю па завяршэнні навучання і выхавання на II або III ступені агульнай сярэдняй адукацыі, выдаюцца адпаведна пасведчанне аб агульнай базавай адукацыі або атэстат аб агульнай сярэдняй адукацыі. Такія асобы лічацца асобамі, якія атрымалі адпаведна агульную базавую адукацыю або агульную сярэднюю адукацыю.

3. Асобе з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, якая засвоіла змест адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі, якой выдадзены пасведчанне аб агульнай базавай адукацыі або атэстат аб агульнай сярэдняй адукацыі, установай адукацыі таксама выдаецца даведка аб засваенні зместу адукацыйнай праграмы

спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі па форме, устаноўленай Міністэрствам адукацыі.

4. Асобе з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, якая засвоіла змест адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю і паспяхова прайшла выніковую атэстацыю, калі іншае не ўстаноўлена гэтым Кодэксам, выдаецца пасведчанне аб спецыяльнай адукацыі.

5. Асоба з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця можа рэалізаваць свае права на атрыманне спецыяльнай адукацыі пры наяўнасці заключэння дзяржаўнага цэнтра карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі.

**Артыкул 14. Атрыманне асноўнай і дадатковай адукацыі навучэнцамі з асаблівымі індывідуальнымі адукацыйнымі патрэбамі**

1. У Рэспубліцы Беларусь ажыццяўляецца падтрымка адораных і таленавітых навучэнцаў, асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, дзяцей, што маюць патрэбу ў асаблівых умовах выхавання, і аказваецца садзейнічанне ў атрыманні такімі асобамі асноўнай і дадатковай адукацыі, а таксама ствараюцца ўмовы для атрымання дашкольнай і агульнай сярэдняй адукацыі дома, прадастаўляецца магчымасць атрымання агульнай сярэдняй і прафесійна-тэхнічнай адукацыі асобам, якія ўтрымліваюцца ў папраўчых установах крымінальна-выканаўчай сістэмы Міністэрства ўнутраных спраў, лячэбна-працоўных прафілакторыях Міністэрства ўнутраных спраў, якія навучаюцца ў спецыяльных навучальна-выхаваўчых установах, спецыяльных лячэбна-выхаваўчых установах.

2. З мэтай выяўлення і падтрымкі адораных і таленавітых навучэнцаў арганізуюцца і праводзяцца алімпіяды, конкурсы, турніры, фестывалі і іншыя адукацыйныя мерапрыемствы, спартыўныя спаборніцтвы, фізкультурна-аздараўленчыя, спартыўна-масавыя мерапрыемствы, накіраваныя на выяўленне і развіццё ў навучэнцаў інтэлектуальных і творчых здольнасцей, здольнасцей да заняткаў фізічнай культурай і спортам, інтарэсу да навуковай (навукова-даследчай) дзейнасці, творчай дзейнасці, на прапаганду навуковых ведаў, творчых дасягненняў, фізічнай культуры і спорту.

Для аказання садзейнічання ў атрыманні адоранымі і таленавітымі навучэнцамі асноўнай і дадатковай адукацыі, задавальнення іх асаблівых індывідуальных адукацыйных патрэб ствараюцца розныя віды ўстаноў адукацыі, умовы для арганізацыі вучэбна-трэніровачнага працэсу з мэтай падрыхтоўкі спартыўнага рэзерву і (або) спартсменаў высокага класа, арганізуюцца дадаткова да вучэбных заняткаў заняткі, накіраваныя на інтэлектуальнае, духоўнае і фізічнае развіццё, развіццё творчых здольнасцей навучэнцаў, устанаўліваюцца льготы пры прыёме для атрымання асноўнай адукацыі.

3. Пры атрыманні асноўнай і дадатковай адукацыі забяспечваецца ўключэнне асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця ў сумесны адукацыйны працэс з іншымі навучэнцамі пры дапамозе стварэння спецыяльных умоў з улікам асаблівасцей іх псіхафізічнага развіцця, стану здароўя і пазнавальных магчымасцей, аказання пры неабходнасці карэкцыйна-педагагічнай дапамогі.

У залежнасці ад ступені праяўлення парушэнняў у фізічным і (або) псіхічным развіцці навучэнцаў карэкцыйна-педагагічная дапамога можа аказвацца пры засваенні імі зместу адукацыйных праграм асноўнай адукацыі ў рамках адпаведнай адукацыйнай праграмы і (або) асобна.

Карэкцыйна-педагагічная дапамога аказваецца ў пунктах карэкцыйна-педагагічнай дапамогі, цэнтрах прафесійнай і сацыяльнай рэабілітацыі асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, дзяржаўных цэнтрах карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі. Змест карэкцыйна-педагагічнай дапамогі, парадак і ўмовы яе аказання ў пунктах карэкцыйна-педагагічнай дапамогі, цэнтрах прафесійнай і сацыяльнай рэабілітацыі асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, дзяржаўных цэнтрах карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі вызначаюцца Міністэрствам адукацыі.

Парадак вызначэння напаўняльнасці груп, класаў, вучэбных груп, аб’яднанняў па інтарэсах пры засваенні зместу адукацыйных праграм асноўнай і дадатковай адукацыі з уключэннем у адукацыйны працэс асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця вызначаецца Міністэрствам адукацыі, калі іншае не ўстаноўлена гэтым Кодэксам.

Асоба з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця можа рэалізаваць свае права на стварэнне спецыяльных умоў пры атрыманні асноўнай або дадатковай адукацыі, атрыманне карэкцыйна-педагагічнай дапамогі пры наяўнасці заключэння дзяржаўнага цэнтра карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі або даведкі аб засваенні зместу адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі.

4. Для асоб, якія ўтрымліваюцца ў папраўчых установах крымінальна-выканаўчай сістэмы Міністэрства ўнутраных спраў, лячэбна-працоўных прафілакторыях Міністэрства ўнутраных спраў, забяспечваюцца ўмовы для атрымання агульнай сярэдняй і прафесійна-тэхнічнай адукацыі шляхам стварэння дзяржаўных сярэдніх школ (філіялаў дзяржаўных сярэдніх школ), філіялаў дзяржаўных каледжаў мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі на тэрыторыі папраўчых устаноў крымінальна-выканаўчай сістэмы Міністэрства ўнутраных спраў, рэспубліканскіх унітарных вытворчых прадпрыемстваў, падпарадкаваных Дэпартаменту выканання пакаранняў Міністэрства ўнутраных спраў, лячэбна-працоўных прафілакторыяў Міністэрства ўнутраных спраў.

**Артыкул 15. Адукацыйныя праграмы**

1. Адукацыйныя праграмы падзяляюцца на адукацыйныя праграмы асноўнай адукацыі, адукацыйныя праграмы дадатковай адукацыі і адукацыйныя праграмы спецыяльнай адукацыі.

Паводле рашэння Урада Рэспублікі Беларусь або ўпаўнаважанага ім органа і ў вызначаным імі парадку могуць рэалізоўвацца эксперыментальныя адукацыйныя праграмы, міжнародныя адукацыйныя праграмы.

2. Адукацыйныя праграмы асноўнай адукацыі – адукацыйныя праграмы, рэалізацыя якіх дазваляе атрымаць дашкольную, агульную сярэднюю, прафесійна-тэхнічную, сярэднюю спецыяльную, вышэйшую, навукова-арыентаваную адукацыю.

3. Адукацыйныя праграмы дадатковай адукацыі – адукацыйныя праграмы, рэалізацыя якіх дазваляе атрымаць дадатковую адукацыю дзяцей і моладзі, дадатковую адукацыю адораных дзяцей і моладзі, дадатковую адукацыю дарослых.

4. Адукацыйныя праграмы спецыяльнай адукацыі – адукацыйныя праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўнях дашкольнай і агульнай сярэдняй адукацыі, рэалізацыя якіх дазваляе атрымаць спецыяльную адукацыю.

5. Адукацыйныя праграмы асноўнай адукацыі, акрамя адукацыйных праграм навукова-арыентаванай адукацыі, адукацыйныя праграмы спецыяльнай адукацыі, адукацыйная праграма перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць вышэйшую адукацыю, адукацыйная праграма перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць сярэднюю спецыяльную адукацыю, уключаюць у сябе змест, які вызначаецца адукацыйным стандартам і навукова-метадычным забеспячэннем адукацыі, і рэсурснае (кадравае і матэрыяльна-тэхнічнае) забеспячэнне.

6. Адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, адукацыйная праграма дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, адукацыйная праграма дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі, адукацыйныя праграмы дадатковай адукацыі дарослых, акрамя адукацыйнай праграмы перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць вышэйшую адукацыю, адукацыйнай праграмы перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць сярэднюю спецыяльную адукацыю, уключаюць у сябе змест, які вызначаецца навукова-метадычным забеспячэннем адукацыі, і рэсурснае (кадравае і матэрыяльна-тэхнічнае) забеспячэнне.

7. Адукацыйныя праграмы прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай, вышэйшай, навукова-арыентаванай адукацыі, адукацыйная праграма перападрыхтоўкі кіруючых

работнікаў і спецыялістаў, якія маюць вышэйшую адукацыю, адукацыйная праграма перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць сярэднюю спецыяльную адукацыю, рэалізуюцца па спецыяльнасцях пры ўмове адкрыцця падрыхтоўкі па іх. Адукацыйная праграма павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў рэалізуецца па профілях адукацыі, напрамках адукацыі пры ўмове адкрыцця падрыхтоўкі па іх.

Найменні і коды профіляў адукацыі, напрамкаў адукацыі, груп спецыяльнасцей, спецыяльнасцей, па якіх рэалізуюцца адукацыйныя праграмы прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай, вышэйшай адукацыі, адукацыйная праграма перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць вышэйшую адукацыю, адукацыйная праграма перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць сярэднюю спецыяльную адукацыю, адукацыйная праграма павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, кваліфікацыі, якія прысвойваюцца, вызначаюцца ў адпаведнасці з Агульнадзяржаўным класіфікатарам Рэспублікі Беларусь «Спецыяльнасці і кваліфікацыі».

Адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі рэалізуюцца па спецыяльнасцях і галінах навукі, якія адпавядаюць наменклатуры спецыяльнасцей навуковых работнікаў Рэспублікі Беларусь, што ўстанаўліваецца Вышэйшай атэстацыйнай камісіяй. Парадак адкрыцця падрыхтоўкі па спецыяльнасцях для атрымання навукова-арыентаванай адукацыі ўстанаўліваецца Урадам Рэспублікі Беларусь.

Адукацыйная праграма прафесійнай падрыхтоўкі рабочых (служачых), адукацыйная праграма перападрыхтоўкі рабочых (служачых) і адукацыйная праграма павышэння кваліфікацыі рабочых (служачых) рэалізуюцца па прафесіях рабочых, пасадах служачых, акрамя пасад кіраўнікоў і спецыялістаў, пры ўмове адкрыцця падрыхтоўкі па іх. Пералік прафесій рабочых для падрыхтоўкі па адукацыйнай праграме прафесійнай падрыхтоўкі рабочых (служачых), пералік пасад служачых, акрамя пасад кіраўнікоў і спецыялістаў, для падрыхтоўкі па адукацыйнай праграме прафесійнай падрыхтоўкі рабочых (служачых) і пералік прафесій рабочых, па якіх разрады прысвойваюцца толькі па выніках засваення зместу адукацыйнай праграмы перападрыхтоўкі рабочых (служачых), вызначаюцца Міністэрствам адукацыі і Міністэрствам працы і сацыяльнай абароны.

Парадак адкрыцця падрыхтоўкі па профілях адукацыі, напрамках адукацыі, спецыяльнасцях, прафесіях рабочых, пасадах служачых, акрамя пасад кіраўнікоў і спецыялістаў, устанаўліваецца Урадам Рэспублікі Беларусь.

8. Адукацыйная праграма дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі рэалізуецца па профілях, якія вызначаюцца гэтым Кодэксам і Палажэннем аб заснаванні дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі або яе відзе.

9. Адукацыйная праграма дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі рэалізуецца па напрамках, якія вызначаюцца ў парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам.

10. Адукацыйныя праграмы асноўнай адукацыі, акрамя адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі, адукацыйныя праграмы дадатковай адукацыі дарослых, адукацыйныя праграмы спецыяльнай адукацыі падзяляюцца на віды, якія вызначаюцца гэтым Кодэксам.

11. Пры рэалізацыі адукацыйных праграм можа прымяняцца модульны прынцып пабудовы зместу адукацыйнай праграмы ў вучэбна-праграмнай дакументацыі адукацыйнай праграмы.

12. Адукацыйныя праграмы могуць рэалізоўвацца праз сеткавую форму ўзаемадзеяння.

Рэалізацыя адукацыйнай праграмы праз сеткавую форму ўзаемадзеяння ажыццяўляецца на падставе дагавора аб сеткавай форме ўзаемадзеяння.

Парадак і ўмовы рэалізацыі адукацыйных праграм праз сеткавую форму ўзаемадзеяння, фінансавання выдаткаў арганізацый, якія ўдзельнічаюць у рэалізацыі адукацыйных праграм праз сеткавую форму ўзаемадзеяння, у выпадках,

не прадугледжаных гэтым Кодэксам, накіравання выдаткаў, звязаных з забеспячэннем навучэнцаў пры рэалізацыі адукацыйных праграм праз сеткавую форму ўзаемадзеяння, якія фінансуюцца за кошт сродкаў рэспубліканскага і (або) мясцовых бюджэтаў, іншыя аспекты рэалізацыі адукацыйных праграм праз сеткавую форму ўзаемадзеяння ўстанаўліваюцца Палажэннем аб сеткавай форме ўзаемадзеяння пры рэалізацыі адукацыйных праграм, якое зацвярджаецца Урадам Рэспублікі Беларусь.

Рэалізацыя адукацыйных праграм пры падрыхтоўцы кадраў па спецыяльнасцях для воінскіх фарміраванняў і ваенізаваных арганізацый, мытных органаў праз сеткавую форму ўзаемадзеяння ажыццяўляецца на падставе рашэння дзяржаўнага органа, падпарадкаванага і (або) падсправаздачнага Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь, рэспубліканскага органа дзяржаўнага кіравання, у падпарадкаванні якіх знаходзяцца ўстанова адукацыі, арганізацыя, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, і ў якіх ажыццяўляецца такая падрыхтоўка, а ў выпадку падрыхтоўкі спецыялістаў у інтарэсах іншага дзяржаўнага органа – у тым ліку па ўзгадненні з гэтым дзяржаўным органам.

**Артыкул 16. Формы атрымання адукацыі, прымяненне дыстанцыйных адукацыйных тэхналогій**

1. Адукацыя можа быць атрымана ў вочнай (дзённай, вячэрняй), завочнай, дыстанцыйнай формах атрымання адукацыі і ў форме саіскальніцтва.

2. Вочная форма атрымання адукацыі – навучанне і выхаванне, якія прадугледжваюць пастаянны асабісты ўдзел навучэнца ў рэгулярных вучэбных занятках, занятках і асабісты ўдзел яго ў атэстацыі, арганізаваных установай адукацыі, арганізацыяй, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, іншай арганізацыяй, індывідуальным прадпрымальнікам, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць.

Дзённая форма атрымання адукацыі – від вочнай формы атрымання адукацыі, калі атрыманне адукацыі з'яўляецца асноўным відам занятасці навучэнца.

Вячэрняя форма атрымання адукацыі – від вочнай формы атрымання адукацыі, калі атрыманне адукацыі спалучаецца, як правіла, з іншым відам занятасці навучэнца.

3. Завочная форма атрымання адукацыі – навучанне і выхаванне, якія прадугледжваюць пераважна самастойнае засваенне зместу адукацыйнай праграмы навучэнцам, які ўдзельнічае асабіста толькі ў абмежаванай колькасці вучэбных заняткаў (заняткаў) і атэстацыі, арганізаваных установай адукацыі, арганізацыяй, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, іншай арганізацыяй, індывідуальным прадпрымальнікам, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць.

4. Дыстанцыйная форма атрымання адукацыі – навучанне і выхаванне, якія прадугледжваюць пераважна самастойнае засваенне зместу адукацыйнай праграмы навучэнцам і ўзаемадзеянне навучэнца і педагагічных работнікаў на аснове выкарыстання дыстанцыйных адукацыйных тэхналогій.

Пад дыстанцыйнымі адукацыйнымі тэхналогіямі разумеюцца адукацыйныя тэхналогіі, якія рэалізуюцца ў асноўным з прымяненнем інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій пры апасродкаваным (на адлегласці) узаемадзеянні навучэнцаў і педагагічных работнікаў.

Палажэнні аб дыстанцыйнай форме атрымання адукацыі пры рэалізацыі адпаведных адукацыйных праграм зацвярджаюцца Міністэрствам адукацыі.

Парадак і ўмовы выкарыстання дыстанцыйных адукацыйных тэхналогій пры рэалізацыі адукацыйных праграм вызначаюцца Міністэрствам адукацыі.

Пры рэалізацыі адукацыйных праграм з прымяненнем дыстанцыйных адукацыйных тэхналогій месцам ажыццяўлення адукацыйнай дзейнасці з'яўляецца месца знаходжання ўстановы адукацыі, арганізацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, іншай арганізацыі, індывідуальнага прадпрымальніка, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць.

5. Саіскальніцтва – навучанне і выхаванне, якія прадугледжваюць пераважна самастойнае засваенне навучэнцам зместу адукацыйнай праграмы, яго асабісты ўдзел толькі ў атэстацыі, арганізаванай установай адукацыі, арганізацыяй, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі.

6. Пры рэалізацыі адукацыйных праграм у выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам, дапускаецца спалучэнне розных формаў атрымання адукацыі.

7. Пералік спецыяльнасцей, па якіх не дапускаецца атрыманне адукацыі ў вячэрняй, завочнай, дыстанцыйнай формах атрымання адукацыі, вызначаецца Урадам Рэспублікі Беларусь.

8. Пры рэалізацыі адукацыйных праграм у любой форме атрымання адукацыі могуць выкарыстоўвацца дыстанцыйныя адукацыйныя тэхналогіі.

**Артыкул 17. Выхаванне ў сістэме адукацыі**

1. Мэтай выхавання з’яўляецца фарміраванне рознабакова развітой, маральна сталай, творчай асобы навучэнца.

2. Задачамі выхавання з’яўляюцца:

2.1. фарміраванне грамадзянскасці, патрыятызму і нацыянальнай самасвядомасці на аснове дзяржаўнай ідэалогіі;

2.2. падрыхтоўка да самастойнага жыцця, прафесійнага самавызначэння, выбару прафесіі і працы;

2.3. фарміраванне маральнай, эстэтычнай культуры і культуры ў сферы аховы навакольнага асяроддзя і прыродакарыстання;

2.4. фарміраванне фізічнай культуры, авалоданне каштоўнасцямі і навыкамі здаровага ладу жыцця;

2.5. фарміраванне культуры сямейных адносін;

2.6. стварэнне ўмоў для сацыялізацыі, самаразвіцця і самарэалізацыі асобы навучэнца.

3. Выхаванне грунтуецца на агульначалавечых, гуманістычных каштоўнасцях, культурных і духоўных традыцыях беларускага народа, дзяржаўнай ідэалогіі, адлюстроўвае інтарэсы асобы, грамадства і дзяржавы.

4. Асноўнымі патрабаваннямі да выхавання з’яўляюцца:

4.1. адпаведнасць зместу, формаў і метадаў выхавання мэце і задачам выхавання;

4.2. сістэмнасць і адзінства педагагічных патрабаванняў;

4.3. пераемнасць, бесперапыннасць і паслядоўнасць рэалізацыі зместу выхавання з улікам узроставых і індывідуальных асаблівасцей навучэнцаў;

4.4. стварэнне ўмоў для развіцця творчых здольнасцей навучэнцаў, уключэнне іх у розныя віды сацыяльна значнай дзейнасці.

5. Асноўнымі складнікамі выхавання з’яўляюцца:

5.1. ідэалагічнае выхаванне, накіраванае на фарміраванне ў навучэнцаў ведаў асноў дзяржаўнай ідэалогіі, прывіццё падрастаючаму пакаленню агульначалавечых, гуманістычных каштоўнасцей, ідэй, перакананняў, якія адлюстроўваюць сутнасць беларускай дзяржаўнасці;

5.2. грамадзянскае і патрыятычнае выхаванне, накіраванае на фарміраванне ў навучэнцаў актыўнай грамадзянскай пазіцыі, патрыятызму, прававой, палітычнай і інфармацыйнай культуры;

5.3. духоўна-маральнае выхаванне, накіраванае на далучэнне навучэнцаў да агульначалавечых і гуманістычных каштоўнасцей, фарміраванне маральнай культуры;

5.4. эстэтычнае выхаванне, накіраванае на фарміраванне ў навучэнцаў эстэтычнага густу, развіццё пачуцця прыгожага;

5.5. выхаванне псіхалагічнай культуры, накіраванае на развіццё, самаразвіццё і самарэалізацыю асобы навучэнцаў;

5.6. выхаванне фізічнай культуры, фізічнае ўдасканаленне;

5.7. фарміраванне ў навучэнцаў навыкаў здаровага ладу жыцця, усведамлення значнасці здароўя як каштоўнасці і важнасці яго захавання;

5.8. сямейнае і гендарнае выхаванне, накіраванае на фарміраванне ў навучэнцаў адказных адносін да сям'і, шлюбу, выхавання дзяцей, усвядомленых уяўленняў аб ролі і жыццёвым прызначэнні мужчын і жанчын у адпаведнасці з традыцыйнымі каштоўнасцямі беларускага грамадства;

5.9. працоўнае і прафесійнае выхаванне, накіраванае на разуменне навучэнцамі працы як асобаснай і сацыяльнай каштоўнасці, фарміраванне гатоўнасці да ўсвядомленага прафесійнага выбару;

5.10. выхаванне, накіраванае на фарміраванне ў навучэнцаў беражлівых адносін да навакольнага асяроддзя і прыродных рэсурсаў;

5.11. выхаванне культуры бяспекі жыццядзейнасці, накіраванае на фарміраванне ў навучэнцаў бяспечных паводзін у сацыяльнай і прафесійнай дзейнасці;

5.12. выхаванне культуры быту і вольнага часу, накіраванае на фарміраванне ў навучэнцаў каштоўнасных адносін да матэрыяльнага асяроддзя, умення мэтазгодна і эфектыўна выкарыстоўваць вольны час;

5.13. полікультурнае выхаванне, накіраванае на фарміраванне ў навучэнцаў талерантных адносін да прадстаўнікоў іншых культур, нацыянальнасцей, веравызнанняў;

5.14. эканамічнае выхаванне, накіраванае на фарміраванне ў навучэнцаў эканамічнай культуры асобы.

6. Выхаванне ажыццяўляецца на вучэбных занятках, занятках і ў працэсе выхаваўчай працы ў невучэбны час.

Выхаваўчая праца ў невучэбны час – мэтанакіраваная, сістэматычная і планаваная дзейнасць педагагічных работнікаў, у тым ліку прафесарска-выкладчыцкага складу, накіраваная на фарміраванне ў навучэнцаў пачуцця патрыятызму, грамадзянскасці, павагі да памяці абаронцаў Айчыны, закона і правапарадку, чалавека працы і старэйшага пакалення, беражлівых адносін да гісторыка-культурнай спадчыны і традыцый беларускага народа, стварэнне ўмоў для самавызначэння, сацыялізацыі і самарэалізацыі асобы навучэнца на аснове сацыякультурных, духоўна-маральных каштоўнасцей і прынятых у грамадстве правіл, нормаў паводзін у інтарэсах чалавека, сям'і, грамадства і дзяржавы.

Парадак правядзення педагагічнымі работнікамі выхаваўчай працы ў невучэбны час з навучэнцамі, якія засвойваюць змест адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі, адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі, адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю, адукацыйных праграм прафесійна-тэхнічнай адукацыі, адукацыйных праграм сярэдняй спецыяльнай адукацыі, адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі, вызначаецца Міністэрствам адукацыі.

7. Мэты, задачы, змест і парадак правядзення выхаваўчай працы з навучэнцамі пры атрыманні адукацыі па спецыяльнасцях для воінскіх фарміраванняў і ваенізаваных арганізацый устанаўліваюцца актамі заканадаўства.

## РАЗДЗЕЛ II
## СУБ’ЕКТЫ АДУКАЦЫЙНЫХ АДНОСІН

### ГЛАВА 4
### УСТАНОВЫ АДУКАЦЫІ, АРГАНІЗАЦЫІ, ШТО РЭАЛІЗУЮЦЬ АДУКАЦЫЙНЫЯ ПРАГРАМЫ НАВУКОВА-АРЫЕНТАВАНАЙ АДУКАЦЫІ, ІНШЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ, ІНДЫВІДУАЛЬНЫЯ ПРАДПРЫМАЛЬНІКІ, ШТО АЖЫЦЦЯЎЛЯЮЦЬ АДУКАЦЫЙНУЮ ДЗЕЙНАСЦЬ

**Артыкул 18. Установы адукацыі**

1. Установы адукацыі падзяляюцца на наступныя тыпы:
1.1. установы дашкольнай адукацыі;
1.2. установы агульнай сярэдняй адукацыі;
1.3. установы сярэдняй спецыяльнай адукацыі;
1.4. установы вышэйшай адукацыі;
1.5. установы спецыяльнай адукацыі;
1.6. установы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі;
1.7. установы дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі;
1.8. установы дадатковай адукацыі дарослых;
1.9. выхаваўча-аздараўленчыя ўстановы адукацыі;
1.10. сацыяльна-педагагічныя ўстановы;
1.11. спецыяльныя навучальна-выхаваўчыя ўстановы;
1.12. спецыяльныя лячэбна-выхаваўчыя ўстановы.

2. Установы адукацыі адпаведнага тыпу з улікам асаблівасцей арганізацыі адукацыйнага працэсу падзяляюцца на віды, якія вызначаюцца гэтым Кодэксам.

Для рэалізацыі эксперыментальных адукацыйных праграм, міжнародных адукацыйных праграм паводле рашэння Міністэрства адукацыі могуць стварацца іншыя тыпы і віды ўстаноў адукацыі.

3. Выключаны.

4. Палажэнні аб адпаведным тыпе і (або) відзе ўстановы адукацыі, акрамя Палажэння аб су892раўскім ваенным вучылішчы, Палажэння аб кадэцкім вучылішчы, Палажэння аб вучылішча алімпійскага рэзерву, Палажэння аб дзіцячай школе мастацтваў, зацвярджаюцца Міністэрствам адукацыі, калі іншае не ўстаноўлена Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь. Палажэнне аб суворуаўскім ваенным вучылішчы і Палажэнне аб кадэцкім вучылішчы зацвярджаюцца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь. Палажэнне аб вучылішчы алімпійскага рэзерву зацвярджаецца Міністэрствам спорту і турызму. Палажэнне аб дзіцячай школе мастацтваў зацвярджаецца Міністэрствам культуры.

5. Установы адукацыі могуць рэалізоўваць адукацыйныя праграмы асноўнай адукацыі, адукацыйныя праграмы дадатковай адукацыі, адукацыйныя праграмы спецыяльнай адукацыі, праграмы выхавання. Адукацыйныя праграмы, праграмы выхавання, якія могуць рэалізоўваць установы адукацыі адпаведнага віду, устанаўліваюцца гэтым Кодэксам.

Установы адукацыі паводле рашэння Урада Рэспублікі Беларусь або ўпаўнаважанага ім органа могуць рэалізоўваць эксперыментальныя адукацыйныя праграмы, міжнародныя адукацыйныя праграмы.

6. Установы адукацыі могуць быць дзяржаўнымі і прыватнымі.

7. Установы адукацыі, якія ажыццяўляюць падрыхтоўку кадраў па спецыяльнасцях для воінскіх фарміраванняў і ваенізаваных арганізацый, мытных органаў, грамадзянскай авіяцыі, спецыялізаваныя ліцэі, сувораўскія ваенныя вучылішчы, кадэцкія вучылішчы, установы адукацыі, якія знаходзяцца на тэрыторыі папраўчых устаноў крымінальна-выканаўчай сістэмы Міністэрства ўнутраных спраў, рэспубліканскіх унітарных вытворчых прадпрыемстваў, падпарадкаваных Дэпартаменту выканання пакаранняў Міністэрства

ўнутраных спраў, лячэбна-працоўных прафілакторыяў Міністэрства ўнутраных спраў, спецыяльныя навучальна-выхаваўчыя ўстановы і спецыяльныя лячэбна-выхаваўчыя ўстановы могуць быць толькі дзяржаўнымі.

8. Тып і від установы адукацыі вызначаюцца пры яе стварэнні ў адпаведнасці з адукацыйнымі праграмамі і праграмамі выхавання, якія рэалізуюцца.

9. Філіялы, прадстаўніцтвы і іншыя адасобленыя падраздзяленні ўстановы адукацыі ствараюцца ў парадку, устаноўленым актамі заканадаўства. Тыпавое палажэнне аб філіяле, прадстаўніцтве і іншым адасобленым падраздзяленні ўстановы адукацыі зацвярджаецца Міністэрствам адукацыі.

10. Установе адукацыі ў сістэме прафесійна-тэхнічнай адукацыі можа быць прадастаўлены статус «вядучая ўстанова адукацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы прафесійна-тэхнічнай адукацыі».

Установе адукацыі ў сістэме сярэдняй спецыяльнай адукацыі можа быць прадастаўлены статус «вядучая ўстанова адукацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы сярэдняй спецыяльнай адукацыі».

Установе вышэйшай адукацыі могуць быць прадастаўлены асаблівы статус «нацыянальная ўстанова адукацыі» або статус «вядучая ўстанова вышэйшай адукацыі».

Установе адукацыі ў сістэме дадатковай адукацыі дарослых можа быць прадастаўлены статус «вядучая ўстанова адукацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы дадатковай адукацыі дарослых».

Палажэнні аб парадку прадастаўлення статусу «вядучая ўстанова адукацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы прафесійна-тэхнічнай адукацыі» і статусу «вядучая ўстанова адукацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы сярэдняй спецыяльнай адукацыі» зацвярджаюцца Міністэрствам адукацыі.

Палажэнні аб парадку прадастаўлення асаблівага статусу «нацыянальная ўстанова адукацыі», статусу «вядучая ўстанова вышэйшай адукацыі» і статусу «вядучая ўстанова адукацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы дадатковай адукацыі дарослых» зацвярджаюцца Урадам Рэспублікі Беларусь.

11. Установа адукацыі ажыццяўляе сваю дзейнасць у адпаведнасці з гэтым Кодэксам, палажэннем аб адпаведным тыпе і (або) відзе ўстановы адукацыі, іншымі актамі заканадаўства, статутам установы адукацыі.

У палажэнні аб адпаведным тыпе і (або) відзе ўстановы адукацыі могуць вызначацца:

прадмет і парадак дзейнасці ўстановы адукацыі;

задачы і функцыі ўстановы адукацыі;

правы і абавязкі ўстановы адукацыі;

пералік адукацыйных праграм, якія рэалізуюцца, і адукацыйных праграм, якія ўстанова адукацыі можа рэалізоўваць;

структурныя падраздзяленні ўстановы адукацыі, іх функцыі, умовы і парадак стварэння і дзейнасці;

віды груп – для ўстаноў адукацыі пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі, адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі, віды класаў – для ўстаноў адукацыі пры рэалізацыі адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі, адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі;

катэгорыі навучэнцаў, іх правы і абавязкі;

катэгорыі педагагічных работнікаў, іншых работнікаў установы адукацыі, іх правы і абавязкі;

парадак кіравання ўстановай адукацыі;

парадак арганізацыі адукацыйнага працэсу;

тыпавыя формы асобных дакументаў, неабходных для арганізацыі адукацыйнага працэсу ва ўстанове адукацыі, парадак іх зацвярджэння і вядзення;

крытэрыі віду ўстановы адукацыі;

парадак прыёму (залічэння) асоб ва ўстанову адукацыі для атрымання адукацыі, пералік дакументаў, якія прад'яўляюцца пры прыёме (залічэнні) ва ўстанову адукацыі, калі парадак прыёму (залічэння) і пералік дакументаў не вызначаны Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, Урадам Рэспублікі Беларусь або ўпаўнаважанымі імі органамі, гэтым Кодэксам;

іншыя палажэнні, якія вызначаюць парадак працы ўстановы адукацыі.

12. Парадак працы ўстаноў адукацыі, якія ажыццяўляюць падрыхтоўку кадраў па спецыяльнасцях для воінскіх фарміраванняў і ваенізаваных арганізацый, мытных органаў, вызначаецца дзяржаўнымі органамі, падпарадкаванымі і (або) падсправаздачнымі Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь, іншымі дзяржаўнымі органамі, у падпарадкаванні якіх знаходзяцца гэтыя ўстановы адукацыі.

**Артыкул 19. Правы і абавязкі ўстаноў адукацыі**

1. Установы адукацыі самастойныя ў ажыццяўленні адукацыйнай, навуковай, навукова-тэхнічнай дзейнасці, дзейнасці па навукова-метадычным забеспячэнні адукацыі, падборы і расстаноўцы кадраў і іншай дзейнасці ў межах, устаноўленых актамі заканадаўства.

2. Установы адукацыі ў адпаведнасці з актамі заканадаўства маюць права:

2.1. ажыццяўляць адукацыйную дзейнасць;

2.2. фарміраваць структуру і штатны расклад установы адукацыі;

2.3. перадаваць функцыі па забеспячэнні дзейнасці дзяржаўным установам, створаным выканаўчымі камітэтамі абласнога і базавага тэрытарыяльных узроўняў, для забеспячэння дзейнасці падначаленых ім бюджэтных арганізацый;

2.4. ажыццяўляць дзейнасць, якая прыносіць даходы;

2.5. удзельнічаць у навуковай, навукова-тэхнічнай, эксперыментальнай і інавацыйнай дзейнасці, дзейнасці па навукова-метадычным забеспячэнні адукацыі;

2.6. ажыццяўляць праверку сапраўднасці дакумента аб адукацыі шляхам накіравання запыту ў Міністэрства адукацыі аб пацвярджэнні факта яго выдачы ў выпадку ўзнікнення сумненняў у сапраўднасці дакумента аб адукацыі, выдадзенага ў Рэспубліцы Беларусь, пры прыёме (залічэнні) асобы для атрымання адукацыі;

2.7. уваходзіць у склад асацыяцый (саюзаў) і іншых аб'яднанняў некамерцыйных арганізацый;

2.8. ажыццяўляць міжнароднае супрацоўніцтва ў сферы адукацыі, у тым ліку знешнегандлёвую дзейнасць.

3. Установы агульнай сярэдняй адукацыі ў выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам, могуць ствараць умовы для арганізацыі вучэбна-трэніровачнага працэсу або арганізоўваць вучэбна-трэніровачны працэс з мэтай падрыхтоўкі спартыўнага рэзерву і (або) спартсменаў высокага класа. Вучэбна-трэніровачны працэс з мэтай падрыхтоўкі спартыўнага рэзерву і (або) спартсменаў высокага класа ажыццяўляецца на аснове вучэбных праграм па асобных відах спорту, якія зацвярджаюцца Міністэрствам спорту і турызму, у адпаведнасці з актамі заканадаўства.

4. Установы адукацыі абавязаны забяспечваць:

4.1. якасць адукацыі;

4.2. распрацоўку і зацвярджэнне ва ўстаноўленым парадку структурных элементаў навукова-метадычнага забеспячэння адпаведнай адукацыі, яго ўдасканаленне;

4.3. падбор, прыём на працу і расстаноўку кадраў, павышэнне іх кваліфікацыі;

4.4. выкананне санітарна-эпідэміялагічных патрабаванняў;

4.5. стварэнне бяспечных умоў пры арганізацыі адукацыйнага і выхаваўчага працэсаў;

4.6. распрацоўку і прыняцце правіл унутранага распарадку для навучэнцаў;

4.7. распрацоўку правіл унутранага распарадку ў інтэрнатах;

4.8. маральнае і матэрыяльнае стымуляванне навучэнцаў, педагагічных і іншых работнікаў установы адукацыі;

4.9. меры сацыяльнай абароны навучэнцаў;

4.10. стварэнне неабходных умоў для арганізацыі харчавання і аказання медыцынскай дапамогі, пражывання (пры неабходнасці) навучэнцаў;

4.11. удзел у фарміраванні кантрольных лічбаў прыёму;

4.12. арганізацыю размеркавання, працаўладкавання ў лік броні, пераразмеркавання, накіравання на працу, перанакіравання на працу выпускнікоў, пераразмеркавання і перанакіравання на працу маладых спецыялістаў, маладых рабочых (служачых) і кантроль за іх працаўладкаваннем;

4.13. азнаямленне асоб, законных прадстаўнікоў непаўналетніх асоб пры прыёме (залічэнні) ва ўстановы адукацыі з пасведчаннем аб дзяржаўнай рэгістрацыі, інфармацыяй аб наяўнасці ліцэнзіі на адукацыйную дзейнасць, сертыфікатамі аб дзяржаўнай акрэдытацыі, статутам, правіламі ўнутранага распарадку для навучэнцаў, правіламі ўнутранага распарадку ў інтэрнатах, іншымі лакальнымі прававымі актамі ўстаноў адукацыі, якія ўтрымліваюць правы і абавязкі навучэнцаў, а па іх патрабаванні – таксама з вучэбна-праграмнай дакументацыяй;

4.14. патранат асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця на працягу двух гадоў пасля атрымання адукацыі ў гэтых установах адукацыі ў адпаведнасці з Палажэннем аб патранаце асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, якое зацвярджаецца Міністэрствам адукацыі;

4.15. садзейнічанне ўпаўнаважаным дзяржаўным органам, іншым арганізацыям у правядзенні кантролю за забеспячэннем якасці адукацыі.

5. Іншыя правы і абавязкі ўстаноў адукацыі ўстанаўліваюцца гэтым Кодэксам, іншымі актамі заканадаўства, статутамі ўстаноў адукацыі.

**Артыкул 20. Стварэнне, рэарганізацыя і ліквідацыя ўстаноў адукацыі**

1. Стварэнне, рэарганізацыя і ліквідацыя ўстаноў адукацыі ажыццяўляюцца ў парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам і іншымі актамі заканадаўства.

2. Заснавальнікамі ўстаноў адукацыі могуць быць:

2.1. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь, Урад Рэспублікі Беларусь;

2.2. дзяржаўныя органы, падпарадкаваныя і (або) падсправаздачныя Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь, Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, рэспубліканскія органы дзяржаўнага кіравання і іншыя арганізацыі, падпарадкаваныя Ураду Рэспублікі Беларусь;

2.3. мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы;

2.4. юрыдычныя асобы і грамадзяне Рэспублікі Беларусь;

2.5. замежныя дзяржавы, замежныя арганізацыі, міжнародныя арганізацыі, міждзяржаўныя ўтварэнні, замежныя грамадзяне, асобы без грамадзянства, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўчымі актамі, міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь.

3. Поўнае найменне ўстановы адукацыі павінна ўтрымліваць словы «ўстанова адукацыі» і ўказанне на яе тып і (або) від, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўчымі актамі.

Забараняецца выкарыстанне ў найменнях юрыдычных асоб, якія не з’яўляюцца ўстановамі адукацыі, слоў «аздараўленчы лагер», «дзіцячы сад», «школа» (акрамя арганізацый фізічнай культуры і спорту), «гімназія», «ліцэй», «вучылішча», «каледж», «універсітэт», «інстытут», калі іншае не ўстаноўлена заканадаўчымі актамі.

4. Дзяржаўныя ўніверсітэты, акадэміі (кансерваторыі), інстытуты, установы адукацыі, якія ажыццяўляюць падрыхтоўку кадраў па спецыяльнасцях для воінскіх фарміраванняў і ваенізаваных арганізацый, мытных органаў, ствараюцца і рэарганізуюцца паводле рашэння Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Урада Рэспублікі Беларусь або ўпаўнаважаных імі органаў, а ліквідуюцца паводле рашэння Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Урада Рэспублікі Беларусь або ўпаўнаважаных імі органаў, суда.

5. Спецыялізаваныя ліцэі ствараюцца і рэарганізуюцца паводле рашэння Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Урада Рэспублікі Беларусь або ўпаўнаважаных імі органаў, а ліквідуюцца паводле рашэння Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Урада Рэспублікі Беларусь або ўпаўнаважаных імі органаў, суда.

6. Суворaўскія ваенныя вучылішчы ствараюцца і рэарганізуюцца паводле рашэння Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, а ліквідуюцца паводле рашэння Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, суда.

7. Кадэцкія вучылішчы ствараюцца і рэарганізуюцца паводле рашэння абласнога (Мінскага гарадскога) выканаўчага камітэта, а ліквідуюцца паводле рашэння абласнога (Мінскага гарадскога) выканаўчага камітэта, суда.

8. Установы дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі ствараюцца і рэарганізуюцца паводле рашэння Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Міністэрства адукацыі, а ліквідуюцца паводле рашэння Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Міністэрства адукацыі, суда.

9. Спецыяльныя навучальна-выхаваўчыя ўстановы, інстытуты прафесійнай адукацыі, інстытуты кантролю ведаў ствараюцца і рэарганізуюцца паводле рашэння Міністэрства адукацыі, а ліквідуюцца паводле рашэння Міністэрства адукацыі, суда.

Спецыяльныя лячэбна-выхаваўчыя ўстановы ствараюцца і рэарганізуюцца паводле рашэння Міністэрства адукацыі, абласнога (Мінскага гарадскога) выканаўчага камітэта, а ліквідуюцца паводле рашэння Міністэрства адукацыі, абласнога (Мінскага гарадскога) выканаўчага камітэта, суда.

10. Рашэнні аб змяненні віду, рэарганізацыі, ліквідацыі дзяржаўных устаноў агульнай сярэдняй адукацыі прымаюцца заснавальнікамі на падставе ацэнкі наступстваў прыняцця такіх рашэнняў з улікам колькасці асоб, якія падлягаюць навучанню і выхаванню на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі на тэрыторыі адпаведнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі, і колькасці дзяржаўных устаноў, што рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі на гэтай тэрыторыі.

11. Рашэнні аб рэарганізацыі і ліквідацыі дзяржаўных устаноў спецыяльнай адукацыі прымаюцца іх заснавальнікамі на падставе ацэнкі наступстваў прыняцця такіх рашэнняў з улікам колькасці асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, якія атрымліваюць спецыяльную адукацыю на тэрыторыі адпаведнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі, і колькасці дзяржаўных устаноў адукацыі, што рэалізуюць адукацыйныя праграмы спецыяльнай адукацыі, і ўстаноў адукацыі, якія маюць умовы для рэалізацыі адукацыйных праграм спецыяльнай адукацыі.

12. У выпадку скасавання структурнага падраздзялення, спынення дзейнасці адасобленага падраздзялення, рэарганізацыі ўстановы адукацыі пры адсутнасці магчымасці працягнуць адукацыйныя адносіны, ліквідацыі ўстановы адукацыі, прыпынення, спынення ліцэнзіі на адукацыйную дзейнасць установы адукацыі (па яе адасобленых падраздзяленнях, у дачыненні да адной або некалькіх паслуг, якія складаюць адукацыйную дзейнасць) заснавальнік або ўпаўнаважаны ім орган прымаюць меры па пераводзе навучэнцаў з іх згоды, згоды законных прадстаўнікоў непаўналетніх навучэнцаў у іншыя ўстановы адукацыі, што рэалізуюць адпаведныя адукацыйныя праграмы, у парадку, які ўстанаўліваецца Урадам Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 21. Статут установы адукацыі**

1. Установа адукацыі дзейнічае на падставе статута.

2. У статуце ўстановы адукацыі, калі іншае не вызначана Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, указваюцца:

2.1. найменне ўстановы адукацыі ў адпаведнасці з патрабаваннямі заканадаўства;

2.2. месца знаходжання ўстановы адукацыі;

2.3. тып, від установы адукацыі;

2.4. прадмет, мэты і задачы дзейнасці ўстановы адукацыі;

2.5. звесткі аб заснавальніку гэтай установы адукацыі;

2.6. мова (мовы) навучання і выхавання, пералік адукацыйных праграм, праграм выхавання, якія рэалізуюцца, формы атрымання адукацыі, профілі адукацыі, напрамкі

адукацыі, спецыяльнасці, па якіх рэалізуюцца адукацыйныя праграмы ва ўстанове адукацыі, кваліфікацыі, якія прысвойваюцца;

2.7. крыніцы і парадак фарміравання маёмасці ўстановы адукацыі;

2.8. парадак кіравання ўстановай адукацыі, структура і парадак фарміравання органаў кіравання і самакіравання;

2.9. парадак фарміравання структуры і штатнага раскладу ўстановы адукацыі;

2.10. паўнамоцтвы заснавальніка гэтай установы адукацыі;

2.11. парадак арганізацыі адукацыйнага працэсу ва ўстанове адукацыі;

2.12. звесткі аб філіялах, прадстаўніцтвах, іншых адасобленых падраздзяленнях установы адукацыі;

2.13. звесткі аб стварэнні, рэарганізацыях з указаннем даных аб праваепераемнасці, перайменаваннях гэтай установы адукацыі са спасылкамі на адпаведныя рашэнні заснавальніка і органа рэгістрацыі;

2.14. парадак рэарганізацыі і ліквідацыі ўстановы адукацыі;

2.15. парадак унясення змяненняў і (або) дапаўненняў у статут установы адукацыі;

2.16. іншыя звесткі аб гэтай установе адукацыі, прадугледжаныя актамі заканадаўства і вызначаныя заснавальнікам.

**Артыкул 22. Структура ўстаноў адукацыі**

1. Установы адукацыі могуць мець у сваёй структуры адасобленыя і (або) структурныя падраздзяленні.

Адасобленыя і (або) структурныя падраздзяленні ўстаноў адукацыі ствараюцца пры наяўнасці станоўчых санітарна-гігіенічных заключэнняў, выдадзеных па выніках дзяржаўнай санітарна-гігіенічнай экспертызы, праведзенай органамі і ўстановамі, якія ажыццяўляюць дзяржаўны санітарны нагляд, калі наяўнасць такіх заключэнняў прадугледжана актамі заканадаўства ў сферы санітарна-эпідэміялагічнага дабрабыту насельніцтва.

2. Да адасобленых падраздзяленняў устаноў адукацыі адносяцца філіялы, прадстаўніцтвы, іншыя адасобленыя падраздзяленні.

3. Да структурных падраздзяленняў устаноў адукацыі адносяцца бібліятэкі, інтэрнаты, навучальна-доследныя ўчасткі, навучальна-доследныя гаспадаркі, навучальна-доследныя лясгасы, навучальна-вытворчыя майстэрні, лабараторыі, факультэты, кафедры, філіялы кафедраў, спартыўныя клубы, студэнцкія санаторыі-прафілакторыі, цэнтры, упраўленні, часткі, аддзелы, сектары, аддзяленні, навучальныя гаспадаркі, пункты карэкцыйна-педагагічнай дапамогі, дзіцячыя сацыяльныя прытулкі, іншыя структурныя падраздзяленні.

4. Структурныя падраздзяленні паводле рашэння кіраўнікоў устаноў адукацыі могуць ствараца як адасобленыя падраздзяленні.

5. Установы адукацыі фарміруюць сваю структуру ў адпаведнасці з актамі заканадаўства, іх статутамі.

**Артыкул 23. Змяненне віду ўстановы адукацыі**

1. Від установы адукацыі можа быць зменены.

2. Рашэнне аб змяненні віду ўстановы адукацыі прымаецца заснавальнікам па ўласнай ініцыятыве або па ініцыятыве ўстановы адукацыі пры сукупнасці наступных умоў:

2.1. абгрунтаванасць неабходнасці змянення віду ўстановы адукацыі;

2.2. адпаведнасць установы адукацыі крытэрыям заяўленага віду.

**Артыкул 24. Кіраванне ўстановай адукацыі**

1. Кіраванне ўстановай адукацыі ажыццяўляецца ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам, палажэннем аб адпаведным тыпе і (або) відзе ўстановы адукацыі, іншымі актамі заканадаўства, статутам установы адукацыі і грунтуецца на спалучэнні прынцыпаў адзінаначалля і самакіравання.

2. Непасрэднае кіраўніцтва ўстановай адукацыі ажыццяўляе яе кіраўнік, які прызначаецца на пасаду і вызваляецца ад пасады ў парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам і іншымі заканадаўчымі актамі.

3. Кіраўнік установы адукацыі ў дзейнасці па кіраванні гэтай установай адукацыі ўзаемадзейнічае з органамі самакіравання ўстановы адукацыі.

4. Асноўным органам самакіравання ва ўстановах дашкольнай, агульнай сярэдняй, спецыяльнай адукацыі, дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі, выхаваўча-аздараўленчых установах адукацыі, сацыяльна-педагагічных установах, спецыяльных навучальна-выхаваўчых установах і спецыяльных лячэбна-выхаваўчых установах з'яўляецца педагагічны савет, у іншых установах адукацыі – савет. Педагагічны савет, савет узначальвае кіраўнік установы адукацыі.

5. У выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам, ва ўстанове адукацыі ствараюцца (могуць стварацца) наступныя органы самакіравання: педагагічны савет, савет, навукова-метадычны савет, метадычны савет, апекавальніцкі савет, бацькоўскі камітэт, вучнёўскі савет, студэнцкі савет, трэнерскі савет.

6. Палажэнні аб педагагічным савеце, савеце, навукова-метадычным савеце, метадычным савеце, апекавальніцкім савеце, бацькоўскім камітэце, вучнёўскім савеце, студэнцкім савеце ўстановы адукацыі зацвярджаюцца Міністэрствам адукацыі. Палажэнне аб трэнерскім савеце ўстановы адукацыі зацвярджаецца Міністэрствам спорту і турызму.

7. Паводле рашэння Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ва ўстановах вышэйшай адукацыі могуць стварацца іншыя органы самакіравання, якія ажыццяўляюць сваю дзейнасць у вызначаным ім парадку.

8. Органы самакіравання ўстановы адукацыі ствараюцца і ажыццяўляюць сваю дзейнасць у адпаведнасці з актамі заканадаўства, статутам установы адукацыі.

**Артыкул 25. Паўнамоцтвы кіраўніка ўстановы адукацыі**

1. Кіраўнік установы адукацыі:

1.1. дзейнічае ад імені ўстановы адукацыі без даверанасці і нясе адказнасць за вынікі сваёй дзейнасці;

1.2. выдае загады, заключае дагаворы, выдае даверанасці, адкрывае рахункі ў банках у межах сваіх паўнамоцтваў;

1.3. ажыццяўляе прыём і звальненне работнікаў, зацвярджае іх службовыя (рабочыя) інструкцыі.

2. Кіраўнік дзяржаўнай установы адукацыі мае права прадастаўляць навучэнцам, студэнтам у перыяд атрымання сярэдняй спецыяльнай, вышэйшай адукацыі скідкі са сфарміраванага кошту навучання на ўмовах, якія ўстанаўліваюцца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, у парадку і памерах, якія вызначаюцца Урадам Рэспублікі Беларусь, ажыццяўляць перавод навучэнцаў, студэнтаў з платнага навучання на навучанне за кошт сродкаў рэспубліканскага і (або) мясцовых бюджэтаў на ўмовах, якія ўстанаўліваюцца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, і ў парадку, які вызначаецца Урадам Рэспублікі Беларусь.

3. Кіраўнік прыватнай установы адукацыі мае права прадастаўляць навучэнцам, студэнтам у перыяд атрымання сярэдняй спецыяльнай, вышэйшай адукацыі скідкі са сфарміраванага кошту навучання.

4. Іншыя паўнамоцтвы кіраўніка ўстановы адукацыі ўстанаўліваюцца гэтым Кодэксам, іншымі актамі заканадаўства, статутам установы адукацыі.

**Артыкул 26. Арганізацыі, што рэалізуюць адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, іншыя арганізацыі, індывідуальныя прадпрымальнікі, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць**

1. Да арганізацый, што рэалізуюць адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, адносяцца арганізацыі, што ажыццяўляюць навукова-метадычнае забеспячэнне навукова-арыентаванай адукацыі, якія падпарадкаваны Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання і рэалізуюць адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, навуковыя арганізацыі, што рэалізуюць адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, а таксама арганізацыі, якія ўпаўнаважаны Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь на рэалізацыю адукацыйных праграм навукова-арыентаванай адукацыі і рэалізуюць іх.

Арганізацыі, што рэалізуюць адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, ажыццяўляюць падрыхтоўку кадраў па спецыяльнасцях для воінскіх фарміраванняў і ваенізаваных арганізацый, мытных органаў, могуць быць толькі дзяржаўнымі.

Арганізацыі, што рэалізуюць адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, ажыццяўляюць падрыхтоўку кадраў па спецыяльнасцях для воінскіх фарміраванняў і ваенізаваных арганізацый, мытных органаў, ствараюцца і рэарганізуюцца паводле рашэння Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Урада Рэспублікі Беларусь або ўпаўнаважаных імі органаў, а ліквідуюцца паводле рашэння Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Урада Рэспублікі Беларусь або ўпаўнаважаных імі органаў, суда.

2. Іншыя арганізацыі, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, могуць рэалізоўваць адукацыйную праграму дашкольнай адукацыі, адукацыйную праграму дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, адукацыйныя праграмы спецыяльнай адукацыі і (або) адукацыйныя праграмы дадатковай адукацыі дарослых, якія вызначаюцца гэтым Кодэксам.

3. Індывідуальныя прадпрымальнікі, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, могуць рэалізоўваць адукацыйную праграму дашкольнай адукацыі, адукацыйныя праграмы спецыяльнай адукацыі і (або) адукацыйныя праграмы дадатковай адукацыі дарослых, якія вызначаюцца гэтым Кодэксам.

4. Арганізацыі, што рэалізуюць адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, іншыя арганізацыі, індывідуальныя прадпрымальнікі, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць у адпаведнасці з гэтым Кодэксам, іншымі актамі заканадаўства, іх статутамі.

Іншыя арганізацыі, індывідуальныя прадпрымальнікі, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, паведамляюць мясцовым выканаўчым і распарадчым органам, якія ажыццяўляюць кантроль за забеспячэннем якасці адукацыі, па месцы іх знаходжання аб ажыццяўленні і спыненні ажыццяўлення імі адукацыйнай дзейнасці, акрамя ліцэнзаванай дзейнасці, адукацыйнай дзейнасці пры рэалізацыі адукацыйных праграм дадатковай адукацыі дарослых, указаных у падпунктах 1.2 і 1.3 пункта 1 артыкула 252 гэтага Кодэкса.

5. У выпадку скасавання структурнага падраздзялення, спынення дзейнасці адасобленага падраздзялення, рэарганізацыі арганізацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, іншай арганізацыі, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, пры адсутнасці магчымасці працягнуць адукацыйныя адносіны, ліквідацыі арганізацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, іншай арганізацыі, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, прыпынення, спынення ліцэнзіі на адукацыйную дзейнасць іншай арганізацыі, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць (па яе адасобленых падраздзяленнях, у дачыненні да адной або некалькіх паслуг, якія складаюць адукацыйную дзейнасць), заснавальнік або ўпаўнаважаны ім орган прымаюць меры па пераводзе навучэнцаў з іх згоды, згоды законных

прадстаўнікоў непаўналетніх навучэнцаў у іншыя ўстановы адукацыі, арганізацыі, што рэалізуюць адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, іншыя арганізацыі, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, рэалізуюць адпаведныя адукацыйныя праграмы, у парадку, які ўстанаўліваецца Урадам Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 27. Правы і абавязкі арганізацый, што рэалізуюць адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, іншых арганізацый, індывідуальных прадпрымальнікаў, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць**

1. Арганізацыі, што рэалізуюць адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, іншыя арганізацыі, індывідуальныя прадпрымальнікі, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, самастойныя ў ажыццяўленні адукацыйнай, навуковай, навукова-тэхнічнай дзейнасці, дзейнасці па навукова-метадычным забеспячэнні адукацыі, падборы і расстаноўцы кадраў і іншай дзейнасці ў межах, устаноўленых актамі заканадаўства.

2. Арганізацыі, што рэалізуюць адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, іншыя арганізацыі, індывідуальныя прадпрымальнікі, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, маюць права:

2.1. ажыццяўляць адукацыйную дзейнасць;

2.2. удзельнічаць у навуковай, навукова-тэхнічнай дзейнасці, дзейнасці па навукова-метадычным забеспячэнні адукацыі;

2.3. ажыццяўляць міжнароднае супрацоўніцтва ў сферах адукацыі, навуковай дзейнасці, у тым ліку знешнегандлёвую дзейнасць.

3. Арганізацыі, што рэалізуюць адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, іншыя арганізацыі, індывідуальныя прадпрымальнікі, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, абавязаны забяспечваць:

3.1. якасць адукацыі;

3.2. распрацоўку і зацвярджэнне ва ўстаноўленым парадку структурных элементаў навукова-метадычнага забеспячэння адпаведнай адукацыі, яго ўдасканаленне;

3.3. выкананне санітарна-эпідэміялагічных патрабаванняў;

3.4. стварэнне бяспечных умоў пры арганізацыі адукацыйнага і выхаваўчага працэсаў;

3.5. маральнае і матэрыяльнае стымуляванне навучэнцаў, педагагічных работнікаў;

3.6. азнаямленне асоб, законных прадстаўнікоў непаўналетніх асоб пры прыёме (залічэнні) з пасведчаннем аб дзяржаўнай рэгістрацыі, устаноўчымі дакументамі, інфармацыяй аб наяўнасці ліцэнзіі на адукацыйную дзейнасць, сертыфікатамі аб дзяржаўнай акрэдытацыі, правіламі ўнутранага распарадку для навучэнцаў, правіламі ўнутранага распарадку ў інтэрнатах, іншымі лакальнымі прававымі актамі, якія ўтрымліваюць правы і абавязкі навучэнцаў, а па іх патрабаванні – таксама з вучэбна-праграмнай дакументацыяй;

3.7. садзейнічанне ўпаўнаважаным дзяржаўным органам, іншым арганізацыям у правядзенні кантролю за забеспячэннем якасці адукацыі.

4. Іншыя правы і абавязкі арганізацый, што рэалізуюць адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, іншых арганізацый, індывідуальных прадпрымальнікаў, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, устанаўліваюцца гэтым Кодэксам, іншымі актамі заканадаўства, іх устаноўчымі дакументамі.

**Артыкул 28. Дзяржаўная акрэдытацыя ўстаноў адукацыі, іншых арганізацый, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, пацвярджэнне дзяржаўнай акрэдытацыі**

1. Дзяржаўная акрэдытацыя ўстановы адукацыі, іншай арганізацыі, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, – дзейнасць дзяржаўных органаў (арганізацый) па ўстанаўленні адпаведнасці адукацыйнай дзейнасці ўстановы адукацыі, іншай арганізацыі, што

ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, заканадаўству аб адукацыі, зместу і якасці адукацыі, якая прадастаўляецца, патрабаванням адукацыйных стандартаў, вучэбна-праграмнай дакументацыі адукацыйных праграм.

Дзяржаўнай акрэдытацыі падлягаюць установы адукацыі і іншыя арганізацыі, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць.

2. Па выніках правядзення дзяржаўнай акрэдытацыі ўстановы адукацыі, іншай арганізацыі, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, прымаецца рашэнне аб акрэдытацыі ўстановы адукацыі, іншай арганізацыі, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, або аб адмове ў акрэдытацыі ўстановы адукацыі, іншай арганізацыі, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць.

3. Пры наяўнасці рашэння аб акрэдытацыі ўстановы адукацыі, іншай арганізацыі, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, установа адукацыі, іншая арганізацыя, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, лічацца акрэдытаванымі і ім выдаюцца сертыфікаты аб дзяржаўнай акрэдытацыі.

4. Рашэннем аб акрэдытацыі ўстановы адукацыі, іншай арганізацыі, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, устанаўліваецца права ўстановы адукацыі, іншай арганізацыі, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, на выдачу выпускнікам дакументаў аб адукацыі.

5. Дзяржаўная акрэдытацыя ўстаноў адукацыі, іншых арганізацый, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, праводзіцца:

5.1. на адпаведнасць заяўленаму віду – для ўстаноў агульнай сярэдняй, сярэдняй спецыяльнай, вышэйшай адукацыі, спецыяльных навучальна-выхаваўчых устаноў, спецыяльных лячэбна-выхаваўчых устаноў, устаноў спецыяльнай адукацыі, што рэалізуюць адукацыйную праграму спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі, а таксама для ўстаноў дадатковай адукацыі дарослых, што рэалізуюць адукацыйную праграму перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць вышэйшую адукацыю, адукацыйную праграму перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць сярэднюю спецыяльную адукацыю, адукацыйную праграму павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў;

5.2. па кожнай спецыяльнасці – для спецыяльнасцей, па якіх рэалізуюцца адукацыйныя праграмы сярэдняй спецыяльнай адукацыі, адукацыйныя праграмы вышэйшай адукацыі, адукацыйная праграма перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць вышэйшую адукацыю, адукацыйная праграма перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць сярэднюю спецыяльную адукацыю;

5.3. па профілі адукацыі, напрамку адукацыі – для профіляў адукацыі, напрамкаў адукацыі, па якіх рэалізуецца адукацыйная праграма павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў у іншай арганізацыі, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць.

6. Установы адукацыі, іншыя арганізацыі, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, абавязаны пацвярджаць сваю дзяржаўную акрэдытацыю.

7. Пацвярджэнне дзяржаўнай акрэдытацыі з’яўляецца падставай для захавання за ўстановай адукацыі, іншай арганізацыяй, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, права на выдачу выпускнікам дакументаў аб адукацыі.

8. У выпадку непацвярджэння дзяржаўнай акрэдытацыі ўстанова адукацыі, іншая арганізацыя, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, пазбаўляюцца адпаведнай дзяржаўнай акрэдытацыі.

9. Палажэнне аб парадку правядзення дзяржаўнай акрэдытацыі і пацвярджэнні дзяржаўнай акрэдытацыі ўстаноў адукацыі, іншых арганізацый, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, зацвярджаецца Урадам Рэспублікі Беларусь, узоры сертыфікатаў аб дзяржаўнай акрэдытацыі ўстанаўліваюцца Урадам Рэспублікі Беларусь.

## ГЛАВА 5
## НАВУЧЭНЦЫ, ЗАКОННЫЯ ПРАДСТАЎНІКІ НЕПАЎНАЛЕТНІХ НАВУЧЭНЦАЎ. САЦЫЯЛЬНАЯ АБАРОНА НАВУЧЭНЦАЎ, ПАДТРЫМКА ВЫПУСКНІКОЎ

### Артыкул 29. Навучэнцы. Дакументы, якія пацвярджаюць статус навучэнца

1. Да навучэнцаў адносяцца:

1.1. ад'юнкт – асоба, прынятая (залічаная) для засваення зместу адукацыйнай праграмы аспірантуры (ад'юнктуры) у дзённай або завочнай форме атрымання адукацыі па спецыяльнасцях для воінскіх фарміраванняў і ваенізаваных арганізацый;

1.2. аспірант – асоба, прынятая (залічаная) для засваення зместу адукацыйнай праграмы аспірантуры (ад'юнктуры) у дзённай або завочнай форме атрымання адукацыі, акрамя асоб, аднесеных згодна з падпунктам 1.1 гэтага пункта да ад'юнктаў;

1.3. выхаванец – асоба, прынятая (залічаная) для засваення зместу адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі, адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі або адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю;

1.4. дактарант – асоба, прынятая (залічаная) для засваення зместу адукацыйнай праграмы дактарантуры ў дзённай форме атрымання адукацыі;

1.5. курсант – асоба, прынятая (залічаная) для засваення зместу аднаго з відаў адукацыйных праграм прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай адукацыі або адукацыйнай праграмы бакалаўрыяту, бесперапыннай адукацыйнай праграмы вышэйшай адукацыі ў дзённай форме атрымання адукацыі па спецыяльнасцях для воінскіх фарміраванняў і ваенізаваных арганізацый, грамадзянскай авіяцыі, акрамя асоб, аднесеных згодна з падпунктам 1.7 гэтага пункта да слухачоў;

1.6. магістрант – студэнт, прыняты (залічаны) для засваення зместу адукацыйнай праграмы магістратуры;

1.7. слухач – асоба з ліку афіцэрскага складу воінскіх фарміраванняў, прынятая (залічаная) для засваення зместу аднаго з відаў адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі, або асоба з ліку асоб начальніцкага і радавога складу ваенізаваных арганізацый, прынятая (залічаная) для засваення зместу адукацыйнай праграмы бакалаўрыяту або бесперапыннай адукацыйнай праграмы вышэйшай адукацыі ў завочнай або дыстанцыйнай форме атрымання адукацыі, адукацыйнай праграмы магістратуры па спецыяльнасцях для воінскіх фарміраванняў і ваенізаваных арганізацый, а таксама асоба з ліку кіруючых кадраў, асоб, уключаных у рэзервы кіруючых кадраў, прынятая (залічаная) для атрымання другой агульнай вышэйшай адукацыі або спецыяльнай вышэйшай адукацыі ў Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, або асоба, прынятая (залічаная) для засваення зместу аднаго з відаў адукацыйных праграм дадатковай адукацыі дарослых, акрамя адукацыйнай праграмы стажыроўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў;

1.8. саіскальнік – асоба, прынятая (залічаная) для засваення зместу аднаго з відаў адукацыйных праграм навукова-арыентаванай адукацыі ў форме саіскальніцтва;

1.9. стажор – асоба, прынятая (залічаная) для засваення зместу адукацыйнай праграмы стажыроўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў;

1.10. студэнт – асоба, прынятая (залічаная) для засваення зместу аднаго з відаў адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі, акрамя асоб, аднесеных згодна з падпунктамі 1.5 і 1.7 гэтага пункта да курсантаў і слухачоў;

1.11. навучэнец – асоба, прынятая (залічаная) для засваення зместу аднаго з відаў адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі, у тым ліку кандыдат для залічэння ў вучылішча алімпійскага рэзерву на перыяд правядзення вучэбна-трэніровачнага працэсу, адукацыйных праграм прафесійна-тэхнічнай адукацыі, акрамя асоб, аднесеных згодна з падпунктам 1.5 гэтага пункта да курсантаў, адукацыйных праграм сярэдняй спецыяльнай адукацыі, акрамя асоб, аднесеных згодна з падпунктам 1.5 гэтага пункта да курсантаў, адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, адукацыйнай праграмы

дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі, адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі, адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю;

1.12. экстэрн – асоба, прынятая (залічаная) у дзяржаўную ўстанову агульнай сярэдняй адукацыі для праходжання атэстацыі ў парадку экстэрнату.

2. Навучэнцам на перыяд засваення імі зместу адукацыйных праграм могуць выдавацца, а ў выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам, выдаюцца дакументы, якія пацвярджаюць статус навучэнца (білет навучэнца, студэнцкі білет, іншы дакумент). Дакумент, які пацвярджае статус навучэнца, можа быць шматфункцыянальным.

Рашэнне аб выдачы навучэнцам дакументаў, якія пацвярджаюць статус навучэнца, у выпадках, калі выдача такіх дакументаў не з’яўляецца абавязковай у адпаведнасці з гэтым Кодэксам, прымаецца кіраўніком установы адукацыі, арганізацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, іншай арганізацыі, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, рэалізуе адукацыйныя праграмы, па ўзгадненні з заснавальнікам або ўпаўнаважаным ім органам, а таксама індывідуальным прадпрымальнікам, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, рэалізуе адукацыйныя праграмы.

**Артыкул 30. Асноўныя правы навучэнцаў**

1. Навучэнцы, акрамя навучэнцаў, указаных у пунктах 3 і 4 гэтага артыкула, у адпаведнасці з гэтым Кодэксам і іншымі актамі заканадаўства маюць права на:

1.1. атрыманне адукацыі ў адпаведнасці з адукацыйнымі праграмамі;

1.2. адначасовае засваенне зместу некалькіх адукацыйных праграм асноўнай адукацыі ў выпадках, прадугледжаных актамі заканадаўства;

1.3. перавод у іншую ўстанову адукацыі ў парадку, які ўстанаўліваецца Урадам Рэспублікі Беларусь;

1.4. перавод для атрымання адукацыі па іншай спецыяльнасці, у тым ліку пры наяўнасці медыцынскіх проціпаказанняў да навучання па спецыяльнасці, якая атрымліваецца, кваліфікацыі, якая прысвойваецца, у іншай форме атрымання адукацыі ў парадку, які ўстанаўліваецца Урадам Рэспублікі Беларусь;

1.5. аднаўленне для працягу атрымання адукацыі ва ўстанове адукацыі, арганізацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, у выпадках і парадку, устаноўленых артыкулам 69 гэтага Кодэкса;

1.6. навучанне і выхаванне ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам у межах зместу адукацыйнай праграмы па індывідуальным вучэбным плане, індывідуальнай вучэбнай праграме ў выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам;

1.7. стварэнне спецыяльных умоў для атрымання адукацыі з улікам асаблівасцей іх псіхафізічнага развіцця;

1.8. павагу чалавечай годнасці, абарону ад усіх формаў фізічнага і псіхічнага гвалту, знявагі асобы, ахову жыцця і здароўя ў час адукацыйнага працэсу;

1.9. бясплатнае псіхолага-медыка-педагагічнае абследаванне ў дзяржаўных цэнтрах карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі;

1.10. бясплатную карэкцыю парушэнняў у фізічным і (або) псіхічным развіцці ў дзяржаўных установах адукацыі, што рэалізуюць адукацыйныя праграмы спецыяльнай адукацыі, карэкцыйна-педагагічную дапамогу ў дзяржаўных установах адукацыі, што рэалізуюць адукацыйныя праграмы асноўнай, дадатковай і спецыяльнай адукацыі;

1.11. карыстанне падручнікамі і вучэбнымі дапаможнікамі;

1.12. забеспячэнне стыпендыяй і іншымі грашовымі выплатамі;

1.13. забеспячэнне месцам для пражывання;

1.14. пакрыццё выдаткаў па найме жылога памяшкання (яго часткі) у выпадку незабеспячэння жылым памяшканнем (яго часткай) у інтэрнаце;

1.15. крэдыт на льготных умовах для аплаты першай вышэйшай адукацыі;

1.16. водпускі, канікулы, канікулярныя водпускі;

1.17. бясплатнае карыстанне бібліятэкай, фізкультурна-спартыўнымі збудаваннямі, вучэбнай, вытворчай, навуковай базай установы адукацыі, арганізацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі;

1.18. атрыманне сацыяльна-педагагічнай падтрымкі і псіхалагічнай дапамогі з боку спецыялістаў установы адукацыі;

1.19. заахвочванне за поспехі ў вучэбнай, грамадскай, навуковай, навукова-тэхнічнай, эксперыментальнай, інавацыйнай дзейнасці, удзел у фізкультурна-аздараўленчых, спартыўна-масавых, спартыўных мерапрыемствах, а таксама ў адукацыйных мерапрыемствах;

1.20. удзел у кіраванні ўстановай адукацыі;

1.21. удзел у алімпіядах, конкурсах, турнірах, фестывалях, канферэнцыях, сімпозіумах, кангрэсах, семінарах, святах і іншых адукацыйных і іншых мерапрыемствах, спартыўна-масавых мерапрыемствах, грамадскай, навуковай, навукова-тэхнічнай, эксперыментальнай, інавацыйнай, культурнай дзейнасці;

1.22. азнаямленне з пасведчаннем аб дзяржаўнай рэгістрацыі, установчым дакументам, інфармацыяй аб наяўнасці ліцэнзіі на адукацыйную дзейнасць, сертыфікатамі аб дзяржаўнай акрэдытацыі, правіламі ўнутранага распарадку для навучэнцаў, правіламі ўнутранага распарадку ў інтэрнатах, іншымі лакальнымі прававымі актамі, якія ўтрымліваюць правы і абавязкі навучэнцаў, а таксама з вучэбна-праграмнай дакументацыяй;

1.23. удзел у прафесійных саюзах, маладзёжных і іншых грамадскіх аб'яднаннях, дзейнасць якіх не супярэчыць заканадаўству;

1.24. зварот у камісію па вырашэнні канфлікту інтарэсаў педагагічнага работніка ў выпадку ўзнікнення рознагалоссяў паміж удзельнікамі адукацыйных адносін.

2. Іншыя правы навучэнцаў устанаўліваюцца гэтым Кодэксам, іншымі актамі заканадаўства, установчымі дакументамі і іншымі лакальнымі прававымі актамі ўстаноў адукацыі, арганізацый, што рэалізуюць адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, іншых арганізацый, індывідуальных прадпрымальнікаў, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, дагаворамі ў сферы адукацыі, якія заключаюцца пры атрыманні адукацыі.

3. Правы навучэнцаў, якія знаходзяцца ў спецыяльных навучальна-выхаваўчых установах, спецыяльных лячэбна-выхаваўчых установах, устанаўліваюцца гэтым Кодэксам і заканадаўствам аб прафілактыцы безнагляднасці і правапарушэнняў непаўналетніх.

4. Навучэнцы дзяржаўных устаноў адукацыі (філіялаў дзяржаўных устаноў адукацыі), якія знаходзяцца на тэрыторыі папраўчых устаноў крымінальна-выканаўчай сістэмы Міністэрства ўнутраных спраў, рэспубліканскіх унітарных вытворчых прадпрыемстваў, падпарадкаваных Дэпартаменту выканання пакаранняў Міністэрства ўнутраных спраў, лячэбна-працоўных прафілакторыяў Міністэрства ўнутраных спраў, у адпаведнасці з гэтым Кодэксам і іншымі актамі заканадаўства маюць права на:

4.1. атрыманне адукацыі ў адпаведнасці з адукацыйнымі праграмамі;

4.2. перавод для атрымання адукацыі па іншай спецыяльнасці, у тым ліку пры наяўнасці медыцынскіх процілпаказанняў да навучання па спецыяльнасці, якая атрымліваецца, кваліфікацыі, якая прысвойваецца, у іншай форме атрымання адукацыі ў парадку, які ўстанаўліваецца Урадам Рэспублікі Беларусь;

4.3. аднаўленне для працягу атрымання адукацыі ва ўстанове адукацыі ў выпадках і парадку, устаноўленых артыкулам 69 гэтага Кодэкса;

4.4. навучанне і выхаванне ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам у межах зместу адукацыйнай праграмы па індывідуальным вучэбным плане, індывідуальнай вучэбнай праграме ў выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам;

4.5. стварэнне спецыяльных умоў для атрымання адукацыі з улікам асаблівасцей іх псіхафізічнага развіцця;

4.6. павагу чалавечай годнасці, абарону ад усіх формаў фізічнага і псіхічнага гвалту, знявагі асобы, ахову жыцця і здароўя ў час адукацыйнага працэсу;

4.7. атрыманне сацыяльна-педагагічнай падтрымкі і псіхалагічнай дапамогі з боку спецыялістаў установы адукацыі;

4.8. канікулы;

4.9. бясплатнае карыстанне бібліятэкай, фізкультурна-спартыўнымі збудаваннямі, вучэбнай і вытворчай базай установы адукацыі;

4.10. карыстанне падручнікамі і вучэбнымі дапаможнікамі;

4.11. удзел у спартыўна-масавых мерапрыемствах, грамадскай, эксперыментальнай дзейнасці;

4.12. заахвочванне за поспехі ў вучэбнай, грамадскай і эксперыментальнай дзейнасці, удзел у спартыўна-масавых мерапрыемствах;

4.13. азнаямленне з пасведчаннем аб дзяржаўнай рэгістрацыі, статутам, інфармацыяй аб наяўнасці ліцэнзіі на адукацыйную дзейнасць, сертыфікатамі аб дзяржаўнай акрэдытацыі, правіламі ўнутранага распарадку для навучэнцаў, правіламі ўнутранага распарадку ў інтэрнатах, іншымі лакальнымі прававымі актамі, якія ўтрымліваюць правы і абавязкі навучэнцаў, а таксама з вучэбна-праграмнай дакументацыяй.

5. Пры падрыхтоўцы кадраў па спецыяльнасцях для воінскіх фарміраванняў і ваенізаваных арганізацый, мытных органаў у адпаведнасці з заканадаўствам аб праходжанні адпаведнай службы могуць устанаўлівацца асаблівасці правоў навучэнцаў.

### Артыкул 31. Асноўныя абавязкі навучэнцаў

1. Навучэнцы абавязаны:

1.1. добрасумленна і адказна адносіцца да засваення зместу адукацыйных праграм, праграм выхавання;

1.2. клапаціцца аб сваім здароўі, імкнуцца да маральнага, духоўнага і фізічнага развіцця і самаўдасканалення;

1.3. выконваць патрабаванні ўстаноўчых дакументаў, правіл унутранага распарадку для навучэнцаў, правіл унутранага распарадку ў інтэрнатах;

1.4. паважаць гонар і годнасць іншых удзельнікаў адукацыйнага працэсу;

1.5. не дапускаць дзеянняў, якія перашкаджаюць іншым удзельнікам адукацыйнага працэсу выконваць іх абавязкі і рэалізоўваць іх правы ў сферы адукацыі;

1.6. беражліва адносіцца да маёмасці ўстановы адукацыі, арганізацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, іншай арганізацыі, індывідуальнага прадпрымальніка, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць.

2. Іншыя абавязкі навучэнцаў устанаўліваюцца гэтым Кодэксам, іншымі актамі заканадаўства, устаноўчымі дакументамі і іншымі лакальнымі прававымі актамі ўстаноў адукацыі, арганізацый, што рэалізуюць адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, іншых арганізацый, індывідуальных прадпрымальнікаў, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, дагаворамі ў сферы адукацыі, якія заключаюцца пры атрыманні адукацыі.

3. Пры падрыхтоўцы кадраў па спецыяльнасцях для воінскіх фарміраванняў і ваенізаваных арганізацый, мытных органаў у адпаведнасці з заканадаўствам аб праходжанні адпаведнай службы могуць устанаўлівацца асаблівасці абавязкаў навучэнцаў.

### Артыкул 32. Законныя прадстаўнікі непаўналетніх навучэнцаў

1. Законнымі прадстаўнікамі непаўналетніх навучэнцаў з’яўляюцца іх бацькі, усынаўляльнікі (удачаральнікі), апекуны, апекавальнікі.

2. Законныя прадстаўнікі непаўналетніх навучэнцаў прадстаўляюць правы і законныя інтарэсы непаўналетніх навучэнцаў у грамадскіх адносінах у сферы адукацыі без спецыяльных паўнамоцтваў.

**Артыкул 33. Асноўныя правы законных прадстаўнікоў непаўналетніх навучэнцаў**

1. Законныя прадстаўнікі непаўналетніх навучэнцаў у адпаведнасці з гэтым Кодэксам і іншымі актамі заканадаўства маюць права на:

1.1. азнаямленне з пасведчаннем аб дзяржаўнай рэгістрацыі, устаноўчым дакументам, інфармацыяй аб наяўнасці ліцэнзіі на адукацыйную дзейнасць, сертыфікатамі аб дзяржаўнай акрэдытацыі, правіламі ўнутранага распарадку для навучэнцаў, правіламі ўнутранага распарадку ў інтэрнатах, іншымі лакальнымі прававымі актамі, якія ўтрымліваюць правы і абавязкі навучэнцаў, а таксама з вучэбна-праграмнай дакументацыяй;

1.2. удзел у кіраванні ўстановай адукацыі;

1.3. абарону правоў і законных інтарэсаў навучэнцаў, уключаючы зварот у камісію па вырашэнні канфлікту інтарэсаў педагагічнага работніка ў выпадку ўзнікнення рознагалоссяў паміж удзельнікамі адукацыйных адносін;

1.4. атрыманне інфармацыі аб ходзе і змесце адукацыйнага працэсу, метадах навучання і выхавання, якія выкарыстоўваюцца, выніках вучэбнай дзейнасці навучэнцаў у парадку, што вызначаецца кіраўніком установы адукацыі з удзелам органа самакіравання, у які ўваходзяць асобы з ліку законных прадстаўнікоў непаўналетніх навучэнцаў;

1.5. атрыманне інфармацыі аб усіх відах абследаванняў (медыцынскіх, псіхалагічных, педагагічных) навучэнцаў.

2. Іншыя правы законных прадстаўнікоў непаўналетніх навучэнцаў устанаўліваюцца гэтым Кодэксам, іншымі актамі заканадаўства, устаноўчымі дакументамі і іншымі лакальнымі прававымі актамі ўстаноў адукацыі, іншых арганізацый, індывідуальных прадпрымальнікаў, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць.

3. Пры падрыхтоўцы кадраў па спецыяльнасцях для воінскіх фарміраванняў і ваенізаваных арганізацый, мытных органаў у адпаведнасці з заканадаўствам аб праходжанні адпаведнай службы могуць устанаўлівацца асаблівасці рэалізацыі правоў законных прадстаўнікоў непаўналетніх навучэнцаў.

**Артыкул 34. Асноўныя абавязкі законных прадстаўнікоў непаўналетніх навучэнцаў**

1. Законныя прадстаўнікі непаўналетніх навучэнцаў абавязаны:

1.1. забяспечваць умовы для атрымання адукацыі і развіцця навучэнцаў;

1.2. паважаць гонар і годнасць іншых удзельнікаў адукацыйнага працэсу;

1.3. забяспечваць выкананне навучэнцамі, законнымі прадстаўнікамі якіх яны з’яўляюцца, патрабаванняў устаноўчых дакументаў, правіл унутранага распарадку для навучэнцаў, правіл унутранага распарадку ў інтэрнатах.

2. Іншыя абавязкі законных прадстаўнікоў непаўналетніх навучэнцаў устанаўліваюцца гэтым Кодэксам, іншымі актамі заканадаўства, устаноўчымі дакументамі і іншымі лакальнымі прававымі актамі ўстаноў адукацыі, арганізацый, што рэалізуюць адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, іншых арганізацый, індывідуальных прадпрымальнікаў, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць.

### Артыкул 35. Камісія па вырашэнні канфлікту інтарэсаў педагагічнага работніка

1. Камісія па вырашэнні канфлікту інтарэсаў педагагічнага работніка ствараецца з мэтай урэгулявання рознагалоссяў паміж удзельнікамі адукацыйных адносін у выпадку ўзнікнення канфлікту інтарэсаў педагагічнага работніка.

Камісія па вырашэнні канфлікту інтарэсаў педагагічнага работніка ствараецца ва ўстанове адукацыі, арганізацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, іншай арганізацыі, у індывідуальнага прадпрымальніка, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць.

2. Рашэнне камісіі па вырашэнні канфлікту інтарэсаў педагагічнага работніка з’яўляецца абавязковым для ўсіх удзельнікаў адукацыйных адносін ва ўстанове адукацыі, арганізацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, іншай арганізацыі, у індывідуальнага прадпрымальніка, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, і падлягае выкананню ў тэрміны, прадугледжаныя ўказаным рашэннем.

3. Рашэнне камісіі па вырашэнні канфлікту інтарэсаў педагагічнага работніка можа быць абскарджана ў вышэйстаячы орган (арганізацыю), а пры адсутнасці вышэйстаячага органа (арганізацыі) – у суд на працягу аднаго месяца пасля атрымання копіі рашэння камісіі.

Рашэнне камісіі па вырашэнні канфлікту інтарэсаў педагагічнага работніка пасля абскарджання ў вышэйстаячы орган (арганізацыю) можа быць абскарджана ў суд.

4. Парадак стварэння, арганізацыі працы, прыняцця рашэнняў камісіяй па вырашэнні канфлікту інтарэсаў педагагічнага работніка і іх выканання ўстанаўліваецца Міністэрствам адукацыі.

### Артыкул 36. Сацыяльная абарона навучэнцаў, падтрымка выпускнікоў

1. Сацыяльная абарона навучэнцаў – комплекс мер, устаноўленых дзяржавай з мэтай забеспячэння атрымання адукацыі навучэнцамі, накіраваных на іх матэрыяльнае забеспячэнне, прадастаўленне ім дзяржаўных сацыяльных ільгот, правоў і гарантый, прадугледжаных гэтым Кодэксам і іншымі актамі заканадаўства.

2. Фінансаванне выдаткаў на забеспячэнне сацыяльнай абароны навучэнцаў ажыццяўляецца за кошт сродкаў рэспубліканскага і (або) мясцовых бюджэтаў, а таксама іншых крыніц у адпаведнасці з актамі заканадаўства з улікам дзяржаўнай праграмы развіцця сістэмы адукацыі, рэгіянальных комплексаў мерапрыемстваў, якія забяспечваюць рэалізацыю дзяржаўнай праграмы развіцця сістэмы адукацыі.

3. Падтрымка выпускнікоў – прадастаўленне выпускнікам, акрамя выпускнікоў, указаных у частцы другой гэтага пункта, месца працы шляхам размеркавання, працаўладкавання ў лік броні, накіравання на працу, а таксама гарантый і кампенсацый у сувязі з размеркаваннем, працаўладкаваннем у лік броні, накіраваннем на працу, прадугледжаных артыкулам 48 гэтага Кодэкса.

Для асоб, якія атрымалі адукацыю па спецыяльнасцях для воінскіх фарміраванняў і ваенізаваных арганізацый, прадастаўленне працоўнага месца, а таксама гарантый і кампенсацый у сувязі з накіраваннем да месца службы вызначаецца заканадаўствам аб праходжанні адпаведнай службы.

### Артыкул 37. Прынцыпы сацыяльнай абароны навучэнцаў

Асноўнымі прынцыпамі сацыяльнай абароны навучэнцаў з’яўляюцца:

гарантаванасць з боку дзяржавы атрымання адукацыі, матэрыяльнага забеспячэння, дзяржаўных сацыяльных ільгот, правоў і гарантый;

адраснасць.

**Артыкул 38. Меры сацыяльнай абароны навучэнцаў**

1. Мерамі сацыяльнай абароны навучэнцаў з’яўляюцца:

1.1. карыстанне падручнікамі і вучэбнымі дапаможнікамі;

1.2. забеспячэнне харчаваннем;

1.3. ахова жыцця і здароўя;

1.4. забеспячэнне стыпендыямі, матэрыяльнай дапамогай і іншымі грашовымі выплатамі;

1.5. забеспячэнне адзеннем, абуткам і іншымі неабходнымі сродкамі і прадметамі першай неабходнасці;

1.6. прадастаўленне жылых памяшканняў (іх частак) у інтэрнаце;

1.7. забеспячэнне месцамі для пражывання ў дзяржаўных школах-інтэрнатах для дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекавання бацькоў, санаторных школах-інтэрнатах, спецыяльных школах-інтэрнатах, сацыяльна-педагагічных установах, спецыяльных навучальна-выхаваўчых установах, спецыяльных лячэбна-выхаваўчых установах;

1.8. прадастаўленне крэдыту на льготных умовах для аплаты першай вышэйшай адукацыі;

1.9. транспартнае забеспячэнне;

1.10. прадастаўленне водпускаў.

2. Актамі заканадаўства могуць быць устаноўлены іншыя меры сацыяльнай абароны навучэнцаў.

**Артыкул 39. Карыстанне падручнікамі і вучэбнымі дапаможнікамі**

1. Карыстанне падручнікамі і вучэбнымі дапаможнікамі навучэнцамі ва ўстановах адукацыі можа быць платным і бясплатным.

2. Асобы, якія засвойваюць змест адукацыйных праграм дашкольнай, агульнай сярэдняй адукацыі, на час атрымання адукацыі забяспечваюцца падручнікамі, вучэбнымі дапаможнікамі ўстановамі адукацыі, іншымі арганізацыямі, індывідуальнымі прадпрымальнікамі, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, за плату. Памер такой платы і парадак яе спагнання ўстанаўліваюцца Урадам Рэспублікі Беларусь.

Бясплатнае карыстанне падручнікамі і вучэбнымі дапаможнікамі ўстанаўліваецца для:

навучэнцаў санаторных школ-інтэрнатаў, спецыяльных навучальна-выхаваўчых устаноў і спецыяльных лячэбна-выхаваўчых устаноў;

асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, якія засвойваюць змест адукацыйных праграм спецыяльнай адукацыі;

дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекавання бацькоў, а таксама асоб з ліку дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекавання бацькоў;

дзяцей-інвалідаў ва ўзросце да васямнаццаці гадоў, інвалідаў з дзяцінства;

асоб, якія засвойваюць змест адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі і пакутуюць на анкалагічныя захворванні або хворыя на туберкулёз;

навучэнцаў з сем’яў, якія ў адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь ад 29 снежня 2012 г. № 7-З «Аб дзяржаўных дапамогах сем’ям, якія выхоўваюць дзяцей» атрымліваюць дзяржаўную дапамогу на дзяцей старэйшых за тры гады з асобных катэгорый сем’яў;

навучэнцаў, у якіх адзін з бацькоў, усынаўляльнікаў (удачаральнікаў) з’яўляецца інвалідам I або II групы;

навучэнцаў, якія з’яўляюцца членамі сем’яў асоб, указаных у падпунктах 3.2, 3.4 і 3.7 пункта 3, пункце 10 і падпунктах 12.2 і 12.3 пункта 12 артыкула 3 Закона Рэспублікі Беларусь ад 14 чэрвеня 2007 г. № 239-З «Аб дзяржаўных сацыяльных ільготах, правах і гарантыях для асобных катэгорый грамадзян».

Для навучэнцаў са шматдзетных сем’яў плата за карыстанне падручнікамі і вучэбнымі дапаможнікамі зніжаецца на 50 працэнтаў ад устаноўленай платы за карыстанне адпаведнымі падручнікамі і вучэбнымі дапаможнікамі.

3. Асобы, якія засвойваюць змест адукацыйных праграм прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай, вышэйшай адукацыі, забяспечваюцца ўстановамі адукацыі на час атрымання адукацыі падручнікамі, вучэбнымі дапаможнікамі бясплатна.

**Артыкул 40. Забеспячэнне харчаваннем**

1. Установы адукацыі, іншыя арганізацыі, індывідуальныя прадпрымальнікі, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, пры рэалізацыі імі адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі, адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі, адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю ствараюць неабходныя ўмовы для арганізацыі харчавання навучэнцаў.

2. Харчаванне навучэнцаў арганізуецца ў адпаведнасці з актамі заканадаўства юрыдычнымі асобамі і індывідуальнымі прадпрымальнікамі, якія ажыццяўляюць грамадскае харчаванне на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, або ўстановамі адукацыі, іншымі арганізацыямі, індывідуальнымі прадпрымальнікамі, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць.

3. Харчаванне навучэнцаў можа ажыццяўляцца за кошт уласных сродкаў, сродкаў законных прадстаўнікоў непаўналетніх навучэнцаў, сродкаў рэспубліканскага і (або) мясцовых бюджэтаў, іншых крыніц у адпаведнасці з актамі заканадаўства.

4. Забеспячэнне харчаваннем навучэнцаў пры падрыхтоўцы кадраў па спецыяльнасцях для воінскіх фарміраванняў і ваенізаваных арганізацый ажыццяўляецца за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту ў парадку і на ўмовах, якія ўстанаўліваюцца заканадаўствам аб праходжанні адпаведнай службы.

5. Навучэнцы ў сувораўскіх ваенных вучылішчах, кадэцкіх вучылішчах, спецыялізаваных ліцэях на перыяд навучання і выхавання бясплатна забяспечваюцца гэтымі ўстановамі адукацыі харчаваннем у парадку і на ўмовах, якія ўстанаўліваюцца заснавальнікамі ўказаных устаноў адукацыі або ўпаўнаважанымі імі органамі.

6. Навучэнцы, якія засвойваюць змест адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі, у перыяд знаходжання ва ўстанове дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі бясплатна забяспечваюцца гэтай установай адукацыі харчаваннем за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту.

7. Навучэнцы ў дзяржаўных школах-інтэрнатах для дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекавання бацькоў, санаторных школах-інтэрнатах, спецыяльных школах, спецыяльных школах-інтэрнатах, сацыяльна-педагагічных установах, спецыяльных навучальна-выхаваўчых установах, спецыяльных лячэбна-выхаваўчых установах, вучылішчах алімпійскага рэзерву, у тым ліку кандыдаты для залічэння ў вучылішчы алімпійскага рэзерву, дзяржаўных цэнтрах карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі на перыяд навучання і выхавання бясплатна забяспечваюцца гэтымі ўстановамі адукацыі харчаваннем, акрамя выпадкаў, прадугледжаных актамі заканадаўства.

8. Харчаванне навучэнцаў арганізуецца ў адпаведнасці з санітарна-эпідэміялагічнымі патрабаваннямі па нормах харчавання і грашовых нормах выдаткаў на харчаванне з улікам віду ўстановы адукацыі, катэгорый навучэнцаў. Пры неабходнасці арганізуецца дыетычнае (лячэбнае) харчаванне.

Нормы харчавання, грашовыя нормы выдаткаў на харчаванне навучэнцаў, акрамя навучэнцаў вучылішчаў алімпійскага рэзерву, устанаўліваюцца Урадам Рэспублікі Беларусь або ўпаўнаважаным ім органам.

Парадак устанаўлення грашовых нормаў выдаткаў на харчаванне для навучэнцаў вучылішчаў алімпійскага рэзерву ўстанаўліваецца Міністэрствам спорту і турызму па ўзгадненні з Міністэрствам фінансаў.

Палажэнне аб арганізацыі харчавання навучэнцаў, забеспячэнні харчаваннем навучэнцаў за кошт сродкаў рэспубліканскага і (або) мясцовых бюджэтаў, памер і парадак спагнання платы за харчаванне зацвярджаюцца Урадам Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 41. Ахова жыцця і здароўя**

1. Установы адукацыі, арганізацыі, што рэалізуюць адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, іншыя арганізацыі, індывідуальныя прадпрымальнікі, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, пры ажыццяўленні адукацыйнай дзейнасці ствараюць умовы для забеспячэння аховы жыцця і здароўя навучэнцаў у адпаведнасці з актамі заканадаўства.

2. Ахова жыцця і здароўя навучэнцаў уключае ў сябе:

2.1. стварэнне аптымальных умоў для атрымання адукацыі, вызначэнне аптымальнай вучэбнай нагрузкі, рэжыму вучэбных заняткаў, заняткаў, працягласці канікул, канікулярных водпускаў;

2.2. абавязковае страхаванне ад няшчасных выпадкаў на вытворчасці і прафесійных захворванняў жыцця і здароўя навучэнцаў, акрамя курсантаў і слухачоў, пры прыцягненні да аплачвальных работ у арганізацыях у перыяд праходжання практыкі, вытворчага навучання, стажыроўкі;

2.3. прапаганду здаровага ладу жыцця і навучанне навыкам такога ладу жыцця;

2.4. арганізацыю аздараўлення;

2.5. стварэнне ўмоў для заняткаў фізічнай культурай і спортам;

2.6. аказанне медыцынскай дапамогі;

2.7. прафілактыку і прыняцце мер па недапушчэнні ўжывання алкагольных, слабаалкагольных напіткаў, піва, спажывання наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў, іх аналагаў, таксічных і іншых адурманьвальных рэчываў у памяшканнях і на тэрыторыях, якія займаюцца ўстановамі адукацыі, арганізацыямі, што рэалізуюць адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, іншымі арганізацыямі, індывідуальнымі прадпрымальнікамі, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць;

2.8. прафілактыку і прыняцце мер па недапушчэнні курэння (спажывання) тытунёвых вырабаў, выкарыстання электронных сістэм курэння, сістэм для спажывання тытуню ў памяшканнях і на тэрыторыях, якія займаюцца ўстановамі адукацыі, арганізацыямі, што рэалізуюць адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, а таксама ў памяшканнях і на тэрыторыях (акрамя спецыяльна створаных месцаў), якія займаюцца іншымі арганізацыямі, індывідуальнымі прадпрымальнікамі, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць.

3. Медыцынская дапамога навучэнцам аказваецца ў парадку, устаноўленым актамі заканадаўства.

4. Навучэнцам ва ўстановах дашкольнай, агульнай сярэдняй (акрамя навучэнцаў ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі, указаных у пункце 5 гэтага артыкула), сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі, дзіцячых дамах медыцынская дапамога аказваецца ў адпаведнасці з актамі заканадаўства медыцынскімі работнікамі, якія ўваходзяць у штат дзяржаўных арганізацый аховы здароўя па месцы знаходжання адпаведнай установы адукацыі, дзіцячага дома.

5. Навучэнцам у спецыялізаваных ліцэях, сувораўскіх ваенных вучылішчах, вучылішчах алімпійскага рэзерву, гімназіях – каледжах мастацтваў, установах дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі, якія засвойваюць змест адукацыйнай праграмы адораных дзяцей і моладзі, у перыяд знаходжання іх ва ўстанове дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі, установах спецыяльнай адукацыі, выхаваўча-аздараўленчых установах адукацыі, спецыяльных навучальна-выхаваўчых установах, спецыяльных

лячэбна-выхаваўчых установах, якія маюць права на ажыццяўленне медыцынскай дзейнасці, медыцынскую дапамогу аказваюць медыцынскія работнікі, якія ўваходзяць у штат указаных устаноў адукацыі, калі іншае не ўстаноўлена Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь. Ва ўстановах сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі медыцынская дапамога таксама можа аказвацца медыцынскімі работнікамі, якія ўваходзяць у штат указаных устаноў адукацыі, калі гэтыя ўстановы маюць права на ажыццяўленне медыцынскай дзейнасці.

**Артыкул 42. Стыпендыі, матэрыяльная дапамога і іншыя грашовыя выплаты**

1. Стыпендыя – штомесячная грашовая выплата, якая з'яўляецца мерай сацыяльнай абароны з боку дзяржавы паспяваючых навучэнцаў у дзённай форме атрымання адукацыі і стымулюе засваенне навучэнцамі зместу адукацыйных праграм прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай, вышэйшай, навукова-арыентаванай адукацыі, адукацыйнай праграмы прафесійнай падрыхтоўкі рабочых (служачых), адукацыйнай праграмы перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць вышэйшую адукацыю, адукацыйнай праграмы падрыхтоўкі асоб да паступлення ва ўстановы адукацыі Рэспублікі Беларусь, а таксама навучэнцаў, якія атрымліваюць адукацыю за кошт грантаў на навучанне.

2. Стыпендыі падзяляюцца на наступныя віды:

вучэбныя;

аспірантам, дактарантам;

сацыяльныя;

Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь;

спецыяльныя;

імянныя;

персанальныя стыпендыі савета ўстановы вышэйшай адукацыі;

кіруючым кадрам.

Стыпендыі, віды якіх устаноўлены часткай першай гэтага пункта, прызначаюцца навучэнцам, якія атрымліваюць адукацыю за кошт сродкаў рэспубліканскага і (або) мясцовых бюджэтаў.

3. Вучэбная стыпендыя прызначаецца асобе, якая засвойвае змест адукацыйных праграм прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай або вышэйшай адукацыі, у тым ліку асобе, якая атрымлівае адукацыю за кошт грантаў на навучанне, у час навучання і выхавання ў першым семестры, паўгоддзі ў памеры мінімальнай вучэбнай стыпендыі, а пры засваенні зместу адукацыйных праграм сярэдняй спецыяльнай або вышэйшай адукацыі – і ў залежнасці ад набываемай спецыяльнасці. У другім і наступных семестрах, паўгоддзях, за выключэннем вучэбных стыпендый, якія ўстанаўліваюцца магістрантам, вучэбная стыпендыя прызначаецца ў залежнасці ад вынікаў вучэбнай дзейнасці. Памеры вучэбных стыпендый устанаўліваюцца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь. Крытэрыі паспяховасці навучэнцаў, умовы і парадак прызначэння і выплаты вучэбных стыпендый вызначаюцца Урадам Рэспублікі Беларусь або ўпаўнаважаным ім органам.

4. Стыпендыя аспіранту, дактаранту прызначаецца аспіранту, дактаранту. Памеры стыпендый аспірантам, дактарантам устанаўліваюцца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь. Умовы і парадак прызначэння і выплаты стыпендый аспірантам, дактарантам вызначаюцца Урадам Рэспублікі Беларусь або ўпаўнаважаным ім органам.

5. Сацыяльная стыпендыя прызначаецца асобе, якая засвойвае змест адукацыйных праграм прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай або вышэйшай адукацыі і не атрымлівае вучэбнай стыпендыі, калі гэта асоба адносіцца да катэгорыі:

дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекавання бацькоў, асоб з ліку дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекавання бацькоў, а таксама асоб, якія страцілі апошняга з бацькоў у перыяд атрымання адпаведнай адукацыі;

асоб, указаных у падпункце 3.2 пункта 3 артыкула 3 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб дзяржаўных сацыяльных ільготах, правах і гарантыях для асобных катэгорый грамадзян»;

дзяцей асоб, указаных у пункце 10 і падпунктах 12.2 і 12.3 пункта 12 артыкула 3 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб дзяржаўных сацыяльных ільготах, правах і гарантыях для асобных катэгорый грамадзян»;

інвалідаў;

асоб, якія маюць ільготы ў адпаведнасці з артыкуламі 18–23 Закона Рэспублікі Беларусь ад 6 студзеня 2009 г. № 9-З «Аб сацыяльнай абароне грамадзян, якія пацярпелі ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, іншых радыяцыйных аварый»;

цяжарных жанчын;

асоб, якія маюць дзяцей ва ўзросце да васямнаццаці гадоў;

асоб, хворых на туберкулёз;

асоб, якія знаходзяцца ў цяжкім матэрыяльным становішчы.

Сацыяльная стыпендыя таксама прызначаецца дзецям-сіротам, дзецям, якія засталіся без апекавання бацькоў, асобам з ліку дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекавання бацькоў, што засвойваюць змест адукацыйнай праграмы падрыхтоўкі асоб да паступлення ва ўстановы адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Памеры сацыяльных стыпендый устанаўліваюцца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь. Умовы і парадак прызначэння і выплаты сацыяльных стыпендый вызначаюцца Урадам Рэспублікі Беларусь або ўпаўнаважаным ім органам.

6. Стыпендыя Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь прызначаецца навучэнцу, які засвойвае змест адной з адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі, адукацыйнай праграмы аспірантуры (ад’юнктуры). Катэгорыі навучэнцаў, якім прызначаецца стыпендыя Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, памеры стыпендый Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, умовы і парадак іх прызначэння і выплаты ўстанаўліваюцца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

7. Спецыяльная стыпендыя прызначаецца на ўвесь перыяд атрымання адукацыі асобе, якая мае права на такую стыпендыю ў адпаведнасці з пунктам 24 часткі першай артыкула 12, падпунктам 1.19 пункта 1 артыкула 18, падпунктам 2.9 пункта 2 артыкула 23 Закона Рэспублікі Беларусь ад 17 красавіка 1992 г. № 1594-XII «Аб ветэранах». Памеры спецыяльных стыпендый устанаўліваюцца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь. Парадак прызначэння і выплаты спецыяльных стыпендый вызначаецца Урадам Рэспублікі Беларусь або ўпаўнаважаным ім органам.

8. Імянная стыпендыя прызначаецца асобе, якая засвойвае змест адукацыйных праграм прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай або вышэйшай адукацыі, якая дасягнула высокіх паказчыкаў у вучэбнай, грамадскай дзейнасці, а асобе, якая засвойвае змест адукацыйнай праграмы вышэйшай адукацыі, – і высокіх паказчыкаў у навукова-даследчай дзейнасці. Імянная стыпендыя заснoўваецца з мэтай увекавечання памяці выдатнага асветніка або выдатнага дзеяча ў галіне навукі, культуры, спорту, захавання нацыянальнай бяспекі, прамысловасці, будаўніцтва, транспарту або сельскай гаспадаркі. Памеры імянных стыпендый устанаўліваюцца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь. Умовы і парадак прызначэння і выплаты імянных стыпендый вызначаюцца Урадам Рэспублікі Беларусь або ўпаўнаважаным ім органам.

9. Персанальная стыпендыя савета ўстановы вышэйшай адукацыі прызначаецца навучэнцу, які засвойвае змест адной з адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі, за асаблівыя поспехі ў вывучэнні асобных вучэбных дысцыплін і навукова-тэхнічнай творчасці. Катэгорыі навучэнцаў, якім прызначаецца персанальная стыпендыя савета ўстановы вышэйшай адукацыі, памер персанальнай стыпендыі савета ўстановы вышэйшай адукацыі ўстанаўліваюцца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь. Умовы і парадак прызначэння і выплаты персанальных стыпендый савета ўстановы вышэйшай адукацыі вызначаюцца Урадам Рэспублікі Беларусь або ўпаўнаважаным ім органам.

10. Стыпендыі кіруючым кадрам прызначаюцца кіруючым кадрам, асобам, што ўключаны ў рэзерв кіруючых кадраў, якія накіроўваюцца ў Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь на перападрыхтоўку ў вочнай форме атрымання адукацыі ў рамках дзяржаўнага заказу. Памер стыпендыі кіруючым кадрам устанаўліваецца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь. Умовы і парадак прызначэння і выплаты стыпендый кіруючым кадрам вызначаюцца Урадам Рэспублікі Беларусь.

11. Асобам, якія засвойваюць змест адукацыйных праграм сярэдняй спецыяльнай, вышэйшай, навукова-арыентаванай адукацыі і атрымліваюць стыпендыю, могуць устанаўлівацца надбаўкі да стыпендыі за поспехі ў вучэбнай, навуковай і грамадскай дзейнасці.

12. Асобам, якія засвойваюць змест адукацыйных праграм прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай, вышэйшай адукацыі, адукацыйнай праграмы аспірантуры (ад'юнктуры) у дзённай форме атрымання адукацыі за кошт сродкаў рэспубліканскага і (або) мясцовых бюджэтаў, можа быць аказана матэрыяльная дапамога за кошт сродкаў рэспубліканскага і (або) мясцовых бюджэтаў, сродкаў ад дзейнасці ўстановы адукацыі, арганізацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, якая прыносіць даходы, у частцы перавышэння даходаў над выдаткамі. Асобам, якія атрымліваюць адукацыю на платнай аснове, матэрыяльная дапамога можа быць аказана за кошт сродкаў ад дзейнасці ўстановы адукацыі, арганізацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, якая прыносіць даходы, у частцы перавышэння даходаў над выдаткамі.

Умовы і парадак аказання матэрыяльнай дапамогі за кошт сродкаў ад дзейнасці ўстановы адукацыі, арганізацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, якая прыносіць даходы, у частцы перавышэння даходаў над выдаткамі асобам, якія засвойваюць змест адукацыйных праграм прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай, вышэйшай адукацыі, адукацыйнай праграмы аспірантуры (ад'юнктуры) у дзённай форме атрымання адукацыі, вызначаюцца ўстановай адукацыі, арганізацыяй, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі.

13. Умовы і парадак прызначэння і выплаты надбавак да стыпендый за поспехі ў вучэбнай, навуковай і грамадскай дзейнасці, аказання матэрыяльнай дапамогі за кошт сродкаў рэспубліканскага і (або) мясцовых бюджэтаў вызначаюцца Урадам Рэспублікі Беларусь або ўпаўнаважаным ім органам, а аб'ёмы сродкаў, якія накіроўваюцца на ўказаныя мэты, – Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

14. Замежным грамадзянам і асобам без грамадзянства, якія засвойваюць змест адукацыйных праграм прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай, вышэйшай, навукова-арыентаванай адукацыі, вучацца ў адпаведнасці з міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь, выплачваюцца вучэбныя стыпендыі, стыпендыі аспірантам, дактарантам, калі гэта прадугледжана міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь, у адпаведнасці з якімі гэтыя асобы прыняты (залічаны) на навучанне.

15. Курсантам, слухачам, ад'юнктам, дактарантам, якія вучацца па спецыяльнасцях для воінскіх фарміраванняў і ваенізаваных арганізацый, выплачваюцца грашовае забеспячэнне, матэрыяльная дапамога, надбаўкі за дасягненне высокіх вынікаў у вучэбнай, навуковай і грамадскай дзейнасці, іншыя грашовыя выплаты, памер, умовы і парадак прызначэння і выплаты якіх устанаўліваюцца актамі заканадаўства.

16. Асобам, якія засвойваюць змест адукацыйных праграм прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай, вышэйшай, навукова-арыентаванай адукацыі за кошт сродкаў рэспубліканскага і (або) мясцовых бюджэтаў, на платнай аснове, можа выплачвацца заахвочванне за кошт сродкаў ад дзейнасці ўстановы адукацыі, арганізацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, якая прыносіць даходы, у частцы перавышэння даходаў над выдаткамі.

Умовы і парадак прызначэння і выплаты заахвочвання вызначаюцца Урадам Рэспублікі Беларусь або ўпаўнаважаным ім органам.

### Артыкул 43. Забеспячэнне адзеннем, абуткам і іншымі неабходнымі сродкамі і прадметамі першай неабходнасці

1. Асобы, якія засвойваюць змест адукацыйных праграм прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай, вышэйшай адукацыі, пры праходжанні практыкі, вытворчага навучання, стажыроўкі забяспечваюцца спецыяльным адзеннем, спецыяльным абуткам і іншымі неабходнымі сродкамі індывідуальнай засцярогі, змывальнымі і абясшкоджвальнымі сродкамі па тыпавых нормах у парадку, устаноўленым актамі заканадаўства.

2. Навучэнцы пры падрыхтоўцы кадраў па спецыяльнасцях для воінскіх фарміраванняў і ваенізаваных арганізацый, грамадзянскай авіяцыі забяспечваюцца форменным адзеннем у парадку і на ўмовах, устаноўленых актамі заканадаўства.

Навучэнцы ў спецыялізаваных ліцэях, сувораўскіх ваенных вучылішчах забяспечваюцца форменным адзеннем у парадку і на ўмовах, якія ўстанаўліваюцца заснавальнікам установы адукацыі або ўпаўнаважаным ім органам.

Навучэнцы, якія засвойваюць змест адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі, у перыяд знаходжання ва ўстанове дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі забяспечваюцца атрыбутыкай, сродкамі індывідуальнай засцярогі пры правядзенні заняткаў па нормах, у парадку і на ўмовах, якія ўстанаўліваюцца Урадам Рэспублікі Беларусь.

Навучэнцы ў кадэцкіх вучылішчах забяспечваюцца форменным адзеннем у парадку і на ўмовах, якія ўстанаўліваюцца Урадам Рэспублікі Беларусь.

3. Навучэнцы, якія адносяцца да катэгорыі дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекавання бацькоў, а таксама асоб з ліку дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекавання бацькоў, забяспечваюцца адзеннем, абуткам і іншымі прадметамі першай неабходнасці ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі па нормах і ў парадку, якія ўстанаўліваюцца Урадам Рэспублікі Беларусь.

### Артыкул 44. Прадастаўленне жылых памяшканняў (іх частак) у інтэрнаце

1. Навучэнцам ва ўстановах агульнай сярэдняй, сярэдняй спецыяльнай, вышэйшай адукацыі, дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі, дадатковай адукацыі дарослых, спецыяльнай адукацыі, арганізацыях, што рэалізуюць адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, на перыяд навучання і выхавання ў адпаведнасці з актамі заканадаўства могуць прадастаўляцца жылыя памяшканні (іх часткі) у інтэрнаце.

2. Жылыя памяшканні (іх часткі) у інтэрнаце могуць прадастаўляцца са спагнаннем або без спагнання платы за карыстанне імі.

3. У дзяржаўных установах адукацыі плата за карыстанне жылым памяшканнем (яго часткай) у інтэрнаце не спаганяецца з навучэнцаў, якія адносяцца да катэгорыі:

3.1. дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекавання бацькоў, а таксама асоб з ліку дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекавання бацькоў;

3.2. дзяцей-інвалідаў ва ўзросце да васямнаццаці гадоў, інвалідаў I або II групы;

3.3. асоб, якія пакутуюць на анкалагічныя захворванні або хворыя на туберкулёз;

3.4. асоб, якія з’яўляюцца членамі сем’яў асоб, указаных у падпунктах 3.2, 3.4 і 3.7 пункта 3, пункце 10 і падпунктах 12.2 і 12.3 пункта 12 артыкула 3 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб дзяржаўных сацыяльных ільготах, правах і гарантыях для асобных катэгорый грамадзян»;

3.5. навучэнцаў у спецыялізаваных ліцэях, сувораўскіх ваенных вучылішчах, кадэцкіх вучылішчах, спецыяльных школах, цэнтрах карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі, а таксама навучэнцаў у дзяржаўных вучылішчах алімпійскага рэзерву, у тым ліку кандыдатаў для залічэння ў вучылішчы алімпійскага рэзерву, якія атрымліваюць адпаведную адукацыю за кошт сродкаў рэспубліканскага і (або) мясцовых бюджэтаў;

3.6. навучэнцаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі, навучэнцаў, якія засвойваюць змест адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі ва ўстановах вышэйшай адукацыі, пастаянна пражываюць у сельскіх населеных пунктах;

3.7. навучэнцаў, якія засвойваюць змест адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі, у перыяд знаходжання ва ўстанове дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі;

3.8. курсантаў;

3.9. слухачоў, якія атрымліваюць першую агульную вышэйшую адукацыю, спецыяльную вышэйшую адукацыю па напрамку адукацыі «Ахова здароўя»;

3.10. слухачоў, якія атрымліваюць агульную вышэйшую адукацыю, паглыбленую вышэйшую адукацыю ў дзённай форме атрымання адукацыі за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту па спецыяльнасцях для воінскіх фарміраванняў і ваенізаваных арганізацый.

4. Плата за карыстанне жылым памяшканнем (яго часткай) у інтэрнаце ў перыяды канікул, праходжання практыкі, вытворчага навучання не спаганяецца ў выпадку, калі ў гэтыя перыяды навучэнцы не пражываюць у інтэрнаце.

5. У выпадку незабеспячэння жылым памяшканнем (яго часткай) у інтэрнаце іншагародніх навучэнцаў і студэнтаў, якія атрымліваюць адукацыю ў дзённай форме атрымання адукацыі за кошт сродкаў рэспубліканскага і (або) мясцовых бюджэтаў, дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекавання бацькоў, асоб з ліку дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекавання бацькоў, якім прадастаўлена дзяржаўнае забеспячэнне, што атрымліваюць прафесійна-тэхнічную, сярэднюю спецыяльную або вышэйшую адукацыю ў дзённай форме атрымання адукацыі, ім кампенсуюцца выдаткі па найме жылога памяшкання (яго часткі) у парадку і памеры, якія ўстанаўліваюцца Урадам Рэспублікі Беларусь.

6. Парадак і ўмовы прадастаўлення жылых памяшканняў (іх частак) у інтэрнаце навучэнцам пры падрыхтоўцы кадраў па спецыяльнасцях для воінскіх фарміраванняў і ваенізаваных арганізацый, а таксама навучэнцам у сувораўскіх ваенных вучылішчах устанаўліваюцца актамі заканадаўства.

**Артыкул 45. Забеспячэнне месцамі для пражывання ў дзяржаўных школах-інтэрнатах для дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекавання бацькоў, санаторных школах-інтэрнатах, спецыяльных школах-інтэрнатах, сацыяльна-педагагічных установах, спецыяльных навучальна-выхаваўчых установах, спецыяльных лячэбна-выхаваўчых установах**

Навучэнцы ў дзяржаўных школах-інтэрнатах для дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекавання бацькоў, санаторных школах-інтэрнатах, спецыяльных школах-інтэрнатах, сацыяльна-педагагічных установах, спецыяльных навучальна-выхаваўчых установах, спецыяльных лячэбна-выхаваўчых установах на перыяд навучання і выхавання бясплатна забяспечваюцца гэтымі ўстановамі адукацыі месцамі для пражывання.

**Артыкул 46. Прадастаўленне крэдыту на льготных умовах для аплаты першай вышэйшай адукацыі**

Грамадзяне Рэспублікі Беларусь, якія атрымліваюць першую вышэйшую адукацыю на платнай аснове ў дзённай форме атрымання адукацыі ў дзяржаўных установах адукацыі, установах вышэйшай адукацыі спажывецкай кааперацыі Рэспублікі Беларусь і ўстановах вышэйшай адукацыі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, маюць права на атрыманне крэдыту на льготных умовах для аплаты першай вышэйшай адукацыі, якія вызначаюцца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь. Парадак прадастаўлення ўказанага крэдыту вызначаецца Урадам Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 47. Транспартнае забеспячэнне**

1. Транспартнае забеспячэнне навучэнцаў уключае ў сябе прадастаўленне ім ільгот пры праездзе транспартам агульнага карыстання ў адпаведнасці з актамі заканадаўства, а таксама арганізацыю іх бясплатнай перавозкі ў выпадках, устаноўленых гэтым артыкулам.

2. Мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы арганізуюць бясплатную перавозку навучэнцаў:

2.1. якія пражываюць у сельскіх населеных пунктах, да дзяржаўнай установы дашкольнай, агульнай сярэдняй, спецыяльнай адукацыі, за выключэннем спецыяльнай школы-інтэрната, і назад у выпадку адсутнасці дзяржаўнай установы адукацыі, што рэалізуе адпаведныя адукацыйныя праграмы, па месцы жыхарства (месцы знаходжання) навучэнца або непрадастаўлення месца ў дзяржаўнай установе адукацыі, што рэалізуе адукацыйную праграму дашкольнай адукацыі, адукацыйныя праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі, па месцы жыхарства (месцы знаходжання) выхаванца – пры адсутнасці аўтамабільных перавозак пасажыраў у рэгулярных зносінах транспартам агульнага карыстання або немагчымасці забеспячэння такой перавозкі аўтамабільнымі перавозкамі пасажыраў у рэгулярных зносінах транспартам агульнага карыстання;

2.2. з ліку асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, якія вучацца ў дзяржаўных цэнтрах карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі, а таксама асоб, якія маюць парушэнні функцый апорна-рухальнага апарату (са значным і рэзка выяўленым парушэннем перамяшчэння або яго адсутнасцю), у дзяржаўныя ўстановы дашкольнай, агульнай сярэдняй і спецыяльнай адукацыі на спецыяльна абсталяваных транспартных сродках ад месца жыхарства (месца знаходжання) навучэнца да ўстановы адукацыі і назад;

2.3. ад дзяржаўнай установы адукацыі да месцаў правядзення экскурсій, наведванне якіх прадугледжана вучэбна-праграмнай дакументацыяй адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі, адукацыйных праграм спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі, у рамках вывучэння вучэбных прадметаў, модуляў, і назад;

2.4. якія засвойваюць змест адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі, за выключэннем навучэнцаў, якія пражываюць па месцы знаходжання ўстановы дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі, ад месца жыхарства (месца знаходжання) да ўстановы дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі і назад;

2.5. да пункта правядзення цэнтралізаванага экзамену і назад – пры адсутнасці аўтамабільных перавозак пасажыраў у рэгулярных зносінах транспартам агульнага карыстання або немагчымасці забеспячэння такой перавозкі аўтамабільнымі перавозкамі пасажыраў у рэгулярных зносінах транспартам агульнага карыстання да ўстаноўленага часу.

3. Месца фарміравання групы навучэнцаў і асоб, што суправаджаюць іх, ад якога арганізуецца бясплатная перавозка, вызначаецца адпаведным мясцовым выканаўчым і распарадчым органам або ўпаўнаважаным ім органам.

Арганізацыя бясплатнай перавозкі навучэнцаў ажыццяўляецца аўтобусамі, якія выконваюць аўтамабільныя перавозкі пасажыраў у рэгулярных зносінах транспартам агульнага карыстання, школьнымі аўтобусамі, а таксама цягнікамі рэгіянальных ліній эканомкласа, акрамя перавозкі выхаванцаў, якія засвойваюць змест адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі, адукацыйных праграм спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі.

4. Бясплатная перавозка навучэнцаў, якія засвойваюць змест адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі, у перыяд знаходжання іх ва ўстанове дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі да месцаў правядзення заняткаў, экскурсій, фізкультурна-аздараўленчых, спартыўна-масавых, спартыўных, культурных мерапрыемстваў, наведванне якіх прадугледжана вучэбна-праграмнай дакументацыяй

адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі, праграмна-планавальнай дакументацыяй выхавання, арганізуецца ўстановай дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі.

5. Парадак арганізацыі бясплатнай перавозкі навучэнцаў устанаўліваецца Урадам Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 48. Гарантыі і кампенсацыі выпускнікам**

Выпускнікам, якім месца працы прадастаўлена шляхам размеркавання, працаўладкавання ў лік броні, накіравання на працу, прадастаўляюцца наступныя гарантыі і кампенсацыі:

працаўладкаванне ў адпаведнасці з атрыманай спецыяльнасцю, прысвоенай кваліфікацыяй і (або) ступенню;

адпачынак працягласцю 31 каляндарны дзень, а выпускнікам, накіраваным для працы ў якасці педагагічных работнікаў, – 45 каляндарных дзён, на пасадзе трэнера-выкладчыка па спорце – 60 каляндарных дзён. Па ініцыятыве выпускніка працягласць адпачынку можа быць скарочана;

кампенсацыя ў сувязі з пераездам на працу ў іншую мясцовасць у адпаведнасці з заканадаўствам аб працы;

грашовая дапамога, памер, крыніцы фінансавання і парадак выплаты якой вызначаюцца Урадам Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 49. Водпускі**

1. Асобам, якія засвойваюць змест адукацыйных праграм асноўнай адукацыі, адукацыйных праграм спецыяльнай адукацыі, адукацыйнай праграмы перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць вышэйшую адукацыю, адукацыйнай праграмы перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць сярэднюю спецыяльную адукацыю, прадастаўляюцца наступныя водпускі:

1.1. акадэмічны;

1.2. па доглядзе дзіцяці да дасягнення ім узросту трох гадоў;

1.3. для праходжання ваеннай службы;

1.4. для праходжання альтэрнатыўнай службы.

2. Акадэмічны водпуск прадастаўляецца навучэнцу па медыцынскіх паказаннях, у сувязі з прызывам на службу ў рэзерве або па іншых уважлівых прычынах.

Акадэмічны водпуск па медыцынскіх паказаннях прадастаўляецца навучэнцу на падставе заключэння ўрачэбна-кансультацыйнай камісіі ў выпадку:

часовага зніжэння здольнасці да навучання з прычыны вострага захворвання і (або) працяглых і (або) частых абвастрэнняў хранічнага захворвання ў адпаведнасці з пералікам і крытэрыямі, якія вызначаюцца Міністэрствам аховы здароўя;

цяжарнасці, якая працякае нармальна, тэрмінам з 24 тыдняў і цяжарнасці, якая працякае паталагічна, з любога тэрміну.

Акадэмічны водпуск у сувязі з прызывам на службу ў рэзерве прадастаўляецца навучэнцу, які праходзіць службу ў рэзерве, на перыяд праходжання заняткаў і вучэбных збораў у воінскіх часцях, іншых арганізацыях Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь або транспартных войскаў.

Па іншых уважлівых прычынах акадэмічны водпуск навучэнцу прадастаўляецца па дамоўленасці паміж кіраўніком установы адукацыі, арганізацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, і навучэнцам. Агульная працягласць акадэмічных водпускаў па іншых уважлівых прычынах, якія прадастаўляюцца навучэнцу, за перыяд засваення зместу адпаведнай адукацыйнай праграмы не павінна перавышаць, як правіла, адзін год. Акадэмічны водпуск па іншых уважлівых прычынах тэрмінам большым за адзін год можа быць прадастаўлены навучэнцу (акрамя асоб, якія

засвойваюць змест адукацыйных праграм навукова-арыентаванай адукацыі), які атрымлівае адукацыю па спецыяльнасці, прыём (залічэнне) для атрымання адукацыі па якой не ажыццяўляецца штогод.

3. Водпуск па доглядзе дзіцяці да дасягнення ім узросту трох гадоў прадастаўляецца маці дзіцяці па яе жаданні пасля перапынку ў вучобе, выкліканага родамі.

Водпуск па доглядзе дзіцяці да дасягнення ім узросту трох гадоў прадастаўляецца навучэнцам – бацьку дзіцяці, іншаму родзічу або члену сям'і дзіцяці, якія фактычна ажыццяўляюць догляд дзіцяці, у выпадку выхаду маці дзіцяці на працу (службу), вучобу, ажыццяўлення ёю іншага віду дзейнасці.

Водпуск па доглядзе дзіцяці да дасягнення ім узросту трох гадоў можа быць выкарыстаны поўнасцю або па частках любой працягласці. Калі водпуск па доглядзе дзіцяці да дасягнення ім узросту трох гадоў заканчваецца ў навучальным годзе, то кіраўнік установы адукацыі, арганізацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, па заяве маці дзіцяці, бацькі дзіцяці, іншага родзіча або члена сям'і дзіцяці, якія фактычна ажыццяўляюць догляд дзіцяці, абавязаны прадаставіць акадэмічны водпуск да заканчэння гэтага навучальнага года.

4. Водпуск для праходжання ваеннай службы прадастаўляецца навучэнцу, прызванаму на тэрміновую ваенную службу, ваенную службу афіцэраў па прызыве. Водпуск для праходжання альтэрнатыўнай службы прадастаўляецца навучэнцу, накіраванаму для праходжання альтэрнатыўнай службы. Водпуск для праходжання ваеннай службы, водпуск для праходжання альтэрнатыўнай службы прадастаўляюцца на ўвесь перыяд праходжання службы і на перыяд да аднаго года з даты звальнення з тэрміновай ваеннай службы, з ваеннай службы афіцэраў па прызыве ў запас або адстаўку ці звальнення з альтэрнатыўнай службы.

Пры завяршэнні выкарыстання водпуску, а таксама на працягу аднаго года з даты звальнення з тэрміновай ваеннай службы, з ваеннай службы афіцэраў па прызыве ў запас або адстаўку ці звальнення з альтэрнатыўнай службы навучэнец мае права працягнуць атрыманне адукацыі ў той жа ўстанове адукацыі, арганізацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, на ранейшых умовах. На працягу аднаго года з даты паступлення з тэрміновай ваеннай службы, з ваеннай службы афіцэраў па прызыве на ваенную службу па кантракце навучэнец мае права працягнуць атрыманне адукацыі ў той жа ўстанове адукацыі, арганізацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, у завочнай або дыстанцыйнай форме атрымання адукацыі.

5. Водпускі прадастаўляюцца навучэнцам на падставе іх пісьмовых заяў і афармляюцца загадам кіраўніка ўстановы адукацыі, арганізацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі.

Пісьмовая заява аб прадастаўленні водпуску для праходжання ваеннай службы, водпуску для праходжання альтэрнатыўнай службы або акадэмічнага водпуску ў сувязі з прызывам на службу ў рэзерве падаецца ў наступныя тэрміны:

водпуску для праходжання ваеннай службы, водпуску для праходжання альтэрнатыўнай службы – на працягу сямі каляндарных дзён з дня атрымання павесткі або прадпісання ваеннага камісарыята (адасобленага падраздзялення ваеннага камісарыята) для адпраўкі да месца тэрміновай ваеннай службы, ваеннай службы афіцэраў па прызыве ці іншых дакументаў, якія пацвярджаюць праходжанне ваеннай службы па прызыве, або дакумента, які пацвярджае накіраванне на альтэрнатыўную службу;

акадэмічнага водпуску ў сувязі з прызывам на службу ў рэзерве – на працягу сямі каляндарных дзён з дня атрымання павесткі ваеннага камісарыята (адасобленага падраздзялення ваеннага камісарыята) для адпраўкі да месца службы ў рэзерве або не пазней за тры каляндарныя дні да даты прыбыцця ў воінскую часць, указанай у прадпісанні воінскай часці аб прыбыцці рэзервіста на заняткі або вучэбны збор і паведамленні воінскай часці аб прадастаўленні рэзервісту кароткатэрміновага водпуску.

6. Акадэмічныя водпускі па медыцынскіх паказаннях і іншых уважлівых прычынах, а таксама водпуск па доглядзе дзіцяці да дасягнення ім узросту трох гадоў асобам, якія атрымліваюць адукацыю пры падрыхтоўцы кадраў па спецыяльнасцях для воінскіх фарміраванняў і ваенізаваных арганізацый, прадастаўляюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам аб праходжанні адпаведнай службы.

## ГЛАВА 6
## ПЕДАГАГІЧНЫЯ РАБОТНІКІ. ІНШЫЯ РАБОТНІКІ ЎСТАНОЎ АДУКАЦЫІ

### Артыкул 50. Педагагічныя работнікі

1. Педагагічнымі работнікамі прызнаюцца асобы, якія ажыццяўляюць педагагічную дзейнасць (рэалізуюць змест адукацыйных праграм, праграм выхавання, аказваюць карэкцыйна-педагагічную дапамогу, ажыццяўляюць навукова-метадычнае забеспячэнне адукацыі і (або) кіраўніцтва адукацыйнай дзейнасцю ўстановы адукацыі, яе адасобленых падраздзяленняў, структурных падраздзяленняў).

Педагагічная дзейнасць ажыццяўляецца фізічнымі асобамі на падставе працоўнага дагавора, кантракта аб праходжанні ваеннай службы (службы) або грамадзянска-прававога дагавора і індывідуальнымі прадпрымальнікамі, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць.

2. Педагагічныя работнікі, педагагічная дзейнасць якіх накіравана на рэалізацыю зместу адукацыйных праграм вышэйшай, навукова-арыентаванай адукацыі, а таксама адукацыйных праграм дадатковай адукацыі дарослых ва ўстановах вышэйшай адукацыі і ўстановах дадатковай адукацыі дарослых, акрамя інстытута кантролю ведаў і цэнтра падрыхтоўкі, павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў, на кіраўніцтва адукацыйнай дзейнасцю ўстановы вышэйшай адукацыі, акадэміі адукацыі, акадэміі паслядыпломнай адукацыі, інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі, інстытута развіцця адукацыі, інстытута прафесійнай адукацыі, факультэта, ваеннага факультэта, інстытута без права юрыдычнай асобы, ваеннага інстытута без права юрыдычнай асобы, вышэйшай школы ва ўстанове вышэйшай адукацыі, адносяцца да прафесарска-выкладчыцкага складу.

Педагагічная дзейнасць прафесарска-выкладчыцкага складу ўключае ў сябе вучэбную, навукова-метадычную, навукова-даследчую, выхаваўчую і іншую працу.

Нормы часу для разліку аб’ёму вучэбнай працы, асноўныя віды навукова-метадычнай, навукова-даследчай, выхаваўчай і іншых работ для педагагічных работнікаў з ліку прафесарска-выкладчыцкага складу, што рэалізуюць змест адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі, дадатковай адукацыі дарослых, а таксама суадносіны колькасці навучэнцаў і педагагічных работнікаў з ліку прафесарска-выкладчыцкага складу, што рэалізуюць змест адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі, дадатковай адукацыі дарослых, вызначаюцца Міністэрствам адукацыі, калі іншае не ўстаноўлена Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

Асноўныя віды вучэбнай, навукова-метадычнай, навукова-даследчай, выхаваўчай і іншых работ, іх нарміраванне для педагагічных работнікаў з ліку прафесарска-выкладчыцкага складу, што рэалізуюць змест адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі, дадатковай адукацыі дарослых, а таксама суадносіны колькасці навучэнцаў і педагагічных работнікаў з ліку прафесарска-выкладчыцкага складу, што рэалізуюць змест адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі, дадатковай адукацыі дарослых, або парадак вызначэння колькасці такіх педагагічных работнікаў пры падрыхтоўцы кадраў па спецыяльнасцях для воінскіх фарміраванняў і ваенізаваных арганізацый, мытных органаў вызначаюцца адпаведнымі дзяржаўнымі органамі, калі іншае не ўстаноўлена Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

3. Асобныя пасады педагагічных работнікаў, якія адносяцца да прафесарска-выкладчыцкага складу (асістэнт, выкладчык, старшы выкладчык, дацэнт, прафесар,

загадчык кафедры (начальнік кафедры)), акрамя ўказаных у частцы другой гэтага пункта, замяшчаюцца па конкурсе. Парадак правядзення конкурсу вызначаецца Урадам Рэспублікі Беларусь.

Пасады педагагічных работнікаў, якія адносяцца да прафесарска-выкладчыцкага складу (асістэнт, выкладчык, старшы выкладчык, начальнік цыкла, дацэнт, прафесар, начальнік кафедры (аддзела, філіяла кафедры), намеснік начальніка кафедры (філіяла кафедры)), якія падлягаюць замяшчэнню ваеннаслужачымі, работнікамі, якія маюць спецыяльныя званні, персанальныя званні, ва ўстановах адукацыі, арганізацыях, што рэалізуюць адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, замяшчаюцца ў парадку, прадугледжаным заканадаўствам аб праходжанні адпаведнай службы.

**Артыкул 51. Патрабаванні, якія прад'яўляюцца да педагагічных работнікаў**

1. Асноўныя патрабаванні, што прад'яўляюцца да педагагічных работнікаў, вызначаюцца кваліфікацыйнымі характарыстыкамі, якія зацвярджаюцца ў парадку, устаноўленым актамі заканадаўства.

2. Педагагічную дзейнасць не могуць ажыццяўляць асобы:

2.1. пазбаўленыя права займацца педагагічнай дзейнасцю;

2.2. якія маюць судзімасць, што не знята або не пагашана;

2.3. якія не маюць права займацца педагагічнай дзейнасцю ў выпадках, прадугледжаных заканадаўчымі актамі;

2.4. прызнаныя недзеяздольнымі або абмежавана дзеяздольнымі;

2.5. якія маюць медыцынскія проціпаказанні да ажыццяўлення педагагічнай дзейнасці.

3. Пры ўзнікненні ў перыяд ажыццяўлення педагагічнай дзейнасці акалічнасцей, прадугледжаных пунктам 2 гэтага артыкула, ажыццяўленне педагагічнай дзейнасці спыняецца ў адпаведнасці з актамі заканадаўства.

4. Пры прыёме на працу на пасады педагагічных работнікаў, заключэнні грамадзянска-прававога дагавора на ажыццяўленне педагагічнай дзейнасці:

установа адукацыі, арганізацыя, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, іншая арганізацыя, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, якія заключаюць грамадзянска-прававыя дагаворы на ажыццяўленне педагагічнай дзейнасці, наймальнік, за выключэннем індывідуальнага прадпрымальніка, абавязаны запытваць у дачыненні да асоб, з якімі яны заключаюць адпаведны дагавор, з адзінага дзяржаўнага банка даных аб правапарушэннях звесткі аб нязнятай і непагашанай судзімасці, а ў выпадках, прадугледжаных заканадаўчымі актамі, – аб учыненых імі злачынствах незалежна ад зняцця або пагашэння судзімасці ці спынення крымінальнага праследу на падставах, прадугледжаных пунктамі 3 або 4 часткі першай артыкула 29 Крымінальна-працэсуальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь. Такія звесткі прадастаўляюцца бясплатна і без згоды асоб, у дачыненні да якіх яны запытваюцца;

індывідуальны прадпрымальнік абавязаны запатрабаваць, а асоба, з якой заключаецца працоўны дагавор, грамадзянска-прававы дагавор на ажыццяўленне педагагічнай дзейнасці, абавязана прадставіць выпіску з адзінага дзяржаўнага банка даных аб правапарушэннях са звесткамі, указанымі ў абзацы другім гэтай часткі.

Установа адукацыі, арганізацыя, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, іншая арганізацыя, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, якія заключылі грамадзянска-прававыя дагаворы на ажыццяўленне педагагічнай дзейнасці, наймальнік, за выключэннем індывідуальнага прадпрымальніка, маюць права таксама атрымаць з адзінага дзяржаўнага банка даных аб правапарушэннях звесткі, указаныя ў абзацы другім часткі першай гэтага пункта, у дачыненні да асоб у перыяд ажыццяўлення імі педагагічнай дзейнасці па адпаведным дагаворы. Такія звесткі прадастаўляюцца бясплатна і без згоды асоб, у дачыненні да якіх яны запытваюцца.

Асобы, указаныя ў абзацы трэцім часткі першай гэтага пункта, у перыяд працы ў індывідуальнага прадпрымальніка абавязаны па яго патрабаванні прадставіць выпіску з адзінага дзяржаўнага банка даных аб правапарушэннях са звесткамі, указанымі ў абзацы другім часткі першай гэтага пункта.

**Артыкул 52. Правы педагагічных работнікаў**

1. Педагагічныя работнікі ў адпаведнасці з актамі заканадаўства маюць права на:

1.1. абарону прафесійнага гонару і годнасці;

1.2. забеспячэнне ўмоў для ажыццяўлення прафесійнай дзейнасці;

1.3. творчую ініцыятыву, свабоду выбару педагагічна абгрунтаваных формаў і метадаў навучання і выхавання, вучэбных выданняў і сродкаў навучання і выхавання;

1.4. доступ да вучэбна-праграмнай, вучэбна-метадычнай дакументацыі, інфармацыйна-аналітычных матэрыялаў;

1.5. удзел у абнаўленні, распрацоўцы і вызначэнні структуры і зместу структурных элементаў навукова-метадычнага забеспячэння адукацыі;

1.6. удзел у навуковай, навукова-тэхнічнай, эксперыментальнай, інавацыйнай, міжнароднай дзейнасці ўстановы адукацыі;

1.7. удзел у кіраванні ўстановай адукацыі;

1.8. павышэнне кваліфікацыі;

1.9. маральнае і матэрыяльнае заахвочванне за поспехі ў педагагічнай, навуковай, навукова-тэхнічнай, эксперыментальнай і інавацыйнай дзейнасці ў сістэме адукацыі;

1.10. аб’яднанне ў прафесійныя саюзы, іншыя грамадскія аб’яднанні, дзейнасць якіх не супярэчыць заканадаўству;

1.11. штомесячную кампенсацыю выдаткаў на набыццё вучэбнай і метадычнай літаратуры. Парадак, умовы і памер штомесячнай кампенсацыі выдаткаў на набыццё вучэбнай і метадычнай літаратуры педагагічным работнікам, пералік пасад педагагічных работнікаў, якім выплачваецца штомесячная кампенсацыя выдаткаў на набыццё вучэбнай і метадычнай літаратуры, вызначаюцца Міністэрствам адукацыі;

1.12. бясплатную перавозку да месца працы (да ўстаноў дашкольнай, агульнай сярэдняй, спецыяльнай адукацыі) і назад школьнымі аўтобусамі па маршруце іх руху ў выпадку адсутнасці аўтамабільных перавозак пасажыраў у рэгулярных зносінах транспартам агульнага карыстання, якія забяспечваюць прыбыццё педагагічнага работніка да пачатку яго працоўнага дня да месца працы і назад, і пры наяўнасці свабодных пасадачных месцаў у школьным аўтобусе.

2. Іншыя правы педагагічных работнікаў устанаўліваюцца актамі заканадаўства, устаноўчымі дакументамі і іншымі лакальнымі прававымі актамі ўстаноў адукацыі, арганізацый, што рэалізуюць адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, іншых арганізацый, індывідуальных прадпрымальнікаў, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, працоўнымі дагаворамі, грамадзянска-прававымі дагаворамі, кантрактамі аб праходжанні ваеннай службы (службы).

3. Пры падрыхтоўцы кадраў па спецыяльнасцях для воінскіх фарміраванняў і ваенізаваных арганізацый, мытных органаў у адпаведнасці з заканадаўствам аб праходжанні адпаведнай службы могуць устанаўлівацца асаблівасці правоў педагагічных работнікаў з ліку ваеннаслужачых, работнікаў, якія маюць спецыяльныя званні, персанальныя званні.

**Артыкул 53. Абавязкі педагагічных работнікаў**

1. Педагагічныя работнікі абавязаны:

1.1. ажыццяўляць сваю дзейнасць на прафесійным узроўні, які забяспечвае рэалізацыю адукацыйных праграм, праграм выхавання;

1.2. кіравацца прававымі, маральнымі і этычнымі нормамі;

1.3. паважаць гонар і годнасць навучэнцаў і іншых удзельнікаў адукацыйнага працэсу;

1.4. павышаць свой прафесійны ўзровень, праходзіць атэстацыю;

1.5. прапагандаваць здаровы лад жыцця сярод навучэнцаў;

1.6. забяспечваць выкананне спецыяльных умоў, неабходных для атрымання адукацыі асобамі з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця;

1.7. праходзіць папярэдні (пры паступленні на працу) і перыядычныя (на працягу працоўнай дзейнасці) абавязковыя медыцынскія агляды ў парадку, які ўстанаўліваецца Міністэрствам аховы здароўя па ўзгадненні з Міністэрствам працы і сацыяльнай абароны.

2. Іншыя абавязкі педагагічных работнікаў устанаўліваюцца актамі заканадаўства, устаноўчымі дакументамі і іншымі лакальнымі прававымі актамі ўстаноў адукацыі, арганізацый, што рэалізуюць адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, іншых арганізацый, індывідуальных прадпрымальнікаў, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, іх працоўнымі або грамадзянска-прававымі дагаворамі, кантрактамі аб праходжанні ваеннай службы (службы).

3. Педагагічныя работнікі не маюць права аказваць платныя кансультацыйныя паслугі па асобных вучэбных прадметах, модулях, вучэбных дысцыплінах, адукацыйных галінах, тэмах, у тым ліку дапамогу ў падрыхтоўцы да ўступных іспытаў (рэпетытарства), навучэнцам, калі гэта прыводзіць да канфлікту інтарэсаў педагагічнага работніка.

4. Педагагічным работнікам забараняецца выкарыстоўваць адукацыйны і выхаваўчы працэсы з палітычнымі мэтамі або для падахвочвання навучэнцаў да дзеянняў, якія супярэчаць Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і актам заканадаўства.

5. Пры падрыхтоўцы кадраў па спецыяльнасцях для воінскіх фарміраванняў і ваенізаваных арганізацый, мытных органаў у адпаведнасці з актамі заканадаўства аб праходжанні адпаведнай службы могуць устанаўлівацца асаблівасці абавязкаў педагагічных работнікаў з ліку ваеннаслужачых, работнікаў, якія маюць спецыяльныя званні, персанальныя званні.

**Артыкул 54. Іншыя работнікі ўстаноў адукацыі, іх правы і абавязкі**

1. Да іншых работнікаў устаноў адукацыі адносяцца работнікі, якія не з’яўляюцца педагагічнымі.

2. Правы і абавязкі іншых работнікаў устаноў адукацыі ўстанаўліваюцца актамі заканадаўства, статутамі і іншымі лакальнымі прававымі актамі ўстаноў адукацыі, заключанымі з імі працоўнымі дагаворамі.

**Артыкул 54$^{1}$. Стварэнне ўмоў для арганізацыі харчавання педагагічных і іншых работнікаў устаноў адукацыі**

1. Установы адукацыі ствараюць умовы для арганізацыі харчавання педагагічных і іншых работнікаў устаноў адукацыі.

2. Парадак арганізацыі харчавання ва ўстановах адукацыі, якія фінансуюцца з рэспубліканскага або мясцовых бюджэтаў, педагагічных і іншых работнікаў гэтых устаноў адукацыі, планавання выдаткаў рэспубліканскага або мясцовых бюджэтаў на гэтыя мэты, памер і парадак спагнання платы за такое харчаванне ўстанаўліваюцца Урадам Рэспублікі Беларусь.

## РАЗДЗЕЛ III
## АДУКАЦЫЙНЫЯ АДНОСІНЫ

## ГЛАВА 7
## УЗНІКНЕННЕ, ЗМЯНЕННЕ І СПЫНЕННЕ АДУКАЦЫЙНЫХ АДНОСІН

### Артыкул 55. Узнікненне адукацыйных адносін ва ўстанове адукацыі, арганізацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі

1. Падставай для ўзнікнення адукацыйных адносін ва ўстанове адукацыі, арганізацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, з'яўляецца дагавор, а калі заключэнне дагавора не патрабуецца – рашэнне кіраўніка аб прыёме (залічэнні) асобы ва ўстанову адукацыі, арганізацыю, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі.

2. Парадак узнікнення адукацыйных адносін ва ўстанове адукацыі, арганізацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, уключае ў сябе:

2.1. прадстаўленне дакументаў, пералік і парадак прадстаўлення якіх устаноўлены гэтым Кодэксам і (або) іншымі актамі заканадаўства;

2.2. правядзенне прафесійнага адбору па спецыяльнасцях вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі, што вызначаюцца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь;

2.3. правядзенне ўступных іспытаў і (або) конкурсу ў выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам і (або) іншымі актамі заканадаўства;

2.4. разгляд кіраўніком або прыёмнай камісіяй установы адукацыі, арганізацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, прадстаўленых дакументаў, а таксама вынікаў уступных іспытаў і (або) конкурсу;

2.5. прыняцце рашэння прыёмнай камісіяй установы адукацыі, арганізацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, аб прыёме (залічэнні) ва ўстанову адукацыі, арганізацыю, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, у выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам і (або) іншымі актамі заканадаўства;

2.6. заключэнне дагавора ў выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам;

2.7. прыняцце рашэння (выданне загада) кіраўніком установы адукацыі, арганізацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, аб прыёме (залічэнні) асобы ва ўстанову адукацыі, арганізацыю, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, у тым ліку ў выпадку ўзнікнення адукацыйных адносін на падставе дагавора.

3. Спісы навучэнцаў, прынятых (залічаных) для атрымання адукацыі, размяшчаюцца ва ўстанове адукацыі, арганізацыі, што рэалізуе адукацыйную праграму навукова-арыентаванай адукацыі, у даступных для азнаямлення месцах або ў глабальнай камп'ютарнай сетцы Інтэрнэт на афіцыйным сайце.

4. Адукацыйныя адносіны пры падрыхтоўцы кадраў па спецыяльнасцях для воінскіх фарміраванняў і ваенізаваных арганізацый узнікаюць у парадку і на ўмовах, устаноўленых заканадаўствам аб праходжанні адпаведнай службы.

### Артыкул 56. Узнікненне адукацыйных адносін у іншай арганізацыі, у індывідуальнага прадпрымальніка, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць

1. Падставай для ўзнікнення адукацыйных адносін у іншай арганізацыі, у індывідуальнага прадпрымальніка, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, з'яўляецца дагавор, а калі заключэнне дагавора не патрабуецца – рашэнне кіраўніка іншай арганізацыі, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, індывідуальнага прадпрымальніка,

што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, аб прыёме (залічэнні) асобы ў іншую арганізацыю, да індывідуальнага прадпрымальніка, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць.

2. Парадак узнікнення адукацыйных адносін у іншай арганізацыі, у індывідуальнага прадпрымальніка, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, уключае ў сябе:

2.1. прадстаўленне дакументаў, пералік і парадак прадстаўлення якіх устаноўлены гэтым Кодэксам і (або) іншымі актамі заканадаўства;

2.2. правядзенне ўступных іспытаў і (або) конкурсу ў выпадках, прадугледжаных актамі заканадаўства;

2.3. разгляд кіраўніком іншай арганізацыі, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, індывідуальным прадпрымальнікам, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, прадстаўленых дакументаў, а таксама вынікаў уступных іспытаў і (або) конкурсу;

2.4. заключэнне дагавора ў выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам;

2.5. прыняцце рашэння (выданне загада) кіраўніком іншай арганізацыі, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, індывідуальным прадпрымальнікам, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, аб прыёме (залічэнні) асобы ў іншую арганізацыю, да індывідуальнага прадпрымальніка, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, у тым ліку ў выпадку ўзнікнення адукацыйных адносін на падставе дагавора.

3. Спісы навучэнцаў, прынятых (залічаных) для атрымання адукацыі, размяшчаюцца іншай арганізацыяй, індывідуальным прадпрымальнікам, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, у даступных для азнаямлення месцах або ў глабальнай камп'ютарнай сетцы Інтэрнэт на афіцыйным сайце.

**Артыкул 57. Агульныя патрабаванні да парадку прыёму (залічэння) асоб для атрымання адукацыі ва ўстанову адукацыі, арганізацыю, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі**

1. У Рэспубліцы Беларусь кожны мае права звяртацца для атрымання адукацыі ў любую ўстанову адукацыі, любую арганізацыю, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, якія абавязаны разгледзець усе кандыдатуры ў адпаведнасці з устаноўленай працэдурай прыёму (залічэння).

2. Прыём (залічэнне) асоб для атрымання адукацыі ва ўстанову адукацыі, арганізацыю, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, ажыццяўляецца ў рамках гранічнай колькасці навучэнцаў, указанай у Адзіным рэестры ліцэнзій, калі наяўнасць ліцэнзіі на адукацыйную дзейнасць прадугледжана заканадаўствам аб ліцэнзаванні, а калі для ажыццяўлення адукацыйнай дзейнасці наяўнасць ліцэнзіі не патрабуецца – у адпаведнасці з кантрольнымі лічбамі прыёму з улікам санітарна-эпідэміялагічных патрабаванняў.

3. Кантрольныя лічбы прыёму для атрымання агульнай сярэдняй, спецыяльнай адукацыі, дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі за кошт сродкаў рэспубліканскага і (або) мясцовых бюджэтаў зацвярджаюцца заснавальнікамі ўстаноў адукацыі або ўпаўнаважанымі імі органамі штогод.

Кантрольныя лічбы прыёму для атрымання дадатковай адукацыі дарослых за кошт сродкаў рэспубліканскага і (або) мясцовых бюджэтаў штогод зацвярджаюцца, калі іншае не вызначана Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, заснавальнікамі ўстаноў адукацыі або ўпаўнаважанымі імі органамі ў вызначаным імі парадку.

Кантрольныя лічбы прыёму для атрымання дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту зацвярджаюцца Міністэрствам адукацыі штогод.

4. Кантрольныя лічбы прыёму для атрымання прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай, вышэйшай адукацыі за кошт сродкаў рэспубліканскага і (або) мясцовых бюджэтаў устанаўліваюцца заснавальнікамі ўстаноў адукацыі або ўпаўнаважанымі імі органамі на падставе заказу на падрыхтоўку спецыялістаў, рабочых, служачых,

сфарміраванага дзяржаўнымі органамі, падпарадкаванымі і (або) падсправаздачнымі Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі, рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання, іншымі арганізацыямі, падпарадкаванымі Ураду Рэспублікі Беларусь, абласнымі (Мінскім гарадскім) выканаўчымі камітэтамі і іншымі арганізацыямі ў выніку прагназавання дадатковых патрэб у маладых спецыялістах, рабочых, служачых, па ўзгадненні з Міністэрствам адукацыі. Парадак прагназавання дадатковых патрэб у маладых спецыялістах, рабочых, служачых, фарміравання заказу на іх падрыхтоўку і ўстанаўлення кантрольных лічбаў прыёму для атрымання прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай, вышэйшай адукацыі за кошт сродкаў рэспубліканскага і (або) мясцовых бюджэтаў вызначаецца Урадам Рэспублікі Беларусь.

Кантрольныя лічбы прыёму для атрымання навукова-арыентаванай адукацыі за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту ўстанаўліваюцца Дзяржаўным камітэтам па навуцы і тэхналогіях у парадку, які вызначаецца Урадам Рэспублікі Беларусь.

5. Прыём (залічэнне) асоб для атрымання адукацыі па ўсіх формах атрымання адукацыі ў рамках адукацыйнай праграмы асноўнай адукацыі аднаго ўзроўню (ступені) незалежна ад формы ўласнасці і падпарадкаванасці ўстановы адукацыі, арганізацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, ажыццяўляецца ў адзіным парадку, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўчымі актамі.

6. З мэтай адбору асоб, найбольш падрыхтаваных для засваення зместу адукацыйных праграм, у выпадках і парадку, устаноўленых гэтым Кодэксам і (або) іншымі актамі заканадаўства, праводзяцца конкурс, праверка здольнасцей.

7. Прыём (залічэнне) асоб для атрымання навукова-арыентаванай адукацыі ажыццяўляецца ў парадку, які вызначаецца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

8. Прыём (залічэнне) асоб для атрымання агульнай вышэйшай адукацыі, спецыяльнай вышэйшай адукацыі ажыццяўляецца ў адпаведнасці з правіламі прыёму, якія зацвярджаюцца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

Прыём (залічэнне) асоб для атрымання паглыбленай вышэйшай адукацыі ажыццяўляецца ў адпаведнасці з правіламі прыёму, якія зацвярджаюцца Урадам Рэспублікі Беларусь.

Прыём (залічэнне) асоб для атрымання вышэйшай адукацыі ва ўстановы вышэйшай адукацыі, якія знаходзяцца ў падпарадкаванні органаў дзяржаўнай бяспекі, ажыццяўляецца ў адпаведнасці з правіламі прыёму, якія зацвярджаюцца Камітэтам дзяржаўнай бяспекі.

9. Прыём (залічэнне) кіруючых кадраў, асоб, уключаных у рэзервы кіруючых кадраў, для атрымання агульнай вышэйшай адукацыі і спецыяльнай вышэйшай адукацыі ў рамках дзяржаўнага заказу ў Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь ажыццяўляецца ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам і Правіламі прыёму ў Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь для падрыхтоўкі, перападрыхтоўкі, стажыроўкі і павышэння кваліфікацыі ў адпаведнасці з дзяржаўным заказам, які зацвярджаецца Акадэміяй кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь па ўзгадненні з Адміністрацыяй Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

10. Прыём (залічэнне) асоб для атрымання сярэдняй спецыяльнай адукацыі ажыццяўляецца ў адпаведнасці з правіламі прыёму, якія зацвярджаюцца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

11. Прыём (залічэнне) асоб для атрымання прафесійна-тэхнічнай адукацыі ажыццяўляецца ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам і правіламі прыёму, якія зацвярджаюцца Урадам Рэспублікі Беларусь.

12. Прыём (залічэнне) асоб для атрымання агульнай сярэдняй адукацыі ажыццяўляецца ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам, Палажэннем аб установе агульнай сярэдняй адукацыі або яе відзе. Асаблівасці прыёму асоб у сярэднія школы, гімназіі, ліцэі, універсітэты для засваення зместу адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі з вывучэннем асобных вучэбных прадметаў на павышаным узроўні ў рамках арганізацыі профільнага навучання вызначаюцца правіламі прыёму, якія зацвярджаюцца Міністэрствам адукацыі.

Асаблівасці прыёму асоб у гімназіі – каледжы мастацтваў, акадэміі (кансерваторыі) для засваення зместу адукацыйнай праграмы базавай адукацыі, адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі з вывучэннем на павышаным узроўні вучэбных прадметаў, змест якіх накіраваны на развіццё здольнасцей навучэнцаў у галіне асобных відаў мастацтва, вызначаюцца правіламі прыёму, якія зацвярджаюцца Міністэрствам культуры па ўзгадненні з Міністэрствам адукацыі. Асаблівасці прыёму асоб у спецыялізаваныя ліцэі з мэтай падрыхтоўкі навучэнцаў да паступлення ва ўстановы адукацыі для атрымання адукацыі па спецыяльнасцях для воінскіх фарміраванняў і ваенізаваных арганізацый вызначаюцца правіламі прыёму, якія зацвярджаюцца ў парадку, прадугледжаным часткай дзявятай пункта 8 артыкула 151 гэтага Кодэкса. Асаблівасці прыёму асоб у суvoраўскія ваенныя вучылішчы, кадэцкія вучылішчы вызначаюцца адпаведна Палажэннем аб суворaўскім ваенным вучылішчы, Палажэннем аб кадэцкім вучылішчы. Асаблівасці прыёму асоб у вучылішчы алімпійскага рэзерву для атрымання агульнай сярэдняй адукацыі вызначаюцца Міністэрствам спорту і турызму і Міністэрствам адукацыі.

Прыём (залічэнне) асоб у пачатковыя школы, базавыя школы, сярэднія школы (акрамя прыёму для засваення зместу адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі з вывучэннем асобных вучэбных прадметаў на павышаным узроўні ў рамках арганізацыі профільнага навучання), вячэрнія класы ў сярэдняй школе, а таксама ў школы-інтэрнаты для дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекавання бацькоў, санаторныя школы-інтэрнаты ажыццяўляецца ў парадку, які вызначаецца Палажэннем аб установе агульнай сярэдняй адукацыі або яе відзе.

13. Прыём (залічэнне) асоб для атрымання дашкольнай адукацыі, спецыяльнай адукацыі ажыццяўляецца ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам і ў парадку, які вызначаецца палажэннем аб адпаведным тыпе ўстановы адукацыі або яе відзе.

14. Прыём (залічэнне) асоб для атрымання дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі ажыццяўляецца ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам і ў парадку, які вызначаецца Палажэннем аб установе дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі або яе відзе.

15. Прыём (залічэнне) асоб для атрымання дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі ажыццяўляецца ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам і ў парадку, які вызначаецца Міністэрствам адукацыі.

16. Прыём (залічэнне) асоб для атрымання дадатковай адукацыі дарослых ажыццяўляецца ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам і ў парадку, які вызначаецца Палажэннем аб установе дадатковай адукацыі дарослых.

Прыём (залічэнне) асоб для атрымання дадатковай адукацыі дарослых ва ўстановы вышэйшай адукацыі, якія знаходзяцца ў падпарадкаванні органаў дзяржаўнай бяспекі, ажыццяўляецца ў адпаведнасці з правіламі прыёму, якія зацвярджаюцца Камітэтам дзяржаўнай бяспекі.

Да прыёму (залічэння) для засваення зместу адукацыйнай праграмы перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць вышэйшую адукацыю, допускаюцца асобы, якія маюць вышэйшую адукацыю, а таксама студэнты, курсанты, слухачы, што атрымліваюць першую агульную вышэйшую адукацыю, спецыяльную вышэйшую адукацыю па напрамку адукацыі «Ахова здароўя», апошніх двух курсаў, якія засвойваюць змест адукацыйнай праграмы бакалаўрыяту або бесперапыннай адукацыйнай праграмы вышэйшай адукацыі ў вочнай форме атрымання адукацыі па адпаведных профілях адукацыі, напрамках адукацыі, спецыяльнасцях, якія вызначаюцца Урадам Рэспублікі Беларусь, калі іншае не ўстаноўлена Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

Да прыёму (залічэння) для засваення зместу адукацыйнай праграмы перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць сярэднюю спецыяльную адукацыю, допускаюцца асобы, якія маюць сярэднюю спецыяльную адукацыю, а таксама навучэнцы, курсанты апошняга курса, якія засвойваюць змест адукацыйнай праграмы сярэдняй спецыяльнай адукацыі, што забяспечвае атрыманне кваліфікацыі спецыяліста з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, у вочнай форме атрымання адукацыі па адпаведных профілях

адукацыі, напрамках адукацыі, спецыяльнасцях, якія вызначаюцца Урадам Рэспублікі Беларусь, калі іншае не ўстаноўлена Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

Прыём (залічэнне) асоб для атрымання дадатковай адукацыі дарослых у рамках дзяржаўнага заказу ў Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь ажыццяўляецца ў адпаведнасці з Правіламі прыёму ў Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь для падрыхтоўкі, перападрыхтоўкі, стажыроўкі і павышэння кваліфікацыі ў адпаведнасці з дзяржаўным заказам.

17. Прыём (залічэнне) асоб у выхаваўча-аздараўленчыя ўстановы адукацыі ажыццяўляецца ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам і ў парадку, які вызначаецца Палажэннем аб выхаваўча-аздараўленчай установе адукацыі або яе відзе.

18. Прыём (залічэнне) асоб у сацыяльна-педагагічныя, спецыяльныя навучальна-выхаваўчыя і спецыяльныя лячэбна-выхаваўчыя ўстановы ажыццяўляецца ў парадку, прадугледжаным заканадаўствам аб прафілактыцы безнагляднасці і правапарушэнняў непаўналетніх.

19. Прыём (залічэнне) асоб для атрымання дашкольнай, агульнай сярэдняй і спецыяльнай адукацыі ва ўстановы адукацыі ажыццяўляецца з улікам медыцынскіх паказанняў і медыцынскіх проціпаказанняў для атрымання адукацыі, пералік якіх устанаўліваецца Міністэрствам аховы здароўя па ўзгадненні з Міністэрствам адукацыі.

Прыём (залічэнне) асоб для атрымання прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі ажыццяўляецца з улікам медыцынскіх проціпаказанняў да навучання па спецыяльнасці, што атрымліваецца, кваліфікацыі, што прысвойваецца, пералік якіх устанаўліваецца Міністэрствам аховы здароўя.

20. Асаблівасці прыёму (залічэння) асоб для атрымання адукацыі па спецыяльнасцях для воінскіх фарміраванняў і ваенізаваных арганізацый устанаўліваюцца заканадаўствам аб праходжанні адпаведнай службы.

**Артыкул 58. Патрабаванні да парадку прыёму (залічэння) асоб для атрымання адукацыі ў іншую арганізацыю, да індывідуальнага прадпрымальніка, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць**

1. У Рэспубліцы Беларусь кожны мае права звяртацца для атрымання адукацыі ў любую іншую арганізацыю, да любога індывідуальнага прадпрымальніка, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, якія абавязаны разгледзець усе кандыдатуры ў адпаведнасці з устаноўленай працэдурай прыёму (залічэння).

2. Прыём (залічэнне) асоб для атрымання адукацыі ў іншую арганізацыю, да індывідуальнага прадпрымальніка, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, ажыццяўляецца ў рамках гранічнай колькасці навучэнцаў, указанай у Адзіным рэестры ліцэнзій, калі наяўнасць ліцэнзіі на адукацыйную дзейнасць прадугледжана заканадаўствам аб ліцэнзаванні, а калі для ажыццяўлення адукацыйнай дзейнасці наяўнасць ліцэнзіі не патрабуецца – у адпаведнасці з кантрольнымі лічбамі прыёму з улікам санітарна-эпідэміялагічных патрабаванняў.

3. Кантрольныя лічбы прыёму для атрымання адукацыі ў іншай арганізацыі, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, за кошт сродкаў рэспубліканскага і (або) мясцовых бюджэтаў устанаўліваюцца яе заснавальнікам, а ў іншых выпадках – яе заснавальнікам або ва ўстаноўленым ім парадку. Кантрольныя лічбы прыёму для атрымання адукацыі ў індывідуальнага прадпрымальніка, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, устанаўліваюцца ім самастойна.

4. З мэтай адбору асоб, найбольш падрыхтаваных для засваення зместу адукацыі, у выпадках і парадку, устаноўленых гэтым Кодэксам і (або) іншымі актамі заканадаўства, праводзяцца конкурс, праверка здольнасцей.

5. Прыём (залічэнне) асоб для атрымання дашкольнай, спецыяльнай адукацыі, дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі ў іншую арганізацыю, да індывідуальнага

прадпрымальніка, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, ажыццяўляецца ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам.

6. Прыём (залічэнне) асоб для атрымання дадатковай адукацыі дарослых у іншую арганізацыю, да індывідуальнага прадпрымальніка, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, ажыццяўляецца ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам і ў парадку, які вызначаецца Палажэннем аб установе дадатковай адукацыі дарослых.

**Артыкул 59. Дагаворы ў сферы адукацыі**

1. Для атрымання навукова-арыентаванай, вышэйшай, сярэдняй спецыяльнай, прафесійна-тэхнічнай адукацыі, у тым ліку на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі, дадатковай адукацыі дарослых пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы прафесійнай падрыхтоўкі рабочых (служачых), адукацыйнай праграмы перападрыхтоўкі рабочых (служачых), адукацыйнай праграмы павышэння кваліфікацыі рабочых (служачых) у іншай арганізацыі, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, за кошт сродкаў іншай арганізацыі, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, або па заяўцы арганізацыі – заказчыка кадраў за кошт сродкаў арганізацыі – заказчыка кадраў, а таксама для аказання паслуг у сферы адукацыі пры рэалізацыі адукацыйных праграм на платнай аснове заключаецца дагавор, калі іншае не ўстаноўлена гэтым Кодэксам, іншымі заканадаўчымі актамі.

2. Падставай для ўзнікнення адукацыйных адносін могуць выступаць:

2.1. дагавор аб падрыхтоўцы спецыяліста з вышэйшай адукацыяй, спецыяліста (рабочага) з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, рабочага (служачага) з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй за кошт сродкаў рэспубліканскага (мясцовага) бюджэту;

2.2. дагавор аб мэтавай падрыхтоўцы спецыяліста з вышэйшай адукацыяй, спецыяліста (рабочага) з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, рабочага (служачага) з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй;

2.3. дагавор аб падрыхтоўцы спецыяліста з вышэйшай адукацыяй, спецыяліста (рабочага) з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, рабочага (служачага) з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй на платнай аснове;

2.4. дагавор аб падрыхтоўцы навуковага работніка вышэйшай кваліфікацыі за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту;

2.5. дагавор аб падрыхтоўцы навуковага работніка вышэйшай кваліфікацыі на платнай аснове;

2.6. дагавор аб прафесійнай падрыхтоўцы, перападрыхтоўцы, павышэнні кваліфікацыі рабочага (служачага) у іншай арганізацыі, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, за кошт сродкаў іншай арганізацыі, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, або па заяўцы арганізацыі – заказчыка кадраў за кошт сродкаў арганізацыі – заказчыка кадраў;

2.7. дагавор аб аказанні паслуг пры рэалізацыі адукацыйных праграм на платнай аснове;

2.8. дагавор аб падрыхтоўцы спецыяліста з вышэйшай адукацыяй, спецыяліста (рабочага) з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй за кошт грантаў на навучанне.

3. Тыпавыя формы дагавораў устанаўліваюцца Урадам Рэспублікі Беларусь або ўпаўнаважаным ім органам, калі іншае не ўстаноўлена гэтым Кодэксам.

Парадак заключэння дагавора аб падрыхтоўцы спецыяліста з вышэйшай адукацыяй, спецыяліста (рабочага) з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй за кошт грантаў на навучанне, а таксама істотныя ўмовы такога дагавора ўстанаўліваюцца Урадам Рэспублікі Беларусь.

4. Дагавор з непаўналетнім грамадзянінам заключаецца толькі з пісьмовай згоды яго законнага прадстаўніка.

**Артыкул 60. Дагавор аб падрыхтоўцы спецыяліста з вышэйшай адукацыяй, спецыяліста (рабочага) з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, рабочага (служачага) з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй за кошт сродкаў рэспубліканскага (мясцовага) бюджэту**

1. Падрыхтоўка спецыяліста з вышэйшай адукацыяй, спецыяліста (рабочага) з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, рабочага (служачага) з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй за кошт сродкаў рэспубліканскага (мясцовага) бюджэту ажыццяўляецца на падставе дагавора аб падрыхтоўцы спецыяліста з вышэйшай адукацыяй, спецыяліста (рабочага) з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, рабочага (служачага) з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй за кошт сродкаў рэспубліканскага (мясцовага) бюджэту.

2. Дагавор аб падрыхтоўцы спецыяліста з вышэйшай адукацыяй, спецыяліста (рабочага) з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, рабочага (служачага) з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй за кошт сродкаў рэспубліканскага (мясцовага) бюджэту заключаецца паміж дзяржаўнай установай адукацыі і грамадзянінам.

3. Істотнымі ўмовамі дагавора аб падрыхтоўцы спецыяліста з вышэйшай адукацыяй, спецыяліста (рабочага) з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, рабочага (служачага) з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй за кошт сродкаў рэспубліканскага (мясцовага) бюджэту з'яўляюцца:

3.1. прадмет дагавора;

3.2. спецыяльнасць, па якой будзе ажыццяўляцца падрыхтоўка;

3.3. кваліфікацыя і (або) ступень;

3.4. тэрмін атрымання адукацыі;

3.5. кошт навучання, парадак яго змянення;

3.6. працаўладкаванне ў адпаведнасці з атрыманай спецыяльнасцю, прысвоенай кваліфікацыяй і (або) ступенню;

3.7. тэрмін абавязковай працы;

3.8. форма атрымання адукацыі;

3.9. пакрыццё сродкаў, затрачаных дзяржавай на падрыхтоўку спецыяліста, рабочага, служачага ў выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам і іншымі заканадаўчымі актамі;

3.10. адказнасць бакоў.

4. Умовы, якія ўтрымліваюцца ў падпунктах 3.6, 3.7 і 3.9 пункта 3 гэтага артыкула, не з'яўляюцца істотнымі ў выпадку заключэння дагавора аб падрыхтоўцы спецыяліста з вышэйшай адукацыяй, спецыяліста (рабочага) з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, рабочага (служачага) з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй за кошт сродкаў рэспубліканскага (мясцовага) бюджэту з асобамі, якія не падлягаюць размеркаванню.

**Артыкул 61. Дагавор аб мэтавай падрыхтоўцы спецыяліста з вышэйшай адукацыяй, спецыяліста (рабочага) з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, рабочага (служачага) з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй**

1. Падрыхтоўка спецыяліста з вышэйшай адукацыяй, спецыяліста (рабочага) з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, рабочага (служачага) з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі ажыццяўляецца на падставе дагавора аб мэтавай падрыхтоўцы спецыяліста з вышэйшай адукацыяй, спецыяліста (рабочага) з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, рабочага (служачага) з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй.

2. Дагавор аб мэтавай падрыхтоўцы спецыяліста з вышэйшай адукацыяй, спецыяліста (рабочага) з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, рабочага (служачага) з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй заключаецца паміж дзяржаўнай установай адукацыі, грамадзянінам і арганізацыяй – заказчыкам кадраў, якая мае патрэбу ў падрыхтоўцы спецыяліста з агульнай вышэйшай адукацыяй, або спецыяліста з паглыбленай вышэйшай адукацыяй, або спецыяліста са спецыяльнай вышэйшай адукацыяй, або спецыяліста (рабочага)

з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, або рабочага (служачага) з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй.

3. Істотнымі ўмовамі дагавора аб мэтавай падрыхтоўцы спецыяліста з вышэйшай адукацыяй, спецыяліста (рабочага) з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, рабочага (служачага) з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй з'яўляюцца:

3.1. прадмет дагавора;

3.2. спецыяльнасць, па якой будзе ажыццяўляцца падрыхтоўка;

3.3. кваліфікацыя і (або) ступень;

3.4. тэрмін атрымання адукацыі;

3.5. кошт навучання, парадак яго змянення;

3.6. стварэнне арганізацыяй – заказчыкам кадраў умоў навучэнцам для праходжання вытворчага навучання, практыкі, правядзення практычных заняткаў, а пры падрыхтоўцы спецыяліста з вышэйшай адукацыяй таксама для выканання навукова-даследчых, доследна-канструктарскіх і доследна-тэхналагічных работ, апрабацыі і ўкаранення вынікаў навуковай дзейнасці;

3.7. працаўладкаванне ў адпаведнасці з атрыманай спецыяльнасцю, прысвоенай кваліфікацыяй і (або) ступенню;

3.8. тэрмін абавязковай працы;

3.9. форма атрымання адукацыі;

3.10. пакрыццё сродкаў, затрачаных дзяржавай на падрыхтоўку спецыяліста, рабочага, служачага, у выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам і іншымі заканадаўчымі актамі;

3.11. адказнасць бакоў.

**Артыкул 62. Дагавор аб падрыхтоўцы спецыяліста з вышэйшай адукацыяй, спецыяліста (рабочага) з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, рабочага (служачага) з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй на платнай аснове**

1. Падрыхтоўка спецыяліста з вышэйшай адукацыяй, спецыяліста (рабочага) з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, рабочага (служачага) з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй за кошт сродкаў юрыдычных асоб, індывідуальных прадпрымальнікаў, фізічных асоб або ўласных сродкаў грамадзяніна ажыццяўляецца на падставе дагавора аб падрыхтоўцы спецыяліста з вышэйшай адукацыяй, спецыяліста (рабочага) з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, рабочага (служачага) з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй на платнай аснове.

2. Дагавор аб падрыхтоўцы спецыяліста з вышэйшай адукацыяй, спецыяліста (рабочага) з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, рабочага (служачага) з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй на платнай аснове заключаецца паміж установай адукацыі і грамадзянінам, а таксама юрыдычнай асобай, індывідуальным прадпрымальнікам або фізічнай асобай, якія ажыццяўляюць аплату кошту навучання (пры іх наяўнасці).

3. Істотнымі ўмовамі дагавора аб падрыхтоўцы спецыяліста з вышэйшай адукацыяй, спецыяліста (рабочага) з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, рабочага (служачага) з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй на платнай аснове з'яўляюцца:

3.1. прадмет дагавора;

3.2. спецыяльнасць, па якой будзе ажыццяўляцца падрыхтоўка;

3.3. кваліфікацыя і (або) ступень;

3.4. тэрмін атрымання адукацыі;

3.5. кошт навучання, парадак яго змянення;

3.6. парадак разлікаў за навучанне;

3.7. форма атрымання адукацыі;

3.8. адказнасць бакоў.

**Артыкул 63. Дагавор аб падрыхтоўцы навуковага работніка вышэйшай кваліфікацыі за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту**

1. Падрыхтоўка навуковага работніка вышэйшай кваліфікацыі за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту ажыццяўляецца на падставе дагавора аб падрыхтоўцы навуковага работніка вышэйшай кваліфікацыі за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту.

2. Дагавор аб падрыхтоўцы навуковага работніка вышэйшай кваліфікацыі за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту заключаецца паміж дзяржаўнай установай адукацыі або дзяржаўнай арганізацыяй, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, грамадзянінам і арганізацыяй – заказчыкам кадраў, якая мае патрэбу ў падрыхтоўцы навуковага работніка вышэйшай кваліфікацыі.

3. Істотнымі ўмовамі дагавора аб падрыхтоўцы навуковага работніка вышэйшай кваліфікацыі за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту з'яўляюцца:

3.1. прадмет дагавора;

3.2. спецыяльнасць, па якой будзе ажыццяўляцца падрыхтоўка;

3.3. кваліфікацыя;

3.4. тэрмін атрымання адукацыі;

3.5. кошт навучання, парадак яго змянення;

3.6. працаўладкаванне ў адпаведнасці з атрыманай спецыяльнасцю, прысвоенай кваліфікацыяй;

3.7. тэрмін абавязковай працы;

3.8. форма атрымання адукацыі;

3.9. пакрыццё сродкаў, затрачаных дзяржавай на падрыхтоўку навуковага работніка вышэйшай кваліфікацыі, у выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам і іншымі заканадаўчымі актамі;

3.10. адказнасць бакоў.

4. Умовы, якія ўтрымліваюцца ў падпунктах 3.6, 3.7 і 3.9 пункта 3 гэтага артыкула, не з'яўляюцца істотнымі ў выпадку заключэння дагавора аб падрыхтоўцы навуковага работніка вышэйшай кваліфікацыі за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту з асобамі, якія не падлягаюць накіраванню на працу.

**Артыкул 64. Дагавор аб падрыхтоўцы навуковага работніка вышэйшай кваліфікацыі на платнай аснове**

1. Падрыхтоўка навуковага работніка вышэйшай кваліфікацыі за кошт сродкаў юрыдычных асоб, індывідуальных прадпрымальнікаў, фізічных асоб або ўласных сродкаў грамадзяніна ажыццяўляецца на падставе дагавора аб падрыхтоўцы навуковага работніка вышэйшай кваліфікацыі на платнай аснове.

2. Дагавор аб падрыхтоўцы навуковага работніка вышэйшай кваліфікацыі на платнай аснове заключаецца паміж установай адукацыі або арганізацыяй, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, і грамадзянінам, а таксама юрыдычнай асобай, індывідуальным прадпрымальнікам або фізічнай асобай, якія ажыццяўляюць аплату кошту навучання (пры іх наяўнасці).

3. Істотнымі ўмовамі дагавора аб падрыхтоўцы навуковага работніка вышэйшай кваліфікацыі на платнай аснове з'яўляюцца:

3.1. прадмет дагавора;

3.2. спецыяльнасць, па якой будзе ажыццяўляцца падрыхтоўка;

3.3. кваліфікацыя;

3.4. тэрмін атрымання адукацыі;

3.5. кошт навучання, парадак яго змянення;

3.6. парадак разлікаў за навучанне;

3.7. форма атрымання адукацыі;

3.8. адказнасць бакоў.

**Артыкул 65. Дагавор аб прафесійнай падрыхтоўцы, перападрыхтоўцы, павышэнні кваліфікацыі рабочага (служачага) у іншай арганізацыі, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, за кошт сродкаў іншай арганізацыі, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, або па заяўцы арганізацыі – заказчыка кадраў за кошт сродкаў арганізацыі – заказчыка кадраў**

1. Прафесійная падрыхтоўка, перападрыхтоўка, павышэнне кваліфікацыі рабочага (служачага) у іншай арганізацыі, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, за кошт сродкаў іншай арганізацыі, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, або па заяўцы арганізацыі – заказчыка кадраў за кошт сродкаў арганізацыі – заказчыка кадраў ажыццяўляюцца на падставе дагавора аб прафесійнай падрыхтоўцы, перападрыхтоўцы, павышэнні кваліфікацыі рабочага (служачага) у іншай арганізацыі, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, за кошт сродкаў іншай арганізацыі, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, або па заяўцы арганізацыі – заказчыка кадраў за кошт сродкаў арганізацыі – заказчыка кадраў.

2. Дагавор аб прафесійнай падрыхтоўцы, перападрыхтоўцы, павышэнні кваліфікацыі рабочага (служачага) у іншай арганізацыі, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, за кошт сродкаў іншай арганізацыі, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, заключаецца паміж іншай арганізацыяй, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, і грамадзянінам.

Дагавор аб прафесійнай падрыхтоўцы, перападрыхтоўцы, павышэнні кваліфікацыі рабочага (служачага) па заяўцы арганізацыі – заказчыка кадраў за кошт сродкаў арганізацыі – заказчыка кадраў заключаецца паміж іншай арганізацыяй, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, арганізацыяй – заказчыкам кадраў і грамадзянінам.

3. Істотнымі ўмовамі дагавора аб прафесійнай падрыхтоўцы, перападрыхтоўцы, павышэнні кваліфікацыі рабочага (служачага) у іншай арганізацыі, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, за кошт сродкаў іншай арганізацыі, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, або па заяўцы арганізацыі – заказчыка кадраў за кошт сродкаў арганізацыі – заказчыка кадраў з’яўляюцца:

3.1. прадмет дагавора;

3.2. прафесія рабочага (пасада служачага, акрамя пасад кіраўнікоў і спецыялістаў), па якой будуць ажыццяўляцца прафесійная падрыхтоўка, перападрыхтоўка, павышэнне кваліфікацыі рабочага (служачага);

3.3. кваліфікацыя (разрад па прафесіі рабочага, які прысвойваецца);

3.4. тэрмін атрымання адукацыі;

3.5. працаўладкаванне ў іншай арганізацыі, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, або ў арганізацыі – заказчыку кадраў, якая накіравала рабочага (служачага) на навучанне ў іншую арганізацыю, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, у адпаведнасці з прысвоеным разрадам;

3.6. тэрмін абавязковай працы;

3.7. выплаты слухачу ў адпаведнасці з актамі заканадаўства;

3.8. форма атрымання адукацыі;

3.9. адказнасць бакоў.

**Артыкул 66. Дагавор аб аказанні паслуг пры рэалізацыі адукацыйных праграм на платнай аснове**

1. Аказанне ўстановай адукацыі, арганізацыяй, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, іншай арганізацыяй, індывідуальным прадпрымальнікам, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, паслуг пры рэалізацыі адукацыйных праграм на платнай аснове, акрамя падрыхтоўкі спецыяліста з вышэйшай адукацыяй, спецыяліста (рабочага) з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, рабочага (служачага) з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй на платнай аснове, падрыхтоўкі навуковага работніка вышэйшай

кваліфікацыі на платнай аснове, ажыццяўляецца на падставе дагавора аб аказанні паслуг пры рэалізацыі адукацыйных праграм на платнай аснове.

2. Істотнымі ўмовамі дагавора аб аказанні паслуг пры рэалізацыі адукацыйных праграм на платнай аснове з'яўляюцца:

2.1. прадмет дагавора;

2.2. дата пачатку адукацыйнага працэсу або парадак яе вызначэння;

2.3. форма атрымання адукацыі;

2.4. тэрмін навучання;

2.5. кошт навучання, парадак яго змянення;

2.6. парадак разлікаў за навучанне;

2.7. адказнасць бакоў.

3. Заканадаўствам у галіне транспартнай дзейнасці могуць вызначацца асаблівасці заключэння дагавораў па падрыхтоўцы, перападрыхтоўцы, павышэнні кваліфікацыі вадзіцеляў механічных транспартных сродкаў, самаходных машын, а таксама дзяржаўныя органы, якія ўстанаўліваюць тыпавыя формы такіх дагавораў.

### Артыкул 67. Змяненне адукацыйных адносін

1. Падставай для змянення адукацыйных адносін з'яўляецца рашэнне кіраўніка ўстановы адукацыі, арганізацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, іншай арганізацыі, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, індывідуальнага прадпрымальніка, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць. У рашэнні кіраўніка ўстановы адукацыі, арганізацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, іншай арганізацыі, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, індывідуальнага прадпрымальніка, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, указваюцца падстава, дата змянення адукацыйных адносін, а таксама могуць быць вызначаны ўмовы, парадак, тэрміны іх змянення. З рашэннем аб змяненні адукацыйных адносін навучэнец, законны прадстаўнік непаўналетняга навучэнца павінны быць азнаёмлены пад роспіс.

Калі для ўзнікнення адукацыйных адносін неабходна заключэнне дагавора, то рашэнню кіраўніка ўстановы адукацыі, арганізацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, іншай арганізацыі, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, індывідуальнага прадпрымальніка, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, аб змяненні адукацыйных адносін папярэднічае ўнясенне адпаведных змяненняў і (або) дапаўненняў у дагавор.

2. Адукацыйныя адносіны могуць быць зменены ў сувязі з:

2.1. пераводам для атрымання адукацыі ў іншай форме атрымання адукацыі;

2.2. пераводам для атрымання адукацыі па іншай спецыяльнасці;

2.3. прадастаўленнем водпуску;

2.4. пераводам з навучання на платнай аснове на навучанне за кошт сродкаў рэспубліканскага і (або) мясцовых бюджэтаў;

2.5. рэарганізацыяй установы адукацыі, арганізацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, іншай арганізацыі, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць;

2.6. змяненнем заканадаўства аб адукацыі;

2.7. іншымі акалічнасцямі.

3. Адукацыйныя адносіны могуць быць зменены па ініцыятыве навучэнца, законнага прадстаўніка непаўналетняга навучэнца, установы адукацыі, арганізацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, іншай арганізацыі, індывідуальнага прадпрымальніка, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, юрыдычнай асобы, індывідуальнага прадпрымальніка, фізічнай асобы, якія ажыццяўляюць аплату кошту навучання, а таксама арганізацыі – заказчыка кадраў.

4. Парадак і ўмовы пераводу навучэнцаў для атрымання адукацыі ў іншай форме атрымання адукацыі, па іншай спецыяльнасці ўстанаўліваюцца Урадам Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 68. Спыненне адукацыйных адносін (адлічэнне)**

1. Падставай для спынення адукацыйных адносін (адлічэння) з'яўляецца рашэнне кіраўніка ўстановы адукацыі, арганізацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, іншай арганізацыі, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, індывідуальнага прадпрымальніка, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, аб адлічэнні. У рашэнні кіраўніка ўстановы адукацыі, арганізацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, іншай арганізацыі, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, індывідуальнага прадпрымальніка, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, аб адлічэнні ўказваюцца падстава і дата спынення адукацыйных адносін (адлічэння).

З рашэннем аб адлічэнні навучэнец, законны прадстаўнік непаўналетняга навучэнца павінны быць азнаёмлены пад роспіс не пазней за дату спынення адукацыйных адносін (адлічэння), указаную ў рашэнні. Пры немагчымасці такога азнаямлення копія рашэння накіроўваецца навучэнцу, законнаму прадстаўніку непаўналетняга навучэнца па месцы жыхарства (месцы знаходжання) не пазней за дзень спынення адукацыйных адносін (адлічэння), указанага ў рашэнні.

У выпадках спынення адукацыйных адносін (адлічэння) на падставах, прадугледжаных падпунктамі 2.1 і 2.2 пункта 2 гэтага артыкула, азнаямленне навучэнца, законнага прадстаўніка непаўналетняга навучэнца з рашэннем аб адлічэнні не патрабуецца. Адукацыйныя адносіны спыняюцца з даты спынення адукацыйных адносін (адлічэння), указанай у рашэнні аб адлічэнні.

Правы і абавязкі навучэнца, прадугледжаныя заканадаўствам аб адукацыі і лакальнымі прававымі актамі, спыняюцца з дня, наступнага за днём спынення адукацыйных адносін (адлічэння), а калі навучэнец не быў належным чынам апавешчаны аб адлічэнні – з дня, наступнага за днём належнага паведамлення. Правы і абавязкі навучэнца, прадугледжаныя дагаворам у сферы адукацыі, спыняюцца ў адпаведнасці з такім дагаворам і актамі заканадаўства.

Калі для ўзнікнення адукацыйных адносін неабходна заключэнне дагавора, то пры датэрміновым спыненні адукацыйных адносін (адлічэнні) па ініцыятыве навучэнца, законнага прадстаўніка непаўналетняга навучэнца рашэнню кіраўніка ўстановы адукацыі, арганізацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, іншай арганізацыі, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, індывідуальнага прадпрымальніка, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, аб адлічэнні папярэднічае скасаванне дагавора.

2. Адукацыйныя адносіны спыняюцца:

2.1. у сувязі з атрыманнем адукацыі, акрамя асоб, якія атрымалі пачатковую адукацыю ў базавай школе, сярэдняй школе, гімназіі, школе-інтэрнаце для дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекавання бацькоў, універсітэце, што рэалізуе адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, спецыяльнай школе-інтэрнаце, а таксама дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекавання бацькоў, асоб з ліку дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекавання бацькоў, якія атрымалі агульную базавую, агульную сярэднюю, спецыяльную адукацыю ў школе-інтэрнаце для дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекавання бацькоў, спецыяльнай школе-інтэрнаце, і асоб, якія атрымалі агульную базавую, агульную сярэднюю, сярэднюю спецыяльную адукацыю ў вучылішчах алімпійскага рэзерву і працягваюць выконваць вучэбную праграму па асобным відзе спорту па 31 жніўня года, у якім атрымана адпаведная адукацыя;

2.2. у сувязі са спыненнем выканання вучэбнай праграмы па асобным відзе спорту ў год атрымання агульнай базавай, агульнай сярэдняй, сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў вучылішчах алімпійскага рэзерву;

2.3. датэрмінова на падставах, прадугледжаных пунктам 3 гэтага артыкула;

2.4. у сувязі са сканчэннем устаноўленага судом тэрміну знаходжання непаўналетняга выхаванца ў спецыяльнай навучальна-выхаваўчай установе, спецыяльнай лячэбна-выхаваўчай установе;

2.5. у сувязі з вызваленнем ад адбывання пакарання, пераводам да іншага месца адбывання пакарання навучэнца, які атрымлівае адукацыю ў дзяржаўнай установе адукацыі (філіяле), што знаходзіцца на тэрыторыі папраўчай установы крымінальна-выканаўчай сістэмы Міністэрства ўнутраных спраў, рэспубліканскага ўнітарнага вытворчага прадпрыемства, падпарадкаванага Дэпартаменту выканання пакаранняў Міністэрства ўнутраных спраў, лячэбна-працоўнага прафілакторыя Міністэрства ўнутраных спраў.

3. Адукацыйныя адносіны спыняюцца датэрмінова:

3.1. па ініцыятыве навучэнца, законнага прадстаўніка непаўналетняга навучэнца;

3.2. па ініцыятыве ўстановы адукацыі, арганізацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, іншай арганізацыі, індывідуальнага прадпрымальніка, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць;

3.3. па акалічнасцях, не залежных ад волі навучэнца, установы адукацыі, арганізацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, іншай арганізацыі, індывідуальнага прадпрымальніка, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць.

4. Датэрміновае спыненне адукацыйных адносін (адлічэнне) па ініцыятыве навучэнца, законнага прадстаўніка непаўналетняга навучэнца ажыццяўляецца:

4.1. для пераводу ў іншую ўстанову адукацыі, арганізацыю, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі;

4.2. па ўласным жаданні.

5. Датэрміновае спыненне адукацыйных адносін (адлічэнне) па ініцыятыве ўстановы адукацыі, арганізацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, іншай арганізацыі, індывідуальнага прадпрымальніка, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, ажыццяўляецца ў выпадку:

5.1. няяўкі ў год прыёму (залічэння) на вучэбныя заняткі на працягу 30 дзён пасля пачатку навучальнага года асобы, прынятай (залічанай) ва ўстанову адукацыі для атрымання прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай, вышэйшай адукацыі, пры непрадстаўленні (асабіста або праз законнага прадстаўніка непаўналетняга навучэнца) дакументаў, якія пацвярджаюць уважлівасць прычыны яе адсутнасці;

5.2. атрымання навучэнцам трох нездавальняючых адзнак па выніках прамежкавай атэстацыі ў семестры (паўгоддзі) пры засваенні зместу адукацыйных праграм прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай, вышэйшай адукацыі, адукацыйнай праграмы перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць вышэйшую адукацыю, адукацыйнай праграмы перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць сярэднюю спецыяльную адукацыю;

5.3. атрымання навучэнцам нездавальняючых адзнак па двух вучэбных прадметах (для навучэнцаў сувораўскіх ваенных вучылішчаў), па двух вучэбных прадметах, змест якіх накіраваны на развіццё здольнасцей навучэнцаў у галіне асобных відаў мастацтва (для навучэнцаў гімназій – каледжаў мастацтваў, акадэмій (кансерваторый), якія засвойваюць змест адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі), па выніках выніковай атэстацыі;

5.4. атрымання навучэнцам нездавальняючай адзнакі па выніках выніковай атэстацыі пры засваенні зместу адукацыйных праграм прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай, вышэйшай адукацыі;

5.5. непраходжання навучэнцам выніковай атэстацыі ва ўстаноўленыя тэрміны, акрамя непраходжання такой атэстацыі па ўважлівай прычыне;

5.6. незацвярджэння прамежкавай, выніковай справаздачы аспіранта, ад’юнкта, дактаранта, саіскальніка аб выкананні індывідуальнага плана працы аспіранта, ад’юнкта, дактаранта, саіскальніка па выніках прамежкавай або выніковай атэстацыі аспіранта,

ад’юнкта, дактаранта, саіскальніка пры засваенні зместу адукацыйных праграм навукова-арыентаванай адукацыі;

5.7. неліквідацыі навучэнцам акадэмічнай запазычанасці ва ўстаноўленыя тэрміны;

5.8. невыканання вучэбнай праграмы па асобным відзе спорту, парушэння спартыўнага рэжыму навучэнцам вучылішча алімпійскага рэзерву, які засвойвае змест адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі;

5.9. бесперапыннай адсутнасці на занятках без уважлівых прычын больш за 30 дзён выхаванца, які засвойвае змест адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі або адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі;

5.10. бесперапыннай адсутнасці на вучэбных занятках, занятках без уважлівых прычын больш за 30 дзён асобы, якая засвойвае змест адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі, адной з адукацыйных праграм прафесійна-тэхнічнай адукацыі;

5.11. бесперапыннай адсутнасці на вучэбных занятках, занятках без уважлівых прычын больш за 20 дзён асобы, якая засвойвае змест адукацыйнай праграмы перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць сярэднюю спецыяльную адукацыю, або адукацыйнай праграмы перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць вышэйшую адукацыю;

5.12. адсутнасці на вучэбных занятках, занятках, акрамя выпадку, прадугледжанага падпунктам 5.18.1 гэтага пункта, без уважлівых прычын больш за 72 акадэмічныя гадзіны на працягу семестра або паўгоддзя асобы, якая засвойвае змест адной з адукацыйных праграм сярэдняй спецыяльнай, вышэйшай адукацыі або адукацыйнай праграмы аспірантуры (ад’юнктуры);

5.13. бесперапыннай адсутнасці на вучэбных занятках, занятках без уважлівых прычын больш за тры дні асобы, якая засвойвае змест адной з адукацыйных праграм дадатковай адукацыі дарослых, за выключэннем асоб, якія засвойваюць змест адукацыйнай праграмы перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць вышэйшую адукацыю, адукацыйнай праграмы перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць сярэднюю спецыяльную адукацыю;

5.14. нявыхаду навучэнца з акадэмічнага водпуску, водпуску па доглядзе дзіцяці да дасягнення ім узросту трох гадоў на працягу сямі каляндарных дзён пасля заканчэння тэрміну акадэмічнага водпуску, водпуску па доглядзе дзіцяці да дасягнення ім узросту трох гадоў;

5.15. няяўкі навучэнца на вучэбныя заняткі, заняткі па сканчэнні аднаго года з даты звальнення з тэрміновай ваеннай службы, з ваеннай службы афіцэраў па прызыве ў запас або адстаўку або звальнення з альтэрнатыўнай службы;

5.16. невыканання або неналежнага выканання без уважлівых прычын абавязкаў навучэнцам, які мае нязнятае (непагашанае) дысцыплінарнае спагнанне;

5.17. неўнясення платы за навучанне ў тэрміны, прадугледжаныя актамі заканадаўства або дагаворам;

5.18. аднаразовага грубага парушэння студэнтам, аспірантам, дактарантам абавязкаў навучэнцаў, якое выявілася ў:

5.18.1. адсутнасці на вучэбных занятках у сувязі з адбываннем адміністрацыйнага спагнання ў выглядзе адміністрацыйнага арышту;

5.18.2. учыненні дзеянняў, якія перашкаджаюць іншым удзельнікам адукацыйнага працэсу выконваць іх абавязкі і рэалізоўваць іх правы ў сферы адукацыі;

5.18.3. закліку навучэнцаў да невыканання імі сваіх абавязкаў.

6. Датэрміновае спыненне адукацыйных адносін (адлічэнне) з навучэнцамі на падставах, прадугледжаных падпунктамі 5.10–5.13 і 5.16 пункта 5 гэтага артыкула, прымяняецца як мера дысцыплінарнага спагнання і ажыццяўляецца ў парадку, прадугледжаным раздзелам V гэтага Кодэкса.

7. Датэрміновае спыненне адукацыйных адносін (адлічэнне) па акалічнасцях, не залежных ад волі навучэнца, установы адукацыі, арганізацыі, што рэалізуе адукацыйныя

праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, іншай арганізацыі, індывідуальнага прадпрымальніка, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, ажыццяўляецца ў выпадку:

7.1. прызнання навучэнца сувораўскага ваеннага вучылішча непрыгодным да працягу атрымання адукацыі ў гэтай установе адукацыі ў сувязі з пагаршэннем стану здароўя, што перашкаджае атрыманню адукацыі па спецыяльнасцях для Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь і транспартных войскаў, у парадку, які вызначаецца Міністэрствам абароны, і на ўмовах, якія вызначаюцца Міністэрствам абароны і Міністэрствам аховы здароўя;

7.2. прызнання навучэнца спецыялізаванага ліцэя непрыгодным да працягу атрымання адукацыі ў гэтай установе адукацыі ў сувязі з пагаршэннем стану здароўя пры наяўнасці медыцынскіх проціпаказанняў да атрымання адукацыі ў спецыялізаваным ліцэі ў парадку, які вызначаецца адпаведна Міністэрствам абароны, Міністэрствам унутраных спраў, Міністэрствам па надзвычайных сітуацыях, Дзяржаўным пагранічным камітэтам, Следчым камітэтам, Дзяржаўным камітэтам судовых экспертыз;

7.3. пагаршэння стану здароўя, што перашкаджае працягу занятку выбраным відам спорту (для навучэнцаў вучылішчаў алімпійскага рэзерву, якія засвойваюць змест адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі, і ўстаноў адукацыі, у якіх створаны спецыялізаваныя па спорце класы, пры адсутнасці магчымасці пераводу ў іншы клас);

7.4. пагаршэння стану здароўя, што перашкаджае працягу навучання па спецыяльнасці, якая атрымліваецца, кваліфікацыі, якая прысвойваецца, пры наяўнасці медыцынскіх проціпаказанняў, пералік якіх устанаўліваецца Міністэрствам аховы здароўя, што пацвярджаюцца заключэннем урачэбна-кансультацыйнай камісіі, у парадку, які вызначаецца Міністэрствам адукацыі па ўзгадненні з Міністэрствам аховы здароўя;

7.5. прызыву навучэнца на тэрміновую ваенную службу, ваенную службу афіцэраў па прызыве, накіраванні на альтэрнатыўную службу;

7.6. паступлення на ваенную службу па кантракце асоб, якія атрымліваюць прафесійна-тэхнічную, сярэднюю спецыяльную, вышэйшую, навукова-арыентаваную адукацыю, акрамя такіх асоб, якія атрымліваюць адукацыю ў завочнай форме атрымання адукацыі;

7.7. ліквідацыі ўстановы адукацыі, арганізацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, іншай арганізацыі, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, спынення дзейнасці індывідуальнага прадпрымальніка, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць;

7.8. скасавання структурнага падраздзялення, спынення дзейнасці адасобленага падраздзялення, рэарганізацыі ўстановы адукацыі, арганізацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, іншай арганізацыі, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, пры адсутнасці магчымасці працягнуць адукацыйныя адносіны;

7.9. прыпынення, спынення ліцэнзіі на адукацыйную дзейнасць установы адукацыі, іншай арганізацыі, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць (па іх адасобленых падраздзяленнях, у дачыненні да адной або некалькіх паслуг, якія складаюць адукацыйную дзейнасць);

7.10. уступлення ў законную сілу прыгавору суда, якім навучэнец асуджаны да пакарання, якое выключае працяг атрымання адукацыі;

7.11. уступлення ў законную сілу прыгавору суда з прымяненнем прымусовых мер выхаваўчага характару ў выглядзе змяшчэння непаўналетняга ў спецыяльную навучальна-выхаваўчую ўстанову або спецыяльную лячэбна-выхаваўчую ўстанову ці рашэння суда аб змяшчэнні непаўналетняга ў спецыяльную навучальна-выхаваўчую ўстанову або спецыяльную лячэбна-выхаваўчую ўстанову;

7.12. смерці навучэнца.

8. Датэрміновае спыненне адукацыйных адносін (адлічэнне) з навучэнцам на падставе, прадугледжанай падпунктам 7.5 пункта 7 гэтага артыкула, ажыццяўляецца па сканчэнні 14 каляндарных дзён з дня атрымання ўстановай адукацыі, арганізацыяй, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, дакумента, які

пацвярджае факт прызыву яго на ваенную службу, накіравання на альтэрнатыўную службу, у выпадку, калі навучэнец не падаў ва ўстаноўленым часткай другой пункта 5 артыкула 49 гэтага Кодэкса парадку заяву аб прадастаўленні водпуску для праходжання адпаведнай службы.

9. Датэрміновае спыненне адукацыйных адносін (адлічэнне) з кіруючымі кадрамі, а таксама асобамі, уключанымі ў рэзервы кіруючых кадраў, якія праходзяць падрыхтоўку, перападрыхтоўку, стажыроўку і павышэнне кваліфікацыі ў Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з дзяржаўным заказам, ажыццяўляецца на падставах, прадугледжаных гэтым Кодэксам, а таксама ў выпадку іх звальнення з дзяржаўнага органа, арганізацыі на падставах, якія прызнаюцца ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі дыскрэдытуючымі акалічнасцямі звальнення.

10. Пры датэрміновым спыненні адукацыйных адносін (адлічэнні) выдаецца даведка аб навучанні ў парадку, які ўстанаўліваецца Міністэрствам адукацыі.

11. Датэрміновае па ініцыятыве ўстановы адукацыі спыненне адукацыйных адносін (адлічэнне) з непаўналетнім навучэнцам, які засвойвае змест аднаго з відаў адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі, прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай або вышэйшай адукацыі, дапускаецца толькі са згоды адпаведнай камісіі па справах непаўналетніх мясцовага выканаўчага і распарадчага органа, калі іншае не ўстаноўлена часткай другой гэтага пункта, іншымі заканадаўчымі актамі.

Датэрміновае па ініцыятыве ўстановы адукацыі спыненне адукацыйных адносін (адлічэнне) з непаўналетнімі навучэнцамі суворaўскага ваеннага вучылішча, непаўналетнімі навучэнцамі, якія атрымліваюць адукацыю па спецыяльнасцях для воінскіх фарміраванняў і ваенізаваных арганізацый, ажыццяўляецца ў парадку, прадугледжаным заканадаўствам аб праходжанні адпаведнай службы.

12. Пры датэрміновым спыненні адукацыйных адносін (адлічэнні) на падставах, прадугледжаных падпунктамі 5.3 і 5.8 пункта 5, падпунктамі 7.1, 7.2 і 7.4 пункта 7 гэтага артыкула, кіраўнік установы адукацыі абавязаны прыняць меры для пераводу навучэнца, які атрымлівае агульную сярэднюю адукацыю, у іншую ўстанову адукацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі.

Пры датэрміновым спыненні адукацыйных адносін (адлічэнні) на падставе, прадугледжанай падпунктам 7.3 пункта 7 гэтага артыкула, кіраўнік установы адукацыі, у якой створаны спецыялізаваныя па спорце класы, абавязаны прыняць меры для пераводу навучэнца ў іншы клас гэтай установы адукацыі, а пры адсутнасці такой магчымасці – у іншую ўстанову адукацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі.

Пры датэрміновым спыненні адукацыйных адносін (адлічэнні) на падставе, прадугледжанай падпунктам 7.3 пункта 7 гэтага артыкула, з навучэнцам, які засвойвае змест адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі, кіраўнік вучылішча алімпійскага рэзерву абавязаны прыняць меры для пераводу навучэнца ў іншую ўстанову адукацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі.

13. Датэрміновае спыненне адукацыйных адносін (адлічэнне) з навучэнцам для пераводу з адной установы адукацыі, арганізацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, у іншую ўстанову адукацыі, арганізацыю, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, можа ажыццяўляцца пры атрыманні агульнай сярэдняй, прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай, вышэйшай, навукова-арыентаванай адукацыі, дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, дадатковай адукацыі дарослых, якая атрымліваецца пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць вышэйшую адукацыю, адукацыйнай праграмы перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць сярэднюю спецыяльную адукацыю.

Парадак і ўмовы адлічэння навучэнцаў з установы адукацыі, арганізацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, адлічэння навучэнцаў

для пераводу з адной установы адукацыі, арганізацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, у іншую ўстанову адукацыі, арганізацыю, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, устанаўліваюцца Урадам Рэспублікі Беларусь.

Установа адукацыі, арганізацыя, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, не мае права перашкаджаць адлічэнню для пераводу навучэнца, які выказаў жаданне перавесціся ў іншую ўстанову адукацыі, арганізацыю, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, і атрымаў згоду гэтай установы адукацыі, арганізацыі.

14. Адлічэнне і перавод асоб, якія атрымліваюць адукацыю па спецыяльнасцях для воінскіх фарміраванняў і ваенізаваных арганізацый, ажыццяўляюцца ў выпадках і парадку, прадугледжаных заканадаўствам аб праходжанні адпаведнай службы.

**Артыкул 69. Аднаўленне для працягу атрымання адукацыі**

1. Асобы, якія не завяршылі засваенне зместу адукацыйнай праграмы і адлічаны з установы адукацыі, арганізацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, маюць права на аднаўленне для працягу атрымання адукацыі ва ўстановах адукацыі, арганізацыях, што рэалізуюць адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, за выключэннем асоб:

1.1. якія не прайшлі прамежкавую атэстацыю за першы семестр, першае паўгоддзе пры засваенні зместу адукацыйных праграм прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай, вышэйшай адукацыі, адукацыйных праграм навукова-арыентаванай адукацыі, адукацыйнай праграмы перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць вышэйшую адукацыю, адукацыйнай праграмы перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць сярэднюю спецыяльную адукацыю, і адлічаны з устаноў адукацыі, арганізацый, што рэалізуюць адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, акрамя асоб, адлічаных па акалічнасцях, якія перашкаджаюць працягу засваення зместу адукацыйных праграм прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай, вышэйшай адукацыі, адукацыйнай праграмы аспірантуры (ад’юнктуры) па спецыяльнасцях для воінскіх фарміраванняў і ваенізаваных арганізацый, прадугледжаных заканадаўствам аб праходжанні адпаведнай службы, а таксама асоб, адлічаных у выпадку прызыву на тэрміновую ваенную службу, ваенную службу афіцэраў па прызыве, паступлення на ваенную службу па кантракце, накіравання на альтэрнатыўную службу;

1.2. якія не завяршылі засваенне зместу адукацыйных праграм прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай, вышэйшай адукацыі, адукацыйных праграм навукова-арыентаванай адукацыі па спецыяльнасцях для воінскіх фарміраванняў і ваенізаваных арганізацый, пры адсутнасці падстаў для заключэння з імі кантракта аб праходжанні ваеннай службы (службы);

1.3. якія не завяршылі засваенне зместу адукацыйных праграм дадатковай адукацыі дарослых, акрамя адукацыі, што атрымліваецца пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць вышэйшую адукацыю, і адукацыйнай праграмы перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць сярэднюю спецыяльную адукацыю;

1.4. якія не завяршылі засваенне зместу адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі, адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, акрамя асоб, адлічаных з дзіцячых школ мастацтваў.

2. Асобы, якія не завяршылі засваенне зместу аднаго з відаў адукацыйных праграм прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай, вышэйшай, навукова-арыентаванай адукацыі, адукацыйнай праграмы перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць вышэйшую адукацыю, адукацыйнай праграмы перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць сярэднюю спецыяльную адукацыю, адлічаны з устаноў адукацыі, арганізацый, што рэалізуюць адукацыйныя праграмы навукова-

арыентаванай адукацыі, маюць права на аднаўленне для працягу атрымання адукацыі, але не раней чым пасля заканчэння навучальнага года, у якім яны былі адлічаны. Аднаўленне ажыццяўляецца на семестр, паўгоддзе, у якіх яны былі адлічаны, або на семестр, паўгоддзе, на якія яны не былі пераведзены, або на больш раннія семестр, паўгоддзе паводле рашэння кіраўніка ўстановы адукацыі, арганізацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, з улікам неабходнасці засваення зместу адукацыйнай праграмы або ліквідацыі акадэмічнай запазычанасці.

3. Асобы, якія адлічаны з устаноў адукацыі, арганізацый, што рэалізуюць адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, не завяршылі засваенне зместу адукацыйных праграм прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай, вышэйшай, навукова-арыентаванай адукацыі па спецыяльнасцях для воінскіх фарміраванняў і ваенізаваных арганізацый, якім прадастаўлена права на аднаўленне для працягу атрымання адукацыі, на працягу трох гадоў з даты адлічэння, але не раней чым пасля заканчэння навучальнага года, у якім яны былі адлічаны, маюць права на аднаўленне для працягу атрымання адукацыі ў выпадках, прадугледжаных заканадаўствам аб праходжанні адпаведнай службы, і ў парадку, які ўстанаўліваецца адпаведным дзяржаўным органам, падпарадкаваным і (або) падсправаздачным Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь, рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання.

4. Асоба, адлічаная са спецыяльнай навучальна-выхаваўчай установы, спецыяльнай лячэбна-выхаваўчай установы, мае права на аднаўленне для працягу атрымання адпаведнай адукацыі ва ўстанове адукацыі, у якой яна атрымлівала адукацыю да змяшчэння ў спецыяльную навучальна-выхаваўчую ўстанову, спецыяльную лячэбна-выхаваўчую ўстанову, ці ў іншай установе адукацыі.

5. Падставай для ўзнікнення адукацыйных адносін пры аднаўленні для працягу атрымання адукацыі ва ўстанове адукацыі, арганізацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, з’яўляецца рашэнне кіраўніка ўстановы адукацыі, арганізацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, аб аднаўленні асобы для працягу атрымання адукацыі. Калі для атрымання адпаведнай адукацыі гэтым Кодэксам прадугледжана заключэнне дагавора, рашэнню кіраўніка ўстановы адукацыі, арганізацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, аб аднаўленні асобы для працягу атрымання адукацыі павінна папярэднічаць заключэнне дагавора.

З рашэннем аб аднаўленні асобы для працягу атрымання адукацыі ва ўстанове адукацыі, арганізацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, навучэнец, законны прадстаўнік непаўналетняга навучэнца павінны быць азнаёмлены пад роспіс.

6. Парадак і ўмовы аднаўлення асоб для працягу атрымання адукацыі ва ўстановах адукацыі, арганізацыях, што рэалізуюць адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, устанаўліваюцца Урадам Рэспублікі Беларусь або ўпаўнаважаным ім органам. Парадак і ўмовы аднаўлення асоб для працягу атрымання навукова-арыентаванай адукацыі ўстанаўліваюцца з улікам парадку планавання падрыхтоўкі навуковых работнікаў вышэйшай кваліфікацыі.

## ГЛАВА 8
## ГРАМАДСКІЯ АДНОСІНЫ, ЗВЯЗАНЫЯ З АДУКАЦЫЙНЫМІ АДНОСІНАМІ

### Артыкул 70. Грамадскія адносіны, звязаныя з адукацыйнымі адносінамі

Да грамадскіх адносін, звязаных з адукацыйнымі адносінамі, адносяцца адносіны па кіраванні і кантролі ў сферы адукацыі, фінансавым, матэрыяльна-тэхнічным, навукова-метадычным і інфармацыйным забеспячэнні адукацыі, забеспячэнні галін эканомікі і сацыяльнай сферы спецыялістамі, рабочымі, служачымі, размеркаванні, накіраванні на працу выпускнікоў, адпрацоўцы імі ўстаноўленага тэрміну абавязковай працы,

устанаўленні і прадастаўленні мер сацыяльнай абароны навучэнцам, прымяненні да іх мер дысцыплінарнага спагнання і іншыя грамадскія адносіны, звязаныя з рэалізацыяй права грамадзян на адукацыю.

### Артыкул 71. Дзяржаўныя арганізацыі адукацыі, якія забяспечваюць функцыянаванне сістэмы адукацыі

1. Да дзяржаўных арганізацый адукацыі, якія забяспечваюць функцыянаванне сістэмы адукацыі, адносяцца:

1.1. арганізацыі, што ажыццяўляюць навукова-метадычнае забеспячэнне адукацыі;

1.2. арганізацыі, якія ажыццяўляюць інфармацыйнае забеспячэнне ў сферы адукацыі;

1.3. арганізацыі, якія ўстанаўліваюць адпаведнасць адукацыйнай дзейнасці адукацыйным стандартам, вучэбна-праграмнай дакументацыі адукацыйных праграм, іншым патрабаванням у сферы адукацыі.

2. Арганізацыя, што ажыццяўляе навукова-метадычнае забеспячэнне адукацыі, – арганізацыя, функцыямі якой з’яўляюцца правядзенне фундаментальных і (або) прыкладных навуковых даследаванняў у сферы адукацыі, накіраваных на развіццё зместу адукацыйных праграм і павышэнне якасці адукацыі, і (або) распрацоўка вучэбна-праграмнай дакументацыі адукацыйных праграм, вучэбна-метадычнай дакументацыі, кантрольна-вымяральных матэрыялаў, укараненне ў практыку інавацыйных структурных элементаў навукова-метадычнага забеспячэння, вучэбна-метадычных комплексаў, сродкаў навучання і выхавання, каардынацыя працы па ажыццяўленні навукова-метадычнага забеспячэння адукацыі, дзейнасць, накіраваная на забеспячэнне функцыянавання ўстаноў адукацыі па ўдасканаленні зместу, формаў і метадаў навучання і выхавання, працэсу абароны правоў навучэнцаў, стварэнне ўмоў для фарміравання і ўдасканальвання прафесійнай культуры педагагічных работнікаў, павышэння іх кваліфікацыі і развіцця ініцыятывы і творчасці для рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі ў сферы адукацыі і іншыя функцыі.

Дзяржаўныя арганізацыі, што ажыццяўляюць навукова-метадычнае забеспячэнне адукацыі, могуць функцыянаваць на рэспубліканскім, абласным (горада Мінска) і раённым (гарадскім) узроўнях.

Арганізацыя, што ажыццяўляе навукова-метадычнае забеспячэнне адукацыі, мае права ажыццяўляць сістэматычнае назіранне за станам адукацыі і дынамікай змяненняў яе вынікаў, умоў ажыццяўлення адукацыйнай дзейнасці, кантынгенту навучэнцаў, іх вучэбных і невучэбных дасягненняў, сеткі ўстаноў адукацыі, у тым ліку ў рамках міжнародных параўнальных даследаванняў у сферы адукацыі, доследную праверку падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў, выконваць экспертныя, прагназавальныя, інфармацыйна-аналітычныя і іншыя функцыі, накіраваныя на забеспячэнне атрымання адукацыі і павышэнне яе якасці.

3. Арганізацыя, якая ажыццяўляе інфармацыйнае забеспячэнне ў сферы адукацыі, – арганізацыя, асноўнымі функцыямі якой з’яўляюцца каардынацыя дзейнасці ўстаноў адукацыі па ўкараненні і развіцці сродкаў інфармацыйных тэхналогій і тэлекамунікацый, вытворчасці і распаўсюджванні інфармацыйных рэсурсаў і інфармацыйных сістэм у сферы адукацыі, распрацоўка і ўкараненне праграмных сродкаў, неабходных для інфарматызацыі і інфармацыйнага забеспячэння сістэмы адукацыі, інфармацыйна-аналітычнае забеспячэнне дзейнасці ў сферы адукацыі, правядзенне навукова-даследчых і доследна-канструктарскіх прац у галіне інфарматызацыі, інфармацыйных і тэлекамунікацыйных тэхналогій.

4. Арганізацыя, якая ўстанаўлівае адпаведнасць адукацыйнай дзейнасці адукацыйным стандартам, вучэбна-праграмнай дакументацыі адукацыйных праграм, іншым патрабаванням у сферы адукацыі, – дзяржаўная арганізацыя, функцыямі якой з’яўляюцца ўстанаўленне, пацвярджэнне адпаведнасці адукацыйнай дзейнасці заканадаўству, распрацоўка кантрольна-дыягнастычных і іншых матэрыялаў, неабходных для

ўстанаўлення адпаведнасці адукацыйнай дзейнасці заканадаўству, іншых кантрольных вымярэнняў у сферы адукацыі, іх арганізацыя і (або) правядзенне, аказанне кансультацыйна-метадычнай дапамогі ўстановам адукацыі, іншым арганізацыям, індывідуальным прадпрымальнікам, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, па пытаннях арганізацыі і ўдасканальвання адукацыйнага працэсу, іншыя функцыі, прадугледжаныя актамі заканадаўства, заснавальнікам.

На арганізацыю, якая ўстанаўлівае адпаведнасць адукацыйнай дзейнасці адукацыйным стандартам, вучэбна-праграмнай дакументацыі адукацыйных праграм, іншым патрабаванням у сферы адукацыі, могуць быць ускладзены функцыі правядзення дзяржаўнай акрэдытацыі, пацвярджэння дзяржаўнай акрэдытацыі ўстаноў адукацыі, іншых арганізацый, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць.

5. Функцыі дзяржаўных арганізацый адукацыі, якія забяспечваюць функцыянаванне сістэмы адукацыі, могуць быць ускладзены на адну з гэтых арганізацый. Функцыі арганізацыі, што ажыццяўляе навукова-метадычнае забеспячэнне адукацыі, могуць быць ускладзены таксама на ўстановы адукацыі.

6. Дзейнасць дзяржаўных арганізацый адукацыі, якія забяспечваюць функцыянаванне сістэмы адукацыі, рэгулюецца гэтым Кодэксам, іншымі актамі заканадаўства, статутамі гэтых арганізацый, а дзейнасць арганізацый, што ажыццяўляюць навукова-метадычнае забеспячэнне адукацыі, – таксама палажэннем аб іх.

Палажэнне аб арганізацыях, што ажыццяўляюць навукова-метадычнае забеспячэнне адукацыі, зацвярджаецца Урадам Рэспублікі Беларусь або ўпаўнаважаным ім органам, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўчымі актамі.

### Артыкул 72. Размеркаванне выпускнікоў

1. Размеркаванне – працэдура вызначэння месца працы выпускніка, якая ажыццяўляецца дзяржаўнай установай адукацыі або ў выпадках, устаноўленых Урадам Рэспублікі Беларусь, дзяржаўным органам, з мэтай падтрымкі выпускнікоў, задавальнення патрэб галін эканомікі і сацыяльнай сферы ў спецыялістах, рабочых, служачых.

2. Месца працы шляхам размеркавання прадастаўляецца ў адпаведнасці з атрыманай спецыяльнасцю, прысвоенай кваліфікацыяй і (або) ступенню выпускнікам, якія атрымалі:

вышэйшую, сярэднюю спецыяльную, прафесійна-тэхнічную адукацыю ў дзённай форме атрымання адукацыі за кошт сродкаў рэспубліканскага і (або) мясцовых бюджэтаў, акрамя асоб, якія навучаліся на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі;

сярэднюю спецыяльную, агульную вышэйшую або спецыяльную вышэйшую адукацыю, не менш за палавіну тэрміну атрымання адукацыі якіх фінансавалася за кошт сродкаў рэспубліканскага і (або) мясцовых бюджэтаў і ажыццяўлялася ў дзённай форме атрымання адукацыі, акрамя асоб, якія на момант размеркавання навучаюцца ў вячэрняй, завочнай або дыстанцыйнай форме атрымання адукацыі і працуюць па спецыяльнасці, што атрымліваецца, праходзяць ваенную службу па кантракце, а таксама асоб, якія навучаліся на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі.

Месца працы шляхам размеркавання не прадастаўляецца:

выпускнікам, уключаным Міністэрствам спорту і турызму ў спісачныя склады нацыянальных каманд Рэспублікі Беларусь па відах спорту;

выпускнікам дзяржаўных устаноў адукацыі, якія навучаліся ў іх філіялах, што знаходзяцца на тэрыторыі папраўчых устаноў крымінальна-выканаўчай сістэмы Міністэрства ўнутраных спраў, рэспубліканскіх унітарных вытворчых прадпрыемстваў, падпарадкаваных Дэпартаменту выканання пакаранняў Міністэрства ўнутраных спраў, лячэбна-працоўных прафілакторыяў Міністэрства ўнутраных спраў;

выпускнікам спецыяльных навучальна-выхаваўчых устаноў і спецыяльных лячэбна-выхаваўчых устаноў;

выпускнікам, якія атрымалі адукацыю па спецыяльнасцях для воінскіх фарміраванняў і ваенізаваных арганізацый, месца працы якім прадастаўляецца ў парадку, прадугледжаным заканадаўствам аб праходжанні адпаведнай службы;

выпускнікам з ліку замежных грамадзян і асоб без грамадзянства, якія не маюць дазволу на пастаяннае пражыванне ў Рэспубліцы Беларусь.

Выпускнікі, якія на працягу двух гадоў пасля атрымання вышэйшай адукацыі выключаны са спісачных складаў нацыянальных каманд Рэспублікі Беларусь па відах спорту, падлягаюць размеркаванню. У тэрмін абавязковай працы па размеркаванні такім выпускнікам па іх жаданні залічваецца перыяд знаходжання ў спісачных складах нацыянальных каманд Рэспублікі Беларусь па відах спорту.

3. Выпускнікі, якім месца працы прадастаўлена шляхам размеркавання, абавязаны адпрацаваць тэрміны абавязковай працы па размеркаванні, устаноўленыя пунктамі 4 і 5 гэтага артыкула, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўчымі актамі.

4. Тэрмін абавязковай працы па размеркаванні два гады ўстанаўліваецца для асоб, якія атрымалі:

4.1. сярэднюю спецыяльную адукацыю, акрамя:

4.1.1. асоб, якія прыняты (залічаны) у год атрымання сярэдняй спецыяльнай адукацыі ва ўстановы адукацыі для атрымання агульнай вышэйшай або спецыяльнай вышэйшай адукацыі ў дзённай форме атрымання адукацыі за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту і атрымалі адпаведную адукацыю на гэтых умовах;

4.1.2. асоб, якія адпрацавалі па размеркаванні не менш за адзін год пасля атрымання прафесійна-тэхнічнай адукацыі;

4.2. агульную вышэйшую адукацыю, акрамя асоб, якія прыняты (залічаны) у год атрымання агульнай вышэйшай адукацыі ва ўстановы адукацыі для атрымання паглыбленай вышэйшай адукацыі ў дзённай форме атрымання адукацыі за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту і атрымалі адпаведную адукацыю на гэтых умовах;

4.3. спецыяльную вышэйшую адукацыю, акрамя асоб, якія прыняты (залічаны) у год атрымання спецыяльнай вышэйшай адукацыі ва ўстановы адукацыі, арганізацыі, што рэалізуюць адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, для атрымання навукова-арыентаванай адукацыі пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы аспірантуры (ад’юнктуры) у дзённай форме атрымання адукацыі за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту і атрымалі адпаведную адукацыю на гэтых умовах;

4.4. паглыбленую вышэйшую адукацыю, калі для атрымання паглыбленай вышэйшай адукацыі яны прыняты (залічаны) ва ўстановы адукацыі ў год атрымання агульнай вышэйшай адукацыі ў дзённай форме атрымання адукацыі за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту, акрамя асоб, якія прыняты (залічаны) у год атрымання паглыбленай вышэйшай адукацыі ва ўстановы адукацыі, арганізацыі, што рэалізуюць адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, для атрымання навукова-арыентаванай адукацыі пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы аспірантуры (ад’юнктуры) у дзённай форме атрымання адукацыі за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту і атрымалі адпаведную адукацыю на гэтых умовах.

5. Тэрмін абавязковай працы па размеркаванні адзін год устанаўліваецца для асоб, якія атрымалі:

5.1. прафесійна-тэхнічную адукацыю, акрамя асоб, якія прыняты (залічаны) у год атрымання прафесійна-тэхнічнай адукацыі ва ўстановы адукацыі для атрымання сярэдняй спецыяльнай, агульнай вышэйшай або спецыяльнай вышэйшай адукацыі ў дзённай форме атрымання адукацыі за кошт сродкаў рэспубліканскага і (або) мясцовых бюджэтаў і атрымалі адпаведную адукацыю на гэтых умовах;

5.2. сярэднюю спецыяльную адукацыю, калі яны адпрацавалі па размеркаванні не менш за адзін год пасля атрымання прафесійна-тэхнічнай адукацыі, акрамя асоб, якія прыняты (залічаны) у год атрымання сярэдняй спецыяльнай адукацыі ва ўстановы адукацыі для атрымання агульнай вышэйшай або спецыяльнай вышэйшай адукацыі ў дзённай форме

атрымання адукацыі за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту і атрымалі адпаведную адукацыю на гэтых умовах;

5.3. паглыбленую вышэйшую адукацыю, акрамя:

5.3.1. асоб, якія прыняты (залічаны) у год атрымання паглыбленай вышэйшай адукацыі ва ўстановы адукацыі, арганізацыі, што рэалізуюць адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, для атрымання навукова-арыентаванай адукацыі пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы аспірантуры (ад’юнктуры) у дзённай форме атрымання адукацыі за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту і атрымалі адпаведную адукацыю на гэтых умовах;

5.3.2. асоб, якія для атрымання паглыбленай вышэйшай адукацыі былі прыняты (залічаны) ва ўстановы адукацыі ў год атрымання агульнай вышэйшай адукацыі ў дзённай форме атрымання адукацыі за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту.

6. Выпускнікі, якія працуюць па размеркаванні, з’яўляюцца на працягу тэрміну абавязковай працы па размеркаванні маладымі спецыялістамі або маладымі рабочымі (служачымі).

Заканадаўствам аб праходжанні адпаведнай службы для асоб, якія атрымалі адукацыю па спецыяльнасцях для воінскіх фарміраванняў і ваенізаваных арганізацый, можа быць прадугледжана прадастаўленне статусу маладога спецыяліста.

7. Тэрміны абавязковай працы, указаныя ў пунктах 4 і 5 гэтага артыкула, вылічваюцца з даты прыёму выпускніка на працу па размеркаванні, а ў выпадку прыёму на працу выпускніка да даты выдачы пасведчання аб накіраванні на працу – з даты выдачы пасведчання аб накіраванні на працу. Для асоб, якія атрымалі вышэйшую адукацыю па напрамку адукацыі «Ахова здароўя», акрамя асоб, размеркаваных у Дзяржаўны камітэт судовых экспертыз, тэрмін абавязковай працы вылічвацца з дня пачатку дзеяння працоўнага дагавора на пасадзе ўрача-спецыяліста, правізара-спецыяліста.

8. У тэрмін абавязковай працы па размеркаванні па жаданні выпускніка, маладога спецыяліста, маладога рабочага (служачага) залічваюцца перыяды ваеннай службы па прызыве, ваеннай службы па кантракце, службы ў рэзерве, альтэрнатыўнай службы, перыяд знаходжання ў водпуску па доглядзе дзіцяці да дасягнення ім узросту трох гадоў, калі гэтыя перыяды мелі месца пасля размеркавання на працу.

9. Месца працы для выпускнікоў у ходзе размеркавання вызначаецца ўстановай адукацыі або дзяржаўным органам самастойна з улікам наяўных заявак і заключаных дагавораў аб узаемадзеянні, а выпускнікам, якія адносяцца да катэгорыі:

9.1. дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекавання бацькоў, а таксама асоб з ліку дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекавання бацькоў, месца працы прадастаўляецца па месцы замацавання за імі жылых памяшканняў, або па месцы ўключэння іх у спісы ўліку асоб, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, або па месцы першапачатковага набыцця статусу дзяцей-сірот ці статусу дзяцей, якія засталіся без апекавання бацькоў, або з іх згоды ў іншым населеным пункце;

9.2. дзяцей-інвалідаў ва ўзросце да васямнаццаці гадоў, інвалідаў I або II групы, месца працы прадастаўляецца па месцы жыхарства бацькоў, мужа (жонкі) або са згоды выпускніка іншае наяўнае месца працы;

9.3. асоб, якія маюць аднаго з бацькоў, усынаўляльнікаў (удачаральнікаў) або мужа (жонку) інваліда I або II групы або дзіця-інваліда ва ўзросце да васямнаццаці гадоў, месца працы прадастаўляецца па жаданні выпускніка і пры наяўнасці магчымасці працаўладкавання па месцы жыхарства гэтых бацькі або маці, мужа (жонкі), дзіцяці-інваліда ва ўзросце да васямнаццаці гадоў або са згоды выпускніка іншае наяўнае месца працы;

9.4. асоб, якія маюць медыцынскія проціпаказанні да працы на асобных пасадах служачых, па асобных прафесіях рабочых, месца працы прадастаўляецца з улікам стану іх здароўя;

9.5. цяжарных жанчын, месца працы прадастаўляецца па іх жаданні і пры наяўнасці магчымасці працаўладкавання па месцы жыхарства бацькоў, мужа або са згоды выпускніцы іншае наяўнае месца працы;

9.6. бацькоў, усынаўляльнікаў (удачаральнікаў), якія маюць дзіця ва ўзросце да трох гадоў на дату прыняцця рашэння аб размеркаванні, месца працы прадастаўляецца па іх жаданні і пры наяўнасці магчымасці працаўладкавання па месцы жыхарства аднаго з бацькоў, усынаўляльнікаў (удачаральнікаў) дзіцяці;

9.7. мужа (жонкі) асобы, выбранай на выбарную пасаду служачага ў дзяржаўныя органы, або накіраванай на працу ў дыпламатычныя прадстаўніцтвы ці консульскія ўстановы Рэспублікі Беларусь, або з ліку ваеннаслужачых (акрамя ваеннаслужачых, якія праходзяць тэрміновую ваенную службу, службу ў рэзерве, альтэрнатыўную службу, курсантаў), супрацоўнікаў Службы бяспекі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, ваенізаваных арганізацый, органаў дзяржаўнай бяспекі, мытных органаў, пракурорскіх работнікаў, месца працы прадастаўляецца па іх жаданні і пры наяўнасці магчымасці працаўладкавання па месцы працы, праходжання ваеннай службы (службы) жонкі (мужа);

9.8. мужа (жонкі), жонка (муж) якога (якой) працуе і пастаянна пражывае ў Рэспубліцы Беларусь, месца працы прадастаўляецца па жаданні выпускніка і пры наяўнасці магчымасці працаўладкавання па месцы жыхарства і (або) працы жонкі (мужа);

9.9. сужэнцаў, якія размяркоўваюцца ў адным каляндарным або навучальным годзе, месца працы прадастаўляецца па іх жаданні і пры наяўнасці магчымасці працаўладкавання ў адным населеным пункце;

9.10. дзяцей асоб, указаных у падпунктах 3.2, 3.4 і 3.7 пункта 3, пункце 10 і падпунктах 12.2 і 12.3 пункта 12 артыкула 3 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб дзяржаўных сацыяльных ільготах, правах і гарантыях для асобных катэгорый грамадзян», месца працы пры наяўнасці магчымасці прадастаўляецца па месцы жыхарства бацькоў, мужа (жонкі) выпускніка або з яго згоды іншае наяўнае месца працы.

10. Выпускнікі дзяржаўных устаноў прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі, уключаныя ў банкі даных адоранай і таленавітай моладзі, а таксама грамадзяне, якія прайшлі тэрміновую ваенную службу, службу ў рэзерве, маюць рэкамендацыі воінскіх часцей, органаў пагранічнай службы на навучанне ва ўстановах адукацыі, дасягнулі высокіх паказчыкаў у вучэбнай і грамадскай дзейнасці, а таксама асобы з ліку ўказаных грамадзян, якія засвойваюць змест адукацыйнай праграмы вышэйшай адукацыі і дасягнулі высокіх паказчыкаў у навукова-даследчай дзейнасці, маюць права на першачарговае размеркаванне.

11. Выпускнікам, якім месца працы прадастаўлена шляхам размеркавання, пры выдачы дакумента аб адукацыі выдаецца пасведчанне аб накіраванні на працу.

12. Парадак размеркавання, а таксама працаўладкавання выпускнікоў дзяржаўных устаноў адукацыі ў частцы, не ўрэгуляванай гэтым Кодэксам, вызначаецца Урадам Рэспублікі Беларусь, калі іншае не ўстаноўлена Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

13. Асобам, якія атрымалі адукацыю па спецыяльнасцях для воінскіх фарміраванняў і ваенізаваных арганізацый, месца працы, праходжання ваеннай службы (службы) прадастаўляецца ў парадку, прадугледжаным заканадаўствам аб праходжанні адпаведнай службы.

14. Выпускнікі дзяржаўных устаноў сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў сферы культуры і гімназій – каледжаў мастацтваў, якія абавязаны адпрацаваць тэрмін абавязковай працы па размеркаванні і паступілі ў год атрымання сярэдняй спецыяльнай адукацыі ва ўстановы вышэйшай адукацыі ў сферы культуры Расійскай Федэрацыі для засваення зместу адукацыйнай праграмы бакалаўрыяту або спецыялітэту згодна з пералікам, зацверджаным Міністэрствам культуры, адпрацоўваюць тэрмін абавязковай працы па размеркаванні пасля атрымання вышэйшай адукацыі або пасля датэрміновага спынення адукацыйных адносін (адлічэння) з установай вышэйшай адукацыі ў сферы культуры Расійскай Федэрацыі ў выпадку адначасовага выканання наступных умоў:

выпускнік установы сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў сферы культуры або гімназіі – каледжа мастацтваў на працягу апошніх двух гадоў на момант атрымання сярэдняй спецыяльнай адукацыі быў узнагароджаны нагрудным знакам «Лаўрэат спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі», і (або) атрымаў званне стыпендыята таленавітай моладзі за творчыя дасягненні ў сферы культуры, адпаведныя выбранай спецыяльнасці, і (або) атрымаў дыплом аб сярэдняй спецыяльнай адукацыі з адзнакай па спецыяльнасці «Музыказнаўства» профілю адукацыі «Гуманітарныя навукі»;

выпускнік установы сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў сферы культуры або гімназіі – каледжа мастацтваў паступіў ва ўстанову вышэйшай адукацыі ў сферы культуры Расійскай Федэрацыі для атрымання вышэйшай адукацыі за кошт сродкаў федэральнага бюджэту або бюджэтаў суб’ектаў Расійскай Федэрацыі ў дзённай форме атрымання адукацыі.

Выпускнікі абавязаны на працягу пяці дзён пасля залічэння ва ўстанову вышэйшай адукацыі ў сферы культуры Расійскай Федэрацыі пісьмова паведаміць аб гэтым установе сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў сферы культуры або гімназіі – каледжу мастацтваў, вярнуць пасведчанне аб накіраванні на працу ва ўстанову сярэдняй спецыяльнай адукацыі (у выпадку залічэння ва ўстанову вышэйшай адукацыі да заключэння працоўнага дагавора (кантракта)). Установа сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў сферы культуры або гімназія – каледж мастацтваў на працягу пяці дзён пасля атрымання пісьмовага паведамлення ад выпускніка аб залічэнні яго ва ўстанову вышэйшай адукацыі ў сферы культуры Расійскай Федэрацыі інфармуюць аб гэтым наймальніка (арганізацыю, у якую ён размеркаваны) і Міністэрства культуры.

Міністэрства культуры на працягу дзесяці дзён з дня атрымання інфармацыі, указанай у частцы другой гэтага пункта, заключае з выпускніком дагавор аб адпрацоўцы тэрміну абавязковай працы па размеркаванні, тыпавая форма якога зацвярджаецца гэтым Міністэрствам па ўзгадненні з Міністэрствам адукацыі.

**Артыкул 73. Працаўладкаванне ў лік броні**

1. Працаўладкаванне ў лік броні – працэдура вызначэння месца працы выпускніка, якому не можа быць прадастаўлена месца працы ў ходзе размеркавання, што ажыццяўляецца дзяржаўнымі ўстановамі адукацыі на працоўныя месцы, якія вызначаюцца наймальнікам мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі, з мэтай падтрымкі выпускнікоў.

2. Месца працы шляхам працаўладкавання ў лік броні прадастаўляецца ў адпаведнасці з атрыманай спецыяльнасцю, прысвоенай кваліфікацыяй і (або) ступенню выпускнікам, якія атрымалі прафесійна-тэхнічную, сярэднюю спецыяльную, вышэйшую адукацыю, якія адносяцца да катэгорыі:

2.1. дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекавання бацькоў, а таксама асоб з ліку дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекавання бацькоў;

2.2. асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця.

3. Выпускнікам, якія працаўладкоўваюцца ў лік броні, пры выдачы дакумента аб адукацыі ўстановамі адукацыі выдаецца пасведчанне аб накіраванні на працу.

4. Выпускнікі, якія працаўладкоўваюцца ў лік броні, абавязаны адпрацаваць тэрміны абавязковай працы, устаноўленыя пунктамі 4 і 5 артыкула 72 гэтага Кодэкса.

Тэрміны абавязковай працы па працаўладкаванні ў лік броні вылічваюцца ў парадку, устаноўленым пунктам 7 артыкула 72 гэтага Кодэкса.

Выпускнікі, працаўладкаваныя ў лік броні, на працягу тэрміну абавязковай працы з’яўляюцца маладымі спецыялістамі або маладымі рабочымі (служачымі).

У тэрмін абавязковай працы па працаўладкаванні ў лік броні па жаданні выпускніка, маладога спецыяліста, маладога рабочага (служачага) залічваюцца перыяды ваеннай службы па прызыве, ваеннай службы па кантракце, службы ў рэзерве, альтэрнатыўнай

службы, перыяд знаходжання ў водпуску па доглядзе дзіцяці да дасягнення ім узросту трох гадоў, калі гэтыя перыяды мелі месца пасля працаўладкавання ў лік броні.

Выпускнікам, якія працаўладкаваны ў лік броні і не адпрацавалі тэрмін абавязковай працы, месца працы вызначаецца ў адпаведнасці з артыкулам 72 гэтага Кодэкса.

5. Парадак устанаўлення броні для працаўладкавання выпускнікоў, якія адносяцца да катэгорый дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекавання бацькоў, асоб з ліку дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекавання бацькоў, а таксама асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, якія атрымалі прафесійна-тэхнічную, сярэднюю спецыяльную, вышэйшую адукацыю, вызначаецца Урадам Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 74. Пераразмеркаванне выпускнікоў, маладых спецыялістаў, маладых рабочых (служачых)**

1. Пераразмеркаванне выпускнікоў, маладых спецыялістаў, маладых рабочых (служачых) ажыццяўляецца ў адпаведнасці з атрыманай спецыяльнасцю, прысвоенай кваліфікацыяй і (або) ступенню ўстановамі адукацыі або дзяржаўнымі органамі ў выпадках, указаных у пункце 4 гэтага артыкула, а таксама ў іншых выпадках, устаноўленых Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь або Урадам Рэспублікі Беларусь.

2. Пераразмеркаванне маладых спецыялістаў, маладых рабочых (служачых) ажыццяўляецца ў выпадку:

2.1. пераводу маладога спецыяліста, маладога рабочага (служачага) з іх згоды ад аднаго наймальніка да іншага (пункт 4 часткі другой артыкула 35 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь) па ўзгадненні паміж імі;

2.2. скасавання з маладым спецыялістам, маладым рабочым (служачым) працоўнага дагавора ў сувязі з (са):

2.2.1. ліквідацыяй арганізацыі, спыненнем дзейнасці філіяла, прадстаўніцтва або іншага адасобленага падраздзялення арганізацыі, размешчаных у іншай мясцовасці, скарачэннем колькасці або штату работнікаў, спыненнем (прыпыненнем) у адпаведнасці з заканадаўчымі актамі дзейнасці натарыуса, які ажыццяўляе натарыяльную дзейнасць у натарыяльным бюро, фізічнай асобы, якая ажыццяўляе дзейнасць па аказанні паслуг у сферы аграэкатурызму, індывідуальнага прадпрымальніка, за выключэннем выпадкаў спынення (прыпынення) дзейнасці ў сувязі з іх прызывам на ваенную службу, накіраваннем на альтэрнатыўную службу (пункты 1 і 2 артыкула 42 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь);

2.2.2. парушэннем наймальнікам заканадаўства аб працы, калектыўнага дагавора, пагаднення, працоўнага дагавора (артыкулы 40 і 41 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь);

2.2.3. неадпаведнасцю іх займанай пасадзе служачага (прафесіі рабочага) або працы, што выконваецца, з прычыны стану здароўя, які перашкаджае працягу гэтай працы (пункт 3 артыкула 42 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь);

2.2.4. няяўкай на працу на працягу больш чым чатырох месяцаў запар з прычыны часовай непрацаздольнасці (не лічачы водпуску па цяжарнасці і родах), калі заканадаўствам не ўстаноўлены больш працяглы тэрмін захавання месца працы, пасады служачага (прафесіі рабочага) пры пэўным захворванні (пункт 5 артыкула 42 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь);

2.2.5. акалічнасцямі, не залежнымі ад волі бакоў, з прычыны аднаўлення на працы работніка, які раней выконваў гэту працу, парушэння ўстаноўленых правіл прыёму на працу (пункты 2 і 3 артыкула 44 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь);

2.2.6. іх прызывам на ваенную службу (пункт 1 артыкула 44 Працоўнага кодэкса), але не накіраваных на такую службу, і адмовай наймальніка, да якога былі размеркаваны малады спецыяліст, малады рабочы (служачы), у прыёме на працу;

2.2.7. спартыўнай дыскваліфікацыяй за допінг у спорце (частка другая артыкула 47 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь);

2.3. узнікнення ў маладога спецыяліста, маладога рабочага (служачага) акалічнасцей, пры якіх месца працы выпускніку прадастаўляецца ў парадку, прадугледжаным пунктам 9 артыкула 72 гэтага Кодэкса (акрамя выпадкаў змянення месца працы ў межах аднаго населенага пункта);

2.4. адмовы ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі ў прадастаўленні допуску да дзяржаўных сакрэтаў работніку, якому для выканання сваіх працоўных абавязкаў неабходны такі допуск, або спынення ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі допуску да дзяржаўных сакрэтаў такога работніка, калі спыненне яго допуску да дзяржаўных сакрэтаў з'яўляецца перашкодай для працягу ім працы па займанай пасадзе служачага (пункт 8 часткі першай артыкула 47 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь).

3. Пераразмеркаванне выпускнікоў ажыццяўляецца ў выпадку:

3.1. адмовы наймальніка ў прыёме на працу па атрыманай спецыяльнасці, прысвоенай кваліфікацыі і (або) ступені выпускніку, які прыбыў на працу па размеркаванні;

3.2. датэрміновага спынення адукацыйных адносін (адлічэння) з установай адукацыі, арганізацыяй, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, асобы, прынятай (залічанай) для атрымання адукацыі больш высокага ўзроўню або аднаго з відаў вышэйшай адукацыі за кошт сродкаў рэспубліканскага і (або) мясцовых бюджэтаў у дзённай форме атрымання адукацыі ў год атрымання адукацыі папярэдняга ўзроўню або аднаго з відаў вышэйшай адукацыі, якая не адпрацавала тэрмін абавязковай працы па размеркаванні пасля атрымання адпаведнай адукацыі, або пераводу такой асобы з дзённай формы атрымання адукацыі на іншую форму атрымання адукацыі;

3.3. узнікнення ў выпускніка да тэрміну прыбыцця, устаноўленага ў пасведчанні аб накіраванні на працу, акалічнасцей, пры якіх месца працы выпускніку прадастаўляецца ў парадку, прадугледжаным пунктам 9 артыкула 72 гэтага Кодэкса;

3.4. немагчымасці прадастаўлення месца працы ў адпаведнасці з атрыманай спецыяльнасцю, прысвоенай кваліфікацыяй і (або) ступенню па заканчэнні ваеннай службы па прызыве, ваеннай службы па кантракце, альтэрнатыўнай службы ў наймальніка, да якога выпускнік быў накіраваны на працу да прызыву на ваенную службу, паступлення на ваенную службу па кантракце, накіравання на альтэрнатыўную службу, у выпадку:

3.4.1. жадання выпускніка, з якога ў адпаведнасці з часткай першай пункта 4 артыкула 78 гэтага Кодэкса сродкі, затрачаныя дзяржавай на яго падрыхтоўку, не спаганяюцца, працаваць па размеркаванні;

3.4.2. звальнення выпускніка з ваеннай службы па прызыве, ваеннай службы па кантракце, альтэрнатыўнай службы, калі тэрмін ваеннай службы па прызыве, ваеннай службы па кантракце, альтэрнатыўнай службы склаў менш за тэрмін, устаноўлены актамі заканадаўства для праходжання ваеннай службы па прызыве для адпаведнай катэгорыі ваеннаслужачых, тэрміну ваеннай службы, устаноўленага кантрактам аб праходжанні ваеннай службы, тэрміну альтэрнатыўнай службы для адпаведнай катэгорыі грамадзян;

3.5. спартыўнай дыскваліфікацыі за допінг у спорце;

3.6. датэрміновага спынення адукацыйных адносін (адлічэння) з замежнай арганізацыяй асобы, накіраванай для атрымання адукацыі;

3.7. неадпрацоўкі тэрміну абавязковай працы, устаноўленага дагаворам, асобай, якая накіравана і атрымала навукова-арыентаваную, вышэйшую адукацыю ў замежнай арганізацыі.

4. Міністэрства культуры ў парадку, што ім устанаўліваецца, ажыццяўляе пераразмеркаванне выпускнікоў дзяржаўных устаноў сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў сферы культуры і гімназій – каледжаў мастацтваў, якія заключылі з Міністэрствам культуры дагавор аб адпрацоўцы тэрміну абавязковай працы па размеркаванні і атрымалі адукацыю ва ўстановах вышэйшай адукацыі ў сферы культуры Расійскай Федэрацыі ў адпаведнасці з атрыманай ва ўстанове сярэдняй спецыяльнай адукацыі, гімназіі – каледжы мастацтваў або ўстанове вышэйшай адукацыі ў сферы культуры Расійскай Федэрацыі спецыяльнасцю і прысвоенай кваліфікацыяй (па іх жаданні), а выпускнікоў, якія

датэрмінова спынілі адукацыйныя адносіны (адлічаны) з установай вышэйшай адукацыі ў сферы культуры Расійскай Федэрацыі, – у адпаведнасці з атрыманай ва ўстанове сярэдняй спецыяльнай адукацыі, гімназіі – каледжы мастацтваў спецыяльнасцю, прысвоенай кваліфікацыяй.

5. Рашэнне аб пераразмеркаванні выпускнікоў, маладых спецыялістаў, якія атрымалі вышэйшую або сярэднюю спецыяльную адукацыю па напрамку адукацыі «Ахова здароўя», прымаецца ўстановай адукацыі па ўзгадненні з Міністэрствам аховы здароўя, а выпускнікоў, маладых спецыялістаў, якія атрымалі вышэйшую або сярэднюю спецыяльную адукацыю па напрамку адукацыі «Сельская гаспадарка», – установай адукацыі па ўзгадненні з абласным (Мінскім гарадскім) выканаўчым камітэтам па месцы знаходжання арганізацыі, у якую размеркаваны выпускнік. Парадак узгаднення рашэння аб пераразмеркаванні выпускнікоў, маладых спецыялістаў, якія атрымалі вышэйшую або сярэднюю спецыяльную адукацыю па напрамку адукацыі «Ахова здароўя», устанаўліваецца Міністэрствам аховы здароўя. Парадак узгаднення рашэння аб пераразмеркаванні выпускнікоў, маладых спецыялістаў, якія атрымалі вышэйшую або сярэднюю спецыяльную адукацыю па напрамку адукацыі «Сельская гаспадарка», устанаўліваецца абласнымі (Мінскім гарадскім) выканаўчымі камітэтамі.

6. Тэрмін абавязковай працы па пераразмеркаванні вызначаецца тэрмінам абавязковай працы па размеркаванні і змяншаецца на час, адпрацаваны выпускніком па размеркаванні.

Тэрмін абавязковай працы па размеркаванні прыпыняецца з дня, наступнага за днём звальнення, да дня прыёму на працу па пераразмеркаванні.

7. У тэрмін абавязковай працы па пераразмеркаванні па жаданні выпускніка, маладога спецыяліста, маладога рабочага (служачага) залічваюцца перыяд ваеннай службы па прызыве, ваеннай службы па кантракце, службы ў рэзерве, альтэрнатыўнай службы, перыяд знаходжання ў водпуску па доглядзе дзіцяці да дасягнення ім узросту трох гадоў, калі гэтыя перыяды мелі месца пасля пераразмеркавання на працу.

8. Выпускнікі, якія працуюць па пераразмеркаванні, з'яўляюцца на працягу тэрміну абавязковай працы па пераразмеркаванні маладымі спецыялістамі або маладымі рабочымі (служачымі).

9. Выпускнікам, якія пераразмеркаваны, выдаецца пасведчанне аб накіраванні на працу.

10. Парадак пераразмеркавання выпускнікоў, маладых спецыялістаў, маладых рабочых (служачых), акрамя выпускнікоў, указаных у пункце 4 гэтага артыкула, у частцы, не ўрэгуляванай гэтым Кодэксам, устанаўліваецца Урадам Рэспублікі Беларусь, калі іншае не ўстаноўлена Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 75. Накіраванне на працу выпускнікоў**

1. Накіраванне на працу выпускнікоў – працэдура вызначэння месца працы ў адпаведнасці з заключанымі дагаворамі для выпускнікоў, якія атрымалі ў дзённай форме атрымання адукацыі навукова-арыентаваную адукацыю за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту, на платнай аснове за кошт сродкаў юрыдычных асоб, індывідуальных прадпрымальнікаў, вышэйшую, сярэднюю спецыяльную або прафесійна-тэхнічную адукацыю на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі, на платнай аснове за кошт сродкаў юрыдычных асоб, індывідуальных прадпрымальнікаў, што ажыццяўляецца дзяржаўнымі ўстановамі адукацыі, дзяржаўнымі арганізацыямі, што рэалізуюць адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, або ў выпадках, установленых Урадам Рэспублікі Беларусь, дзяржаўнымі органамі.

2. Выпускнікі, якія накіраваны на працу, абавязаны адпрацаваць тэрмін абавязковай працы пры накіраванні на працу, устаноўлены гэтым пунктам, адпаведным дагаворам.

Тэрмін абавязковай працы пры накіраванні на працу для выпускнікоў, якія атрымалі навукова-арыентаваную адукацыю пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы аспірантуры (ад'юнктуры) за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту, – два гады.

Тэрмін абавязковай працы пры накіраванні на працу для выпускнікоў, якія атрымалі навукова-арыентаваную адукацыю пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы дактарантуры за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту, – адзін год.

Тэрмін абавязковай працы пры накіраванні на працу для выпускнікоў, якія атрымалі агульную вышэйшую або спецыяльную вышэйшую адукацыю на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі, – не менш за пяць гадоў, для выпускнікоў, якія атрымалі паглыбленую вышэйшую або сярэднюю спецыяльную адукацыю на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі, – не менш за тры гады, для выпускнікоў, якія атрымалі прафесійна-тэхнічную адукацыю на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі, – не менш за два гады. Канкрэтны тэрмін абавязковай працы пры накіраванні на працу для выпускнікоў, якія атрымалі вышэйшую, сярэднюю спецыяльную або прафесійна-тэхнічную адукацыю на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі, устанаўліваецца дагаворам аб мэтавай падрыхтоўцы спецыяліста з вышэйшай адукацыяй, спецыяліста (рабочага) з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, рабочага (служачага) з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй.

Тэрмін абавязковай працы пры накіраванні на працу для выпускнікоў, якія атрымалі навукова-арыентаваную, вышэйшую, сярэднюю спецыяльную або прафесійна-тэхнічную адукацыю на платнай аснове за кошт сродкаў юрыдычных асоб, індывідуальных прадпрымальнікаў, вызначаецца адпаведнымі дагаворамі.

3. Выпускнікі, якія атрымалі навукова-арыентаваную, вышэйшую або сярэднюю спецыяльную адукацыю ў дзённай форме атрымання адукацыі на платнай аснове за кошт сродкаў фізічных асоб або ўласных сродкаў, а таксама выпускнікі, якія атрымалі сярэднюю спецыяльную, агульную вышэйшую або спецыяльную вышэйшую адукацыю, менш за палавіну тэрміну атрымання адукацыі якіх фінансавалася за кошт сродкаў рэспубліканскага і (або) мясцовых бюджэтаў і ажыццяўлялася ў дзённай форме атрымання адукацыі, па іх жаданні і пры наяўнасці месцаў працы, што засталіся пасля размеркавання, накіроўваюцца на працу.

4. З'яўляюцца маладымі спецыялістамі або маладымі рабочымі (служачымі) асобы, якія працуюць па накіраванні на працу:

4.1. выпускнікі, указаныя ў частках другой–чацвёртай пункта 2 гэтага артыкула, на працягу тэрміну абавязковай працы па накіраванні на працу;

4.2. выпускнікі, указаныя ў частцы пятай пункта 2 і пункце 3 гэтага артыкула, на працягу двух гадоў.

5. Тэрміны абавязковай працы, указаныя ў пункце 2 гэтага артыкула, вылічваюцца з даты прыёму выпускніка на працу пры накіраванні на працу, а ў выпадку прыёму на працу выпускніка да даты выдачы пасведчання аб накіраванні на працу – з даты выдачы пасведчання аб накіраванні на працу.

Для асоб, якія атрымалі вышэйшую адукацыю па напрамку адукацыі «Ахова здароўя», акрамя асоб, накіраваных на працу ў Дзяржаўны камітэт судовых экспертыз, тэрмін абавязковай працы вылічваецца з дня пачатку дзеяння працоўнага дагавора на пасадзе ўрача-спецыяліста, правізара-спецыяліста.

У тэрмін абавязковай працы пры накіраванні на працу выпускніка, маладога спецыяліста, маладога рабочага (служачага), акрамя накіравання на працу выпускніка, маладога спецыяліста, маладога рабочага (служачага), якія атрымалі навукова-арыентаваную, вышэйшую, сярэднюю спецыяльную або прафесійна-тэхнічную адукацыю на платнай аснове за кошт сродкаў юрыдычных асоб, індывідуальных прадпрымальнікаў, па жаданні выпускніка, маладога спецыяліста, маладога рабочага (служачага) залічваюцца перыяд ваеннай службы па прызыве, ваеннай службы па кантракце, службы ў рэзерве, альтэрнатыўнай службы, перыяд знаходжання ў водпуску па доглядзе дзіцяці

да дасягнення ім узросту трох гадоў, калі такія перыяды мелі месца пасля накіравання на працу.

У тэрмін абавязковай працы пры накіраванні на працу выпускніка, маладога спецыяліста, маладога рабочага (служачага), якія атрымалі навукова-арыентаваную, вышэйшую, сярэднюю спецыяльную або прафесійна-тэхнічную адукацыю на платнай аснове за кошт сродкаў юрыдычных асоб, індывідуальных прадпрымальнікаў, па жаданні выпускніка, маладога спецыяліста, маладога рабочага (служачага) і са згоды асобы, якая ажыццяўляла аплату навучання, залічваюцца перыяд ваеннай службы па прызыве, ваеннай службы па кантракце, службы ў рэзерве, альтэрнатыўнай службы, перыяд знаходжання ў водпуску па доглядзе дзіцяці да дасягнення ім узросту трох гадоў, калі такія перыяды мелі месца пасля накіравання на працу.

6. Выпускнікам, якія накіраваны на працу, пры выдачы дакумента аб адукацыі выдаецца пасведчанне аб накіраванні на працу.

7. Парадак накіравання на працу выпускнікоў у частцы, не ўрэгуляванай гэтым Кодэксам, устанаўліваецца Урадам Рэспублікі Беларусь, калі іншае не ўстаноўлена Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 76. Перанакіраванне на працу выпускнікоў, маладых спецыялістаў, маладых рабочых (служачых)**

1. Установы адукацыі, арганізацыі, што рэалізуюць адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, ажыццяўляюць перанакіраванне на працу ў адпаведнасці з атрыманай спецыяльнасцю, прысвоенай кваліфікацыяй і (або) ступенню:

1.1. маладых спецыялістаў, маладых рабочых (служачых), акрамя накіраваных на працу згодна з дагаворам аб мэтавай падрыхтоўцы спецыяліста з вышэйшай адукацыяй, спецыяліста (рабочага) з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, рабочага (служачага) з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй, у выпадку:

1.1.1. пераводу маладога спецыяліста, маладога рабочага (служачага) з іх згоды ад аднаго наймальніка да іншага (пункт 4 часткі другой артыкула 35 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь) па ўзгадненні паміж імі;

1.1.2. скасавання з маладым спецыялістам, маладым рабочым (служачым) працоўнага дагавора ў сувязі з (са):

ліквідацыяй арганізацыі, спыненнем дзейнасці філіяла, прадстаўніцтва або іншага адасобленага падраздзялення арганізацыі, размешчаных у іншай мясцовасці, скарачэннем колькасці або штату работнікаў, спыненнем (прыпыненнем) у адпаведнасці з заканадаўчымі актамі дзейнасці натарыуса, які ажыццяўляе натарыяльную дзейнасць у натарыяльным бюро, фізічнай асобы, якая ажыццяўляе дзейнасць па аказанні паслуг у сферы аграэкатурызму, індывідуальнага прадпрымальніка, за выключэннем выпадкаў спынення (прыпынення) дзейнасці ў сувязі з іх прызывам на ваенную службу, накіраваннем на альтэрнатыўную службу (пункты 1 і 2 артыкула 42 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь);

парушэннем наймальнікам заканадаўства аб працы, калектыўнага дагавора, пагаднення, працоўнага дагавора (артыкулы 40 і 41 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь);

неадпаведнасцю іх займанай пасадзе служачага (прафесіі рабочага) або працы, што выконваецца, з прычыны стану здароўя, які перашкаджае працягу гэтай працы (пункт 3 артыкула 42 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь);

няяўкай на працу на працягу больш чым чатырох месяцаў запар з прычыны часовай непрацаздольнасці (не лічачы водпуску па цяжарнасці і родах), калі заканадаўствам не вызначаны больш працяглы тэрмін захавання месца працы, пасады служачага (прафесіі рабочага) пры пэўным захворванні (пункт 5 артыкула 42 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь);

акалічнасцямі, не залежнымі ад волі бакоў, з прычыны аднаўлення на працы работніка, які раней выконваў гэту працу, парушэння ўстаноўленых правіл прыёму на працу (пункты 2 і 3 артыкула 44 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь);

іх прызывам на ваенную службу (пункт 1 артыкула 44 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь), але не накіраваных на такую службу, і адмовай наймальніка, да якога былі размеркаваны малады спецыяліст, малады рабочы (служачы), у прыёме на працу;

спартыўнай дыскваліфікацыяй за допінг у спорце (частка другая артыкула 47 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь);

1.1.3. узнікнення ў маладога спецыяліста, маладога рабочага (служачага) акалічнасцей, пры якіх месца працы выпускніку прадастаўляецца ў парадку, прадугледжаным пунктам 9 артыкула 72 гэтага Кодэкса (акрамя выпадкаў змянення месца працы ў межах аднаго населенага пункта);

1.1.4. скасавання працоўнага дагавора з маладым спецыялістам, маладым рабочым (служачым), якія атрымалі навукова-арыентаваную, вышэйшую або сярэднюю спецыяльную адукацыю за кошт сродкаў фізічных асоб або ўласных сродкаў, і пры жаданні выпускніка працаваць па накіраванні на працу;

1.1.5. адмовы ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі ў прадастаўленні допуску да дзяржаўных сакрэтаў работніку, якому для выканання сваіх працоўных абавязкаў неабходны такі допуск, або спынення ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі допуску да дзяржаўных сакрэтаў такога работніка, калі спыненне яго допуску да дзяржаўных сакрэтаў з'яўляецца перашкодай для працягу ім працы па займанай пасадзе служачага (пункт 8 часткі першай артыкула 47 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь);

1.1.6. датэрміновага спынення адукацыйных адносін (адлічэння) з замежнай арганізацыяй асобы, накіраванай для атрымання адукацыі;

1.2. выпускнікоў, акрамя накіраваных на працу згодна з дагаворам аб мэтавай падрыхтоўцы спецыяліста з вышэйшай адукацыяй, спецыяліста (рабочага) з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, рабочага (служачага) з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй, у выпадку:

1.2.1. адмовы наймальніка ў прыёме на працу па атрыманай спецыяльнасці, прысвоенай кваліфікацыі і (або) ступені выпускніку, які прыбыў на працу па накіраванні;

1.2.2. немагчымасці прадастаўлення месца працы ў адпаведнасці з атрыманай спецыяльнасцю, прысвоенай кваліфікацыяй і (або) ступенню па заканчэнні ваеннай службы па прызыве, ваеннай службы па кантракце, альтэрнатыўнай службы ў наймальніка, да якога выпускнік быў накіраваны на працу да прызыву на ваенную службу, паступлення на ваенную службу па кантракце, накіравання на альтэрнатыўную службу, у выпадку:

жадання выпускніка, з якога ў адпаведнасці з часткай першай пункта 4 артыкула 78 гэтага Кодэкса сродкі, затрачаныя дзяржавай на яго падрыхтоўку, не спаганяюцца, працаваць па накіраванні на працу;

звальнення выпускніка з ваеннай службы па прызыве, ваеннай службы па кантракце, альтэрнатыўнай службы, калі тэрмін ваеннай службы па прызыве, ваеннай службы па кантракце, альтэрнатыўнай службы склаў менш за тэрмін, устаноўлены актамі заканадаўства для праходжання ваеннай службы па прызыве для адпаведнай катэгорыі ваеннаслужачых, тэрміну ваеннай службы, устаноўленага кантрактам аб праходжанні ваеннай службы, тэрміну альтэрнатыўнай службы для адпаведнай катэгорыі грамадзян;

1.2.3. немагчымасці прадастаўлення месца працы ў адпаведнасці з атрыманай спецыяльнасцю, прысвоенай кваліфікацыяй і (або) ступенню ў наймальніка, да якога выпускнік быў накіраваны на працу, у выпадку ненакіравання на ваенную службу па прызыве, у тым ліку калі працоўны дагавор быў спынены ў сувязі з яго прызывам на ваенную службу, накіраваннем на альтэрнатыўную службу (пункт 1 артыкула 44 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь);

1.2.4. датэрміновага спынення адукацыйных адносін (адлічэння) з замежнай арганізацыяй асобы, накіраванай для атрымання адукацыі;

1.2.5. спартыўнай дыскваліфікацыі за допінг у спорце;

1.3. выпускнікоў, маладых спецыялістаў, маладых рабочых (служачых), накіраваных на працу згодна з дагаворам аб мэтавай падрыхтоўцы спецыяліста з вышэйшай адукацыяй, спецыяліста (рабочага) з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, рабочага (служачага) з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй:

1.3.1. у выпадку ўзнікнення ў выпускніка, маладога спецыяліста, маладога рабочага (служачага) акалічнасцей, пры якіх месца працы выпускніку прадастаўляецца ў парадку, прадугледжаным пунктам 9 артыкула 72 гэтага Кодэкса, пры ўмове перазаключэння дагавора аб мэтавай падрыхтоўцы спецыяліста з вышэйшай адукацыяй, спецыяліста (рабочага) з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, рабочага (служачага) з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй;

1.3.2. у выпадку немагчымасці прадастаўлення месца працы ў адпаведнасці з атрыманай спецыяльнасцю, прысвоенай кваліфікацыяй і (або) ступенню па заканчэнні ваеннай службы па прызыве, ваеннай службы па кантракце, альтэрнатыўнай службы ў наймальніка, да якога выпускнік быў накіраваны на працу да прызыву на ваенную службу, паступлення на ваенную службу па кантракце, накіравання на альтэрнатыўную службу, у выпадку:

жадання выпускніка, з якога ў адпаведнасці з часткай другой пункта 4 артыкула 78 гэтага Кодэкса сродкі, затрачаныя дзяржавай на яго падрыхтоўку, не спаганяюцца, працаваць па накіраванні на працу;

звальнення выпускніка з ваеннай службы па прызыве, ваеннай службы па кантракце, альтэрнатыўнай службы, калі тэрмін ваеннай службы па прызыве, ваеннай службы па кантракце, альтэрнатыўнай службы склаў менш чым тэрмін абавязковай працы, устаноўлены пры накіраванні на працу выпускнікоў, якія атрымалі адпаведную адукацыю;

1.3.3. у выпадку немагчымасці прадастаўлення месца працы ў адпаведнасці з атрыманай спецыяльнасцю, прысвоенай кваліфікацыяй і (або) ступенню ў наймальніка, да якога выпускнік быў накіраваны на працу, у выпадку ненакіравання на ваенную службу па прызыве, у тым ліку калі працоўны дагавор быў спынены ў сувязі з прызывам яго на ваенную службу, накіраваннем на альтэрнатыўную службу (пункт 1 артыкула 44 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь);

1.3.4. у выпадках, прадугледжаных пунктамі 5 і 6 артыкула 78 гэтага Кодэкса;

1.3.5. у выпадку спартыўнай дыскваліфікацыі за допінг у спорце.

2. Парадак змянення і скасавання дагавораў аб мэтавай падрыхтоўцы спецыяліста з вышэйшай адукацыяй, спецыяліста (рабочага) з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, рабочага (служачага) з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй устанаўліваецца Урадам Рэспублікі Беларусь.

3. Рашэнне аб перанакіраванні маладых спецыялістаў, выпускнікоў, якія атрымалі вышэйшую адукацыю па напрамку адукацыі «Ахова здароўя», прымаецца ўстановай адукацыі па ўзгадненні з Міністэрствам аховы здароўя, а выпускнікоў, якія атрымалі вышэйшую або сярэднюю спецыяльную адукацыю па напрамку адукацыі «Сельская гаспадарка», сярэднюю спецыяльную адукацыю па напрамку адукацыі «Ахова здароўя», – установай адукацыі па ўзгадненні з абласным (Мінскім гарадскім) выканаўчым камітэтам па месцы знаходжання арганізацыі, у якую накіраваны выпускнік. Парадак узгаднення рашэння аб перанакіраванні маладых спецыялістаў, выпускнікоў, якія атрымалі вышэйшую адукацыю па напрамку адукацыі «Ахова здароўя», устанаўліваецца Міністэрствам аховы здароўя. Парадак узгаднення рашэння аб перанакіраванні маладых спецыялістаў, выпускнікоў, якія атрымалі вышэйшую або сярэднюю спецыяльную адукацыю па напрамку адукацыі «Сельская гаспадарка», сярэднюю спецыяльную адукацыю па напрамку адукацыі «Ахова здароўя», устанаўліваецца абласнымі (Мінскім гарадскім) выканаўчымі камітэтамі.

4. Тэрмін абавязковай працы пры перанакіраванні на працу вызначаецца тэрмінам абавязковай працы пры накіраванні на працу і змяншаецца на час, адпрацаваны маладым спецыялістам, маладым рабочым (служачым) пры накіраванні на працу.

Тэрмін абавязковай працы па накіраванні на працу прыпыняецца з дня, наступнага за днём звальнення, да дня прыёму на працу па перанакіраванні.

У тэрмін абавязковай працы пры перанакіраванні на працу выпускніка, маладога спецыяліста, маладога рабочага (служачага), якія атрымалі навукова-арыентаваную, вышэйшую, сярэднюю спецыяльную або прафесійна-тэхнічную адукацыю, акрамя перанакіравання на працу выпускніка, маладога спецыяліста, маладога рабочага (служачага), якія атрымалі навукова-арыентаваную, вышэйшую, сярэднюю спецыяльную або прафесійна-тэхнічную адукацыю на платнай аснове за кошт сродкаў юрыдычных асоб, індывідуальных прадпрымальнікаў, па жаданні выпускніка, маладога спецыяліста, маладога рабочага (служачага) залічваюцца перыяд ваеннай службы па прызыве, ваеннай службы па кантракце, службы ў рэзерве, альтэрнатыўнай службы, перыяд знаходжання ў водпуску па доглядзе дзіцяці да дасягнення ім узросту трох гадоў, калі такія перыяды мелі месца пасля перанакіравання на працу.

У тэрмін абавязковай працы пры перанакіраванні на працу выпускніка, маладога спецыяліста, маладога рабочага (служачага), якія атрымалі навукова-арыентаваную, вышэйшую, сярэднюю спецыяльную або прафесійна-тэхнічную адукацыю на платнай аснове за кошт сродкаў юрыдычных асоб, індывідуальных прадпрымальнікаў, па жаданні выпускніка, маладога спецыяліста, маладога рабочага (служачага) і са згоды асобы, якая ажыццяўляла аплату навучання, залічваюцца перыяд ваеннай службы па прызыве, ваеннай службы па кантракце, службы ў рэзерве, альтэрнатыўнай службы, перыяд знаходжання ў водпуску па доглядзе дзіцяці да дасягнення ім узросту трох гадоў, калі такія перыяды мелі месца пасля перанакіравання на працу.

5. Выпускнікам, маладым спецыялістам, маладым рабочым (служачым), якія перанакіраваны на працу, выдаецца пасведчанне аб накіраванні на працу.

6. Парадак перанакіравання на працу выпускнікоў, маладых спецыялістаў, маладых рабочых (служачых) у частцы, не ўрэгуляванай гэтым Кодэксам, устанаўліваецца Урадам Рэспублікі Беларусь, калі іншае не ўстаноўлена Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 77. Прадастаўленне выпускнікам, маладым спецыялістам, маладым рабочым (служачым) права на самастойнае працаўладкаванне**

1. Месца працы пры размеркаванні, пераразмеркаванні, накіраванні на працу і перанакіраванні на працу не прадастаўляецца выпускніку, маладому спецыялісту, маладому рабочаму (служачаму):

1.1. якім месца працы не можа быць прадастаўлена ў адпаведнасці з атрыманай спецыяльнасцю, прысвоенай кваліфікацыяй і (або) ступенню ў сувязі з адсутнасцю месца працы або месца працы, якое адпавядае ўмовам, указаным у пункце 9 артыкула 72 гэтага Кодэкса;

1.2. якія атрымалі адукацыю ў вячэрняй, завочнай або дыстанцыйнай форме атрымання адукацыі, акрамя выпускнікоў, не менш за палавіну тэрміну атрымання адукацыі якіх фінансавалася за кошт сродкаў рэспубліканскага і (або) мясцовых бюджэтаў і ажыццяўлялася ў дзённай форме атрымання адукацыі, якія на момант размеркавання навучаліся ў вячэрняй, завочнай або дыстанцыйнай форме атрымання адукацыі і не працавалі па спецыяльнасці, што атрымліваецца, не праходзілі ваенную службу па кантракце;

1.3. якім месца працы шляхам размеркавання не прадастаўляецца ў адпаведнасці з часткай другой пункта 2 артыкула 72 гэтага Кодэкса;

1.4. якія атрымалі адукацыю ў дзённай форме атрымання адукацыі на платнай аснове, акрамя выпускнікоў, якія атрымалі вышэйшую, сярэднюю спецыяльную або прафесійна-тэхнічную адукацыю ў дзённай форме атрымання адукацыі на платнай аснове за кошт сродкаў юрыдычных асоб, індывідуальных прадпрымальнікаў, і выпускнікоў, якім месца працы прадастаўляецца пры накіраванні на працу ў адпаведнасці з пунктам 3 артыкула 75 гэтага Кодэкса;

1.5. якія не адпрацавалі тэрмін абавязковай працы па размеркаванні пры накіраванні на працу, калі яны вызвалены ад пакрыцця сродкаў, затрачаных дзяржавай на падрыхтоўку спецыяліста, рабочага, служачага, у рэспубліканскі і (або) мясцовыя бюджэты на падставе пунктаў 2, 3, 5 і 6 артыкула 78 гэтага Кодэкса;

1.6. якія не адпрацавалі тэрмін абавязковай працы па размеркаванні пры накіраванні на працу, калі яны пакрылі ў рэспубліканскі і (або) мясцовыя бюджэты сродкі, затрачаныя дзяржавай на падрыхтоўку спецыяліста, рабочага, служачага;

1.7. якія не адпрацавалі тэрмін абавязковай працы па размеркаванні пры накіраванні на працу, у дачыненні да якіх ёсць рашэнне суда, што ўступіла ў законную сілу, аб спагнанні ў рэспубліканскі і (або) мясцовыя бюджэты сродкаў, затрачаных дзяржавай на падрыхтоўку спецыяліста, рабочага, служачага;

1.8. якія не адпрацавалі тэрмін абавязковай працы пры накіраванні на працу, калі яны адносяцца да адной з катэгорый выпускнікоў, указаных у пункце 3 артыкула 75 гэтага Кодэкса, пры адсутнасці падставы для перанакіравання на працу або пры наяўнасці падставы для перанакіравання на працу ў выпадку адсутнасці на гэта жадання.

2. У выпадках, прадугледжаных пунктам 1 гэтага артыкула, выпускніку, маладому спецыялісту, маладому рабочаму (служачаму) прадастаўляецца права на самастойнае працаўладкаванне, што пацвярджаецца даведкай аб самастойным працаўладкаванні, акрамя асоб, якім пры адсутнасці месца працы шляхам размеркавання месца працы прадастаўляецца шляхам працаўладкавання ў лік броні, якая выдаецца дзяржаўнай установай адукацыі, дзяржаўнай арганізацыяй, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, дзяржаўным органам.

3. Прыватная ўстанова адукацыі выдае выпускніку даведку аб самастойным працаўладкаванні.

### Артыкул 78. Пакрыццё ў рэспубліканскі і (або) мясцовыя бюджэты сродкаў, затрачаных дзяржавай на падрыхтоўку навуковага работніка вышэйшай кваліфікацыі, спецыяліста, рабочага, служачага

1. Выпускнікі, якім месца працы прадастаўлена шляхам размеркавання, працаўладкавання ў лік броні, пераразмеркавання, якія накіраваны, перанакіраваны на працу ў адпаведнасці з дагаворам аб падрыхтоўцы навуковага работніка вышэйшай кваліфікацыі за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту, аб мэтавай падрыхтоўцы спецыяліста з вышэйшай адукацыяй, спецыяліста (рабочага) з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, рабочага (служачага) з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй і не адпрацавалі ўстаноўлены тэрмін абавязковай працы (акрамя асоб, указаных у пунктах 2–6 гэтага артыкула), а таксама асобы, якія навучаліся або атрымалі адукацыю па спецыяльнасцях для воінскіх фарміраванняў і ваенізаваных арганізацый, у выпадках, прадугледжаных заканадаўствам аб праходжанні адпаведнай службы, абавязаны пакрыць у рэспубліканскі і (або) мясцовыя бюджэты сродкі, затрачаныя дзяржавай на іх падрыхтоўку.

Выпускнікі, якія не заключылі дагавор аб адпрацоўцы абавязковага тэрміну працы па размеркаванні ў адпаведнасці з часткамі другой і трэцяй пункта 14 артыкула 72 гэтага Кодэкса і не адпрацавалі ўстаноўлены тэрмін абавязковай працы па размеркаванні пасля атрымання вышэйшай адукацыі ва ўстановах вышэйшай адукацыі ў сферы культуры Расійскай Федэрацыі (датэрміновага спынення адукацыйных адносін (адлічэння) з установай вышэйшай адукацыі ў сферы культуры Расійскай Федэрацыі), абавязаны пакрыць у рэспубліканскі і (або) мясцовыя бюджэты сродкі, затрачаныя дзяржавай на іх падрыхтоўку ва ўстанове сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў сферы культуры, гімназіі – каледжы мастацтваў.

Абавязак па пакрыцці ў рэспубліканскі і (або) мясцовыя бюджэты сродкаў, затрачаных дзяржавай на падрыхтоўку навуковага работніка вышэйшай кваліфікацыі, спецыяліста, рабочага, служачага, падрыхтоўка якіх ажыццяўлялася за кошт сродкаў

рэспубліканскага і (або) мясцовых бюджэтаў, у парадку, які вызначаецца Урадам Рэспублікі Беларусь, нясуць:

арганізацыя – заказчык кадраў – у выпадку неабгрунтаванай адмовы ў прыёме на працу па атрыманай спецыяльнасці, прысвоенай кваліфікацыі і (або) ступені выпускніку, які прыбыў на працу па размеркаванні, пераразмеркаванні, працаўладкаванні ў лік броні, накіраванаму, перанакіраванаму на працу;

наймальнік – у выпадку незаконнага звальнення маладога спецыяліста, маладога рабочага (служачага).

Асобы, якія засвойвалі змест адукацыйных праграм на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі і спынілі адукацыйныя адносіны па ўласным жаданні (падпункт 4.2 пункта 4 артыкула 68 гэтага Кодэкса), ініцыятыве ўстановы адукацыі (пункт 5 артыкула 68 гэтага Кодэкса), абавязаны пакрыць у рэспубліканскі і (або) мясцовыя бюджэты сродкі, затрачаныя дзяржавай на іх падрыхтоўку, акрамя асоб, якія адносяцца да катэгорыі асоб:

якім установлена інваліднасць да дасягнення імі ўзросту васямнаццаці гадоў;

якім установлена інваліднасць I або II групы;

аднаму з бацькоў, усынаўляльнікаў (удачаральнікаў) або мужу (жонцы) якіх установлена інваліднасць I або II групы;

дзіцяці якіх установлена інваліднасць;

у якіх узніклі медыцынскія проціпаказанні да працы па спецыяльнасці, што атрымліваецца, і прысвоенай кваліфікацыі, а таксама ў выпадку ліквідацыі арганізацыі – заказчыка кадраў.

2. Маладыя спецыялісты, маладыя рабочыя (служачыя), якім месца працы прадастаўлена шляхам размеркавання, працаўладкавання ў лік броні, пераразмеркавання, якія накіраваны, перанакіраваны на працу ў адпаведнасці з дагаворам аб падрыхтоўцы навуковага работніка вышэйшай кваліфікацыі за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту, а таксама выпускнікі, якім месца працы прадастаўлена шляхам размеркавання, працаўладкавання ў лік броні, якія накіраваны на працу ў адпаведнасці з дагаворам аб падрыхтоўцы навуковага работніка вышэйшай кваліфікацыі за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту, прыбылі да месца працы ў тэрмін, установлены ў пасведчанні аб накіраванні на працу, і не адпрацавалі ўстаноўлены тэрмін абавязковай працы, вызваляюцца ад пакрыцця ў рэспубліканскі і (або) мясцовыя бюджэты сродкаў, затрачаных дзяржавай на іх падрыхтоўку, калі яны адносяцца да катэгорыі:

2.1. асоб, уключаных Міністэрствам спорту і турызму ў спісачныя склады нацыянальных камандаў Рэспублікі Беларусь па відах спорту;

2.2. дзяцей-інвалідаў ва ўзросце да васямнаццаці гадоў, інвалідаў I або II групы, пры немагчымасці прадастаўлення шляхам пераразмеркавання, перанакіравання на працу новага месца працы з улікам стану іх здароўя па месцы жыхарства бацькоў, усынаўляльнікаў (удачаральнікаў), мужа (жонкі) або з іх згоды іншага месца працы;

2.3. асоб, якія маюць аднаго з бацькоў, усынаўляльнікаў (удачаральнікаў) або мужа (жонку) інваліда I або II групы або дзіця-інваліда ва ўзросце да васямнаццаці гадоў, пры немагчымасці прадастаўлення шляхам пераразмеркавання, перанакіравання на працу новага месца працы па месцы жыхарства гэтых бацькі або маці, мужа (жонкі), дзіцяці-інваліда ва ўзросце да васямнаццаці гадоў;

2.4. выпускнікоў, працаўладкаваных у лік броні, пры немагчымасці прадастаўлення шляхам пераразмеркавання новага месца працы;

2.5. асоб, якія маюць медыцынскія проціпаказанні да працы па атрыманай спецыяльнасці і прысвоенай кваліфікацыі, а таксама маюць медыцынскія проціпаказанні да працы на асобных пасадах служачых, па асобных прафесіях рабочых, пры немагчымасці прадастаўлення шляхам пераразмеркавання, перанакіравання на працу новага месца працы з улікам стану іх здароўя;

2.6. цяжарных жанчын, пры немагчымасці прадастаўлення шляхам пераразмеркавання, перанакіравання на працу новага месца працы па месцы іх жыхарства;

2.7. маці (бацькаў), якія маюць дзіця ва ўзросце да трох гадоў на дату прыняцця рашэння аб пераразмеркаванні, перанакіраванні на працу, пры немагчымасці прадастаўлення шляхам пераразмеркавання, перанакіравання на працу новага месца працы па месцы жыхарства аднаго з бацькоў дзіцяці;

2.8. асоб, муж (жонка) якіх працуе і пастаянна пражывае ў Рэспубліцы Беларусь або накіраваны на працу ў дыпламатычныя прадстаўніцтвы або консульскія ўстановы Рэспублікі Беларусь, пры немагчымасці прадастаўлення ім шляхам пераразмеркавання, перанакіравання на працу новага месца працы па месцы жыхарства і (або) працы (службы) мужа (жонкі);

2.9. дзяцей асоб, указаных у падпунктах 3.2, 3.4 і 3.7 пункта 3, пункце 10 і падпунктах 12.2 і 12.3 пункта 12 артыкула 3 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб дзяржаўных сацыяльных ільготах, правах і гарантыях для асобных катэгорый грамадзян», пры немагчымасці прадастаўлення шляхам пераразмеркавання, перанакіравання на працу новага месца працы па месцы жыхарства бацькоў, усынаўляльнікаў (удачаральнікаў), мужа (жонкі) гэтых дзяцей;

2.10. асоб, якія маюць ільготы ў адпаведнасці з артыкулам 18 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб сацыяльнай абароне грамадзян, пацярпелых ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, іншых радыяцыйных аварый»;

2.11. дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекавання бацькоў, а таксама асоб з ліку дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекавання бацькоў, асоб ва ўзросце ад васямнаццаці да дваццаці трох гадоў, якія страцілі апошняга з бацькоў у перыяд атрымання адпаведнай адукацыі, пры немагчымасці прадастаўлення ім новага месца працы шляхам пераразмеркавання, перанакіравання на працу.

3. Маладыя спецыялісты, маладыя рабочыя (служачыя), якім месца працы прадастаўлена шляхам размеркавання, працаўладкавання ў лік броні, пераразмеркавання, накіраваныя, перанакіраваныя на працу ў адпаведнасці з дагаворам аб падрыхтоўцы навуковага работніка вышэйшай кваліфікацыі за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту, якія не адпрацавалі ўстаноўлены тэрмін абавязковай працы, вызваляюцца ад пакрыцця ў рэспубліканскі і (або) мясцовыя бюджэты сродкаў, затрачаных дзяржавай на іх падрыхтоўку, калі працоўны дагавор з імі скасаваны ў сувязі з (са):

3.1. ліквідацыяй арганізацыі, спыненнем дзейнасці філіяла, прадстаўніцтва або іншага адасобленага падраздзялення арганізацыі, размешчаных у іншай мясцовасці, скарачэннем колькасці або штату работнікаў, спыненнем (прыпыненнем) у адпаведнасці з заканадаўчымі актамі дзейнасці натарыуса, які ажыццяўляе натарыяльную дзейнасць у натарыяльным бюро, фізічнай асобы, якая ажыццяўляе дзейнасць па аказанні паслуг у сферы аграэкатурызму, індывідуальнага прадпрымальніка, за выключэннем выпадкаў спынення (прыпынення) дзейнасці ў сувязі з іх прызывам на ваенную службу, накіраваннем на альтэрнатыўную службу (пункты 1 і 2 артыкула 42 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь);

3.2. парушэннем наймальнікам заканадаўства аб працы, калектыўнага дагавора, пагаднення, працоўнага дагавора (артыкулы 40 і 41 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь), пры немагчымасці прадастаўлення ім новага месца працы шляхам пераразмеркавання, перанакіравання на працу;

3.3. неадпаведнасцю іх займанай пасадзе служачага (прафесіі рабочага) або працы, што выконваецца, з прычыны стану здароўя, які перашкаджае працягу гэтай працы (пункт 3 артыкула 42 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь), пры немагчымасці прадастаўлення ім новага месца працы шляхам пераразмеркавання, перанакіравання на працу з улікам стану іх здароўя;

3.4. няяўкай на працу на працягу больш чым чатырох месяцаў запар з прычыны часовай непрацаздольнасці (не лічачы водпуску па цяжарнасці і родах), калі заканадаўствам не ўстаноўлены больш працяглы тэрмін захавання месца працы, пасады служачага (прафесіі рабочага) пры пэўным захворванні (пункт 5 артыкула 42 Працоўнага

кодэкса Рэспублікі Беларусь), пры немагчымасці прадастаўлення ім новага месца працы шляхам пераразмеркавання, перанакіравання на працу;

3.5. іх прызывам на ваенную службу, накіраваннем на альтэрнатыўную службу (пункт 1 артыкула 44 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь), пры немагчымасці прадастаўлення ім новага месца працы шляхам пераразмеркавання, перанакіравання на працу;

3.6. акалічнасцямі, не залежнымі ад волі бакоў, з прычыны аднаўлення на працы работніка, які раней выконваў гэту працу, парушэння ўстаноўленых правіл прыёму на працу (пункты 2 і 3 артыкула 44 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь), пры немагчымасці прадастаўлення ім новага месца працы шляхам пераразмеркавання, перанакіравання на працу;

3.7. пераходам на выбарную пасаду служачага (пункт 4 часткі другой артыкула 35 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь);

3.8. адмовай у адпаведнасці з заканадаўчымі актамі ў прадастаўленні допуску да дзяржаўных сакрэтаў работніку, якому для выканання сваіх працоўных абавязкаў неабходны такі допуск, або спыненнем у адпаведнасці з заканадаўчымі актамі допуску да дзяржаўных сакрэтаў такога работніка, калі спыненне яго допуску да дзяржаўных сакрэтаў з'яўляецца перашкодай для працягу ім працы па займанай пасадзе служачага (пункт 8 часткі першай артыкула 47 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь), пры немагчымасці прадастаўлення ім новага месца працы шляхам пераразмеркавання, перанакіравання на працу.

4. З выпускнікоў, якім месца працы прадастаўлена шляхам размеркавання, працаўладкавання ў лік броні, пераразмеркавання, якія накіраваны, перанакіраваны на працу ў адпаведнасці з дагаворам аб падрыхтоўцы навуковага работніка вышэйшай кваліфікацыі за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту, прызваны на ваенную службу, паступілі на ваенную службу па кантракце або накіраваны на альтэрнатыўную службу і праслужылі (прайшлі альтэрнатыўную службу) не менш за тэрмін, устаноўлены заканадаўствам для праходжання ваеннай службы па прызыве для адпаведнай катэгорыі ваеннаслужачых, тэрмін ваеннай службы, устаноўлены кантрактам аб праходжанні ваеннай службы, тэрмін альтэрнатыўнай службы для адпаведнай катэгорыі грамадзян, сродкі, затрачаныя дзяржавай на іх падрыхтоўку, не спаганяюцца.

З выпускнікоў, якія атрымалі адукацыю на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі, прызваны на ваенную службу, паступілі на ваенную службу па кантракце або накіраваны на альтэрнатыўную службу і праслужылі (прайшлі альтэрнатыўную службу) не менш за тэрмін абавязковай працы, устаноўлены пры накіраванні на працу выпускнікоў, якія атрымалі адпаведную адукацыю, сродкі, затрачаныя дзяржавай на іх падрыхтоўку, не спаганяюцца.

З выпускнікоў, якім месца працы прадастаўлена шляхам размеркавання, працаўладкавання ў лік броні, пераразмеркавання, якія накіраваны, перанакіраваны на працу ў адпаведнасці з дагаворам аб падрыхтоўцы навуковага работніка вышэйшай кваліфікацыі за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту, аб мэтавай падрыхтоўцы спецыяліста з вышэйшай адукацыяй, спецыяліста (рабочага) з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, рабочага (служачага) з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй, прызваны на ваенную службу, паступілі на ваенную службу па кантракце, накіраваны на альтэрнатыўную службу, пры немагчымасці прадастаўлення ім новага месца працы шляхам пераразмеркавання, перанакіравання сродкі, затрачаныя дзяржавай на іх падрыхтоўку, не спаганяюцца ў выпадку, калі яны звольнены з ваеннай службы па прызыве, ваеннай службы па кантракце, альтэрнатыўнай службы і праслужылі (прайшлі альтэрнатыўную службу) менш чым тэрмін службы, устаноўлены заканадаўствам для праходжання ваеннай службы па прызыве для адпаведнай катэгорыі ваеннаслужачых, тэрмін ваеннай службы, устаноўлены кантрактам аб праходжанні ваеннай службы, тэрмін альтэрнатыўнай службы

для адпаведнай катэгорыі грамадзян або менш чым тэрмін абавязковай працы, устаноўлены пры накіраванні на працу выпускнікоў.

5. Маладыя спецыялісты, маладыя рабочыя (служачыя), якія накіраваны, перанакіраваны на працу ў адпаведнасці з дагаворам аб мэтавай падрыхтоўцы спецыяліста з вышэйшай адукацыяй, спецыяліста (рабочага) з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, рабочага (служачага) з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй, а таксама выпускнікі, якія накіраваны на працу ў адпаведнасці з дагаворам аб мэтавай падрыхтоўцы спецыяліста з вышэйшай адукацыяй, спецыяліста (рабочага) з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, рабочага (служачага) з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй, прыбылі да месца працы ў тэрмін, устаноўлены ў пасведчанні аб накіраванні на працу, і не адпрацавалі ўстаноўлены тэрмін абавязковай працы, вызваляюцца ад пакрыцця ў рэспубліканскі і (або) мясцовыя бюджэты сродкаў, затрачаных дзяржавай на іх падрыхтоўку, калі яны:

5.1. з’яўляюцца дзецьмі-інвалідамі ва ўзросце да васямнаццаці гадоў, інвалідамі I або II групы, пры немагчымасці прадастаўлення ім новага месца працы шляхам перанакіравання на працу з улікам стану іх здароўя па месцы жыхарства бацькоў, мужа (жонкі) або з іх згоды іншага месца працы;

5.2. маюць аднаго з бацькоў, усынаўляльнікаў (удачаральнікаў) або мужа (жонку) інваліда I або II групы або дзіця-інваліда ва ўзросце да васямнаццаці гадоў, пры немагчымасці прадастаўлення ім новага месца працы шляхам перанакіравання на працу па месцы жыхарства гэтых бацькі або маці, мужа (жонкі), дзіцяці-інваліда ва ўзросце да васямнаццаці гадоў;

5.3. маюць медыцынскія проціпаказанні да працы на асобных пасадах служачых, па асобных прафесіях рабочых, пры немагчымасці прадастаўлення ім новага месца працы шляхам перанакіравання на працу з улікам стану іх здароўя.

6. Маладыя спецыялісты, маладыя рабочыя (служачыя), якія накіраваны, перанакіраваны на працу ў адпаведнасці з дагаворам аб мэтавай падрыхтоўцы спецыяліста з вышэйшай адукацыяй, спецыяліста (рабочага) з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, рабочага (служачага) з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй, не адпрацавалі ўстаноўлены тэрмін абавязковай працы, вызваляюцца ад пакрыцця ў рэспубліканскі і (або) мясцовыя бюджэты сродкаў, затрачаных дзяржавай на іх падрыхтоўку, калі працоўны дагавор (кантракт) з імі скасаваны ў сувязі з (са):

6.1. ліквідацыяй арганізацыі, спыненнем дзейнасці філіяла, прадстаўніцтва або іншага адасобленага падраздзялення арганізацыі, размешчаных у іншай мясцовасці, скарачэннем колькасці або штату работнікаў, спыненнем (прыпыненнем) у адпаведнасці з заканадаўчымі актамі дзейнасці натарыуса, які ажыццяўляе натарыяльную дзейнасць у натарыяльным бюро, фізічнай асобы, якая ажыццяўляе дзейнасць па аказанні паслуг у сферы аграэкатурызму, індывідуальнага прадпрымальніка, за выключэннем выпадкаў спынення (прыпынення) дзейнасці ў сувязі з іх прызывам на ваенную службу, накіраваннем на альтэрнатыўную службу (пункты 1 і 2 артыкула 42 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь);

6.2. парушэннем наймальнікам заканадаўства аб працы, калектыўнага дагавора, пагаднення, працоўнага дагавора (артыкулы 40 і 41 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь), пры немагчымасці прадастаўлення ім новага месца працы шляхам перанакіравання на працу;

6.3. неадпаведнасцю іх займанай пасадзе служачага (прафесіі рабочага) або працы, што выконваецца, з прычыны стану здароўя, які перашкаджае працягу гэтай працы (пункт 3 артыкула 42 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь), пры немагчымасці прадастаўлення ім шляхам перанакіравання на працу новага месца працы з улікам стану іх здароўя;

6.4. няяўкай на працу на працягу больш чым чатырох месяцаў запар з прычыны часовай непрацаздольнасці (не лічачы водпуску па цяжарнасці і родах), калі заканадаўствам не ўстаноўлены больш працяглы тэрмін захавання месца працы, пасады служачага (прафесіі рабочага) пры пэўным захворванні (пункт 5 артыкула 42 Працоўнага

кодэкса Рэспублікі Беларусь), пры немагчымасці прадастаўлення ім новага месца працы шляхам перанакіравання на працу;

6.5. акалічнасцямі, не залежнымі ад волі бакоў, з прычыны аднаўлення на працы работніка, які раней выконваў гэту працу, парушэння ўстаноўленых правіл прыёму на працу (пункты 2 і 3 артыкула 44 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь), пры немагчымасці прадастаўлення ім новага месца працы шляхам перанакіравання на працу;

6.6. адмовай у адпаведнасці з заканадаўчымі актамі ў прадастаўленні допуску да дзяржаўных сакрэтаў работніку, якому для выканання сваіх працоўных абавязкаў неабходны такі допуск, або спыненнем у адпаведнасці з заканадаўчымі актамі допуску да дзяржаўных сакрэтаў такога работніка, калі спыненне яго допуску да дзяржаўных сакрэтаў з'яўляецца перашкодай для працягу ім працы па займанай пасадзе служачага (пункт 8 часткі першай артыкула 47 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь), пры немагчымасці прадастаўлення ім новага месца працы шляхам перанакіравання на працу;

6.7. іх прызывам на ваенную службу, накіраваннем на альтэрнатыўную службу (пункт 1 артыкула 44 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь), пры немагчымасці прадастаўлення ім новага месца працы шляхам перанакіравання на працу.

7. Парадак пакрыцця сродкаў у рэспубліканскі і (або) мясцовыя бюджэты, затрачаныя дзяржавай на падрыхтоўку навуковага работніка вышэйшай кваліфікацыі, спецыяліста, рабочага, служачага, вызначаецца Урадам Рэспублікі Беларусь, калі іншае не ўстаноўлена Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

8. Пакрыццё сродкаў у рэспубліканскі і (або) мясцовыя бюджэты, затрачаных дзяржавай на падрыхтоўку спецыяліста, рабочага, служачага, асобамі, якія навучаліся або атрымалі адукацыю па спецыяльнасцях для воінскіх фарміраванняў і ваенізаваных арганізацый, ажыццяўляецца ў парадку, прадугледжаным заканадаўствам аб праходжанні адпаведнай службы.

### Артыкул 79. Страта статусу маладога спецыяліста, маладога рабочага (служачага)

1. Маладыя спецыялісты, маладыя рабочыя (служачыя) страчваюць статус маладога спецыяліста, маладога рабочага (служачага), калі яны:

1.1. працуюць па размеркаванні, працаўладкаванні ў лік броні, пераразмеркаванні, накіраванні на працу, перанакіраванні на працу і ў перыяд тэрміну абавязковай працы адначасова ў дзённай форме атрымання адукацыі атрымліваюць адукацыю ва ўстанове адукацыі, арганізацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, пасля атрымання якой яны падлягаюць размеркаванню або накіраванню на працу ў адпаведнасці з артыкуламі 72 або 75 гэтага Кодэкса, – з даты ўзнікнення адукацыйных адносін;

1.2. не адпрацавалі тэрмін абавязковай працы пасля размеркавання, працаўладкавання ў лік броні, пераразмеркавання, накіравання на працу, перанакіравання на працу і атрымалі права на самастойнае працаўладкаванне, – з даты выдачы даведкі аб самастойным працаўладкаванні.

2. Маладыя спецыялісты, маладыя рабочыя (служачыя), якія прыняты (залічаны) для атрымання адукацыі ў дзённай форме атрымання адукацыі, пасля атрымання якой яны падлягаюць размеркаванню або накіраванню на працу ў адпаведнасці з артыкуламі 72 або 75 гэтага Кодэкса, працягваюць працаваць па месцы размеркавання, працаўладкавання ў лік броні, пераразмеркавання, накіравання на працу або перанакіравання на працу, абавязаны на працягу сямі каляндарных дзён пасля азнаямлення з загадам кіраўніка ўстановы адукацыі, арганізацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, аб прыёме (залічэнні) ва ўстанову адукацыі, арганізацыю, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, для атрымання адукацыі пісьмова паведаміць аб гэтым установе адукацыі, арганізацыі, што рэалізуе

адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, якімі было выдадзена пасведчанне аб накіраванні на працу, і наймальніку.

3. Установа адукацыі, арганізацыя, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, абавязаны на працягу пяці дзён пасля выдання загада кіраўніка аб прыёме (залічэнні) ва ўстанову адукацыі, арганізацыю, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, для атрымання адукацыі ўказаных у пункце 2 гэтага артыкула маладых спецыялістаў, маладых рабочых (служачых) пісьмова паведаміць аб гэтым установе адукацыі, арганізацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, якімі было выдадзена пасведчанне аб накіраванні на працу.

4. Установа адукацыі, арганізацыя, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, якімі было выдадзена пасведчанне аб накіраванні на працу, абавязаны на працягу пяці дзён пасля атрымання паведамлення, указанага ў пункце 3 гэтага артыкула, пісьмова паведаміць аб гэтым наймальніку, да якога былі размеркаваны, працаўладкаваны ў лік броні, пераразмеркаваны, накіраваны на працу, перанакіраваны на працу выпускнік, малады спецыяліст, малады рабочы (служачы).

5. Установа адукацыі, арганізацыя, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, абавязаны на працягу пяці дзён пасля выдачы даведкі аб самастойным працаўладкаванні паведаміць аб гэтым наймальніку выпускніка, якому выдадзена даведка аб самастойным працаўладкаванні.

6. Маладыя спецыялісты, маладыя рабочыя (служачыя), указаныя ў пункце 1 гэтага артыкула, якія не паведамілі наймальніку аб прыёме (залічэнні) ва ўстанову адукацыі, арганізацыю, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, аб атрыманні права на самастойнае працаўладкаванне, абавязаны пакрыць у рэспубліканскі і (або) мясцовыя бюджэты ў парадку, які вызначаецца Урадам Рэспублікі Беларусь, сродкі, затрачаныя на грашовыя выплаты, прадугледжаныя актамі заканадаўства маладым спецыялістам, маладым рабочым (служачым), калі такія грашовыя выплаты былі ажыццёўлены пасля прыёму (залічэння) ва ўстанову адукацыі, арганізацыю, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, выдачы даведкі аб самастойным працаўладкаванні.

### Артыкул 80. Атрыманне адукацыі (навучанне) у замежных арганізацыях, пакрыццё ў рэспубліканскі бюджэт сродкаў, затрачаных дзяржавай на падрыхтоўку навуковых работнікаў вышэйшай кваліфікацыі, спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй у замежных арганізацыях

1. Грамадзяне Рэспублікі Беларусь, у тым ліку якім месца працы прадастаўлена шляхам размеркавання, накіраваныя на працу (акрамя асоб, якія навучаліся на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі) і абавязаныя адпрацаваць тэрмін абавязковай працы, могуць накіроўвацца ў замежныя арганізацыі для атрымання навукова-арыентаванай, вышэйшай адукацыі за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту па спецыяльнасцях, неабходных для Рэспублікі Беларусь, падрыхтоўка па якіх у Рэспубліцы Беларусь не ажыццяўляецца, на тэрмін навучання, устаноўлены актамі заканадаўства дзяржавы прымаючага боку.

2. Асобы, указаныя ў пункце 1 гэтага артыкула, накіроўваюцца ў замежныя арганізацыі для атрымання навукова-арыентаванай, вышэйшай адукацыі на ўмовах дагавора, які заключаецца паміж дзяржаўным органам, арганізацыяй, якія накіроўваюць на падрыхтоўку, грамадзянінам і замежнай арганізацыяй. Істотнай умовай такога дагавора з'яўляецца абавязацельства грамадзяніна, які накіроўваецца, па адпрацоўцы тэрміну абавязковай працы ў Рэспубліцы Беларусь пасля атрымання адпаведнай адукацыі. Тэрмін абавязковай працы, што вызначаецца дагаворам, не можа быць меншы за тэрмін, устаноўлены гэтым Кодэксам для асоб, якія атрымалі адпаведную адукацыю.

3. Асобы, накіраваныя ў замежныя арганізацыі для атрымання навукова-арыентаванай, вышэйшай адукацыі, пры датэрміновым спыненні адукацыйных адносін (адлічэнні) з замежнай арганізацыяй абавязаны пакрыць у рэспубліканскі бюджэт сродкі,

затрачаныя на іх падрыхтоўку ў замежнай арганізацыі, акрамя выпадкаў, якія не дазваляюць прадоўжыць далейшае навучанне ў сувязі з пагаршэннем стану здароўя або ў сувязі з акалічнасцямі, не залежнымі ад волі бакоў. Пры гэтым асобы, якія мелі на дату заключэння дагавора, указанага ў пункце 2 гэтага артыкула, абавязацельства па адпрацоўцы тэрміну абавязковай працы пры атрыманні адпаведнай адукацыі за кошт сродкаў рэспубліканскага і (або) мясцовых бюджэтаў у Рэспубліцы Беларусь, павінны таксама адпрацаваць гэты тэрмін або пакрыць у рэспубліканскі і (або) мясцовыя бюджэты сродкі, затрачаныя дзяржавай на іх падрыхтоўку, у парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам.

4. Асобы, якія атрымалі навукова-арыентаваную, вышэйшую адукацыю ў замежных арганізацыях і не адпрацавалі тэрмін абавязковай працы, устаноўлены дагаворам, указаным у пункце 2 гэтага артыкула, абавязаны пакрыць у рэспубліканскі бюджэт сродкі, затрачаныя на іх падрыхтоўку ў замежнай арганізацыі, у парадку, які вызначаецца Урадам Рэспублікі Беларусь. Пры гэтым асобы, якія мелі на дату заключэння дагавора, указанага ў пункце 2 гэтага артыкула, абавязацельства па адпрацоўцы тэрміну абавязковай працы пры атрыманні адпаведнай адукацыі за кошт сродкаў рэспубліканскага і (або) мясцовых бюджэтаў у Рэспубліцы Беларусь, павінны таксама адпрацаваць гэты тэрмін або пакрыць у рэспубліканскі і (або) мясцовыя бюджэты сродкі, затрачаныя дзяржавай на іх падрыхтоўку, у парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам.

5. Парадак вызначэння спецыяльнасцей, неабходных для Рэспублікі Беларусь, падрыхтоўка па якіх у Рэспубліцы Беларусь не ажыццяўляецца, а таксама парадак накіравання грамадзян для падрыхтоўкі навуковых работнікаў вышэйшай кваліфікацыі, спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй у замежных арганізацыях за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту па спецыяльнасцях, неабходных для Рэспублікі Беларусь, падрыхтоўка па якіх у Рэспубліцы Беларусь не ажыццяўляецца, пакрыцця сродкаў, затрачаных на падрыхтоўку навуковых работнікаў вышэйшай кваліфікацыі, спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй у замежных арганізацыях, вызначаюцца Урадам Рэспублікі Беларусь.

6. Асобы, якія атрымліваюць навукова-арыентаваную, вышэйшую адукацыю ў Рэспубліцы Беларусь у дзённай форме атрымання адукацыі за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту, могуць накіроўвацца ў замежныя арганізацыі для навучання з мэтай павышэння ўзроўню іх тэарэтычнай і практычнай падрыхтоўкі, авалодання найноўшымі тэхналогіямі і метадамі правядзення навуковых даследаванняў па спецыяльнасцях, якія не атрымалі дастатковага развіцця ў Рэспубліцы Беларусь, тэрмінам да аднаго года. Парадак накіравання ў замежныя арганізацыі для навучання ўстанаўліваецца Урадам Рэспублікі Беларусь.

7. Асаблівасці накіравання грамадзян у замежныя арганізацыі для атрымання навукова-арыентаванай, вышэйшай адукацыі па спецыяльнасцях для воінскіх фарміраванняў і ваенізаваных арганізацый вызначаюцца міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь, заканадаўствам аб праходжанні адпаведнай службы.

8. Грамадзянам Рэспублікі Беларусь, якія атрымалі ў дзённай форме атрымання адукацыі навукова-арыентаваную, вышэйшую, сярэднюю спецыяльную або прафесійна-тэхнічную адукацыю ў замежных арганізацыях, па іх жаданні можа быць прадастаўлена месца працы дзяржаўнымі органамі, якія вызначаюцца Урадам Рэспублікі Беларусь, і ў парадку, які ім устанаўліваецца, з выдачай пасведчання аб накіраванні на працу. Грамадзянін, якому выдадзена пасведчанне аб накіраванні на працу, на працягу двух гадоў з даты прыёму яго на працу з’яўляецца маладым спецыялістам або маладым рабочым (служачым). Такому грамадзяніну прадастаўляюцца гарантыі і кампенсацыі, прадугледжаныя маладым спецыялістам і маладым рабочым (служачым) гэтым Кодэксам і іншымі актамі заканадаўства.

## ГЛАВА 9
## АГУЛЬНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА АДУКАЦЫЙНАГА ПРАЦЭСУ

### Артыкул 81. Адукацыйны працэс

1. Адукацыйны працэс арганізуецца на аснове:

1.1. прынцыпаў дзяржаўнай палітыкі ў сферы адукацыі;

1.2. адукацыйных стандартаў;

1.3. дасягненняў у галіне навукі і тэхнікі, інавацыйных праектаў, якія рэалізуюцца ў галінах эканомікі і сацыяльнай сферы;

1.4. педагагічна абгрунтаванага выбару формаў, метадаў і сродкаў навучання і выхавання;

1.5. культурных і духоўных традыцый і каштоўнасцей беларускага народа, дасягненняў сусветнай культуры;

1.6. сучасных адукацыйных і інфармацыйных тэхналогій.

2. Забараняецца прыцягненне навучэнцаў устаноў адукацыі, арганізацый, што рэалізуюць адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, іншых арганізацый, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, навучэнцаў індывідуальных прадпрымальнікаў, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, да выканання работ, аказання паслуг, не прадугледжаных вучэбна-праграмнай дакументацыяй.

Прыцягненне курсантаў, слухачоў, ад'юнктаў і дактарантаў для вырашэння задач, не прадугледжаных вучэбна-праграмнай дакументацыяй пры падрыхтоўцы кадраў па спецыяльнасцях для воінскіх фарміраванняў і ваенізаваных арганізацый, ажыццяўляецца ў адпаведнасці з заканадаўствам аб праходжанні адпаведнай службы.

3. Арганізацыя адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адпаведных адукацыйных праграм ажыццяўляецца ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам, палажэннем аб адпаведным тыпе ўстановы адукацыі або яе відзе, вучэбна-праграмнай дакументацыяй адпаведных адукацыйных праграм і ўключае ў сябе тэарэтычную і практычную падрыхтоўку, выхаваўчую працу, самастойную працу навучэнцаў, атэстацыю навучэнцаў у выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам.

Да формаў арганізацыі адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адпаведных адукацыйных праграм адносяцца гульня, вучэбныя заняткі, заняткі, практыка, іншыя формы. Формы арганізацыі адукацыйнага працэсу, а таксама віды вучэбных заняткаў, заняткаў, практыкі, якая праводзіцца з мэтай набыцця навучэнцамі практычнага вопыту і навыкаў, іх падрыхтоўкі да самастойнай прафесійнай дзейнасці, вызначаюцца гэтым Кодэксам і (або) ва ўстаноўленым ім парадку.

Дадаткова да вучэбных заняткаў пры рэалізацыі адукацыйных праграм агульнай сярэдняй, адукацыйных праграм прафесійна-тэхнічнай, адукацыйных праграм сярэдняй спецыяльнай, адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі і адукацыйных праграм спецыяльнай адукацыі ў адпаведнасці з вучэбна-праграмнай дакументацыяй адпаведнай адукацыйнай праграмы праводзяцца факультатыўныя і іншыя заняткі, кансультацыі, пры рэалізацыі адукацыйных праграм навукова-арыентаванай адукацыі – кансультацыі.

Факультатыўныя заняткі – заняткі, накіраваныя на актывізацыю пазнавальнай дзейнасці, інтэлектуальнае, духоўнае і фізічнае развіццё, павышэнне цікавасці навучэнцаў да вучэбных прадметаў, што вывучаюцца, вучэбных дысцыплін, модуляў, паглыбленне іх зместу, падрыхтоўку да пачатку працоўнай дзейнасці і працягу адукацыі, пры рэалізацыі адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі – і на падрыхтоўку да профільнага навучання, выбару профілю адукацыі, напрамку адукацыі пры атрыманні асноўнай адукацыі больш высокага ўзроўню, звязанага з пэўным відам прафесійнай дзейнасці, пры рэалізацыі адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі і адукацыйных праграм сярэдняй спецыяльнай адукацыі – і на навучанне па праграмах падрыхтоўкі малодшых камандзіраў і праграмах падрыхтоўкі афіцэраў запасу.

Кансультацыі – заняткі, накіраваныя на аказанне дапамогі ў засваенні зместу адукацыйнай праграмы, у тым ліку ў вывучэнні вучэбных прадметаў, вучэбных дысцыплін, модуляў, агульнаадукацыйных дысцыплін, спецыяльных дысцыплін, асобных тэм, у праходжанні практыкі, падрыхтоўцы да атэстацыі, у тым ліку да атэстацыі ў парадку экстэрнату.

4. Для вызначэння структуры адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі, адукацыйных праграм перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць вышэйшую адукацыю, адукацыйных праграм перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць сярэднюю спецыяльную адукацыю, і працаёмістасці іх засваення прымяняецца сістэма залiковых адзінак (крэдытаў) і можа прымяняцца сістэма акадэмічных гадзін.

Заліковая адзінка (крэдыт) – лікавы спосаб выяўлення аб'ёму вучэбнай дзейнасці студэнта, слухача, курсанта ў працэсе аўдыторнай працы, самастойнай працы, практыкі, стажыроўкі.

Парадак прымянення сістэмы заліковых адзінак (крэдытаў), акадэмічных гадзін і вызначэння колькасці заліковых адзінак (крэдытаў) у структуры адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі, адукацыйных праграм перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць вышэйшую адукацыю, адукацыйных праграм перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць сярэднюю спецыяльную адукацыю, устанаўліваецца Міністэрствам адукацыі.

5. Для навучэнцаў пры засваенні зместу адукацыйных праграм прафесійна-тэхнічнай, адукацыйных праграм сярэдняй спецыяльнай і адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі могуць праводзіцца паўторныя вучэбныя заняткі па-за вучэбнай групай у парадку і на ўмовах, якія вызначаюцца правіламі правядзення атэстацыі навучэнцаў пры засваенні зместу адпаведных адукацыйных праграм.

З навучэнцаў, якія не наведалі лабараторныя і практычныя вучэбныя заняткі без уважлівых прычын у адпаведнасці з іх раскладам, пры засваенні імі зместу адукацыйных праграм сярэдняй спецыяльнай адукацыі і адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі за правядзенне паўторных вучэбных заняткаў па-за вучэбнай групай можа спаганяцца плата.

Парадак вызначэння платы за правядзенне паўторных лабараторных і практычных вучэбных заняткаў устанаўліваецца Міністэрствам адукацыі.

6. Для арганізацыі адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адпаведных адукацыйных праграм установамі адукацыі, арганізацыямі, што рэалізуюць адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, іншымі арганізацыямі, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, у адпаведнасці з гэтым Кодэксам могуць стварацца структурныя падраздзяленні.

**Артыкул 82. Мова навучання і выхавання. Вывучэнне моў ва ўстановах адукацыі**

1. Асноўнымі мовамі навучання і выхавання ў Рэспубліцы Беларусь з'яўляюцца дзяржаўныя мовы Рэспублікі Беларусь. Дзяржава гарантуе грамадзянам права на выбар навучання і выхавання на адной з дзяржаўных моў Рэспублікі Беларусь і стварае ўмовы для рэалізацыі гэтага права. Мова навучання і выхавання вызначаецца заснавальнікам установы адукацыі, арганізацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, іншай арганізацыі, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, індывідуальным прадпрымальнікам, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, з улікам пажаданняў навучэнцаў, законных прадстаўнікоў непаўналетніх навучэнцаў пры наяўнасці такой магчымасці.

2. Права грамадзян на выбар навучання і выхавання на адной з дзяржаўных моў Рэспублікі Беларусь забяспечваецца развіццём сеткі ўстаноў адукацыі, класаў, груп, патокаў з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання, выданнем літаратуры, падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў на беларускай і рускай мовах.

3. Пры атрыманні агульнай сярэдняй, спецыяльнай, прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі з адначасовым атрыманнем агульнай сярэдняй адукацыі вывучэнне беларускай, рускай і адной з замежных моў навучэнцамі, акрамя асобных катэгорый асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, з'яўляецца абавязковым. Катэгорыі асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця і парадак вывучэння імі моў вызначаюцца Міністэрствам адукацыі. Ад вывучэння беларускай або рускай мовы могуць быць вызвалены замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства, якія часова знаходзяцца або часова пражываюць у Рэспубліцы Беларусь. Парадак вывучэння беларускай і рускай моў замежнымі грамадзянамі і асобамі без грамадзянства, якія часова знаходзяцца або часова пражываюць у Рэспубліцы Беларусь, вызначаецца Міністэрствам адукацыі.

4. Абавязковая для вывучэння замежная мова вызначаецца заснавальнікам установы адукацыі з улікам патрэб дзяржавы і магчымасцей установы адукацыі.

5. Пры атрыманні прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай, агульнай вышэйшай і спецыяльнай вышэйшай адукацыі вывучэнне беларускай мовы навучэнцамі, акрамя асобных катэгорый асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, якія вызначаюцца Міністэрствам адукацыі, з'яўляецца абавязковым. Ад вывучэння беларускай мовы могуць быць вызвалены замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства, якія часова знаходзяцца або часова пражываюць у Рэспубліцы Беларусь.

6. У адпаведнасці з пажаданнямі выхаванцаў, навучэнцаў і іх законных прадстаўнікоў паводле рашэння мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, узгодненага з Міністэрствам адукацыі, могуць ствараюцца групы ва ўстановах дашкольнай і агульнай сярэдняй адукацыі, у якіх выхаванцы вывучаюць мову нацыянальнай меншасці, класы ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі, у якіх навучэнцы вывучаюць мову і літаратуру нацыянальнай меншасці.

7. Ва ўстановах адукацыі, арганізацыях, што рэалізуюць адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, навучанне і выхаванне пры наяўнасці ўмоў і па ўзгадненні з Міністэрствам адукацыі могуць ажыццяўляцца на замежнай мове.

### Артыкул 83. Асноўныя патрабаванні да арганізацыі адукацыйнага працэсу

Асноўныя патрабаванні да арганізацыі адукацыйнага працэсу:

забеспячэнне якасці адукацыі;

кампетэнтнасны падыход;

ахова жыцця і здароўя навучэнцаў;

захаванне ўстаноўленай працягласці навучальнага года, канікул, канікулярных водпускаў, тэрмінаў і формаў атэстацыі навучэнцаў;

выкананне санітарна-эпідэміялагічных патрабаванняў;

стварэнне бяспечных умоў пры арганізацыі адукацыйнага працэсу, у тым ліку пры правядзенні мерапрыемстваў плана выхаваўчай працы ўстановы адукацыі, іншай арганізацыі, індывідуальнага прадпрымальніка, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць. З мэтай стварэння бяспечных умоў пры арганізацыі адукацыйнага працэсу, у тым ліку пры правядзенні мерапрыемстваў плана выхаваўчай працы ўстановы адукацыі, іншай арганізацыі, індывідуальнага прадпрымальніка, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, устанаўліваюцца патрабаванні да мер бяспекі пры правядзенні вучэбных заняткаў, заняткаў па вучэбных прадметах, вучэбных дысцыплінах, адукацыйных галінах, тэмах, арганізацыі практыкі, вытворчага навучання, мерапрыемстваў па рэалізацыі ўстановамі адукацыі, іншымі арганізацыямі, індывідуальнымі прадпрымальнікамі, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, планаў выхаваўчай працы. Правілы бяспекі арганізацыі адукацыйнага працэсу, арганізацыі выхаваўчага працэсу, Правілы расследавання і ўліку няшчасных выпадкаў, якія адбыліся з навучэнцамі пры засваенні зместу адукацыйных праграм (акрамя няшчасных выпадкаў, якія адбыліся пры прыцягненні да выканання работ у арганізацыях у перыяд праходжання практыкі, вытворчага навучання, стажыроўкі, а таксама ў час правядзення заняткаў фізічнай культурай

і спортам), з выхаванцамі пры рэалізацыі праграм выхавання, зацвярджаюцца Міністэрствам адукацыі. Арганізацыя бяспекі правядзення заняткаў фізічнай культурай і спортам з навучэнцамі ажыццяўляецца ў адпаведнасці з Правіламі бяспекі правядзення заняткаў фізічнай культурай і спортам, якія зацвярджаюцца Міністэрствам спорту і турызму;

стварэнне ўмоў для развіцця творчых здольнасцей навучэнцаў, уцягненне іх у розныя віды сацыяльна значнай дзейнасці;

забеспячэнне сацыяльна-педагагічнай падтрымкі навучэнцаў і аказання ім псіхалагічнай дапамогі;

педагагічная падтрымка дзіцячых і маладзёжных грамадскіх аб’яднанняў;

стварэнне спецыяльных умоў для атрымання адукацыі асобамі з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця.

**Артыкул 84. Адукацыйныя стандарты**

1. У Рэспубліцы Беларусь устанаўліваюцца адукацыйныя стандарты дашкольнай, агульнай сярэдняй, прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай, вышэйшай, спецыяльнай адукацыі і перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў.

2. Адукацыйныя стандарты асноўнай адукацыі, указаныя ў пункце 1 гэтага артыкула, забяспечваюць пераемнасць яе ўзроўняў, а таксама ступеней у рамках узроўню агульнай сярэдняй адукацыі.

3. Адукацыйныя стандарты абавязковыя для прымянення ва ўсіх установах адукацыі, у іншых арганізацыях, у індывідуальных прадпрымальнікаў, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, пры рэалізацыі адпаведных адукацыйных праграм.

4. Дзяржаўныя органы, якія арганізуюць распрацоўку і зацвярджаюць адукацыйныя стандарты, вызначаюцца гэтым Кодэксам.

Асаблівасці распрацоўкі, узгаднення і зацвярджэння адукацыйных стандартаў вызначаюцца Міністэрствам адукацыі.

**Артыкул 85. Атэстацыя навучэнцаў**

1. Атрыманне адукацыі ў выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам, суправаджаецца бягучай, прамежкавай і выніковай атэстацыяй.

Бягучая атэстацыя – вызначэнне адпаведнасці вынікаў вучэбнай дзейнасці навучэнцаў патрабаванням адукацыйных стандартаў, вучэбна-праграмнай дакументацыі адпаведных адукацыйных праграм, зместу індывідуальнага плана працы магістранта, слухача з мэтай сістэматычнага або перыядычнага кантролю і ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці навучэнцаў у працэсе засваення імі зместу адпаведнай адукацыйнай праграмы на працягу чвэрці, семестра, паўгоддзя.

Прамежкавая атэстацыя – вызначэнне адпаведнасці вынікаў вучэбнай дзейнасці навучэнцаў патрабаванням адукацыйных стандартаў, вучэбна-праграмнай дакументацыі адпаведных адукацыйных праграм, зместу індывідуальнага плана працы магістранта, слухача, індывідуальнага плана працы аспіранта, ад’юнкта, дактаранта, саіскальніка, праграм-мінімумаў кандыдацкіх экзаменаў па агульнаадукацыйных дысцыплінах, праграм-мінімумаў кандыдацкіх экзаменаў па спецыяльных дысцыплінах, праграм-мінімумаў кандыдацкіх дыферэнцыраваных залікаў па агульнаадукацыйных дысцыплінах з мэтай ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці навучэнцаў за чвэрць, семестр, паўгоддзе.

Прамежкавая атэстацыя праводзіцца з улікам вынікаў бягучай атэстацыі ў выпадку яе правядзення, калі ўлік вынікаў бягучай атэстацыі прадугледжаны гэтым Кодэксам.

Выніковая атэстацыя – вызначэнне адпаведнасці вынікаў вучэбнай дзейнасці навучэнцаў патрабаванням адукацыйных стандартаў, вучэбна-праграмнай дакументацыі адпаведных адукацыйных праграм, зместу індывідуальнага плана працы магістранта, слухача, індывідуальнага плана працы аспіранта, ад’юнкта, дактаранта, саіскальніка пры

завяршэнні засваення зместу адукацыйных праграм, калі іншае не ўстаноўлена гэтым Кодэксам.

2. Віды і (або) формы атэстацыі пры засваенні зместу адпаведнай адукацыйнай праграмы вызначаюцца гэтым Кодэксам.

3. Атэстацыя навучэнцаў пры засваенні зместу адпаведных адукацыйных праграм, акрамя адукацыйных праграм навукова-арыентаванай адукацыі, праводзіцца ў адпаведнасці з правіламі правядзення атэстацыі навучэнцаў пры засваенні зместу адпаведных адукацыйных праграм, якія зацвярджаюцца Міністэрствам адукацыі па ўзгадненні з зацікаўленымі дзяржаўнымі органамі, калі іншае не ўстаноўлена гэтым Кодэксам. Вынікі вучэбнай дзейнасці навучэнцаў пры іх атэстацыі могуць ацэньвацца адзнакамі па шкале, якая выкарыстоўваецца пры ацэньванні, адзнакамі «залічана», «не залічана», «не атэставаны(а)», запісамі «засвоіў(ла)», «не засвоіў(ла)», «вызвалены(а)», «не вывучаў(ла)», іншымі запісамі, ажыццяўляцца на змястоўна-ацэначнай аснове, якая прадугледжвае вусную ацэнку вынікаў вучэбнай дзейнасці. Адзнакі і запісы могуць быць станоўчымі і нездавальняючымі. Шкала адзнак, якая выкарыстоўваецца пры ацэньванні вынікаў вучэбнай дзейнасці навучэнцаў, іншыя адзнакі і запісы, якія выкарыстоўваюцца пры ацэнцы вынікаў вучэбнай дзейнасці навучэнцаў, устанаўліваюцца правіламі правядзення атэстацыі навучэнцаў пры засваенні зместу адпаведных адукацыйных праграм. Атэстацыя навучэнцаў пры засваенні зместу адукацыйных праграм навукова-арыентаванай адукацыі праводзіцца ў парадку, які ўстанаўліваецца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

Правіламі правядзення атэстацыі навучэнцаў пры засваенні зместу адпаведных адукацыйных праграм дадатковай адукацыі могуць быць вызначаны іншыя перыяды, акрамя ўказаных у частках другой і трэцяй пункта 1 гэтага артыкула, за якія праводзіцца бягучая і прамежкавая атэстацыя навучэнцаў.

4. Навучэнцы, якія не з’явіліся для праходжання бягучай атэстацыі ва ўстаноўлены ўстановай адукацыі тэрмін без уважлівай прычыны, атрымалі нездавальняючую адзнаку пры праходжанні бягучай атэстацыі і (або) маюць акадэмічную запазычанасць, павінны прайсці бягучую або паўторную бягучую атэстацыю і (або) ліквідаваць акадэмічную запазычанасць у парадку, што вызначаецца правіламі правядзення атэстацыі навучэнцаў пры засваенні зместу адпаведных адукацыйных праграм.

За ліквідацыю акадэмічнай запазычанасці навучэнцамі пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы сярэдняй спецыяльнай і адукацыйнай праграмы вышэйшай адукацыі, рэалізацыя якіх установай адукацыі ажыццяўляецца за кошт сродкаў рэспубліканскага і (або) мясцовых бюджэтаў і на платнай аснове, можа спаганяцца плата.

Парадак вызначэння платы за ліквідацыю акадэмічнай запазычанасці ўстанаўліваецца Міністэрствам адукацыі.

### Артыкул 86. Навукова-метадычнае забеспячэнне адукацыі

1. Навукова-метадычнае забеспячэнне адукацыі ажыццяўляецца з мэтай забеспячэння атрымання адукацыі, павышэння якасці адукацыі і грунтуецца на выніках фундаментальных і прыкладных навуковых даследаванняў у сферы адукацыі.

2. Фундаментальныя і прыкладныя навуковыя даследаванні ў сферы адукацыі праводзяцца навуковымі арганізацыямі, арганізацыямі, што ажыццяўляюць навукова-метадычнае забеспячэнне адукацыі, і ўстановамі адукацыі ў межах іх паўнамоцтваў.

3. Навукова-метадычнае забеспячэнне адукацыі ўключае ў сябе, калі іншае не ўстаноўлена гэтым Кодэксам:

3.1. вучэбна-праграмную дакументацыю адукацыйных праграм;

3.2. праграмна-планавальную дакументацыю выхавання;

3.3. вучэбна-метадычную дакументацыю;

3.4. вучэбныя, навуковыя і іншыя выданні;

3.5. кантрольна-вымяральныя матэрыялы;

3.6. інфармацыйна-аналітычныя матэрыялы;

3.7. метадычныя ўказанні па распрацоўцы вучэбна-праграмнай дакументацыі адукацыйных праграм.

4. Вучэбна-праграмная дакументацыя адукацыйных праграм і праграмна-планавальная дакументацыя выхавання, прадугледжаныя гэтым Кодэксам, з’яўляюцца абавязковымі для прымянення ўстановамі адукацыі, арганізацыямі, што рэалізуюць адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, іншымі арганізацыямі, індывідуальнымі прадпрымальнікамі, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, пры рэалізацыі адпаведных адукацыйных праграм, праграм выхавання, калі іншае не ўстаноўлена гэтым Кодэксам.

Змест і парадак падрыхтоўкі праграмна-планавальнай дакументацыі выхавання пры падрыхтоўцы кадраў па спецыяльнасцях для воінскіх фарміраванняў і ваенізаваных арганізацый устанаўліваюцца актамі заканадаўства.

5. Структурныя элементы навукова-метадычнага забеспячэння адукацыі па ўзроўнях асноўнай адукацыі, спецыяльнай адукацыі могуць аб’ядноўвацца ў вучэбна-метадычныя комплексы, палажэнні аб якіх зацвярджаюцца Міністэрствам адукацыі.

6. Да вучэбна-праграмнай дакументацыі адукацыйных праграм дашкольнай, агульнай сярэдняй, прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай, вышэйшай, навукова-арыентаванай адукацыі, калі іншае не ўстаноўлена гэтым Кодэксам, адносяцца вучэбныя планы і вучэбныя праграмы. Парадак іх распрацоўкі, узгаднення і зацвярджэння, іх змест і віды ўстанаўліваюцца гэтым Кодэксам.

Вучэбны план – вучэбна-праграмны дакумент, які ў залежнасці ад віду адукацыйнай праграмы ўстанаўлівае пералік, аб’ём, паслядоўнасць вывучэння вучэбных прадметаў, вучэбных дысцыплін, агульнаадукацыйных дысцыплін, спецыяльных дысцыплін, прадметных галін, адукацыйных галін, тэм, графік адукацыйнага працэсу, формы, віды і тэрміны правядзення вучэбных заняткаў, атэстацыі навучэнцаў, а таксама праходжання практыкі. Вучэбны план можа ўключаць у сябе дзяржаўны кампанент, кампанент установы адукацыі, арганізацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, іншай арганізацыі, індывідуальнага прадпрымальніка, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, агульнаадукацыйны кампанент, прафесійны кампанент. Кампанент установы адукацыі, арганізацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, іншай арганізацыі, індывідуальнага прадпрымальніка, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, з’яўляецца варыятыўным.

Вучэбная праграма – вучэбна-праграмны дакумент, які ў залежнасці ад віду адукацыйнай праграмы вызначае мэты і задачы вывучэння вучэбнага прадмета, вучэбнай дысцыпліны, агульнаадукацыйнай дысцыпліны, спецыяльнай дысцыпліны, адукацыйнай галіны, тэмы, практыкі, іх змест, час на вывучэнне асобных тэм, асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці навучэнцаў, рэкамендаваныя формы і метады навучання і выхавання.

7. Склад, парадак распрацоўкі, узгаднення і зацвярджэння вучэбна-праграмнай дакументацыі адукацыйных праграм навукова-арыентаванай адукацыі, адукацыйных праграм спецыяльнай адукацыі, адукацыйных праграм дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, адукацыйных праграм дадатковай адукацыі дарослых і змест вучэбна-праграмнай дакументацыі ўстанаўліваюцца гэтым Кодэксам.

Склад вучэбна-праграмнай дакументацыі адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі і яе змест устанаўліваюцца гэтым Кодэксам.

8. Да праграмна-планавальнай дакументацыі выхавання адносіцца дакументацыя, вызначаная артыкулам 87 гэтага Кодэкса.

9. Да вучэбна-метадычнай дакументацыі адносяцца методыкі выкладання вучэбных прадметаў, вучэбных дысцыплін, прадметных галін, адукацыйных галін, тэм, правядзення карэкцыйных заняткаў, метадычныя ўказанні, метадычныя рэкамендацыі, інструктыўна-метадычныя пісьмы, іншая дакументацыя, прадугледжаная палажэннем аб адпаведным тыпе або відзе ўстановы адукацыі.

10. Вучэбнае выданне – выданне, якое ўтрымлівае з улікам узроставых асаблівасцей навучэнцаў сістэматызаваныя звесткі навуковага або прыкладнога характару, неабходныя для рэалізацыі адукацыйных праграм, выкладзеныя ў форме, зручнай для арганізацыі адукацыйнага працэсу. Вучэбныя выданні могуць быць друкаванымі і (або) электроннымі.

Да выкарыстання ў адукацыйным працэсе дапускаюцца:

падручнікі, вучэбныя дапаможнікі і іншыя вучэбныя выданні, афіцыйна зацверджаныя або дапушчаныя ў якасці адпаведнага віду вучэбнага выдання Міністэрствам адукацыі (акрамя вучэбных выданняў, якія ўтрымліваюць дзяржаўныя сакрэты);

падручнікі, вучэбныя дапаможнікі і іншыя вучэбныя выданні па агульнапрафесійных і спецыяльных вучэбных дысцыплінах, афіцыйна зацверджаныя або дапушчаныя ў якасці адпаведнага віду вучэбнага выдання іншымі дзяржаўнымі органамі пры падрыхтоўцы кадраў па спецыяльнасцях для воінскіх фарміраванняў і ваенізаваных арганізацый, мытных органаў;

вучэбныя выданні (акрамя падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў), рэкамендаваныя ўстановамі адукацыі, арганізацыямі, што рэалізуюць адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, арганізацыямі, што ажыццяўляюць навукова-метадычнае забеспячэнне адукацыі, вучэбна-метадычнымі аб’яднаннямі ў сферы адукацыі;

вучэбныя выданні і іншыя выданні, якія вызначаюцца ўстановамі вышэйшай адукацыі пры рэалізацыі адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі, установамі дадатковай адукацыі дарослых у вучэбна-праграмнай дакументацыі адпаведнай адукацыйнай праграмы ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам;

іншыя выданні, акрамя выданняў для ўстаноў вышэйшай адукацыі і ўстаноў дадатковай адукацыі дарослых, якія вызначаюцца Міністэрствам адукацыі.

Патрабаванні да парадку падрыхтоўкі і выпуску вучэбных выданняў, якія афіцыйна зацвярджаюцца або дапускаюцца ў якасці адпаведнага віду вучэбнага выдання Міністэрствам адукацыі, рэкамендуюцца ўстановамі адукацыі, арганізацыямі, што рэалізуюць адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, арганізацыямі, што ажыццяўляюць навукова-метадычнае забеспячэнне адукацыі, вучэбна-метадычнымі аб’яднаннямі ў сферы адукацыі, і іх выкарыстання вызначаюцца Палажэннем аб парадку падрыхтоўкі і выпуску вучэбных выданняў і іх выкарыстання, што зацвярджаецца Міністэрствам адукацыі.

Патрабаванні да парадку падрыхтоўкі і выпуску вучэбных выданняў па агульнапрафесійных і спецыяльных вучэбных дысцыплінах, якія афіцыйна зацвярджаюцца або дапускаюцца ў якасці адпаведнага віду вучэбнага выдання дзяржаўнымі органамі пры падрыхтоўцы кадраў па спецыяльнасцях для воінскіх фарміраванняў і ваенізаваных арганізацый, мытных органаў, рэкамендуюцца вучэбна-метадычнымі аб’яднаннямі ў сферы адукацыі, і іх выкарыстання вызначаюцца палажэннямі аб парадку падрыхтоўкі і выпуску вучэбных выданняў і іх выкарыстання, якія зацвярджаюцца адпаведнымі дзяржаўнымі органамі.

Патрабаванні да вызначэння ўстановамі вышэйшай адукацыі, установамі дадатковай адукацыі дарослых у вучэбна-праграмнай дакументацыі адпаведнай адукацыйнай праграмы вучэбных і іншых выданняў, якія дапускаюцца да выкарыстання ў адукацыйным працэсе, вызначаюцца метадычнымі ўказаннямі па распрацоўцы вучэбна-праграмнай дакументацыі адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі і метадычнымі ўказаннямі па распрацоўцы вучэбна-праграмнай дакументацыі адукацыйных праграм дадатковай адукацыі дарослых.

11. Кантрольна-вымяральныя матэрыялы – заданне або сукупнасць заданняў рознага віду, прызначаныя для ажыццяўлення кантролю вынікаў вучэбнай дзейнасці навучэнцаў пры правядзенні іх атэстацыі або для ацэнкі (ацэньвання) кампетэнцый абітурыентаў з мэтай адбору асоб, найбольш падрыхтаваных для засваення зместу адукацыйных праграм.

12. Інфармацыйна-аналітычныя матэрыялы – матэрыялы, якія ўтрымліваюць звесткі, параўнальную інфармацыю, аналітычную інфармацыю аб функцыянаванні, перспектывах

развіцця сістэмы адукацыі. Да інфармацыйна-аналітычных матэрыялаў адносяцца звесткі дзяржаўных інфармацыйных рэсурсаў, баз даных, банкаў даных у выпадках, прадугледжаных актамі заканадаўства, а таксама афіцыйная статыстычная інфармацыя, даведнікі, даведкі, інфармацыйныя пісьмы, справаздачы, даклады і іншыя матэрыялы.

13. Метадычныя ўказанні па распрацоўцы вучэбна-праграмнай дакументацыі адукацыйных праграм устанаўліваюць патрабаванні да распрацоўкі вучэбна-праграмнай дакументацыі, у тым ліку патрабаванні да яе структуры, афармлення і зместу.

Метадычныя ўказанні па распрацоўцы вучэбна-праграмнай дакументацыі адукацыйных праграм распрацоўваюцца па кожным узроўні асноўнай адукацыі, дадатковай адукацыі, спецыяльнай адукацыі арганізацыямі, што ажыццяўляюць навукова-метадычнае забеспячэнне адукацыі, установамі адукацыі ў адпаведнасці з іх паўнамоцтвамі.

14. Навукова-метадычнае забеспячэнне адукацыі ажыццяўляецца:

14.1. арганізацыямі, што ажыццяўляюць навукова-метадычнае забеспячэнне адукацыі;

14.2. навуковымі арганізацыямі;

14.3. установамі адукацыі;

14.4. арганізацыямі, што рэалізуюць адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі;

14.5. іншымі арганізацыямі, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць;

14.6. індывідуальнымі прадпрымальнікамі, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць;

14.7. арганізацыямі – заказчыкамі кадраў;

14.8. арганізацыямі, якія накіроўваюць работнікаў для засваення зместу адукацыйных праграм дадатковай адукацыі дарослых;

14.9. вучэбна-метадычнымі аб’яднаннямі ў сферы адукацыі;

14.10. дзяржаўнымі органамі, падпарадкаванымі і (або) падсправаздачнымі Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі, рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання, іншымі арганізацыямі, падпарадкаванымі Ураду Рэспублікі Беларусь, мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі, іншымі арганізацыямі і фізічнымі асобамі ў межах іх паўнамоцтваў у сферы адукацыі.

15. Фінансаванне выдаткаў, звязаных з падрыхтоўкай і выпускам вучэбных выданняў, вучэбна-праграмнай дакументацыі адукацыйных праграм, вучэбна-метадычнай дакументацыі, камплектаваннем і дастаўкай асобных вучэбных выданняў, ажыццяўляецца за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту ў парадку, які ўстанаўліваецца Урадам Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 87. Праграмна-планавальная дакументацыя выхавання**

1. Канцэпцыя бесперапыннага выхавання дзяцей і вучнёўскай моладзі вызначае змест выхавання і метадалагічныя падыходы да выхавання навучэнцаў. Канцэпцыя бесперапыннага выхавання дзяцей і вучнёўскай моладзі распрацоўваецца і зацвярджаецца Міністэрствам адукацыі.

2. Праграма бесперапыннага выхавання дзяцей і вучнёўскай моладзі вызначае асноўныя напрамкі выхавання навучэнцаў і мерапрыемствы па іх рэалізацыі. Праграма бесперапыннага выхавання дзяцей і вучнёўскай моладзі распрацоўваецца тэрмінам на пяць гадоў і зацвярджаецца Міністэрствам адукацыі.

3. Комплексная праграма выхавання дзяцей і вучнёўскай моладзі распрацоўваецца на аснове Канцэпцыі бесперапыннага выхавання дзяцей і вучнёўскай моладзі і Праграмы бесперапыннага выхавання дзяцей і вучнёўскай моладзі на абласным (горада Мінска), раённым (гарадскім) узроўнях тэрмінам на пяць гадоў і зацвярджаецца адпаведным мясцовым выканаўчым і распарадчым органам.

4. Праграмы выхавання ўстаноў адукацыі, іншых арганізацый, індывідуальных прадпрымальнікаў, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, распрацоўваюцца ва

ўстановах адукацыі, іншых арганізацыях, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, індывідуальнымі прадпрымальнікамі, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, тэрмінам на пяць гадоў на аснове адпаведнай комплекснай праграмы выхавання дзяцей і вучнёўскай моладзі – для ўстаноў адукацыі, якія знаходзяцца ў падпарадкаванні мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, на аснове Канцэпцыі бесперапыннага выхавання дзяцей і вучнёўскай моладзі і Праграмы бесперапыннага выхавання дзяцей і вучнёўскай моладзі – для іншых устаноў адукацыі, іншых арганізацый, індывідуальных прадпрымальнікаў, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць. Праграмы выхавання ўстаноў адукацыі, іншых арганізацый, індывідуальных прадпрымальнікаў, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, вызначаюць мэты, задачы, асноўныя напрамкі, формы і метады выхавання навучэнцаў з улікам асаблівасцей, патрэб і інтарэсаў навучэнцаў ва ўстанове адукацыі, іншай арганізацыі, у індывідуальнага прадпрымальніка, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, і зацвярджаюцца кіраўніком установы адукацыі, іншай арганізацыі, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, індывідуальным прадпрымальнікам, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць.

5. План выхаваўчай працы ўстановы адукацыі, іншай арганізацыі, індывідуальнага прадпрымальніка, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, распрацоўваецца на бягучы вучэбны год ва ўстанове адукацыі, іншай арганізацыі, у індывідуальнага прадпрымальніка, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, на аснове праграмы выхаваўчай працы ўстановы адукацыі, іншай арганізацыі, індывідуальнага прадпрымальніка, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, устанаўлівае мерапрыемствы па рэалізацыі асноўных напрамкаў выхавання навучэнцаў, тэрміны, месца іх правядзення, удзельнікаў, асоб, адказных за іх правядзенне, і зацвярджаецца кіраўніком установы адукацыі, іншай арганізацыі, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, індывідуальным прадпрымальнікам, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць.

**Артыкул 88. Сацыяльна-педагагічная падтрымка навучэнцаў і аказанне ім псіхалагічнай дапамогі**

1. Ва ўстанове адукацыі, іншай арганізацыі, у індывідуальнага прадпрымальніка, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі, адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі, адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю ажыццяўляюцца сацыяльна-педагагічная падтрымка навучэнцаў і аказанне ім псіхалагічнай дапамогі.

2. Сацыяльна-педагагічная падтрымка навучэнцаў і аказанне ім псіхалагічнай дапамогі ажыццяўляюцца педагогам-псіхолагам і (або) педагогам сацыяльным у парадку, які вызначаецца Міністэрствам адукацыі.

**Артыкул 89. Эксперыментальная і інавацыйная дзейнасць у сферы адукацыі**

1. Эксперыментальная і інавацыйная дзейнасць у сферы адукацыі накіравана на абнаўленне зместу адукацыйных праграм і павышэнне якасці адукацыі пры дапамозе рэалізацыі эксперыментальных і інавацыйных праектаў.

2. Эксперыментальная дзейнасць у сферы адукацыі ўяўляе сабой працэс праверкі вынікаў фундаментальных і прыкладных навуковых даследаванняў з мэтай вызначэння эфектыўнасці і мэтазгоднасці іх масавага выкарыстання.

3. Інавацыйная дзейнасць у сферы адукацыі ўяўляе сабой працэс укаранення ў практыку апрабаваных у ходзе эксперыментальнай дзейнасці вынікаў фундаментальных і прыкладных навуковых даследаванняў.

4. Пералік устаноў адукацыі, на базе якіх ажыццяўляецца эксперыментальная і інавацыйная дзейнасць у сферы адукацыі, парадак арганізацыі і правядзення

эксперыментальнай і інавацыйнай дзейнасці ў сферы адукацыі вызначаюцца Міністэрствам адукацыі, калі іншае не ўстаноўлена Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

5. Эксперыментальная і інавацыйная дзейнасць у сферы адукацыі ажыццяўляецца ў адпаведнасці з актамі заканадаўства.

## ГЛАВА 10
## ДАКУМЕНТЫ АБ АДУКАЦЫІ. ДАКУМЕНТЫ АБ НАВУЧАННІ

### Артыкул 90. Дакументы аб адукацыі

1. Дакумент аб адукацыі – дакумент дзяржаўнага ўзору, які пацвярджае засваенне навучэнцам зместу адпаведнай адукацыйнай праграмы, у тым ліку з прысваеннем кваліфікацыі і (або) ступені.

2. Дакументамі аб адукацыі з’яўляюцца:

2.1. пасведчанне аб агульнай базавай адукацыі (пасведчанне аб агульнай базавай адукацыі з адзнакай);

2.2. атэстат аб агульнай сярэдняй адукацыі (атэстат аб агульнай сярэдняй адукацыі асаблівага ўзору з узнагароджаннем залатым (сярэбраным) медалём);

2.3. дыплом аб прафесійна-тэхнічнай адукацыі (дыплом аб прафесійна-тэхнічнай адукацыі з адзнакай);

2.4. дыплом аб сярэдняй спецыяльнай адукацыі (дыплом аб сярэдняй спецыяльнай адукацыі з адзнакай);

2.5. дыплом бакалаўра (дыплом бакалаўра з адзнакай, дыплом бакалаўра з адзнакай з узнагароджаннем залатым медалём);

2.6. дыплом магістра (дыплом магістра з адзнакай, дыплом магістра з адзнакай з узнагароджаннем залатым медалём);

2.7. дыплом даследчыка;

2.8. дыплом аб перападрыхтоўцы на ўзроўні вышэйшай адукацыі;

2.9. дыплом аб перападрыхтоўцы на ўзроўні сярэдняй спецыяльнай адукацыі;

2.10. пасведчанне аб павышэнні кваліфікацыі.

3. Пасведчанне аб агульнай базавай адукацыі (пасведчанне аб агульнай базавай адукацыі з адзнакай) выдаецца навучэнцам, якія засвоілі змест адукацыйнай праграмы базавай адукацыі.

4. Атэстат аб агульнай сярэдняй адукацыі (атэстат аб агульнай сярэдняй адукацыі асаблівага ўзору з узнагароджаннем залатым (сярэбраным) медалём) выдаецца навучэнцам, якія засвоілі змест адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі.

5. Дыплом аб прафесійна-тэхнічнай адукацыі (дыплом аб прафесійна-тэхнічнай адукацыі з адзнакай) выдаецца навучэнцам, якія засвоілі змест адукацыйнай праграмы прафесійна-тэхнічнай адукацыі.

6. Дыплом аб сярэдняй спецыяльнай адукацыі (дыплом аб сярэдняй спецыяльнай адукацыі з адзнакай) выдаецца навучэнцам, якія засвоілі змест адукацыйнай праграмы сярэдняй спецыяльнай адукацыі.

7. Дыплом бакалаўра (дыплом бакалаўра з адзнакай, дыплом бакалаўра з адзнакай з узнагароджаннем залатым медалём) выдаецца навучэнцам, якія засвоілі змест адукацыйнай праграмы бакалаўрыяту.

8. Дыплом магістра (дыплом магістра з адзнакай, дыплом магістра з адзнакай з узнагароджаннем залатым медалём) выдаецца навучэнцам, якія засвоілі змест адукацыйнай праграмы магістратуры або змест бесперапыннай адукацыйнай праграмы вышэйшай адукацыі.

9. Дыплом даследчыка выдаецца навучэнцам, якія засвоілі змест адукацыйнай праграмы аспірантуры (ад’юнктуры).

10. Дыплом аб перападрыхтоўцы на ўзроўні вышэйшай адукацыі выдаецца навучэнцам, якія засвоілі змест адукацыйнай праграмы перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць вышэйшую адукацыю.

Асобам, якія засвоілі змест адукацыйнай праграмы перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць вышэйшую адукацыю, паралельна з засваеннем зместу адукацыйнай праграмы бакалаўрыяту або бесперапыннай адукацыйнай праграмы вышэйшай адукацыі, дыплом аб перападрыхтоўцы на ўзроўні вышэйшай адукацыі выдаецца пасля атрымання дыплома бакалаўра або дыплома магістра.

11. Дыплом аб перападрыхтоўцы на ўзроўні сярэдняй спецыяльнай адукацыі выдаецца навучэнцам, якія засвоілі змест адукацыйнай праграмы перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць сярэднюю спецыяльную адукацыю.

Асобам, якія засвоілі змест адукацыйнай праграмы перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць сярэднюю спецыяльную адукацыю, паралельна з засваеннем зместу адукацыйнай праграмы сярэдняй спецыяльнай адукацыі, што забяспечвае атрыманне кваліфікацыі спецыяліста з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, дыплом аб перападрыхтоўцы на ўзроўні сярэдняй спецыяльнай адукацыі выдаецца пасля атрымання дыплома аб сярэдняй спецыяльнай адукацыі.

12. Пасведчанне аб павышэнні кваліфікацыі выдаецца навучэнцам, якія засвоілі змест адукацыйнай праграмы павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў.

13. Пры выдачы атэстата аб агульнай сярэдняй адукацыі навучэнцы могуць узнагароджвацца пахвальнымі лістамі. Умовы ўзнагароджання навучэнцаў пахвальнымі лістамі вызначаюцца Міністэрствам адукацыі. Рашэнне аб узнагароджанні навучэнца пахвальным лістом прымаецца кіраўніком установы адукацыі.

14. З дыпломам аб прафесійна-тэхнічнай адукацыі, дыпломам аб сярэдняй спецыяльнай адукацыі, дыпломам аб перападрыхтоўцы на ўзроўні вышэйшай адукацыі, дыпломам аб перападрыхтоўцы на ўзроўні сярэдняй спецыяльнай адукацыі выдаюцца дадаткі да іх у выглядзе выпіскі выніковых адзнак (выпіскі з залікова-экзаменацыйных ведамасцей), якія без адпаведнага дакумента аб адукацыі несапраўдныя.

З дыпломам бакалаўра, дыпломам магістра выдаюцца дадаткі да дыпломаў у адпаведнасці з агульнаеўрапейскім узорам «Diploma Supplement», якія без адпаведнага дакумента аб адукацыі несапраўдныя.

15. Дакумент аб адукацыі, дадатак да яго (выпіска выніковых адзнак, выпіска з залікова-экзаменацыйнай ведамасці) афармляюцца на беларускай і рускай мовах.

Дадаткі да дыплома бакалаўра, дыплома магістра ў адпаведнасці з агульнаеўрапейскім узорам «Diploma Supplement» афармляюцца на беларускай, рускай і англійскай мовах.

16. Замежным грамадзянам і асобам без грамадзянства, якія часова знаходзяцца або часова пражываюць у Рэспубліцы Беларусь, якія атрымалі адукацыю ў Рэспубліцы Беларусь, выдаюцца дакументы аб адукацыі на рускай або беларускай (на іх выбар) і англійскай мовах.

17. Дакументы аб адукацыі, дадаткі да іх падпісваюцца кіраўніком установы адукацыі або ўпаўнаважаным ім кіраўніком адасобленага падраздзялення, кіраўніком арганізацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, іншай арганізацыі, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, і завяраюцца пячаткай (пры яе наяўнасці) установы адукацыі, арганізацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, іншай арганізацыі, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць.

18. У выпадку перамены імені ўладальніка дакумента аб адукацыі, акрамя перамены імені ў сувязі са змяненнем палавой прыналежнасці, змяненні ў дакумент аб адукацыі не ўносяцца і дакумент аб адукацыі на новае імя не выдаецца.

Пры перамене імені ўладальніка дакумента аб адукацыі ў сувязі са змяненнем палавой прыналежнасці выдаецца дакумент аб адукацыі ў адпаведнасці з заканадаўствам аб адміністрацыйных працэдурах.

19. Узоры і (або) апісанні дакументаў аб адукацыі, дадаткаў да іх, залатога, сярэбранага медалёў, парадак запаўнення дакументаў аб адукацыі, дадаткаў да іх, уліку і выдачы дакументаў аб адукацыі, дадаткаў да іх, залатога, сярэбранага медалёў, умовы выдачы дакументаў аб адукацыі з адзнакай, асаблівага ўзору з узнагароджаннем залатымі (сярэбранымі) медалямі вызначаюцца Міністэрствам адукацыі.

Узоры і (або) апісанні залатых медалёў і парадак іх уліку і выдачы, умовы выдачы дакументаў аб адукацыі з адзнакай з узнагароджаннем залатымі медалямі навучэнцам па спецыяльнасцях для воінскіх фарміраванняў і ваенізаваных арганізацый вызначаюцца адпаведна Міністэрствам абароны, Дзяржаўным пагранічным камітэтам, Міністэрствам унутраных спраў, Міністэрствам па надзвычайных сітуацыях.

20. У Рэспубліцы Беларусь вядзецца банк даных аб дакументах аб адукацыі ў парадку і на ўмовах, якія вызначаюцца Міністэрствам адукацыі.

**Артыкул 91. Дакументы аб навучанні**

1. Дакумент аб навучанні – дакумент дзяржаўнага ўзору, які пацвярджае засваенне навучэнцам зместу адпаведнай адукацыйнай праграмы, незавершанае засваенне зместу адукацыйнай праграмы, навучанне і выхаванне ва ўстанове адукацыі, іншай арганізацыі, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, якія не прайшлі або не пацвердзілі дзяржаўную акрэдытацыю, у індывідуальнага прадпрымальніка, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць.

2. Дакументамі аб навучанні з'яўляюцца:

2.1. пасведчанне аб спецыяльнай адукацыі;

2.2. пасведчанне аб стажыроўцы кіруючых работнікаў і спецыялістаў;

2.3. пасведчанне аб спецыяльнай падрыхтоўцы;

2.4. пасведчанне аб падрыхтоўцы, перападрыхтоўцы, павышэнні кваліфікацыі рабочага (служачага);

2.5. пасведчанне аб падрыхтоўцы, перападрыхтоўцы, павышэнні кваліфікацыі вадзіцеляў механічных транспартных сродкаў, самаходных машын;

2.6. пасведчанне аб заканчэнні факультэта давузаўскай падрыхтоўкі, падрыхтоўчага аддзялення, падрыхтоўчых курсаў;

2.7. пасведчанне аб дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі;

2.8. даведка аб навучанні;

2.9. сертыфікат аб навучанні.

3. Пасведчанне аб спецыяльнай адукацыі выдаецца навучэнцам, якія засвоілі змест адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю.

4. Пасведчанне аб стажыроўцы кіруючых работнікаў і спецыялістаў выдаецца навучэнцам, які засвоілі змест адукацыйнай праграмы стажыроўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў.

5. Пасведчанне аб спецыяльнай падрыхтоўцы выдаецца навучэнцам, якія засвоілі змест адукацыйнай праграмы спецыяльнай падрыхтоўкі, неабходнай для займання асобных пасад служачых.

6. Пасведчанне аб падрыхтоўцы, перападрыхтоўцы, павышэнні кваліфікацыі рабочага (служачага) выдаецца навучэнцам, якія засвоілі змест адукацыйнай праграмы прафесійнай падрыхтоўкі рабочых (служачых), або адукацыйнай праграмы перападрыхтоўкі рабочых (служачых), або адукацыйнай праграмы павышэння кваліфікацыі рабочых (служачых), а таксама якім прысвоена кваліфікацыя рабочага (служачага) пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы прафесійна-тэхнічнай, або адукацыйнай праграмы сярэдняй спецыяльнай адукацыі, або адукацыйнай праграмы бакалаўрыяту, або бесперапыннай адукацыйнай праграмы вышэйшай адукацыі.

7. Пасведчанне аб падрыхтоўцы, перападрыхтоўцы, павышэнні кваліфікацыі вадзіцеляў механічных транспартных сродкаў, самаходных машын выдаецца навучэнцам,

якія засвоілі змест адукацыйнай праграмы падрыхтоўкі вадзіцеляў механічных транспартных сродкаў, самаходных машын, або адукацыйнай праграмы перападрыхтоўкі вадзіцеляў механічных транспартных сродкаў, самаходных машын, або адукацыйнай праграмы павышэння кваліфікацыі вадзіцеляў механічных транспартных сродкаў, самаходных машын.

8. Пасведчанне аб заканчэнні факультэта давузаўскай падрыхтоўкі, падрыхтоўчага аддзялення, падрыхтоўчых курсаў выдаецца навучэнцам, якія засвоілі змест адукацыйнай праграмы падрыхтоўкі асоб да паступлення ва ўстановы адукацыі Рэспублікі Беларусь.

9. Пасведчанне аб дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі выдаецца навучэнцам, якія засвоілі змест адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі з вывучэннем вучэбных прадметаў, вучэбных дысцыплін, адукацыйных галін, тэм на павышаным узроўні.

10. Даведка аб навучанні выдаецца асобам:

10.1. якія не завяршылі засваенне зместу адукацыйных праграм, пры датэрміновым спыненні адукацыйных адносін (адлічэнні);

10.2. якія вучыліся ва ўстанове адукацыі, іншай арганізацыі, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, якія не прайшлі або не пацвердзілі дзяржаўную акрэдытацыю;

10.3. якія засвоілі змест адукацыйнай праграмы перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць вышэйшую адукацыю, або адукацыйнай праграмы перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць сярэднюю спецыяльную адукацыю, але не завяршылі засваенне зместу адукацыйнай праграмы асноўнай адукацыі адпаведнага ўзроўню ў сувязі з датэрміновым спыненнем адукацыйных адносін (адлічэннем).

11. Сертыфікат аб навучанні выдаецца асобам:

11.1. якія засвоілі змест адукацыйнай праграмы навучальных курсаў (лекторыяў, тэматычных семінараў, практыкумаў, трэнінгаў, афіцэрскіх курсаў і іншых відаў навучальных курсаў);

11.2. якія засвоілі змест адукацыйнай праграмы курсаў мэтавага прызначэння, – у выпадку прыняцця ўстановай адукацыі, іншай арганізацыяй, індывідуальным прадпрымальнікам, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, рашэння аб яго выдачы;

11.3. якія не завяршылі засваенне зместу адукацыйнай праграмы, але засвоілі змест модуля ў поўным аб’ёме, пры датэрміновым спыненні адукацыйных адносін (адлічэнні) – у выпадках, прадугледжаных адукацыйным стандартам і (або) вучэбна-праграмнай дакументацыяй адпаведнай адукацыйнай праграмы.

12. Дакумент аб навучанні афармляецца на беларускай і рускай мовах, падпісваецца кіраўніком установы адукацыі або ўпаўнаважаным ім кіраўніком адасобленага падраздзялення, кіраўніком арганізацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, іншай арганізацыі, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, індывідуальным прадпрымальнікам, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, і завяраецца пячаткай (пры яе наяўнасці) установы адукацыі, арганізацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, іншай арганізацыі, індывідуальнага прадпрымальніка, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць.

13. У выпадку перамены імені ўладальніка дакумента аб навучанні, акрамя перамены імені ў сувязі са змяненнем палавой прыналежнасці, змяненні ў дакумент аб навучанні не ўносяцца і дакумент аб навучанні на новае імя не выдаецца.

Пры перамене імені ўладальніка дакумента аб навучанні ў сувязі са змяненнем палавой прыналежнасці выдаецца дакумент аб навучанні ў адпаведнасці з заканадаўствам аб адміністрацыйных працэдурах.

14. Узоры і (або) апісанні дакументаў аб навучанні, парадак іх запаўнення, уліку і выдачы вызначаюцца Міністэрствам адукацыі.

### Артыкул 92. Юрыдычнае значэнне дакументаў аб адукацыі, дакументаў аб навучанні

Дакумент аб адукацыі, дакумент аб навучанні з’яўляюцца неабходнай умовай для працягу адукацыі, падставай для працаўладкавання і (або) праходжання атэстацыі ў парадку экстэрнату. Дакументы аб адукацыі з адзнакай дакументы аб адукацыі з адзнакай з узнагароджаннем залатым медалём, дакументы аб адукацыі асаблівага ўзору з узнагароджаннем залатымі (сярэбранымі) медалямі даюць права на атрыманне льгот, устаноўленых заканадаўчымі актамі.

### Артыкул 93. Падставы для выдачы дакументаў аб адукацыі, дакументаў аб навучанні

1. Дакументы аб адукацыі выдаюцца ўстановамі адукацыі, арганізацыямі, што рэалізуюць адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, іншымі арганізацыямі, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, навучэнцам, якія засвоілі змест адпаведных адукацыйных праграм, у тым ліку паспяхова прайшлі атэстацыю.

2. Падставай для выдачы дакумента аб адукацыі з’яўляецца рашэнне кіраўніка ўстановы агульнай сярэдняй адукацыі, іншай установы адукацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, установы спецыяльнай адукацыі, рашэнне дзяржаўнай экзаменацыйнай камісіі, дзяржаўнай атэстацыйнай камісіі, дзяржаўнай кваліфікацыйнай камісіі ўстановы адукацыі, арганізацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, іншай арганізацыі, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць.

3. Дакументы аб навучанні выдаюцца ўстановамі адукацыі, арганізацыямі, што рэалізуюць адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, іншымі арганізацыямі, індывідуальнымі прадпрымальнікамі, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, у адпаведнасці з артыкулам 91 гэтага Кодэкса навучэнцам:

3.1. якія засвоілі змест адпаведных адукацыйных праграм, у тым ліку паспяхова прайшлі атэстацыю;

3.2. якія не завяршылі засваенне зместу адукацыйных праграм або вучыліся ва ўстановах адукацыі, іншых арганізацыях, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, якія не прайшлі або не пацвердзілі дзяржаўную акрэдытацыю;

3.3. якім прысвоена кваліфікацыя рабочага (служачага) пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы прафесійна-тэхнічнай, або адукацыйнай праграмы сярэдняй спецыяльнай адукацыі, або адукацыйнай праграмы бакалаўрыяту, або бесперапыннай адукацыйнай праграмы вышэйшай адукацыі.

4. Падставай для выдачы дакумента аб навучанні з’яўляецца рашэнне кіраўніка ўстановы адукацыі, арганізацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, іншай арганізацыі, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, індывідуальнага прадпрымальніка, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, рашэнне дзяржаўнай экзаменацыйнай камісіі, дзяржаўнай кваліфікацыйнай камісіі.

### Артыкул 94. Прызнанне дакументаў аб адукацыі, выдадзеных у замежных дзяржавах, і ўстанаўленне іх эквівалентнасці (адпаведнасці) дакументам аб адукацыі Рэспублікі Беларусь

1. Прызнанне дакументаў аб адукацыі, выдадзеных у замежных дзяржавах, і ўстанаўленне іх эквівалентнасці (адпаведнасці) дакументам аб адукацыі Рэспублікі Беларусь азначаюць прадастаўленне Рэспублікай Беларусь уладальнікам гэтых дакументаў тых жа правоў, што і ўладальнікам дакументаў аб адукацыі Рэспублікі Беларусь.

2. Прызнанне дакументаў аб адукацыі, выдадзеных у замежных дзяржавах, і ўстанаўленне іх эквівалентнасці (адпаведнасці) дакументам аб адукацыі Рэспублікі

Беларусь ажыццяўляюцца Міністэрствам адукацыі ў адпаведнасці з актамі заканадаўства, міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь з выдачай пасведчання аб прызнанні дакумента аб адукацыі, выдадзенага ў замежнай дзяржаве, і ўстанаўленні яго эквівалентнасці (адпаведнасці) дакументу аб адукацыі Рэспублікі Беларусь.

3. Парадак прызнання дакументаў аб адукацыі, выдадзеных у замежных дзяржавах, і ўстанаўлення іх эквівалентнасці (адпаведнасці) дакументам аб адукацыі Рэспублікі Беларусь, узор пасведчання аб прызнанні дакумента аб адукацыі, выдадзенага ў замежнай дзяржаве, і ўстанаўленні яго эквівалентнасці (адпаведнасці) дакументу аб адукацыі Рэспублікі Беларусь устанаўліваюцца Урадам Рэспублікі Беларусь, калі іншае не ўстаноўлена Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 95. Дублікат дакумента аб адукацыі, дублікат дадатку да дакумента аб адукацыі, дублікат дакумента аб навучанні**

1. У выпадку страты, прывядзення ў непрыгоднасць дакумента аб адукацыі, дадатку да дакумента аб адукацыі, дакумента аб навучанні выдаюцца адпаведна дублікат дакумента аб адукацыі, дублікат дадатку да дакумента аб адукацыі, дублікат дакумента аб навучанні.

2. Дублікат дакумента аб адукацыі, дублікат дадатку да дакумента аб адукацыі, дублікат дакумента аб навучанні маюць сілу адпаведна дакумента аб адукацыі, дадатку да дакумента аб адукацыі, дакумента аб навучанні.

3. Парадак запаўнення і ўліку дублікатаў дакументаў аб адукацыі, дублікатаў дадаткаў да дакументаў аб адукацыі, дублікатаў дакументаў аб навучанні вызначаецца дзяржаўным органам, які зацвярджае парадак запаўнення, уліку і выдачы дакументаў аб адукацыі, дадаткаў да дакументаў аб адукацыі, дакументаў аб навучанні. Парадак выдачы дублікатаў дакументаў аб адукацыі, дублікатаў дадаткаў да дакументаў аб адукацыі, дублікатаў дакументаў аб навучанні ўстанаўліваецца заканадаўствам аб адміністрацыйных працэдурах.

4. У выпадку страты, прывядзення ў непрыгоднасць дубліката дакумента аб адукацыі, дубліката дадатку да дакумента аб адукацыі, дубліката дакумента аб навучанні паўторна выдаюцца дублікат дакумента аб адукацыі, дублікат дадатку да дакумента аб адукацыі, дублікат дакумента аб навучанні ў парадку, устаноўленым для выдачы дубліката дакумента аб адукацыі, дубліката дадатку да дакумента аб адукацыі, дубліката дакумента аб навучанні.

**Артыкул 96. Парадак і падставы для адмены рашэння аб выдачы асобе дакумента аб адукацыі, дакумента аб навучанні**

1. Рашэнне кіраўніка ўстановы адукацыі, арганізацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, іншай арганізацыі, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, індывідуальнага прадпрымальніка, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, рашэнне дзяржаўнай экзаменацыйнай камісіі, дзяржаўнай атэстацыйнай камісіі, дзяржаўнай кваліфікацыйнай камісіі аб выдачы асобе дакумента аб адукацыі, дакумента аб навучанні падлягаюць адмене ў выпадку адсутнасці:

1.1. на дату выдачы дакумента аб адукацыі, дакумента аб навучанні ў арганізацыі, якая выдала дакумент аб адукацыі, дакумент аб навучанні, ліцэнзіі на адукацыйную дзейнасць, калі яе наяўнасць прадугледжана заканадаўствам аб ліцэнзаванні;

1.2. на дату выдачы дакумента аб адукацыі ў арганізацыі, якая выдала дакумент аб адукацыі, права на выдачу выпускнікам, асобам, якія засвоілі змест адукацыйнай праграмы перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць вышэйшую адукацыю, адукацыйнай праграмы перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць сярэднюю спецыяльную адукацыю, адукацыйнай праграмы павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, дакументаў аб адукацыі;

1.3. падстаў для прыняцця рашэння аб выдачы дакумента аб адукацыі, дакумента аб навучанні.

2. Асоба, якая атрымала дакумент аб адукацыі, дакумент аб навучанні, пазбаўляецца дакумента аб адукацыі, дакумента аб навучанні на падставах, прадугледжаных пунктам 1 гэтага артыкула. Пры гэтым дакумент аб адукацыі, дакумент аб навучанні адбіраецца.

3. Адмена рашэння кіраўніка ўстановы адукацыі, арганізацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, іншай арганізацыі, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, індывідуальнага прадпрымальніка, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, рашэння дзяржаўнай экзаменацыйнай камісіі, дзяржаўнай атэстацыйнай камісіі, дзяржаўнай кваліфікацыйнай камісіі аб выдачы асобе дакумента аб адукацыі, дакумента аб навучанні, а таксама адабранне дакумента аб адукацыі, дакумента аб навучанні ажыццяўляюцца Міністэрствам адукацыі ў парадку, які ўстанаўліваецца Урадам Рэспублікі Беларусь або ўпаўнаважаным ім органам.

Рашэнні аб адмене рашэння кіраўніка ўстановы адукацыі, арганізацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, іншай арганізацыі, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, індывідуальнага прадпрымальніка, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, рашэнні дзяржаўнай экзаменацыйнай камісіі, дзяржаўнай атэстацыйнай камісіі, дзяржаўнай кваліфікацыйнай камісіі аб выдачы асобе дакумента аб адукацыі, дакумента аб навучанні, аб адабранні дакумента аб адукацыі, дакумента аб навучанні могуць быць абскарджаны ў суд.

4. Адабраныя дакумент аб адукацыі, дакумент аб навучанні, рашэнні аб выдачы якіх адменены, падлягаюць знішчэнню ў парадку, які ўстанаўліваецца Міністэрствам адукацыі.

## РАЗДЗЕЛ IV
## КІРАВАННЕ І МІЖНАРОДНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА Ў СФЕРЫ АДУКАЦЫІ. КАНТРОЛЬ І САМАКАНТРОЛЬ ЗА ЗАБЕСПЯЧЭННЕМ ЯКАСЦІ АДУКАЦЫІ

## ГЛАВА 11
## КІРАВАННЕ Ў СФЕРЫ АДУКАЦЫІ

### Артыкул 97. Прынцыпы і мэты кіравання ў сферы адукацыі

1. Кіраванне ў сферы адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь носіць дзяржаўна-грамадскі характар.

2. Кіраванне ў сферы адукацыі ажыццяўляецца на прынцыпах законнасці, дэмакратыі, галоснасці, уліку грамадскай думкі і сістэмнасці кіравання адукацыяй.

3. Мэтамі кіравання ў сферы адукацыі з’яўляюцца:

3.1. правядзенне дзяржаўнай палітыкі ў сферы адукацыі;

3.2. удасканаленне і развіццё сістэмы адукацыі;

3.3. рэалізацыя адукацыйных праграм, праграм выхавання.

### Артыкул 98. Дзяржаўнае кіраванне ў сферы адукацыі

Дзяржаўнае кіраванне ў сферы адукацыі ажыццяўляюць Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь, Урад Рэспублікі Беларусь, дзяржаўныя органы, падпарадкаваныя і (або) падсправаздачныя Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь, Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, рэспубліканскія органы дзяржаўнага кіравання, іншыя арганізацыі, падпарадкаваныя Ураду Рэспублікі Беларусь, мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы ў межах іх паўнамоцтваў.

## Артыкул 99. Паўнамоцтвы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у сферы адукацыі

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь з'яўляецца гарантам рэалізацыі права грамадзян на адукацыю, вызначае дзяржаўную палітыку ў сферы адукацыі, гарантуе рэалізацыю асноўных напрамкаў дзяржаўнай палітыкі ў сферы адукацыі, забеспячэнне пераемнасці і ўзаемадзеяння дзяржаўных арганізацый у сферы адукацыі і ажыццяўляе іншыя паўнамоцтвы ў сферы адукацыі, якія вызначаюцца Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, гэтым Кодэксам і іншымі заканадаўчымі актамі.

## Артыкул 100. Паўнамоцтвы Урада Рэспублікі Беларусь у сферы адукацыі

Урад Рэспублікі Беларусь у сферы адукацыі:

забяспечвае правядзенне дзяржаўнай палітыкі;

ажыццяўляе агульнае кіраванне сістэмай адукацыі;

вызначае напрамкі ўзаемадзеяння рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, іншых арганізацый, падпарадкаваных Ураду Рэспублікі Беларусь, і мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў;

забяспечвае правядзенне ў Рэспубліцы Беларусь знешнегандлёвай палітыкі і прымае неабходныя меры па яе рэалізацыі;

зацвярджае палажэнні аб мэтавай падрыхтоўцы спецыялістаў, рабочых (служачых), аб постынтэрнатным суправаджэнні дзяцей-сірот, дзяцей, якія засталіся без апекавання бацькоў, а таксама асоб з ліку дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекавання бацькоў, аб парадку правядзення конкурсаў прафесійнага майстэрства, падрыхтоўкі і накіравання асоб для ўдзелу ў міжнародных конкурсах прафесійнага майстэрства, аб парадку стварэння і функцыянавання цэнтра кампетэнцый, рэсурснага цэнтра і іншыя нарматыўныя прававыя акты, якія рэгламентуюць грамадскія адносіны ў сферы адукацыі, у адпаведнасці з яго паўнамоцтвамі;

устанаўлівае памер платы за атрыманне дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, якая атрымліваецца ў дзяржаўных дзіцячых школах мастацтваў, і парадак яе спагнання;

вызначае гарантыі і кампенсацыі навучэнцам, якія ўдзельнічаюць у адукацыйных мерапрыемствах, навучэнцам, якія накіроўваюцца для атрымання адукацыі ў замежных арганізацыях;

вызначае парадак адбору замежных грамадзян і асоб без грамадзянства, якія пастаянна пражываюць за межамі Рэспублікі Беларусь, для прадастаўлення грантаў на навучанне;

вызначае парадак стварэння, фарміравання, выкарыстання і эксплуатацыі дзяржаўных аўтаматызаваных інфармацыйных сістэм (рэсурсаў), Рэспубліканскага інфармацыйна-адукацыйнага асяроддзя;

ажыццяўляе іншыя паўнамоцтвы, якія вызначаюцца Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, гэтым Кодэксам, іншымі законамі і актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

## Артыкул 101. Паўнамоцтвы Міністэрства адукацыі ў сферы адукацыі

Міністэрства адукацыі ў сферы адукацыі:

забяспечвае рэалізацыю дзяржаўнай палітыкі;

забяспечвае функцыянаванне сістэмы адукацыі;

ажыццяўляе кіраванне сістэмай адукацыі;

ажыццяўляе дзяржаўную кадравую палітыку, узгадняе прызначэнне на пасаду і вызваленне ад пасады кіраўнікоў структурных падраздзяленняў мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, якія ажыццяўляюць дзяржаўна-ўладныя паўнамоцтвы ў сферы адукацыі;

забяспечвае арганізацыю і правядзенне фундаментальных і прыкладных навуковых даследаванняў, эксперыментальнай і інавацыйнай дзейнасці;

арганізуе міжнароднае супрацоўніцтва;

ажыццяўляе праз сваё структурнае падраздзяленне з правамі юрыдычнай асобы кантроль за забеспячэннем якасці адукацыі;

арганізуе распрацоўку, падтрыманне ў актуальным стане адукацыйных стандартаў, вучэбна-праграмнай дакументацыі адукацыйных праграм, праграм выхавання, ажыццяўляе іх улік і захоўванне ў вызначаным ім парадку;

ажыццяўляе навукова-метадычнае забеспячэнне адукацыі;

арганізуе падрыхтоўку і выпуск вучэбных выданняў, вучэбна-праграмнай дакументацыі адукацыйных праграм, вучэбна-метадычнай дакументацыі;

даводзіць да ўстаноў адукацыі, арганізацый, зацікаўленых у падрыхтоўцы спецыялістаў, рабочых (служачых), колькасць месцаў для атрымання адукацыі на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі;

каардынуе дзейнасць дзяржаўных арганізацый;

арганізуе стварэнне, фарміраванне, выкарыстанне і эксплуатацыю дзяржаўных аўтаматызаваных інфармацыйных сістэм (рэсурсаў), Рэспубліканскага інфармацыйна-адукацыйнага асяроддзя;

фарміруе і вядзе банкі даных адоранай моладзі, аб дзецях з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, аб дакументах аб адукацыі;

вызначае парадак уліку дзяцей з мэтай атрымання імі дашкольнай, агульнай сярэдняй, спецыяльнай адукацыі;

устанаўлівае па ўзгадненні з Міністэрствам аховы здароўя і Міністэрствам працы і сацыяльнай абароны парадак выяўлення дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця і стварэння банка даных аб іх;

распрацоўвае галіновую праграму кадравага забеспячэння, прагнозы патрэбы галіны ў кадрах;

вызначае пералік спецыяльнасцей, па якіх ажыццяўляецца мэтавая падрыхтоўка спецыялістаў, рабочых (служачых), на падставе прапаноў зацікаўленых дзяржаўных органаў, падпарадкаваных і (або) падсправаздачных Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь, рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, іншых арганізацый, падпарадкаваных Ураду Рэспублікі Беларусь;

удзельнічае ў распрацоўцы праектаў нарматыўных прававых актаў, дзяржаўнай праграмы развіцця сістэмы адукацыі;

вызначае штогод па ўзгадненні з Міністэрствам замежных спраў квоты для атрымання адукацыі за кошт грантаў на навучанне;

вызначае парадак арганізацыі самастойнай працы навучэнцаў пры засваенні зместу адукацыйных праграм;

вызначае пералік пасад педагагічных работнікаў, якім выплачваецца штомесячная кампенсацыя выдаткаў на набыццё вучэбнай і метадычнай літаратуры;

вызначае парадак атэстацыі педагагічных работнікаў;

ажыццяўляе іншыя паўнамоцтвы, якія вызначаюцца гэтым Кодэксам і іншымі актамі заканадаўства.

**Артыкул 102. Паўнамоцтвы дзяржаўных органаў, падпарадкаваных і (або) падсправаздачных Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, іншых арганізацый, падпарадкаваных Ураду Рэспублікі Беларусь, у сферы адукацыі**

Дзяржаўныя органы, падпарадкаваныя і (або) падсправаздачныя Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь, Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, рэспубліканскія органы дзяржаўнага кіравання, іншыя арганізацыі, падпарадкаваныя Ураду Рэспублікі Беларусь, у сферы адукацыі:

удзельнічаюць у распрацоўцы дзяржаўнай праграмы развіцця сістэмы адукацыі, працы міжведамасных саветаў па розных напрамках;

удзельнічаюць у распрацоўцы адукацыйных стандартаў, вучэбна-праграмнай дакументацыі адукацыйных праграм, Агульнадзяржаўнага класіфікатара Рэспублікі Беларусь «Спецыяльнасці і кваліфікацыі»;

арганізуюць распрацоўку адукацыйных стандартаў, вучэбна-праграмнай дакументацыі адукацыйных праграм у адпаведнасці з гэтым Кодэксам;

распрацоўваюць галіновыя праграмы кадравага забеспячэння, прагнозы патрэб галін у кадрах на аснове праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь;

арганізуюць павышэнне кваліфікацыі, стажыроўку і перападрыхтоўку кіруючых работнікаў, спецыялістаў, рабочых (служачых) галін;

даводзяць да Міністэрства адукацыі, устаноў адукацыі, арганізацый, зацікаўленых у падрыхтоўцы спецыялістаў, рабочых (служачых), колькасць месцаў для атрымання адукацыі на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі;

ажыццяўляюць навукова-метадычнае забеспячэнне адукацыі;

удзельнічаюць у вызначэнні месца працы выпускнікоў, маладых спецыялістаў, маладых рабочых (служачых);

удзельнічаюць у фарміраванні банка даных аб дакументах аб адукацыі;

удзельнічаюць у фарміраванні дзяржаўных аўтаматызаваных інфармацыйных сістэм (рэсурсаў), Рэспубліканскага інфармацыйна-адукацыйнага асяроддзя;

ажыццяўляюць іншыя паўнамоцтвы, якія вызначаюцца гэтым Кодэксам і іншымі актамі заканадаўства.

**Артыкул 103. Паўнамоцтвы мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў у сферы адукацыі**

Мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы ў сферы адукацыі:

ажыццяўляюць кіраванне на тэрыторыі адпаведнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі;

распрацоўваюць прагнозы патрэбы ў кадрах для адпаведнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі;

забяспечваюць стварэнне ўмоў для рэалізацыі права грамадзян на атрыманне бясплатнай дашкольнай, агульнай сярэдняй, спецыяльнай, прафесійна-тэхнічнай адукацыі;

арганізуюць павышэнне кваліфікацыі і перападрыхтоўку спецыялістаў, рабочых (служачых) падпарадкаваных арганізацый;

даводзяць да Міністэрства адукацыі, устаноў адукацыі, арганізацый, зацікаўленых у падрыхтоўцы спецыялістаў, рабочых (служачых), колькасць месцаў для атрымання адукацыі на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі;

удзельнічаюць у вызначэнні месца працы выпускнікоў, маладых спецыялістаў, маладых рабочых (служачых);

устанаўліваюць броню для працаўладкавання ў лік броні выпускнікоў, якія адносяцца да катэгорый дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекавання бацькоў, а таксама асоб з ліку дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекавання бацькоў, асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, якія атрымалі прафесійна-тэхнічную, сярэднюю спецыяльную, вышэйшую адукацыю;

ствараюць, рэарганізуюць, ліквідуюць дзяржаўныя арганізацыі адукацыі, якія забяспечваюць функцыянаванне сістэмы адукацыі;

удзельнічаюць у фарміраванні банка даных аб дакументах аб адукацыі;

удзельнічаюць у фарміраванні дзяржаўных аўтаматызаваных інфармацыйных сістэм (рэсурсаў), Рэспубліканскага інфармацыйна-адукацыйнага асяроддзя;

забяспечваюць замацаванне пачатковых школ, базавых школ, сярэдніх школ, гімназій (для атрымання агульнай базавай адукацыі) за канкрэтнымі тэрыторыямі адміністрацыйна-тэрытарыяльнай (тэрытарыяльнай) адзінкі;

ажыццяўляюць кантроль за забеспячэннем якасці адукацыі;

ажыццяўляюць іншыя паўнамоцтвы, якія вызначаюцца гэтым Кодэксам і іншымі актамі заканадаўства.

**Артыкул 104. Ліцэнзаванне адукацыйнай дзейнасці**

Адукацыйная дзейнасць ліцэнзуецца ў адпаведнасці з заканадаўствам аб ліцэнзаванні.

**Артыкул 105. Прагназаванне развіцця сістэмы адукацыі**

1. Развіццё сістэмы адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь ажыццяўляецца на аснове праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь, дзяржаўнай праграмы развіцця сістэмы адукацыі.

2. Прагнознымі паказчыкамі ў сістэме адукацыі з'яўляюцца сетка ўстаноў адукацыі, кантынгент навучэнцаў, арганізацыя адукацыйнага працэсу, кантрольныя лічбы прыёму, колькасць выпускнікоў, матэрыяльна-тэхнічная база ўстаноў адукацыі, патрэбы ў педагагічных кадрах, вучэбна-метадычных комплексах і іншыя.

3. Прагназаванне развіцця сістэмы адукацыі ажыццяўляецца на рэспубліканскім, абласным, раённым (гарадскім) узроўнях.

**Артыкул 106. Улік у сферы адукацыі**

1. Улік у сферы адукацыі вядзецца з мэтай сістэматычнага аналізу, кантролю за колькаснымі і якаснымі паказчыкамі аб'ектаў уліку.

2. Аб'ектамі ўліку ў сферы адукацыі з'яўляюцца:

2.1. установы адукацыі, арганізацыі, што рэалізуюць адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, іншыя арганізацыі, індывідуальныя прадпрымальнікі, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць;

2.2. дзяржаўныя арганізацыі адукацыі, якія забяспечваюць функцыянаванне сістэмы адукацыі;

2.3. кантынгент навучэнцаў;

2.4. кантынгент дзяцей, прызнаных дзецьмі, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы;

2.5. кантынгент дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекавання бацькоў;

2.6. кантынгент дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекавання бацькоў і падлягаюць усынаўленню (удачарэнню);

2.7. кантынгент дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця;

2.8. вынікі аздараўлення навучэнцаў;

2.9. педагагічныя і іншыя работнікі ўстаноў адукацыі;

2.10. колькасць выпускнікоў, іх размеркаванне, працаўладкаванне ў лік броні, накіраванне на працу і працаўладкаванне;

2.11. вучэбныя выданні;

2.12. матэрыяльна-тэхнічная база ўстаноў адукацыі;

2.13. вынікі дзейнасці ўстаноў адукацыі, якая прыносіць даходы;

2.14. іншыя аб'екты, якія вызначаюцца Міністэрствам адукацыі.

**Артыкул 107. Інфармацыйнае забеспячэнне ў сферы адукацыі**

1. У рамках інфармацыйнага забеспячэння ў сферы адукацыі ажыццяўляюцца:

1.1. збор, апрацоўка, аналіз і сістэматызацыя інфармацыі, у тым ліку аб аб'ектах уліку ў сферы адукацыі;

1.2. прымяненне дыстанцыйных адукацыйных тэхналогій;

1.3. стварэнне, выкарыстанне і эксплуатацыя дзяржаўных аўтаматызаваных інфармацыйных сістэм (рэсурсаў), Рэспубліканскага інфармацыйна-адукацыйнага асяроддзя;

1.4. атрыманне дзяржаўнымі органамі, установамі адукацыі і іншымі суб’ектамі адукацыйных адносін інфармацыі, неабходнай для ацэнкі дзейнасці і асноўных тэндэнцый развіцця сістэмы адукацыі, фарміравання стратэгіі яе развіцця, каардынацыі дзейнасці дзяржаўных органаў па кіраванні ў сферы адукацыі і ўстаноў адукацыі;

1.5. інфармаванне дзяржаўных органаў, іншых зацікаўленых юрыдычных і фізічных асоб па пытаннях адукацыі.

2. Інфармацыйнае забеспячэнне ў сферы адукацыі ажыццяўляецца з улікам абмежаванняў, устаноўленых заканадаўчымі актамі.

**Артыкул 108. Каардынацыйныя і іншыя саветы ў сферы адукацыі**

1. У Рэспубліцы Беларусь паводле рашэння Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Урада Рэспублікі Беларусь, Міністэрства адукацыі, іншых дзяржаўных органаў могуць ствараецца з ліку работнікаў дзяржаўных органаў, устаноў адукацыі, грамадскіх аб’яднанняў, іншых арганізацый, індывідуальных прадпрымальнікаў, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, каардынацыйныя і іншыя саветы па розных напрамках дзейнасці ў сферы адукацыі, палажэнні аб якіх зацвярджаюцца Урадам Рэспублікі Беларусь або ўпаўнаважаным ім органам, калі іншае не ўстаноўлена Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

2. Для выпрацоўкі рэкамендацый па пытаннях вышэйшай адукацыі, удасканалення адукацыйнага і выхаваўчага працэсаў, развіцця навукі і паляпшэння матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстаноў вышэйшай адукацыі ствараецца Рэспубліканскі савет рэктараў устаноў вышэйшай адукацыі. Паўнамоцтвы, склад і парадак арганізацыі дзейнасці Рэспубліканскага савета рэктараў устаноў вышэйшай адукацыі вызначаюцца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 109. Грамадскія аб’яднанні ў сферы адукацыі**

З мэтай сацыяльнага станаўлення, развіцця і самарэалізацыі навучэнцаў і педагагічных работнікаў, аховы і абароны іх правоў і законных інтарэсаў у адпаведнасці з актамі заканадаўства могуць ствараецца грамадскія аб’яднанні ў сферы адукацыі.

## ГЛАВА 12
## МІЖНАРОДНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА Ў СФЕРЫ АДУКАЦЫІ

**Артыкул 110. Міжнароднае супрацоўніцтва ў сферы адукацыі**

1. Міжнароднае супрацоўніцтва ў сферы адукацыі накіравана на атрыманне адукацыі грамадзянамі Рэспублікі Беларусь у замежных арганізацыях, замежнымі грамадзянамі і асобамі без грамадзянства, якія часова знаходзяцца або часова пражываюць у Рэспубліцы Беларусь, ва ўстановах адукацыі Рэспублікі Беларусь, іншых арганізацыях сістэмы адукацыі Рэспублікі Беларусь, на абмен навучэнцамі, педагагічнымі работнікамі, а таксама на ўдзел у міжнародных адукацыйных мерапрыемствах.

2. Міжнароднае супрацоўніцтва ў сферы адукацыі ажыццяўляецца на аснове міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь, дагавораў, якія заключаюцца паміж установай адукацыі Рэспублікі Беларусь, іншай арганізацыяй сістэмы адукацыі Рэспублікі Беларусь і замежнай арганізацыяй, міжнароднай арганізацыяй, замежным грамадзянінам, асобай без грамадзянства, якія часова знаходзяцца або часова пражываюць у Рэспубліцы Беларусь, міжнародных і нацыянальных праектаў і праграм у сферы адукацыі.

3. Міжнароднае супрацоўніцтва ў сферы адукацыі ажыццяўляецца ў адпаведнасці з актамі заканадаўства на прынцыпах незалежнасці, роўнасці, узаемнай выгады і павагі

і не павінна наносіць урон суверэнітэту Рэспублікі Беларусь, нацыянальнай бяспецы і інтарэсам асобы, грамадства і дзяржавы.

**Артыкул 111. Знешнегандлёвая дзейнасць у сферы адукацыі**

Знешнегандлёвая дзейнасць у сферы адукацыі ажыццяўляецца ў парадку і на ўмовах, устаноўленых актамі заканадаўства, нормамі міжнароднага права.

**Артыкул 112. Атрыманне адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь замежнымі грамадзянамі і асобамі без грамадзянства, якія пастаянна пражываюць за межамі Рэспублікі Беларусь**

1. Замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства, якія пастаянна пражываюць за межамі Рэспублікі Беларусь, маюць права на атрыманне адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь у адпаведнасці з міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь, дагаворамі, якія заключаюцца паміж установай адукацыі Рэспублікі Беларусь, іншай арганізацыяй сістэмы адукацыі Рэспублікі Беларусь і замежнай арганізацыяй, міжнароднай арганізацыяй, замежным грамадзянінам, асобай без грамадзянства, якія пастаянна пражываюць за межамі Рэспублікі Беларусь, калі іншае не ўстаноўлена гэтым Кодэксам.

2. Замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства, якія пастаянна пражываюць за межамі Рэспублікі Беларусь, маюць права на атрыманне адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь у дзяржаўных установах вышэйшай або сярэдняй спецыяльнай адукацыі за кошт грантаў на навучанне ў парадку, які ўстанаўліваецца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

3. Замежным грамадзянам і асобам без грамадзянства, якія пастаянна пражываюць за межамі Рэспублікі Беларусь, атрымліваюць адукацыю ў Рэспубліцы Беларусь за кошт грантаў на навучанне, прызначаецца стыпендыя, выплачваюцца надбаўкі да стыпендыі за поспехі ў вучэбнай, навуковай і грамадскай дзейнасці, аказваецца матэрыяльная дапамога, а таксама прадастаўляецца жылое памяшканне ў інтэрнаце на перыяд атрымання адукацыі ў парадку, які вызначаецца актамі заканадаўства.

**Артыкул 113. Акадэмічная мабільнасць**

1. Акадэмічная мабільнасць – абмен навучэнцамі, педагагічнымі работнікамі Рэспублікі Беларусь і замежнай дзяржавы з мэтай навучання, павышэння кваліфікацыі, удасканалення педагагічнай дзейнасці.

2. Акадэмічная мабільнасць дасягаецца пры дапамозе рэалізацыі міжнародных праграм, міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь, дагавораў, якія заключаюцца паміж установай адукацыі Рэспублікі Беларусь, іншай арганізацыяй сістэмы адукацыі Рэспублікі Беларусь і замежнай арганізацыяй, міжнароднай арганізацыяй, замежным грамадзянінам, асобай без грамадзянства.

3. Акадэмічная мабільнасць ажыццяўляецца на парытэтнай аснове і носіць часовы характар. Навучэнцы, педагагічныя работнікі павінны вярнуцца ў дзяржаву пастаяннага пражывання пасля завяршэння навучання, павышэння кваліфікацыі, удасканалення педагагічнай дзейнасці. Працягласць і іншыя ўмовы акадэмічнай мабільнасці ўстанаўліваюцца дагаворам.

**Артыкул 114. Прызнанне і ўстанаўленне адпаведнасці перыядаў навучання ў замежных арганізацыях**

1. Прызнанне і ўстанаўленне адпаведнасці перыядаў навучання ў замежных арганізацыях і іх філіялах, міжнародных арганізацыях азначаюць прадастаўленне права асобе працягнуць атрыманне адукацыі ва ўстановах адукацыі Рэспублікі Беларусь,

арганізацыях Рэспублікі Беларусь, што рэалізуюць адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі.

2. Прызнанне і ўстанаўленне адпаведнасці перыядаў навучання ў замежных арганізацыях і іх філіялах, міжнародных арганізацыях ажыццяўляюцца ўстановай адукацыі, арганізацыяй, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, пры прыёме (залічэнні) на навучанне ў адпаведнасці з актамі заканадаўства, а таксама міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь.

3. Крытэрыі і парадак прызнання і ўстанаўлення адпаведнасці перыядаў навучання ў замежных арганізацыях вызначаюцца Урадам Рэспублікі Беларусь, калі іншае не ўстаноўлена Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

### Артыкул 115. Адукацыйная дзейнасць устаноў адукацыі Рэспублікі Беларусь і іх філіялаў на тэрыторыі замежных дзяржаў, замежных арганізацый і іх філіялаў, міжнародных арганізацый у Рэспубліцы Беларусь

1. Адукацыйная дзейнасць устаноў адукацыі Рэспублікі Беларусь і іх філіялаў на тэрыторыі замежных дзяржаў ажыццяўляецца ў адпаведнасці з актамі заканадаўства замежнай дзяржавы, на тэрыторыі якой яны размешчаны, і актамі заканадаўства Рэспублікі Беларусь, а таксама міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь.

2. Адукацыйная дзейнасць замежных арганізацый і іх філіялаў, міжнародных арганізацый у Рэспубліцы Беларусь ажыццяўляецца ў адпаведнасці з актамі заканадаўства Рэспублікі Беларусь, а таксама міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь.

## ГЛАВА 13
## КАНТРОЛЬ І САМАКАНТРОЛЬ ЗА ЗАБЕСПЯЧЭННЕМ ЯКАСЦІ АДУКАЦЫІ

### Артыкул 116. Кантроль за забеспячэннем якасці адукацыі

1. Кантроль за забеспячэннем якасці адукацыі – дзейнасць упаўнаважаных кантралюючых (наглядных) органаў (структурнага падраздзялення з правамі юрыдычнай асобы Міністэрства адукацыі, мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў) па праверцы адпаведнасці адукацыі адукацыйнаму стандарту, вучэбна-праграмнай дакументацыі адукацыйных праграм, іншым патрабаванням, прадугледжаным гэтым Кодэксам і іншымі актамі заканадаўства, адукацыйнай і іншай дзейнасці ўстановы адукацыі, іншай арганізацыі, індывідуальнага прадпрымальніка, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, патрабаванням заканадаўства аб адукацыі.

2. Кантроль за забеспячэннем якасці адукацыі ажыццяўляецца ў адпаведнасці з заканадаўствам аб кантрольнай (нагляднай) дзейнасці.

### Артыкул 117. Самакантроль за забеспячэннем якасці адукацыі

1. Самакантроль за забеспячэннем якасці адукацыі – комплексны аналіз адукацыйнай дзейнасці, які ўключае самаправерку, самаацэнку адукацыйнай дзейнасці, ажыццяўляецца ўстановай адукацыі, арганізацыяй, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, іншай арганізацыяй, індывідуальным прадпрымальнікам, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць.

2. Парадак і перыядычнасць правядзення самакантролю за забеспячэннем якасці адукацыі вызначаюцца кіраўніком установы адукацыі, арганізацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, іншай арганізацыі, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, індывідуальным прадпрымальнікам, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць.

## РАЗДЗЕЛ V
## ДЫСЦЫПЛІНАРНАЯ АДКАЗНАСЦЬ НАВУЧЭНЦАЎ

### ГЛАВА 14
### ПАДСТАВЫ ДЛЯ ПРЫЦЯГНЕННЯ НАВУЧЭНЦАЎ ДА ДЫСЦЫПЛІНАРНАЙ АДКАЗНАСЦІ. МЕРЫ ДЫСЦЫПЛІНАРНАГА СПАГНАННЯ

#### Артыкул 118. Падставы для прыцягнення навучэнцаў да дысцыплінарнай адказнасці

1. Падставай для прыцягнення навучэнца да дысцыплінарнай адказнасці з’яўляецца проціпраўнае, вінаватае (наўмыснае або па неасцярожнасці) невыкананне або неналежнае выкананне абавязкаў, ускладзеных на яго актамі заканадаўства, устаноўчым дакументам і іншымі лакальнымі прававымі актамі ўстановы адукацыі, арганізацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, іншай арганізацыі, індывідуальнага прадпрымальніка, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць (далей – дысцыплінарная правіннасць), у выглядзе наступных дзеянняў (бяздзейнасці):

1.1. спазненне або няяўкі без уважлівых прычын на вучэбныя заняткі, заняткі, вытворчае навучанне, практыку, стажыроўку, іншыя формы арганізацыі адукацыйнага працэсу;

1.2. парушэння дысцыпліны;

1.3. невыканання ў перыяд праходжання вытворчага навучання, практыкі, стажыроўкі рэжыму рабочага часу, вызначанага правіламі ўнутранага працоўнага распарадку адпаведнай арганізацыі;

1.4. невыканання без уважлівых прычын патрабавання педагагічнага работніка, заснаванага на акце заканадаўства, устаноўчым дакуменце або іншым лакальным прававым акце ўстановы адукацыі, арганізацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, іншай арганізацыі, індывідуальнага прадпрымальніка, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць;

1.5. знявагі ўдзельнікаў адукацыйнага працэсу;

1.6. пашкоджання капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), абсталявання або іншай маёмасці ўстановы адукацыі, арганізацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, іншай арганізацыі, індывідуальнага прадпрымальніка, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць;

1.7. распівання алкагольных, слабаалкагольных напіткаў, піва, спажывання наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў, іх аналагаў, таксічных або іншых адурманьвальных рэчываў у памяшканнях і на тэрыторыях, якія займаюцца ўстановай адукацыі, арганізацыяй, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, іншай арганізацыяй, індывідуальным прадпрымальнікам, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, а таксама з’яўлення ва ўказаных месцах у стане алкагольнага, наркатычнага або таксічнага ап’янення;

1.8. курэння (спажывання) тытунёвых вырабаў, выкарыстання электронных сістэм курэння, сістэм для спажывання тытуню ў памяшканнях і на тэрыторыях, якія займаюцца ўстановай адукацыі, арганізацыяй, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, а таксама ў памяшканнях і на тэрыторыях (акрамя спецыяльна створаных месцаў), якія займаюцца іншай арганізацыяй, індывідуальным прадпрымальнікам, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць;

1.9. іншых проціпраўных дзеянняў (бяздзейнасці).

2. Не прызнаецца дысцыплінарнай правіннасцю дзеянне, адпаведнае крытэрыям, указаным у пункце 1 гэтага артыкула, учыненае навучэнцам з ліку асоб з умеранай і цяжкай інтэлектуальнай недастатковасцю, з цяжкімі, шматлікімі парушэннямі ў фізічным і (або) псіхічным развіцці.

3. За ўчыненне навучэнцам дысцыплінарнай правіннасці ўстанаўліваецца дысцыплінарная адказнасць, якая выяўляецца ў прымяненні да яго мер дысцыплінарнага спагнання.

### Артыкул 119. Узрост, па дасягненні якога наступае дысцыплінарная адказнасць

1. Да дысцыплінарнай адказнасці прыцягваецца навучэнец, які дасягнуў да моманту ўчынення дысцыплінарнай правіннасці ўзросту чатырнаццаці гадоў, а навучэнец з ліку асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця – сямнаццаці гадоў.

2. Да навучэнца, які ўчыніў дысцыплінарную правіннасць і не дасягнуў да моманту яе ўчынення ўзросту, з якога наступае дысцыплінарная адказнасць, а таксама да навучэнца з ліку асоб з умеранай і цяжкай інтэлектуальнай недастатковасцю, з цяжкімі, шматлікімі парушэннямі ў фізічным і (або) псіхічным развіцці могуць прымяняцца меры педагагічнага ўздзеяння (гутарка, абмеркаванне на педагагічным савеце і іншыя меры, якія не супярэчаць заканадаўству).

### Артыкул 120. Меры дысцыплінарнага спагнання

1. За ўчыненне дысцыплінарнай правіннасці да навучэнца могуць быць прыменены наступныя меры дысцыплінарнага спагнання:

1.1. заўвага;

1.2. вымова;

1.3. датэрміновае спыненне адукацыйных адносін (адлічэнне) на падставах, прадугледжаных падпунктамі 5.10–5.13 і 5.16 пункта 5 артыкула 68 гэтага Кодэкса.

2. Датэрміновае спыненне адукацыйных адносін (адлічэнне) як мера дысцыплінарнага спагнання не прымяняецца да:

2.1 навучэнца, які не дасягнуў васямнаццаці гадоў і не завяршыў засваенне зместу адукацыйнай праграмы базавай адукацыі, адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі, адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю, адукацыйнай праграмы прафесійна-тэхнічнай адукацыі, якая забяспечвае атрыманне кваліфікацыі рабочага (служачага) і агульнай сярэдняй адукацыі, або адукацыйнай праграмы прафесійна-тэхнічнай адукацыі з вывучэннем асобных вучэбных прадметаў на павышаным узроўні, якая забяспечвае атрыманне кваліфікацыі рабочага (служачага) і агульнай сярэдняй адукацыі, адной з адукацыйных праграм сярэдняй спецыяльнай адукацыі, не прайшоў выніковую атэстацыю за перыяд атрымання агульнай базавай, агульнай сярэдняй адукацыі пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі;

2.2. навучэнцу, які не дасягнуў узросту шаснаццаці гадоў, за выключэннем навучэнца суворaўскага ваеннага вучылішча, кадэцкага вучылішча, спецыялізаванага ліцэя;

2.3. выхаванцу спецыяльнай навучальна-выхаваўчай установы, спецыяльнай лячэбна-выхаваўчай установы, сацыяльна-педагагічнага цэнтра, дзіцячага дома, школы-інтэрната для дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекавання бацькоў.

3. Права выбару меры дысцыплінарнага спагнання належыць кіраўніку ўстановы адукацыі, арганізацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, іншай арганізацыі, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, індывідуальнаму прадпрымальніку, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць. Пры выбары меры дысцыплінарнага спагнання павінны ўлічвацца цяжар дысцыплінарнай правіннасці, прычыны і акалічнасці, пры якіх яна ўчынена, папярэднія паводзіны навучэнца.

4. Меры дысцыплінарнага спагнання, умовы і парадак іх прымянення ў дачыненні да навучэнцаў суворaўскага ваеннага вучылішча ўстанаўліваюцца Палажэннем аб суворaўскім ваенным вучылішчы.

### Артыкул 121. Дысцыплінарная адказнасць навучэнцаў з ліку ваеннаслужачых, асоб начальніцкага і радавога складу ваенізаваных арганізацый

Дысцыплінарная адказнасць навучэнцаў з ліку ваеннаслужачых, асоб начальніцкага і радавога складу ваенізаваных арганізацый устанаўліваецца заканадаўствам аб праходжанні адпаведнай службы.

## ГЛАВА 15
## ПРЫМЯНЕННЕ МЕР ДЫСЦЫПЛІНАРНАГА СПАГНАННЯ

### Артыкул 122. Прэзумпцыя невінаватасці навучэнца, які прыцягваецца да дысцыплінарнай адказнасці

1. Навучэнец, які прыцягваецца да дысцыплінарнай адказнасці, лічыцца невінаватым, пакуль яго віна не будзе даказана і ўстаноўлена загадам аб прымяненні меры дысцыплінарнага спагнання, выдадзеным кіраўніком установы адукацыі, арганізацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, іншай арганізацыі, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, індывідуальным прадпрымальнікам, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць.

2. Навучэнец, які прыцягваецца да дысцыплінарнай адказнасці, не абавязаны даказваць сваю невінаватасць. Неадхільныя сумненні ў вінаватасці навучэнца, які прыцягваецца да дысцыплінарнай адказнасці, тлумачацца на яго карысць.

### Артыкул 123. Правы навучэнца, які прыцягваецца да дысцыплінарнай адказнасці, законнага прадстаўніка непаўналетняга навучэнца, які прыцягваецца да дысцыплінарнай адказнасці

Навучэнец, які прыцягваецца да дысцыплінарнай адказнасці, законны прадстаўнік непаўналетняга навучэнца, які прыцягваецца да дысцыплінарнай адказнасці, маюць права:

знаёміцца з усімі матэрыяламі адносна ўчыненай дысцыплінарнай правіннасці, здымаць копіі з дакументаў;

даваць паясненні і прадстаўляць доказы або адмовіцца ад дачы паясненняў;

быць заслуханымі ў ходзе любога разбору, які закранае іх інтарэсы, прысутнічаць на ім;

атрымаць юрыдычную дапамогу ў адпаведнасці з актамі заканадаўства;

азнаёміцца з загадам аб прымяненні меры дысцыплінарнага спагнання і атрымаць яго копію;

абскардзіць загад аб прымяненні меры дысцыплінарнага спагнання.

### Артыкул 124. Парадак прымянення мер дысцыплінарнага спагнання

1. Падставамі для прыцягнення навучэнца да дысцыплінарнай адказнасці могуць служыць паведамленні мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, праваахоўных органаў, іншых дзяржаўных органаў і арганізацый, дакладныя запіскі педагагічных і іншых работнікаў установы адукацыі, арганізацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, іншай арганізацыі, індывідуальнага прадпрымальніка, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, асоб, якія ажыццяўляюць ахову памяшканняў установы адукацыі, арганізацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, іншай арганізацыі, індывідуальнага прадпрымальніка, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, або іншае пісьмовае паведамленне.

2. Да прымянення меры дысцыплінарнага спагнання кіраўнік установы адукацыі, арганізацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, іншай арганізацыі, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, індывідуальны прадпрымальнік,

што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, на працягу двух каляндарных дзён пасля выяўлення ўчынення навучэнцам дзеяння, якое падпадае пад прыкметы дысцыплінарнай правіннасці, абавязаны пісьмова паведаміць аднаму з законных прадстаўнікоў непаўналетняга навучэнца і запатрабаваць у навучэнца пісьмовае тлумачэнне.

Пісьмовае тлумачэнне прадстаўляецца навучэнцам на працягу трох каляндарных дзён пасля яго выпатрабавання.

Непрадстаўленне навучэнцам пісьмовага тлумачэння, немагчымасць атрымання ад яго пісьмовага тлумачэння афармляюцца актам, які падпісваецца трыма асобамі з ліку работнікаў установы адукацыі, арганізацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, іншай арганізацыі, індывідуальнага прадпрымальніка, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, і (або) навучэнцаў гэтых установы адукацыі, арганізацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, іншай арганізацыі, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, гэтага індывідуальнага прадпрымальніка, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, якія дасягнулі ўзросту васямнаццаці гадоў.

3. Непрадстаўленне навучэнцам пісьмовага тлумачэння, немагчымасць атрымання ад яго пісьмовага тлумачэння не перашкаджаюць прымяненню да навучэнца меры дысцыплінарнага спагнання.

4. За кожную дысцыплінарную правіннасць можа быць прыменена толькі адна мера дысцыплінарнага спагнання.

5. Прымяненне меры дысцыплінарнага спагнання ў выглядзе датэрміновага спынення адукацыйных адносін (адлічэння) да непаўналетняга навучэнца дапускаецца толькі са згоды адпаведнай камісіі па справах непаўналетніх мясцовага выканаўчага і распарадчага органа, калі іншае не ўстаноўлена часткай другой гэтага пункта, іншымі заканадаўчымі актамі.

Прымяненне меры дысцыплінарнага спагнання ў выглядзе датэрміновага спынення адукацыйных адносін (адлічэння) да непаўналетняга навучэнца суворáўскага ваеннага вучылішча, непаўналетняга навучэнца, які атрымлівае адукацыю па спецыяльнасцях для воінскіх фарміраванняў і ваенізаваных арганізацый, ажыццяўляецца ў парадку, прадугледжаным заканадаўствам аб праходжанні адпаведнай службы.

6. Рашэнне аб прымяненні меры дысцыплінарнага спагнання да навучэнца прымаецца на падставе матэрыялаў, якія ўтрымліваюць фактычныя доказы ўчынення ім дысцыплінарнай правіннасці, а таксама з улікам формы віны навучэнца.

7. Кіраўнік установы адукацыі, арганізацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, іншай арганізацыі, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, індывідуальны прадпрымальнік, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, маюць права, а па ініцыятыве навучэнца, які прыцягваецца да дысцыплінарнай адказнасці, законнага прадстаўніка непаўналетняга навучэнца, які прыцягваецца да дысцыплінарнай адказнасці, абавязаны да прыняцця рашэння аб прымяненні меры дысцыплінарнага спагнання заслухаць тлумачэнні навучэнца, яго заявы, скаргі.

**Артыкул 125. Тэрміны прымянення мер дысцыплінарнага спагнання**

1. Навучэнец можа быць прыцягнуты да дысцыплінарнай адказнасці не пазней за адзін месяц з дня выяўлення дысцыплінарнай правіннасці (дзень, калі аб правіннасці стала або павінна было стаць вядома педагагічнаму работніку ўстановы адукацыі, арганізацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, іншай арганізацыі, індывідуальнага прадпрымальніка, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць), не лічачы часу знаходжання навучэнца на канікулах, у водпуску, адсутнасці на вучэбных занятках, занятках, вытворчым навучанні, практыцы, стажыроўцы, іншых формах арганізацыі адукацыйнага працэсу. Мера дысцыплінарнага спагнання да непаўналетняга навучэнца можа быць прыменена не раней чым праз сем каляндарных дзён пасля накіравання пісьмовага паведамлення аднаму з яго законных прадстаўнікоў.

2. Мера дысцыплінарнага спагнання да навучэнца не можа быць прыменена пазней за шэсць месяцаў з дня ўчынення дысцыплінарнай правіннасці.

### Артыкул 126. Аб’яўленне рашэння аб прымяненні меры дысцыплінарнага спагнання да навучэнца

1. Рашэнне аб прымяненні меры дысцыплінарнага спагнання да навучэнца афармляецца загадам кіраўніка ўстановы адукацыі, арганізацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, іншай арганізацыі, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, індывідуальнага прадпрымальніка, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, аб дысцыплінарным спагнанні, у якім павінны ўтрымлівацца звесткі аб навучэнцу, які прыцягваецца да дысцыплінарнай адказнасці, аб учыненай дысцыплінарнай правіннасці, форме віны, доказе віны, указанне меры дысцыплінарнага спагнання.

2. Загад кіраўніка ўстановы адукацыі, арганізацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, іншай арганізацыі, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, індывідуальнага прадпрымальніка, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, аб дысцыплінарным спагнанні аб’яўляецца навучэнцу пад роспіс на працягу пяці каляндарных дзён з дня выдання загада, не лічачы часу знаходжання навучэнца на канікулах, у водпуску, адсутнасці на вучэбных занятках, занятках, вытворчым навучанні, практыцы, стажыроўцы, іншых формах арганізацыі адукацыйнага працэсу.

Навучэнец, не азнаёмлены з загадам аб дысцыплінарным спагнанні, лічыцца навучэнцам, які не мае дысцыплінарнага спагнання.

Для азнаямлення з загадам аб дысцыплінарным спагнанні запрашаюцца непаўналетні навучэнец і адзін з яго законных прадстаўнікоў.

Адмова навучэнца ад азнаямлення з загадам аб прымяненні меры дысцыплінарнага спагнання або немагчымасць азнаямлення з загадам аб прымяненні меры дысцыплінарнага спагнання афармляецца актам, які падпісваецца трыма асобамі з ліку работнікаў установы адукацыі, арганізацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, іншай арганізацыі, індывідуальнага прадпрымальніка, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, і (або) навучэнцаў гэтых устаноў адукацыі, арганізацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, іншай арганізацыі, гэтага індывідуальнага прадпрымальніка, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, якія дасягнулі ўзросту васямнаццаці гадоў.

Копіі акта і загада аб прымяненні меры дысцыплінарнага спагнання (выпіскі з загада) на працягу пяці каляндарных дзён з дня складання акта накіроўваюцца ўстановай адукацыі, арганізацыяй, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, іншай арганізацыяй, індывідуальным прадпрымальнікам, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, законнаму прадстаўніку непаўналетняга навучэнца.

3. Звесткі аб прымяненні меры дысцыплінарнага спагнання заносяцца ў асабістую справу навучэнца.

### Артыкул 127. Абскарджанне рашэння аб прымяненні меры дысцыплінарнага спагнання да навучэнца

1. Рашэнне аб прымяненні меры дысцыплінарнага спагнання да навучэнца можа быць абскарджана навучэнцам, асобай, адлічанай з установы адукацыі, арганізацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, іншай арганізацыі, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, адлічаным індывідуальным прадпрымальнікам, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, а таксама законным прадстаўніком непаўналетняга навучэнца, законным прадстаўніком непаўналетняй асобы, адлічанай з установы адукацыі, арганізацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, іншай

арганізацыі, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, адлічанай індывідуальным прадпрымальнікам, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, у вышэйстаячы орган (арганізацыю), а пры адсутнасці вышэйстаячага органа (арганізацыі) – у суд на працягу аднаго месяца пасля прымянення меры дысцыплінарнага спагнання.

2. Рашэнне аб прымяненні меры дысцыплінарнага спагнання да навучэнца пасля абскарджання ў вышэйстаячы орган (арганізацыю) можа быць абскарджана ў суд.

**Артыкул 128. Парадак зняцця і пагашэння мер дысцыплінарнага спагнання ў выглядзе заўвагі або вымовы**

1. Калі на працягу года з дня прымянення меры дысцыплінарнага спагнання ў выглядзе заўвагі або вымовы навучэнец не будзе падвергнуты новаму дысцыплінарнаму спагнанню, ён лічыцца навучэнцам, які не падвяргаўся дысцыплінарнаму спагнанню. Пры гэтым мера дысцыплінарнага спагнання ў выглядзе заўвагі або вымовы пагашаецца аўтаматычна без выдання загада.

2. Кіраўнік установы адукацыі, арганізацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, іншай арганізацыі, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, індывідуальны прадпрымальнік, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, якія прымянілі да навучэнца меру дысцыплінарнага спагнання ў выглядзе заўвагі або вымовы, маюць права зняць яе датэрмінова па ўласнай ініцыятыве або па просьбе навучэнца.

3. Датэрміновае зняцце меры дысцыплінарнага спагнання ў выглядзе заўвагі або вымовы афармляецца загадам кіраўніка ўстановы адукацыі, арганізацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, іншай арганізацыі, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, індывідуальнага прадпрымальніка, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць.

## РАЗДЗЕЛ VI
## ФІНАНСАВАННЕ, МАТЭРЫЯЛЬНА-ТЭХНІЧНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ Ў СФЕРЫ АДУКАЦЫІ

### ГЛАВА 16
### ФІНАНСАВАННЕ Ў СФЕРЫ АДУКАЦЫІ

**Артыкул 129. Фінансаванне ўстаноў адукацыі, дзяржаўных арганізацый адукацыі, якія забяспечваюць функцыянаванне сістэмы адукацыі, іншых арганізацый, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць**

1. Фінансаванне дзяржаўных устаноў адукацыі, дзяржаўных арганізацый адукацыі, якія забяспечваюць функцыянаванне сістэмы адукацыі, ажыццяўляецца за кошт сродкаў рэспубліканскага і (або) мясцовых бюджэтаў, сродкаў заснавальнікаў, сродкаў, атрыманых ад дзейнасці, якая прыносіць даходы, безаплатнай (спонсарскай) дапамогі юрыдычных асоб, індывідуальных прадпрымальнікаў і іншых крыніц, не забароненых актамі заканадаўства.

2. Фінансаванне прыватных устаноў адукацыі ажыццяўляецца за кошт сродкаў заснавальнікаў, сродкаў, атрыманых ад дзейнасці, якая прыносіць даходы, безаплатнай (спонсарскай) дапамогі юрыдычных асоб, індывідуальных прадпрымальнікаў і іншых крыніц, не забароненых актамі заканадаўства.

3. Фінансаванне дзяржаўных устаноў адукацыі, дзяржаўных арганізацый адукацыі, якія забяспечваюць функцыянаванне сістэмы адукацыі, ажыццяўляецца з улікам дзяржаўнай праграмы развіцця сістэмы адукацыі, іншых дзяржаўных праграм, рэгіянальных комплексаў мерапрыемстваў, якія забяспечваюць рэалізацыю дзяржаўных праграм, дзяржаўных мінімальных сацыяльных стандартаў у галіне адукацыі, нарматываў выдаткаў на аднаго навучэнца.

4. Фінансаванне часткі выдаткаў іншых арганізацый, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі, адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі, адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю ажыццяўляецца за кошт сродкаў мясцовых бюджэтаў.

Фінансаванне выдаткаў іншых арганізацый, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, указаных у частцы першай гэтага пункта, ажыццяўляецца ў памеры нарматыву бюджэтнай забяспечанасці выдаткаў на аднаго выхаванца ва ўстановах дашкольнай адукацыі, спецыяльных дзіцячых садах, устаноўленага дзяржаўнымі сацыяльнымі стандартамі па абслугоўванні насельніцтва. Фінансаванне такіх выдаткаў ажыццяўляецца ў парадку, што ўстанаўліваецца Міністэрствам адукацыі па ўзгадненні з Міністэрствам фінансаў, абласнымі (Мінскім гарадскім) выканаўчымі камітэтамі.

Фінансаванне выдаткаў прыватных устаноў адукацыі, што рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, якія маюць дзяржаўную акрэдытацыю на адпаведнасць заяўленаму віду, можа ажыццяўляцца за кошт рэспубліканскага і (або) мясцовых бюджэтаў. Фінансаванне выдаткаў прыватных устаноў адукацыі, што рэалізуюць адукацыйную праграму дашкольнай адукацыі, адукацыйную праграму спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі, адукацыйную праграму спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю, можа ажыццяўляцца за кошт мясцовых бюджэтаў. Умовы накіравання сродкаў і парадак фінансавання вызначаюцца Урадам Рэспублікі Беларусь.

5. Фінансаванне выдаткаў арганізацый, якія ўдзельнічаюць у рэалізацыі адукацыйных праграм праз сеткавую форму ўзаемадзеяння, ажыццяўляецца за кошт сродкаў рэспубліканскага і (або) мясцовых бюджэтаў, сродкаў, атрыманых ад дзейнасці бюджэтных арганізацый, якая прыносіць даходы, уласных сродкаў іншых арганізацый, іншых крыніц, не забароненых заканадаўствам.

У выпадку калі арганізацыя, якая ўдзельнічае ў рэалізацыі адукацыйнай праграмы праз сеткавую форму ўзаемадзеяння, з'яўляецца дзяржаўнай установай адукацыі, то фінансаванне яе выдаткаў на навучэнцаў, якія атрымліваюць адукацыю як за кошт сродкаў рэспубліканскага, так і за кошт сродкаў мясцовых бюджэтаў, ажыццяўляецца за кошт сродкаў бюджэту, з якога гэтай установе выдзяляюцца сродкі на яе функцыянаванне.

Фінансаванне выдаткаў дзяржаўнай установы вышэйшай або сярэдняй спецыяльнай адукацыі пры навучанні грамадзян па праграмах падрыхтоўкі малодшых камандзіраў і праграмах падрыхтоўкі афіцэраў запасу ажыццяўляецца за кошт сродкаў рэспубліканскага або мясцовага бюджэту, з якога гэтай установе адукацыі выдзяляюцца сродкі на функцыянаванне.

Пры гэтым дзяржаўныя ўстановы вышэйшай або сярэдняй спецыяльнай адукацыі ажыццяўляюць навучанне грамадзян па праграмах падрыхтоўкі малодшых камандзіраў і праграмах падрыхтоўкі афіцэраў запасу з ліку асоб, якія вучацца як за кошт сродкаў рэспубліканскага або мясцовых бюджэтаў, так і на платнай аснове, у тым ліку ў прыватных установах вышэйшай або сярэдняй спецыяльнай адукацыі.

6. Фінансаванне выдаткаў на правядзенне цэнтралізаванага экзамену ва ўстановах адукацыі ажыццяўляецца за кошт сродкаў рэспубліканскага і (або) мясцовых бюджэтаў, з якіх гэтым установам адукацыі выдзяляюцца сродкі на іх функцыянаванне.

**Артыкул 130. Дзейнасць устаноў адукацыі, якая прыносіць даходы**

1. Установы адукацыі могуць ажыццяўляць дзейнасць, якая прыносіць даходы, у адпаведнасці з актамі заканадаўства.

2. Ажыццяўленне дзяржаўнымі ўстановамі адукацыі дзейнасці, якая прыносіць даходы, не цягне зніжэння іх фінансавання за кошт сродкаў рэспубліканскага і (або) мясцовых бюджэтаў.

3. Сродкі, атрыманыя ўстановамі адукацыі ад дзейнасці, якая прыносіць даходы, паступаюць у іх самастойнае распараджэнне і выдаткоўваюцца ў адпаведнасці з актамі заканадаўства і іх статутамі, калі іншае не ўстаноўлена Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

4. Забараняецца ўстанаўліваць установам адукацыі нарматывы па ажыццяўленні дзейнасці, якая прыносіць даходы.

5. Дзейнасць, якая прыносіць даходы пры аказанні ўстановамі адукацыі платных паслуг, у тым ліку шляхам рэалізацыі адукацыйных праграм на платнай аснове, ажыццяўляецца ў адпаведнасці з заканадаўствам.

6. Рэалізацыя адукацыйнай праграмы, якая ажыццяўляецца ў рамках адукацыйнай дзейнасці і фінансуецца за кошт сродкаў рэспубліканскага і (або) мясцовых бюджэтаў, не можа замяняцца поўнасцю або часткова платнай паслугай, акрамя выпадкаў, устаноўленых часткай другой пункта 5 артыкула 81 і часткай другой пункта 4 артыкула 85 гэтага Кодэкса.

## ГЛАВА 17
## МАТЭРЫЯЛЬНА-ТЭХНІЧНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ Ў СФЕРЫ АДУКАЦЫІ

### Артыкул 131. Матэрыяльна-тэхнічная база ўстаноў адукацыі

1. Матэрыяльна-тэхнічная база ўстаноў адукацыі фарміруецца заснавальнікамі, калі іншае не ўстаноўлена гэтым Кодэксам, у адпаведнасці з патрабаваннямі, устаноўленымі актамі заканадаўства.

2. Матэрыяльна-тэхнічную базу ўстаноў адукацыі складаюць зямельныя ўчасткі, капітальныя пабудовы (будынкі, збудаванні), абсталяванне, транспартныя сродкі і іншая маёмасць.

3. Ва ўстанове адукацыі павінны быць:

3.1. памяшканні, кабінеты, лабараторыі, майстэрні, пляцоўкі, забяспечаныя мэбляй, інвентаром, сродкамі навучання і выхавання, неабходнымі для арганізацыі адукацыйнага працэсу;

3.2. памяшканні для заняткаў фізічнай культурай і спортам;

3.3. памяшканне медыцынскага прызначэння;

3.4. іншая маёмасць у адпаведнасці з санітарна-эпідэміялагічнымі патрабаваннямі.

4. Да сродкаў навучання і выхавання адносяцца прыборы, абсталяванне, уключаючы вучэбна-лабараторнае, вучэбна-вытворчае, спартыўнае абсталяванне і інвентар, інструменты, у тым ліку музычныя, вучэбныя выданні, камп'ютары, інфармацыйна-тэлекамунікацыйныя сеткі, апаратна-праграмныя і аўдыявізуальныя сродкі, друкаваныя і электронныя адукацыйныя і інфармацыйныя рэсурсы і іншыя матэрыяльныя аб'екты, неабходныя для арганізацыі адукацыйнага працэсу.

Набыццё і пастаўка сродкаў навучання і выхавання для аснашчэння ўстаноў адукацыі, якія фінансуюцца за кошт сродкаў мясцовых бюджэтаў, для забеспячэння рэалізацыі адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі, адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі, адукацыйных праграм спецыяльнай адукацыі, адукацыйных праграм прафесійна-тэхнічнай адукацыі, адукацыйных праграм сярэдняй спецыяльнай адукацыі могуць ажыццяўляцца за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту, іншых крыніц, не забароненых актамі заканадаўства, у рамках дзяржаўнай праграмы развіцця сістэмы адукацыі.

5. Ва ўстанове вышэйшай адукацыі павінен быць інтэрнат.

6. Для арганізацыі адукацыйнага працэсу, у тым ліку праходжання практыкі, вытворчага навучання, можа выкарыстоўвацца матэрыяльна-тэхнічная база арганізацый – заказчыкаў кадраў, а таксама іншых арганізацый.

7. Забараняюцца дзеянні (бяздзейнасць), якія прыводзяць да неабгрунтаванага скарачэння або пагаршэння матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстаноў адукацыі.

**Артыкул 132. Развіццё матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстаноў адукацыі**

1. Заснавальнікі ўстаноў адукацыі забяспечваюць абнаўленне і развіццё матэрыяльна-тэхнічнай базы гэтых устаноў адукацыі.

2. Дзяржава падтрымлівае і развівае выдавецкую, паліграфічную дзейнасць, накіраваную на ўдасканаленне навукова-метадычнага забеспячэння адукацыі.

3. Развіццё матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстаноў адукацыі ажыццяўляецца з улікам дзяржаўнай праграмы развіцця сістэмы адукацыі, іншых дзяржаўных праграм, рэгіянальных комплексаў мерапрыемстваў, якія забяспечваюць рэалізацыю дзяржаўных праграм, патрэб асобы, грамадства і дзяржавы ў павышэнні якасці адукацыі.

# АСАБЛІВАЯ ЧАСТКА

# РАЗДЗЕЛ VII
# ДАШКОЛЬНАЯ АДУКАЦЫЯ

## ГЛАВА 18
## СІСТЭМА ДАШКОЛЬНАЙ АДУКАЦЫІ

**Артыкул 133. Сістэма дашкольнай адукацыі**

1. Дашкольная адукацыя – узровень асноўнай адукацыі, накіраваны на рознабаковае развіццё асобы дзіцяці ранняга і дашкольнага ўзросту ў адпаведнасці з яго ўзроставымі і індывідуальнымі магчымасцямі, здольнасцямі і патрэбамі, фарміраванне ў яго духоўных нормаў, кампетэнцый, неабходных для набыцця сацыяльнага вопыту, падрыхтоўкі да працягу адукацыі, аздараўленне дзіцяці.

2. Ранні ўзрост – пачатковы этап фізічнага, псіхічнага і сацыяльнага развіцця асобы дзіцяці ад двух месяцаў да трох гадоў.

3. Дашкольны ўзрост – этап фізічнага, псіхічнага і сацыяльнага развіцця асобы дзіцяці ад трох гадоў да прыёму (залічэння) яго ва ўстанову адукацыі для атрымання агульнай сярэдняй або спецыяльнай адукацыі.

4. Сістэма дашкольнай адукацыі ўключае ў сябе:

4.1. удзельнікаў адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі;

4.2. адукацыйную праграму дашкольнай адукацыі;

4.3. установы дашкольнай адукацыі;

4.4. іншыя ўстановы адукацыі, што рэалізуюць адукацыйную праграму дашкольнай адукацыі;

4.5. іншыя арганізацыі, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, якія рэалізуюць адукацыйную праграму дашкольнай адукацыі;

4.6. індывідуальных прадпрымальнікаў, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, якія рэалізуюць адукацыйную праграму дашкольнай адукацыі;

4.7. дзяржаўныя арганізацыі адукацыі, якія забяспечваюць функцыянаванне сістэмы адукацыі;

4.8. арганізацыі, якія ўдзельнічаюць у рэалізацыі адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі праз сеткавую форму ўзаемадзеяння;

4.9. рэспубліканскія органы дзяржаўнага кіравання, іншыя арганізацыі, падпарадкаваныя Ураду Рэспублікі Беларусь, мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы, іншыя арганізацыі ў межах іх паўнамоцтваў у сферы дашкольнай адукацыі.

**Артыкул 134. Адукацыйная праграма дашкольнай адукацыі**

1. Адукацыйная праграма дашкольнай адукацыі рэалізуецца ў дзённай форме атрымання адукацыі.

2. Адукацыйная праграма дашкольнай адукацыі рэалізуецца ва ўстановах дашкольнай адукацыі, сацыяльна-педагагічных установах, школах-інтэрнатах для дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекавання бацькоў, а таксама можа быць рэалізавана пачатковымі школамі, базавымі школамі, сярэднімі школамі, універсітэтамі, акадэміямі (кансерваторыямі), іншымі арганізацыямі, індывідуальнымі прадпрымальнікамі, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць. Умовы рэалізацыі адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі ўніверсітэтамі, акадэміямі (кансерваторыямі) вызначаюцца гэтым Кодэксам.

Для арганізацыі адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі ва ўстановах адукацыі, акрамя ўстаноў дашкольнай адукацыі, і іншых арганізацыях, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, у якасці структурнага падраздзялення можа стварацца яслі-сад, а пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі і ажыццяўленні аздараўлення дзяцей ранняга і дашкольнага ўзросту – санаторны яслі-сад.

**Артыкул 135. Адукацыйны стандарт дашкольнай адукацыі**

1. Адукацыйны стандарт дашкольнай адукацыі ўстанаўлівае патрабаванні да вынікаў засваення зместу адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі, зместу вучэбна-праграмнай дакументацыі адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі, тэрмінаў атрымання адукацыі, арганізацыі адукацыйнага працэсу. Патрабаванні да вынікаў засваення зместу адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі ўключаюць у сябе фарміруемыя кампетэнцыі выхаванцаў.

2. Распрацоўку адукацыйнага стандарту дашкольнай адукацыі арганізуе і ажыццяўляе Міністэрства адукацыі сумесна з арганізацыямі, што ажыццяўляюць навукова-метадычнае забеспячэнне дашкольнай адукацыі.

3. Адукацыйны стандарт дашкольнай адукацыі зацвярджаецца Міністэрствам адукацыі.

**Артыкул 136. Тэрмін атрымання дашкольнай адукацыі**

Тэрмін атрымання дашкольнай адукацыі вызначаецца законнымі прадстаўнікамі выхаванцаў. Пры гэтым тэрмін засваення зместу адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі складае да пяці гадоў дзесяці месяцаў і можа быць павялічаны на адзін год па жаданні законных прадстаўнікоў выхаванцаў.

**Артыкул 137. Установы дашкольнай адукацыі**

1. Установа дашкольнай адукацыі – установа адукацыі, якая рэалізуе адукацыйную праграму дашкольнай адукацыі, можа рэалізоўваць адукацыйную праграму спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі, адукацыйную праграму спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю, адукацыйную праграму дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі і ажыццяўляць аздараўленне выхаванцаў.

2. Установы дашкольнай адукацыі могуць быць наступных відаў:

2.1. дзіцячы сад;

2.2. санаторны дзіцячы сад;

2.3. дашкольны цэнтр развіцця дзіцяці.

3. Дзіцячы сад – установа дашкольнай адукацыі, якая рэалізуе адукацыйную праграму дашкольнай адукацыі, можа рэалізоўваць адукацыйную праграму спецыяльнай адукацыі на

ўзроўні дашкольнай адукацыі, адукацыйную праграму спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю, адукацыйную праграму дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі па адным або некалькіх профілях з вывучэннем адукацыйных галін на базавым узроўні і ажыццяўляць аздараўленне выхаванцаў.

4. Санаторны дзіцячы сад – установа дашкольнай адукацыі, якая рэалізуе адукацыйную праграму дашкольнай адукацыі, ажыццяўляе аздараўленне выхаванцаў і можа рэалізоўваць адукацыйную праграму спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі, адукацыйную праграму спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю, адукацыйную праграму дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі па адным або некалькіх профілях з вывучэннем адукацыйных галін на базавым узроўні.

5. Дашкольны цэнтр развіцця дзіцяці – установа дашкольнай адукацыі, якая рэалізуе адукацыйную праграму дашкольнай адукацыі, адукацыйную праграму дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі па некалькіх профілях з вывучэннем адукацыйных галін на павышаным узроўні і можа рэалізоўваць адукацыйную праграму спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі, адукацыйную праграму спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю.

6. Ва ўстанове дашкольнай адукацыі могуць стварацца структурныя падраздзяленні: пункт карэкцыйна-педагагічнай дапамогі, рэсурсны цэнтр, іншыя структурныя падраздзяленні.

**Артыкул 138. Кіраванне ўстановай дашкольнай адукацыі**

1. Непасрэднае кіраўніцтва ўстановай дашкольнай адукацыі ажыццяўляе загадчык.

2. Загадчык установы дашкольнай адукацыі прызначаецца на пасаду і вызваляецца ад пасады заснавальнікам установы дашкольнай адукацыі або ўпаўнаважаным ім органам.

3. Асноўным органам самакіравання ўстановы дашкольнай адукацыі з'яўляецца педагагічны савет, які ўзначальваецца загадчыкам гэтай установы адукацыі.

4. Ва ўстанове дашкольнай адукацыі могуць стварацца апекавальніцкі савет, бацькоўскі камітэт.

## ГЛАВА 19
## АРГАНІЗАЦЫЯ АДУКАЦЫЙНАГА ПРАЦЭСУ ПРЫ РЭАЛІЗАЦЫІ АДУКАЦЫЙНАЙ ПРАГРАМЫ ДАШКОЛЬНАЙ АДУКАЦЫІ

**Артыкул 139. Агульныя патрабаванні да арганізацыі адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі**

1. Адукацыйны працэс пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі можа арганізоўвацца:

1.1. ва ўстановах адукацыі;

1.2. дома;

1.3. у іншых арганізацыях, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць;

1.4. у індывідуальных прадпрымальнікаў, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць;

1.5. у санаторна-курортных і аздараўленчых арганізацыях.

2. Арганізацыя адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі ажыццяўляецца круглагадова з 1 верасня па 31 жніўня.

3. Час знаходжання выхаванцаў ва ўстанове адукацыі, іншай арганізацыі, у індывідуальнага прадпрымальніка, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі вызначаецца заснавальнікам установы адукацыі, іншай арганізацыі, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, індывідуальным прадпрымальнікам, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць,

у адпаведнасці з запытамі законных прадстаўнікоў выхаванцаў і можа складаць ад 2 да 7 гадзін, 10,5 гадзіны, 12 гадзін, 24 гадзіны.

Час знаходжання выхаванца ва ўстанове адукацыі, іншай арганізацыі, у індывідуальнага прадпрымальніка, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі па жаданні яго законнага прадстаўніка можа быць зменшаны.

4. Адукацыйны працэс пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі ажыццяўляецца ў групах або індывідуальна.

Ва ўстановах дашкольнай адукацыі могуць стварацца групы, у якіх вывучаецца мова нацыянальнай меншасці.

Ва ўстановах дашкольнай адукацыі, іншых установах адукацыі, у індывідуальных прадпрымальнікаў, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, якія рэалізуюць адукацыйную праграму дашкольнай адукацыі, могуць стварацца санаторныя групы, іншыя групы, а таксама спецыяльныя групы, санаторныя спецыяльныя групы, групы інтэграванага навучання і выхавання, санаторныя групы інтэграванага навучання і выхавання пры арганізацыі інтэграванага навучання і выхавання.

5. Санаторныя групы – групы, у якіх выхаванцы атрымліваюць дашкольную адукацыю і аздараўленне.

6. Выхаванцы аб’ядноўваюцца ў групы з улікам узросту на 1 верасня адпаведнага навучальнага года:

6.1. першага ранняга ўзросту – да аднаго года;

6.2. другога ранняга ўзросту – ад аднаго года да двух гадоў;

6.3. першую малодшую – ад двух да трох гадоў;

6.4. другую малодшую – ад трох да чатырох гадоў;

6.5. сярэднюю – ад чатырох да пяці гадоў;

6.6. старэйшую – ад пяці да сямі гадоў;

6.7. рознаўзроставую – ад аднаго года да сямі гадоў;

6.8. санаторную першага ранняга ўзросту – да аднаго года;

6.9. санаторную другога ранняга ўзросту – ад аднаго года да двух гадоў;

6.10. санаторную першую малодшую – ад двух да трох гадоў;

6.11. санаторную другую малодшую – ад трох да чатырох гадоў;

6.12. санаторную сярэднюю – ад чатырох да пяці гадоў;

6.13. санаторную старэйшую – ад пяці да сямі гадоў;

6.14. санаторную рознаўзроставую – ад аднаго года да сямі гадоў.

7. Напаўняльнасць груп не павінна перавышаць:

першага ранняга ўзросту – 7 выхаванцаў;

другога ранняга ўзросту – 10 выхаванцаў;

першай малодшай – 15 выхаванцаў;

другой малодшай – 20 выхаванцаў;

сярэдняй – 20 выхаванцаў;

старэйшай – 20 выхаванцаў;

рознаўзроставай – 12 выхаванцаў;

санаторнай першага ранняга ўзросту – 7 выхаванцаў;

санаторнай другога ранняга ўзросту – 10 выхаванцаў;

санаторнай першай малодшай – 10 выхаванцаў;

санаторнай другой малодшай – 15 выхаванцаў;

санаторнай сярэдняй – 15 выхаванцаў;

санаторнай старэйшай – 15 выхаванцаў;

санаторнай рознаўзроставай – 10 выхаванцаў.

Заснавальнік установы адукацыі, іншай арганізацыі, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, якія рэалізуюць адукацыйную праграму дашкольнай адукацыі, індывідуальны прадпрымальнік, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, які рэалізуе адукацыйную

праграму дашкольнай адукацыі, могуць устанаўліваць іншую напаўняльнасць груп пры наяўнасці аб’ектыўных акалічнасцей, выканання санітарна-эпідэміялагічных патрабаванняў у частцы ўмоў размяшчэння і рэжыму адукацыйнага працэсу, у тым ліку нормаў плошчы на аднаго выхаванца ва ўсіх памяшканнях са знаходжаннем выхаванцаў.

8. Напаўняльнасць спецыяльных груп, санаторных спецыяльных груп, груп інтэграванага навучання і выхавання, санаторных груп інтэграванага навучання і выхавання вызначаецца ў адпаведнасці з патрабаваннямі да напаўняльнасці груп, устаноўленымі пунктамі 10–13 і 18 артыкула 273 гэтага Кодэкса.

9. Адукацыйны працэс пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі, адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю ў спецыяльных групах, санаторных спецыяльных групах, групах інтэграванага навучання і выхавання, санаторных групах інтэграванага навучання і выхавання арганізуецца ў адпаведнасці з патрабаваннямі да арганізацыі адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі з улікам асаблівасцей, указаных у главе 59 гэтага Кодэкса.

10. Адукацыйны працэс ажыццяўляецца індывідуальна на падставе рашэння кіраўніка ўстановы адукацыі, іншай арганізацыі, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, індывідуальнага прадпрымальніка, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, якія рэалізуюць адукацыйную праграму дашкольнай адукацыі, у адпаведнасці з індывідуальным вучэбным планам або індывідуальным вучэбным планам і індывідуальнай вучэбнай праграмай для выхаванца з асаблівымі індывідуальнымі адукацыйнымі патрэбамі.

11. Асноўнымі формамі арганізацыі адукацыйнага працэсу з’яўляюцца гульня, заняткі.

12. Ва ўстанове адукацыі, іншай арганізацыі, у індывідуальнага прадпрымальніка, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі ўстанаўліваюцца канікулы, у час якіх заняткі з выхаванцамі не праводзяцца. У час канікул з выхаванцамі праводзяцца мерапрыемствы фізкультурна-аздараўленчай і мастацка-эстэтычнай накіраванасці.

Агульная працягласць канікул складае 112 каляндарных дзён: летнія – 92 каляндарныя дні, зімовыя – 10 каляндарных дзён, веснавыя – 10 каляндарных дзён.

### Артыкул 140. Агульныя патрабаванні да прыёму (залічэння) асоб для атрымання дашкольнай адукацыі

1. Прыём (залічэнне) асобы для атрымання дашкольнай адукацыі ажыццяўляецца на падставе:

1.1. заявы законнага прадстаўніка гэтай асобы;

1.2. медыцынскай даведкі аб стане здароўя;

1.3. накіравання, выдадзенага мясцовым выканаўчым і распарадчым органам па месцы знаходжання ўстановы адукацыі, – для атрымання дашкольнай адукацыі ў дзяржаўных установах адукацыі, прыватных установах адукацыі, што рэалізуюць адукацыйную праграму дашкольнай адукацыі, фінансаванне часткі выдаткаў якіх ажыццяўляецца за кошт сродкаў мясцовых бюджэтаў;

1.4. заключэння ўрачэбна-кансультацыйнай камісіі – для атрымання дашкольнай адукацыі дома, у санаторных дзіцячых садах, санаторных групах устаноў адукацыі, іншых арганізацый, у індывідуальных прадпрымальнікаў, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, якія рэалізуюць адукацыйную праграму дашкольнай адукацыі;

1.5. заключэння дзяржаўнага цэнтра карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі – для асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця.

2. Прыём (залічэнне) асоб для атрымання дашкольнай адукацыі ў частцы, не ўрэгуляванай гэтым Кодэксам, ажыццяўляецца ў адпаведнасці з Палажэннем аб установе дашкольнай адукацыі або яе відзе.

**Артыкул 141. Засваенне зместу адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі дома, у санаторна-курортных і аздараўленчых арганізацыях, спалучэнне заняткаў дома і ва ўстанове адукацыі**

1. Для выхаванцаў, якія па медыцынскіх паказаннях пастаянна не могуць наведваць установы адукацыі, ствараюцца ўмовы для засваення зместу адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі дома.

Пералік медыцынскіх паказанняў для атрымання дашкольнай адукацыі дома вызначаецца Міністэрствам аховы здароўя.

2. Адукацыйны працэс для засваення выхаванцамі зместу адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі дома арганізуецца дзяржаўнай установай адукацыі па месцы жыхарства (месцы знаходжання) выхаванца.

З мэтай сацыялізацыі выхаванца, які засвойвае змест адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі дома, заняткі могуць арганізоўвацца дома або ў спалучэнні заняткаў дома і ва ўстанове адукацыі, што арганізавала навучанне і выхаванне дома.

3. Рашэнне аб засваенні зместу адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі дома прымаецца структурным падраздзяленнем мясцовага выканаўчага і распарадчага органа, што ажыццяўляе дзяржаўна-ўладныя паўнамоцтвы ў сферы адукацыі па месцы жыхарства (месцы знаходжання) выхаванца, на падставе заявы законнага прадстаўніка выхаванца і заключэння ўрачэбна-кансультацыйнай камісіі.

4. Парадак арганізацыі засваення зместу адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі дома ўстанаўліваецца Міністэрствам адукацыі па ўзгадненні з Міністэрствам аховы здароўя.

5. Выхаванцам, якія знаходзяцца ў санаторна-курортных і аздараўленчых арганізацыях і накіраваны ў гэтыя арганізацыі ў складзе арганізаваных груп, ствараюцца ўмовы для навучання і выхавання ў парадку, вызначаным Міністэрствам адукацыі.

6. Адукацыйны працэс у санаторна-курортных і аздараўленчых арганізацыях арганізуецца ўстановамі адукацыі, іншымі арганізацыямі, індывідуальнымі прадпрымальнікамі, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, якія накіроўваюць арганізаваныя групы выхаванцаў.

## ГЛАВА 20
## НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ ДАШКОЛЬНАЙ АДУКАЦЫІ

**Артыкул 142. Сістэма навукова-метадычнага забеспячэння дашкольнай адукацыі**

1. Навукова-метадычнае забеспячэнне дашкольнай адукацыі ўключае ў сябе:

1.1. вучэбна-праграмную дакументацыю адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі;

1.2. праграмна-планавальную дакументацыю выхавання;

1.3. вучэбна-метадычную дакументацыю;

1.4. вучэбныя і іншыя выданні;

1.5. інфармацыйна-аналітычныя матэрыялы;

1.6. метадычныя ўказанні па распрацоўцы вучэбна-праграмнай дакументацыі адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі.

2. Навукова-метадычнае забеспячэнне дашкольнай адукацыі ажыццяўляюць:

2.1. арганізацыі, што ажыццяўляюць навукова-метадычнае забеспячэнне дашкольнай адукацыі;

2.2. установы дашкольнай адукацыі;

2.3. іншыя ўстановы адукацыі, што рэалізуюць адукацыйную праграму дашкольнай адукацыі;

2.4. іншыя арганізацыі, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, якія рэалізуюць адукацыйную праграму дашкольнай адукацыі;

2.5. індывідуальныя прадпрымальнікі, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, якія рэалізуюць адукацыйную праграму дашкольнай адукацыі;

2.6. арганізацыі, якія ўдзельнічаюць у рэалізацыі адукацыйных праграм праз сеткавую форму ўзаемадзеяння;

2.7. рэспубліканскія органы дзяржаўнага кіравання, іншыя арганізацыі, падпарадкаваныя Ураду Рэспублікі Беларусь, мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы, іншыя арганізацыі і фізічныя асобы ў межах іх паўнамоцтваў у сферы дашкольнай адукацыі.

**Артыкул 143. Вучэбна-праграмная дакументацыя адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі**

1. Вучэбна-праграмная дакументацыя адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі ўключае ў сябе вучэбныя планы і вучэбныя праграмы дашкольнай адукацыі.

2. Вучэбныя планы падзяляюцца на:

2.1. тыпавы вучэбны план дашкольнай адукацыі;

2.2. вучэбныя планы ўстаноў адукацыі, іншых арганізацый, індывідуальных прадпрымальнікаў, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, якія рэалізуюць адукацыйную праграму дашкольнай адукацыі;

2.3. эксперыментальныя вучэбныя планы ўстаноў дашкольнай адукацыі;

2.4. індывідуальныя вучэбныя планы.

3. Тыпавы вучэбны план дашкольнай адукацыі з’яўляецца тэхнічным нарматыўным прававым актам і ўстанаўлівае пералік адукацыйных сфер, колькасць вучэбных гадзін на іх вывучэнне па групах выхаванцаў, максімальны дапушчальны аб’ём вучэбнай нагрузкі і агульную колькасць вучэбных гадзін на тыдзень.

Тыпавы вучэбны план дашкольнай адукацыі распрацоўваецца Міністэрствам адукацыі сумесна з арганізацыямі, што ажыццяўляюць навукова-метадычнае забеспячэнне дашкольнай адукацыі, і зацвярджаецца Міністэрствам адукацыі пры наяўнасці заключэння Міністэрства аховы здароўя аб яго адпаведнасці заканадаўству ў сферы санітарна-эпідэміялагічнага дабрабыту насельніцтва.

4. Вучэбны план установы адукацыі, іншай арганізацыі, індывідуальнага прадпрымальніка, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, якія рэалізуюць адукацыйную праграму дашкольнай адукацыі, распрацоўваецца ўстановай адукацыі, іншай арганізацыяй, індывідуальным прадпрымальнікам, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, якія рэалізуюць адукацыйную праграму дашкольнай адукацыі, на аснове тыпавога вучэбнага плана дашкольнай адукацыі, вучэбнай праграмы дашкольнай адукацыі і зацвярджаецца кіраўніком установы адукацыі, іншай арганізацыі, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, індывідуальным прадпрымальнікам, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць.

5. Эксперыментальны вучэбны план установы дашкольнай адукацыі апрабуецца ва ўстанове дашкольнай адукацыі, на базе якой ажыццяўляецца эксперыментальная дзейнасць.

Эксперыментальны вучэбны план установы дашкольнай адукацыі распрацоўваецца Міністэрствам адукацыі сумесна з арганізацыямі, што ажыццяўляюць навукова-метадычнае забеспячэнне дашкольнай адукацыі, і зацвярджаецца Міністэрствам адукацыі.

6. Індывідуальны вучэбны план устанаўлівае асаблівасці атрымання дашкольнай адукацыі выхаванцамі з улікам іх магчымасцей, здольнасцей і патрэб, а таксама выхаванцамі, час знаходжання якіх ва ўстанове адукацыі, іншай арганізацыі, у індывідуальнага прадпрымальніка, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, якія рэалізуюць адукацыйную праграму дашкольнай адукацыі, зменшаны па жаданні іх законных прадстаўнікоў.

Індывідуальны вучэбны план распрацоўваецца ўстановай адукацыі, іншай арганізацыяй, індывідуальным прадпрымальнікам, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, якія рэалізуюць адукацыйную праграму дашкольнай адукацыі, на аснове тыпавога вучэбнага плана дашкольнай адукацыі, індывідуальнай вучэбнай праграмы для выхаванца з асаблівымі індывідуальнымі адукацыйнымі патрэбамі і зацвярджаецца кіраўніком установы адукацыі, іншай арганізацыі, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, індывідуальным прадпрымальнікам, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць.

7. Вучэбныя праграмы падзяляюцца на:

вучэбную праграму дашкольнай адукацыі;

эксперыментальную вучэбную праграму дашкольнай адукацыі;

індывідуальныя вучэбныя праграмы для выхаванцаў з асаблівымі індывідуальнымі адукацыйнымі патрэбамі.

Вучэбная праграма дашкольнай адукацыі з'яўляецца тэхнічным нарматыўным прававым актам і вызначае мэты і задачы вывучэння адукацыйных сфер, іх змест, час на вывучэнне асобных тэм, віды вучэбнай дзейнасці, рэкамендаваныя формы і метады навучання і выхавання.

Вучэбная праграма дашкольнай адукацыі распрацоўваецца Міністэрствам адукацыі сумесна з арганізацыямі, што ажыццяўляюць навукова-метадычнае забеспячэнне дашкольнай адукацыі, і зацвярджаецца Міністэрствам адукацыі.

8. Эксперыментальная вучэбная праграма дашкольнай адукацыі апрабуецца ва ўстанове адукацыі, што рэалізуе адукацыйную праграму дашкольнай адукацыі, на базе якой ажыццяўляецца эксперыментальная дзейнасць.

Эксперыментальная вучэбная праграма дашкольнай адукацыі распрацоўваецца арганізацыяй, што ажыццяўляе навукова-метадычнае забеспячэнне дашкольнай адукацыі, і зацвярджаецца Міністэрствам адукацыі.

9. Індывідуальная вучэбная праграма для выхаванца з асаблівымі індывідуальнымі адукацыйнымі патрэбамі вызначае мэты і задачы вывучэння адукацыйных галін, іх змест, час на вывучэнне асобных тэм, віды вучэбнай дзейнасці, рэкамендаваныя формы і метады навучання і выхавання выхаванцаў з асаблівымі індывідуальнымі адукацыйнымі патрэбамі.

Індывідуальная вучэбная праграма для выхаванца з асаблівымі індывідуальнымі адукацыйнымі патрэбамі распрацоўваецца ўстановай адукацыі, іншай арганізацыяй, індывідуальным прадпрымальнікам, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, якія рэалізуюць адукацыйную праграму дашкольнай адукацыі, на аснове вучэбнай праграмы дашкольнай адукацыі і зацвярджаецца кіраўніком установы адукацыі, іншай арганізацыі, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, індывідуальным прадпрымальнікам, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць.

## РАЗДЗЕЛ VIII
## АГУЛЬНАЯ СЯРЭДНЯЯ АДУКАЦЫЯ

## ГЛАВА 21
## СІСТЭМА АГУЛЬНАЙ СЯРЭДНЯЙ АДУКАЦЫІ

### Артыкул 144. Сістэма агульнай сярэдняй адукацыі

1. Агульная сярэдняя адукацыя – узровень асноўнай адукацыі, накіраваны на духоўна-маральнае і фізічнае развіццё асобы навучэнца, яго індывідуальных здольнасцей; авалоданне навучэнцам асновамі навук, дзяржаўнымі мовамі Рэспублікі Беларусь, навыкамі разумовай і фізічнай працы, самастойнай вучэбнай дзейнасці, неабходнымі для падрыхтоўкі да жыцця ў грамадстве, самастойнага жыццёвага выбару; развіццё інтарэсу да пазнання і творчых здольнасцей, здольнасці да сацыяльнага самавызначэння; фарміраванне маральных перакананняў, культуры паводзін і зносін, эстэтычнага густу,

бяспечнага і здаровага ладу жыцця, кампетэнцый, накіраваных на падрыхтоўку да працягу адукацыі і пачатку працоўнай дзейнасці.

2. Сістэма агульнай сярэдняй адукацыі ўключае ў сябе:

2.1. удзельнікаў адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі;

2.2. адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі;

2.3. установы агульнай сярэдняй адукацыі;

2.4. іншыя ўстановы адукацыі, што рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі;

2.5. дзяржаўныя арганізацыі адукацыі, якія забяспечваюць функцыянаванне сістэмы адукацыі;

2.6. вучэбна-метадычныя аб’яднанні ў сферы агульнай сярэдняй адукацыі;

2.7. арганізацыі, якія ўдзельнічаюць у рэалізацыі адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі праз сеткавую форму ўзаемадзеяння;

2.8. рэспубліканскія органы дзяржаўнага кіравання, іншыя арганізацыі, падпарадкаваныя Ураду Рэспублікі Беларусь, мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы, іншыя арганізацыі ў межах іх паўнамоцтваў у сферы агульнай сярэдняй адукацыі.

3. Агульная сярэдняя адукацыя ўключае ў сябе тры ступені:

I ступень – пачатковая адукацыя (I–IV класы);

II ступень – базавая адукацыя (V–IX класы);

III ступень – сярэдняя адукацыя (X–XI класы, вячэрнія класы ў сярэдняй школе – X–XII класы).

I і II ступені агульнай сярэдняй адукацыі складаюць агульную базавую адукацыю.

I, II і III ступені агульнай сярэдняй адукацыі складаюць агульную сярэднюю адукацыю.

4. На I ступені агульнай сярэдняй адукацыі рэалізуецца адукацыйная праграма пачатковай адукацыі, засваенне зместу якой з’яўляецца абавязковым.

Пачатковая адукацыя дае права на працяг адукацыі на II ступені агульнай сярэдняй адукацыі.

5. На II ступені агульнай сярэдняй адукацыі рэалізуецца адукацыйная праграма базавай адукацыі, засваенне зместу якой з’яўляецца абавязковым.

Агульная базавая адукацыя дае права на працяг адукацыі на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі, а таксама на ўзроўнях прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі.

Асобы, якія атрымалі агульную базавую адукацыю і не дасягнулі ўзросту васямнаццаці гадоў, маюць права на працяг адукацыі на ўзроўні прафесійна-тэхнічнай адукацыі па адукацыйных праграмах, указаных у падпунктах 1.3 і 1.4 пункта 1 артыкула 167 гэтага Кодэкса.

6. На III ступені агульнай сярэдняй адукацыі рэалізуецца адукацыйная праграма сярэдняй адукацыі, засваенне зместу якой з’яўляецца абавязковым.

Агульная сярэдняя адукацыя дае права на працяг адукацыі на ўзроўнях прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай, вышэйшай адукацыі.

7. Патрабаванне абавязковасці агульнай сярэдняй адукацыі захоўваецца да дасягнення асобай узросту васямнаццаці гадоў, а таксама для асоб, якія дасягнулі такога ўзросту і засвойваюць змест адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі. Пры гэтым патрабаванне абавязковасці агульнай сярэдняй адукацыі не распаўсюджваецца на асоб, якія засвойваюць змест адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю.

**Артыкул 145. Адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі**

1. Адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі падзяляюцца на:

1.1. адукацыйную праграму пачатковай адукацыі;

1.2. адукацыйную праграму базавай адукацыі;

1.3. адукацыйную праграму сярэдняй адукацыі.

2. Адукацыйная праграма пачатковай адукацыі, адукацыйная праграма базавай адукацыі рэалізуюцца ў дзённай форме атрымання адукацыі. Адукацыйная праграма сярэдняй адукацыі рэалізуецца ў вочнай і завочнай формах атрымання адукацыі. Адукацыйная праграма сярэдняй адукацыі ў вячэрняй і завочнай формах атрымання адукацыі рэалізуецца толькі ў вячэрніх класах у сярэдняй школе.

3. Адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі рэалізуюцца ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі, спецыяльных навучальна-выхаваўчых установах, спецыяльных лячэбна-выхаваўчых установах, адукацыйна-аздараўленчых цэнтрах, а таксама могуць быць рэалізаваны ў філіялах дзяржаўных каледжаў, што знаходзяцца на тэрыторыі папраўчых устаноў крымінальна-выканаўчай сістэмы Міністэрства ўнутраных спраў, рэспубліканскіх унітарных вытворчых прадпрыемстваў, падпарадкаваных Дэпартаменту выканання пакаранняў Міністэрства ўнутраных спраў, лячэбна-працоўных прафілакторыяў Міністэрства ўнутраных спраў, універсітэтах, акадэміях (кансерваторыях). Віды рэалізуемых адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі ва ўказаных установах адукацыі, умовы рэалізацыі адукацыйнай праграмы пачатковай адукацыі, адукацыйнай праграмы базавай адукацыі ва ўніверсітэтах, акадэміях (кансерваторыях) вызначаюцца гэтым Кодэксам.

Ва ўніверсітэтах, акадэміях (кансерваторыях) для арганізацыі адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы пачатковай адукацыі, адукацыйнай праграмы базавай адукацыі, адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі ў якасці структурнага падраздзялення можа стварацца школа, а пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі – ліцэй.

**Артыкул 146. Адукацыйныя стандарты агульнай сярэдняй адукацыі**

1. Адукацыйныя стандарты агульнай сярэдняй адукацыі ўключаюць у сябе:

1.1. адукацыйны стандарт пачатковай адукацыі;

1.2. адукацыйны стандарт базавай адукацыі;

1.3. адукацыйны стандарт сярэдняй адукацыі.

2. Адукацыйны стандарт пачатковай адукацыі, адукацыйны стандарт базавай адукацыі, адукацыйны стандарт сярэдняй адукацыі ўстанаўліваюць патрабаванні да вынікаў засваення адпаведна зместу адукацыйнай праграмы пачатковай адукацыі, адукацыйнай праграмы базавай адукацыі, адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі, зместу вучэбна-праграмнай дакументацыі адпаведнай адукацыйнай праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, арганізацыі адукацыйнага працэсу, максімальна дапушчальнага аб’ёму вучэбнай нагрузкі навучэнцаў. Патрабаванні да вынікаў засваення зместу адпаведнай адукацыйнай праграмы агульнай сярэдняй адукацыі ўключаюць у сябе фарміруемыя кампетэнцыі навучэнцаў.

3. Адукацыйныя стандарты агульнай сярэдняй адукацыі распрацоўваюцца Міністэрствам адукацыі сумесна з арганізацыямі, што ажыццяўляюць навукова-метадычнае забеспячэнне агульнай сярэдняй адукацыі.

4. Адукацыйныя стандарты агульнай сярэдняй адукацыі зацвярджаюцца Міністэрствам адукацыі па ўзгадненні з Міністэрствам аховы здароўя.

**Артыкул 147. Тэрмін атрымання агульнай сярэдняй адукацыі**

1. Тэрмін атрымання:

1.1. пачатковай адукацыі складае чатыры гады;

1.2. агульнай базавай адукацыі складае дзевяць гадоў;

1.3. агульнай сярэдняй адукацыі складае адзінаццаць гадоў (у вячэрніх класах у сярэдняй школе – дванаццаць гадоў).

2. Тэрміны навучання і выхавання на ступенях агульнай сярэдняй адукацыі складаюць на:

2.1. I ступені пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы пачатковай адукацыі чатыры гады;

2.2. II ступені пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы базавай адукацыі пяць гадоў;

2.3. III ступені пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі два гады (у вячэрніх класах у сярэдняй школе тры гады).

**Артыкул 148. Установы агульнай сярэдняй адукацыі**

1. Установа агульнай сярэдняй адукацыі – установа адукацыі, якая рэалізуе адну або некалькі адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі, а таксама можа рэалізоўваць адукацыйную праграму дашкольнай адукацыі, адукацыйную праграму сярэдняй спецыяльнай адукацыі, што забяспечвае атрыманне кваліфікацыі спецыяліста з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, адукацыйныя праграмы спецыяльнай адукацыі, адукацыйную праграму дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, адукацыйную праграму прафесійнай падрыхтоўкі рабочых (служачых), праграму выхавання дзяцей, што маюць патрэбу ў аздараўленні.

2. Установы агульнай сярэдняй адукацыі могуць быць наступных відаў:

2.1. пачатковая школа;

2.2. базавая школа;

2.3. сярэдняя школа;

2.4. гімназія;

2.5. ліцэй;

2.6. спецыялізаваны ліцэй;

2.7. сувораўскае ваеннае вучылішча;

2.8. кадэцкае вучылішча;

2.9. школа-інтэрнат для дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекавання бацькоў;

2.10. санаторная школа-інтэрнат;

2.11. гімназія – каледж мастацтваў;

2.12. вучылішча алімпійскага рэзерву.

3. Пачатковая школа – установа агульнай сярэдняй адукацыі, якая рэалізуе адукацыйную праграму пачатковай адукацыі.

Пачатковая школа таксама можа рэалізоўваць адукацыйную праграму дашкольнай адукацыі, адукацыйныя праграмы спецыяльнай адукацыі, адукацыйную праграму дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, праграму выхавання дзяцей, што маюць патрэбу ў аздараўленні, ствараць умовы для арганізацыі вучэбна-трэніровачнага працэсу з мэтай падрыхтоўкі спартыўнага рэзерву і (або) спартсменаў высокага класа.

4. Базавая школа – установа агульнай сярэдняй адукацыі, якая рэалізуе адукацыйную праграму пачатковай адукацыі, адукацыйную праграму базавай адукацыі і можа забяспечваць вывучэнне асобных вучэбных прадметаў, модуляў на павышаным узроўні пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы базавай адукацыі.

Базавая школа таксама можа рэалізоўваць адукацыйную праграму дашкольнай адукацыі, адукацыйныя праграмы спецыяльнай адукацыі, адукацыйную праграму дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, праграму выхавання дзяцей, што маюць патрэбу ў аздараўленні, ствараць умовы для арганізацыі вучэбна-трэніровачнага працэсу з мэтай падрыхтоўкі спартыўнага рэзерву і (або) спартсменаў высокага класа.

5. Сярэдняя школа – установа агульнай сярэдняй адукацыі, якая рэалізуе адукацыйную праграму пачатковай адукацыі, адукацыйную праграму базавай адукацыі, адукацыйную праграму сярэдняй адукацыі і можа забяспечваць вывучэнне асобных вучэбных прадметаў, модуляў на павышаным узроўні пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы базавай адукацыі, вывучэнне асобных вучэбных прадметаў, модуляў

на павышаным узроўні ў рамках арганізацыі профільнага навучання пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі.

Сярэдняя школа таксама можа рэалізоўваць адукацыйную праграму дашкольнай адукацыі, адукацыйныя праграмы спецыяльнай адукацыі, адукацыйную праграму дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, адукацыйную праграму прафесійнай падрыхтоўкі рабочых (служачых), праграму выхавання дзяцей, што маюць патрэбу ў аздараўленні, ствараць умовы для арганізацыі вучэбна-трэніровачнага працэсу з мэтай падрыхтоўкі спартыўнага рэзерву і (або) спартсменаў высокага класа.

6. Гімназія – установа агульнай сярэдняй адукацыі, якая рэалізуе адукацыйную праграму пачатковай адукацыі, адукацыйную праграму базавай адукацыі, адукацыйную праграму сярэдняй адукацыі з вывучэннем асобных вучэбных прадметаў, модуляў на павышаным узроўні ў рамках арганізацыі профільнага навучання і можа забяспечваць вывучэнне асобных вучэбных прадметаў на павышаным узроўні пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы базавай адукацыі.

Гімназія таксама можа рэалізоўваць адукацыйныя праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі, адукацыйную праграму дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, адукацыйную праграму прафесійнай падрыхтоўкі рабочых (служачых), праграму выхавання дзяцей, што маюць патрэбу ў аздараўленні, ствараць умовы для арганізацыі вучэбна-трэніровачнага працэсу з мэтай падрыхтоўкі спартыўнага рэзерву і (або) спартсменаў высокага класа.

7. Ліцэй – установа агульнай сярэдняй адукацыі, якая рэалізуе адукацыйную праграму сярэдняй адукацыі з вывучэннем асобных вучэбных прадметаў, модуляў на павышаным узроўні ў рамках арганізацыі профільнага навучання, стварае ўмовы для пражывання навучэнцаў.

Ліцэй таксама можа рэалізоўваць адукацыйную праграму спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі, адукацыйную праграму дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, адукацыйную праграму прафесійнай падрыхтоўкі рабочых (служачых), праграму выхавання дзяцей, што маюць патрэбу ў аздараўленні, ствараць умовы для арганізацыі вучэбна-трэніровачнага працэсу з мэтай падрыхтоўкі спартыўнага рэзерву і (або) спартсменаў высокага класа.

8. Спецыялізаваны ліцэй – установа агульнай сярэдняй адукацыі, якая рэалізуе адукацыйную праграму базавай адукацыі, адукацыйную праграму сярэдняй адукацыі з вывучэннем асобных вучэбных прадметаў, модуляў на павышаным узроўні з мэтай падрыхтоўкі навучэнцаў да паступлення ва ўстановы адукацыі для атрымання адукацыі па спецыяльнасцях для воінскіх фарміраванняў і ваенізаваных арганізацый, стварае ўмовы для харчавання і пражывання навучэнцаў і можа забяспечваць вывучэнне асобных вучэбных прадметаў, модуляў на павышаным узроўні пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы базавай адукацыі.

Спецыялізаваны ліцэй таксама можа рэалізоўваць адукацыйную праграму дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, адукацыйную праграму прафесійнай падрыхтоўкі рабочых (служачых), праграму выхавання дзяцей, што маюць патрэбу ў аздараўленні, ствараць умовы для арганізацыі вучэбна-трэніровачнага працэсу з мэтай падрыхтоўкі спартыўнага рэзерву і (або) спартсменаў высокага класа.

Парадак арганізацыі і дзейнасці спецыялізаваных ліцэяў вызначаецца адпаведна Міністэрствам абароны, Дзяржаўным пагранічным камітэтам, Міністэрствам унутраных спраў, Следчым камітэтам, Дзяржаўным камітэтам судовых экспертыз, Міністэрствам па надзвычайных сітуацыях па ўзгадненні з Міністэрствам адукацыі.

9. Сувораўскае ваеннае вучылішча – установа агульнай сярэдняй адукацыі, якая рэалізуе адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі і можа забяспечваць вывучэнне асобных вучэбных прадметаў, модуляў на павышаным узроўні пры рэалізацыі адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі з мэтай падрыхтоўкі непаўналетніх грамадзян Рэспублікі Беларусь мужчынскага полу да паступлення ва ўстановы адукацыі,

што ажыццяўляюць падрыхтоўку кадраў па спецыяльнасцях ваеннага профілю для Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь, а таксама стварае ўмовы для пражывання і харчавання навучэнцаў. Адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі і праграмы выхавання, якія можа рэалізоўваць суվораўскае ваеннае вучылішча, устанаўліваюцца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

Суվораўскае ваеннае вучылішча таксама можа рэалізоўваць адукацыйную праграму дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, праграму выхавання дзяцей, што маюць патрэбу ў аздараўленні.

10. Кадэцкае вучылішча – установа агульнай сярэдняй адукацыі, якая рэалізуе адукацыйную праграму базавай адукацыі, адукацыйную праграму сярэдняй адукацыі, арганізуе вучэбна-трэніровачны працэс з мэтай падрыхтоўкі спартыўнага рэзерву і (або) спартсменаў высокага класа і можа пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы базавай адукацыі, адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі забяспечваць вывучэнне асобных вучэбных прадметаў, модуляў на павышаным узроўні, накіраванае на падрыхтоўку грамадзян да службы ў воінскіх фарміраваннях і ваенізаваных арганізацыях або на паступленне ва ўстановы адукацыі, што ажыццяўляюць падрыхтоўку кадраў па спецыяльнасцях для воінскіх фарміраванняў і ваенізаваных арганізацый, і іншыя ўстановы адукацыі, а таксама стварае ўмовы для пражывання і харчавання навучэнцаў.

Кадэцкае вучылішча таксама можа рэалізоўваць адукацыйную праграму дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, праграму выхавання дзяцей, што маюць патрэбу ў аздараўленні.

11. Школа-інтэрнат для дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекавання бацькоў, – установа агульнай сярэдняй адукацыі, якая рэалізуе адукацыйную праграму пачатковай адукацыі, адукацыйную праграму базавай адукацыі, адукацыйную праграму сярэдняй адукацыі, адукацыйную праграму дашкольнай адукацыі, стварае ўмовы для пражывання, харчавання, рознабаковага развіцця і сацыялізацыі дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекавання бацькоў, ажыццяўляе постынтэрнатнае суправаджэнне выпускнікоў з ліку дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекавання бацькоў, асоб з ліку дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекавання бацькоў.

Школа-інтэрнат для дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекавання бацькоў, таксама можа забяспечваць вывучэнне асобных вучэбных прадметаў, модуляў на павышаным узроўні пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы базавай адукацыі, вывучэнне асобных вучэбных прадметаў, модуляў на павышаным узроўні ў рамках арганізацыі профільнага навучання пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі, рэалізоўваць адукацыйныя праграмы спецыяльнай адукацыі, адукацыйную праграму дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, адукацыйную праграму прафесійнай падрыхтоўкі рабочых (служачых), праграму выхавання дзяцей, што маюць патрэбу ў аздараўленні, ствараць умовы для арганізацыі вучэбна-трэніровачнага працэсу з мэтай падрыхтоўкі спартыўнага рэзерву і (або) спартсменаў высокага класа.

12. Санаторная школа-інтэрнат – установа агульнай сярэдняй адукацыі, якая рэалізуе адукацыйную праграму пачатковай адукацыі, адукацыйную праграму базавай адукацыі, адукацыйную праграму сярэдняй адукацыі, стварае ўмовы для аказання медыцынскай дапамогі, аздараўлення, пражывання і харчавання навучэнцаў.

Санаторная школа-інтэрнат таксама можа рэалізоўваць адукацыйныя праграмы спецыяльнай адукацыі, адукацыйную праграму дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, праграму выхавання дзяцей, што маюць патрэбу ў аздараўленні.

Санаторныя школы-інтэрнаты ствараюцца асобна для дзяцей з захворваннямі касцёва-мышачнай сістэмы і злучальнай тканкі, саматычнай паталогіяй, хворых на туберкулёз і з рызыкай яго развіцця.

13. Гімназія – каледж мастацтваў – установа агульнай сярэдняй адукацыі, якая рэалізуе адукацыйную праграму базавай адукацыі, адукацыйную праграму сярэдняй адукацыі з вывучэннем на павышаным узроўні вучэбных прадметаў, модуляў, змест якіх накіраваны на развіццё здольнасцей навучэнцаў у галіне асобных відаў мастацтва,

адукацыйную праграму сярэдняй спецыяльнай адукацыі, што забяспечвае атрыманне кваліфікацыі спецыяліста з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй.

Гімназія – каледж мастацтваў таксама можа рэалізоўваць адукацыйную праграму пачатковай адукацыі, адукацыйную праграму спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі, адукацыйную праграму дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, праграму выхавання дзяцей, што маюць патрэбу ў аздараўленні.

Для рэалізацыі адукацыйнай праграмы пачатковай адукацыі ў гімназіі – каледжы мастацтваў дадаткова адкрываюцца I–IV класы з вывучэннем вучэбных прадметаў, модуляў, змест якіх накіраваны на развіццё здольнасцей навучэнцаў у галіне асобных відаў мастацтва.

14. Вучылішча алімпійскага рэзерву – установа агульнай сярэдняй адукацыі, якая рэалізуе адукацыйную праграму базавай адукацыі, адукацыйную праграму сярэдняй адукацыі, адукацыйную праграму сярэдняй спецыяльнай адукацыі, што забяспечвае атрыманне кваліфікацыі спецыяліста з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, арганізуе вучэбна-трэніровачны працэс з мэтай падрыхтоўкі спартыўнага рэзерву і (або) спартсменаў высокага класа.

Вучылішча алімпійскага рэзерву таксама можа рэалізоўваць адукацыйную праграму дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, праграму выхавання дзяцей, што маюць патрэбу ў аздараўленні.

15. Ва ўстанове агульнай сярэдняй адукацыі могуць стварацца структурныя падраздзяленні: аддзяленне, цэнтр допрызыўнай падрыхтоўкі, навучальна-вытворчая майстэрня, навучальна-доследная гаспадарка, пункт карэкцыйна-педагагічнай дапамогі, іншыя структурныя падраздзяленні.

### Артыкул 149. Кіраванне ўстановай агульнай сярэдняй адукацыі

1. Непасрэднае кіраўніцтва ўстановай агульнай сярэдняй адукацыі ажыццяўляе яе кіраўнік (дырэктар, начальнік).

2. Кіраўнік установы агульнай сярэдняй адукацыі прызначаецца на пасаду і вызваляецца ад пасады заснавальнікам установы агульнай сярэдняй адукацыі або ўпаўнаважаным ім органам.

3. Асноўным органам самакіравання ўстановы агульнай сярэдняй адукацыі з'яўляецца педагагічны савет, які ўзначальваецца кіраўніком гэтай установы адукацыі.

4. У вучылішчы алімпійскага рэзерву паводле рашэння заснавальніка ствараецца трэнерскі савет. Ва ўстанове агульнай сярэдняй адукацыі могуць стварацца савет, апекавальніцкі савет, бацькоўскі камітэт, вучнёўскі савет.

## ГЛАВА 22
## АРГАНІЗАЦЫЯ АДУКАЦЫЙНАГА ПРАЦЭСУ ПРЫ РЭАЛІЗАЦЫІ АДУКАЦЫЙНЫХ ПРАГРАМ АГУЛЬНАЙ СЯРЭДНЯЙ АДУКАЦЫІ

### Артыкул 150. Агульныя патрабаванні да арганізацыі адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі

1. Адукацыйны працэс пры рэалізацыі адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі можа быць арганізаваны:

1.1. ва ўстановах адукацыі;

1.2. дома;

1.3. у арганізацыях аховы здароўя;

1.4. у санаторна-курортных і аздараўленчых арганізацыях;

1.5. у следчых ізалятарах і папраўчых установах.

2. Адукацыйны працэс пры рэалізацыі адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі арганізуецца па навучальных гадах. Навучальны год дзеліцца на чвэрці. У вячэрніх класах у сярэдняй школе пры завочнай форме атрымання адукацыі ў навучальным годзе арганізуюцца сесіі.

Працягласць навучальнага года, уключаючы канікулы, устанаўліваецца з 1 верасня па 31 жніўня. Вучэбныя заняткі праводзяцца з 1 верасня па 31 мая ўключна, а для навучэнцаў IX і XI (XII) класаў – з 1 верасня па 25 мая. Калі ўказаныя даты прыпадаюць на непрацоўны дзень, то пачатак (заканчэнне) навучальнага года, вучэбных заняткаў пераносіцца на наступны (папярэдні) працоўны дзень.

3. Для навучэнцаў устанаўліваюцца канікулы.

Агульная працягласць канікул у перыяд правядзення вучэбных заняткаў павінна быць не меншай за 30 каляндарных дзён, для навучэнцаў I і II класаў – не меншай за 37 каляндарных дзён.

Працягласць летніх канікул павінна быць не меншай за 12 каляндарных тыдняў. Для дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекавання бацькоў, завяршылі навучанне і выхаванне ў IX класе на II ступені агульнай сярэдняй адукацыі, працягласць летніх канікул павінна быць не меншай за 10 каляндарных тыдняў.

Пачатак і завяршэнне чвэрцей, канікул штогод да пачатку навучальнага года вызначаюцца Міністэрствам адукацыі.

4. Адукацыйны працэс пры рэалізацыі адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі, адукацыйныя мерапрыемствы, а таксама выхаваўчая праца з навучэнцамі ў невучэбны час арганізуюцца ў рэжыме шасцідзённага тыдня, які ўключае ў сябе пяцідзённы навучальны тыдзень і шосты школьны дзень, акрамя арганізацыі адукацыйнага працэсу для навучэнцаў у вучылішчах алімпійскага рэзерву. Вучэбныя заняткі, а таксама факультатыўныя заняткі пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы пачатковай адукацыі праводзяцца ў рэжыме пяцідзённага навучальнага тыдня. Вучэбныя заняткі пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы базавай адукацыі, адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі праводзяцца ў рэжыме пяцідзённага навучальнага тыдня. У рэжыме шасцідзённага тыдня могуць праводзіцца факультатыўныя заняткі ў V–XI (XII) класах і рэалізоўвацца адукацыйная праграма прафесійнай падрыхтоўкі рабочых (служачых) для навучэнцаў X–XI (XII) класаў. У шосты школьны дзень праводзяцца мерапрыемствы па рэалізацыі асноўных напрамкаў выхавання, у тым ліку спартыўна-масавыя, турыстычныя мерапрыемствы, экскурсіі. У шосты школьны дзень таксама могуць праводзіцца вучэбныя заняткі ў V–XI класах гімназій – каледжаў мастацтваў па вучэбных прадметах, модулях, змест якіх накіраваны на развіццё здольнасцей навучэнцаў у галіне асобных відаў мастацтва.

Вучэбныя заняткі ў вучылішчах алімпійскага рэзерву пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы базавай адукацыі, адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі праводзяцца ў рэжыме пяцідзённага навучальнага тыдня і шостага школьнага дня або шасцідзённага навучальнага тыдня.

Выхаваўчая праца ў невучэбны час з навучэнцамі ажыццяўляецца педагагічнымі работнікамі, у тым ліку тымі, якія выконваюць функцыі класнага кіраўніка.

5. Адукацыйны працэс пры рэалізацыі адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі ажыццяўляецца ў класах, групах (пры дзяленні класа на групы або аб’яднанні навучэнцаў паралельных класаў у групы) або індывідуальна.

У клас аб’ядноўваюцца навучэнцы пераважна аднаго ўзросту. У выпадку, калі колькасць навучэнцаў пры прыёме (залічэнні) ва ўстанову адукацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, перавышае ўстаноўленую заснавальнікам установы адукацыі або ўпаўнаважаным ім органам напаўняльнасць класа, ствараецца некалькі класаў (паралельныя класы). Парадак дзялення класаў на групы, аб’яднанні навучэнцаў некалькіх класаў (паралельных класаў) у групы вызначаецца Палажэннем аб установе агульнай сярэдняй адукацыі або яе відзе.

Ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі могуць стварацца класы, у якіх вывучаюцца мова нацыянальнай меншасці, літаратура нацыянальнай меншасці, спецыялізаваныя па спорце класы, класы, у якіх ажыццяўляецца вывучэнне асобных вучэбных прадметаў, модуляў на павышаным узроўні, класы (групы), у якіх ажыццяўляецца вывучэнне асобных вучэбных прадметаў, модуляў на павышаным узроўні ў рамках арганізацыі профільнага навучання, вячэрнія класы ў сярэдняй школе, класы сумеснага навучання і выхавання, іншыя класы, а пры арганізацыі інтэграванага навучання і выхавання – спецыяльныя класы, класы інтэграванага навучання і выхавання.

Спецыялізаваныя па спорце класы – класы, што ствараюцца на I, II і III ступенях агульнай сярэдняй адукацыі, у якіх рэалізуюцца адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі і з мэтай падрыхтоўкі спартыўнага рэзерву і (або) спартсменаў высокага класа для навучэнцаў арганізуецца вучэбна-трэніровачны працэс. Палажэнне аб спецыялізаваных па спорце класах зацвярджаецца Міністэрствам спорту і турызму і Міністэрствам адукацыі.

Пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі ў завочнай форме атрымання адукацыі ў вячэрніх класах у сярэдняй школе падчас сесій праводзяцца вучэбныя заняткі, заняткі, а таксама атэстацыя навучэнцаў. Парадак арганізацыі адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі ў вячэрніх класах у сярэдняй школе ў вячэрняй і завочнай формах атрымання адукацыі вызначаецца Палажэннем аб установе агульнай сярэдняй адукацыі або яе відзе.

Класы сумеснага навучання і выхавання – класы, у якіх асобы з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця сумесна з асобамі, якія не маюць такіх асаблівасцей, засвойваюць змест адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі. Парадак стварэння класаў сумеснага навучання і выхавання, парадак арганізацыі адукацыйнага працэсу ў іх вызначаюцца Палажэннем аб установе агульнай сярэдняй адукацыі або яе відзе.

6. Рашэнне аб напаўняльнасці класаў, у тым ліку класаў сумеснага навучання і выхавання, і колькасці асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця ў іх, акрамя спецыяльных класаў, класаў інтэграванага навучання і выхавання, прымаецца заснавальнікам установы адукацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, або ўпаўнаважаным ім органам з улікам патрэб грамадзян Рэспублікі Беларусь, замежных грамадзян і асоб без грамадзянства, якія маюць роўнае з грамадзянамі Рэспублікі Беларусь права на атрыманне агульнай сярэдняй адукацыі, пражываюць на тэрыторыі, замацаванай за гэтай установай адукацыі, пры выкананні санітарна-эпідэміялагічных патрабаванняў у частцы ўмоў размяшчэння і рэжыму адукацыйнага працэсу, у тым ліку нормаў плошчы на аднаго навучэнца ва ўсіх памяшканнях са знаходжаннем навучэнцаў.

Напаўняльнасць спецыяльных класаў, класаў інтэграванага навучання і выхавання вызначаецца ў адпаведнасці з патрабаваннямі напаўняльнасці класаў, устаноўленымі пунктамі 14, 15 і 18 артыкула 273 гэтага Кодэкса.

7. Адукацыйны працэс пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі, адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю ў спецыяльных класах, класах інтэграванага навучання і выхавання арганізуецца ў адпаведнасці з патрабаваннямі да арганізацыі адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі з улікам асаблівасцей, указаных у главах 59 і 60 гэтага Кодэкса.

8. Ва ўстанове адукацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі і размешчана ў сельскім населеным пункце, ва ўмовах, калі колькасць навучэнцаў у I–IV класах складае пяць чалавек і менш, дапускаецца вывучэнне часткі вучэбных прадметаў адначасова навучэнцамі розных класаў. Парадак аб'яднання навучэнцаў розных класаў для адначасовага вывучэння вучэбных прадметаў і пералік гэтых вучэбных прадметаў вызначаюцца Палажэннем аб установе агульнай сярэдняй адукацыі або яе відзе.

9. Адукацыйны працэс арганізуецца індывідуальна ў выпадках, калі гэта прадугледжана вучэбна-праграмнай дакументацыяй адукацыйных праграм агульнай

сярэдняй адукацыі, а таксама на падставе рашэння кіраўніка ўстановы адукацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, у адпаведнасці з індывідуальным вучэбным планам. Парадак арганізацыі адукацыйнага працэсу індывідуальна вызначаецца Палажэннем аб установе агульнай сярэдняй адукацыі або яе відзе.

10. Арганізацыя адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі можа быць заснавана на дыферэнцыяцыі іх зместу з улікам адукацыйных патрэб і інтарэсаў навучэнцаў, што забяспечвае вывучэнне асобных вучэбных прадметаў, модуляў адпаведнай адукацыйнай праграмы агульнай сярэдняй адукацыі на базавым, павышаным узроўні, у тым ліку ў рамках профільнага навучання.

Базавы ўзровень вывучэння вучэбнага прадмета, модуля – вывучэнне зместу адпаведнага вучэбнага прадмета, модуля, якое з’яўляецца абавязковым у адпаведнасці з навучальнай праграмай па гэтым вучэбным прадмеце, модулі.

Павышаны ўзровень вывучэння вучэбнага прадмета, модуля – вывучэнне зместу адпаведнага вучэбнага прадмета, модуля, якое ўключае ў сябе базавы ўзровень вывучэння гэтага вучэбнага прадмета, модуля з паглыбленнем і (або) пашырэннем яго зместу.

Профільнае навучанне – мэтанакіраваны працэс арганізацыі і стымулявання вучэбнай дзейнасці навучэнцаў на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі на аснове індывідуалізацыі пры вывучэнні вучэбных прадметаў, модуляў, у тым ліку вучэбных прадметаў, модуляў, што вывучаюцца на павышаным узроўні, вучэбных прадметаў, модуляў з прафесійнай арыентацыяй зместу (профільных вучэбных прадметаў, модуляў), правядзенні факультатыўных заняткаў, змест якіх звязаны з пэўным відам прафесійнай дзейнасці (педагагічнай, аграрнай і іншай).

У пачатковых школах, санаторных школах-інтэрнатах, вучылішчах алімпійскага рэзерву, а таксама ў класах інтэграванага навучання і выхавання, класах сумеснага навучання і выхавання, спецыялізаваных па спорце класах, вячэрніх класах у сярэдняй школе вывучэнне вучэбных прадметаў ажыццяўляецца на базавым узроўні.

У базавых школах, сярэдніх школах, школах-інтэрнатах для дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекавання бацькоў, гімназіях можа ажыццяўляцца вывучэнне асобных вучэбных прадметаў, модуляў на павышаным узроўні ў рамках адукацыйнай праграмы базавай адукацыі, а ў сярэдніх школах, школах-інтэрнатах для дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекавання бацькоў, таксама можа ажыццяўляцца вывучэнне асобных вучэбных прадметаў, модуляў на павышаным узроўні ў рамках арганізацыі профільнага навучання пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі. У гімназіях асобныя вучэбныя прадметы, модулі вывучаюцца на павышаным узроўні ў рамках арганізацыі профільнага навучання пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі, а ў гімназіях – каледжах мастацтваў пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы базавай адукацыі, адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі вучэбныя прадметы, модулі, змест якіх накіраваны на развіццё здольнасцей навучэнцаў у галіне асобных відаў мастацтва, вывучаюцца на павышаным узроўні.

У ліцэях асобныя вучэбныя прадметы, модулі вывучаюцца на павышаным узроўні ў рамках арганізацыі профільнага навучання, у спецыялізаваных ліцэях асобныя вучэбныя прадметы, модулі вывучаюцца на павышаным узроўні ў рамках адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі і могуць вывучацца на павышаным узроўні пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы базавай адукацыі.

У кадэцкіх вучылішчах асобныя вучэбныя прадметы, модулі могуць вывучацца на павышаным узроўні пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы базавай адукацыі і адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі.

У суворaўскіх ваенных вучылішчах асобныя вучэбныя прадметы, модулі могуць вывучацца на павышаным узроўні ў рамках адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі.

Ва ўніверсітэтах, акадэміях (кансерваторыях) асобныя вучэбныя прадметы, модулі вывучаюцца на павышаным узроўні ў рамках адукацыйнай праграмы базавай адукацыі, а таксама ў рамках арганізацыі профільнага навучання пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі або вывучаюцца на павышаным узроўні вучэбныя прадметы, модулі, змест якіх накіраваны на развіццё здольнасцей навучэнцаў у галіне асобных відаў мастацтва, у рамках адукацыйнай праграмы базавай адукацыі, адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі.

11. Навучэнцы на медыцынскіх і іншых падставах могуць быць вызвалены ад вывучэння асобных вучэбных прадметаў. Пералік захворванняў, якія з'яўляюцца медыцынскай падставай для вызвалення навучэнцаў ад вывучэння асобных вучэбных прадметаў, вызначаецца Міністэрствам аховы здароўя. Іншыя падставы для вызвалення навучэнцаў ад вывучэння асобных вучэбных прадметаў устанаўліваюцца Міністэрствам адукацыі.

12. Формамі арганізацыі адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі з'яўляюцца вучэбныя заняткі, заняткі. Асноўнай формай арганізацыі адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі з'яўляюцца вучэбныя заняткі. Да вучэбных заняткаў адносяцца ўрок, назіранне, вучэбнае праектаванне, экскурсія, вучэбна-палявыя зборы і іншыя вучэбныя заняткі. Да заняткаў адносяцца факультатыўныя, стымулюючыя, падтрымліваючыя заняткі, кансультацыі (для навучэнцаў вячэрніх класаў у сярэдняй школе, якія засвойваюць змест адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі ў завочнай форме атрымання адукацыі), карэкцыйныя заняткі (для навучэнцаў з ліку асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця), заняткі па фізічнай рэабілітацыі, музычна-рытмічныя заняткі (для навучэнцаў санаторных школ-інтэрнатаў), практычныя заняткі, грамадска карысная праца, што праводзяцца дадаткова да вучэбных заняткаў. Вучэбныя заняткі, заняткі могуць праводзіцца па зменах.

Вучэбнае праектаванне – вучэбныя заняткі, якія прадугледжваюць самастойную дзейнасць навучэнца або групы навучэнцаў для практычнага рашэння навуковай, тэхнічнай, мастацкай, сацыяльнай або іншай значнай праблемы з наступным публічным прадстаўленнем і абмеркаваннем вынікаў.

Вучэбна-палявыя зборы – вучэбныя заняткі, накіраваныя на фарміраванне ўменняў і асноў культуры воінскай службы, неабходных для засваення абавязкаў абаронцы Айчыны.

У адпаведнасці з запытамі навучэнцаў, законных прадстаўнікоў непаўналетніх навучэнцаў і магчымасцямі ўстановы адукацыі факультатыўныя заняткі могуць быць натуральна-матэматычнай, гуманітарнай, грамадазнаўчай, экалагічнай, ваенна-патрыятычнай, музычнай, харэаграфічнай, мастацкай, тэатральнай, прафарыентацыйнай і іншай накіраванасці, а таксама могуць садзейнічаць фізічнаму развіццю навучэнцаў, удасканаленню іх рухальнай актыўнасці.

Стымулюючыя заняткі – заняткі, накіраваныя на развіццё творчых здольнасцей адораных і таленавітых навучэнцаў.

Падтрымліваючыя заняткі – заняткі, накіраваныя на пераадоленне цяжкасцей у вывучэнні вучэбных прадметаў (асобных тэм вучэбных прадметаў) навучэнцамі, якія засвойваюць змест адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі ў вочнай форме атрымання адукацыі.

Заняткі па фізічнай рэабілітацыі – заняткі, накіраваныя на падтрыманне, аднаўленне і (або) паляпшэнне функцыянальнага стану органаў і сістэм арганізма навучэнца.

Музычна-рытмічныя заняткі – заняткі, накіраваныя на развіццё рухальных навыкаў і ўменняў навучэнцаў санаторных школ-інтэрнатаў.

Практычныя заняткі – заняткі, накіраваныя на авалоданне пэўнымі відамі прафесійнай дзейнасці.

Грамадска карысная праца – заняткі, накіраваныя на фарміраванне ў навучэнцаў працоўных уменняў і навыкаў.

Парадак арганізацыі заняткаў, указаных у частцы першай гэтага пункта, вызначаецца Палажэннем аб установе агульнай сярэдняй адукацыі або яе відзе.

13. Пры правядзенні вучэбных заняткаў па вучэбным прадмеце «Фізічная культура і здароўе» клас, як правіла, дзеліцца на групы хлопчыкаў (юнакоў) і дзяўчынак (дзяўчат), напаўняльнасць якіх вызначаецца Палажэннем аб установе агульнай сярэдняй адукацыі або яе відзе.

14. Засваенне зместу адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі асобамі, якія ўтрымліваюцца ў папраўчых установах крымінальна-выканаўчай сістэмы Міністэрства ўнутраных спраў, лячэбна-працоўных прафілакторыях Міністэрства ўнутраных спраў, ажыццяўляецца ў дзяржаўных сярэдніх школах (філіялах дзяржаўных сярэдніх школ), філіялах дзяржаўных каледжаў, што знаходзяцца на тэрыторыі папраўчых устаноў крымінальна-выканаўчай сістэмы Міністэрства ўнутраных спраў, рэспубліканскіх унітарных вытворчых прадпрыемстваў, падпарадкаваных Дэпартаменту выканання пакаранняў Міністэрства ўнутраных спраў, лячэбна-працоўных прафілакторыяў Міністэрства ўнутраных спраў.

15. Ва ўстанове адукацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, у парадку, які вызначаецца гэтай установай адукацыі, праводзяцца адукацыйныя мерапрыемствы (алімпіяды, конкурсы, турніры, фестывалі, семінары, канферэнцыі, іншыя мерапрыемствы) з мэтай выяўлення і падтрымкі адораных і таленавітых навучэнцаў з улікам разнастайнасці іх інтарэсаў і магчымасцей, садзейнічання ўзаемаразуменню і супрацоўніцтву паміж удзельнікамі адукацыйнага працэсу.

16. Ва ўстановах адукацыі, што рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, для аказання дапамогі сям’і ў навучанні і выхаванні навучэнцаў, развіцця ў іх творчых здольнасцей могуць адкрывацца групы прадоўжанага дня для навучэнцаў I–IX класаў, палажэнне аб якіх зацвярджаецца Міністэрствам адукацыі.

Рашэнне аб напаўняльнасці групы прадоўжанага дня ва ўстанове адукацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, прымаецца яе заснавальнікам або ўпаўнаважаным ім органам. Колькасць навучэнцаў у групах прадоўжанага дня не павінна перавышаць напаўняльнасць класаў, якая ўстанаўліваецца ў парадку, які вызначаецца пунктам 6 гэтага артыкула.

**Артыкул 151. Агульныя патрабаванні да прыёму (залічэння) асоб для атрымання агульнай сярэдняй адукацыі ва ўстановах адукацыі**

1. Мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы замацоўваюць за пачатковай школай, базавай школай, сярэдняй школай, гімназіяй (для атрымання агульнай базавай адукацыі) тэрыторыю адпаведнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай (тэрытарыяльнай) адзінкі з мэтай забеспячэння грамадзянам Рэспублікі Беларусь, якія пражываюць на гэтай тэрыторыі, замежным грамадзянам і асобам без грамадзянства, якія маюць роўнае з грамадзянамі Рэспублікі Беларусь права на атрыманне агульнай сярэдняй адукацыі, доступу да яе атрымання.

Пераважнае права пры прыёме (залічэнні) у дзяржаўныя пачатковую школу, базавую школу, сярэднюю школу, гімназію (для атрымання агульнай базавай адукацыі) маюць асобы, што пражываюць на тэрыторыі, за якой замацавана адпаведная ўстанова адукацыі. У прыёме (залічэнні) ва ўстанову адукацыі асобе, што пражывае на тэрыторыі, за якой замацавана гэта ўстанова адукацыі, можа быць адмоўлена толькі з прычыны адсутнасці ў ёй свабоднага месца. Пры наяўнасці свабодных месцаў ва ўстанову адукацыі могуць прымацца (залічвацца) асобы незалежна ад месца іх жыхарства. Тэрміны і парадак прыёму (залічэння) ва ўстановы адукацыі на свабодныя месцы асоб, што не пражываюць на тэрыторыі, за якой замацавана адпаведная ўстанова адукацыі, вызначаюцца Палажэннем аб установе агульнай сярэдняй адукацыі або яе відзе.

У выпадку адсутнасці свабоднага месца ва ўстанове адукацыі асоба, законны прадстаўнік непаўналетняй асобы, што пражываюць на тэрыторыі, за якой замацавана гэта

ўстанова адукацыі, звяртаюцца ў іншую ўстанову адукацыі або структурнае падраздзяленне мясцовага выканаўчага і распарадчага органа, што ажыццяўляе дзяржаўна-ўладныя паўнамоцтвы ў сферы адукацыі на тэрыторыі адміністрацыйна-тэрытарыяльнай (тэрытарыяльнай) адзінкі па месцы пражывання асобы, законнага прадстаўніка непаўналетняй асобы.

2. Прыём (залічэнне) асобы, якая дасягнула ўзросту чатырнаццаці гадоў, ва ўстанову адукацыі для атрымання агульнай сярэдняй адукацыі ажыццяўляецца на падставе яе заявы і са згоды аднаго з яе законных прадстаўнікоў пры прад'яўленні пасведчання аб нараджэнні або дакумента, які сведчыць асобу, медыцынскай даведкі аб стане здароўя, даведкі аб навучанні, калі іншае не вызначана гэтым Кодэксам. Ад імені непаўналетняй асобы заява можа быць пададзена яе законным прадстаўніком. У выпадках, прадугледжаных гэтым артыкулам, калі іншае не вызначана Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, прыём (залічэнне) асобы для засваення зместу адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі ажыццяўляецца таксама па конкурсе на падставе вынікаў:

адбору асоб, здольных дасягнуць высокіх спартыўных вынікаў у асобным відзе спорту, і з улікам стану здароўя;

выніковай атэстацыі па вучэбных прадметах, якія ў адпаведнасці з тыпавым вучэбным планам агульнай сярэдняй адукацыі вывучаюцца на павышаным узроўні ў X і XI класах у рамках арганізацыі профільнага навучання, і сярэдняга бала выніковай атэстацыі ў год прыёму (залічэння);

праверкі здольнасцей у галіне асобных відаў мастацтва;

уступных іспытаў;

уступных іспытаў і з улікам стану здароўя.

Да ўдзелу ў конкурсе ў выпадках, указаных у абзацах трэцім–шостым часткі першай гэтага пункта, не допускаюцца асобы, якія маюць па выніках выніковай атэстацыі ў навучальным годзе, што папярэднічае году прыёму (залічэння), нездавальняючую адзнаку па паводзінах.

3. Прыём (залічэнне) асоб ва ўстанову адукацыі для засваення зместу адукацыйнай праграмы пачатковай адукацыі ажыццяўляецца па дасягненні гэтымі асобамі на пачатак навучальнага года ўзросту шасці гадоў або па жаданні аднаго з законных прадстаўнікоў непаўналетняй асобы з больш позняга ўзросту.

Па заяве аднаго з законных прадстаўнікоў непаўналетняй асобы пры наяўнасці рашэння педагагічнага савета дапускаецца прыём (залічэнне) у I клас асобы, якой шэсць гадоў спаўняецца ў бягучым каляндарным годзе.

4. Прыём (залічэнне) асоб для засваення зместу адукацыйнай праграмы пачатковай адукацыі, адукацыйнай праграмы базавай адукацыі, адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі ў спецыялізаваных па спорце класах устаноў агульнай сярэдняй адукацыі ажыццяўляецца па конкурсе на падставе вынікаў адбору асоб, здольных дасягнуць высокіх спартыўных вынікаў у асобным відзе спорту, пры адсутнасці медыцынскіх проціпаказанняў да занятку відамі спорту, пералік якіх устанаўліваецца Міністэрствам аховы здароўя.

Адбор асоб, здольных дасягнуць высокіх спартыўных вынікаў у асобным відзе спорту, ажыццяўляецца па выніках удзелу ў спартыўных спаборніцтвах і здачы нарматываў па фізічнай і спецыяльнай падрыхтоўцы, якія вызначаюцца вучэбнымі праграмамі па асобных відах спорту.

Парадак прыёму (залічэння) асоб для засваення зместу адукацыйнай праграмы пачатковай адукацыі, адукацыйнай праграмы базавай адукацыі, адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі ў спецыялізаваных па спорце класах устаноў агульнай сярэдняй адукацыі, у тым ліку адбору асоб, здольных дасягнуць высокіх спартыўных вынікаў у асобным відзе спорту, і фарміравання кантынгенту навучэнцаў вызначаецца Палажэннем аб спецыялізаваных па спорце класах, калі іншае не вызначана Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

5. У гімназіі для засваення зместу адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі з вывучэннем асобных вучэбных прадметаў, модуляў на павышаным узроўні ў рамках арганізацыі профільнага навучання прымаюцца (залічваюцца) асобы, якія атрымалі агульную базавую адукацыю.

Прыём (залічэнне) у X клас гімназій ажыццяўляецца ў адпаведнасці з кантрольнымі лічбамі прыёму (у XI клас – пры наяўнасці свабодных месцаў) па конкурсе на падставе вынікаў выніковай атэстацыі па вучэбных прадметах, што выбраны для вывучэння на павышаным узроўні асобамі, якія выказалі жаданне ўдзельнічаць у конкурсе для засваення зместу адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі з вывучэннем асобных вучэбных прадметаў, модуляў на павышаным узроўні ў рамках арганізацыі профільнага навучання ў гэтых гімназіях, і сярэдняга бала выніковай атэстацыі ў год прыёму (залічэння).

Па-за конкурсам пры паступленні ў гімназіі для засваення зместу адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі з вывучэннем асобных вучэбных прадметаў, модуляў на павышаным узроўні ў рамках арганізацыі профільнага навучання залічваюцца пераможцы (дыпломы I, II або III ступені) заключнага этапу рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах, праведзенай Міністэрствам адукацыі ў навучальным годзе, што завяршаецца ў год прыёму (залічэння).

Пераважнае права пры роўнай колькасці балаў на прыём (залічэнне) у гімназіі для засваення зместу адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі з вывучэннем асобных вучэбных прадметаў, модуляў на павышаным узроўні ў рамках арганізацыі профільнага навучання ў парадку пераліку маюць:

пераможцы (дыпломы I, II або III ступені) рэспубліканскіх конкурсаў прац даследчага характару (канферэнцый) навучэнцаў па вучэбных прадметах, праведзеных Міністэрствам адукацыі ў навучальным годзе, што завяршаецца ў год прыёму (залічэння);

пераможцы (дыпломы I, II або III ступені) трэцяга (абласнога, Мінскага гарадскога) этапу рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах, праведзенай Міністэрствам адукацыі ў навучальным годзе, што завяршаецца ў год прыёму (залічэння);

асобы, якія маюць па выніках выніковай атэстацыі ў год прыёму (залічэння) больш высокі сярэдні бал па вучэбных прадметах, што выбраны імі для вывучэння на павышаным узроўні ў рамках арганізацыі профільнага навучання;

асобы, якія маюць больш высокі сярэдні бал па выніках выніковай атэстацыі ў год прыёму (залічэння).

Парадак прыёму (залічэння) асоб для засваення зместу адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі з вывучэннем асобных вучэбных прадметаў, модуляў на павышаным узроўні ў рамках арганізацыі профільнага навучання ў гімназіях, у тым ліку пералік вучэбных прадметаў, па якіх пераможцы заключнага этапу рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах у адпаведнасці з часткай трэцяй гэтага пункта маюць права на прыём (залічэнне) у гімназіі па-за конкурсам, пералік вучэбных прадметаў, па якіх пераможцы адукацыйных мерапрыемстваў па вучэбных прадметах у адпаведнасці з абзацамі другім і трэцім часткі чацвёртай гэтага пункта маюць ільготы на прыём (залічэнне) у гімназіі, тэрміны фарміравання кантынгенту навучэнцаў, пералік дакументаў, што, апрача прадугледжаных пунктам 2 гэтага артыкула, прад'яўляюцца ў прыёмную камісію гімназіі, вызначаюцца Правіламі прыёму асоб для атрымання агульнай сярэдняй адукацыі ў гімназіях.

У гімназіях для арганізацыі прыёму (залічэння) асоб, якія выказалі жаданне ўдзельнічаць у конкурсе для засваення зместу адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі з вывучэннем асобных вучэбных прадметаў, модуляў на павышаным узроўні ў рамках арганізацыі профільнага навучання ў гэтых гімназіях, фарміравання кантынгенту навучэнцаў па выніках конкурсу ствараецца прыёмная камісія, што ўзначальваецца кіраўніком гімназіі або ўпаўнаважанай ім асобай. Прыёмная камісія ажыццяўляе сваю

дзейнасць у адпаведнасці з Палажэннем аб прыёмнай камісіі гімназіі, якое зацвярджаецца Міністэрствам адукацыі.

6. У гімназіі – каледжы мастацтваў, акадэміі (кансерваторыі) для засваення зместу адукацыйнай праграмы базавай адукацыі, адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі з вывучэннем на павышаным узроўні вучэбных прадметаў, модуляў, змест якіх накіраваны на развіццё здольнасцей навучэнцаў у галіне асобных відаў мастацтва, прымаюцца (залічваюцца) асобы, якія атрымалі адпаведна пачатковую, базавую адукацыю.

Прыём (залічэнне) у V і X класы гімназій – каледжаў мастацтваў, акадэмій (кансерваторый) ажыццяўляецца ў адпаведнасці з кантрольнымі лічбамі прыёму, у VI–IX і XI класы – пры наяўнасці свабодных месцаў. Пры наяўнасці свабодных месцаў прыём (залічэнне) можа ажыццяўляцца ў X клас. Прыём (залічэнне) асоб у гімназіі – каледжы мастацтваў, акадэміі (кансерваторыі) для засваення зместу адукацыйнай праграмы базавай адукацыі, адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі з вывучэннем на павышаным узроўні вучэбных прадметаў, модуляў, змест якіх накіраваны на развіццё здольнасцей навучэнцаў у галіне асобных відаў мастацтва, ажыццяўляецца па конкурсе на падставе вынікаў праверкі здольнасцей у галіне асобных відаў мастацтва.

Пераважнае права пры роўнай колькасці балаў на прыём (залічэнне) у гімназіі – каледжы мастацтваў, акадэміі (кансерваторыі) для засваення зместу адукацыйнай праграмы базавай адукацыі, адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі з вывучэннем на павышаным узроўні вучэбных прадметаў, модуляў, змест якіх накіраваны на развіццё здольнасцей навучэнцаў у галіне асобных відаў мастацтва, маюць асобы з больш высокім узроўнем здольнасцей у галіне асобных відаў мастацтва.

Асобы, якія атрымалі агульную базавую адукацыю ў гімназіях – каледжах мастацтваў, акадэміях (кансерваторыях), па іх жаданні могуць працягнуць засваенне зместу адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі з вывучэннем на павышаным узроўні вучэбных прадметаў, модуляў, змест якіх накіраваны на развіццё здольнасцей навучэнцаў у галіне асобных відаў мастацтва, у гімназіях – каледжах мастацтваў, акадэміях (кансерваторыях), у якіх яны атрымалі агульную базавую адукацыю, без праверкі здольнасцей у галіне асобных відаў мастацтва.

Прыём (залічэнне) у I клас гімназій – каледжаў мастацтваў, акадэмій (кансерваторый), што адкрылі для рэалізацыі адукацыйнай праграмы пачатковай адукацыі дадаткова I–IV класы з вывучэннем вучэбных прадметаў, модуляў, змест якіх накіраваны на развіццё здольнасцей навучэнцаў у галіне асобных відаў мастацтва, ажыццяўляецца ў адпаведнасці з кантрольнымі лічбамі прыёму (II–IV класы – пры наяўнасці свабодных месцаў) па конкурсе на падставе вынікаў праверкі здольнасцей у галіне асобных відаў мастацтва з мэтай выяўлення асоб з больш высокім узроўнем здольнасцей у галіне асобных відаў мастацтва.

Парадак прыёму (залічэння) асоб для засваення зместу адукацыйнай праграмы базавай адукацыі, адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі з вывучэннем на павышаным узроўні вучэбных прадметаў, модуляў, змест якіх накіраваны на развіццё здольнасцей навучэнцаў у галіне асобных відаў мастацтва, у гімназіях – каледжах мастацтваў, акадэміях (кансерваторыях), у тым ліку тэрміны і парадак правядзення праверкі здольнасцей у галіне асобных відаў мастацтва, фарміравання кантынгенту навучэнцаў па яе выніках, умовы і парадак прыёму (залічэння) асоб, якія атрымалі агульную базавую адукацыю ў гімназіях – каледжах мастацтваў, акадэміях (кансерваторыях) і жадаюць прадоўжыць засваенне зместу адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі з вывучэннем на павышаным узроўні вучэбных прадметаў, модуляў, змест якіх накіраваны на развіццё здольнасцей навучэнцаў у галіне асобных відаў мастацтва, у гэтых установах адукацыі, а таксама парадак прыёму (залічэння) асоб для атрымання пачатковай адукацыі ў гімназіях – каледжах мастацтваў, акадэміях (кансерваторыях), што адкрылі для рэалізацыі адукацыйнай праграмы пачатковай адукацыі дадаткова I–IV класы з вывучэннем вучэбных прадметаў, модуляў, змест якіх накіраваны на развіццё здольнасцей навучэнцаў у галіне асобных відаў

мастацтва, у тым ліку тэрміны і парадак правядзення праверкі здольнасцей у галіне асобных відаў мастацтва, крытэрыі, у адпаведнасці з якімі ажыццяўляецца выяўленне ўзроўню такіх здольнасцей, а таксама пералік дакументаў, што, апрача прадугледжаных пунктам 2 гэтага артыкула, прад'яўляюцца ў прыёмную камісію ўказаных устаноў адукацыі, вызначаюцца Правіламі прыёму асоб для атрымання агульнай сярэдняй адукацыі ў гімназіях – каледжах мастацтваў, акадэміях (кансерваторыях).

У гімназіях – каледжах мастацтваў, акадэміях (кансерваторыях) для арганізацыі прыёму (залічэння) асоб, якія выказалі жаданне прыняць удзел у конкурсе для засваення зместу адукацыйнай праграмы базавай адукацыі, адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі з вывучэннем на павышаным узроўні вучэбных прадметаў, модуляў, змест якіх накіраваны на развіццё здольнасцей навучэнцаў у галіне асобных відаў мастацтва, або адукацыйнай праграмы пачатковай адукацыі (пры наяўнасці I–IV класаў з вывучэннем вучэбных прадметаў, модуляў, змест якіх накіраваны на развіццё здольнасцей навучэнцаў у галіне асобных відаў мастацтва) у гэтых установах адукацыі, правядзення праверкі здольнасцей у галіне асобных відаў мастацтва (для засваення зместу адукацыйнай праграмы базавай адукацыі, адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі), праверкі здольнасцей у галіне асобных відаў мастацтва (для засваення зместу адукацыйнай праграмы пачатковай адукацыі), фарміравання кантынгенту навучэнцаў па выніках праверкі здольнасцей у галіне асобных відаў мастацтва ствараецца прыёмная камісія, што ўзначальваецца кіраўніком адпаведнай установы адукацыі або ўпаўнаважанай ім асобай. Прыёмная камісія ажыццяўляе сваю дзейнасць у адпаведнасці з Палажэннем аб прыёмнай камісіі гімназіі – каледжа мастацтваў, акадэміі (кансерваторыі), што зацвярджаецца Міністэрствам культуры і Міністэрствам адукацыі.

7. У ліцэі, універсітэты для засваення зместу адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі з вывучэннем асобных вучэбных прадметаў, модуляў на павышаным узроўні ў рамках арганізацыі профільнага навучання прымаюцца (залічваюцца) асобы, якія атрымалі агульную базавую адукацыю.

Прыём (залічэнне) у X клас ліцэяў, універсітэтаў ажыццяўляецца ў адпаведнасці з кантрольнымі лічбамі прыёму (XI клас – пры наяўнасці свабодных месцаў) па конкурсе на падставе вынікаў уступных іспытаў.

Без уступных іспытаў пры паступленні ў ліцэі, універсітэты для засваення зместу адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі з вывучэннем асобных вучэбных прадметаў, модуляў на павышаным узроўні ў рамках арганізацыі профільнага навучання залічваюцца пераможцы (дыпломы I, II або III ступені) міжнародных алімпіяд (у адпаведнасці з пералікам, устаноўленым Міністэрствам адукацыі), заключнага этапу рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах, праведзенай Міністэрствам адукацыі ў навучальным годзе, што завяршаецца ў год прыёму (залічэння), асобы, якія засвоілі змест адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі ў год прыёму (залічэння) і (або) у год, што папярэднічае году прыёму (залічэння), пры наяўнасці рэкамендацыі наглядальнага савета на падставе крытэрыяў, якія вызначаюцца Міністэрствам адукацыі.

Пераважнае права пры роўнай колькасці балаў, набраных на ўступных іспытах, на прыём (залічэнне) у ліцэі, універсітэты для засваення зместу адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі з вывучэннем асобных вучэбных прадметаў, модуляў на павышаным узроўні ў рамках арганізацыі профільнага навучання ў парадку пераліку маюць:

пераможцы (дыпломы I, II або III ступені) трэцяга (абласнога, Мінскага гарадскога) этапу рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах, праведзенай Міністэрствам адукацыі ў навучальным годзе, што завяршаецца ў год прыёму (залічэння);

асобы, якія атрымалі агульную базавую адукацыю ва ўстановах адукацыі, размешчаных у сельскіх населеных пунктах;

асобы, якія маюць па выніках выніковай атэстацыі ў год прыёму (залічэння) больш высокі сярэдні бал;

асобы, якія маюць па выніках выніковай атэстацыі ў год прыёму (залічэння) больш высокі сярэдні бал па вучэбных прадметах, па якіх праводзяцца ўступныя іспыты.

Парадак прыёму (залічэння) асоб у ліцэі, універсітэты для засваення зместу адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі з вывучэннем асобных вучэбных прадметаў, модуляў на павышаным узроўні ў рамках арганізацыі профільнага навучання, у тым ліку пералік вучэбных прадметаў, па якіх праводзяцца ўступныя іспыты, пералік вучэбных прадметаў, па якіх пераможцы заключнага этапу рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах у адпаведнасці з часткай трэцяй гэтага пункта залічваюцца ў ліцэі, універсітэты без уступных іспытаў, і вучэбных прадметаў, па якіх пераможцы трэцяга (абласнога, Мінскага гарадскога) этапу рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах у адпаведнасці з абзацам другім часткі чацвёртай гэтага пункта маюць пераважнае права на прыём (залічэнне) у ліцэі, універсітэты пры роўнай колькасці балаў, набраных на ўступных іспытах, тэрміны і парадак правядзення ўступных іспытаў, фарміравання кантынгенту навучэнцаў, а таксама пералік дакументаў, што, апрача прадугледжаных пунктам 2 гэтага артыкула, прад'яўляюцца ў прыёмную камісію ліцэяў, універсітэтаў, вызначаюцца Правіламі прыёму асоб для атрымання агульнай сярэдняй адукацыі ў ліцэях, універсітэтах. Правіламі прыёму асоб для атрымання агульнай сярэдняй адукацыі ў ліцэях, універсітэтах таксама рэгулюецца парадак прыёму (залічэння) асоб ва ўніверсітэты для засваення зместу адукацыйнай праграмы пачатковай адукацыі, адукацыйнай праграмы базавай адукацыі.

У ліцэях, універсітэтах для арганізацыі прыёму (залічэння) асоб, якія выказалі жаданне ўдзельнічаць у конкурсе для засваення зместу адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі з вывучэннем асобных вучэбных прадметаў, модуляў на павышаным узроўні ў рамках арганізацыі профільнага навучання ў гэтых установах адукацыі, правядзення ўступных іспытаў, фарміравання кантынгенту навучэнцаў па выніках конкурсу ствараецца прыёмная камісія, што ўзначальваецца кіраўніком адпаведнай установы адукацыі або ўпаўнаважанай ім асобай. Прыёмная камісія ажыццяўляе сваю дзейнасць у адпаведнасці з Палажэннем аб прыёмнай камісіі ліцэя, універсітэта.

8. Для засваення зместу адукацыйнай праграмы базавай адукацыі, адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі з вывучэннем асобных вучэбных прадметаў, модуляў на павышаным узроўні ў спецыялізаваных ліцэях з мэтай падрыхтоўкі навучэнцаў да паступлення ва ўстановы адукацыі для атрымання адукацыі па спецыяльнасцях для воінскіх фарміраванняў і ваенізаваных арганізацый прымаюцца (залічваюцца) асобы, якія завяршылі навучанне і выхаванне ў VI класе на II ступені агульнай сярэдняй адукацыі.

Прыём (залічэнне) у VII клас спецыялізаваных ліцэяў для засваення зместу адукацыйнай праграмы базавай адукацыі, адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі з вывучэннем асобных вучэбных прадметаў, модуляў на павышаным узроўні з мэтай падрыхтоўкі навучэнцаў да паступлення ва ўстановы адукацыі для атрымання адукацыі па спецыяльнасцях для воінскіх фарміраванняў і ваенізаваных арганізацый ажыццяўляецца ў адпаведнасці з кантрольнымі лічбамі прыёму, у VIII, IX і X класы – пры наяўнасці свабодных месцаў.

Прыём (залічэнне) асоб у спецыялізаваныя ліцэі для засваення зместу адукацыйнай праграмы базавай адукацыі, адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі з вывучэннем асобных вучэбных прадметаў, модуляў на павышаным узроўні з мэтай падрыхтоўкі навучэнцаў да паступлення ва ўстановы адукацыі для атрымання адукацыі па спецыяльнасцях для воінскіх фарміраванняў і ваенізаваных арганізацый ажыццяўляецца па конкурсе на падставе вынікаў уступных іспытаў і з улікам стану здароўя.

Па-за конкурсам пры ўмове атрымання на ўступных іспытах станоўчых адзнак у спецыялізаваныя ліцэі ў парадку пераліку прымаюцца (залічваюцца):

дзеці-сіроты і дзеці, якія засталіся без апекавання бацькоў;

дзеці асоб, указаных у падпунктах 12.2 і 12.3 пункта 12 артыкула 3 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб дзяржаўных сацыяльных ільготах, правах і гарантыях для асобных катэгорый грамадзян».

Пераважнае права пры роўнай колькасці балаў, набраных на ўступных іспытах, на прыём (залічэнне) у спецыялізаваныя ліцэі ў парадку пераліку маюць:

асобы, якія маюць больш высокі сярэдні бал па выніках выніковай атэстацыі ў год прыёму (залічэння);

асобы, якія маюць больш высокі бал па выніках уступнага іспыту па вучэбным прадмеце, што вызначаецца правіламі прыёму асоб для атрымання агульнай сярэдняй адукацыі ў спецыялізаваных ліцэях, якія зацвярджаюцца ў парадку, што вызначаецца часткай дзявятай гэтага пункта;

асобы, якія пастаянна (пераважна) пражываюць на тэрыторыі радыеактыўнага забруджвання.

Асобы, якія атрымалі агульную базавую адукацыю ў спецыялізаваных ліцэях, па іх жаданні могуць працягнуць засваенне зместу адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі ў гэтых спецыялізаваных ліцэях без здачы ўступных іспытаў і праходжання медыцынскага асведчання.

Парадак прыёму (залічэння) асоб для засваення зместу адукацыйнай праграмы базавай адукацыі, адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі з вывучэннем асобных вучэбных прадметаў, модуляў на павышаным узроўні ў спецыялізаваных ліцэях, у тым ліку пералік вучэбных прадметаў, па якіх праводзяцца ўступныя іспыты, вучэбны прадмет, вынік уступнага іспыту па якім у адпаведнасці з абзацам трэцім часткі пятай гэтага пункта дае пераважнае права на прыём (залічэнне) у спецыялізаваныя ліцэі пры роўнай колькасці балаў, набраных на ўступных іспытах, тэрміны і парадак правядзення ўступных іспытаў, фарміравання кантынгенту навучэнцаў, а таксама парадак прыёму (залічэння) асоб, якія атрымалі агульную базавую адукацыю ў спецыялізаваных ліцэях, для засваення зместу адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі з вывучэннем асобных вучэбных прадметаў, модуляў на павышаным узроўні ў гэтых спецыялізаваных ліцэях, пералік дакументаў, што прад’яўляюцца пры прыёме (залічэнні) у спецыялізаваныя ліцэі, вызначаюцца правіламі прыёму асоб для атрымання агульнай сярэдняй адукацыі ў спецыялізаваных ліцэях, што зацвярджаюцца ў парадку, які вызначаецца часткай дзявятай гэтага пункта.

У спецыялізаваных ліцэях для арганізацыі прыёму (залічэння) асоб, правядзення ўступных іспытаў і фарміравання па іх выніках кантынгенту навучэнцаў ствараецца прыёмная камісія, склад якой зацвярджаецца ў парадку, які вызначаецца часткай дзявятай гэтага пункта.

Правілы прыёму асоб для атрымання агульнай сярэдняй адукацыі ў спецыялізаваных ліцэях, у якіх навучанне і выхаванне накіраваны на падрыхтоўку навучэнцаў да паступлення ва ўстановы адукацыі для атрымання адукацыі па спецыяльнасцях для Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь і транспартных войскаў, зацвярджаюцца Міністэрствам абароны і Міністэрствам адукацыі, а склад прыёмнай камісіі – Міністэрствам абароны. Правілы прыёму асоб для атрымання агульнай сярэдняй адукацыі ў спецыялізаваных ліцэях, у якіх навучанне і выхаванне накіраваны на падрыхтоўку навучэнцаў да паступлення ва ўстановы адукацыі для атрымання адукацыі па спецыяльнасцях для органаў пагранічнай службы, зацвярджаюцца Дзяржаўным пагранічным камітэтам і Міністэрствам адукацыі, а склад прыёмнай камісіі – Дзяржаўным пагранічным камітэтам. Правілы прыёму асоб для атрымання агульнай сярэдняй адукацыі ў спецыялізаваных ліцэях, у якіх навучанне і выхаванне накіраваны на падрыхтоўку навучэнцаў да паступлення ва ўстановы адукацыі для атрымання адукацыі па спецыяльнасцях для органаў унутраных спраў, зацвярджаюцца Міністэрствам унутраных спраў і Міністэрствам адукацыі, а склад прыёмнай камісіі – Міністэрствам унутраных спраў. Правілы прыёму асоб для атрымання агульнай сярэдняй адукацыі ў спецыялізаваных ліцэях, у якіх навучанне і выхаванне накіраваны на падрыхтоўку

навучэнцаў да паступлення ва ўстановы адукацыі для атрымання адукацыі па спецыяльнасцях для Следчага камітэта, зацвярджаюцца Следчым камітэтам і Міністэрствам адукацыі, а склад прыёмнай камісіі – Следчым камітэтам. Правілы прыёму асоб для атрымання агульнай сярэдняй адукацыі ў спецыялізаваных ліцэях, у якіх навучанне і выхаванне накіраваны на падрыхтоўку навучэнцаў да паступлення ва ўстановы адукацыі для атрымання адукацыі па спецыяльнасцях для Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз, зацвярджаюцца Дзяржаўным камітэтам судовых экспертыз і Міністэрствам адукацыі, а склад прыёмнай камісіі – Дзяржаўным камітэтам судовых экспертыз. Правілы прыёму асоб для атрымання агульнай сярэдняй адукацыі ў спецыялізаваных ліцэях, у якіх навучанне і выхаванне накіраваны на падрыхтоўку навучэнцаў да паступлення ва ўстановы адукацыі для атрымання адукацыі па спецыяльнасцях для органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях, зацвярджаюцца Міністэрствам па надзвычайных сітуацыях і Міністэрствам адукацыі, а склад прыёмнай камісіі – Міністэрствам па надзвычайных сітуацыях.

Асобы, якія выказалі жаданне прыняць удзел у конкурсе, асобы, якія прымаюцца (залічваюцца) па-за конкурсам для засваення зместу адукацыйнай праграмы базавай адукацыі, адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі ў спецыялізаваных ліцэях, дапускаюцца да здачы ўступных іспытаў пасля праходжання медыцынскага асведчання.

Медыцынскае асведчанне праводзіцца для вызначэння прыгоднасці асоб па стане здароўя да навучання і выхавання ў спецыялізаваных ліцэях. Пералік медыцынскіх проціпаказанняў да навучання і выхавання ў спецыялізаваных ліцэях вызначаецца адпаведна Міністэрствам абароны, Міністэрствам унутраных спраў, Міністэрствам па надзвычайных сітуацыях, Дзяржаўным пагранічным камітэтам, Следчым камітэтам, Дзяржаўным камітэтам судовых экспертыз па ўзгадненні з Міністэрствам аховы здароўя. Для арганізацыі і правядзення медыцынскага асведчання ў спецыялізаваных ліцэях ствараецца часовая ваенна-ўрачэбная камісія.

Парадак правядзення медыцынскага асведчання, у тым ліку пералік дакументаў, неабходных для праходжання такога асведчання пры прыёме (залічэнні) асоб у спецыялізаваныя ліцэі, у якіх навучанне і выхаванне накіраваны на падрыхтоўку навучэнцаў да паступлення ва ўстановы адукацыі для атрымання адукацыі па спецыяльнасцях для Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь і транспартных войскаў, вызначаецца Міністэрствам абароны і Міністэрствам аховы здароўя, а склад часовай ваенна-ўрачэбнай камісіі, яе правы і абавязкі, парадак стварэння, а таксама парадак афармлення заключэнняў урачоў-спецыялістаў і часовай ваенна-ўрачэбнай камісіі аб прыгоднасці асоб да навучання і выхавання ў гэтых спецыялізаваных ліцэях – Міністэрствам абароны па ўзгадненні з Міністэрствам аховы здароўя. Парадак правядзення медыцынскага асведчання, у тым ліку пералік дакументаў, неабходных для праходжання такога асведчання пры прыёме (залічэнні) асоб у спецыялізаваныя ліцэі, у якіх навучанне і выхаванне накіраваны на падрыхтоўку навучэнцаў да паступлення ва ўстановы адукацыі для атрымання адукацыі па спецыяльнасцях для органаў пагранічнай службы, вызначаецца Дзяржаўным пагранічным камітэтам і Міністэрствам аховы здароўя, а склад часовай ваенна-ўрачэбнай камісіі, яе правы і абавязкі, парадак стварэння, а таксама парадак афармлення заключэнняў урачоў-спецыялістаў і часовай ваенна-ўрачэбнай камісіі аб прыгоднасці асоб да навучання і выхавання ў гэтых спецыялізаваных ліцэях – Дзяржаўным пагранічным камітэтам па ўзгадненні з Міністэрствам аховы здароўя. Парадак правядзення медыцынскага асведчання, у тым ліку пералік дакументаў, неабходных для праходжання такога асведчання пры прыёме (залічэнні) асоб у спецыялізаваныя ліцэі, у якіх навучанне і выхаванне накіраваны на падрыхтоўку навучэнцаў да паступлення ва ўстановы адукацыі для атрымання адукацыі па спецыяльнасцях для органаў унутраных спраў, вызначаецца Міністэрствам унутраных спраў і Міністэрствам аховы здароўя, а склад часовай ваенна-ўрачэбнай камісіі, яе правы і абавязкі, парадак стварэння, а таксама парадак афармлення заключэнняў урачоў-спецыялістаў і часовай ваенна-ўрачэбнай камісіі

аб прыгоднасці асоб да навучання і выхавання ў гэтых спецыялізаваных ліцэях – Міністэрствам унутраных спраў па ўзгадненні з Міністэрствам аховы здароўя. Парадак правядзення медыцынскага асведчання, у тым ліку пералік дакументаў, неабходных для праходжання такога асведчання пры прыёме (залічэнні) асоб у спецыялізаваныя ліцэі, у якіх навучанне і выхаванне накіраваны на падрыхтоўку навучэнцаў да паступлення ва ўстановы адукацыі для атрымання адукацыі па спецыяльнасцях для Следчага камітэта, вызначаецца Следчым камітэтам і Міністэрствам аховы здароўя, а склад часовай ваенна-ўрачэбнай камісіі, яе правы і абавязкі, парадак стварэння, а таксама парадак афармлення заключэнняў урачоў-спецыялістаў і часовай ваенна-ўрачэбнай камісіі аб прыгоднасці асоб да навучання і выхавання ў гэтых спецыялізаваных ліцэях – Следчым камітэтам па ўзгадненні з Міністэрствам аховы здароўя. Парадак правядзення медыцынскага асведчання, у тым ліку пералік дакументаў, неабходных для праходжання такога асведчання пры прыёме (залічэнні) асоб у спецыялізаваныя ліцэі, у якіх навучанне і выхаванне накіраваны на падрыхтоўку навучэнцаў да паступлення ва ўстановы адукацыі для атрымання адукацыі па спецыяльнасцях для Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз, вызначаецца Дзяржаўным камітэтам судовых экспертыз і Міністэрствам аховы здароўя, а склад часовай ваенна-ўрачэбнай камісіі, яе правы і абавязкі, парадак стварэння, а таксама парадак афармлення заключэнняў урачоў-спецыялістаў і часовай ваенна-ўрачэбнай камісіі аб прыгоднасці асоб да навучання і выхавання ў гэтых спецыялізаваных ліцэях – Дзяржаўным камітэтам судовых экспертыз па ўзгадненні з Міністэрствам аховы здароўя. Парадак правядзення медыцынскага асведчання, у тым ліку пералік дакументаў, неабходных для праходжання такога асведчання пры прыёме (залічэнні) асоб у спецыялізаваныя ліцэі, у якіх навучанне і выхаванне накіраваны на падрыхтоўку навучэнцаў да паступлення ва ўстановы адукацыі для атрымання адукацыі па спецыяльнасцях для органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях, вызначаецца Міністэрствам па надзвычайных сітуацыях і Міністэрствам аховы здароўя, а склад часовай ваенна-ўрачэбнай камісіі, яе правы і абавязкі, парадак стварэння, а таксама парадак афармлення заключэнняў урачоў-спецыялістаў і часовай ваенна-ўрачэбнай камісіі аб прыгоднасці асоб да навучання і выхавання ў гэтых спецыялізаваных ліцэях – Міністэрствам па надзвычайных сітуацыях па ўзгадненні з Міністэрствам аховы здароўя.

9. Узрост грамадзян Рэспублікі Беларусь, клас, у якім яны завяршылі навучанне і выхаванне ў год прыёму (залічэння) у суворaўскія ваенныя вучылішчы, а таксама парадак прыёму (залічэння) асоб для атрымання агульнай сярэдняй адукацыі ў суворaўскіх ваенных вучылішчах устанаўліваюцца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

10. У кадэцкія вучылішчы прымаюцца (залічваюцца) асобы, якія завяршылі навучанне і выхаванне ў VII класе на II ступені агульнай сярэдняй адукацыі.

Парадак прыёму (залічэння) асоб для засваення зместу адукацыйнай праграмы базавай адукацыі, адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі ў кадэцкіх вучылішчах устанаўліваецца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

11. У сярэднія школы для засваення зместу адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі прымаюцца (залічваюцца) асобы, якія атрымалі агульную базавую адукацыю.

Прыём (залічэнне) асоб у X клас сярэдніх школ для засваення зместу адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі, адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі з вывучэннем асобных вучэбных прадметаў, модуляў на павышаным узроўні ў рамках арганізацыі профільнага навучання ажыццяўляецца ў адпаведнасці з кантрольнымі лічбамі прыёму, у XI клас – пры наяўнасці свабодных месцаў.

Прыём (залічэнне) асоб для засваення зместу адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі з вывучэннем асобных вучэбных прадметаў, модуляў на павышаным узроўні ў рамках арганізацыі профільнага навучання ў сярэдніх школах ажыццяўляецца на падставе вынікаў выніковай атэстацыі па вучэбных прадметах, што выбраны для вывучэння на павышаным узроўні асобамі, якія выказалі жаданне ўдзельнічаць у конкурсе для засваення зместу адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі з вывучэннем

асобных вучэбных прадметаў, модуляў на павышаным узроўні ў рамках арганізацыі профільнага навучання ва ўказаных установах адукацыі, і сярэдняга бала выніковай атэстацыі ў год прыёму (залічэння).

Па-за конкурсам пры ўмове выканання патрабаванняў часткі трэцяй гэтага пункта пры паступленні ў сярэднія школы для засваення зместу адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі з вывучэннем асобных вучэбных прадметаў, модуляў на павышаным узроўні ў рамках арганізацыі профільнага навучання ў парадку пераліку прымаюцца (залічваюцца):

пераможцы (дыпломы I, II або III ступені) заключнага этапу рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах, праведзенай Міністэрствам адукацыі ў навучальным годзе, што завяршаецца ў год прыёму (залічэння);

пераможцы (дыпломы I, II або III ступені) рэспубліканскіх конкурсаў прац даследчага характару (канферэнцый) навучэнцаў па вучэбных прадметах, праведзеных Міністэрствам адукацыі ў навучальным годзе, што завяршаецца ў год прыёму (залічэння);

пераможцы (дыпломы I, II або III ступені) трэцяга (абласнога, Мінскага гарадскога) этапу рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах, праведзенай Міністэрствам адукацыі ў навучальным годзе, што завяршаецца ў год прыёму (залічэння);

пераможцы (дыпломы I, II або III ступені) другога (раённага, гарадскога) этапу рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах, праведзенай Міністэрствам адукацыі ў навучальным годзе, што завяршаецца ў год прыёму (залічэння).

Пераважнае права пры роўнай колькасці балаў на прыём (залічэнне) у сярэднія школы для засваення зместу адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі з вывучэннем асобных вучэбных прадметаў, модуляў на павышаным узроўні ў рамках арганізацыі профільнага навучання ў парадку пераліку маюць:

асобы, якія маюць па выніках выніковай атэстацыі ў год прыёму (залічэння) больш высокі сярэдні бал;

асобы, якія маюць па выніках выніковай атэстацыі ў год прыёму (залічэння) больш высокі сярэдні бал па вучэбных прадметах, модулях, што выбраны імі для вывучэння на павышаным узроўні ў рамках арганізацыі профільнага навучання.

Парадак прыёму (залічэння) асоб для засваення зместу адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі, адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі з вывучэннем асобных вучэбных прадметаў, модуляў на павышаным узроўні ў рамках арганізацыі профільнага навучання ў сярэдніх школах, у тым ліку ўмовы і парадак допуску да ўдзелу ў конкурсе асоб, якія выказалі жаданне ўдзельнічаць у ім, пералік вучэбных прадметаў, па якіх пераможцы адукацыйных мерапрыемстваў па вучэбных прадметах у адпаведнасці з часткай чацвёртай гэтага пункта маюць права на прыём (залічэнне) ва ўказаныя ўстановы адукацыі па-за конкурсам, тэрміны фарміравання кантынгенту навучэнцаў, пералік дакументаў, што, апрача прадугледжаных пунктам 2 гэтага артыкула, прад'яўляюцца пры прыёме (залічэнні) ва ўказаныя ўстановы адукацыі, вызначаюцца Правіламі прыёму асоб для атрымання агульнай сярэдняй адукацыі ў сярэдніх школах. У сярэдніх школах для арганізацыі прыёму (залічэння) асоб, якія выказалі жаданне ўдзельнічаць у конкурсе для засваення зместу адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі з вывучэннем асобных вучэбных прадметаў, модуляў на павышаным узроўні ў рамках арганізацыі профільнага навучання ва ўказаных установах адукацыі, правядзення конкурсу, фарміравання кантынгенту навучэнцаў па яго выніках ствараецца прыёмная камісія, што ўзначальваецца кіраўніком адпаведнай установы адукацыі або ўпаўнаважанай ім асобай. Прыёмная камісія ажыццяўляе сваю дзейнасць у адпаведнасці з Палажэннем аб прыёмнай камісіі сярэдняй школы, якое зацвярджаецца Міністэрствам адукацыі.

12. У школу-інтэрнат для дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекавання бацькоў, прымаюцца (залічваюцца) дзеці-сіроты і дзеці, якія засталіся без апекавання бацькоў, ва ўзросце ад шасці да васямнаццаці гадоў. Разам са старэйшымі братамі і сёстрамі ў школу-інтэрнат для дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекавання бацькоў, могуць прымацца (залічвацца) дзеці ва ўзросце ад трох гадоў.

Прыём (залічэнне) у школу-інтэрнат для дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекавання бацькоў, ажыццяўляецца на падставе наступных дакументаў:

рашэння мясцовага выканаўчага і распарадчага органа па месцы жыхарства (месцы знаходжання) дзіцяці аб уладкаванні яго на выхаванне ў дзіцячую інтэрнатную ўстанову;

накіравання структурнага падраздзялення абласнога (Мінскага гарадскога) выканаўчага камітэта, што ажыццяўляе дзяржаўна-ўладныя паўнамоцтвы ў сферы адукацыі;

пасведчання аб нараджэнні або іншага дакумента, які сведчыць асобу;

медыцынскай даведкі аб стане здароўя;

даведкі аб навучанні.

Прыём (залічэнне) дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекавання бацькоў, у школу-інтэрнат для дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекавання бацькоў, для засваення зместу адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі з вывучэннем асобных вучэбных прадметаў, модуляў на павышаным узроўні ў рамках арганізацыі профільнага навучання ажыццяўляецца на ўмовах і ў парадку, устаноўленых пунктам 11 гэтага артыкула.

13. У санаторныя школы-інтэрнаты прымаюцца (залічваюцца) дзеці з захворваннямі касцёва-мышачнай сістэмы і злучальнай тканкі, з саматычнай паталогіяй, хворыя на туберкулёз і з рызыкай яго развіцця.

Прыём (залічэнне) асоб у санаторныя школы-інтэрнаты ажыццяўляецца да пачатку навучальнага года (чвэрці). Прыём (залічэнне) асоб у санаторныя школы-інтэрнаты пасля пачатку навучальнага года (чвэрці) ажыццяўляецца пры наяўнасці свабодных месцаў.

Пераважнае права пры прыёме (залічэнні) у санаторныя школы-інтэрнаты ў парадку пераліку маюць:

дзеці-сіроты і дзеці, якія засталіся без апекавання бацькоў;

дзеці, прызнаныя дзецьмі, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы;

дзеці, адзін з бацькоў, усынаўляльнікаў (удачаральнікаў) якіх з’яўляецца інвалідам;

дзеці са шматдзетных сем’яў.

Для прыёму (залічэння) у санаторныя школы-інтэрнаты асобы падаюць, апрача дакументаў, прадугледжаных пунктам 2 гэтага артыкула, наступныя дакументы:

накіраванне структурнага падраздзялення абласнога (Мінскага гарадскога) выканаўчага камітэта, што ажыццяўляе дзяржаўна-ўладныя паўнамоцтвы ў сферы адукацыі;

дакументы, якія пацвярджаюць права асобы на льготы пры прыёме (залічэнні) у санаторную школу-інтэрнат (пры наяўнасці права на льготы).

Накіраванні ў санаторныя школы-інтэрнаты выдаюцца структурным падраздзяленнем абласнога (Мінскага гарадскога) выканаўчага камітэта, што ажыццяўляе дзяржаўна-ўладныя паўнамоцтвы ў сферы адукацыі, на падставе заключэння ўрачэбна-кансультацыйнай камісіі.

14. Прыём (залічэнне) асоб для засваення зместу адукацыйнай праграмы базавай адукацыі, адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі ў вучылішчах алімпійскага рэзерву ажыццяўляецца па конкурсе на падставе вынікаў адбору асоб, здольных дасягнуць высокіх спартыўных вынікаў у асобным відзе спорту, пры адсутнасці медыцынскіх проціпаказанняў да занятку відамі спорту, пералік якіх вызначаецца Міністэрствам аховы здароўя.

Для арганізацыі прыёму (залічэння) асоб для засваення зместу адукацыйнай праграмы базавай адукацыі, адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі, правядзення адбору асоб, здольных дасягнуць высокіх спартыўных вынікаў у асобным відзе спорту, і фарміравання кантынгенту навучэнцаў па яго выніках у вучылішчы алімпійскага рэзерву ствараецца прыёмная камісія.

Парадак прыёму (залічэння) асоб для засваення зместу адукацыйнай праграмы базавай адукацыі, адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі ў вучылішчах алімпійскага

рэзерву, дзейнасці прыёмнай камісіі, тэрміны, парадак і асаблівасці правядзення адбору асоб, здольных дасягнуць высокіх спартыўных вынікаў у асобным відзе спорту, а таксама пералік дакументаў, якія прад'яўляюцца пры прыёме (залічэнні) у вучылішчы алімпійскага рэзерву, вызначаюцца Міністэрствам спорту і турызму і Міністэрствам адукацыі.

15. Вынікі праверкі здольнасцей у галіне асобнага віду мастацтва ў гімназіях – каледжах мастацтваў, акадэміях (кансерваторыях), уступных іспытаў у ліцэях, універсітэтах, спецыялізаваных ліцэях пры прыёме (залічэнні) асоб, якія выказалі жаданне прыняць удзел у конкурсе для атрымання базавай адукацыі, сярэдняй адукацыі ў адпаведнай установе адукацыі, ацэньваюцца адзнакамі па шкале адзнак, што выкарыстоўваецца пры ацэньванні вынікаў вучэбнай дзейнасці навучэнцаў, у адпаведнасці з нормамі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці навучэнцаў па вучэбных прадметах пры засваенні зместу адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі.

16. Прыём (залічэнне) асоб для засваення зместу адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі ў частцы, не ўрэгуляванай гэтым Кодэксам, ажыццяўляецца ў адпаведнасці з Палажэннем аб установе агульнай сярэдняй адукацыі або яе відзе.

### Артыкул 152. Засваенне зместу адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі дома, спалучэнне вучэбных заняткаў дома і ва ўстанове адукацыі

1. Для навучэнцаў, якія па медыцынскіх паказаннях часова або пастаянна не могуць наведваць установы адукацыі, ствараюцца ўмовы для засваення зместу адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі дома.

Пералік медыцынскіх паказанняў для атрымання агульнай сярэдняй адукацыі дома вызначаецца Міністэрствам аховы здароўя.

2. Адукацыйны працэс для засваення навучэнцам зместу адпаведнай адукацыйнай праграмы агульнай сярэдняй адукацыі дома арганізуецца дзяржаўнай установай адукацыі па месцы жыхарства (месцы знаходжання) навучэнца або дзяржаўнай установай адукацыі, у якой ён навучаўся да ўзнікнення медыцынскіх паказанняў для атрымання агульнай сярэдняй адукацыі пры засваенні зместу адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі дома.

З мэтай сацыялізацыі навучэнца, які засвойвае змест адпаведнай адукацыйнай праграмы агульнай сярэдняй адукацыі дома, вучэбныя заняткі могуць арганізоўвацца дома або ў спалучэнні вучэбных заняткаў дома і ва ўстанове адукацыі, што арганізавала навучанне і выхаванне дома.

3. Рашэнне аб засваенні зместу адпаведнай адукацыйнай праграмы агульнай сярэдняй адукацыі дома, арганізацыі вучэбных заняткаў дома або дома і ва ўстанове адукацыі прымаецца структурным падраздзяленнем мясцовага выканаўчага і распарадчага органа, што ажыццяўляе дзяржаўна-ўладныя паўнамоцтвы ў сферы адукацыі па месцы жыхарства (месцы знаходжання) навучэнца, на падставе заявы навучэнца, законнага прадстаўніка непаўналетняга навучэнца і заключэння ўрачэбна-кансультацыйнай камісіі.

4. Парадак арганізацыі засваення зместу адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі дома вызначаецца Міністэрствам адукацыі па ўзгадненні з Міністэрствам аховы здароўя.

### Артыкул 153. Навучанне і выхаванне навучэнцаў у арганізацыях аховы здароўя

1. Навучэнцам, якія засвойваюць змест адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі і якім аказваецца медыцынская дапамога ў стацыянарных умовах у арганізацыях аховы здароўя, ствараюцца ўмовы для навучання і выхавання ў парадку, што вызначаецца Міністэрствам адукацыі па ўзгадненні з Міністэрствам аховы здароўя.

2. Навучанне і выхаванне навучэнцаў у арганізацыі аховы здароўя арганізуюцца ўстановай адукацыі па месцы знаходжання арганізацыі аховы здароўя.

3. Рашэнне аб навучанні і выхаванні навучэнца ў арганізацыі аховы здароўя прымаецца структурным падраздзяленнем мясцовага выканаўчага і распарадчага органа, што ажыццяўляе дзяржаўна-ўладныя паўнамоцтвы ў сферы адукацыі па месцы знаходжання арганізацыі аховы здароўя, на падставе звестак, якія прадастаўляюцца гэтай арганізацыяй аховы здароўя.

**Артыкул 154. Навучанне і выхаванне навучэнцаў у санаторна-курортных і аздараўленчых арганізацыях**

1. Навучэнцам, якія засвойваюць змест адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі і знаходзяцца на лячэнні або аздараўленні ў санаторна-курортных і аздараўленчых арганізацыях, ствараюцца ўмовы для іх навучання і выхавання ў парадку, што вызначаецца Міністэрствам адукацыі.

2. Навучанне і выхаванне навучэнцаў у санаторна-курортных і аздараўленчых арганізацыях арганізуюцца ўстановамі адукацыі па месцы знаходжання гэтых арганізацый. Навучанне і выхаванне навучэнцаў, якія накіроўваюцца ў санаторна-курортныя і аздараўленчыя арганізацыі ў складзе арганізаваных груп, арганізуюцца таксама ўстановамі адукацыі, што накіроўваюць такія групы.

**Артыкул 155. Навучанне і выхаванне навучэнцаў, якія прымаюць удзел у спартыўных мерапрыемствах**

1. Навучэнцам, якія засвойваюць змест адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі і прымаюць удзел у спартыўных мерапрыемствах па-за месцам знаходжання ўстаноў адукацыі, у якіх яны навучаюцца, ствараюцца ўмовы для навучання і выхавання ў выпадках і парадку, што вызначаюцца Міністэрствам адукацыі і Міністэрствам спорту і турызму.

2. Навучанне і выхаванне навучэнцаў у перыяд удзелу іх у спартыўных мерапрыемствах па-за месцам знаходжання ўстаноў адукацыі, у якіх яны навучаюцца, арганізуюцца ўстановамі адукацыі па месцы правядзення спартыўных мерапрыемстваў.

3. Рашэнне аб навучанні і выхаванні навучэнца ва ўстанове адукацыі на перыяд удзелу ў спартыўным мерапрыемстве прымаецца мясцовым выканаўчым і распарадчым органам па месцы правядзення спартыўнага мерапрыемства на падставе звестак, якія прадастаўляюцца арганізатарам спартыўнага мерапрыемства.

**Артыкул 156. Навучанне і выхаванне навучэнцаў, якія засвойваюць змест адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі**

Навучэнцам, якія засвойваюць змест адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі, у перыяд знаходжання іх ва ўстанове дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі ствараюцца ўмовы для навучання і выхавання на II і III ступенях агульнай сярэдняй адукацыі ў парадку, што вызначаецца Міністэрствам адукацыі.

**Артыкул 157. Навучанне і выхаванне навучэнцаў, якія ўтрымліваюцца пад вартай у следчых ізалятарах, пад вартай у папраўчых установах**

1. Навучэнцам, якія засвойваюць змест адукацыйнай праграмы базавай адукацыі, адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі і ўтрымліваюцца пад вартай у следчым ізалятары, пад вартай у папраўчай установе, ствараюцца ўмовы для навучання і выхавання

ў выпадках і парадку, што вызначаюцца Міністэрствам адукацыі, Міністэрствам унутраных спраў, Камітэтам дзяржаўнай бяспекі.

2. Навучанне і выхаванне навучэнцаў, якія ўтрымліваюцца пад вартай у следчым ізалятары, пад вартай у папраўчай установе, арганізуюцца ўстановай адукацыі па месцы знаходжання следчага ізалятара, папраўчай установы.

3. Рашэнне аб навучанні і выхаванні навучэнца, які ўтрымліваецца пад вартай у следчым ізалятары, пад вартай у папраўчай установе, прымаецца структурным падраздзяленнем мясцовага выканаўчага і распарадчага органа, што ажыццяўляе дзяржаўна-ўладныя паўнамоцтвы ў сферы адукацыі па месцы знаходжання следчага ізалятара, папраўчай установы, на падставе звестак, якія прадастаўляюцца гэтымі следчым ізалятарам, папраўчай установай.

## ГЛАВА 23
## АТЭСТАЦЫЯ НАВУЧЭНЦАЎ ПРЫ ЗАСВАЕННІ ЗМЕСТУ АДУКАЦЫЙНЫХ ПРАГРАМ АГУЛЬНАЙ СЯРЭДНЯЙ АДУКАЦЫІ

### Артыкул 158. Агульныя патрабаванні да атэстацыі навучэнцаў пры засваенні зместу адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі

1. Навучэнцы пры засваенні зместу адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі, акрамя экстэрнаў, праходзяць бягучую, прамежкавую і выніковую атэстацыю па вучэбных прадметах, модулях вучэбнага плана ўстановы адукацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі.

2. Экстэрны праходзяць атэстацыю ў парадку экстэрнату.

3. Пры правядзенні прамежкавай і выніковай атэстацыі ажыццяўляецца ацэнка паводзін навучэнцаў, якая выяўляецца наступнымі характарыстыкамі: «прыкладныя», «здавальняючыя», «нездавальняючыя». Крытэрыі ацэнкі паводзін навучэнцаў вызначаюцца Міністэрствам адукацыі.

### Артыкул 159. Атэстацыя экстэрнаў

1. Для праходжання атэстацыі ў парадку экстэрнату прымаюцца асобы:

1.1. якія поўнасцю або часткова самастойна засвоілі змест адукацыйнай праграмы базавай адукацыі, адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі;

1.2. якія поўнасцю або часткова засвоілі змест адукацыйнай праграмы базавай адукацыі, адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі ва ўстанове адукацыі, што не прайшла або не пацвердзіла дзяржаўную акрэдытацыю;

1.3. якія поўнасцю або часткова вывучылі ў адпаведнасці з адукацыйным стандартам сярэдняй адукацыі вучэбныя прадметы, модулі агульнаадукацыйнага кампанента тыпавога вучэбнага плана па спецыяльнасці пры атрыманні прафесійна-тэхнічнай адукацыі з агульнай сярэдняй адукацыяй або тыпавога вучэбнага плана па спецыяльнасці пры атрыманні сярэдняй спецыяльнай адукацыі на аснове агульнай базавай адукацыі ва ўстанове адукацыі, але не атрымалі адпаведнай адукацыі.

2. Экстэрнат – працэдура атэстацыі экстэрна, якая выяўляецца ў выстаўленні экзаменацыйных адзнак па вучэбных прадметах, модулях тыпавога вучэбнага плана базавай школы пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы базавай адукацыі, тыпавога вучэбнага плана сярэдняй школы пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі, па якіх экстэрн здае экзамены, адзнак па выніках праходжання выніковых іспытаў па асобных вучэбных прадметах, модулях і (або) адзнак з даведкі аб навучанні.

3. Рашэнне аб допуску асобы да атэстацыі ў парадку экстэрнату прымаецца структурным падраздзяленнем мясцовага выканаўчага і распарадчага органа, што ажыццяўляе дзяржаўна-ўладныя паўнамоцтвы ў сферы адукацыі па месцы жыхарства (месцы знаходжання) асобы, на падставе яе заявы, заявы законнага прадстаўніка

непаўналетняй асобы пры прад'яўленні пасведчання аб нараджэнні або дакумента, які сведчыць асобу, даведкі аб навучанні (пры наяўнасці), пасведчання аб агульнай базавай адукацыі (пры наяўнасці).

Атэстацыя ў парадку экстэрнату праводзіцца дзяржаўнай установай агульнай сярэдняй адукацыі. Дзяржаўныя ўстановы агульнай сярэдняй адукацыі, якія праводзяць атэстацыю ў парадку экстэрнату, вызначаюцца структурным падраздзяленнем мясцовага выканаўчага і распарадчага органа, што ажыццяўляе дзяржаўна-ўладныя паўнамоцтвы ў сферы адукацыі.

4. Парадак правядзення атэстацыі ў парадку экстэрнату вызначаецца Міністэрствам адукацыі.

### Артыкул 160. Бягучая і прамежкавая атэстацыя навучэнцаў пры засваенні зместу адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі

1. Бягучая атэстацыя праводзіцца на вучэбных занятках з мэтай сістэматычнага кантролю і ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці навучэнцаў у працэсе вывучэння вучэбных прадметаў, модуляў пры засваенні зместу адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі.

2. Прамежкавая атэстацыя праводзіцца па вучэбных прадметах, модулях за чвэрць і (або) паўгоддзе па выніках бягучай атэстацыі.

3. Парадак правядзення бягучай, прамежкавай атэстацыі, у тым ліку нормы ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці навучэнцаў па вучэбных прадметах, модулях пры правядзенні бягучай, прамежкавай атэстацыі, вызначаецца Правіламі правядзення атэстацыі навучэнцаў пры засваенні зместу адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі.

4. Вынікі бягучай і прамежкавай атэстацыі навучэнцаў заносяцца ў класны журнал і дзённік навучэнца. Тыпавыя формы класнага журнала, дзённіка навучэнца і парадак іх вядзення вызначаюцца Міністэрствам адукацыі.

### Артыкул 161. Выніковая атэстацыя навучэнцаў пры засваенні зместу адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі

1. Выніковая атэстацыя праводзіцца па вучэбных прадметах, модулях пасля завяршэння вучэбных заняткаў у навучальным годзе, навучання і выхавання на II і III ступенях агульнай сярэдняй адукацыі.

2. Выніковая атэстацыя пасля завяршэння вучэбных заняткаў у навучальным годзе праводзіцца па выніках прамежкавай атэстацыі.

3. Выніковая атэстацыя пасля завяршэння навучання і выхавання на II ступені агульнай сярэдняй адукацыі праводзіцца па выніках выніковай атэстацыі пасля завяршэння вучэбных заняткаў у навучальным годзе і выніковых іспытаў па асобных вучэбных прадметах, модулях.

Пералік вучэбных прадметаў, модуляў, па якіх праводзяцца выніковыя іспыты пасля завяршэння навучання і выхавання на II ступені агульнай сярэдняй адукацыі, віды, формы і тэрміны правядзення выніковых іспытаў штогод да пачатку навучальнага года ўстанаўліваюцца Міністэрствам адукацыі.

4. Выніковая атэстацыя пасля завяршэння навучання і выхавання на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі праводзіцца па выніках выніковай атэстацыі пасля завяршэння вучэбных заняткаў у навучальным годзе і выніковых іспытаў па асобных вучэбных прадметах, модулях. Выніковыя іспыты па асобных вучэбных прадметах могуць праводзіцца ў выглядзе цэнтралізаванага экзамену.

Пералік вучэбных прадметаў, модуляў, па якіх праводзяцца выніковыя іспыты пасля завяршэння навучання і выхавання на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі, віды, формы і тэрміны правядзення выніковых іспытаў, у тым ліку асноўны і іншы тэрміны, рэзервовыя

дні правядзення цэнтралізаваных экзаменаў, штогод да пачатку навучальнага года ўстанаўліваюцца Міністэрствам адукацыі.

Навучэнцы праходзяць выніковыя іспыты ў выглядзе цэнтралізаванага экзамену ва ўстановах агульнай сярэдняй, сярэдняй спецыяльнай, вышэйшай адукацыі, іншых установах адукацыі, якія вызначаюцца Міністэрствам адукацыі ў якасці пунктаў правядзення цэнтралізаваных экзаменаў.

Парадак арганізацыі і правядзення цэнтралізаваных экзаменаў, у тым ліку ўстановы адукацыі, якія вызначаюцца ў якасці пунктаў правядзення цэнтралізаваных экзаменаў, і ўстановы адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйную праграму сярэдняй адукацыі, што замацоўваюцца за такімі пунктамі, вызначаюцца Міністэрствам адукацыі.

5. Навучэнцы на медыцынскіх падставах могуць быць вызвалены ад выніковых іспытаў пасля завяршэння навучання і выхавання на II ступені агульнай сярэдняй адукацыі. Пералік захворванняў, якія з'яўляюцца медыцынскай падставай для вызвалення навучэнцаў ад выніковых іспытаў пасля завяршэння навучання і выхавання на II ступені агульнай сярэдняй адукацыі, вызначаецца Міністэрствам аховы здароўя.

Навучэнцы могуць быць вызвалены ад выніковых іспытаў пасля завяршэння навучання і выхавання на II і III ступенях агульнай сярэдняй адукацыі па іншых падставах. Іншыя падставы для вызвалення навучэнцаў ад выніковых іспытаў устанаўліваюцца Міністэрствам адукацыі.

Парадак правядзення выніковай атэстацыі навучэнцаў, вызваленых ад выніковых іспытаў, вызначаецца Правіламі правядзення атэстацыі навучэнцаў пры засваенні зместу адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі.

6. Навучэнцам, што маюць станоўчыя вынікі выніковай атэстацыі пасля завяршэння вучэбных заняткаў у навучальным годзе, якія не згодны з гадавой адзнакай, прадастаўляецца права на перагляд гэтай гадавой адзнакі, але не больш чым па двух вучэбных прадметах, модулях.

7. Навучэнцам, за выключэннем тых, якія праходзяць выніковыя іспыты ў выглядзе цэнтралізаванага экзамену, што пражываюць або атрымліваюць адукацыю ў зоне радыеактыўнага забруджвання і выязджаюць у арганізаваным парадку на аздараўленне ў санаторна-курортныя і аздараўленчыя арганізацыі ў тэрміны, устаноўленыя для правядзення выніковых іспытаў, або навучэнцам, якія не могуць прысутнічаць на выніковых іспытах з прычыны захворвання, або навучэнцам, якія не з'явіліся на выніковыя іспыты, або навучэнцам з нездавальняючымі вынікамі выніковай атэстацыі прадастаўляецца права на праходжанне выніковай атэстацыі ў іншыя тэрміны, што вызначаюцца Міністэрствам адукацыі.

Навучэнцам, якія праходзяць выніковыя іспыты ў выглядзе цэнтралізаванага экзамену, што пражываюць або атрымліваюць адукацыю ў зоне радыеактыўнага забруджвання і выязджаюць у арганізаваным парадку на аздараўленне ў санаторна-курортныя і аздараўленчыя арганізацыі ў тэрміны, устаноўленыя для правядзення выніковых іспытаў, або навучэнцам, якія не могуць прысутнічаць на выніковых іспытах з прычыны захворвання, або навучэнцам, якія не з'явіліся на выніковыя іспыты з іншай уважлівай прычыны, прадастаўляецца права на праходжанне выніковай атэстацыі ў выглядзе цэнтралізаванага экзамену ў іншыя тэрміны і рэзервовыя дні правядзення цэнтралізаваных экзаменаў.

8. Выніковая атэстацыя па вучэбных прадметах, модулях, па якіх праводзяцца выніковыя іспыты пасля завяршэння навучання і выхавання на II і III ступенях агульнай сярэдняй адукацыі, ажыццяўляецца экзаменацыйнымі камісіямі, іншымі камісіямі, якія ўдзельнічаюць у правядзенні выніковай атэстацыі.

9. Віды выніковай атэстацыі навучэнцаў пры засваенні зместу адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі, парадак пераводу ў наступны клас, нормы ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці навучэнцаў па вучэбных прадметах, модулях, умовы і парадак допуску навучэнцаў да выніковай атэстацыі пасля завяршэння навучання і выхавання на II і III

ступенях агульнай сярэдняй адукацыі, падставы для вызвалення навучэнцаў ад выніковых іспытаў, прадастаўлення права праходжання выніковай атэстацыі ў іншы тэрмін, парадак перагляду гадавой адзнакі, стварэння і функцыянавання экзаменацыйных камісій, парадак правядзення выніковай атэстацыі ў частцы, не ўрэгуляванай гэтым Кодэксам, вызначаюцца Правіламі правядзення атэстацыі навучэнцаў пры засваенні зместу адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі.

10. Вынікі выніковай атэстацыі навучэнцаў заносяцца ў пратакол выніковых іспытаў, класны журнал, дзённік навучэнца і асабістую картку навучэнца. Тыпавыя формы пратакола выніковых іспытаў, асабістай карткі навучэнца і парадак іх запаўнення (вядзення) вызначаюцца Міністэрствам адукацыі.

## ГЛАВА 24
## НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ АГУЛЬНАЙ СЯРЭДНЯЙ АДУКАЦЫІ

### Артыкул 162. Сістэма навукова-метадычнага забеспячэння агульнай сярэдняй адукацыі

1. Навукова-метадычнае забеспячэнне агульнай сярэдняй адукацыі ўключае ў сябе:

1.1. вучэбна-праграмную дакументацыю адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі;

1.2. праграмна-планавальную дакументацыю выхавання;

1.3. вучэбна-метадычную дакументацыю;

1.4. вучэбныя і іншыя выданні;

1.5. кантрольна-вымяральныя матэрыялы;

1.6. інфармацыйна-аналітычныя матэрыялы;

1.7. метадычныя ўказанні па распрацоўцы вучэбна-праграмнай дакументацыі адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі.

2. Навукова-метадычнае забеспячэнне агульнай сярэдняй адукацыі ажыццяўляюць:

2.1. арганізацыі, што ажыццяўляюць навукова-метадычнае забеспячэнне агульнай сярэдняй адукацыі;

2.2. установы агульнай сярэдняй адукацыі;

2.3. іншыя ўстановы адукацыі, што рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі;

2.4. вучэбна-метадычныя аб’яднанні ў сферы агульнай сярэдняй адукацыі;

2.5. арганізацыі, якія ўдзельнічаюць у рэалізацыі адукацыйных праграм праз сеткавую форму ўзаемадзеяння;

2.6. рэспубліканскія органы дзяржаўнага кіравання, іншыя арганізацыі, падпарадкаваныя Ураду Рэспублікі Беларусь, мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы, іншыя арганізацыі і фізічныя асобы ў межах іх паўнамоцтваў у сферы агульнай сярэдняй адукацыі.

### Артыкул 163. Вучэбна-праграмная дакументацыя адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі

1. Вучэбна-праграмная дакументацыя адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі ўключае ў сябе вучэбныя планы і вучэбныя праграмы.

2. Вучэбныя планы падзяляюцца на:

2.1. тыпавы вучэбны план агульнай сярэдняй адукацыі;

2.2. вучэбныя планы ўстаноў адукацыі, што рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі;

2.3. эксперыментальныя вучэбныя планы ўстаноў адукацыі, што рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі;

2.4. індывідуальныя вучэбныя планы.

3. Тыпавы вучэбны план агульнай сярэдняй адукацыі з'яўляецца тэхнічным нарматыўным прававым актам і складаецца з тыпавых вучэбных планаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі кожнага віду, вучэбнага плана акадэміі (кансерваторыі), што рэалізуе адукацыйную праграму базавай адукацыі, адукацыйную праграму сярэдняй адукацыі з вывучэннем на павышаным узроўні вучэбных прадметаў, модуляў, змест якіх накіраваны на развіццё здольнасцей навучэнцаў у галіне асобных відаў мастацтва.

Тыпавы вучэбны план установы агульнай сярэдняй адукацыі адпаведнага віду, вучэбны план акадэміі (кансерваторыі), што рэалізуе адукацыйную праграму базавай адукацыі, адукацыйную праграму сярэдняй адукацыі з вывучэннем на павышаным узроўні вучэбных прадметаў, модуляў, змест якіх накіраваны на развіццё здольнасцей навучэнцаў у галіне асобных відаў мастацтва, уключаюць у сябе дзяржаўны кампанент, кампанент установы адукацыі, максімальны дапушчальны аб'ём вучэбнай нагрузкі на тыдзень на аднаго навучэнца ў кожным класе. Дзяржаўны кампанент тыпавога вучэбнага плана ўстановы агульнай сярэдняй адукацыі адпаведнага віду, вучэбнага плана акадэміі (кансерваторыі), што рэалізуе адукацыйную праграму базавай адукацыі, адукацыйную праграму сярэдняй адукацыі з вывучэннем на павышаным узроўні вучэбных прадметаў, модуляў, змест якіх накіраваны на развіццё здольнасцей навучэнцаў у галіне асобных відаў мастацтва, устанаўлівае пералік абавязковых для вывучэння вучэбных прадметаў, модуляў па класах і колькасць вучэбных гадзін на тыдзень на іх вывучэнне, абавязковы аб'ём вучэбнай нагрузкі на тыдзень на аднаго навучэнца ў кожным класе, які вызначаецца агульнай колькасцю вучэбных гадзін, устаноўленых дзяржаўным кампанентам на вывучэнне вучэбных прадметаў, модуляў па адпаведным класе. Кампанент установы адукацыі тыпавога вучэбнага плана ўстановы агульнай сярэдняй адукацыі адпаведнага віду, вучэбнага плана акадэміі (кансерваторыі), што рэалізуе адукацыйную праграму базавай адукацыі, адукацыйную праграму сярэдняй адукацыі з вывучэннем на павышаным узроўні вучэбных прадметаў, модуляў, змест якіх накіраваны на развіццё здольнасцей навучэнцаў у галіне асобных відаў мастацтва, устанаўлівае колькасць вучэбных гадзін на тыдзень на правядзенне заняткаў у кожным класе. Максімальны дапушчальны аб'ём вучэбнай нагрузкі на тыдзень на аднаго навучэнца ў кожным класе ўключае ў сябе абавязковы аб'ём вучэбнай нагрузкі і аб'ём вучэбнай нагрузкі на факультатыўных занятках. Навучальныя гадзіны, устаноўленыя тыпавым вучэбным планам установы агульнай сярэдняй адукацыі адпаведнага віду, вучэбным планам акадэміі (кансерваторыі), што рэалізуе адукацыйную праграму базавай адукацыі, адукацыйную праграму сярэдняй адукацыі з вывучэннем на павышаным узроўні вучэбных прадметаў, модуляў, змест якіх накіраваны на развіццё здольнасцей навучэнцаў у галіне асобных відаў мастацтва, у дзяржаўных установах адукацыі фінансуюцца за кошт сродкаў рэспубліканскага і (або) мясцовых бюджэтаў.

Тыпавы вучэбны план установы агульнай сярэдняй адукацыі адпаведнага віду, вучэбны план акадэміі (кансерваторыі), што рэалізуе адукацыйную праграму базавай адукацыі, адукацыйную праграму сярэдняй адукацыі з вывучэннем на павышаным узроўні вучэбных прадметаў, модуляў, змест якіх накіраваны на развіццё здольнасцей навучэнцаў у галіне асобных відаў мастацтва, таксама могуць адлюстроўваць варыянты рэалізацыі адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі на аснове дыферэнцыяцыі яе зместу з улікам адукацыйных патрэб і інтарэсаў навучэнцаў. Дзяржаўны кампанент уключае ў сябе пералік абавязковых для вывучэння вучэбных прадметаў, модуляў і варыятыўны пералік вучэбных прадметаў, модуляў. Вучэбныя прадметы, модулі ў варыятыўным пераліку вучэбных прадметаў, модуляў структуруюцца па прадметных галінах.

Тыпавы вучэбны план сярэдняй школы распрацоўваецца з улікам забеспячэння магчымасці вывучэння мовы нацыянальнай меншасці, літаратуры нацыянальнай меншасці, арганізацыі адукацыйнага працэсу дома, у арганізацыях аховы здароўя, санаторна-курортных і аздараўленчых арганізацыях, арганізацыі адукацыйнага працэсу для навучэнцаў у перыяд удзелу іх у спартыўных мерапрыемствах па-за месцам

знаходжання ўстаноў адукацыі, у якіх яны навучаюцца, а таксама для навучэнцаў, якія ўтрымліваюцца пад вартай у следчых ізалятарах, пад вартай у папраўчых установах.

Частка тыпавога вучэбнага плана сярэдняй школы, якая датычыцца вячэрніх класаў у сярэдняй школе, распрацоўваецца асобна з улікам формы атрымання адукацыі і асаблівасцей адукацыйнага працэсу ў вячэрніх класах, арганізацыі сесій.

Тыпавы вучэбны план агульнай сярэдняй адукацыі, акрамя вучэбнага плана акадэміі (кансерваторыі), што рэалізуе адукацыйную праграму базавай адукацыі, адукацыйную праграму сярэдняй адукацыі з вывучэннем на павышаным узроўні вучэбных прадметаў, модуляў, змест якіх накіраваны на развіццё здольнасцей навучэнцаў у галіне асобных відаў мастацтва, распрацоўваецца і зацвярджаецца Міністэрствам адукацыі пры наяўнасці заключэння Міністэрства аховы здароўя аб яго адпаведнасці заканадаўству ў сферы санітарна-эпідэміялагічнага дабрабыту насельніцтва, а тыпавы вучэбны план спецыялізаванага ліцэя, суворaўскага ваеннага вучылішча, гімназіі – каледжа мастацтваў, вучылішча алімпійскага рэзерву – таксама па ўзгадненні адпаведна з Міністэрствам абароны, Дзяржаўным пагранічным камітэтам, Міністэрствам унутраных спраў, Следчым камітэтам, Дзяржаўным камітэтам судовых экспертыз, Міністэрствам па надзвычайных сітуацыях, Міністэрствам культуры, Міністэрствам спорту і турызму.

Вучэбны план акадэміі (кансерваторыі), што рэалізуе адукацыйную праграму базавай адукацыі, адукацыйную праграму сярэдняй адукацыі з вывучэннем на павышаным узроўні вучэбных прадметаў, модуляў, змест якіх накіраваны на развіццё здольнасцей навучэнцаў у галіне асобных відаў мастацтва, распрацоўваецца і зацвярджаецца Міністэрствам адукацыі і Міністэрствам культуры пры наяўнасці заключэння Міністэрства аховы здароўя аб яго адпаведнасці заканадаўству ў сферы санітарна-эпідэміялагічнага дабрабыту насельніцтва.

4. Вучэбны план установы адукацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, распрацоўваецца ўстановай адукацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, акрамя акадэміі (кансерваторыі), што рэалізуе адукацыйную праграму базавай адукацыі, адукацыйную праграму сярэдняй адукацыі з вывучэннем на павышаным узроўні вучэбных прадметаў, модуляў, змест якіх накіраваны на развіццё здольнасцей навучэнцаў у галіне асобных відаў мастацтва, штогод на аснове тыпавога вучэбнага плана ўстановы агульнай сярэдняй адукацыі адпаведнага віду і зацвярджаецца яе кіраўніком па ўзгадненні з заснавальнікам. Універсітэты пры распрацоўцы гэтага вучэбнага плана выкарыстоўваюць тыпавы вучэбны план сярэдняй школы, або тыпавы вучэбны план гімназіі, або тыпавы вучэбны план ліцэя, іншыя ўстановы адукацыі, што рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, акрамя ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі, – тыпавы вучэбны план сярэдняй школы, калі іншае не вызначана гэтым артыкулам. Акадэміі (кансерваторыі), што рэалізуюць адукацыйную праграму базавай адукацыі, адукацыйную праграму сярэдняй адукацыі з вывучэннем на павышаным узроўні вучэбных прадметаў, модуляў, змест якіх накіраваны на развіццё здольнасцей навучэнцаў у галіне асобных відаў мастацтва, выкарыстоўваюць вучэбны план акадэміі (кансерваторыі), што рэалізуе адукацыйную праграму базавай адукацыі, адукацыйную праграму сярэдняй адукацыі з вывучэннем на павышаным узроўні вучэбных прадметаў, модуляў, змест якіх накіраваны на развіццё здольнасцей навучэнцаў у галіне асобных відаў мастацтва, зацверджаны Міністэрствам адукацыі і Міністэрствам культуры.

Установы агульнай сярэдняй адукацыі, у якіх вывучаюцца мова нацыянальнай меншасці, літаратура нацыянальнай меншасці, установы адукацыі, што арганізуюць адукацыйны працэс дома, у арганізацыях аховы здароўя, санаторна-курортных і аздараўленчых арганізацыях, установы адукацыі, што арганізуюць адукацыйны працэс для навучэнцаў у перыяд удзелу іх у спартыўных мерапрыемствах па-за месцам знаходжання ўстаноў адукацыі, у якіх яны навучаюцца, а таксама для навучэнцаў, якія ўтрымліваюцца пад вартай у следчых ізалятарах, пад вартай у папраўчых установах, пры

распрацоўцы адпаведнага вучэбнага плана выкарыстоўваюць тыпавы вучэбны план сярэдняй школы.

Вучэбны план установы адукацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, уключае ў сябе дзяржаўны кампанент, кампанент установы адукацыі, максімальны дапушчальны аб'ём вучэбнай нагрузкі на тыдзень на аднаго навучэнца ў кожным класе, агульную колькасць вучэбных гадзін на правядзенне вучэбных заняткаў, заняткаў.

Агульная колькасць вучэбных гадзін на правядзенне вучэбных заняткаў, заняткаў уключае ў сябе навучальныя гадзіны, устаноўленыя дзяржаўным кампанентам, кампанентам установы адукацыі тыпавога вучэбнага плана ўстановы агульнай сярэдняй адукацыі адпаведнага віду, а таксама вучэбныя гадзіны, неабходныя для забеспячэння правядзення вучэбных заняткаў, заняткаў у групах (пры дзяленні навучэнцаў класа на групы або аб'яднанні навучэнцаў паралельных або розных класаў у групы) і ў іншых выпадках, якія вызначаюцца Палажэннем аб установе агульнай сярэдняй адукацыі або яе відзе. Агульная колькасць вучэбных гадзін, прадугледжаных вучэбным планам дзяржаўнай установы адукацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, фінансуецца за кошт сродкаў рэспубліканскага і (або) мясцовых бюджэтаў.

5. Эксперыментальны вучэбны план установы адукацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, апрабуецца ва ўстанове адукацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, на базе якой ажыццяўляецца эксперыментальная дзейнасць.

Эксперыментальныя вучэбныя планы ўстаноў адукацыі, што рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, акрамя гімназій – каледжаў мастацтваў, распрацоўваюцца і зацвярджаюцца Міністэрствам адукацыі.

Эксперыментальныя вучэбныя планы гімназій – каледжаў мастацтваў распрацоўваюцца і зацвярджаюцца Міністэрствам адукацыі па ўзгадненні з Міністэрствам культуры.

6. Індывідуальны вучэбны план устанаўлівае асаблівасці атрымання агульнай сярэдняй адукацыі адоранымі і таленавітымі навучэнцамі, а таксама навучэнцамі, якія з уважлівых прычын не могуць пастаянна або часова наведваць вучэбныя заняткі і (або) праходзіць ва ўстаноўленыя тэрміны атэстацыю.

Індывідуальныя вучэбныя планы распрацоўваюцца ўстановамі адукацыі, што рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, на аснове вучэбных планаў устаноў адукацыі, што рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, і зацвярджаюцца іх кіраўнікамі.

7. Вучэбныя праграмы падзяляюцца на:

7.1. вучэбныя праграмы па вучэбных прадметах, модулях;

7.2. вучэбныя праграмы факультатыўных заняткаў;

7.3. эксперыментальныя вучэбныя праграмы па вучэбных прадметах, модулях.

8. Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце, модулі з'яўляецца тэхнічным нарматыўным прававым актам і вызначае мэты і задачы вывучэння вучэбнага прадмета, модуля, яго змест, час на вывучэнне асобных тэм, асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці навучэнцаў, рэкамендаваныя формы і метады навучання і выхавання, іншыя патрабаванні, устаноўленыя адпаведным адукацыйным стандартам агульнай сярэдняй адукацыі.

9. Вучэбная праграма факультатыўных заняткаў з'яўляецца тэхнічным нарматыўным прававым актам і вызначае мэты і задачы факультатыўных заняткаў, іх змест, час на засваенне зместу, асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці навучэнцаў, рэкамендаваныя формы і метады навучання і выхавання, іншыя патрабаванні, устаноўленыя адпаведным адукацыйным стандартам агульнай сярэдняй адукацыі.

10. Эксперыментальная вучэбная праграма па вучэбным прадмеце, модулі апрабуецца ва ўстанове адукацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, на базе якой ажыццяўляецца эксперыментальная дзейнасць.

11. Вучэбныя праграмы па вучэбных прадметах, модулях, акрамя навучальных праграм па вучэбных прадметах, модулях, змест якіх накіраваны на развіццё здольнасцей навучэнцаў у галіне асобных відаў мастацтва, вучэбныя праграмы факультатыўных заняткаў, эксперыментальныя вучэбныя праграмы па вучэбных прадметах, модулях, акрамя эксперыментальных навучальных праграм па вучэбных прадметах, модулях, змест якіх накіраваны на развіццё здольнасцей навучэнцаў у галіне асобных відаў мастацтва, распрацоўваюцца арганізацыямі, што ажыццяўляюць навукова-метадычнае забеспячэнне агульнай сярэдняй адукацыі, і зацвярджаюцца Міністэрствам адукацыі.

Вучэбныя праграмы па вучэбных прадметах, модулях, змест якіх накіраваны на развіццё здольнасцей навучэнцаў у галіне асобных відаў мастацтва, распрацоўваюцца і зацвярджаюцца Міністэрствам культуры.

Эксперыментальныя вучэбныя праграмы па вучэбных прадметах, модулях, змест якіх накіраваны на развіццё здольнасцей навучэнцаў у галіне асобных відаў мастацтва, распрацоўваюцца ўстановай адукацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, на базе якой ажыццяўляецца эксперыментальная дзейнасць, і зацвярджаюцца Міністэрствам культуры.

**Артыкул 164. Вучэбна-метадычныя аб’яднанні ў сферы агульнай сярэдняй адукацыі**

1. Для ўдасканалення навукова-метадычнага забеспячэння агульнай сярэдняй адукацыі, арганізацыі ўзаемадзеяння з арганізацыямі, што ажыццяўляюць навукова-метадычнае забеспячэнне агульнай сярэдняй адукацыі, рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання, мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі і ўстановамі адукацыі могуць ствараецца вучэбна-метадычныя аб’яднанні ў сферы агульнай сярэдняй адукацыі адпаведна на рэспубліканскім, абласным (горада Мінска) і (або) раённым узроўнях і (або) ва ўстановах адукацыі.

2. Вучэбна-метадычныя аб’яднанні ў сферы агульнай сярэдняй адукацыі могуць ствараецца па відах адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі, вучэбным прадмеце, прадметнай галіне адпаведнай адукацыйнай праграмы (адукацыйных праграм) агульнай сярэдняй адукацыі.

3. У склад вучэбна-метадычных аб’яднанняў у сферы агульнай сярэдняй адукацыі могуць уваходзіць педагагічныя работнікі ўстаноў адукацыі, што рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, інстытутаў развіцця адукацыі, навуковыя работнікі, прадстаўнікі дзяржаўных арганізацый адукацыі, што забяспечваюць функцыянаванне сістэмы адукацыі, прадстаўнікі дзяржаўных органаў і іншых арганізацый.

4. Функцыямі вучэбна-метадычных аб’яднанняў у сферы агульнай сярэдняй адукацыі з’яўляюцца:

4.1. удзел у распрацоўцы прапаноў па ўдасканаленні адукацыйных стандартаў агульнай сярэдняй адукацыі;

4.2. удзел у распрацоўцы прапаноў па ўдасканаленні тыпавога вучэбнага плана агульнай сярэдняй адукацыі, вучэбных планаў устаноў адукацыі, што рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, вучэбных праграм;

4.3. удзел у распрацоўцы метадычных рэкамендацый па ўдасканаленні адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі ў дачыненні да ўмоў установы адукацыі, павышэння эфектыўнасці вучэбных заняткаў, заняткаў, самастойнай працы навучэнцаў у вучэбны і ў невучэбны час для развіцця іх творчых здольнасцей, далучэння да розных відаў сацыяльна значнай дзейнасці;

4.4. распрацоўка метадычных рэкамендацый па стымуляванні вучэбнай дзейнасці навучэнцаў і фарміраванні ў іх кампетэнцый, развіцці іх творчых здольнасцей пры

вывучэнні вучэбнага прадмета, модуля ў рамках засваення зместу адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі;

4.5. распрацоўка прапаноў па ўдасканаленні дзейнасці ў павышэнні кваліфікацыі педагагічных работнікаў па пытаннях распрацоўкі і выкарыстання структурных элементаў навукова-метадычнага забеспячэння агульнай сярэдняй адукацыі ў адукацыйным працэсе;

4.6. іншыя функцыі, накіраваныя на павышэнне якасці адукацыі.

5. Рашэнні вучэбна-метадычных аб'яднанняў у сферы агульнай сярэдняй адукацыі носяць рэкамендацыйны характар.

6. Ва ўстанове адукацыі для каардынацыі дзейнасці вучэбна-метадычных аб'яднанняў у сферы агульнай сярэдняй адукацыі, ажыццяўлення ўзаемадзеяння з арганізацыямі, што ажыццяўляюць навукова-метадычнае забеспячэнне агульнай сярэдняй адукацыі, можа ствараецца метадычны савет.

7. Палажэнне аб вучэбна-метадычных аб'яднаннях у сферы агульнай сярэдняй адукацыі, Палажэнне аб метадычным савеце ўстановы адукацыі зацвярджаюцца Міністэрствам адукацыі.

# РАЗДЗЕЛ IX
# ПРАФЕСІЙНА-ТЭХНІЧНАЯ АДУКАЦЫЯ

## ГЛАВА 25
## СІСТЭМА ПРАФЕСІЙНА-ТЭХНІЧНАЙ АДУКАЦЫІ

### Артыкул 165. Сістэма прафесійна-тэхнічнай адукацыі

1. Прафесійна-тэхнічная адукацыя – узровень асноўнай адукацыі, накіраваны на развіццё асобы навучэнца, курсанта, іх прафесійнае станаўленне, фарміраванне ў іх кампетэнцый, неабходных для ажыццяўлення прафесійнай дзейнасці, які завяршаецца прысваеннем кваліфікацыі рабочага з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй, служачага з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй.

2. Сістэма прафесійна-тэхнічнай адукацыі ўключае ў сябе:

2.1. удзельнікаў адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адукацыйных праграм прафесійна-тэхнічнай адукацыі;

2.2. адукацыйныя праграмы прафесійна-тэхнічнай адукацыі;

2.3. установы адукацыі, што рэалізуюць адукацыйныя праграмы прафесійна-тэхнічнай адукацыі;

2.4. дзяржаўныя арганізацыі адукацыі, якія забяспечваюць функцыянаванне сістэмы адукацыі;

2.5. вучэбна-метадычныя аб'яднанні ў сферы прафесійна-тэхнічнай адукацыі;

2.6. арганізацыі, што забяспечваюць праходжанне вытворчага навучання навучэнцамі, курсантамі;

2.7. арганізацыі, якія ўдзельнічаюць у рэалізацыі адукацыйных праграм праз сеткавую форму ўзаемадзеяння;

2.8. арганізацыі – заказчыкі кадраў;

2.9. рэспубліканскія органы дзяржаўнага кіравання, іншыя арганізацыі, падпарадкаваныя Ураду Рэспублікі Беларусь, мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы, іншыя арганізацыі ў межах іх паўнамоцтваў у сферы прафесійна-тэхнічнай адукацыі.

### Артыкул 166. Удзельнікі адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адукацыйных праграм прафесійна-тэхнічнай адукацыі

1. Удзельнікамі адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адукацыйных праграм прафесійна-тэхнічнай адукацыі з'яўляюцца навучэнцы, курсанты, законныя прадстаўнікі непаўналетніх навучэнцаў, курсантаў, педагагічныя работнікі.

2. Навучэнцам на ўвесь перыяд атрымання прафесійна-тэхнічнай адукацыі выдаецца білет навучэнца, узор якога ўстанаўліваецца Міністэрствам адукацыі.

### Артыкул 167. Адукацыйныя праграмы прафесійна-тэхнічнай адукацыі

1. Адукацыйныя праграмы прафесійна-тэхнічнай адукацыі падзяляюцца на:

1.1. адукацыйную праграму прафесійна-тэхнічнай адукацыі, што забяспечвае атрыманне кваліфікацыі рабочага (служачага);

1.2. адукацыйную праграму прафесійна-тэхнічнай адукацыі з вывучэннем асобных вучэбных прадметаў на павышаным узроўні, што забяспечвае атрыманне кваліфікацыі рабочага (служачага);

1.3. адукацыйную праграму прафесійна-тэхнічнай адукацыі, што забяспечвае атрыманне кваліфікацыі рабочага (служачага) і агульнай сярэдняй адукацыі;

1.4. адукацыйную праграму прафесійна-тэхнічнай адукацыі з вывучэннем асобных вучэбных прадметаў на павышаным узроўні, што забяспечвае атрыманне кваліфікацыі рабочага (служачага) і агульнай сярэдняй адукацыі.

2. Адукацыйныя праграмы прафесійна-тэхнічнай адукацыі рэалізуюцца ў вочнай, завочнай і дыстанцыйнай формах атрымання адукацыі.

3. Адукацыйныя праграмы прафесійна-тэхнічнай адукацыі рэалізуюцца ва ўстановах сярэдняй спецыяльнай адукацыі, філіялах дзяржаўных каледжаў, што знаходзяцца на тэрыторыі папраўчых устаноў крымінальна-выканаўчай сістэмы Міністэрства ўнутраных спраў, рэспубліканскіх унітарных вытворчых прадпрыемстваў, падпарадкаваных Дэпартаменту выканання пакаранняў Міністэрства ўнутраных спраў, лячэбна-працоўных прафілакторыяў Міністэрства ўнутраных спраў, спецыяльных прафесійна-тэхнічных вучылішчах закрытага тыпу, спецыяльных лячэбна-выхаваўчых прафесійна-тэхнічных вучылішчах закрытага тыпу, а таксама могуць рэалізоўвацца ва ўстановах вышэйшай адукацыі. Віды рэалізуемых адукацыйных праграм прафесійна-тэхнічнай адукацыі ва ўказаных установах адукацыі вызначаюцца гэтым Кодэксам.

4. Асаблівасці рэалізацыі адукацыйных праграм прафесійна-тэхнічнай адукацыі па спецыяльнасцях для органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях устанаўліваюцца Міністэрствам па надзвычайных сітуацыях і Міністэрствам адукацыі.

### Артыкул 168. Адукацыйныя стандарты прафесійна-тэхнічнай адукацыі

1. Адукацыйныя стандарты прафесійна-тэхнічнай адукацыі распрацоўваюцца па кожнай спецыяльнасці і ўстанаўліваюць патрабаванні да вынікаў засваення зместу адукацыйных праграм прафесійна-тэхнічнай адукацыі, зместу вучэбна-праграмнай дакументацыі адукацыйных праграм прафесійна-тэхнічнай адукацыі, тэрмінаў атрымання прафесійна-тэхнічнай адукацыі, арганізацыі адукацыйнага працэсу, выніковай атэстацыі, кваліфікацыі, якая прысвойваецца. Патрабаванні да вынікаў засваення зместу адукацыйных праграм прафесійна-тэхнічнай адукацыі ўключаюць у сябе фарміруемыя кампетэнцыі навучэнцаў.

2. Распрацоўку адукацыйных стандартаў прафесійна-тэхнічнай адукацыі арганізуе Міністэрства адукацыі і ажыццяўляе сумесна з арганізацыямі, што ажыццяўляюць навукова-метадычнае забеспячэнне прафесійна-тэхнічнай адукацыі, вучэбна-метадычнымі аб’яднаннямі ў сферы прафесійна-тэхнічнай адукацыі і арганізацыямі – заказчыкамі кадраў.

3. Адукацыйныя стандарты прафесійна-тэхнічнай адукацыі зацвярджаюцца Міністэрствам адукацыі па ўзгадненні з зацікаўленымі рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання, іншымі арганізацыямі, падпарадкаванымі Ураду Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 169. Тэрмін атрымання прафесійна-тэхнічнай адукацыі**

1. Тэрмін атрымання прафесійна-тэхнічнай адукацыі ў дзённай форме атрымання адукацыі складае:

1.1. на аснове агульнай базавай адукацыі без атрымання агульнай сярэдняй адукацыі або на аснове спецыяльнай адукацыі – ад аднаго года да двух гадоў;

1.2. на аснове агульнай базавай адукацыі з атрыманнем агульнай сярэдняй адукацыі – ад двух гадоў шасці месяцаў да трох гадоў;

1.3. на аснове агульнай сярэдняй адукацыі – ад шасці месяцаў да аднаго года.

2. Тэрмін атрымання прафесійна-тэхнічнай адукацыі на аснове агульнай сярэдняй адукацыі можа быць павялічаны не больш чым на шэсць месяцаў.

3. Тэрмін атрымання прафесійна-тэхнічнай адукацыі ў вячэрняй форме атрымання адукацыі вызначаецца тэрмінам атрымання прафесійна-тэхнічнай адукацыі ў дзённай форме атрымання адукацыі і можа быць павялічаны не больш чым на адзін год.

4. Тэрмін атрымання прафесійна-тэхнічнай адукацыі ў завочнай і дыстанцыйнай формах атрымання адукацыі складае ад шасці месяцаў да аднаго года шасці месяцаў.

5. Тэрмін атрымання прафесійна-тэхнічнай адукацыі на аснове агульнай базавай адукацыі без атрымання агульнай сярэдняй адукацыі або на аснове спецыяльнай адукацыі можа быць зменшаны да шасці месяцаў па ўзгадненні з Міністэрствам адукацыі пры ўмове выканання патрабаванняў адукацыйных стандартаў прафесійна-тэхнічнай адукацыі.

## ГЛАВА 26
## УСТАНОВЫ АДУКАЦЫІ, ШТО РЭАЛІЗУЮЦЬ АДУКАЦЫЙНЫЯ ПРАГРАМЫ ПРАФЕСІЙНА-ТЭХНІЧНАЙ АДУКАЦЫІ. УЗАЕМАДЗЕЯННЕ ЎСТАНОЎ АДУКАЦЫІ ПРЫ РЭАЛІЗАЦЫІ ПРАФЕСІЙНА-ТЭХНІЧНАЙ АДУКАЦЫІ З АРГАНІЗАЦЫЯМІ – ЗАКАЗЧЫКАМІ КАДРАЎ

**Артыкул 170. Установы адукацыі, што рэалізуюць адукацыйныя праграмы прафесійна-тэхнічнай адукацыі**

1. Да ўстаноў адукацыі, што рэалізуюць адукацыйныя праграмы прафесійна-тэхнічнай адукацыі, адносяцца:

1.1. каледж;

1.2. універсітэт;

1.3. акадэмія (кансерваторыя);

1.4. спецыяльнае прафесійна-тэхнічнае вучылішча закрытага тыпу;

1.5. спецыяльнае лячэбна-выхаваўчае прафесійна-тэхнічнае вучылішча закрытага тыпу.

2. Ва ўстанове адукацыі, што рэалізуе адну або некалькі адукацыйных праграм прафесійна-тэхнічнай адукацыі, могуць ствараецца структурныя падраздзяленні: аддзяленне, лабараторыя, цэнтр, цэнтр кампетэнцый, навучальна-вытворчая майстэрня, навучальная гаспадарка, навучальна-доследная гаспадарка, цэнтр прафесійнай і сацыяльнай рэабілітацыі асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, іншыя структурныя падраздзяленні.

**Артыкул 171. Статус установы адукацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы прафесійна-тэхнічнай адукацыі**

1. Установе адукацыі, што рэалізуе адну або некалькі адукацыйных праграм прафесійна-тэхнічнай адукацыі, у сістэме прафесійна-тэхнічнай адукацыі можа быць прадастаўлены статус «вядучая ўстанова адукацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы прафесійна-тэхнічнай адукацыі» на рэспубліканскім або абласным (горада Мінска) узроўні.

2. Статус «вядучая ўстанова адукацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы прафесійна-тэхнічнай адукацыі» на рэспубліканскім узроўні прадастаўляецца з мэтай устойлівага развіцця сістэмы прафесійна-тэхнічнай адукацыі, узмацнення яе ролі ў забеспячэнні кваліфікаванымі кадрамі навукаёмістых, высокатэхналагічных вытворчасцей, распрацоўкі адукацыйных стандартаў па спецыяльнасцях, сучасных адукацыйных тэхналогій, сродкаў навучання і выхавання, а таксама з іншымі мэтамі ў сферы прафесійна-тэхнічнай адукацыі і вызначаецца па профілях адукацыі і (або) напрамках адукацыі.

Статус «вядучая ўстанова адукацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы прафесійна-тэхнічнай адукацыі» на рэспубліканскім узроўні прадастаўляецца Міністэрствам адукацыі на падставе прапаноў дзяржаўных органаў, арганізацый, у падпарадкаванні якіх знаходзяцца ўстановы адукацыі.

3. Статус «вядучая ўстанова адукацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы прафесійна-тэхнічнай адукацыі» на абласным (горада Мінска) узроўні прадастаўляецца з мэтай удасканалення навукова-метадычнага забеспячэння прафесійна-тэхнічнай адукацыі і каардынацыі дзейнасці ўстаноў адукацыі, што рэалізуюць адукацыйныя праграмы прафесійна-тэхнічнай адукацыі і размешчаны на тэрыторыі адпаведнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі, пры рэалізацыі інавацыйных праектаў і рашэнні іншых задач у сферы прафесійна-тэхнічнай адукацыі адпаведнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі.

Статус «вядучая ўстанова адукацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы прафесійна-тэхнічнай адукацыі» на абласным (горада Мінска) узроўні прадастаўляецца заснавальнікам па ўзгадненні з Міністэрствам адукацыі.

**Артыкул 172. Узаемадзеянне ўстаноў адукацыі пры рэалізацыі адукацыйных праграм прафесійна-тэхнічнай адукацыі з арганізацыямі – заказчыкамі кадраў**

1. Узаемадзеянне ўстаноў адукацыі пры рэалізацыі адукацыйных праграм прафесійна-тэхнічнай адукацыі з арганізацыямі – заказчыкамі кадраў ажыццяўляецца з мэтай забеспячэння арганізацый, што маюць патрэбы ў падрыхтоўцы рабочых з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй, служачых з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй, рабочымі з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй, служачымі з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй.

2. Узаемадзеянне пры падрыхтоўцы рабочых з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй, служачых з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй, акрамя падрыхтоўкі рабочых з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй па спецыяльнасцях для органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях, ажыццяўляецца шляхам заключэння дагавора аб узаемадзеянні або падачы заяўкі на падрыхтоўку рабочых з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй, служачых з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй. Дагавор аб узаемадзеянні заключаецца паміж установай адукацыі і арганізацыяй – заказчыкам кадраў. Заяўка на падрыхтоўку рабочых з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй, служачых з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй падаецца арганізацыяй, якая мае патрэбу ў падрыхтоўцы рабочых з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй, служачых з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй, ва ўстанову адукацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы прафесійна-тэхнічнай адукацыі.

Узаемадзеянне з арганізацыямі – заказчыкамі кадраў пры падрыхтоўцы рабочых з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй па спецыяльнасцях для органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях ажыццяўляецца ў парадку, які вызначаецца Міністэрствам па надзвычайных сітуацыях.

3. Дагавор аб узаемадзеянні ўстановы адукацыі з арганізацыяй – заказчыкам кадраў пры падрыхтоўцы рабочых з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй, служачых з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй заключаецца ў выпадку, калі арганізацыя, якая мае патрэбу ў падрыхтоўцы рабочых з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй, служачых з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй, прымае на сябе абавязацельствы па арганізацыі вытворчага

навучання навучэнцаў, развіцці матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстановы адукацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы прафесійна-тэхнічнай адукацыі.

4. Істотнымі ўмовамі дагавора аб узаемадзеянні ўстановы адукацыі з арганізацыяй – заказчыкам кадраў пры падрыхтоўцы рабочых з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй, служачых з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй з'яўляюцца:

4.1. прадмет дагавора;

4.2. колькасць асоб (па гадах), якая заяўляецца для падрыхтоўкі ва ўстанове адукацыі з мэтай наступнага працаўладкавання ў арганізацыі – заказчыку кадраў, і тэрміны іх навучання;

4.3. спецыяльнасці, кваліфікацыі (прафесіі рабочых, пасады служачых), па якіх будзе ажыццяўляцца падрыхтоўка;

4.4. парадак праходжання навучэнцамі вытворчага навучання;

4.5. замацаванне аб'ектаў і абсталявання для праходжання вытворчага навучання;

4.6. удзел у развіцці матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстановы адукацыі;

4.7. стажыроўка педагагічных работнікаў установы адукацыі ў арганізацыі – заказчыку кадраў;

4.8. удзел прадстаўнікоў арганізацыі – заказчыка кадраў у выніковай атэстацыі навучэнцаў;

4.9. працаўладкаванне выпускнікоў у арганізацыі – заказчыку кадраў.

5. Арганізацыя, якая заключыла дагавор аб узаемадзеянні ўстановы адукацыі з арганізацыяй – заказчыкам кадраў пры падрыхтоўцы рабочых з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй, служачых з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй, прызнаецца базавай арганізацыяй адпаведнай установы адукацыі.

Базавая арганізацыя мае пераважнае права на задавальненне сваёй патрэбы ў рабочых з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй, служачых з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй з ліку выпускнікоў адпаведнай установы адукацыі. Пры наяўнасці некалькіх базавых арганізацый задавальненне патрэб у рабочых з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй, служачых з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй ажыццяўляецца ў парадку чарговасці, якая вызначаецца датай заключэння адпаведных дагавораў.

6. Дагавор аб узаемадзеянні ўстановы адукацыі з арганізацыяй – заказчыкам кадраў пры падрыхтоўцы рабочых з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй, служачых з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй заключаецца паміж установамі адукацыі і арганізацыямі дзяржаўнай формы ўласнасці па ўзгадненні з дзяржаўнымі органамі, арганізацыямі, у падпарадкаванні якіх яны знаходзяцца, а паміж установамі адукацыі і прыватнымі арганізацыямі – па ўзгадненні з іх заснавальнікамі.

7. Заяўка на падрыхтоўку рабочых з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй, служачых з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй – накіроўваемы ва ўстанову адукацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы прафесійна-тэхнічнай адукацыі, заказ арганізацыі, якая мае патрэбу ў падрыхтоўцы рабочых з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй, служачых з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй, на падрыхтоўку рабочых з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй, служачых з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй з мэтай іх наступнага працаўладкавання ў гэтай арганізацыі.

8. У заяўцы на падрыхтоўку рабочых з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй, служачых з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй указваюцца:

8.1. колькасць асоб (па гадах), якая заяўляецца для падрыхтоўкі ва ўстанове адукацыі з мэтай наступнага працаўладкавання ў арганізацыі, і тэрміны іх навучання;

8.2. спецыяльнасці, кваліфікацыі (прафесіі рабочых, пасады служачых), па якіх ёсць патрэба ў падрыхтоўцы.

9. Палажэнне аб базавай арганізацыі ўстановы адукацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы прафесійна-тэхнічнай адукацыі, зацвярджаецца Урадам Рэспублікі Беларусь або ўпаўнаважаным ім органам, прыкладная форма дагавора аб узаемадзеянні ўстановы адукацыі з арганізацыяй – заказчыкам кадраў пры падрыхтоўцы рабочых з прафесійна-

тэхнічнай адукацыяй, служачых з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй і парадак яго заключэння, форма заяўкі на падрыхтоўку рабочых з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй, служачых з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй устанаўліваюцца Урадам Рэспублікі Беларусь або ўпаўнаважаным ім органам.

## ГЛАВА 27
## АРГАНІЗАЦЫЯ АДУКАЦЫЙНАГА ПРАЦЭСУ ПРЫ РЭАЛІЗАЦЫІ АДУКАЦЫЙНЫХ ПРАГРАМ ПРАФЕСІЙНА-ТЭХНІЧНАЙ АДУКАЦЫІ

### Артыкул 173. Агульныя патрабаванні да арганізацыі адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адукацыйных праграм прафесійна-тэхнічнай адукацыі

1. Адукацыйны працэс пры рэалізацыі адукацыйных праграм прафесійна-тэхнічнай адукацыі можа быць арганізаваны:

1.1. ва ўстановах адукацыі;

1.2. дома.

2. Адукацыйны працэс пры рэалізацыі адукацыйных праграм прафесійна-тэхнічнай адукацыі арганізуецца па навучальных гадах. Навучальны год дзеліцца на два паўгоддзі.

3. Для навучэнцаў устанаўліваюцца:

канікулы на працягу навучальнага года працягласцю не меншай за 2 каляндарныя тыдні;

летнія канікулы працягласцю не меншай за 8 каляндарных тыдняў.

Для курсантаў, што навучаюцца па спецыяльнасцях для органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях, устанаўліваюцца канікулярныя водпускі, працягласць і асаблівасці прадастаўлення якіх устанаўліваюцца заканадаўствам аб праходжанні службы ў органах і падраздзяленнях па надзвычайных сітуацыях.

4. Асноўнай формай арганізацыі адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адукацыйных праграм прафесійна-тэхнічнай адукацыі з’яўляюцца вучэбныя заняткі: урок, лекцыя, семінарскія, лабараторныя, практычныя і іншыя вучэбныя заняткі. Вучэбныя заняткі могуць праводзіцца па зменах. Дадаткова да вучэбных заняткаў праводзяцца факультатыўныя заняткі, кансультацыі.

5. Пры рэалізацыі адукацыйных праграм прафесійна-тэхнічнай адукацыі ажыццяўляецца вытворчае навучанне, якое складаецца з пачатковага, асноўнага, заключнага (вытворчая практыка) перыядаў. Колькасць гадзін, што адводзяцца на вытворчае навучанне, складае не менш за 40 працэнтаў ад агульнай колькасці гадзін, што адводзяцца на рэалізацыю прафесійнага кампанента тыпавога вучэбнага плана па спецыяльнасці.

Парадак арганізацыі вытворчага навучання вызначаецца Палажэннем аб арганізацыі вытворчага навучання навучэнцаў, курсантаў, якія засвойваюць змест адукацыйных праграм прафесійна-тэхнічнай адукацыі, якое зацвярджаецца Урадам Рэспублікі Беларусь.

6. Атрыманне прафесійна-тэхнічнай адукацыі асобамі, якія ўтрымліваюцца ў папраўчых установах крымінальна-выканаўчай сістэмы Міністэрства ўнутраных спраў, лячэбна-працоўных прафілакторыях Міністэрства ўнутраных спраў, ажыццяўляецца ў філіялах дзяржаўных каледжаў, што знаходзяцца на тэрыторыі папраўчых устаноў крымінальна-выканаўчай сістэмы Міністэрства ўнутраных спраў, рэспубліканскіх унітарных вытворчых прадпрыемстваў, падпарадкаваных Дэпартаменту выканання пакаранняў Міністэрства ўнутраных спраў, лячэбна-працоўных прафілакторыяў Міністэрства ўнутраных спраў.

7. Адукацыйны працэс пры рэалізацыі адукацыйных праграм прафесійна-тэхнічнай адукацыі ажыццяўляецца ў вучэбных групах або індывідуальна.

Выхаваўчая праца ў невучэбны час з навучэнцамі, курсантамі праводзіцца педагагічнымі работнікамі, у тым ліку тымі, якія выконваюць функцыі куратара вучэбнай групы.

8. Напаўняльнасць вучэбнай групы на момант яе фарміравання пры атрыманні прафесійна-тэхнічнай адукацыі ў дзённай форме атрымання адукацыі складае ад 25 да 30 навучэнцаў, курсантаў, у вячэрняй, завочнай і дыстанцыйнай формах атрымання адукацыі – ад 15 да 20 навучэнцаў, курсантаў.

Напаўняльнасць вучэбнай групы ў філіялах дзяржаўных каледжаў, што знаходзяцца на тэрыторыі папраўчых установ крымінальна-выканаўчай сістэмы Міністэрства ўнутраных спраў, рэспубліканскіх унітарных вытворчых прадпрыемстваў, падпарадкаваных Дэпартаменту выканання пакаранняў Міністэрства ўнутраных спраў, лячэбна-працоўных прафілакторыяў Міністэрства ўнутраных спраў, незалежна ад формы атрымання адукацыі на момант яе фарміравання складае ад 20 да 25 навучэнцаў.

Напаўняльнасць вучэбнай групы, у якой адукацыйны працэс арганізаваны толькі для асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, на момант яе фарміравання складае ад 6 да 12 навучэнцаў.

Напаўняльнасць вучэбнай групы, у якой адукацыйны працэс арганізаваны для асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця і іншых асоб, на момант яе фарміравання складае ад 15 да 20 навучэнцаў, з іх не больш за 6 навучэнцаў з ліку асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця.

9. Заснавальнік установы адукацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы прафесійна-тэхнічнай адукацыі, можа ўстанаўліваць меншую напаўняльнасць вучэбных груп.

10. Вучэбныя групы могуць дзяліцца на падгрупы ў парадку, які вызначаецца Міністэрствам адукацыі.

11. Адукацыйны працэс пры рэалізацыі адукацыйных праграм прафесійна-тэхнічнай адукацыі можа ажыццяўляцца паэтапна. Этапы адукацыйнага працэсу вызначаюцца адпаведнымі ўзроўнямі кваліфікацыі. Кожны этап мае тэарэтычную і практычную завершанасць. Пасля завяршэння этапу адукацыйнага працэсу праводзіцца кваліфікацыйны экзамен.

Асобе, якой прысвоена кваліфікацыя рабочага (служачага) па выніках этапу адукацыйнага працэсу пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы прафесійна-тэхнічнай адукацыі, выдаецца пасведчанне аб падрыхтоўцы, перападрыхтоўцы, павышэнні кваліфікацыі рабочага (служачага). Парадак правядзення кваліфікацыйнага экзамену вызначаецца Правіламі правядзення атэстацыі навучэнцаў, курсантаў пры засваенні зместу адукацыйных праграм прафесійна-тэхнічнай адукацыі.

12. Адукацыйны працэс ажыццяўляецца індывідуальна на падставе рашэння кіраўніка ўстановы адукацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы прафесійна-тэхнічнай адукацыі, у адпаведнасці з індывідуальным вучэбным планам або на падставе вучэбнага плана ўстановы адукацыі па спецыяльнасці (спецыяльнасцях).

**Артыкул 174. Агульныя патрабаванні да прыёму (залічэння) асоб для атрымання прафесійна-тэхнічнай адукацыі**

1. Ва ўстанову адукацыі для атрымання прафесійна-тэхнічнай адукацыі ў вочнай форме атрымання адукацыі прымаюцца (залічваюцца) асобы, якія маюць агульную базавую адукацыю, агульную сярэднюю адукацыю або спецыяльную адукацыю. Асоба, якая мае спецыяльную адукацыю, можа быць прынята (залічана) ва ўстанову адукацыі толькі для засваення зместу адукацыйнай праграмы прафесійна-тэхнічнай адукацыі, што забяспечвае атрыманне кваліфікацыі рабочага (служачага). Асоба, якая мае агульную базавую адукацыю і якая не дасягнула ўзросту васямнаццаці гадоў, можа быць прынята (залічана) ва ўстанову адукацыі толькі для засваення зместу адукацыйнай праграмы прафесійна-тэхнічнай адукацыі, што забяспечвае атрыманне кваліфікацыі рабочага (служачага) і агульнай сярэдняй адукацыі, або адукацыйнай праграмы прафесійна-

тэхнічнай адукацыі з вывучэннем асобных вучэбных прадметаў на павышаным узроўні, што забяспечвае атрыманне кваліфікацыі рабочага (служачага) і агульнай сярэдняй адукацыі.

2. Для атрымання прафесійна-тэхнічнай адукацыі ў дыстанцыйнай форме атрымання адукацыі прымаюцца (залічваюцца) асобы, якія маюць агульную сярэднюю адукацыю. У дыстанцыйнай форме атрымання адукацыі прафесійна-тэхнічная адукацыя можа быць атрымана толькі пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы прафесійна-тэхнічнай адукацыі, што забяспечвае атрыманне кваліфікацыі рабочага (служачага).

3. У завочнай форме атрымання адукацыі прафесійна-тэхнічная адукацыя можа быць атрымана толькі пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы прафесійна-тэхнічнай адукацыі, што забяспечвае атрыманне кваліфікацыі рабочага (служачага). Для яе засваення прымаюцца (залічваюцца) асобы, якія маюць агульную базавую адукацыю і дасягнулі ўзросту васямнаццаці гадоў, або асобы, якія маюць агульную сярэднюю адукацыю і кваліфікацыю рабочага (служачага), але не маюць дакумента аб прафесійна-тэхнічнай адукацыі, пры ўмове навучання па адпаведных спецыяльнасцях і выканання патрабаванняў адукацыйных стандартаў прафесійна-тэхнічнай адукацыі.

4. Для атрымання прафесійна-тэхнічнай адукацыі па спецыяльнасцях, пры рабоце па якіх забаронена прымяненне працы асоб маладзейшых за васямнаццаць гадоў, прымаюцца (залічваюцца) асобы, якім на дату выдачы дыплома аб прафесійна-тэхнічнай адукацыі споўніцца васямнаццаць гадоў.

5. Прыём (залічэнне) асоб ва ўстановы адукацыі для атрымання прафесійна-тэхнічнай адукацыі ажыццяўляецца на падставе іх заяў. У выпадку, калі колькасць пададзеных заяў на канкрэтную спецыяльнасць перавышае ўстаноўленыя па ёй кантрольныя лічбы прыёму, прыём (залічэнне) ва ўстанову адукацыі ажыццяўляецца па конкурсе на падставе сярэдняга бала дакумента аб адукацыі, дакумента аб навучанні, якім пацвярджаецца атрыманне агульнай базавай адукацыі, агульнай сярэдняй адукацыі або спецыяльнай адукацыі.

6. Асобы, якія не прайшлі па конкурсе на адпаведную спецыяльнасць, маюць права на атрыманне прафесійна-тэхнічнай адукацыі за кошт сродкаў рэспубліканскага і (або) мясцовых бюджэтаў па іншай спецыяльнасці ў гэтай установе адукацыі або па выбранай ці іншай спецыяльнасці ў іншай установе адукацыі.

7. Для асобных катэгорый асоб у адпаведнасці з артыкулам 175 гэтага Кодэкса ўстанаўліваюцца льготы пры прыёме (залічэнні) для атрымання прафесійна-тэхнічнай адукацыі.

8. Для арганізацыі прыёму (залічэння) асоб для атрымання прафесійна-тэхнічнай адукацыі і фарміравання кантынгенту навучэнцаў, курсантаў ва ўстанове адукацыі ствараецца прыёмная камісія. Прыёмная камісія ажыццяўляе сваю дзейнасць у адпаведнасці з Палажэннем аб прыёмнай камісіі ўстановы адукацыі па прыёме асоб для атрымання прафесійна-тэхнічнай адукацыі, што зацвярджаецца Міністэрствам адукацыі.

9. У конкурсе на атрыманне прафесійна-тэхнічнай адукацыі па спецыяльнасцях для органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях маюць права ўдзельнічаць грамадзяне Рэспублікі Беларусь, якія прайшлі прафесійны адбор у парадку, устаноўленым заканадаўствам.

10. Прыём (залічэнне) асоб для атрымання прафесійна-тэхнічнай адукацыі ў частцы, не ўрэгуляванай гэтым Кодэксам, ажыццяўляецца ў адпаведнасці з Правіламі прыёму асоб для атрымання прафесійна-тэхнічнай адукацыі.

**Артыкул 175. Ільготы пры прыёме (залічэнні) асоб для атрымання прафесійна-тэхнічнай адукацыі**

1. Па-за конкурсам для атрымання прафесійна-тэхнічнай адукацыі па канкрэтных спецыяльнасцях, акрамя спецыяльнасцей, на якія конкурс у год, што папярэднічае году

прыёму (залічэння), складаў пяць і больш чалавек на месца, пры наяўнасці ў дакуменце аб адукацыі адзнак не ніжэйшых за 4 (чатыры) балы прымаюцца (залічваюцца):

1.1. дзеці-сіроты і дзеці, якія засталіся без апекавання бацькоў, а таксама асобы з ліку дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекавання бацькоў;

1.2. дзеці-інваліды ва ўзросце да васямнаццаці гадоў, інваліды I і II групы, якім у адпаведнасці з заключэннем урачэбна-кансультацыйнай камісіі або рэабілітацыйнай экспертнай камісіі не проціпаказана навучанне ва ўстанове адукацыі;

1.3. асобы, якія маюць ільготы ў адпаведнасці з артыкулам 18 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб сацыяльнай абароне грамадзян, пацярпелых ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, іншых радыяцыйных аварый».

2. Пераважнае права пры аднолькавым сярэднім бале дакумента аб адукацыі, дакумента аб навучанні на прыём (залічэнне) ва ўстановы адукацыі для атрымання прафесійна-тэхнічнай адукацыі ў парадку пераліку маюць:

2.1. асобы, указаныя ў пункце 1 гэтага артыкула, калі яны паступаюць на спецыяльнасці, на якія конкурс у год, што папярэднічае году прыёму (залічэння), складаў пяць і больш чалавек на месца;

2.2. дзеці асоб, указаных у пункце 10 і падпунктах 12.2 і 12.3 пункта 12 артыкула 3 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб дзяржаўных сацыяльных ільготах, правах і гарантыях для асобных катэгорый грамадзян»;

2.3. ветэраны баявых дзеянняў на тэрыторыі іншых дзяржаў;

2.4. інваліды III групы;

2.5. асобы, якія маюць ільготы ў адпаведнасці з артыкуламі 19–23 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб сацыяльнай абароне грамадзян, пацярпелых ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, іншых радыяцыйных аварый»;

2.6. звольненыя ў запас або адстаўку ваеннаслужачыя, якія маюць рэкамендацыі воінскіх часцей, органаў пагранічнай службы на навучанне ва ўстановах адукацыі;

2.7. асобы з мнагадзетных сем'яў;

2.8. пераможцы (дыпломы I, II або III ступені) трэцяга (абласнога, Мінскага гарадскога) этапу рэспубліканскай алімпіяды па вучэбным прадмеце, праведзенай Міністэрствам адукацыі ў навучальным годзе, які завяршыўся ў год прыёму (залічэння), рэспубліканскіх, абласных турніраў і конкурсаў, праведзеных заснавальнікамі ўстаноў адукацыі ў навучальным годзе, які завяршыўся ў год прыёму (залічэння);

2.9. асобы, якія маюць у дакуменце аб адукацыі, дакуменце аб навучанні больш высокі сярэдні бал па вучэбных прадметах «Руская мова» і «Беларуская мова»;

2.10. асобы, якія не прайшлі па конкурсе на месцы для атрымання адукацыі па спецыяльнасцях напрамку адукацыі «Сельская гаспадарка» на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі і ўдзельнічаюць у агульным конкурсе.

**Артыкул 176. Атрыманне прафесійна-тэхнічнай адукацыі дома**

1. Для навучэнцаў з ліку асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, якія па стане здароўя часова або пастаянна не могуць наведваць установы адукацыі, ствараюцца ўмовы для атрымання прафесійна-тэхнічнай адукацыі па асобных спецыяльнасцях, кваліфікацыях дома.

Пералік медыцынскіх паказанняў для атрымання прафесійна-тэхнічнай адукацыі дома вызначаецца Міністэрствам аховы здароўя, а пералік спецыяльнасцей, кваліфікацый для атрымання прафесійна-тэхнічнай адукацыі дома – Міністэрствам адукацыі, Міністэрствам аховы здароўя і Міністэрствам працы і сацыяльнай абароны.

2. Адукацыйны працэс для атрымання прафесійна-тэхнічнай адукацыі дома арганізуецца ўстановай адукацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы прафесійна-тэхнічнай адукацыі па паказаных спецыяльнасці, кваліфікацыі, месца знаходжання якой максімальна набліжана да месца жыхарства (месца знаходжання) навучэнца.

3. Рашэнне аб атрыманні прафесійна-тэхнічнай адукацыі дома прымаецца ўстановай адукацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы прафесійна-тэхнічнай адукацыі па паказаных спецыяльнасці, кваліфікацыі, месца знаходжання якой максімальна набліжана да месца жыхарства (месца знаходжання) навучэнца, на падставе заявы навучэнца, законнага прадстаўніка непаўналетняга навучэнца і заключэння ўрачэбна-кансультацыйнай камісіі.

4. Парадак арганізацыі атрымання прафесійна-тэхнічнай адукацыі дома вызначаецца Міністэрствам адукацыі па ўзгадненні з Міністэрствам аховы здароўя.

## ГЛАВА 28
## АТЭСТАЦЫЯ НАВУЧЭНЦАЎ, КУРСАНТАЎ ПРЫ ЗАСВАЕННІ ЗМЕСТУ АДУКАЦЫЙНЫХ ПРАГРАМ ПРАФЕСІЙНА-ТЭХНІЧНАЙ АДУКАЦЫІ

### Артыкул 177. Бягучая і прамежкавая атэстацыя навучэнцаў, курсантаў пры засваенні зместу адукацыйных праграм прафесійна-тэхнічнай адукацыі

1. Навучэнцы, курсанты пры засваенні зместу адукацыйных праграм прафесійна-тэхнічнай адукацыі праходзяць бягучую і прамежкавую атэстацыю па вучэбных прадметах, модулях агульнаадукацыйнага кампанента, вучэбных прадметах, модулях прафесійнага кампанента вучэбнага плана ўстановы адукацыі па спецыяльнасці (спецыяльнасцях).

2. Бягучая атэстацыя навучэнцаў, курсантаў праводзіцца на працягу паўгоддзя з мэтай перыядычнага кантролю і ацэнкі вынікаў іх вучэбнай дзейнасці па вучэбным прадмеце, модулі агульнаадукацыйнага кампанента, вучэбным прадмеце, модулі прафесійнага кампанента вучэбнага плана ўстановы адукацыі па спецыяльнасці (спецыяльнасцях), якія вывучаюцца ў паўгоддзі.

3. Прамежкавая атэстацыя навучэнцаў, курсантаў праводзіцца з мэтай ацэнкі вынікаў іх вучэбнай дзейнасці за паўгоддзе (навучальны год) па вучэбным прадмеце, модулі агульнаадукацыйнага кампанента, вучэбным прадмеце, модулі прафесійнага кампанента вучэбнага плана ўстановы адукацыі па спецыяльнасці (спецыяльнасцях), якія вывучаюцца ў паўгоддзі (навучальным годзе).

Прамежкавая атэстацыя навучэнцаў, курсантаў па вучэбным прадмеце, модулі агульнаадукацыйнага кампанента, вучэбным прадмеце, модулі прафесійнага кампанента вучэбнага плана ўстановы адукацыі па спецыяльнасці (спецыяльнасцях) праводзіцца ў адпаведнасці з патрабаваннямі адпаведнага адукацыйнага стандарту прафесійна-тэхнічнай адукацыі, вучэбна-праграмнай дакументацыі адукацыйных праграм прафесійна-тэхнічнай адукацыі, а па вучэбным прадмеце, модулі агульнаадукацыйнага кампанента вучэбнага плана ўстановы адукацыі па спецыяльнасці (спецыяльнасцях) – таксама ў адпаведнасці з патрабаваннямі адпаведнай вучэбнай праграмы па вучэбным прадмеце, модулі агульнаадукацыйнага кампанента.

4. Навучэнцы, курсанты, якія не прайшлі прамежкавую атэстацыю ва ўстаноўленыя тэрміны з прычыны атрымання нездавальняючай адзнакі або няяўкі, праходзяць яе ў іншыя тэрміны ў парадку, што вызначаецца Правіламі правядзення атэстацыі навучэнцаў, курсантаў пры засваенні зместу адукацыйных праграм прафесійна-тэхнічнай адукацыі.

5. Вынік прамежкавай атэстацыі, які выявіўся ў атрыманні нездавальняючай адзнакі, або няяўка для праходжання атэстацыі ва ўстаноўлены ўстановай адукацыі тэрмін без уважлівай прычыны з’яўляюцца акадэмічнай запазычанасцю.

Навучэнцы, курсанты абавязаны ліквідаваць акадэмічную запазычанасць у парадку, які вызначаецца Правіламі правядзення атэстацыі навучэнцаў, курсантаў пры засваенні зместу адукацыйных праграм прафесійна-тэхнічнай адукацыі.

6. Навучэнцы, курсанты, якія маюць акадэмічную запазычанасць не больш чым па двух вучэбных прадметах, модулях вучэбнага плана ўстановы адукацыі па спецыяльнасці (спецыяльнасцях) або якім устаноўлены індывідуальны тэрмін

праходжання прамежкавай атэстацыі, што прыпадае на наступнае паўгоддзе (навучальны год), пераводзяцца на наступнае паўгоддзе (навучальны год) умоўна.

7. Формы, умовы і парадак правядзення бягучай і прамежкавай атэстацыі навучэнцаў, курсантаў пры засваенні зместу адукацыйных праграм прафесійна-тэхнічнай адукацыі, крытэрыі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці навучэнцаў, курсантаў, парадак правядзення бягучай і прамежкавай атэстацыі ў частцы, не ўрэгуляванай гэтым Кодэксам, вызначаюцца Правіламі правядзення атэстацыі навучэнцаў, курсантаў пры засваенні зместу адукацыйных праграм прафесійна-тэхнічнай адукацыі.

**Артыкул 178. Выніковая атэстацыя навучэнцаў, курсантаў пры засваенні зместу адукацыйных праграм прафесійна-тэхнічнай адукацыі**

1. Навучэнцы, курсанты пры засваенні зместу адукацыйных праграм прафесійна-тэхнічнай адукацыі праходзяць выніковую атэстацыю па вучэбных прадметах, модулях агульнаадукацыйнага кампанента вучэбнага плана ўстановы адукацыі па спецыяльнасці (спецыяльнасцях), па якіх праводзяцца выніковыя іспыты пасля завяршэння навучання і выхавання на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі.

Пералік вучэбных прадметаў, модуляў, па якіх праводзяцца выніковыя іспыты пасля завяршэння навучання і выхавання на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі, віды і формы выніковых іспытаў штогод да пачатку навучальнага года ўстанаўліваюцца Міністэрствам адукацыі.

2. Навучэнцы могуць быць вызвалены ад выніковых іспытаў па вучэбных прадметах, модулях агульнаадукацыйнага кампанента вучэбнага плана ўстановы адукацыі па спецыяльнасці (спецыяльнасцях). Падставы для вызвалення навучэнцаў ад выніковых іспытаў устанаўліваюцца Міністэрствам адукацыі. У выпадку вызвалення навучэнцаў ад выніковых іспытаў выніковая атэстацыя праводзіцца на падставе гадавых адзнак.

3. Навучэнцы, курсанты пры завяршэнні засваення зместу адукацыйных праграм прафесійна-тэхнічнай адукацыі праходзяць выніковую атэстацыю па вучэбных прадметах, модулях прафесійнага кампанента вучэбнага плана ўстановы адукацыі па спецыяльнасці (спецыяльнасцях).

4. Выніковая атэстацыя па вучэбных прадметах, модулях прафесійнага кампанента вучэбнага плана ўстановы адукацыі па спецыяльнасці (спецыяльнасцях) праводзіцца дзяржаўнымі кваліфікацыйнымі камісіямі, а па вучэбных прадметах, модулях агульнаадукацыйнага кампанента, па якіх праводзяцца выніковыя іспыты, – экзаменацыйнымі камісіямі.

5. Навучэнцам, курсантам, якія не прайшлі выніковую атэстацыю ва ўстаноўлены тэрмін з уважлівай прычыны, прадастаўляецца права на праходжанне выніковай атэстацыі ў іншы тэрмін падчас працы дзяржаўных кваліфікацыйных камісій, экзаменацыйных камісій.

6. Формы, умовы правядзення выніковай атэстацыі навучэнцаў, курсантаў пры засваенні зместу адукацыйных праграм прафесійна-тэхнічнай адукацыі, крытэрыі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці навучэнцаў, курсантаў, парадак і ўмовы допуску навучэнцаў, курсантаў да выніковай атэстацыі, парадак стварэння і функцыянавання дзяржаўных кваліфікацыйных камісій, экзаменацыйных камісій, парадак правядзення выніковай атэстацыі ў частцы, не ўрэгуляванай гэтым Кодэксам, вызначаюцца Правіламі правядзення атэстацыі навучэнцаў, курсантаў пры засваенні зместу адукацыйных праграм прафесійна-тэхнічнай адукацыі.

7. Для курсантаў, якія засвойваюць змест адукацыйных праграм прафесійна-тэхнічнай адукацыі па спецыяльнасцях для органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях, Міністэрствам па надзвычайных сітуацыях могуць устанаўлівацца асаблівасці праходжання выніковай атэстацыі.

## ГЛАВА 29
## НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ ПРАФЕСІЙНА-ТЭХНІЧНАЙ АДУКАЦЫІ

### Артыкул 179. Сістэма навукова-метадычнага забеспячэння прафесійна-тэхнічнай адукацыі

1. Навукова-метадычнае забеспячэнне прафесійна-тэхнічнай адукацыі ўключае ў сябе:

1.1. вучэбна-праграмную дакументацыю адукацыйных праграм прафесійна-тэхнічнай адукацыі;

1.2. вучэбныя праграмы па вучэбных прадметах, модулях агульнаадукацыйнага кампанента;

1.3. тыпавы вучэбны план агульнаадукацыйнага кампанента прафесійна-тэхнічнай адукацыі;

1.4. праграмна-планавальную дакументацыю выхавання;

1.5. вучэбна-метадычную дакументацыю;

1.6. вучэбныя і іншыя выданні;

1.7. кантрольна-вымяральныя матэрыялы;

1.8. інфармацыйна-аналітычныя матэрыялы;

1.9. метадычныя ўказанні па распрацоўцы вучэбна-праграмнай дакументацыі адукацыйных праграм прафесійна-тэхнічнай адукацыі.

2. Вучэбныя праграмы па вучэбных прадметах, модулях агульнаадукацыйнага кампанента датычацца да вучэбна-праграмнай дакументацыі адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі і выкарыстоўваюцца пры вывучэнні вучэбных прадметаў, модуляў агульнаадукацыйнага кампанента.

3. Тыпавы вучэбны план агульнаадукацыйнага кампанента прафесійна-тэхнічнай адукацыі з’яўляецца тэхнічным нарматыўным прававым актам, распрацоўваецца на аснове тыпавога вучэбнага плана агульнай сярэдняй адукацыі і ўключае ў сябе пералік і паслядоўнасць вывучэння вучэбных прадметаў, модуляў па навучальных гадах, колькасць вучэбных гадзін, якія адводзяцца на іх вывучэнне, і выкарыстоўваецца пры распрацоўцы вучэбных планаў установы адукацыі па спецыяльнасці (спецыяльнасцях).

4. Навукова-метадычнае забеспячэнне прафесійна-тэхнічнай адукацыі ажыццяўляюць:

4.1. арганізацыі, што ажыццяўляюць навукова-метадычнае забеспячэнне прафесійна-тэхнічнай адукацыі;

4.2. арганізацыі, што ажыццяўляюць навукова-метадычнае забеспячэнне агульнай сярэдняй адукацыі;

4.3. установы адукацыі, што рэалізуюць адукацыйныя праграмы прафесійна-тэхнічнай адукацыі;

4.4. вучэбна-метадычныя аб’яднанні ў сферы прафесійна-тэхнічнай адукацыі;

4.5. арганізацыі, якія ўдзельнічаюць у рэалізацыі адукацыйных праграм праз сеткавую форму ўзаемадзеяння;

4.6. арганізацыі – заказчыкі кадраў;

4.7. рэспубліканскія органы дзяржаўнага кіравання, іншыя арганізацыі, падпарадкаваныя Ураду Рэспублікі Беларусь, мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы, іншыя арганізацыі і фізічныя асобы ў межах іх паўнамоцтваў у сферы прафесійна-тэхнічнай адукацыі.

**Артыкул 180. Вучэбна-праграмная дакументацыя адукацыйных праграм прафесійна-тэхнічнай адукацыі**

1. Вучэбна-праграмная дакументацыя адукацыйных праграм прафесійна-тэхнічнай адукацыі ўключае ў сябе вучэбныя планы і вучэбныя праграмы.

2. Вучэбныя планы падзяляюцца на:

2.1. прыкладныя вучэбныя планы па спецыяльнасцях;

2.2. вучэбныя планы ўстаноў адукацыі па спецыяльнасці (спецыяльнасцях);

2.3. эксперыментальныя вучэбныя планы па спецыяльнасці (спецыяльнасцях);

2.4. індывідуальныя вучэбныя планы.

3. Прыкладны вучэбны план па спецыяльнасці ўключае ў сябе агульнаадукацыйны кампанент, дзяржаўны кампанент, кампанент установы адукацыі і ўстанаўлівае з улікам тэрмінаў атрымання прафесійна-тэхнічнай адукацыі аб’ёмы вучэбнага часу агульнаадукацыйнага кампанента, дзяржаўнага кампанента, кампанента ўстановы адукацыі, а таксама колькасць вучэбных гадзін на правядзенне факультатыўных заняткаў, карэкцыйных заняткаў (пры неабходнасці) і кансультацый, віды вучэбных заняткаў, формы і тэрміны правядзення атэстацыі, пералік неабходных кабінетаў, лабараторый, майстэрняў і іншых навучальных аб’ектаў.

Дзяржаўны кампанент прыкладнага вучэбнага плана па спецыяльнасці ўстанаўлівае пералік і паслядоўнасць вывучэння па навучальных гадах вучэбных прадметаў, модуляў, колькасць вучэбных гадзін на іх вывучэнне.

Кампанент установы адукацыі прыкладнага вучэбнага плана па спецыяльнасці ўстанаўлівае колькасць вучэбных гадзін, якая пры распрацоўцы вучэбнага плана ўстановы адукацыі па спецыяльнасці (спецыяльнасцях) выкарыстоўваецца для вывучэння вучэбных прадметаў, модуляў, у тым ліку на павышаным узроўні, з мэтай паглыблення падрыхтоўкі рабочых (служачых) у рамках спецыяльнасці (спецыяльнасцей), з улікам спецыфікі ўстановы адукацыі і інтарэсаў арганізацый – заказчыкаў кадраў.

Прыкладныя вучэбныя планы па спецыяльнасцях распрацоўваюцца на аснове адукацыйных стандартаў прафесійна-тэхнічнай адукацыі па спецыяльнасцях арганізацыямі, што ажыццяўляюць навукова-метадычнае забеспячэнне прафесійна-тэхнічнай адукацыі, і зацвярджаюцца Міністэрствам адукацыі пры наяўнасці заключэнняў Міністэрства аховы здароўя аб іх адпаведнасці заканадаўству ў сферы санітарна-эпідэміялагічнага дабрабыту насельніцтва.

4. Вучэбны план установы адукацыі па спецыяльнасці (спецыяльнасцях) распрацоўваецца на аснове тыпавога вучэбнага плана агульнаадукацыйнага кампанента прафесійна-тэхнічнай адукацыі, прыкладнага вучэбнага плана па спецыяльнасці (прыкладных вучэбных планаў па спецыяльнасцях) з улікам абраных установай адукацыі кваліфікацый і іх узроўняў і ўстанаўлівае графік адукацыйнага працэсу, пералік вучэбных прадметаў, модуляў агульнаадукацыйнага кампанента, вучэбных прадметаў, модуляў прафесійнага кампанента, які фарміруецца з дзяржаўнага кампанента і кампанента ўстановы адукацыі прыкладнага вучэбнага плана па спецыяльнасці (прыкладных вучэбных планаў па спецыяльнасцях), паслядоўнасць іх вывучэння па паўгоддзях, інтэнсіўнасць іх вывучэння (колькасць вучэбных гадзін на тыдзень), колькасць гадзін на правядзенне факультатыўных заняткаў, карэкцыйных заняткаў (пры неабходнасці) і кансультацый, вызначае абавязковы аб’ём і максімальны дапушчальны аб’ём вучэбнай нагрузкі навучэнцаў, курсантаў, віды вучэбных заняткаў, віды і формы атэстацыі навучэнцаў, курсантаў.

Вучэбныя планы ўстаноў адукацыі па спецыяльнасці (спецыяльнасцях) распрацоўваюцца па кожнай форме атрымання адукацыі гэтымі ўстановамі адукацыі і зацвярджаюцца іх заснавальнікамі.

5. Эксперыментальныя вучэбныя планы па спецыяльнасці (спецыяльнасцях) апрабуюцца ва ўстановах адукацыі, што рэалізуюць адукацыйныя праграмы прафесійна-тэхнічнай адукацыі, на базе якіх ажыццяўляецца эксперыментальная дзейнасць.

Эксперыментальныя вучэбныя планы па спецыяльнасці (спецыяльнасцях) распрацоўваюцца ўстановамі адукацыі, што рэалізуюць адукацыйныя праграмы прафесійна-тэхнічнай адукацыі, на базе якіх ажыццяўляецца эксперыментальная дзейнасць, і зацвярджаюцца Міністэрствам адукацыі.

6. Індывідуальныя вучэбныя планы ўстанаўліваюць асаблівасці атрымання прафесійна-тэхнічнай адукацыі:

адоранымі і таленавітымі навучэнцамі, курсантамі;

навучэнцамі, курсантамі, якія з уважлівых прычын не могуць пастаянна або часова наведваць вучэбныя заняткі і (або) праходзіць ва ўстаноўленыя тэрміны атэстацыю;

навучэнцамі, курсантамі, прынятымі для атрымання або працягу атрымання адукацыі на ўзроўні прафесійна-тэхнічнай адукацыі, якія засвоілі змест асобных вучэбных прадметаў, модуляў, што ўваходзяць у вучэбны план установы адукацыі па спецыяльнасці (спецыяльнасцях), аб чым ёсць дакумент аб адукацыі або дакумент аб навучанні.

Індывідуальныя вучэбныя планы распрацоўваюцца ўстановамі адукацыі, што рэалізуюць адукацыйныя праграмы прафесійна-тэхнічнай адукацыі, на аснове вучэбных планаў устаноў адукацыі па спецыяльнасці (спецыяльнасцях) і зацвярджаюцца іх кіраўнікамі па ўзгадненні з заснавальнікамі.

7. Вучэбныя праграмы падзяляюцца на:

7.1. прыкладныя вучэбныя праграмы па вучэбных прадметах, модулях;

7.2. вучэбныя праграмы ўстаноў адукацыі па вучэбных прадметах, модулях;

7.3. эксперыментальныя вучэбныя праграмы ўстаноў адукацыі па вучэбных прадметах, модулях;

7.4. вучэбныя праграмы факультатыўных заняткаў.

8. Прыкладная вучэбная праграма па вучэбным прадмеце, модулі распрацоўваецца па вучэбным прадмеце, модулі дзяржаўнага кампанента прыкладнага вучэбнага плана па спецыяльнасці, вызначае мэты вывучэння вучэбнага прадмета, модуля, яго змест, асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці навучэнцаў, курсантаў, пералік рэкамендаваных вучэбных і іншых выданняў.

Прыкладная вучэбная праграма па вучэбным прадмеце, модулі распрацоўваецца ў якасці прыкладу арганізацыі адукацыйнага працэсу па вучэбным прадмеце, модулі прафесійнага кампанента вучэбнага плана ўстановы адукацыі па спецыяльнасці (спецыяльнасцях).

Прыкладныя вучэбныя праграмы па вучэбных прадметах, модулях распрацоўваюцца арганізацыямі, што ажыццяўляюць навукова-метадычнае забеспячэнне прафесійна-тэхнічнай адукацыі, і зацвярджаюцца Міністэрствам адукацыі.

9. Вучэбная праграма ўстановы адукацыі па вучэбным прадмеце, модулі распрацоўваецца па вучэбным прадмеце, модулі прафесійнага кампанента вучэбнага плана ўстановы адукацыі па спецыяльнасці (спецыяльнасцях) на аснове адпаведных адукацыйнага стандарту прафесійна-тэхнічнай адукацыі па спецыяльнасці, вучэбнага плана ўстановы адукацыі па спецыяльнасці (спецыяльнасцях), прыкладнай вучэбнай праграмы па вучэбным прадмеце, модулі пры яе наяўнасці і вызначае мэты вывучэння вучэбнага прадмета, модуля, яго змест, асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці навучэнцаў, курсантаў. Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці навучэнцаў, курсантаў у вучэбнай праграме ўстановы адукацыі па вучэбным прадмеце, модулі прафесійнага кампанента вучэбнага плана ўстановы адукацыі па спецыяльнасці (спецыяльнасцях) вызначаюцца з улікам узроўню кваліфікацыі, якая атрымліваецца.

Вучэбныя праграмы ўстаноў адукацыі па вучэбных прадметах, модулях распрацоўваюцца ўстановамі адукацыі, што рэалізуюць адукацыйныя праграмы прафесійна-тэхнічнай адукацыі, і зацвярджаюцца іх заснавальнікамі.

10. Эксперыментальная вучэбная праграма ўстановы адукацыі па вучэбным прадмеце, модулі распрацоўваецца па вучэбным прадмеце, модулі прафесійнага кампанента эксперыментальнага вучэбнага плана па спецыяльнасці (спецыяльнасцях) або па вучэбным прадмеце, модулі прафесійнага кампанента вучэбнага плана ўстановы адукацыі па спецыяльнасці (спецыяльнасцях), апрабуецца ва ўстанове адукацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы прафесійна-тэхнічнай адукацыі, на базе якой ажыццяўляецца эксперыментальная дзейнасць.

Эксперыментальныя вучэбныя праграмы ўстаноў адукацыі па вучэбных прадметах, модулях распрацоўваюцца ўстановамі адукацыі, што рэалізуюць адукацыйныя праграмы прафесійна-тэхнічнай адукацыі, на базе якіх ажыццяўляецца эксперыментальная дзейнасць, і зацвярджаюцца Міністэрствам адукацыі.

11. Вучэбная праграма факультатыўных заняткаў вызначае змест факультатыўных заняткаў, час на іх правядзенне, асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці навучэнцаў, курсантаў. Вучэбныя праграмы факультатыўных заняткаў распрацоўваюцца ўстановамі адукацыі, што рэалізуюць адукацыйныя праграмы прафесійна-тэхнічнай адукацыі, і зацвярджаюцца іх кіраўнікамі.

**Артыкул 181. Вучэбна-метадычныя аб’яднанні ў сферы прафесійна-тэхнічнай адукацыі**

1. Для ўдасканалення навукова-метадычнага забеспячэння прафесійна-тэхнічнай адукацыі і падрыхтоўкі рабочых з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй, служачых з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй Міністэрствам адукацыі і мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі могуць стварацца вучэбна-метадычныя аб’яднанні ў сферы прафесійна-тэхнічнай адукацыі на рэспубліканскім і (або) абласным (горада Мінска) узроўнях.

2. Вучэбна-метадычныя аб’яднанні ў сферы прафесійна-тэхнічнай адукацыі ствараюцца па профілях адукацыі, напрамках адукацыі, спецыяльнасцях.

3. У склад вучэбна-метадычных аб’яднанняў у сферы прафесійна-тэхнічнай адукацыі могуць уваходзіць педагагічныя работнікі ўстаноў адукацыі, што рэалізуюць адукацыйныя праграмы прафесійна-тэхнічнай адукацыі, навуковыя работнікі, прадстаўнікі арганізацый – заказчыкаў кадраў і іншых арганізацый, зацікаўленых у падрыхтоўцы рабочых (служачых) па пэўных групах спецыяльнасцей.

4. Асноўнымі функцыямі вучэбна-метадычных аб’яднанняў у сферы прафесійна-тэхнічнай адукацыі з’яўляюцца:

4.1. удзел у распрацоўцы прапаноў па ўдасканаленні адукацыйных стандартаў прафесійна-тэхнічнай адукацыі;

4.2. удзел у распрацоўцы і ўдасканаленні вучэбна-праграмнай дакументацыі адукацыйных праграм прафесійна-тэхнічнай адукацыі;

4.3. распрацоўка прапаноў па ўдасканаленні падрыхтоўкі кадраў з улікам патрэб рынку працы.

5. Рашэнні вучэбна-метадычных аб’яднанняў у сферы прафесійна-тэхнічнай адукацыі носяць рэкамендацыйны характар.

6. Палажэнне аб вучэбна-метадычным аб’яднанні ў сферы прафесійна-тэхнічнай адукацыі зацвярджаецца Міністэрствам адукацыі.

## РАЗДЗЕЛ X
## СЯРЭДНЯЯ СПЕЦЫЯЛЬНАЯ АДУКАЦЫЯ

## ГЛАВА 30
## СІСТЭМА СЯРЭДНЯЙ СПЕЦЫЯЛЬНАЙ АДУКАЦЫІ

### Артыкул 182. Сістэма сярэдняй спецыяльнай адукацыі

1. Сярэдняя спецыяльная адукацыя – узровень асноўнай адукацыі, накіраваны на развіццё асобы навучэнца, курсанта, фарміраванне ў іх кампетэнцый, неабходных для ажыццяўлення прафесійнай дзейнасці, які завяршаецца прысваеннем кваліфікацыі спецыяліста з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, рабочага з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй.

2. Сістэма сярэдняй спецыяльнай адукацыі ўключае ў сябе:

2.1. удзельнікаў адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адукацыйных праграм сярэдняй спецыяльнай адукацыі;

2.2. адукацыйныя праграмы сярэдняй спецыяльнай адукацыі;

2.3. установы сярэдняй спецыяльнай адукацыі;

2.4. іншыя ўстановы адукацыі, што рэалізуюць адукацыйныя праграмы сярэдняй спецыяльнай адукацыі;

2.5. дзяржаўныя арганізацыі адукацыі, якія забяспечваюць функцыянаванне сістэмы адукацыі;

2.6. вучэбна-метадычныя аб’яднанні ў сферы сярэдняй спецыяльнай адукацыі;

2.7. арганізацыі, што забяспечваюць правядзенне практычных заняткаў, праходжанне практыкі навучэнцамі, курсантамі;

2.8. арганізацыі, якія ўдзельнічаюць у рэалізацыі адукацыйных праграм праз сеткавую форму ўзаемадзеяння;

2.9. арганізацыі – заказчыкі кадраў;

2.10. рэспубліканскія органы дзяржаўнага кіравання, іншыя арганізацыі, падпарадкаваныя Ураду Рэспублікі Беларусь, мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы, іншыя арганізацыі ў межах іх паўнамоцтваў у сферы сярэдняй спецыяльнай адукацыі.

### Артыкул 183. Удзельнікі адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адукацыйных праграм сярэдняй спецыяльнай адукацыі

1. Удзельнікамі адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адукацыйных праграм сярэдняй спецыяльнай адукацыі з’яўляюцца навучэнцы, курсанты, законныя прадстаўнікі непаўналетніх навучэнцаў, курсантаў, педагагічныя работнікі.

2. Навучэнцам на ўвесь перыяд атрымання сярэдняй спецыяльнай адукацыі выдаюцца білет навучэнца і кніжка паспяховасці навучэнца, узоры якіх устанаўліваюцца Міністэрствам адукацыі.

3. Курсантам на ўвесь перыяд атрымання сярэдняй спецыяльнай адукацыі выдаецца кніжка паспяховасці навучэнца, узор якой устанаўліваецца Міністэрствам адукацыі.

4. Асаблівасці педагагічнай дзейнасці педагагічных работнікаў, яе нарміраванне і парадак вызначэння колькасці педагагічных работнікаў пры рэалізацыі адукацыйных праграм сярэдняй спецыяльнай адукацыі па спецыяльнасцях для Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь, праграм падрыхтоўкі малодшых камандзіраў і праграм падрыхтоўкі афіцэраў запасу вызначаюцца Міністэрствам абароны.

### Артыкул 184. Адукацыйныя праграмы сярэдняй спецыяльнай адукацыі

1. Адукацыйныя праграмы сярэдняй спецыяльнай адукацыі падзяляюцца на:

1.1. адукацыйную праграму сярэдняй спецыяльнай адукацыі, што забяспечвае атрыманне кваліфікацыі спецыяліста з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй;

1.2. адукацыйную праграму сярэдняй спецыяльнай адукацыі, што забяспечвае атрыманне кваліфікацыі рабочага з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй.

2. Адукацыйныя праграмы сярэдняй спецыяльнай адукацыі могуць інтэгравацца з адукацыйнымі праграмамі прафесійна-тэхнічнай адукацыі. Інтэграцыя адукацыйных праграм накіравана на стварэнне ўмоў для засваення зместу адукацыйных праграм сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў скарочаныя тэрміны.

3. Адукацыйная праграма сярэдняй спецыяльнай адукацыі, што забяспечвае атрыманне кваліфікацыі спецыяліста з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, прадугледжвае базавы або павышаны ўзровень вывучэння вучэбных прадметаў, модуляў, праходжання практыкі.

4. Пры засваенні зместу адукацыйных праграм сярэдняй спецыяльнай адукацыі на аснове агульнай базавай адукацыі забяспечваецца атрыманне агульнай сярэдняй адукацыі.

5. Пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы сярэдняй спецыяльнай адукацыі, што забяспечвае атрыманне кваліфікацыі спецыяліста з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, у выпадках, прадугледжаных адукацыйнымі стандартамі сярэдняй спецыяльнай адукацыі, ажыццяўляецца прысваенне кваліфікацыі рабочага.

6. Адукацыйныя праграмы сярэдняй спецыяльнай адукацыі рэалізуюцца ў вочнай, завочнай і дыстанцыйнай формах атрымання адукацыі.

7. Адукацыйныя праграмы сярэдняй спецыяльнай адукацыі рэалізуюцца ва ўстановах сярэдняй спецыяльнай адукацыі, гімназіях – каледжах мастацтваў, вучылішчах алімпійскага рэзерву, а таксама могуць рэалізоўвацца ва ўстановах вышэйшай адукацыі. Віды адукацыйных праграм сярэдняй спецыяльнай адукацыі, што рэалізуюцца ва ўказаных установах адукацыі, вызначаюцца гэтым Кодэксам.

8. Асаблівасці рэалізацыі адукацыйных праграм сярэдняй спецыяльнай адукацыі па спецыяльнасцях для воінскіх фарміраванняў і ваенізаваных арганізацый, грамадзянскай авіяцыі ўстанаўліваюцца адпаведным дзяржаўным органам, падпарадкаваным і (або) падсправаздачным Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь, рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання і Міністэрствам адукацыі.

### Артыкул 185. Адукацыйныя стандарты сярэдняй спецыяльнай адукацыі

1. Адукацыйныя стандарты сярэдняй спецыяльнай адукацыі распрацоўваюцца па кожнай спецыяльнасці і ўстанаўліваюць патрабаванні да вынікаў засваення зместу адукацыйных праграм сярэдняй спецыяльнай адукацыі, зместу вучэбна-праграмнай дакументацыі адукацыйных праграм сярэдняй спецыяльнай адукацыі, тэрмінаў атрымання сярэдняй спецыяльнай адукацыі, выніковай атэстацыі, кваліфікацыі, што прысвойваецца. Патрабаванні да вынікаў засваення зместу адукацыйных праграм сярэдняй спецыяльнай адукацыі ўключаюць у сябе фарміруемыя кампетэнцыі навучэнцаў.

2. Распрацоўку адукацыйных стандартаў сярэдняй спецыяльнай адукацыі, акрамя адукацыйных стандартаў сярэдняй спецыяльнай адукацыі па напрамках адукацыі «Мастацтва», «Ахова здароўя» і «Сельская гаспадарка», арганізуе Міністэрства адукацыі і ажыццяўляе яе сумесна з арганізацыямі, што ажыццяўляюць навукова-метадычнае забеспячэнне сярэдняй спецыяльнай адукацыі, вучэбна-метадычнымі аб’яднаннямі ў сферы сярэдняй спецыяльнай адукацыі і арганізацыямі – заказчыкамі кадраў.

Распрацоўку адукацыйных стандартаў сярэдняй спецыяльнай адукацыі па напрамку адукацыі «Мастацтва» арганізуе Міністэрства культуры і ажыццяўляе сумесна з арганізацыямі, што ажыццяўляюць навукова-метадычнае забеспячэнне сярэдняй

спецыяльнай адукацыі, вучэбна-метадычным аб’яднаннем у сферы сярэдняй спецыяльнай адукацыі па напрамку адукацыі «Мастацтва».

Распрацоўку адукацыйных стандартаў сярэдняй спецыяльнай адукацыі па напрамку адукацыі «Ахова здароўя» арганізуе Міністэрства аховы здароўя і ажыццяўляе сумесна з арганізацыямі, што ажыццяўляюць навукова-метадычнае забеспячэнне сярэдняй спецыяльнай адукацыі, вучэбна-метадычным аб’яднаннем у сферы сярэдняй спецыяльнай адукацыі па напрамку адукацыі «Ахова здароўя».

Распрацоўку адукацыйных стандартаў сярэдняй спецыяльнай адукацыі па напрамку адукацыі «Сельская гаспадарка» арганізуе Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання і ажыццяўляе сумесна з арганізацыямі, што ажыццяўляюць навукова-метадычнае забеспячэнне сярэдняй спецыяльнай адукацыі, вучэбна-метадычным аб’яднаннем у сферы сярэдняй спецыяльнай адукацыі па напрамку адукацыі «Сельская гаспадарка».

3. Адукацыйныя стандарты сярэдняй спецыяльнай адукацыі, акрамя адукацыйных стандартаў сярэдняй спецыяльнай адукацыі па напрамках адукацыі «Мастацтва», «Ахова здароўя» і «Сельская гаспадарка», зацвярджаюцца Міністэрствам адукацыі па ўзгадненні з зацікаўленымі дзяржаўнымі органамі, падпарадкаванымі і (або) падсправаздачнымі Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь, рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання, іншымі арганізацыямі, падпарадкаванымі Ураду Рэспублікі Беларусь.

Адукацыйныя стандарты сярэдняй спецыяльнай адукацыі па напрамку адукацыі «Мастацтва» зацвярджаюцца Міністэрствам адукацыі і Міністэрствам культуры.

Адукацыйныя стандарты сярэдняй спецыяльнай адукацыі па напрамку адукацыі «Ахова здароўя» зацвярджаюцца Міністэрствам адукацыі і Міністэрствам аховы здароўя.

Адукацыйныя стандарты сярэдняй спецыяльнай адукацыі па напрамку адукацыі «Сельская гаспадарка» зацвярджаюцца Міністэрствам адукацыі і Міністэрствам сельскай гаспадаркі і харчавання.

**Артыкул 186. Тэрмін атрымання сярэдняй спецыяльнай адукацыі**

1. Тэрмін атрымання сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў дзённай форме атрымання адукацыі складае:

1.1. на аснове агульнай базавай адукацыі – ад трох да чатырох гадоў;

1.2. на аснове агульнай сярэдняй адукацыі – ад двух да трох гадоў;

1.3. на аснове прафесійна-тэхнічнай адукацыі з агульнай сярэдняй адукацыяй – ад аднаго года да трох гадоў;

1.4. на аснове агульнай базавай або агульнай сярэдняй адукацыі – адзіны тэрмін ад трох да чатырох гадоў для асобных спецыяльнасцей напрамку адукацыі «Мастацтва», пералік якіх устанаўліваецца Міністэрствам культуры па ўзгадненні з Міністэрствам адукацыі.

2. Тэрміны атрымання сярэдняй спецыяльнай адукацыі пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы сярэдняй спецыяльнай адукацыі, што забяспечвае атрыманне кваліфікацыі спецыяліста з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй і прадугледжвае павышаны ўзровень вывучэння вучэбных прадметаў, модуляў, праходжання практыкі, сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў вячэрняй, завочнай або дыстанцыйнай форме атрымання адукацыі вызначаюцца тэрмінам атрымання сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў дзённай форме атрымання адукацыі і павялічваюцца не больш чым на адзін год.

3. Тэрмін атрымання сярэдняй спецыяльнай адукацыі пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы сярэдняй спецыяльнай адукацыі, што забяспечвае атрыманне кваліфікацыі спецыяліста з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, для навучэнцаў вучылішчаў алімпійскага рэзерву паводле рашэння заснавальнікаў вучылішчаў алімпійскага рэзерву можа быць павялічаны не больш чым на два гады з прычыны ўдзелу на працягу навучальнага года ў складзе нацыянальных і зборных каманд Рэспублікі Беларусь па відах спорту ў спартыўных мерапрыемствах.

## ГЛАВА 31
## УСТАНОВЫ СЯРЭДНЯЙ СПЕЦЫЯЛЬНАЙ АДУКАЦЫІ. УЗАЕМАДЗЕЯННЕ ЎСТАНОЎ АДУКАЦЫІ ПРЫ РЭАЛІЗАЦЫІ АДУКАЦЫЙНЫХ ПРАГРАМ СЯРЭДНЯЙ СПЕЦЫЯЛЬНАЙ АДУКАЦЫІ З АРГАНІЗАЦЫЯМІ – ЗАКАЗЧЫКАМІ КАДРАЎ

### Артыкул 187. Установы сярэдняй спецыяльнай адукацыі

1. Установа сярэдняй спецыяльнай адукацыі – установа адукацыі, якая рэалізуе адну або некалькі адукацыйных праграм сярэдняй спецыяльнай адукацыі, адну або некалькі адукацыйных праграм прафесійна-тэхнічнай адукацыі, а таксама можа рэалізоўваць адукацыйную праграму дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, адукацыйныя праграмы дадатковай адукацыі дарослых, акрамя адукацыйнай праграмы перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць вышэйшую адукацыю, адукацыйнай праграмы рэпетыцыйнага тэсціравання, адукацыйную праграму базавай адукацыі, адукацыйную праграму сярэдняй адукацыі ў філіялах дзяржаўных каледжаў, што знаходзяцца на тэрыторыі папраўчых устаноў крымінальна-выканаўчай сістэмы Міністэрства ўнутраных спраў, рэспубліканскіх унітарных вытворчых прадпрыемстваў, падпарадкаваных Дэпартаменту выканання пакаранняў Міністэрства ўнутраных спраў, лячэбна-працоўных прафілакторыяў Міністэрства ўнутраных спраў.

2. Установай сярэдняй спецыяльнай адукацыі з’яўляецца каледж.

3. У каледжы могуць ствараццa структурныя падраздзяленні: аддзяленне, лабараторыя, цэнтр, цэнтр кампетэнцый, навучальна-вытворчая майстэрня, навучальная гаспадарка, навучальна-доследная гаспадарка, цэнтр прафесійнай і сацыяльнай рэабілітацыі асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, ваенны факультэт, ваенная кафедра, іншыя структурныя падраздзяленні.

З мэтай падрыхтоўкі спецыялістаў з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй па спецыяльнасцях для воінскіх фарміраванняў і ваенізаваных арганізацый, навучання грамадзян па праграмах падрыхтоўкі малодшых камандзіраў і праграмах падрыхтоўкі афіцэраў запасу ў каледжы можа ствараццa ваенны факультэт, а для навучання грамадзян па праграмах падрыхтоўкі малодшых камандзіраў і праграмах падрыхтоўкі афіцэраў запасу – ваенная кафедра. Падрыхтоўка спецыялістаў з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй па спецыяльнасцях для воінскіх фарміраванняў і ваенізаваных арганізацый, навучанне грамадзян па праграмах падрыхтоўкі малодшых камандзіраў і праграмах падрыхтоўкі афіцэраў запасу ажыццяўляюцца ў межах кантрольных лічбаў прыёму і заказу на падрыхтоўку такіх спецыялістаў, што ўстанаўліваюцца Міністэрствам абароны. Палажэнні аб ваенным факультэце, ваеннай кафедры зацвярджаюцца Міністэрствам абароны і дзяржаўным органам, у падпарадкаванні якога знаходзіцца каледж. Парадак працы ваеннага факультэта, ваеннай кафедры пры падрыхтоўцы спецыялістаў з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй па спецыяльнасцях для воінскіх фарміраванняў і ваенізаваных арганізацый, навучанні грамадзян па праграмах падрыхтоўкі малодшых камандзіраў і праграмах падрыхтоўкі афіцэраў запасу, крытэрыі і парадак адбору грамадзян для навучання па праграмах падрыхтоўкі малодшых камандзіраў і праграмах падрыхтоўкі афіцэраў запасу вызначаюцца Міністэрствам абароны і Міністэрствам адукацыі. Тыпавыя штаты і нарматывы колькасці ваеннаслужачых і грамадзянскага персаналу ваенных факультэтаў вызначаюцца Міністэрствам абароны і дзяржаўным органам, у падпарадкаванні якога знаходзіцца каледж. Парадак распрацоўкі і зацвярджэння штатных раскладаў ваенных кафедраў вызначаецца Міністэрствам абароны і дзяржаўным органам, у падпарадкаванні якога знаходзіцца каледж.

4. З мэтай удасканалення якасці адукацыі, павышэння педагагічнага майстэрства педагагічных работнікаў, навукова-метадычнага забеспячэння прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў каледжы ствараюцца прадметныя (цыклавыя) камісіі.

Прадметныя (цыклавыя) камісіі ажыццяўляюць сваю дзейнасць у адпаведнасці з Палажэннем аб установе сярэдняй спецыяльнай адукацыі.

**Артыкул 188. Кіраванне ўстановай сярэдняй спецыяльнай адукацыі**

1. Непасрэднае кіраўніцтва ўстановай сярэдняй спецыяльнай адукацыі ажыццяўляе яе кіраўнік (дырэктар, начальнік).

2. Кіраўнік установы сярэдняй спецыяльнай адукацыі прызначаецца на пасаду і вызваляецца ад пасады заснавальнікам установы сярэдняй спецыяльнай адукацыі або ўпаўнаважаным ім органам.

3. Асноўным органам самакіравання ўстановы сярэдняй спецыяльнай адукацыі з'яўляецца савет, які ўзначальваецца кіраўніком гэтай установы адукацыі.

4. Ва ўстанове сярэдняй спецыяльнай адукацыі ствараецца педагагічны савет і могуць стварацца апекавальніцкі савет, метадычны савет, вучнёўскі савет.

**Артыкул 189. Статус установы адукацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы сярэдняй спецыяльнай адукацыі**

1. Установе адукацыі, што рэалізуе адну або некалькі адукацыйных праграм сярэдняй спецыяльнай адукацыі, у сістэме сярэдняй спецыяльнай адукацыі можа быць прадастаўлены статус «вядучая ўстанова адукацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы сярэдняй спецыяльнай адукацыі» на рэспубліканскім або абласным (горада Мінска) узроўні.

2. Статус «вядучая ўстанова адукацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы сярэдняй спецыяльнай адукацыі» на рэспубліканскім узроўні прадастаўляецца з мэтай трывалага развіцця сістэмы сярэдняй спецыяльнай адукацыі, узмацнення яе ролі ў забеспячэнні кваліфікаванымі кадрамі навукаёмістых, высокатэхналагічных вытворчасцей, распрацоўкі адукацыйных стандартаў па спецыяльнасцях, сучасных адукацыйных тэхналогій, сродкаў навучання і выхавання, а таксама з іншымі мэтамі ў сферы сярэдняй спецыяльнай адукацыі і вызначаецца па профілях адукацыі і (або) напрамках адукацыі.

Статус «вядучая ўстанова адукацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы сярэдняй спецыяльнай адукацыі» на рэспубліканскім узроўні прадастаўляецца Міністэрствам адукацыі на падставе прапаноў дзяржаўных органаў, арганізацый, у падпарадкаванні якіх знаходзяцца ўстановы адукацыі.

3. Статус «вядучая ўстанова адукацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы сярэдняй спецыяльнай адукацыі» на абласным (горада Мінска) узроўні прадастаўляецца з мэтай удасканалення навукова-метадычнага забеспячэння сярэдняй спецыяльнай адукацыі, каардынацыі дзейнасці ўстаноў адукацыі, што рэалізуюць адукацыйныя праграмы сярэдняй спецыяльнай адукацыі і размешчаны на тэрыторыі адпаведнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі, пры рэалізацыі інавацыйных праектаў і рашэнні іншых задач у сферы сярэдняй спецыяльнай адукацыі адпаведнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі.

Статус «вядучая ўстанова адукацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы сярэдняй спецыяльнай адукацыі» на абласным (горада Мінска) узроўні прадастаўляецца Міністэрствам адукацыі на падставе прапаноў дзяржаўных органаў, арганізацый, у падпарадкаванні якіх знаходзяцца ўстановы адукацыі.

**Артыкул 190. Узаемадзеянне ўстаноў адукацыі пры рэалізацыі адукацыйных праграм сярэдняй спецыяльнай адукацыі з арганізацыямі – заказчыкамі кадраў**

1. Узаемадзеянне ўстаноў адукацыі пры рэалізацыі адукацыйных праграм сярэдняй спецыяльнай адукацыі з арганізацыямі – заказчыкамі кадраў ажыццяўляецца з мэтай

забеспячэння арганізацый, што маюць патрэбы ў падрыхтоўцы спецыялістаў з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, рабочых з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, спецыялістамі з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, рабочымі з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй.

2. Узаемадзеянне пры падрыхтоўцы спецыялістаў з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, рабочых з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, акрамя падрыхтоўкі спецыялістаў і рабочых з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй па спецыяльнасцях для Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь і транспартных войскаў, Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, ажыццяўляецца шляхам заключэння дагавора аб узаемадзеянні або падачы заяўкі на падрыхтоўку спецыялістаў з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, рабочых з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй. Дагавор аб узаемадзеянні заключаецца паміж установай адукацыі і арганізацыяй – заказчыкам кадраў. Заяўка на падрыхтоўку спецыялістаў з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, рабочых з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй падаецца арганізацыяй, якая мае патрэбу ў падрыхтоўцы спецыялістаў з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, рабочых з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, ва ўстанову адукацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы сярэдняй спецыяльнай адукацыі.

Узаемадзеянне з арганізацыямі – заказчыкамі кадраў пры падрыхтоўцы спецыялістаў і рабочых з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй па спецыяльнасцях для Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь і транспартных войскаў, Міністэрства па надзвычайных сітуацыях ажыццяўляецца ў парадку, які вызначаецца адпаведна Міністэрствам абароны, Міністэрствам па надзвычайных сітуацыях.

3. Дагавор аб узаемадзеянні ўстановы адукацыі з арганізацыяй – заказчыкам кадраў пры падрыхтоўцы спецыялістаў з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, рабочых з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй заключаецца ў выпадку, калі арганізацыя, якая мае патрэбу ў падрыхтоўцы спецыялістаў з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, рабочых з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, прымае на сябе абавязацельствы па арганізацыі праходжання практыкі навучэнцамі і правядзення з імі практычных заняткаў, развіцці матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстановы адукацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы сярэдняй спецыяльнай адукацыі.

4. Істотнымі ўмовамі дагавора аб узаемадзеянні ўстановы адукацыі з арганізацыяй – заказчыкам кадраў пры падрыхтоўцы спецыялістаў з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, рабочых з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй з'яўляюцца:

4.1. прадмет дагавора;

4.2. колькасць асоб (па гадах), якая заяўляецца для падрыхтоўкі ва ўстанове адукацыі з мэтай наступнага працаўладкавання ў арганізацыі – заказчыку кадраў, і тэрміны іх навучання;

4.3. спецыяльнасці, кваліфікацыі, па якіх будзе ажыццяўляцца падрыхтоўка;

4.4. парадак праходжання навучэнцамі практыкі, правядзення практычных заняткаў;

4.5. замацаванне аб'ектаў і абсталявання для праходжання практыкі, правядзення практычных заняткаў;

4.6. удзел у развіцці матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстановы адукацыі;

4.7. стажыроўка педагагічных работнікаў установы адукацыі ў арганізацыі – заказчыку кадраў;

4.8. удзел прадстаўнікоў арганізацыі – заказчыка кадраў у выніковай атэстацыі навучэнцаў;

4.9. працаўладкаванне выпускнікоў у арганізацыі – заказчыку кадраў.

5. Арганізацыя, што заключыла дагавор аб узаемадзеянні ўстановы адукацыі з арганізацыяй – заказчыкам кадраў пры падрыхтоўцы спецыялістаў з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, рабочых з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, прызнаецца базавай арганізацыяй адпаведнай установы адукацыі.

Базавая арганізацыя мае пераважнае права на задавальненне сваёй патрэбы ў спецыялістах з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, рабочых з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй з ліку выпускнікоў адпаведнай установы адукацыі. Пры наяўнасці некалькіх

базавых арганізацый задавальненне патрэб у спецыялістах з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, рабочых з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй ажыццяўляецца ў парадку чарговасці, якая вызначаецца датай заключэння адпаведных дагавораў.

6. Дагавор аб узаемадзеянні ўстановы адукацыі з арганізацыяй – заказчыкам кадраў пры падрыхтоўцы спецыялістаў з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, рабочых з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй заключаецца паміж установамі адукацыі і арганізацыямі дзяржаўнай формы ўласнасці па ўзгадненні з дзяржаўнымі органамі, арганізацыямі, у падпарадкаванні якіх яны знаходзяцца, а паміж установамі адукацыі і прыватнымі арганізацыямі – па ўзгадненні з іх заснавальнікамі.

7. Заяўка на падрыхтоўку спецыялістаў з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, рабочых з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй – накіроўваемы ва ўстанову адукацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы сярэдняй спецыяльнай адукацыі, заказ арганізацыі, якая мае патрэбу ў падрыхтоўцы спецыялістаў з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, рабочых з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, на падрыхтоўку спецыялістаў з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, рабочых з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй з мэтай іх наступнага працаўладкавання ў гэтай арганізацыі.

8. У заяўцы на падрыхтоўку спецыялістаў з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, рабочых з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй указваюцца:

8.1. колькасць асоб (па гадах), якая заяўляецца для падрыхтоўкі;

8.2. спецыяльнасці, кваліфікацыі, па якіх ёсць патрэба ў падрыхтоўцы.

9. Палажэнне аб базавай арганізацыі ўстановы адукацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы сярэдняй спецыяльнай адукацыі, зацвярджаецца Урадам Рэспублікі Беларусь або ўпаўнаважаным ім органам, прыкладная форма дагавора аб узаемадзеянні ўстановы адукацыі з арганізацыяй – заказчыкам кадраў пры падрыхтоўцы спецыялістаў з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, рабочых з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй і парадак яго заключэння, форма заяўкі на падрыхтоўку спецыялістаў з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, рабочых з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй устанаўліваюцца Урадам Рэспублікі Беларусь або ўпаўнаважаным ім органам.

## ГЛАВА 32
## АРГАНІЗАЦЫЯ АДУКАЦЫЙНАГА ПРАЦЭСУ ПРЫ РЭАЛІЗАЦЫІ АДУКАЦЫЙНЫХ ПРАГРАМ СЯРЭДНЯЙ СПЕЦЫЯЛЬНАЙ АДУКАЦЫІ

### Артыкул 191. Агульныя патрабаванні да арганізацыі адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адукацыйных праграм сярэдняй спецыяльнай адукацыі

1. Адукацыйны працэс пры рэалізацыі адукацыйных праграм сярэдняй спецыяльнай адукацыі арганізуецца ва ўстановах адукацыі па навучальных гадах (курсах навучання). Навучальны год пры рэалізацыі адукацыйных праграм сярэдняй спецыяльнай адукацыі дзеліцца на семестры.

Пры рэалізацыі адукацыйных праграм сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў вочнай форме атрымання адукацыі ў навучальным годзе арганізуюцца экзаменацыйныя сесіі, у завочнай і дыстанцыйнай формах атрымання адукацыі – лабараторна-экзаменацыйныя сесіі.

Пры арганізацыі адукацыйнага працэсу ў завочнай форме атрымання адукацыі можа быць прадугледжана правядзенне ўстановачных сесій.

2. Для навучэнцаў, курсантаў, акрамя курсантаў, якія засвойваюць змест адукацыйных праграм сярэдняй спецыяльнай адукацыі па спецыяльнасцях для воінскіх фарміраванняў і ваенізаваных арганізацый, устанаўліваюцца:

канікулы на працягу навучальнага года працягласцю не меншай за 2 каляндарныя тыдні;

летнія канікулы працягласцю не меншай за 6 каляндарных тыдняў.

Для курсантаў, якія засвойваюць змест адукацыйных праграм сярэдняй спецыяльнай адукацыі па спецыяльнасцях для воінскіх фарміраванняў і ваенізаваных арганізацый, устанаўліваюцца канікулярныя водпускі, працягласць і асаблівасці прадастаўлення якіх устанаўліваюцца заканадаўствам аб праходжанні адпаведнай службы.

3. Асноўнай формай арганізацыі адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адукацыйных праграм сярэдняй спецыяльнай адукацыі з'яўляюцца вучэбныя заняткі: урок, лекцыя, курсавое праектаванне, семінарскія, лабараторныя, практычныя і іншыя вучэбныя заняткі, практыка. Колькасць гадзін, якія адводзяцца на вучэбную і вытворчую практыку, складае не менш за 20 працэнтаў ад агульнай колькасці гадзін, устаноўленых на рэалізацыю прафесійнага кампанента вучэбнага плана ўстановы адукацыі па спецыяльнасці. Дадаткова да вучэбных заняткаў праводзяцца факультатыўныя заняткі, кансультацыі. Вучэбныя заняткі могуць праводзіцца па зменах.

Парадак арганізацыі вучэбнай і вытворчай практыкі вызначаецца Палажэннем аб практыцы навучэнцаў, курсантаў, якія засвойваюць змест адукацыйных праграм сярэдняй спецыяльнай адукацыі, якое зацвярджаецца Урадам Рэспублікі Беларусь.

4. Адукацыйны працэс пры рэалізацыі адукацыйных праграм сярэдняй спецыяльнай адукацыі ажыццяўляецца ў вучэбных групах або індывідуальна. Вучэбныя групы могуць аб'ядноўвацца ў патокі.

Выхаваўчая праца ў невучэбны час з навучэнцамі, курсантамі праводзіцца педагагічнымі работнікамі, у тым ліку тымі, якія выконваюць функцыі куратара вучэбнай групы.

5. Напаўняльнасць вучэбнай групы пры атрыманні сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў дзённай форме атрымання адукацыі на момант яе фарміравання складае ад 25 да 30 навучэнцаў, курсантаў, у вячэрняй, завочнай і дыстанцыйнай формах атрымання адукацыі – ад 15 да 20 навучэнцаў, курсантаў.

Напаўняльнасць вучэбнай групы пры атрыманні сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў вучылішчы алімпійскага рэзерву на момант яе фарміравання складае ад 15 да 20 навучэнцаў. Напаўняльнасць вучэбнай групы пры атрыманні адукацыі па спецыяльнасцях напрамку адукацыі «Мастацтва» на момант яе фарміравання складае ад 20 да 30 навучэнцаў.

Напаўняльнасць вучэбнай групы пры атрыманні сярэдняй спецыяльнай адукацыі па спецыяльнасцях для воінскіх фарміраванняў, праграмах падрыхтоўкі малодшых камандзіраў і праграмах падрыхтоўкі афіцэраў запасу вызначаецца кантрольнымі лічбамі прыёму і заказам на падрыхтоўку спецыялістаў, якія зацвярджаюцца адпаведным рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання, і на момант яе фарміравання складае не менш за 5 навучэнцаў, курсантаў.

Напаўняльнасць вучэбнай групы, у якой адукацыйны працэс арганізаваны толькі для асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, на момант яе фарміравання складае ад 6 да 12 навучэнцаў, курсантаў.

Напаўняльнасць вучэбнай групы, у якой адукацыйны працэс арганізаваны для асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця і іншых асоб, на момант яе фарміравання складае ад 15 да 20 навучэнцаў, курсантаў, з іх не больш за 6 навучэнцаў, курсантаў з ліку асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця.

6. Заснавальнік установы адукацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы сярэдняй спецыяльнай адукацыі, можа ўстанаўліваць меншую напаўняльнасць вучэбных груп.

7. У выпадках, прадугледжаных Палажэннем аб установе сярэдняй спецыяльнай адукацыі, вучэбныя групы могуць дзяліцца на падгрупы.

8. Адукацыйны працэс ажыццяўляецца індывідуальна на падставе рашэння кіраўніка ўстановы адукацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы сярэдняй спецыяльнай адукацыі, у адпаведнасці з індывідуальным вучэбным планам або на падставе вучэбнага плана ўстановы адукацыі па спецыяльнасці.

### Артыкул 192. Агульныя патрабаванні да прыёму (залічэння) асоб для атрымання сярэдняй спецыяльнай адукацыі

1. Ва ўстанову адукацыі для атрымання сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў дзённай форме атрымання адукацыі прымаюцца (залічваюцца) асобы, якія маюць агульную базавую, агульную сярэднюю адукацыю або прафесійна-тэхнічную адукацыю з агульнай сярэдняй адукацыяй, а ў вячэрняй, завочнай або дыстанцыйнай форме атрымання адукацыі – асобы, якія маюць агульную сярэднюю адукацыю або прафесійна-тэхнічную адукацыю з агульнай сярэдняй адукацыяй.

2. Прыём (залічэнне) асоб для атрымання сярэдняй спецыяльнай адукацыі па спецыяльнасцях, якія ўказаны ў Правілах прыёму асоб для атрымання сярэдняй спецыяльнай адукацыі, ажыццяўляецца пасля праходжання прафесійнага адбору, па выніках якога гэтыя асобы дапускаюцца або не допускаюцца да ўдзелу ў конкурсе па адпаведнай спецыяльнасці.

3. Для арганізацыі прыёму (залічэння) асоб для атрымання сярэдняй спецыяльнай адукацыі ва ўстанове адукацыі ствараецца прыёмная камісія. Прыёмная камісія ажыццяўляе сваю дзейнасць у адпаведнасці з Палажэннем аб прыёмнай камісіі ўстановы адукацыі па прыёме асоб для атрымання сярэдняй спецыяльнай адукацыі, якое зацвярджаецца Міністэрствам адукацыі.

4. Прыём (залічэнне) асоб для атрымання сярэдняй спецыяльнай адукацыі ажыццяўляецца ў адпаведнасці з Правіламі прыёму асоб для атрымання сярэдняй спецыяльнай адукацыі.

## ГЛАВА 33
## АТЭСТАЦЫЯ НАВУЧЭНЦАЎ, КУРСАНТАЎ ПРЫ ЗАСВАЕННІ ЗМЕСТУ АДУКАЦЫЙНЫХ ПРАГРАМ СЯРЭДНЯЙ СПЕЦЫЯЛЬНАЙ АДУКАЦЫІ

### Артыкул 193. Бягучая і прамежкавая атэстацыя навучэнцаў, курсантаў пры засваенні зместу адукацыйных праграм сярэдняй спецыяльнай адукацыі

1. Навучэнцы, курсанты пры засваенні зместу адукацыйных праграм сярэдняй спецыяльнай адукацыі праходзяць бягучую і прамежкавую атэстацыю па вучэбных прадметах, модулях агульнаадукацыйнага кампанента, вучэбных прадметах, модулях прафесійнага кампанента вучэбнага плана ўстановы адукацыі па спецыяльнасці.

2. Бягучая атэстацыя навучэнцаў, курсантаў праводзіцца на працягу семестра з мэтай перыядычнага кантролю і ацэнкі вынікаў іх вучэбнай дзейнасці па вучэбным прадмеце, модулі агульнаадукацыйнага кампанента, вучэбным прадмеце, модулі прафесійнага кампанента вучэбнага плана ўстановы адукацыі па спецыяльнасці, якія вывучаюцца ў семестры, праходжання практыкі.

3. Прамежкавая атэстацыя навучэнцаў, курсантаў праводзіцца з мэтай ацэнкі вынікаў іх вучэбнай дзейнасці за семестр (навучальны год) па вучэбным прадмеце, модулі агульнаадукацыйнага кампанента, вучэбным прадмеце, модулі прафесійнага кампанента вучэбнага плана ўстановы адукацыі па спецыяльнасці, якія вывучаюцца ў семестры (навучальным годзе), праходжання практыкі.

Прамежкавая атэстацыя навучэнцаў, курсантаў пры засваенні зместу адукацыйных праграм сярэдняй спецыяльнай адукацыі праводзіцца ў адпаведнасці з патрабаваннямі адпаведнага адукацыйнага стандарту сярэдняй спецыяльнай адукацыі, вучэбна-праграмнай дакументацыі адукацыйных праграм сярэдняй спецыяльнай адукацыі.

4. Навучэнцы, курсанты, якія не прайшлі прамежкавую атэстацыю ва ўстаноўленыя тэрміны з прычыны атрымання нездавальняючай адзнакі або няяўкі, праходзяць яе ў іншыя тэрміны ў парадку, які вызначаецца Правіламі правядзення атэстацыі навучэнцаў, курсантаў пры засваенні зместу адукацыйных праграм сярэдняй спецыяльнай адукацыі.

5. Вынік прамежкавай атэстацыі, які выявіўся ў атрыманні нездавальняючай адзнакі, або няяўка для праходжання атэстацыі ва ўстаноўлены ўстановай адукацыі тэрмін без уважлівай прычыны з'яўляюцца акадэмічнай запазычанасцю.

Навучэнцы, курсанты абавязаны ліквідаваць акадэмічную запазычанасць у парадку, які вызначаецца Правіламі правядзення атэстацыі навучэнцаў, курсантаў пры засваенні зместу адукацыйных праграм сярэдняй спецыяльнай адукацыі.

Навучэнцы, курсанты, якія маюць акадэмічную запазычанасць не больш чым па двух вучэбных прадметах, модулях, па практыцы вучэбнага плана ўстановы адукацыі па спецыяльнасці або якім вызначаны індывідуальны тэрмін праходжання прамежкавай атэстацыі, што прыпадае на наступны семестр, пераводзяцца на наступны семестр умоўна.

6. Формы, умовы і парадак правядзення бягучай і прамежкавай атэстацыі навучэнцаў, курсантаў пры засваенні зместу адукацыйных праграм сярэдняй спецыяльнай адукацыі, крытэрыі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці навучэнцаў, курсантаў, парадак правядзення бягучай і прамежкавай атэстацыі ў частцы, не ўрэгуляванай гэтым Кодэксам, вызначаюцца Правіламі правядзення атэстацыі навучэнцаў, курсантаў пры засваенні зместу адукацыйных праграм сярэдняй спецыяльнай адукацыі.

**Артыкул 194. Выніковая атэстацыя навучэнцаў, курсантаў пры засваенні зместу адукацыйных праграм сярэдняй спецыяльнай адукацыі**

1. Навучэнцы, курсанты пры засваенні зместу адукацыйных праграм сярэдняй спецыяльнай адукацыі праходзяць выніковую атэстацыю па вучэбных прадметах, модулях агульнаадукацыйнага кампанента вучэбнага плана ўстановы адукацыі па спецыяльнасці, па якіх праводзяцца выніковыя іспыты пасля завяршэння навучання і выхавання на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі.

Пералік вучэбных прадметаў, модуляў, па якіх праводзяцца выніковыя іспыты пасля завяршэння навучання і выхавання на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі, віды і формы выніковых іспытаў штогод да пачатку навучальнага года ўстанаўліваюцца Міністэрствам адукацыі.

2. Навучэнцы могуць быць вызвалены ад выніковых іспытаў па вучэбных прадметах, модулях агульнаадукацыйнага кампанента вучэбнага плана ўстановы адукацыі па спецыяльнасці (спецыяльнасцях). Падставы для вызвалення навучэнцаў ад выніковых іспытаў устанаўліваюцца Міністэрствам адукацыі. У выпадку вызвалення навучэнцаў ад выніковых іспытаў выніковая атэстацыя праводзіцца на падставе гадавых адзнак.

3. Навучэнцы, курсанты пры завяршэнні засваення зместу адукацыйных праграм сярэдняй спецыяльнай адукацыі праходзяць выніковую атэстацыю па спецыяльнасці.

4. Выніковая атэстацыя па спецыяльнасці праводзіцца дзяржаўнымі кваліфікацыйнымі камісіямі, а па вучэбных прадметах, модулях агульнаадукацыйнага кампанента вучэбнага плана ўстановы адукацыі па спецыяльнасці, па якіх праводзяцца іспыты, – экзаменацыйнымі камісіямі.

5. Формы, умовы правядзення выніковай атэстацыі навучэнцаў, курсантаў пры засваенні зместу адукацыйных праграм сярэдняй спецыяльнай адукацыі, крытэрыі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці навучэнцаў, курсантаў, парадак і ўмовы допуску навучэнцаў, курсантаў да выніковай атэстацыі, парадак стварэння і функцыянавання дзяржаўных кваліфікацыйных камісій, экзаменацыйных камісій, парадак правядзення выніковай атэстацыі ў частцы, не ўрэгуляванай гэтым Кодэксам, вызначаюцца Правіламі правядзення атэстацыі навучэнцаў, курсантаў пры засваенні зместу адукацыйных праграм сярэдняй спецыяльнай адукацыі.

6. Навучэнцам, курсантам, якія не прайшлі выніковую атэстацыю ва ўстаноўлены тэрмін па ўважлівай прычыне, прадастаўляецца права на праходжанне выніковай атэстацыі ў іншы тэрмін падчас працы дзяржаўных кваліфікацыйных камісій, экзаменацыйных камісій.

7. Для курсантаў, якія засвойваюць змест адукацыйных праграм сярэдняй спецыяльнай адукацыі па спецыяльнасцях для воінскіх фарміраванняў і ваенізаваных арганізацый, адпаведным дзяржаўным органам, падпарадкаваным і (або) падсправаздачным Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь, рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання могуць устанаўлівацца асаблівасці праходжання выніковай атэстацыі.

## ГЛАВА 34
## НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ СЯРЭДНЯЙ СПЕЦЫЯЛЬНАЙ АДУКАЦЫІ

### Артыкул 195. Сістэма навукова-метадычнага забеспячэння сярэдняй спецыяльнай адукацыі

1. Навукова-метадычнае забеспячэнне сярэдняй спецыяльнай адукацыі ўключае ў сябе:

1.1. вучэбна-праграмную дакументацыю адукацыйных праграм сярэдняй спецыяльнай адукацыі;

1.2. вучэбныя праграмы па вучэбных прадметах, модулях агульнаадукацыйнага кампанента;

1.3. тыпавы вучэбны план агульнаадукацыйнага кампанента сярэдняй спецыяльнай адукацыі;

1.4. праграмна-планавальную дакументацыю выхавання;

1.5. вучэбна-метадычную дакументацыю;

1.6. вучэбныя і іншыя выданні;

1.7. кантрольна-вымяральныя матэрыялы;

1.8. інфармацыйна-аналітычныя матэрыялы;

1.9. метадычныя ўказанні па распрацоўцы вучэбна-праграмнай дакументацыі адукацыйных праграм сярэдняй спецыяльнай адукацыі.

2. Вучэбныя праграмы па вучэбных прадметах, модулях агульнаадукацыйнага кампанента адносяцца да вучэбна-праграмнай дакументацыі адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі і выкарыстоўваюцца пры вывучэнні вучэбных прадметаў, модуляў агульнаадукацыйнага кампанента.

3. Тыпавы вучэбны план агульнаадукацыйнага кампанента сярэдняй спецыяльнай адукацыі з'яўляецца тэхнічным нарматыўным прававым актам, распрацоўваецца на аснове тыпавога вучэбнага плана агульнай сярэдняй адукацыі, уключае ў сябе пералік і паслядоўнасць вывучэння вучэбных прадметаў, модуляў па навучальных гадах (курсах навучання), колькасць вучэбных гадзін на іх вывучэнне і выкарыстоўваецца пры распрацоўцы вучэбных планаў установы адукацыі па спецыяльнасці.

4. Навукова-метадычнае забеспячэнне сярэдняй спецыяльнай адукацыі ажыццяўляюць:

4.1. арганізацыі, што ажыццяўляюць навукова-метадычнае забеспячэнне сярэдняй спецыяльнай адукацыі;

4.2. арганізацыі, што ажыццяўляюць навукова-метадычнае забеспячэнне агульнай сярэдняй адукацыі;

4.3. установы сярэдняй спецыяльнай адукацыі;

4.4. іншыя ўстановы адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы сярэдняй спецыяльнай адукацыі;

4.5. вучэбна-метадычныя аб'яднанні ў сферы сярэдняй спецыяльнай адукацыі;

4.6. арганізацыі, якія ўдзельнічаюць у рэалізацыі адукацыйных праграм праз сеткавую форму ўзаемадзеяння;

4.7. арганізацыі – заказчыкі кадраў;

4.8. рэспубліканскія органы дзяржаўнага кіравання, іншыя арганізацыі, падпарадкаваныя Ураду Рэспублікі Беларусь, мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы,

іншыя арганізацыі і фізічныя асобы ў межах іх паўнамоцтваў у сферы сярэдняй спецыяльнай адукацыі.

## Артыкул 196. Вучэбна-праграмная дакументацыя адукацыйных праграм сярэдняй спецыяльнай адукацыі

1. Вучэбна-праграмная дакументацыя адукацыйных праграм сярэдняй спецыяльнай адукацыі ўключае ў сябе вучэбныя планы і вучэбныя праграмы.

2. Вучэбныя планы падраздзяляюцца на:

2.1. прыкладныя вучэбныя планы па спецыяльнасцях;

2.2. вучэбныя планы ўстаноў адукацыі па спецыяльнасцях;

2.3. эксперыментальныя вучэбныя планы ўстаноў адукацыі па спецыяльнасцях;

2.4. індывідуальныя вучэбныя планы.

3. Прыкладны вучэбны план па спецыяльнасці ўключае ў сябе агульнаадукацыйны кампанент, дзяржаўны кампанент, кампанент установы адукацыі і ўстанаўлівае з улікам тэрмінаў атрымання сярэдняй спецыяльнай адукацыі аб'ёмы вучэбнага часу агульнаадукацыйнага кампанента, дзяржаўнага кампанента, кампанента ўстановы адукацыі, а таксама колькасць вучэбных гадзін на правядзенне факультатыўных заняткаў, карэкцыйных заняткаў (пры неабходнасці) і кансультацый, віды вучэбных заняткаў, формы і тэрміны правядзення атэстацыі, пералік неабходных кабінетаў, лабараторый, майстэрняў і іншых навучальных аб'ектаў.

Дзяржаўны кампанент прыкладнага вучэбнага плана па спецыяльнасці ўстанаўлівае пералік і паслядоўнасць вывучэння вучэбных прадметаў, модуляў па навучальных гадах (курсах навучання), колькасць вучэбных гадзін на іх вывучэнне, колькасць вучэбных гадзін на праходжанне практыкі і яе размеркаванне па навучальных гадах (курсах навучання).

Кампанент установы адукацыі прыкладнага вучэбнага плана па спецыяльнасці ўстанаўлівае колькасць вучэбных гадзін, якая пры распрацоўцы вучэбнага плана ўстановы адукацыі па спецыяльнасці выкарыстоўваецца для вывучэння вучэбных прадметаў, модуляў, праходжання практыкі, у тым ліку на павышаным узроўні, з мэтай паглыблення падрыхтоўкі спецыялістаў (рабочых) у рамках спецыяльнасці, з улікам спецыфікі ўстановы адукацыі і інтарэсаў арганізацый – заказчыкаў кадраў.

Прыкладныя вучэбныя планы па спецыяльнасцях, акрамя прыкладных вучэбных планаў па спецыяльнасцях напрамку адукацыі «Ахова здароўя», распрацоўваюцца на аснове адукацыйных стандартаў сярэдняй спецыяльнай адукацыі арганізацыямі, што ажыццяўляюць навукова-метадычнае забеспячэнне сярэдняй спецыяльнай адукацыі, і зацвярджаюцца Міністэрствам адукацыі.

Прыкладныя вучэбныя планы па спецыяльнасцях напрамку адукацыі «Ахова здароўя» зацвярджаюцца Міністэрствам аховы здароўя і Міністэрствам адукацыі.

Зацвярджэнне прыкладных вучэбных планаў па спецыяльнасцях ажыццяўляецца пры наяўнасці заключэнняў Міністэрства аховы здароўя аб іх адпаведнасці заканадаўству ў сферы санітарна-эпідэміялагічнага дабрабыту насельніцтва.

4. Вучэбны план установы адукацыі па спецыяльнасці распрацоўваецца ўстановай адукацыі, якая рэалізуе адукацыйныя праграмы сярэдняй спецыяльнай адукацыі, па кожнай форме атрымання адукацыі на аснове тыпавога вучэбнага плана агульнаадукацыйнага кампанента сярэдняй спецыяльнай адукацыі, прыкладнага вучэбнага плана па спецыяльнасці з улікам узроўню вывучэння вучэбных прадметаў, модуляў, праходжання практыкі і зацвярджаецца кіраўніком гэтай установы адукацыі. Вучэбны план установы адукацыі па спецыяльнасці ўстанаўлівае графік адукацыйнага працэсу, пералік вучэбных прадметаў, модуляў агульнаадукацыйнага кампанента, вучэбных прадметаў, модуляў прафесійнага кампанента, які фарміруецца з дзяржаўнага кампанента і кампанента ўстановы адукацыі прыкладнага вучэбнага плана па спецыяльнасці, а таксама колькасць вучэбных гадзін на правядзенне факультатыўных заняткаў, карэкцыйных заняткаў (пры неабходнасці) і кансультацый, віды вучэбных заняткаў, формы і тэрміны правядзення

атэстацыі, пералік неабходных кабінетаў, лабараторый, майстэрняў і іншых навучальных аб'ектаў.

Вучэбны план установы адукацыі па спецыяльнасці, які прадугледжвае змяненне тэрмінаў атрымання адукацыі ў параўнанні з прызначанымі ў прыкладным вучэбным плане па спецыяльнасці і (або) павышаны ўзровень вывучэння вучэбных прадметаў, модуляў, змяненне працягласці праходжання практыкі, зацвярджаецца кіраўніком гэтай установы адукацыі па ўзгадненні з яе заснавальнікам.

5. Эксперыментальныя вучэбныя планы ўстаноў адукацыі па спецыяльнасцях апрабоўваюцца ва ўстановах адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы сярэдняй спецыяльнай адукацыі, на базе якіх ажыццяўляецца эксперыментальная дзейнасць.

Эксперыментальныя вучэбныя планы па спецыяльнасцях распрацоўваюцца ўстановамі адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы сярэдняй спецыяльнай адукацыі, на базе якіх ажыццяўляецца эксперыментальная дзейнасць, і зацвярджаюцца Міністэрствам адукацыі па ўзгадненні з заснавальнікамі гэтых устаноў адукацыі.

6. Індывідуальныя вучэбныя планы ўстанаўліваюць асаблівасці атрымання сярэдняй спецыяльнай адукацыі:

адоранымі і таленавітымі навучэнцамі, курсантамі;

навучэнцамі, курсантамі, якія па ўважлівых прычынах не могуць пастаянна або часова наведваць вучэбныя заняткі і (або) праходзіць ва ўстаноўленыя тэрміны атэстацыю;

навучэнцамі, курсантамі, прынятымі для атрымання або працягу атрымання адукацыі на ўзроўні сярэдняй спецыяльнай адукацыі, якія засвоілі змест асобных вучэбных прадметаў, модуляў, практыкі, што ўваходзяць у вучэбны план установы адукацыі па спецыяльнасці, аб чым маецца дакумент аб адукацыі або дакумент аб навучанні.

Індывідуальныя вучэбныя планы распрацоўваюцца ўстановамі адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы сярэдняй спецыяльнай адукацыі, на аснове вучэбных планаў устаноў адукацыі па спецыяльнасцях і зацвярджаюцца іх кіраўнікамі.

7. Вучэбныя праграмы падраздзяляюцца на:

7.1. прыкладныя вучэбныя праграмы па вучэбных прадметах, модулях, практыцы;

7.2. вучэбныя праграмы ўстаноў адукацыі па вучэбных прадметах, модулях, практыцы;

7.3. эксперыментальныя вучэбныя праграмы ўстаноў адукацыі па вучэбных прадметах, модулях, практыцы;

7.4. вучэбныя праграмы факультатыўных заняткаў.

8. Прыкладная вучэбная праграма па вучэбным прадмеце, модулі распрацоўваецца па вучэбным прадмеце, модулі дзяржаўнага кампанента прыкладнага вучэбнага плана па спецыяльнасці, вызначае мэты і задачы вывучэння вучэбнага прадмета, модуля, яго змест, асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці навучэнцаў, курсантаў, пералік вучэбных і іншых выданняў.

Прыкладная вучэбная праграма па вучэбным прадмеце, модулі распрацоўваецца ў якасці прыкладу арганізацыі адукацыйнага працэсу па вучэбным прадмеце, модулі прафесійнага кампанента вучэбнага плана ўстановы адукацыі па спецыяльнасці.

9. Прыкладная вучэбная праграма па практыцы распрацоўваецца па практыцы дзяржаўнага кампанента прыкладнага вучэбнага плана па спецыяльнасці, вызначае мэты і задачы практыкі, яе змест, асноўныя напрамкі дзейнасці навучэнцаў, курсантаў, тэрміны праходжання навучэнцамі, курсантамі практыкі, асноўныя патрабаванні да ўмоў арганізацыі практыкі і вынікаў яе праходжання навучэнцамі, курсантамі, пералік вучэбных і іншых выданняў.

Прыкладная вучэбная праграма па практыцы распрацоўваецца ў якасці прыкладу арганізацыі адукацыйнага працэсу па практыцы прафесійнага кампанента вучэбнага плана ўстановы адукацыі па спецыяльнасці.

10. Прыкладныя вучэбныя праграмы па вучэбных прадметах, модулях, практыцы, акрамя прыкладных вучэбных праграм па вучэбных прадметах, модулях, практыцы

дзяржаўнага кампанента прыкладных вучэбных планаў па спецыяльнасцях напрамкаў адукацыі «Мастацтва», «Ахова здароўя» і «Сельская гаспадарка», распрацоўваюцца арганізацыямі, што ажыццяўляюць навукова-метадычнае забеспячэнне сярэдняй спецыяльнай адукацыі, і зацвярджаюцца Міністэрствам адукацыі. Прыкладныя вучэбныя праграмы па вучэбных прадметах, модулях, практыцы дзяржаўнага кампанента прыкладных вучэбных планаў па спецыяльнасцях напрамку адукацыі «Мастацтва» зацвярджаюцца Міністэрствам культуры. Прыкладныя вучэбныя праграмы па вучэбных прадметах, модулях, практыцы дзяржаўнага кампанента прыкладных вучэбных планаў па спецыяльнасцях напрамку адукацыі «Ахова здароўя» зацвярджаюцца Міністэрствам аховы здароўя. Прыкладныя вучэбныя праграмы па вучэбных прадметах, модулях, практыцы дзяржаўнага кампанента прыкладных вучэбных планаў па спецыяльнасцях напрамку адукацыі «Сельская гаспадарка» зацвярджаюцца Міністэрствам сельскай гаспадаркі і харчавання.

11. Вучэбная праграма ўстановы адукацыі па вучэбным прадмеце, модулі распрацоўваецца па вучэбным прадмеце, модулі прафесійнага кампанента вучэбнага плана ўстановы адукацыі па спецыяльнасці ўстановай адукацыі, якая рэалізуе адукацыйныя праграмы сярэдняй спецыяльнай адукацыі, на аснове адпаведнага адукацыйнага стандарту сярэдняй спецыяльнай адукацыі па спецыяльнасці, вучэбнага плана ўстановы адукацыі па спецыяльнасці, прыкладнай вучэбнай праграмы па вучэбным прадмеце, модулі пры яе наяўнасці і зацвярджаецца яе кіраўніком.

12. Вучэбная праграма ўстановы адукацыі па практыцы распрацоўваецца па практыцы прафесійнага кампанента вучэбнага плана ўстановы адукацыі па спецыяльнасці ўстановай адукацыі, якая рэалізуе адукацыйныя праграмы сярэдняй спецыяльнай адукацыі, на аснове адпаведнага адукацыйнага стандарту сярэдняй спецыяльнай адукацыі па спецыяльнасці, вучэбнага плана ўстановы адукацыі па спецыяльнасці, прыкладнай вучэбнай праграмы па практыцы пры яе наяўнасці і зацвярджаецца яе кіраўніком.

13. Эксперыментальная вучэбная праграма ўстановы адукацыі па вучэбным прадмеце, модулі, практыцы распрацоўваецца па вучэбным прадмеце, модулі, практыцы прафесійнага кампанента эксперыментальнага вучэбнага плана ўстановы адукацыі па спецыяльнасці або прафесійнага кампанента вучэбнага плана ўстановы адукацыі па спецыяльнасці, апрабоўваецца ва ўстанове адукацыі, якая рэалізуе адукацыйныя праграмы сярэдняй спецыяльнай адукацыі, на базе якой ажыццяўляецца эксперыментальная дзейнасць.

Эксперыментальныя вучэбныя праграмы ўстаноў адукацыі па вучэбных прадметах, модулях, практыцы распрацоўваюцца ўстановамі адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы сярэдняй спецыяльнай адукацыі, на базе якіх ажыццяўляецца эксперыментальная дзейнасць, і зацвярджаюцца Міністэрствам адукацыі па ўзгадненні з заснавальнікамі гэтых устаноў адукацыі.

14. Вучэбная праграма факультатыўных заняткаў вызначае змест факультатыўных заняткаў, час на іх правядзенне, асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці. Вучэбныя праграмы факультатыўных заняткаў распрацоўваюцца ўстановай адукацыі і зацвярджаюцца яе кіраўніком.

**Артыкул 197. Вучэбна-метадычныя аб’яднанні ў сферы сярэдняй спецыяльнай адукацыі**

1. Для ўдасканалення навукова-метадычнага забеспячэння сярэдняй спецыяльнай адукацыі і падрыхтоўкі спецыялістаў з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, рабочых з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй Міністэрствам адукацыі, іншымі рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання, іншымі арганізацыямі, падпарадкаванымі Ураду Рэспублікі Беларусь, што маюць у падпарадкаванні ўстановы сярэдняй спецыяльнай адукацыі, установы агульнай сярэдняй адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйную праграму

сярэдняй спецыяльнай адукацыі, якая забяспечвае атрыманне кваліфікацыі спецыяліста з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, і мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі могуць ствараццa вучэбна-метадычныя аб'яднанні ў сферы сярэдняй спецыяльнай адукацыі на рэспубліканскім і (або) абласным (горада Мінска) узроўнях.

2. Вучэбна-метадычныя аб'яднанні ў сферы сярэдняй спецыяльнай адукацыі ствараюцца па напрамках адукацыі, спецыяльнасцях.

3. У склад вучэбна-метадычных аб'яднанняў у сферы сярэдняй спецыяльнай адукацыі могуць уваходзіць педагагічныя работнікі ўстаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы сярэдняй спецыяльнай адукацыі, навуковыя работнікі, прадстаўнікі арганізацый – заказчыкаў кадраў і іншых арганізацый, зацікаўленых у падрыхтоўцы спецыялістаў з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, рабочых з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй па пэўных групах спецыяльнасцей.

4. Асноўнымі функцыямі вучэбна-метадычных аб'яднанняў у сферы сярэдняй спецыяльнай адукацыі з'яўляюцца:

4.1. удзел у распрацоўцы і ўдасканаленні адукацыйных стандартаў сярэдняй спецыяльнай адукацыі;

4.2. удзел у распрацоўцы і ўдасканаленні вучэбна-праграмнай дакументацыі адукацыйных праграм сярэдняй спецыяльнай адукацыі;

4.3. распрацоўка прапаноў па ўдасканаленні падрыхтоўкі кадраў з улікам патрэб рынку працы.

5. Рашэнні вучэбна-метадычных аб'яднанняў у сферы сярэдняй спецыяльнай адукацыі носяць рэкамендацыйны характар.

6. Палажэнне аб вучэбна-метадычным аб'яднанні ў сферы сярэдняй спецыяльнай адукацыі зацвярджаецца Міністэрствам адукацыі.

## РАЗДЗЕЛ XI
## ВЫШЭЙШАЯ АДУКАЦЫЯ

## ГЛАВА 35
## СІСТЭМА ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ

### Артыкул 198. Сістэма вышэйшай адукацыі

1. Вышэйшая адукацыя – узровень асноўнай адукацыі, накіраваны на развіццё асобы студэнта, курсанта, слухача, іх інтэлектуальных і творчых здольнасцей, фарміраванне ў іх кампетэнцый, неабходных для ажыццяўлення прафесійнай дзейнасці, які завяршаецца прысваеннем кваліфікацыі спецыяліста з агульнай вышэйшай, паглыбленай вышэйшай або спецыяльнай вышэйшай адукацыяй і (або) ступені.

2. Сістэма вышэйшай адукацыі ўключае ў сябе:

2.1. удзельнікаў адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі;

2.2. адукацыйныя праграмы вышэйшай адукацыі;

2.3. установы вышэйшай адукацыі;

2.4. дзяржаўныя арганізацыі адукацыі, якія забяспечваюць функцыянаванне сістэмы адукацыі;

2.5. вучэбна-метадычныя аб'яднанні ў сферы вышэйшай адукацыі;

2.6. арганізацыі, што забяспечваюць праходжанне практыкі студэнтамі, курсантамі, слухачамі;

2.7. арганізацыі, якія ўдзельнічаюць у рэалізацыі адукацыйных праграм праз сеткавую форму ўзаемадзеяння;

2.8. арганізацыі – заказчыкі кадраў;

2.9. дзяржаўныя органы, падпарадкаваныя і (або) падсправаздачныя Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь, Нацыянальную акадэмію навук Беларусі, рэспубліканскія органы

дзяржаўнага кіравання, іншыя арганізацыі, падпарадкаваныя Ураду Рэспублікі Беларусь, іншыя арганізацыі ў межах іх паўнамоцтваў у сферы вышэйшай адукацыі.

3. Вышэйшая адукацыя ўключае ў сябе наступныя віды:

3.1. агульная вышэйшая адукацыя пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы бакалаўрыята, накіраваная на падрыхтоўку спецыялістаў з прысваеннем кваліфікацыі і ступені «Бакалаўр»;

3.2. паглыбленая вышэйшая адукацыя пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы магістратуры, накіраваная на падрыхтоўку спецыялістаў з прысваеннем ступені «Магістр»;

3.3. спецыяльная вышэйшая адукацыя пры рэалізацыі бесперапыннай адукацыйнай праграмы вышэйшай адукацыі, накіраваная на падрыхтоўку спецыялістаў з прысваеннем кваліфікацыі і ступені «Магістр».

4. Агульная вышэйшая адукацыя дае права на працяг вышэйшай адукацыі (атрыманне паглыбленай вышэйшай адукацыі) і працаўладкаванне па атрыманай спецыяльнасці, прысвоеных кваліфікацыі і ступені «Бакалаўр».

5. Паглыбленая вышэйшая адукацыя дае права на засваенне зместу адукацыйнай праграмы аспірантуры (ад’юнктуры) на ўзроўні навукова-арыентаванай адукацыі і працаўладкаванне па атрыманай спецыяльнасці і прысвоенай ступені «Магістр».

6. Спецыяльная вышэйшая адукацыя дае права на засваенне зместу адукацыйнай праграмы аспірантуры (ад’юнктуры) на ўзроўні навукова-арыентаванай адукацыі і працаўладкаванне па атрыманай спецыяльнасці, прысвоеных кваліфікацыі і ступені «Магістр».

7. Другой і наступнай вышэйшай адукацыяй з’яўляюцца:

7.1. агульная вышэйшая адукацыя – для асоб, якія маюць агульную вышэйшую адукацыю, спецыяльную вышэйшую адукацыю;

7.2. спецыяльная вышэйшая адукацыя – для асоб, якія маюць агульную вышэйшую адукацыю, паглыбленую вышэйшую адукацыю, спецыяльную вышэйшую адукацыю;

7.3. паглыбленая вышэйшая адукацыя – для асоб, якія маюць спецыяльную вышэйшую адукацыю, паглыбленую вышэйшую адукацыю.

**Артыкул 199. Удзельнікі адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі**

1. Удзельнікамі адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі з’яўляюцца студэнты, курсанты, слухачы, законныя прадстаўнікі непаўналетніх навучэнцаў, якія засвойваюць змест адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі, педагагічныя работнікі.

2. Студэнтам на ўвесь перыяд атрымання вышэйшай адукацыі выдаецца студэнцкі білет, узор якога ўстанаўліваецца Міністэрствам адукацыі.

Студэнтам, курсантам, слухачам на ўвесь перыяд атрымання вышэйшай адукацыі выдаецца залiковая кніжка, узор якой устанаўліваецца Міністэрствам адукацыі.

**Артыкул 200. Адукацыйныя праграмы вышэйшай адукацыі**

1. Адукацыйныя праграмы вышэйшай адукацыі падраздзяляюцца на:

1.1. адукацыйную праграму бакалаўрыята;

1.2. адукацыйную праграму магістратуры;

1.3. бесперапынную адукацыйную праграму вышэйшай адукацыі.

2. Пералік спецыяльнасцей, па якіх рэалізуецца бесперапынная адукацыйная праграма вышэйшай адукацыі, устанаўліваецца Міністэрствам адукацыі на падставе прапаноў зацікаўленых дзяржаўных органаў, падпарадкаваных і (або) падсправаздачных Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь, рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, іншых арганізацый, падпарадкаваных Ураду Рэспублікі Беларусь.

3. Адукацыйная праграма бакалаўрыята, бесперапынная адукацыйная праграма вышэйшай адукацыі могуць інтэгравацца з адукацыйнымі праграмамі сярэдняй спецыяльнай адукацыі.

Інтэграцыя адукацыйнай праграмы бакалаўрыята з адукацыйнымі праграмамі сярэдняй спецыяльнай адукацыі, бесперапыннай адукацыйнай праграмы вышэйшай адукацыі з адукацыйнымі праграмамі сярэдняй спецыяльнай адукацыі накіравана на стварэнне ўмоў для засваення зместу адукацыйнай праграмы бакалаўрыята, бесперапыннай адукацыйнай праграмы вышэйшай адукацыі ў скарочаныя тэрміны асобамі, якія маюць сярэднюю спецыяльную адукацыю па спецыяльнасцях, што адпавядаюць спецыяльнасцям адукацыйнай праграмы бакалаўрыята, бесперапыннай адукацыйнай праграмы вышэйшай адукацыі. Адпаведнасць спецыяльнасцей сярэдняй спецыяльнай адукацыі спецыяльнасцям вышэйшай адукацыі пры інтэграцыі адукацыйных праграм вызначаецца пералікам, які ўстанаўліваецца Міністэрствам адукацыі.

4. Адукацыйныя праграмы вышэйшай адукацыі рэалізуюцца ў вочнай, завочнай і дыстанцыйнай формах атрымання адукацыі.

5. Адукацыйныя праграмы вышэйшай адукацыі рэалізуюцца ва ўстановах вышэйшай адукацыі. Віды адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі, якія рэалізуюцца ўстановамі вышэйшай адукацыі, вызначаюцца гэтым Кодэксам.

6. Асаблівасці рэалізацыі адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі пры падрыхтоўцы кадраў па спецыяльнасцях для воінскіх фарміраванняў і ваенізаваных арганізацый, мытных органаў устанаўліваюцца адпаведным дзяржаўным органам, падпарадкаваным і (або) падсправаздачным Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь, рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання і Міністэрствам адукацыі.

**Артыкул 201. Адукацыйныя стандарты вышэйшай адукацыі**

1. Адукацыйныя стандарты вышэйшай адукацыі ўключаюць у сябе адукацыйныя стандарты агульнай вышэйшай адукацыі, адукацыйныя стандарты паглыбленай вышэйшай адукацыі і адукацыйныя стандарты спецыяльнай вышэйшай адукацыі.

2. Адукацыйныя стандарты вышэйшай адукацыі распрацоўваюцца па кожнай спецыяльнасці і ўстанаўліваюць патрабаванні да вынікаў засваення зместу адукацыйнай праграмы бакалаўрыята, адукацыйнай праграмы магістратуры, бесперапыннай адукацыйнай праграмы вышэйшай адукацыі, зместу вучэбна-праграмнай дакументацыі адпаведнай адукацыйнай праграмы вышэйшай адукацыі, тэрмінаў атрымання адпаведнай вышэйшай адукацыі, арганізацыі адукацыйнага працэсу, выніковай атэстацыі, кваліфікацыі і (або) ступені, што прысвойваюцца. Патрабаванні да вынікаў засваення зместу адпаведнай адукацыйнай праграмы вышэйшай адукацыі ўключаюць у сябе фарміруемыя кампетэнцыі навучэнцаў.

3. Распрацоўку адукацыйных стандартаў вышэйшай адукацыі, акрамя адукацыйных стандартаў вышэйшай адукацыі па напрамках адукацыі «Ахова здароўя» і «Сельская гаспадарка», адукацыйных стандартаў для ўстаноў вышэйшай адукацыі, якія знаходзяцца ў падпарадкаванні органаў дзяржаўнай бяспекі, арганізуе Міністэрства адукацыі і ажыццяўляе яе сумесна з вучэбна-метадычнымі аб’яднаннямі ў сферы вышэйшай адукацыі і арганізацыямі – заказчыкамі кадраў.

Распрацоўку адукацыйных стандартаў вышэйшай адукацыі па напрамку адукацыі «Ахова здароўя» арганізуе Міністэрства аховы здароўя і ажыццяўляе яе сумесна з вучэбна-метадычнымі аб’яднаннямі ў сферы вышэйшай адукацыі па напрамку адукацыі «Ахова здароўя» і арганізацыямі – заказчыкамі кадраў.

Распрацоўку адукацыйных стандартаў вышэйшай адукацыі па напрамку адукацыі «Сельская гаспадарка» арганізуе Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання і ажыццяўляе яе сумесна з вучэбна-метадычнымі аб’яднаннямі ў сферы вышэйшай адукацыі па напрамку адукацыі «Сельская гаспадарка» і арганізацыямі – заказчыкамі кадраў.

Распрацоўку адукацыйных стандартаў вышэйшай адукацыі для ўстаноў вышэйшай адукацыі, якія знаходзяцца ў падпарадкаванні органаў дзяржаўнай бяспекі, арганізуе Камітэт дзяржаўнай бяспекі.

Распрацоўка адукацыйных стандартаў вышэйшай адукацыі па спецыяльнасцях ажыццяўляецца па форме (макеце) адукацыйнага стандарту адпаведнай адукацыі па спецыяльнасці, якая вызначаецца Міністэрствам адукацыі.

4. Адукацыйныя стандарты вышэйшай адукацыі, акрамя адукацыйных стандартаў вышэйшай адукацыі па напрамках адукацыі «Ахова здароўя» і «Сельская гаспадарка», адукацыйных стандартаў вышэйшай адукацыі для ўстаноў вышэйшай адукацыі, якія знаходзяцца ў падпарадкаванні органаў дзяржаўнай бяспекі, зацвярджаюцца Міністэрствам адукацыі па ўзгадненні з зацікаўленымі дзяржаўнымі органамі, падпарадкаванымі і (або) падсправаздачнымі Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь, рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання, іншымі арганізацыямі, падпарадкаванымі Ураду Рэспублікі Беларусь, у падпарадкаванні якіх знаходзяцца ўстановы вышэйшай адукацыі і (або) для якіх ажыццяўляецца падрыхтоўка кадраў.

Адукацыйныя стандарты вышэйшай адукацыі па напрамку адукацыі «Ахова здароўя» зацвярджаюцца Міністэрствам адукацыі і Міністэрствам аховы здароўя.

Адукацыйныя стандарты вышэйшай адукацыі па напрамку адукацыі «Сельская гаспадарка» зацвярджаюцца Міністэрствам адукацыі і Міністэрствам сельскай гаспадаркі і харчавання.

Адукацыйныя стандарты вышэйшай адукацыі для ўстаноў вышэйшай адукацыі, якія знаходзяцца ў падпарадкаванні органаў дзяржаўнай бяспекі, зацвярджаюцца Камітэтам дзяржаўнай бяспекі па ўзгадненні з Міністэрствам адукацыі.

**Артыкул 202. Тэрмін атрымання вышэйшай адукацыі**

1. Тэрмін атрымання агульнай вышэйшай адукацыі ў дзённай форме атрымання адукацыі складае ад чатырох да чатырох з паловай гадоў.

Тэрмін атрымання агульнай вышэйшай адукацыі ў дзённай форме атрымання адукацыі ўстанаўліваецца адукацыйным стандартам агульнай вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці.

Тэрмін атрымання агульнай вышэйшай адукацыі ў вячэрняй, завочнай і дыстанцыйнай формах атрымання адукацыі вызначаецца тэрмінам атрымання агульнай вышэйшай адукацыі ў дзённай форме атрымання адукацыі і можа быць павялічаны не больш чым на адзін год.

2. Тэрмін атрымання паглыбленай вышэйшай адукацыі ў дзённай форме атрымання адукацыі складае ад аднаго года да двух гадоў.

Тэрмін атрымання паглыбленай вышэйшай адукацыі ў дзённай форме атрымання адукацыі ўстанаўліваецца адукацыйным стандартам паглыбленай вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці.

Тэрмін атрымання паглыбленай вышэйшай адукацыі ў вячэрняй, завочнай і дыстанцыйнай формах атрымання адукацыі вызначаецца тэрмінам атрымання паглыбленай вышэйшай адукацыі ў дзённай форме атрымання адукацыі і можа быць павялічаны не больш чым на паўгода.

Тэрмін атрымання паглыбленай вышэйшай адукацыі па спецыяльнасцях для воінскіх фарміраванняў і ваенізаваных арганізацый можа быць павялічаны не больш чым на адзін год.

3. Тэрмін атрымання спецыяльнай вышэйшай адукацыі ў дзённай форме атрымання адукацыі складае ад пяці да шасці гадоў.

Тэрмін атрымання спецыяльнай вышэйшай адукацыі ў дзённай форме атрымання адукацыі ўстанаўліваецца адукацыйным стандартам спецыяльнай вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці.

Тэрмін атрымання спецыяльнай вышэйшай адукацыі ў вячэрняй, завочнай і дыстанцыйнай формах атрымання адукацыі вызначаецца тэрмінам атрымання спецыяльнай вышэйшай адукацыі ў дзённай форме атрымання адукацыі і можа быць павялічаны не больш чым на адзін год.

4. Тэрмін атрымання другой і наступнай агульнай вышэйшай адукацыі або спецыяльнай вышэйшай адукацыі можа быць скарочаны ўстановай вышэйшай адукацыі пры ўмове выканання патрабаванняў адпаведнага адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці. Пры гэтым тэрмін атрымання другой і наступнай агульнай вышэйшай адукацыі або спецыяльнай вышэйшай адукацыі павінен быць не меншы за два гады.

Тэрмін атрымання другой і наступнай паглыбленай вышэйшай адукацыі не скарачаецца.

Тэрмін атрымання другой і наступнай агульнай вышэйшай і спецыяльнай вышэйшай адукацыі для асоб, якія атрымліваюць такую адукацыю па спецыяльнасцях для органаў дзяржаўнай бяспекі, устанаўліваецца Камітэтам дзяржаўнай бяспекі па ўзгадненні з Міністэрствам адукацыі.

5. Тэрмін атрымання агульнай вышэйшай адукацыі пры інтэграцыі адукацыйнай праграмы бакалаўрыята з адукацыйнымі праграмамі сярэдняй спецыяльнай адукацыі, тэрмін атрымання спецыяльнай вышэйшай адукацыі пры інтэграцыі бесперапыннай адукацыйнай праграмы вышэйшай адукацыі з адукацыйнымі праграмамі сярэдняй спецыяльнай адукацыі скарачаюцца. Пры рэалізацыі адукацыйных праграм у скарочаны тэрмін павінна забяспечвацца выкананне патрабаванняў адукацыйнага стандарту агульнай вышэйшай адукацыі, адукацыйнага стандарту спецыяльнай вышэйшай адукацыі.

## ГЛАВА 36
## УСТАНОВЫ ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ. УЗАЕМАДЗЕЯННЕ ЎСТАНОЎ ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ ПРЫ РЭАЛІЗАЦЫІ АДУКАЦЫЙНЫХ ПРАГРАМ ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ З АРГАНІЗАЦЫЯМІ – ЗАКАЗЧЫКАМІ КАДРАЎ

### Артыкул 203. Установы вышэйшай адукацыі

1. Установа вышэйшай адукацыі – установа адукацыі, якая рэалізуе адну або некалькі адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі і можа рэалізоўваць адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, адукацыйную праграму дашкольнай адукацыі, адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, адукацыйныя праграмы спецыяльнай адукацыі, адукацыйныя праграмы прафесійна-тэхнічнай адукацыі, адукацыйныя праграмы сярэдняй спецыяльнай адукацыі, адукацыйную праграму дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, адукацыйныя праграмы дадатковай адукацыі дарослых.

2. Установы вышэйшай адукацыі могуць быць наступных відаў:

2.1. універсітэт;

2.2. акадэмія (кансерваторыя);

2.3. інстытут.

3. Універсітэт – установа вышэйшай адукацыі, якая рэалізуе адукацыйныя праграмы вышэйшай адукацыі, як правіла, па некалькіх профілях адукацыі, напрамках адукацыі, групах спецыяльнасцей, у лік якіх могуць уваходзіць адзін або некалькі напрамкаў адукацыі, што патрабуюць капіталаёмкага рэсурснага забеспячэння, адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, выконвае фундаментальныя і прыкладныя навуковыя даследаванні па шырокім спектры галін навукі, ажыццяўляе міжнароднае супрацоўніцтва, а таксама можа рэалізоўваць адукацыйную праграму сярэдняй адукацыі, адукацыйныя праграмы прафесійна-тэхнічнай адукацыі, адукацыйныя праграмы сярэдняй спецыяльнай адукацыі, адукацыйную праграму дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, адукацыйныя праграмы дадатковай адукацыі дарослых.

Універсітэты пры ўмове рэалізацыі ў іх адной з адукацыйных праграм агульнай вышэйшай і (або) спецыяльнай вышэйшай адукацыі па спецыяльнасцях профілю адукацыі «Педагогіка» і па ўзгадненні з Міністэрствам адукацыі могуць рэалізоўваць адукацыйную праграму дашкольнай адукацыі, адукацыйную праграму пачатковай адукацыі, адукацыйную праграму базавай адукацыі, адукацыйныя праграмы спецыяльнай адукацыі.

4. Акадэмія (кансерваторыя) – установа вышэйшай адукацыі, якая рэалізуе адукацыйныя праграмы вышэйшай адукацыі, як правіла, па адным профілі адукацыі, адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, выконвае фундаментальныя і прыкладныя навуковыя даследаванні па адной або некалькіх галінах навукі, ажыццяўляе міжнароднае супрацоўніцтва, а таксама можа рэалізоўваць адукацыйную праграму дашкольнай адукацыі, адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, адукацыйныя праграмы спецыяльнай адукацыі, адукацыйныя праграмы прафесійна-тэхнічнай адукацыі, адукацыйныя праграмы сярэдняй спецыяльнай адукацыі, адукацыйную праграму дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, адукацыйныя праграмы дадатковай адукацыі дарослых.

Кансерваторыя рэалізуе адукацыйныя праграмы пераважна па спецыяльнасцях музычнага і тэатральнага мастацтва.

Акадэміі (кансерваторыі) пры ўмове рэалізацыі ў іх адной з адукацыйных праграм агульнай вышэйшай і (або) спецыяльнай вышэйшай адукацыі па спецыяльнасцях напрамку адукацыі «Мастацтва» і па ўзгадненні з Міністэрствам адукацыі могуць рэалізоўваць адукацыйную праграму базавай адукацыі, адукацыйную праграму сярэдняй адукацыі, адукацыйную праграму спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі з вывучэннем на павышаным узроўні вучэбных прадметаў, модуляў, змест якіх накіраваны на развіццё здольнасцей навучэнцаў у галіне асобных відаў мастацтва, а таксама адукацыйную праграму пачатковай адукацыі, адукацыйную праграму спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі з вывучэннем вучэбных прадметаў, модуляў, змест якіх накіраваны на развіццё здольнасцей навучэнцаў у галіне асобных відаў мастацтва.

5. Інстытут – установа вышэйшай адукацыі, якая рэалізуе адукацыйную праграму бакалаўрыята па адной або некалькіх блізкіх спецыяльнасцях аднаго або некалькіх напрамкаў адукацыі, выконвае фундаментальныя і (або) прыкладныя навуковыя даследаванні па адной або некалькіх галінах навукі, ажыццяўляе міжнароднае супрацоўніцтва, а таксама можа рэалізоўваць бесперапынную адукацыйную праграму вышэйшай адукацыі, адукацыйную праграму магістратуры, адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, адукацыйныя праграмы дадатковай адукацыі дарослых.

6. Ва ўстановах вышэйшай адукацыі, якія знаходзяцца ў падпарадкаванні Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, рэалізацыя адукацыйнай праграмы бакалаўрыята не з’яўляецца абавязковай.

7. Ва ўстанове вышэйшай адукацыі могуць ствараецца структурныя падраздзяленні: факультэт, факультэт давузаўскай падрыхтоўкі, кафедра, філіял кафедры, лабараторыя, цэнтр кампетэнцый, навучальна-метадычнае ўпраўленне (цэнтр, частка, аддзел), упраўленне (аддзел, сектар) навукі і інавацыйнай дзейнасці або навукова-даследчая частка (цэнтр, сектар, аддзел), упраўленне (аддзел, сектар) выхаваўчай працы з моладдзю, інстытут без права юрыдычнай асобы, вышэйшая школа без права юрыдычнай асобы, каледж без права юрыдычнай асобы, ліцэй без права юрыдычнай асобы, гімназія без права юрыдычнай асобы, цэнтр развіцця і каардынацыі навукова-метадычнага забеспячэння профілю адукацыі, напрамку адукацыі, спартыўны клуб, санаторый-прафілакторый, іншыя структурныя падраздзяленні.

8. Асноўнымі структурнымі падраздзяленнямі, якія забяспечваюць ажыццяўленне ўстановай вышэйшай адукацыі адукацыйнай, навуковай, навукова-тэхнічнай і інавацыйнай дзейнасці, з’яўляюцца інстытут без права юрыдычнай асобы, факультэт, кафедра, навукова-

даследчая частка (цэнтр, сектар, аддзел), навучальна-метадычнае ўпраўленне (цэнтр, частка, аддзел).

9. З мэтай падрыхтоўкі кадраў па спецыяльнасцях для воінскіх фарміраванняў і ваенізаваных арганізацый, навучання грамадзян па праграмах падрыхтоўкі малодшых камандзіраў і праграмах падрыхтоўкі афіцэраў запасу, рэалізацыі адукацыйных праграм дадатковай адукацыі дарослых ва ўстанове вышэйшай адукацыі могуць стварацца ваенны факультэт або ваенны інстытут без правоў юрыдычнай асобы, а для навучання грамадзян па праграмах падрыхтоўкі малодшых камандзіраў і праграмах падрыхтоўкі афіцэраў запасу – ваенная кафедра. Падрыхтоўка кадраў па спецыяльнасцях для воінскіх фарміраванняў і ваенізаваных арганізацый, навучанне грамадзян па праграмах падрыхтоўкі малодшых камандзіраў і праграмах падрыхтоўкі афіцэраў запасу ажыццяўляюцца ў межах кантрольных лічбаў прыёму і заказу на падрыхтоўку спецыялістаў, якія ўстанаўліваюцца Міністэрствам абароны. Палажэнні аб ваенных факультэтах, ваенных інстытутах без права юрыдычнай асобы, ваенных кафедрах зацвярджаюцца Міністэрствам абароны і дзяржаўным органам, у падпарадкаванні якіх знаходзяцца ўстановы вышэйшай адукацыі. Парадак працы ваенных факультэтаў, ваенных інстытутаў без права юрыдычнай асобы, ваенных кафедраў пры падрыхтоўцы кадраў па спецыяльнасцях для воінскіх фарміраванняў і ваенізаваных арганізацый, навучанні грамадзян па праграмах падрыхтоўкі малодшых камандзіраў і праграмах падрыхтоўкі афіцэраў запасу, крытэрыі і парадак адбору грамадзян для навучання па праграмах падрыхтоўкі малодшых камандзіраў і праграмах падрыхтоўкі афіцэраў запасу вызначаюцца Міністэрствам абароны і Міністэрствам адукацыі. Тыпавыя штаты і нарматывы колькасці ваеннаслужачых і грамадзянскага персаналу ваенных факультэтаў, ваенных інстытутаў без права юрыдычнай асобы вызначаюцца Міністэрствам абароны і дзяржаўным органам, у падпарадкаванні якіх знаходзяцца ўстановы вышэйшай адукацыі. Парадак распрацоўкі і зацвярджэння штатных раскладаў ваенных кафедр устаноў вышэйшай адукацыі вызначаецца Міністэрствам абароны і дзяржаўным органам, у падпарадкаванні якога знаходзяцца ўстановы вышэйшай адукацыі.

10. Асаблівасці стварэння і функцыянавання факультэтаў і кафедр устаноў вышэйшай адукацыі, якія знаходзяцца ў падпарадкаванні Міністэрства абароны, ваенных факультэтаў і іх кафедр, ваенных інстытутаў без права юрыдычнай асобы і іх факультэтаў і кафедр, а таксама ваенных кафедр устаноў вышэйшай адукацыі рэгулююцца статутамі гэтых устаноў адукацыі, палажэннямі аб ваенным факультэце, ваенным інстытуце без права юрыдычнай асобы, ваеннай кафедры.

Асаблівасці стварэння і функцыянавання факультэтаў і кафедр устаноў вышэйшай адукацыі, якія знаходзяцца ў падпарадкаванні органаў дзяржаўнай бяспекі, органаў пагранічнай службы, Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, рэгулююцца статутамі гэтых устаноў адукацыі.

**Артыкул 204. Кіраванне ўстановай вышэйшай адукацыі**

1. Непасрэднае кіраўніцтва ўстановай вышэйшай адукацыі ажыццяўляе яе кіраўнік (рэктар, начальнік).

Вылучэнне кандыдатаў для прызначэння на пасаду кіраўніка ўстановы вышэйшай адукацыі ажыццяўляецца на конкурснай аснове ў парадку, які вызначаецца заснавальнікам установы вышэйшай адукацыі або ўпаўнаважаным ім органам, калі іншае не ўстаноўлена Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

2. Кіраўнік дзяржаўнай установы вышэйшай адукацыі прызначаецца на пасаду і вызваляецца ад пасады ў парадку, які вызначаецца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

3. Кіраўнік прыватнай установы вышэйшай адукацыі прызначаецца на пасаду і вызваляецца ад пасады Міністрам адукацыі па прадстаўленні заснавальніка гэтай установы адукацыі.

4. Непасрэднае кіраўніцтва факультэтам, вышэйшай школай без права юрыдычнай асобы ажыццяўляюць дэкан факультэта, дэкан вышэйшай школы.

Дэкан факультэта, дэкан вышэйшай школы без права юрыдычнай асобы прызначаюцца на пасады па прадстаўленні савета ўстановы вышэйшай адукацыі і вызваляюцца ад пасад кіраўніком гэтай установы адукацыі.

5. Непасрэднае кіраўніцтва інстытутам без права юрыдычнай асобы ажыццяўляе яго дырэктар (начальнік).

Дырэктар (начальнік) інстытута без права юрыдычнай асобы прызначаецца на пасаду па прадстаўленні савета ўстановы вышэйшай адукацыі і вызваляецца ад пасады кіраўніком гэтай установы адукацыі, калі іншае не ўстаноўлена Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

6. Непасрэднае кіраўніцтва кафедрай ажыццяўляе загадчык кафедры. Непасрэднае кіраўніцтва філіялам кафедры ажыццяўляе загадчык філіяла (начальнік філіяла) кафедры.

Загадчык кафедры прызначаецца на пасаду пасля яго выбрання саветам установы вышэйшай адукацыі і вызваляецца ад пасады кіраўніком гэтай установы адукацыі.

7. Непасрэднае кіраўніцтва ваенным факультэтам, ваенным інстытутам без права юрыдычнай асобы ажыццяўляюць начальнік ваеннага факультэта, начальнік ваеннага інстытута без права юрыдычнай асобы.

Непасрэднае кіраўніцтва ваеннай кафедрай ажыццяўляе начальнік ваеннай кафедры.

Прызначэнне на пасады і вызваленне ад пасад начальніка ваеннага факультэта, начальніка ваеннага інстытута без права юрыдычнай асобы і начальніка ваеннай кафедры ўстановы вышэйшай адукацыі ажыццяўляюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам аб праходжанні ваеннай службы.

Прызначэнне на пасады і вызваленне ад пасад кіраўнікоў структурных падраздзяленняў ваенных факультэтаў, ваенных інстытутаў без права юрыдычнай асобы, ваенных кафедр і ўстаноў вышэйшай адукацыі, якія ажыццяўляюць падрыхтоўку кадраў па спецыяльнасцях для воінскіх фарміраванняў і ваенізаваных арганізацый, што падлягаюць камплектаванню ваеннаслужачымі, начальніцкім складам органаў унутраных спраў, органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях, ажыццяўляюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам аб праходжанні адпаведнай службы.

8. Непасрэднае кіраўніцтва структурнымі падраздзяленнямі ўстановы вышэйшай адукацыі, не ўказанымі ў пунктах 4–7 гэтага артыкула, ажыццяўляе кіраўнік адпаведнага структурнага падраздзялення (начальнік, загадчык лабараторыі і іншыя), які прызначаецца на пасаду і вызваляецца ад пасады кіраўніком гэтай установы адукацыі.

9. Асноўным органам самакіравання ўстановы вышэйшай адукацыі з’яўляецца савет універсітэта (акадэміі (кансерваторыі), інстытута), які ўзначальваецца кіраўніком гэтай установы адукацыі.

10. Асноўным органам самакіравання факультэта (інстытута без права юрыдычнай асобы, вышэйшай школы без права юрыдычнай асобы) з’яўляецца савет факультэта (інстытута без права юрыдычнай асобы, вышэйшай школы без права юрыдычнай асобы), які ўзначальваецца дэканам (начальнікам) факультэта (дырэктарам інстытута без права юрыдычнай асобы, дэканам вышэйшай школы без права юрыдычнай асобы).

11. Ва ўстанове вышэйшай адукацыі, што рэалізуе адукацыйную праграму дашкольнай адукацыі, адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, ствараецца педагагічны савет.

12. Ва ўстанове вышэйшай адукацыі могуць стварацца навукова-метадычны савет, апекавальніцкі савет, студэнцкі савет і паводле рашэння Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь іншыя органы самакіравання.

**Артыкул 205. Статус установы вышэйшай адукацыі**

1. Статус установы вышэйшай адукацыі ўстанаўлівае яе асаблівае прававое становішча ў сістэме адукацыі, сістэме вышэйшай адукацыі.

2. У сістэме адукацыі ўстановам вышэйшай адукацыі прадастаўляецца асаблівы статус «нацыянальная ўстанова адукацыі» з мэтай стымулявання развіцця, павышэння канкурэнтаздольнасці сістэмы адукацыі, узмацнення яе міжнароднага аўтарытэту на аснове новых ведаў і інавацый.

Асаблівы статус «нацыянальная ўстанова адукацыі» прадастаўляецца ўстанове вышэйшай адукацыі, якая мае міжнароднае навуковае прызнанне, з'яўляецца навучальным і метадычным цэнтрам па некалькіх напрамках адукацыі, забяспечвае падрыхтоўку па шырокім спектры спецыяльнасцей вышэйшай адукацыі, рэалізуе адукацыйную праграму бакалаўрыята, адукацыйную праграму магістратуры, бесперапынную адукацыйную праграму вышэйшай адукацыі, адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, адукацыйныя праграмы сярэдняй спецыяльнай адукацыі, адукацыйныя праграмы дадатковай адукацыі дарослых, ажыццяўляе правядзенне абароны кваліфікацыйных навуковых прац (дысертацый) на атрыманне вучонай ступені доктара навук па некалькіх навуковых спецыяльнасцях.

Асаблівы статус «нацыянальная ўстанова адукацыі» прадастаўляецца Урадам Рэспублікі Беларусь па ўзгадненні з Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, калі іншае не вызначана Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь. Установе вышэйшай адукацыі з асаблівым статусам «нацыянальная ўстанова адукацыі» прадастаўляюцца паўнамоцтвы, якія вызначаюцца Урадам Рэспублікі Беларусь.

3. У сістэме вышэйшай адукацыі ўстанове вышэйшай адукацыі прадастаўляецца статус «вядучая ўстанова вышэйшай адукацыі». Статус «вядучая ўстанова вышэйшай адукацыі» прадастаўляецца ўстанове вышэйшай адукацыі, якая з'яўляецца навуковым, навучальным і метадычным цэнтрам, выконвае фундаментальныя і (або) прыкладныя навуковыя даследаванні, забяспечвае камерцыялізацыю навуковых распрацовак, каардынацыю навукова-метадычнага забеспячэння па адным або некалькіх профілях або напрамках адукацыі, рэалізуе адукацыйную праграму бакалаўрыята, адукацыйную праграму магістратуры і (або) бесперапынную адукацыйную праграму вышэйшай адукацыі, адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі.

Установе вышэйшай адукацыі статус «вядучая ўстанова вышэйшай адукацыі» прадастаўляецца, калі іншае не ўстаноўлена Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, тэрмінам на пяць гадоў Міністэрствам адукацыі па выніках конкурснага адбору, парадак і ўмовы правядзення якога ўстанаўліваюцца Урадам Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 206. Узаемадзеянне ўстаноў вышэйшай адукацыі пры рэалізацыі праграм вышэйшай адукацыі з арганізацыямі – заказчыкамі кадраў**

1. Узаемадзеянне ўстаноў вышэйшай адукацыі з арганізацыямі – заказчыкамі кадраў ажыццяўляецца з мэтай забеспячэння арганізацый, якія маюць патрэбы ў падрыхтоўцы спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй, спецыялістамі з вышэйшай адукацыяй.

2. Узаемадзеянне ўстаноў вышэйшай адукацыі з арганізацыямі – заказчыкамі кадраў пры падрыхтоўцы спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй, акрамя падрыхтоўкі кадраў па спецыяльнасцях для Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь і транспартных войскаў, Міністэрства па надзвычайных сітуацыях і Дзяржаўнага пагранічнага камітэта, ажыццяўляецца пры дапамозе заключэння дагавора аб узаемадзеянні або падачы заяўкі на падрыхтоўку спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй. Дагавор аб узаемадзеянні заключаецца паміж установай вышэйшай адукацыі і арганізацыяй – заказчыкам кадраў. Заяўка на падрыхтоўку спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй падаецца арганізацыяй, якая мае патрэбу ў падрыхтоўцы спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй, ва ўстанову вышэйшай адукацыі.

Узаемадзеянне ўстаноў вышэйшай адукацыі з арганізацыямі – заказчыкамі кадраў пры падрыхтоўцы кадраў па спецыяльнасцях для Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь і транспартных войскаў, Міністэрства па надзвычайных сітуацыях і Дзяржаўнага

пагранічнага камітэта ажыццяўляецца ў парадку, які ўстанаўліваецца адпаведна Міністэрствам абароны, Міністэрствам па надзвычайных сітуацыях, Дзяржаўным пагранічным камітэтам.

3. Дагавор аб узаемадзеянні ўстановы вышэйшай адукацыі з арганізацыяй – заказчыкам кадраў пры падрыхтоўцы спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй заключаецца ў выпадку, калі арганізацыя, якая мае патрэбу ў адпаведных спецыялістах з вышэйшай адукацыяй, прымае на сябе абавязацельства па арганізацыі праходжання вытворчай практыкі студэнтамі і правядзення з імі практычных заняткаў, развіцці матэрыяльна-тэхнічнай базы гэтай установы адукацыі.

4. Істотнымі ўмовамі дагавора аб узаемадзеянні ўстановы вышэйшай адукацыі з арганізацыяй – заказчыкам кадраў пры падрыхтоўцы спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй з’яўляюцца:

4.1. прадмет дагавора;

4.2. колькасць асоб (па гадах), якая заяўляецца для падрыхтоўкі ва ўстанове адукацыі з мэтай наступнага працаўладкавання ў арганізацыі – заказчыку кадраў;

4.3. спецыяльнасці, кваліфікацыі, ступені, па якіх будзе ажыццяўляцца падрыхтоўка;

4.4. парадак праходжання студэнтамі вытворчай практыкі, правядзення практычных заняткаў;

4.5. замацаванне аб’ектаў і абсталявання для праходжання вытворчай практыкі;

4.6. удзел у развіцці матэрыяльна-тэхнічнай і сацыяльна-культурнай базы ўстановы адукацыі;

4.7. стажыроўка педагагічных работнікаў установы вышэйшай адукацыі ў арганізацыі – заказчыку кадраў;

4.8. удзел прадстаўнікоў арганізацыі – заказчыка кадраў у выніковай атэстацыі студэнтаў;

4.9. працаўладкаванне выпускнікоў у арганізацыі – заказчыку кадраў.

5. Арганізацыя, якая заключыла дагавор аб узаемадзеянні ўстановы вышэйшай адукацыі з арганізацыяй – заказчыкам кадраў пры падрыхтоўцы спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй, прызнаецца базавай арганізацыяй адпаведнай установы вышэйшай адукацыі.

Базавая арганізацыя мае пераважнае права на задавальненне сваёй патрэбы ў спецыялістах з вышэйшай адукацыяй з ліку выпускнікоў адпаведнай установы вышэйшай адукацыі. Пры наяўнасці некалькіх базавых арганізацый задавальненне патрэб у спецыялістах з вышэйшай адукацыяй ажыццяўляецца ў парадку чарговасці, якая вызначаецца датай заключэння адпаведных дагавораў.

6. Дагавор аб узаемадзеянні ўстановы вышэйшай адукацыі з арганізацыяй – заказчыкам кадраў пры падрыхтоўцы спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй знаходзіцца паміж установай вышэйшай адукацыі і арганізацыяй дзяржаўнай формы ўласнасці па ўзгадненні з дзяржаўнымі органамі, арганізацыямі, у падпарадкаванні якіх яны знаходзяцца, а паміж установай вышэйшай адукацыі і прыватнай арганізацыяй – па ўзгадненні з іх заснавальнікамі.

7. Заяўка на падрыхтоўку спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй – накіраваны ва ўстанову вышэйшай адукацыі заказ арганізацыі, якая мае патрэбу ў падрыхтоўцы спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй, на падрыхтоўку спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй з мэтай іх наступнага працаўладкавання ў гэтай арганізацыі.

8. У заяўцы на падрыхтоўку спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй указваюцца:

8.1. колькасць асоб (па гадах), якая адпавядае патрэбе арганізацыі ў спецыялістах з вышэйшай адукацыяй;

8.2. спецыяльнасці, кваліфікацыі, ступені, па якіх ёсць патрэба ў спецыялістах з вышэйшай адукацыяй.

9. Палажэнне аб базавай арганізацыі ўстановы вышэйшай адукацыі зацвярджаецца Урадам Рэспублікі Беларусь або ўпаўнаважаным ім органам, прыкладная форма дагавора аб узаемадзеянні ўстановы вышэйшай адукацыі з арганізацыяй – заказчыкам кадраў пры

падрыхтоўцы спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй і парадак яго заключэння, форма заяўкі на падрыхтоўку спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй устанаўліваюцца Урадам Рэспублікі Беларусь або ўпаўнаважаным ім органам.

## ГЛАВА 37
## АРГАНІЗАЦЫЯ АДУКАЦЫЙНАГА ПРАЦЭСУ ПРЫ РЭАЛІЗАЦЫІ АДУКАЦЫЙНЫХ ПРАГРАМ ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ

### Артыкул 207. Агульныя патрабаванні да арганізацыі адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі

1. Адукацыйны працэс пры рэалізацыі адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі арганізуецца па навучальных гадах (курсах навучання).

Навучальны год пры рэалізацыі адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі дзеліцца на семестры.

2. Для студэнтаў, курсантаў, слухачоў, акрамя курсантаў і слухачоў, якія засвойваюць змест адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі па спецыяльнасцях для воінскіх фарміраванняў і ваенізаваных арганізацый, пры засваенні зместу адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі ў вочнай форме атрымання адукацыі ўстанаўліваюцца:

канікулы на працягу навучальнага года працягласцю не меншай за 2 каляндарныя тыдні;

летнія канікулы працягласцю не меншай за 4 каляндарныя тыдні.

Для курсантаў, слухачоў, якія засвойваюць змест адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі па спецыяльнасцях для воінскіх фарміраванняў і ваенізаваных арганізацый, устанаўліваюцца канікулярныя водпускі, працягласць і асаблівасці прадастаўлення якіх вызначаюцца заканадаўствам аб праходжанні адпаведнай службы.

3. Адукацыйны працэс пры рэалізацыі адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі ажыццяўляецца ў вучэбных групах або індывідуальна. Вучэбныя групы могуць аб’ядноўвацца ў патокі, якія ўключаюць дзве і больш вучэбныя групы, а таксама дзяліцца на падгрупы.

Напаўняльнасць вучэбнай групы вызначаецца ўстановай адукацыі з улікам патрэб арганізацый – заказчыкаў кадраў у спецыялістах з вышэйшай адукацыяй і на момант яе фарміравання складае ад 4 да 30 навучэнцаў.

Адукацыйны працэс можа ажыццяўляцца індывідуальна на падставе адукацыйнага стандарту адпаведнай вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці або на падставе рашэння кіраўніка ўстановы адукацыі ў адпаведнасці з індывідуальным вучэбным планам.

4. Асноўнымі формамі арганізацыі адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі з’яўляюцца вучэбныя заняткі: лекцыя, практычныя, семінарскія, лабараторныя заняткі, кантрольная праца і іншыя заняткі, практыка. Вучэбныя заняткі могуць праводзіцца па зменах. Дадаткова праводзяцца факультатыўныя заняткі, кансультацыі.

Парадак арганізацыі і віды практыкі студэнтаў, курсантаў, слухачоў вызначаюцца Палажэннем аб практыцы студэнтаў, курсантаў, слухачоў, якое зацвярджаецца Урадам Рэспублікі Беларусь.

5. Навуковыя даследаванні з’яўляюцца неад’емнай часткай зместу адукацыйнай праграмы магістратуры, бесперапыннай адукацыйнай праграмы вышэйшай адукацыі. Навуковыя даследаванні праводзяцца ў адпаведнасці з індывідуальным планам працы магістранта, слухача.

Навуковыя даследаванні могуць быць складнікам зместу адукацыйнай праграмы бакалаўрыята.

6. Пры рэалізацыі адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі ў вочнай форме атрымання адукацыі ў навучальным годзе арганізуюцца экзаменацыйныя сесіі.

Пры рэалізацыі адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі ў завочнай форме атрымання адукацыі ў навучальным годзе арганізуюцца лабараторна-экзаменацыйныя сесіі, а таксама могуць арганізоўвацца ўстановачныя сесіі, якія праводзяцца ў пачатку навучальнага года першага курса для правядзення вучэбных заняткаў па вучэбных дысцыплінах, модулях вучэбнага плана ўстановы адукацыі па спецыяльнасці, якія вывучаюцца ў першым семестры.

Пры рэалізацыі адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі ў дыстанцыйнай форме атрымання адукацыі ў навучальным годзе могуць арганізоўвацца лабараторна-экзаменацыйныя сесіі, а таксама ўстановачныя сесіі, якія праводзяцца ў пачатку навучальнага года першага курса для правядзення вучэбных заняткаў па вучэбных дысцыплінах, модулях вучэбнага плана ўстановы адукацыі па спецыяльнасці, якія вывучаюцца ў першым семестры.

7. Парадак арганізацыі адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі вызначаецца Міністэрствам адукацыі.

8. Выхаваўчая праца ў невучэбны час з навучэнцамі праводзіцца педагагічнымі работнікамі, у тым ліку тымі, хто выконвае функцыі куратара вучэбнай групы.

### Артыкул 208. Агульныя патрабаванні да прыёму (залічэння) асоб для атрымання вышэйшай адукацыі

1. Для засваення зместу адукацыйнай праграмы бакалаўрыята, бесперапыннай адукацыйнай праграмы вышэйшай адукацыі на ўсе формы атрымання адукацыі прымаюцца (залічваюцца) асобы, якія маюць агульную сярэднюю адукацыю, прафесійна-тэхнічную адукацыю (прафесійна-тэхнічную адукацыю з атрыманнем агульнай сярэдняй адукацыі або прафесійна-тэхнічную адукацыю на аснове агульнай сярэдняй адукацыі) або сярэднюю спецыяльную адукацыю, а для засваення зместу адукацыйнай праграмы магістратуры – асобы, якія маюць вышэйшую адукацыю па адпаведных профілях адукацыі, напрамках адукацыі, спецыяльнасцях, якія вызначаюцца Урадам Рэспублікі Беларусь, калі іншае не вызначана Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

2. Прыём (залічэнне) асоб для засваення зместу адукацыйных праграм агульнай вышэйшай адукацыі, спецыяльнай вышэйшай адукацыі ажыццяўляецца ў адпаведнасці з Правіламі прыёму асоб для атрымання агульнай вышэйшай адукацыі, спецыяльнай вышэйшай адукацыі. Прыём (залічэнне) асоб для засваення зместу адукацыйнай праграмы паглыбленай вышэйшай адукацыі ажыццяўляецца ў адпаведнасці з Правіламі прыёму асоб для атрымання паглыбленай вышэйшай адукацыі.

3. Для арганізацыі прыёму (залічэння) асоб для засваення зместу адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі ва ўстанове адукацыі ствараецца прыёмная камісія, якая ўзначальваецца яе кіраўніком. Прыёмная камісія ажыццяўляе сваю дзейнасць у адпаведнасці з Палажэннем аб прыёмнай камісіі ўстановы вышэйшай адукацыі па прыёме асоб для атрымання вышэйшай адукацыі, якая зацвярджаецца Міністэрствам адукацыі.

## ГЛАВА 38
## АТЭСТАЦЫЯ СТУДЭНТАЎ, КУРСАНТАЎ, СЛУХАЧОЎ ПРЫ ЗАСВАЕННІ ЗМЕСТУ АДУКАЦЫЙНЫХ ПРАГРАМ ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ

### Артыкул 209. Бягучая і прамежкавая атэстацыя студэнтаў, курсантаў, слухачоў пры засваенні зместу адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі

1. Студэнты, курсанты, слухачы пры засваенні зместу адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі праходзяць бягучую і прамежкавую атэстацыю па вучэбных дысцыплінах, модулях вучэбнага плана ўстановы адукацыі па спецыяльнасці.

Студэнты, курсанты, слухачы пры засваенні зместу адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі праходзяць прамежкавую атэстацыю па практыцы вучэбнага плана ўстановы адукацыі па спецыяльнасці.

Студэнты, курсанты, слухачы пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы магістратуры, бесперапыннай адукацыйнай праграмы вышэйшай адукацыі, якія вывучаюць агульнаадукацыйныя дысцыпліны, праходзяць па іх прамежкавую атэстацыю.

2. Бягучая атэстацыя студэнтаў, курсантаў, слухачоў праводзіцца на працягу семестра з мэтай перыядычнага кантролю і ацэнкі вынікаў іх вучэбнай дзейнасці па вучэбнай дысцыпліне, модулі вучэбнага плана ўстановы адукацыі па спецыяльнасці, якія вывучаюцца ў семестры.

3. Канкрэтныя формы бягучай атэстацыі студэнтаў, курсантаў, слухачоў вызначаюцца вучэбнымі праграмамі па вучэбных дысцыплінах, модулях вучэбнага плана ўстановы адукацыі па спецыяльнасці, індывідуальных планах працы магістранта, слухача.

4. Бягучая атэстацыя студэнтаў, курсантаў, слухачоў праводзіцца ў адпаведнасці з Правіламі правядзення атэстацыі студэнтаў, курсантаў, слухачоў пры засваенні зместу адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі і гэтым Кодэксам. Асаблівасці правядзення бягучай атэстацыі навучэнцаў пры засваенні зместу адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі па спецыяльнасцях напрамку адукацыі «Мастацтва» вызначаюцца Міністэрствам культуры.

5. Прамежкавая атэстацыя студэнтаў, курсантаў, слухачоў праводзіцца з мэтай ацэнкі вынікаў іх вучэбнай дзейнасці за семестр па вучэбнай дысцыпліне, агульнаадукацыйнай дысцыпліне, модулі вучэбнага плана ўстановы адукацыі па спецыяльнасці, якія вывучаюцца ў семестры, праходжання практыкі, выканання індывідуальнага плана працы магістранта, слухача.

Прамежкавая атэстацыя студэнтаў, курсантаў, слухачоў праводзіцца ў адпаведнасці з патрабаваннямі адпаведнага адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі, вучэбна-праграмнай дакументацыі адукацыйнай праграмы вышэйшай адукацыі адпаведнага віду.

6. Вынік прамежкавай атэстацыі, які выявіўся ў атрыманні нездавальняючай адзнакі, або няяўка для праходжання атэстацыі ва ўстаноўлены ўстановай адукацыі тэрмін без уважлівай прычыны з'яўляюцца акадэмічнай запазычанасцю.

Студэнты, курсанты, слухачы абавязаны ліквідаваць акадэмічную запазычанасць у парадку, які вызначаецца Правіламі правядзення атэстацыі студэнтаў, курсантаў, слухачоў пры засваенні зместу адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі.

Студэнты, курсанты, слухачы, якія маюць акадэмічную запазычанасць не больш чым па дзвюх вучэбных дысцыплінах, модулях, па практыцы вучэбнага плана ўстановы адукацыі па спецыяльнасці або якім устаноўлены індывідуальны тэрмін праходжання прамежкавай атэстацыі, што прыпадае на наступны семестр, пераводзяцца на наступны семестр умоўна.

7. Формы, умовы і парадак правядзення прамежкавай атэстацыі студэнтаў, курсантаў, слухачоў пры засваенні зместу адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі, крытэрыі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў, курсантаў, слухачоў, парадак правядзення прамежкавай атэстацыі ў частцы, не ўрэгуляванай гэтым Кодэксам, вызначаюцца Правіламі правядзення атэстацыі студэнтаў, курсантаў, слухачоў пры засваенні зместу адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі.

### Артыкул 210. Выніковая атэстацыя студэнтаў, курсантаў, слухачоў пры засваенні зместу адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі

1. Студэнты, курсанты, слухачы пры завяршэнні засваення зместу адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі праходзяць выніковую атэстацыю.

2. Выніковая атэстацыя студэнтаў, курсантаў, слухачоў праводзіцца дзяржаўнымі экзаменацыйнымі камісіямі.

3. Студэнтам, курсантам, слухачам, якія не прайшлі выніковую атэстацыю ва ўстаноўлены тэрмін па ўважлівай прычыне, прадастаўляецца права на праходжанне выніковай атэстацыі ў іншы тэрмін падчас працы дзяржаўных экзаменацыйных камісій.

4. Формы, умовы правядзення выніковай атэстацыі студэнтаў, курсантаў, слухачоў пры засваенні зместу адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі, крытэрыі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў, курсантаў, слухачоў, парадак і ўмовы допуску студэнтаў, курсантаў, слухачоў да выніковай атэстацыі, парадак стварэння і функцыянавання дзяржаўных экзаменацыйных камісій, парадак правядзення выніковай атэстацыі ў частцы, не ўрэгуляванай гэтым Кодэксам, вызначаюцца Правіламі правядзення атэстацыі студэнтаў, курсантаў, слухачоў пры засваенні зместу адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі.

5. Для курсантаў, слухачоў пры засваенні зместу адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі па спецыяльнасцях для воінскіх фарміраванняў і ваенізаваных арганізацый могуць устанаўлівацца асаблівасці праходжання выніковай атэстацыі адпаведным дзяржаўным органам, падпарадкаваным і (або) падсправаздачным Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь, рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання.

## ГЛАВА 39
## НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ

### Артыкул 211. Сістэма навукова-метадычнага забеспячэння вышэйшай адукацыі

1. Навукова-метадычнае забеспячэнне вышэйшай адукацыі ўключае ў сябе:

1.1. вучэбна-праграмную дакументацыю адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі;

1.2. праграмна-планавальную дакументацыю выхавання;

1.3. вучэбна-метадычную дакументацыю;

1.4. вучэбныя і іншыя выданні;

1.5. кантрольна-вымяральныя матэрыялы;

1.6. інфармацыйна-аналітычныя матэрыялы;

1.7. метадычныя ўказанні па распрацоўцы вучэбна-праграмнай дакументацыі адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі.

2. Навукова-метадычнае забеспячэнне вышэйшай адукацыі ажыццяўляюць:

2.1. арганізацыі, што ажыццяўляюць навукова-метадычнае забеспячэнне вышэйшай адукацыі;

2.2. установы вышэйшай адукацыі, установы дадатковай адукацыі дарослых;

2.3. вучэбна-метадычныя аб’яднанні ў сферы вышэйшай адукацыі;

2.4. арганізацыі, якія ўдзельнічаюць у рэалізацыі адукацыйных праграм праз сеткавую форму ўзаемадзеяння;

2.5. арганізацыі – заказчыкі кадраў;

2.6. дзяржаўныя органы, падпарадкаваныя і (або) падсправаздачныя Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь, Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, рэспубліканскія органы дзяржаўнага кіравання, іншыя арганізацыі, падпарадкаваныя Ураду Рэспублікі Беларусь, іншыя арганізацыі і фізічныя асобы ў межах іх паўнамоцтваў у сферы вышэйшай адукацыі.

### Артыкул 212. Вучэбна-праграмная дакументацыя адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі

1. Вучэбна-праграмная дакументацыя адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі ўключае ў сябе вучэбныя планы, вучэбныя праграмы, праграмы па практыцы, індывідуальныя планы працы магістрантаў, слухачоў.

2. Вучэбныя планы падраздзяляюцца на:

2.1. прыкладныя вучэбныя планы па спецыяльнасцях;

2.2. вучэбныя планы ўстаноў адукацыі па спецыяльнасцях;
2.3. эксперыментальныя вучэбныя планы ўстаноў адукацыі па спецыяльнасцях;
2.4. індывідуальныя вучэбныя планы.

3. Вучэбныя планы ўключаюць у сябе дзяржаўны кампанент і кампанент установы адукацыі. Вучэбныя планы адлюстроўваюць прафілізацыю – варыянт рэалізацыі адпаведнай адукацыйнай праграмы вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці, абумоўлены асаблівасцямі прафесійнай дзейнасці спецыяліста. У найменне вучэбнага плана пры яго распрацоўцы можа ўключацца сціслае найменне прафілізацыі.

Патрабаванні да зместу і рэалізацыі кампанентаў вучэбнага плана, а таксама іх суадносіны адлюстроўваюцца ў адпаведных адукацыйных стандартах вышэйшай адукацыі.

4. Прыкладны вучэбны план па спецыяльнасці ўстанаўлівае прыкладныя графік адукацыйнага працэсу, працаёмкасць вучэбных дысцыплін, модуляў дзяржаўнага кампанента, пералік і працаёмкасць вучэбных дысцыплін, модуляў кампанента ўстановы адукацыі, паслядоўнасць і тэрміны вывучэння вучэбных дысцыплін, модуляў, від, працаёмкасць і тэрміны праходжання практыкі, віды вучэбных заняткаў, суадносіны аўдыторнай і самастойнай працы, формы і тэрміны правядзення прамежкавай і выніковай атэстацыі.

Прыкладны вучэбны план па спецыяльнасці адукацыйнай праграмы магістратуры, бесперапыннай адукацыйнай праграмы вышэйшай адукацыі таксама можа ўстанаўліваць працягласць і тэрміны правядзення навуковых даследаванняў, паслядоўнасць і тэрміны вывучэння агульнаадукацыйных дысцыплін.

Прыкладны вучэбны план па спецыяльнасці распрацоўваецца ў якасці прыкладу рэалізацыі адпаведнага адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі і па форме (макеце) прыкладнага вучэбнага плана па спецыяльнасці, якая вызначаецца Міністэрствам адукацыі. Прыкладны вучэбны план па спецыяльнасці ўключае ў сябе прыклад рэалізацыі дзяржаўнага кампанента ў адпаведнасці з адукацыйным стандартам вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці і прыклад рэалізацыі кампанента ўстановы адукацыі.

Прыкладныя вучэбныя планы па спецыяльнасцях, акрамя прыкладных вучэбных планаў па спецыяльнасцях напрамкаў адукацыі «Ахова здароўя» і «Сельская гаспадарка», прыкладных вучэбных планаў па спецыяльнасцях для ўстаноў вышэйшай адукацыі, якія знаходзяцца ў падпарадкаванні органаў дзяржаўнай бяспекі, распрацоўваюцца арганізацыямі, што ажыццяўляюць навукова-метадычнае забеспячэнне вышэйшай адукацыі, і (або) вучэбна-метадычнымі аб’яднаннямі ў сферы вышэйшай адукацыі і зацвярджаюцца Міністэрствам адукацыі па ўзгадненні з зацікаўленымі дзяржаўнымі органамі, падпарадкаванымі і (або) падсправаздачнымі Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі, рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання, іншымі арганізацыямі, падпарадкаванымі Ураду Рэспублікі Беларусь, у падпарадкаванні якіх знаходзяцца ўстановы адукацыі і (або) для якіх ажыццяўляецца падрыхтоўка кадраў, пры наяўнасці заключэнняў Міністэрства аховы здароўя аб іх адпаведнасці заканадаўству ў сферы санітарна-эпідэміялагічнага дабрабыту насельніцтва. Прыкладныя вучэбныя планы па спецыяльнасцях напрамку адукацыі «Ахова здароўя» зацвярджаюцца Міністэрствам аховы здароўя і Міністэрствам адукацыі, прыкладныя вучэбныя планы па спецыяльнасцях напрамку адукацыі «Сельская гаспадарка» – Міністэрствам сельскай гаспадаркі і харчавання і Міністэрствам адукацыі, а прыкладныя вучэбныя планы па спецыяльнасцях для ўстаноў вышэйшай адукацыі, якія знаходзяцца ў падпарадкаванні органаў дзяржаўнай бяспекі, распрацоўваюцца гэтымі ўстановамі адукацыі і зацвярджаюцца Камітэтам дзяржаўнай бяспекі.

5. Вучэбны план установы адукацыі па спецыяльнасці ўстанаўлівае прынятыя ва ўстанове вышэйшай адукацыі графік адукацыйнага працэсу, працаёмкасць вучэбных дысцыплін, модуляў дзяржаўнага кампанента, пералік і працаёмкасць вучэбных дысцыплін, модуляў кампанента ўстановы адукацыі, паслядоўнасць і тэрміны вывучэння вучэбных дысцыплін, модуляў, від, працаёмкасць і тэрміны праходжання практыкі, віды

вучэбных заняткаў, суадносіны аўдыторнай і самастойнай працы, формы і тэрміны правядзення прамежкавай і выніковай атэстацыі.

Вучэбны план установы адукацыі па спецыяльнасці адукацыйнай праграмы магістратуры, бесперапыннай адукацыйнай праграмы вышэйшай адукацыі таксама можа ўстанаўліваць працягласць і тэрміны правядзення навуковых даследаванняў, паслядоўнасць і тэрміны вывучэння агульнаадукацыйных дысцыплін.

Вучэбны план установы адукацыі па спецыяльнасці распрацоўваецца на аснове адпаведнага адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі. У вучэбны план установы адукацыі па спецыяльнасці ўключаюцца дзяржаўны кампанент у адпаведнасці з адукацыйным стандартам па спецыяльнасці, кампанент установы адукацыі, які адпавядае прафілізацыі спецыяльнасці ва ўстанове адукацыі. Прыкладам пры распрацоўцы вучэбнага плана ўстановы адукацыі па спецыяльнасці можа з’яўляцца прыкладны вучэбны план па спецыяльнасці.

Вучэбныя планы ўстаноў адукацыі па спецыяльнасцях распрацоўваюцца ўстановамі адукацыі па кожнай спецыяльнасці для кожнай формы атрымання адукацыі і зацвярджаюцца кіраўнікамі гэтых устаноў адукацыі.

У вучэбны план установы адукацыі па спецыяльнасці могуць уключацца вучэбныя заняткі, практыка, якія забяспечваюць прысваенне кваліфікацыі рабочага (служачага).

Пры рэалізацыі адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі праз сеткавую форму ўзаемадзеяння ўстановы вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь і замежнай арганізацыі змест дзяржаўнага кампанента вучэбнага плана ўстановы адукацыі па спецыяльнасці можа быць адаптаваны да ўмоў дагавора аб рэалізацыі адпаведнай адукацыйнай праграмы вышэйшай адукацыі праз сеткавую форму ўзаемадзеяння. Адаптацыя дзяржаўнага кампанента вучэбнага плана ўстановы адукацыі па спецыяльнасці ажыццяўляецца ў парадку і на ўмовах, якія вызначаюцца Міністэрствам адукацыі.

6. Эксперыментальны вучэбны план установы адукацыі па спецыяльнасці апрабоўваецца ва ўстанове адукацыі, на базе якой ажыццяўляецца эксперыментальная дзейнасць.

Эксперыментальныя вучэбныя планы ўстаноў адукацыі па спецыяльнасцях, акрамя эксперыментальных вучэбных планаў устаноў адукацыі па спецыяльнасцях напрамкаў адукацыі «Ахова здароўя» і «Сельская гаспадарка», распрацоўваюцца ўстановамі адукацыі, на базе якіх ажыццяўляецца эксперыментальная дзейнасць, і зацвярджаюцца Міністэрствам адукацыі па ўзгадненні з зацікаўленымі дзяржаўнымі органамі, падпарадкаванымі і (або) падсправаздачнымі Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі, рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання, іншымі арганізацыямі, падпарадкаванымі Ураду Рэспублікі Беларусь, у падпарадкаванні якіх знаходзяцца ўстановы адукацыі і (або) для якіх ажыццяўляецца падрыхтоўка кадраў. Эксперыментальныя вучэбныя планы ўстаноў адукацыі па спецыяльнасцях напрамку адукацыі «Ахова здароўя» зацвярджаюцца Міністэрствам аховы здароўя і Міністэрствам адукацыі. Эксперыментальныя вучэбныя планы ўстаноў адукацыі па спецыяльнасцях напрамку адукацыі «Сельская гаспадарка» зацвярджаюцца Міністэрствам сельскай гаспадаркі і харчавання і Міністэрствам адукацыі.

Эксперыментальныя вучэбныя планы ўстаноў адукацыі па спецыяльнасцях могуць распрацоўвацца для кожнай формы атрымання адукацыі.

7. Індывідуальныя вучэбныя планы ўстанаўліваюць асаблівасці атрымання вышэйшай адукацыі:

паспяваючымі студэнтамі, курсантамі, слухачамі, якія па ўважлівых прычынах не могуць пастаянна або часова наведваць вучэбныя заняткі і (або) праходзіць ва ўстаноўленыя тэрміны атэстацыю;

навучэнцамі, курсантамі, прынятымі для атрымання або працягу атрымання адукацыі на ўзроўні вышэйшай адукацыі, якія засвоілі змест асобных вучэбных дысцыплін, модуляў,

практыкі, што ўваходзяць у вучэбны план установы адукацыі па спецыяльнасці, аб чым маецца дакумент аб адукацыі або дакумент аб навучанні.

Індывідуальныя вучэбныя планы распрацоўваюцца ўстановамі адукацыі на аснове вучэбных планаў устаноў адукацыі па спецыяльнасцях і зацвярджаюцца кіраўнікамі гэтых устаноў адукацыі.

8. Вучэбныя праграмы адукацыйнай праграмы бакалаўрыята падраздзяляюцца на:

8.1. прыкладныя вучэбныя праграмы па вучэбных дысцыплінах, модулях;

8.2. вучэбныя праграмы ўстаноў адукацыі па вучэбных дысцыплінах, модулях.

9. Вучэбныя праграмы адукацыйнай праграмы магістратуры, бесперапыннай адукацыйнай праграмы вышэйшай адукацыі падраздзяляюцца на:

9.1. прыкладныя вучэбныя праграмы па вучэбных дысцыплінах, модулях;

9.2. вучэбныя праграмы ўстаноў адукацыі па вучэбных дысцыплінах, модулях;

9.3. праграмы-мінімумы кандыдацкіх экзаменаў па агульнаадукацыйных дысцыплінах;

9.4. праграмы-мінімумы дыферэнцыраваных залікаў па агульнаадукацыйных дысцыплінах.

10. Прыкладная вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне, модулі распрацоўваецца па вучэбнай дысцыпліне, модулі дзяржаўнага кампанента прыкладнага вучэбнага плана па спецыяльнасці, вызначае мэты і задачы вывучэння вучэбнай дысцыпліны, модуля, сувязі з іншымі вучэбнымі дысцыплінамі, модулямі, асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў, курсантаў, слухачоў, змест вучэбнай дысцыпліны, модуля, пералік вучэбных і іншых выданняў.

Прыкладная вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне, модулі распрацоўваецца ў якасці прыкладу арганізацыі адукацыйнага працэсу па вучэбнай дысцыпліне, модулі дзяржаўнага кампанента вучэбнага плана ўстановы адукацыі па спецыяльнасці.

Прыкладныя вучэбныя праграмы па вучэбных дысцыплінах, модулях, акрамя прыкладных вучэбных праграм па спецыяльных вучэбных дысцыплінах, модулях вучэбных планаў па спецыяльнасцях напрамкаў адукацыі «Ахова здароўя» і «Сельская гаспадарка», прыкладных вучэбных праграм па вучэбных дысцыплінах, модулях вучэбных планаў для ўстаноў вышэйшай адукацыі, якія знаходзяцца ў падпарадкаванні органаў дзяржаўнай бяспекі, распрацоўваюцца арганізацыямі, што ажыццяўляюць навукова-метадычнае забеспячэнне вышэйшай адукацыі, і (або) вучэбна-метадычнымі аб’яднаннямі ў сферы вышэйшай адукацыі і зацвярджаюцца Міністэрствам адукацыі.

Прыкладныя вучэбныя праграмы па спецыяльных вучэбных дысцыплінах, модулях вучэбных планаў па спецыяльнасцях напрамку адукацыі «Ахова здароўя» распрацоўваюцца арганізацыямі, што ажыццяўляюць навукова-метадычнае забеспячэнне вышэйшай адукацыі, і (або) вучэбна-метадычнымі аб’яднаннямі ў сферы вышэйшай адукацыі і зацвярджаюцца Міністэрствам аховы здароўя.

Прыкладныя вучэбныя праграмы па спецыяльных вучэбных дысцыплінах, модулях вучэбных планаў па спецыяльнасцях напрамку адукацыі «Сельская гаспадарка» распрацоўваюцца арганізацыямі, што ажыццяўляюць навукова-метадычнае забеспячэнне вышэйшай адукацыі, і (або) вучэбна-метадычнымі аб’яднаннямі ў сферы вышэйшай адукацыі і зацвярджаюцца Міністэрствам сельскай гаспадаркі і харчавання.

Прыкладныя вучэбныя праграмы па вучэбных дысцыплінах, модулях вучэбных планаў для ўстаноў вышэйшай адукацыі, якія знаходзяцца ў падпарадкаванні органаў дзяржаўнай бяспекі, распрацоўваюцца гэтымі ўстановамі адукацыі і зацвярджаюцца Камітэтам дзяржаўнай бяспекі.

11. Вучэбная праграма ўстановы адукацыі па вучэбнай дысцыпліне, модулі распрацоўваецца па вучэбнай дысцыпліне, модулі вучэбнага плана ўстановы адукацыі па спецыяльнасці, вызначае мэты і задачы вывучэння вучэбнай дысцыпліны, модуля, сувязі з іншымі вучэбнымі дысцыплінамі, модулямі, патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці

студэнтаў, курсантаў, слухачоў, змест вучэбнай дысцыпліны, модуля, пералік вучэбных і іншых выданняў.

Вучэбныя праграмы ўстаноў адукацыі па вучэбных дысцыплінах, модулях распрацоўваюцца на аснове адпаведных адукацыйных стандартаў вышэйшай адукацыі і вучэбнага плана ўстановы адукацыі па спецыяльнасці ўстановамі адукацыі і зацвярджаюцца іх кіраўнікамі.

Пры распрацоўцы вучэбных праграм устаноў адукацыі па вучэбных дысцыплінах, модулях могуць выкарыстоўвацца прыкладныя вучэбныя праграмы па вучэбных дысцыплінах, модулях.

12. Праграма па практыцы вызначае мэты і задачы практыкі, патрабаванні да яе арганізацыі і зместу, асноўныя напрамкі дзейнасці студэнтаў, курсантаў, слухачоў падчас праходжання практыкі, патрабаванні да вынікаў яе праходжання.

Праграма па практыцы распрацоўваецца ўстановай адукацыі і зацвярджаецца яе кіраўніком.

13. Праграма-мінімум кандыдацкага экзамену па агульнаадукацыйнай дысцыпліне і праграма-мінімум дыферэнцыраванага заліку па агульнаадукацыйнай дысцыпліне з’яўляюцца тэхнічнымі нарматыўнымі прававымі актамі і вызначаюць мэты і задачы вывучэння адпаведнай агульнаадукацыйнай дысцыпліны, патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў, курсантаў, слухачоў, змест агульнаадукацыйнай дысцыпліны, пералік вучэбных і іншых выданняў.

Праграмы-мінімумы кандыдацкіх экзаменаў па агульнаадукацыйных дысцыплінах і праграмы-мінімумы дыферэнцыраваных залікаў па агульнаадукацыйных дысцыплінах распрацоўваюцца ўстановамі адукацыі, арганізацыямі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, і зацвярджаюцца Міністэрствам адукацыі ў парадку, які ім устанаўліваецца.

14. Індывідуальны план працы магістранта, слухача прадугледжвае праграму падрыхтоўкі магістрантам, слухачом магістарскай дысертацыі.

Індывідуальныя планы працы магістрантаў, слухачоў распрацоўваюцца навуковымі кіраўнікамі магістрантаў, слухачоў пры ўдзеле навучэнцаў на аснове вучэбных планаў устаноў адукацыі па спецыяльнасцях і зацвярджаюцца кіраўнікамі ўстаноў адукацыі.

### Артыкул 213. Вучэбна-метадычныя аб’яднанні ў сферы вышэйшай адукацыі

1. Для ўдасканалення навукова-метадычнага забеспячэння вышэйшай адукацыі, у тым ліку ў адпаведнасці з патрэбамі галін эканомікі і сацыяльнай сферы, пры рэалізацыі адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі Міністэрствам адукацыі могуць ствараецца вучэбна-метадычныя аб’яднанні ў сферы вышэйшай адукацыі.

2. У склад вучэбна-метадычных аб’яднанняў у сферы вышэйшай адукацыі могуць уваходзіць педагагічныя і навуковыя работнікі ўстаноў вышэйшай адукацыі, навуковых арганізацый, прадстаўнікі дзяржаўных органаў, іншых арганізацый, зацікаўленых у падрыхтоўцы спецыялістаў па пэўных групах спецыяльнасцей.

3. Асноўнымі функцыямі вучэбна-метадычных аб’яднанняў у сферы вышэйшай адукацыі з’яўляюцца:

3.1. удзел у аптымізацыі спецыяльнасцей і кваліфікацый;

3.2. удзел у распрацоўцы і ўдасканаленні адукацыйных стандартаў вышэйшай адукацыі;

3.3. удзел у распрацоўцы і ўдасканаленні вучэбных планаў і вучэбных праграм адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі;

3.4. забеспячэнне ўзаемадзеяння з вучэбна-метадычнымі аб’яднаннямі ў сферы сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў распрацоўцы і ўдасканаленні вучэбна-праграмнай дакументацыі адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі, інтэграваных з адукацыйнымі праграмамі сярэдняй спецыяльнай адукацыі;

3.5. рэкамендацыя вучэбна-метадычнага дапаможніка, дапаможніка, практыкуму, вучэбнага нагляднага дапаможніка ў якасці адпаведнага віду вучэбнага выдання;

3.6. падрыхтоўка заключэння аб магчымасці адкрыцця падрыхтоўкі па спецыяльнасцях вышэйшай адукацыі;

3.7. правядзенне кансультацый з зацікаўленымі арганізацыямі па пытаннях забеспячэння адпаведнасці вышэйшай адукацыі сучасным патрэбам галін эканомікі і сацыяльнай сферы;

3.8. правядзенне кансультацый для ўстаноў вышэйшай адукацыі па пытаннях удасканалення вышэйшай адукацыі.

4. Рашэнні вучэбна-метадычных аб'яднанняў у сферы вышэйшай адукацыі носяць рэкамендацыйны характар.

5. Вучэбна-метадычныя аб'яднанні ў сферы вышэйшай адукацыі ствараюцца і функцыянуюць на базе ўстаноў вышэйшай адукацыі. Пералік вучэбна-метадычных аб'яднанняў у сферы вышэйшай адукацыі і ўстаноў вышэйшай адукацыі, на базе якіх яны ствараюцца і функцыянуюць, устанаўліваецца Міністэрствам адукацыі.

6. Дзейнасць вучэбна-метадычнага аб'яднання ў сферы вышэйшай адукацыі забяспечвае ўстанова вышэйшай адукацыі, на базе якой яна створана. Для забеспячэння дзейнасці вучэбна-метадычных аб'яднанняў у сферы вышэйшай адукацыі ва ўстановах вышэйшай адукацыі, на базе якіх яны створаны, могуць ствараццa цэнтры развіцця і каардынацыі навукова-метадычнага забеспячэння адпаведных профіляў адукацыі, напрамкаў адукацыі.

7. Для каардынацыі дзейнасці вучэбна-метадычных аб'яднанняў у сферы вышэйшай адукацыі Міністэрствам адукацыі можа ствараццa Каардынацыйны навукова-метадычны савет вучэбна-метадычных аб'яднанняў у сферы вышэйшай адукацыі.

Палажэнні аб вучэбна-метадычным аб'яднанні ў сферы вышэйшай адукацыі, аб Каардынацыйным навукова-метадычным савеце вучэбна-метадычных аб'яднанняў у сферы вышэйшай адукацыі зацвярджаюцца Міністэрствам адукацыі.

8. Функцыі вучэбна-метадычнага аб'яднання ў сферы падрыхтоўкі кадраў па спецыяльнасцях для органаў дзяржаўнай бяспекі выконвае Праграмна-метадычная камісія Камітэта дзяржаўнай бяспекі.

## РАЗДЗЕЛ XII
## НАВУКОВА-АРЫЕНТАВАНАЯ АДУКАЦЫЯ

## ГЛАВА 40
## СІСТЭМА НАВУКОВА-АРЫЕНТАВАНАЙ АДУКАЦЫІ

### Артыкул 214. Сістэма навукова-арыентаванай адукацыі

1. Навукова-арыентаваная адукацыя – узровень асноўнай адукацыі, накіраваны на развіццё асобы аспіранта, ад'юнкта, дактаранта, саіскальніка, рэалізацыю іх інтэлектуальнага і творчага патэнцыялу, фарміраванне ў іх кампетэнцый, неабходных для арганізацыі і правядзення навуковых даследаванняў, ажыццяўлення прафесійнай дзейнасці, у тым ліку якія завяршаецца прысваеннем кваліфікацыі «Даследчык».

2. Сістэма навукова-арыентаванай адукацыі ўключае ў сябе:

2.1. удзельнікаў адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адукацыйных праграм навукова-арыентаванай адукацыі;

2.2. адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі;

2.3. установы адукацыі, што рэалізуюць адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі;

2.4. арганізацыі, што рэалізуюць адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі;

2.5. арганізацыі, якія ўдзельнічаюць у рэалізацыі адукацыйных праграм праз сеткавую форму ўзаемадзеяння;

2.6. дзяржаўныя арганізацыі адукацыі, якія забяспечваюць функцыянаванне сістэмы адукацыі;

2.7. арганізацыі – заказчыкі кадраў;

2.8. дзяржаўныя органы, падпарадкаваныя і (або) падсправаздачныя Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь, Нацыянальную акадэмію навук Беларусі, рэспубліканскія органы дзяржаўнага кіравання, іншыя арганізацыі, падпарадкаваныя Ураду Рэспублікі Беларусь, іншыя арганізацыі ў межах іх паўнамоцтваў у сферы навукова-арыентаванай адукацыі.

3. Навукова-арыентаваная адукацыя ўключае ў сябе:

3.1. аспірантуру (ад'юнктуру) для рэалізацыі адукацыйнай праграмы аспірантуры (ад'юнктуры), накіраванай на падрыхтоўку спецыялістаў, якія валодаюць навыкамі планавання і самастойнага правядзення навуковых даследаванняў, глыбокімі тэарэтычнымі ведамі, што дазваляюць падрыхтаваць кваліфікацыйную навуковую працу (дысертацыю) на атрыманне вучонай ступені кандыдата навук, якая забяспечвае атрыманне кваліфікацыі «Даследчык»;

3.2. дактарантуру для рэалізацыі адукацыйнай праграмы дактарантуры, накіраванай на падрыхтоўку спецыялістаў, якія валодаюць навыкамі арганізацыі навукова-даследчай працы па новым напрамку навуковых даследаванняў або ў развіццё існуючых актуальных напрамкаў навуковых даследаванняў, аналітычнага абагульнення вынікаў навуковай дзейнасці, якія дазваляюць падрыхтаваць кваліфікацыйную навуковую працу (дысертацыю) на атрыманне вучонай ступені доктара навук.

4. Навукова-арыентаваная адукацыя пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы аспірантуры (ад'юнктуры) дае права на працаўладкаванне па атрыманай спецыяльнасці і прысвоенай кваліфікацыі «Даследчык».

**Артыкул 215. Адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі**

1. Адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі падраздзяляюцца на:

1.1. адукацыйную праграму аспірантуры (ад'юнктуры);

1.2. адукацыйную праграму дактарантуры.

2. Адукацыйная праграма аспірантуры (ад'юнктуры) рэалізуецца ў дзённай і завочнай формах атрымання адукацыі або ў форме саіскальніцтва.

3. Адукацыйная праграма дактарантуры рэалізуецца ў дзённай форме атрымання адукацыі або ў форме саіскальніцтва.

4. Асаблівасці рэалізацыі адукацыйных праграм навукова-арыентаванай адукацыі пры падрыхтоўцы навуковых работнікаў вышэйшай кваліфікацыі па спецыяльнасцях для воінскіх фарміраванняў і ваенізаваных арганізацый устанаўліваюцца адпаведным дзяржаўным органам, падпарадкаваным і (або) падсправаздачным Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь, рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання і Міністэрствам адукацыі, калі іншае не ўстаноўлена Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 216. Тэрмін атрымання навукова-арыентаванай адукацыі**

1. Тэрмін атрымання навукова-арыентаванай адукацыі ў дзённай форме атрымання адукацыі складае не больш за тры гады.

2. Тэрмін атрымання навукова-арыентаванай адукацыі ў завочнай форме атрымання адукацыі складае не больш за чатыры гады.

3. Тэрмін атрымання навукова-арыентаванай адукацыі ў форме саіскальніцтва складае не больш за пяць гадоў.

4. Тэрмін атрымання навукова-арыентаванай адукацыі можа быць зменшаны ў сувязі з абаронай дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата (доктара) навук.

### Артыкул 217. Установы адукацыі, арганізацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі

1. Да ўстаноў адукацыі, арганізацый, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, адносяцца:

1.1. установы вышэйшай адукацыі;

1.2. акадэмія паслядыпломнай адукацыі, інстытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі, інстытут прафесійнай адукацыі;

1.3. арганізацыі, што ажыццяўляюць навукова-метадычнае забеспячэнне навукова-арыентаванай адукацыі;

1.4. навуковыя арганізацыі;

1.5. арганізацыі, упаўнаважаныя Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь на рэалізацыю адукацыйных праграм навукова-арыентаванай адукацыі.

2. Ва ўстановах адукацыі, арганізацыях, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, могуць стварацца структурныя падраздзяленні, што ажыццяўляюць арганізацыйнае і інфармацыйнае забеспячэнне навукова-арыентаванай адукацыі і кантроль за ходам засваення аспірантамі, ад'юнктамі, дактарантамі, саіскальнікамі зместу адукацыйных праграм навукова-арыентаванай адукацыі.

## ГЛАВА 41
## АРГАНІЗАЦЫЯ АДУКАЦЫЙНАГА ПРАЦЭСУ ПРЫ РЭАЛІЗАЦЫІ АДУКАЦЫЙНЫХ ПРАГРАМ НАВУКОВА-АРЫЕНТАВАНАЙ АДУКАЦЫІ, ЯЕ ЎДЗЕЛЬНІКІ

### Артыкул 218. Агульныя патрабаванні да арганізацыі адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адукацыйных праграм навукова-арыентаванай адукацыі

1. Адукацыйны працэс пры рэалізацыі адукацыйных праграм навукова-арыентаванай адукацыі арганізуецца па навучальных гадах.

Навучальны год пры рэалізацыі адукацыйных праграм навукова-арыентаванай адукацыі дзеліцца на паўгоддзі.

2. Для аспірантаў, ад'юнктаў, якія засвойваюць змест адукацыйнай праграмы аспірантуры (ад'юнктуры) у дзённай форме атрымання адукацыі, дактарантаў, якія засвойваюць змест адукацыйнай праграмы дактарантуры ў дзённай форме атрымання адукацыі, устанаўліваюцца штогадовыя канікулы працягласцю 30 каляндарных дзён.

Для ад'юнктаў, дактарантаў, якія вучацца па спецыяльнасцях для воінскіх фарміраванняў і ваенізаваных арганізацый, устанаўліваюцца канікулярныя водпускі (водпускі), іх працягласць і асаблівасці прадастаўлення вызначаюцца заканадаўствам аб праходжанні адпаведнай службы.

3. Адукацыйны працэс пры рэалізацыі адукацыйных праграм навукова-арыентаванай адукацыі арганізуецца ў формах вучэбных заняткаў (лекцыі, семінарскія, практычныя і іншыя заняткі, кансультацыі) і навуковых даследаванняў. Формы вучэбных заняткаў вызначаюцца ўстановамі адукацыі, арганізацыямі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі.

4. Адукацыйны працэс пры рэалізацыі адукацыйных праграм навукова-арыентаванай адукацыі ажыццяўляецца ў вучэбных групах і (або) індывідуальна ў адпаведнасці з індывідуальным планам працы аспіранта, ад'юнкта, дактаранта, саіскальніка.

5. Навуковыя даследаванні з'яўляюцца неад'емнай часткай зместу адукацыйных праграм навукова-арыентаванай адукацыі. Навуковыя даследаванні праводзяцца ў адпаведнасці з індывідуальным планам працы аспіранта, ад'юнкта, дактаранта, саіскальніка.

6. Адукацыйны працэс пры рэалізацыі адукацыйных праграм навукова-арыентаванай адукацыі арганізуецца ў адпаведнасці з Палажэннем аб падрыхтоўцы навуковых работнікаў вышэйшай кваліфікацыі, які зацвярджаецца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 219. Удзельнікі адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адукацыйных праграм навукова-арыентаванай адукацыі. Парадак устанаўлення відаў педагагічнай і навуковай дзейнасці і іх нармаванне для педагагічных работнікаў**

1. Удзельнікамі адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адукацыйных праграм навукова-арыентаванай адукацыі з’яўляюцца аспіранты, ад’юнкты, дактаранты, саіскальнікі, педагагічныя работнікі, у тым ліку навуковыя кіраўнікі, навуковыя кансультанты.

2. Аспірантам, ад’юнктам, дактарантам, саіскальнікам на ўвесь перыяд атрымання навукова-арыентаванай адукацыі выдаецца пасведчанне, узор якога ўстанаўліваецца Міністэрствам адукацыі.

3. Навуковы кіраўнік – спецыяліст, які прызначаецца кіраўніком установы адукацыі, арганізацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, для аказання дапамогі ў выкананні асобных раздзелаў індывідуальнага плана працы аспіранта, ад’юнкта, саіскальніка пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы аспірантуры (ад’юнктуры).

4. Навуковы кансультант – спецыяліст, які прызначаецца кіраўніком установы адукацыі, арганізацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, для аказання дапамогі ў выкананні асобных раздзелаў індывідуальнага плана працы дактаранта, саіскальніка пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы дактарантуры.

5. Патрабаванні да спецыялістаў для прызначэння іх навуковымі кіраўнікамі, навуковымі кансультантамі вызначаюцца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

6. Навуковыя кіраўнікі, навуковыя кансультанты абавязаны:

6.1. праводзіць кансультацыі, неабходныя для засваення аспірантамі, ад’юнктамі, дактарантамі, саіскальнікамі зместу адукацыйных праграм навукова-арыентаванай адукацыі, падрыхтоўкі кваліфікацыйнай навуковай працы (дысертацыі);

6.2. аказваць дапамогу аспірантам, ад’юнктам, дактарантам, саіскальнікам у засваенні метадаў і матэрыялаў, якія выкарыстоўваюцца пры падрыхтоўцы кваліфікацыйнай навуковай працы (дысертацыі);

6.3. забяспечваць фарміраванне ў аспірантаў, ад’юнктаў, дактарантаў, саіскальнікаў кампетэнцый, неабходных для арганізацыі і правядзення навукова-даследчых работ, правіл навуковай этыкі;

6.4. садзейнічаць забеспячэнню аспірантаў, ад’юнктаў, дактарантаў, саіскальнікаў неабходнымі матэрыяламі, навуковай літаратурай па тэме кваліфікацыйнай навуковай працы (дысертацыі), абсталяваннем;

6.5. уносіць у індывідуальныя планы працы аспірантаў, ад’юнктаў, дактарантаў, саіскальнікаў рэкамендацыі па засваенні імі зместу адукацыйных праграм навукова-арыентаванай адукацыі і падрыхтоўцы кваліфікацыйнай навуковай працы (дысертацыі);

6.6. ажыццяўляць кантроль за якасцю засваення аспірантамі, ад’юнктамі, дактарантамі, саіскальнікамі зместу адукацыйных праграм навукова-арыентаванай адукацыі і падрыхтоўкай кваліфікацыйнай навуковай працы (дысертацыі);

6.7. выконваць іншыя абавязкі, якія вызначаюцца заканадаўчымі актамі.

7. Віды педагагічнай і навуковай дзейнасці і іх нармаванне для педагагічных работнікаў пры рэалізацыі адукацыйных праграм навукова-арыентаванай адукацыі ўстанаўліваюцца Міністэрствам адукацыі, калі іншае не ўстаноўлена Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

8. Віды педагагічнай і навуковай дзейнасці і іх нармаванне для педагагічных работнікаў пры рэалізацыі адукацыйных праграм навукова-арыентаванай адукацыі

па спецыяльнасцях для воінскіх фарміраванняў і ваенізаваных арганізацый устанаўліваюцца адпаведным дзяржаўным органам, падпарадкаваным і (або) падсправаздачным Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь, рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання.

Колькасць педагагічных работнікаў з ліку прафесарска-выкладчыцкага складу, навуковых кіраўнікоў, навуковых кансультантаў, педагагічная дзейнасць якіх накіравана на рэалізацыю адукацыйных праграм навукова-арыентаванай адукацыі па спецыяльнасцях для воінскіх фарміраванняў і ваенізаваных арганізацый, вызначаецца ў залежнасці ад колькасці навучэнцаў і аб’ёму вучэбнай працы, што разлічваецца ў парадку і па нормах, якія ўстанаўліваюцца адпаведным дзяржаўным органам, падпарадкаваных і (або) падсправаздачным Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь, рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання.

## ГЛАВА 42
## АТЭСТАЦЫЯ АСПІРАНТАЎ, АД’ЮНКТАЎ, ДАКТАРАНТАЎ, САІСКАЛЬНІКАЎ ПРЫ ЗАСВАЕННІ ЗМЕСТУ АДУКАЦЫЙНЫХ ПРАГРАМ НАВУКОВА-АРЫЕНТАВАНАЙ АДУКАЦЫІ

### Артыкул 220. Прамежкавая атэстацыя аспірантаў, ад’юнктаў, дактарантаў, саіскальнікаў пры засваенні зместу адукацыйных праграм навукова-арыентаванай адукацыі

1. Аспіранты, ад’юнкты, дактаранты, саіскальнікі пры засваенні зместу адукацыйных праграм навукова-арыентаванай адукацыі праходзяць прамежкавую атэстацыю.

2. Прамежкавая атэстацыя аспірантаў, ад’юнктаў, дактарантаў, саіскальнікаў праводзіцца з мэтай ацэнкі выканання аспірантам, ад’юнктам, дактарантам, саіскальнікам індывідуальнага плана працы аспіранта, ад’юнкта, дактаранта, саіскальніка, узроўню засваення аспірантам, ад’юнктам, саіскальнікам зместу спецыяльнай дысцыпліны ў адпаведнасці з патрабаваннямі вучэбна-праграмнай дакументацыі адукацыйных праграм навукова-арыентаванай адукацыі.

3. Аспіранты, ад’юнкты, дактаранты, саіскальнікі дапускаюцца да прамежкавай атэстацыі на ўмовах і ў парадку, якія вызначаюцца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

4. Аспіранты, ад’юнкты, дактаранты, саіскальнікі праходзяць прамежкавую атэстацыю ў тэрміны, устаноўленыя раскладам прамежкавай атэстацыі, што складаецца ўстановай адукацыі, арганізацыяй, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, у адпаведнасці з графікам адукацыйнага працэсу ўстановы адукацыі, арганізацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, па спецыяльнасці.

Аспіранты, ад’юнкты, дактаранты, саіскальнікі, якія не прайшлі прамежкавую атэстацыю, праходзяць паўторную прамежкавую атэстацыю ў тэрміны, што ўстанаўліваюцца ўстановай адукацыі, арганізацыяй, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі.

Паўторнае праходжанне прамежкавай атэстацыі аспірантамі, ад’юнктамі, дактарантамі, саіскальнікамі, якія не прайшлі прамежкавай атэстацыі ва ўстаноўленыя раскладам прамежкавай атэстацыі тэрміны па няўважлівай прычыне, дапускаецца не больш за адзін раз.

5. Формы, парадак і ўмовы правядзення прамежкавай атэстацыі аспірантаў, ад’юнктаў, дактарантаў, саіскальнікаў пры засваенні зместу адукацыйных праграм навукова-арыентаванай адукацыі ў частцы, не ўрэгуляванай гэтым артыкулам, крытэрыі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці аспірантаў, ад’юнктаў, дактарантаў, саіскальнікаў вызначаюцца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

### Артыкул 221. Выніковая атэстацыя аспірантаў, ад'юнктаў, дактарантаў, саіскальнікаў пры засваенні зместу адукацыйных праграм навукова-арыентаванай адукацыі

1. Аспіранты, ад'юнкты, дактаранты, саіскальнікі пры завяршэнні засваення зместу адукацыйных праграм навукова-арыентаванай адукацыі праходзяць выніковую атэстацыю.

2. Аспіранты, ад'юнкты, дактаранты, саіскальнікі дапускаюцца да выніковай атэстацыі на ўмовах і ў парадку, якія вызначаюцца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

3. Выніковая атэстацыя аспірантаў, ад'юнктаў, дактарантаў, саіскальнікаў праводзіцца дзяржаўнымі атэстацыйнымі камісіямі.

Парадак фарміравання і дзейнасці дзяржаўных атэстацыйных камісій вызначаецца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

4. Аспірантам, ад'юнктам, дактарантам, саіскальнікам, якія не прайшлі выніковую атэстацыю ва ўстаноўлены тэрмін па ўважлівай прычыне, прадастаўляецца права на праходжанне выніковай атэстацыі ў іншы тэрмін падчас працы дзяржаўных атэстацыйных камісій.

5. Формы, парадак і ўмовы правядзення выніковай атэстацыі аспірантаў, ад'юнктаў, дактарантаў, саіскальнікаў вызначаюцца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

## ГЛАВА 43
## НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ НАВУКОВА-АРЫЕНТАВАНАЙ АДУКАЦЫІ

### Артыкул 222. Сістэма навукова-метадычнага забеспячэння навукова-арыентаванай адукацыі

1. Навукова-метадычнае забеспячэнне навукова-арыентаванай адукацыі ўключае ў сябе:

1.1. вучэбна-праграмную дакументацыю адукацыйных праграм навукова-арыентаванай адукацыі;

1.2. вучэбна-метадычную дакументацыю;

1.3. навуковыя і іншыя выданні;

1.4. інфармацыйна-аналітычныя матэрыялы;

1.5. метадычныя ўказанні па распрацоўцы вучэбна-праграмнай дакументацыі адукацыйных праграм навукова-арыентаванай адукацыі.

2. Навукова-метадычнае забеспячэнне навукова-арыентаванай адукацыі ажыццяўляюць:

2.1. установы адукацыі, што рэалізуюць адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі;

2.2. арганізацыі, што рэалізуюць адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі;

2.3. арганізацыі, што ажыццяўляюць навукова-метадычнае забеспячэнне навукова-арыентаванай адукацыі;

2.4. арганізацыі – заказчыкі кадраў;

2.5. арганізацыі, якія ўдзельнічаюць у рэалізацыі адукацыйных праграм праз сеткавую форму ўзаемадзеяння;

2.6. дзяржаўныя органы, падпарадкаваныя і (або) падсправаздачныя Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь, Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, рэспубліканскія органы дзяржаўнага кіравання, іншыя арганізацыі, падпарадкаваныя Ураду Рэспублікі Беларусь, іншыя арганізацыі і фізічныя асобы ў межах іх паўнамоцтваў у сферы навукова-арыентаванай адукацыі.

**Артыкул 223. Вучэбна-праграмная дакументацыя адукацыйных праграм навукова-арыентаванай адукацыі**

1. Вучэбна-праграмная дакументацыя адукацыйнай праграмы аспірантуры (ад’юнктуры) уключае ў сябе індывідуальны план працы аспіранта, ад’юнкта, саіскальніка і праграмы-мінімумы кандыдацкіх экзаменаў па спецыяльных дысцыплінах.

2. Вучэбна-праграмная дакументацыя адукацыйнай праграмы дактарантуры ўключае ў сябе індывідуальны план працы дактаранта, саіскальніка.

3. Патрабаванні да зместу індывідуальнага плана працы аспіранта, ад’юнкта, дактаранта, саіскальніка і парадак яго распрацоўкі і зацвярджэння вызначаюцца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

4. Праграма-мінімум кандыдацкага экзамену па спецыяльнай дысцыпліне з’яўляецца тэхнічным нарматыўным прававым актам і вызначае мэты і задачы вывучэння адпаведнай спецыяльнай дысцыпліны, яе змест, асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці аспіранта, ад’юнкта, саіскальніка.

Праграмы-мінімумы кандыдацкіх экзаменаў па спецыяльных дысцыплінах распрацоўваюцца ўстановамі адукацыі, арганізацыямі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, і зацвярджаюцца дзяржаўным органам (арганізацыяй), які вызначаецца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, у парадку, што ўстанаўліваецца гэтым дзяржаўным органам (арганізацыяй).

## РАЗДЗЕЛ XIII
## ДАДАТКОВАЯ АДУКАЦЫЯ ДЗЯЦЕЙ І МОЛАДЗІ

## ГЛАВА 44
## СІСТЭМА ДАДАТКОВАЙ АДУКАЦЫІ ДЗЯЦЕЙ І МОЛАДЗІ

**Артыкул 224. Сістэма дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі**

1. Дадатковая адукацыя дзяцей і моладзі – від дадатковай адукацыі, накіраваны на развіццё асобы навучэнца, адаптацыю да жыцця ў грамадстве, арганізацыю свабоднага часу, прафесійную арыентацыю, фарміраванне кампетэнцый, неабходных для фарміравання і развіцця творчых здольнасцей навучэнца, задавальнення яго індывідуальных патрэб у інтэлектуальным, духоўным, фізічным удасканаленні.

2. Сістэма дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі ўключае ў сябе:

2.1. удзельнікаў адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі;

2.2. адукацыйную праграму дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі;

2.3. установы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі;

2.4. іншыя ўстановы адукацыі, што рэалізуюць адукацыйную праграму дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі;

2.5. іншыя арганізацыі, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, якія рэалізуюць адукацыйную праграму дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі;

2.6. дзяржаўныя арганізацыі адукацыі, якія забяспечваюць функцыянаванне сістэмы адукацыі;

2.7. арганізацыі, якія ўдзельнічаюць у рэалізацыі адукацыйных праграм праз сеткавую форму ўзаемадзеяння;

2.8. рэспубліканскія органы дзяржаўнага кіравання, іншыя арганізацыі, падпарадкаваныя Ураду Рэспублікі Беларусь, мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы, іншыя арганізацыі ў межах іх паўнамоцтваў у сферы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі.

### Артыкул 225. Адукацыйная праграма дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі

1. Адукацыйная праграма дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі рэалізуецца па профілях:

1.1. тэхнічным;

1.2. спартыўна-тэхнічным;

1.3. турысцка-краязнаўчым;

1.4. эколага-біялагічным;

1.5. фізкультурна-спартыўным;

1.6. мастацкім;

1.7. мастацка-маўленчым;

1.8. сацыяльна-камунікатыўным;

1.9. сацыяльна-эканамічным;

1.10. сацыяльна-педагагічным;

1.11. культуры вольнага часу;

1.12. ваенна-патрыятычным;

1.13. інтэлектуальна-пазнавальным;

1.14. прыродазнаўча-матэматычным;

1.15. грамадска-гуманітарным;

1.16. іншых профілях, якія вызначаюцца Палажэннем аб установе дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі або яе відзе.

2. Профілі адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі ўключаюць у сябе напрамкі дзейнасці, якія вызначаюцца вучэбна-праграмнай дакументацыяй адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі.

3. Адукацыйная праграма дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі рэалізуецца ў вочнай, завочнай і дыстанцыйнай формах атрымання адукацыі.

4. Адукацыйная праграма дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі рэалізуецца ва ўстановах дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, а таксама можа рэалізоўвацца ва ўстановах дашкольнай адукацыі, установах агульнай сярэдняй адукацыі, установах сярэдняй спецыяльнай адукацыі, установах вышэйшай адукацыі, установах спецыяльнай адукацыі, установах дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі, выхаваўча-аздараўленчых установах адукацыі, сацыяльна-педагагічных установах, спецыяльных навучальна-выхаваўчых установах, спецыяльных лячэбна-выхаваўчых установах, іншых арганізацыях.

### Артыкул 226. Тэрмін атрымання дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі

Тэрмін атрымання дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі вызначаецца вучэбна-праграмнай дакументацыяй адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі па адпаведным профілі.

## ГЛАВА 45
## УСТАНОВЫ ДАДАТКОВАЙ АДУКАЦЫІ ДЗЯЦЕЙ І МОЛАДЗІ. КІРАВАННЕ ЎСТАНОВАЙ ДАДАТКОВАЙ АДУКАЦЫІ ДЗЯЦЕЙ І МОЛАДЗІ

### Артыкул 227. Установы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі

1. Установа дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі – установа адукацыі, якая рэалізуе адукацыйную праграму дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, а таксама можа рэалізоўваць адукацыйную праграму прафесійнай падрыхтоўкі рабочых (служачых), адукацыйную праграму навучальных курсаў (лекторыяў, тэматычных семінараў, практыкумаў, трэнінгаў, афіцэрскіх курсаў і іншых відаў навучальных курсаў), адукацыйную праграму стажыроўкі

кіруючых работнікаў і спецыялістаў, праграму выхавання дзяцей, што маюць патрэбу ў аздараўленні.

2. Установы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі могуць быць наступных відаў:

2.1. цэнтр (палац);

2.2. дзіцячая школа мастацтваў.

3. Цэнтр (палац) – установа дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, якая рэалізуе адукацыйную праграму дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі па адным або некалькіх профілях, а таксама можа рэалізоўваць адукацыйную праграму прафесійнай падрыхтоўкі рабочых (служачых), адукацыйную праграму навучальных курсаў (лекторыяў, тэматычных семінараў, практыкумаў, трэнінгаў, афіцэрскіх курсаў і іншых відаў навучальных курсаў), адукацыйную праграму стажыроўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, праграму выхавання дзяцей, што маюць патрэбу ў аздараўленні.

4. Дзіцячая школа мастацтваў – установа дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі ў сферы культуры, якая рэалізуе адукацыйную праграму дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі мастацкага профілю з вывучэннем вучэбных прадметаў, вучэбных дысцыплін на павышаным узроўні.

5. Ва ўстанове дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі могуць стварацца структурныя падраздзяленні: аддзяленне, навучальна-доследны ўчастак, іншыя структурныя падраздзяленні.

### Артыкул 228. Кіраванне ўстановай дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі

1. Непасрэднае кіраўніцтва ўстановай дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі ажыццяўляе яе дырэктар.

2. Дырэктар установы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі прызначаецца на пасаду і вызваляецца ад пасады заснавальнікам установы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі або ўпаўнаважаным ім органам.

3. Асноўным органам самакіравання ўстановы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі з'яўляецца педагагічны савет, які ўзначальваецца дырэктарам гэтай установы адукацыі.

4. Ва ўстановах дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі могуць стварацца савет, апекавальніцкі савет, бацькоўскі камітэт.

## ГЛАВА 46
## АРГАНІЗАЦЫЯ АДУКАЦЫЙНАГА ПРАЦЭСУ ПРЫ РЭАЛІЗАЦЫІ АДУКАЦЫЙНАЙ ПРАГРАМЫ ДАДАТКОВАЙ АДУКАЦЫІ ДЗЯЦЕЙ І МОЛАДЗІ

### Артыкул 229. Агульныя патрабаванні да арганізацыі адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі

1. Адукацыйны працэс пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі можа быць арганізаваны:

1.1. ва ўстановах адукацыі;

1.2. у іншых арганізацыях;

1.3. дома;

1.4. у санаторна-курортных і аздараўленчых арганізацыях (акрамя адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі мастацкага профілю з вывучэннем вучэбных прадметаў, вучэбных дысцыплін на павышаным узроўні, якая рэалізуецца ў дзіцячых школах мастацтваў).

2. Адукацыйны працэс пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі арганізуецца па навучальных гадах.

Структура навучальнага года вызначаецца ўстановай адукацыі, іншай арганізацыяй, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, якія рэалізуюць адукацыйную праграму

дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, з улікам устаноўленых санітарна-эпідэміялагічных патрабаванняў.

3. Вывучэнне адукацыйных галін, тэм, вучэбных прадметаў, вучэбных дысцыплін ажыццяўляецца на базавым, павышаным узроўнях.

Базавы ўзровень вывучэння адукацыйнай галіны, тэмы, вучэбнага прадмета або вучэбнай дысцыпліны – вывучэнне зместу адукацыйнай галіны, тэмы, вучэбнага прадмета або вучэбнай дысцыпліны, які з'яўляецца абавязковым пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі па пэўным напрамку дзейнасці адпаведнага профілю.

Павышаны ўзровень вывучэння адукацыйнай галіны, тэмы, вучэбнага прадмета або вучэбнай дысцыпліны – вывучэнне зместу адукацыйнай галіны, тэмы, вучэбнага прадмета або вучэбнай дысцыпліны, які ўключае ў сябе базавы ўзровень вывучэння адукацыйнай галіны, тэмы, вучэбнага прадмета або вучэбнай дысцыпліны з паглыбленнем іх зместу.

4. Навучэнцы ўстаноў адукацыі (акрамя дзіцячых школ мастацтваў), іншых арганізацый, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, якія рэалізуюць адукацыйную праграму дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, вывучаюць адукацыйныя галіны, тэмы, вучэбныя прадметы, вучэбныя дысцыпліны на базавым узроўні, а з улікам меркавання іх законных прадстаўнікоў, схільнасцей, жаданняў і стану здароўя могуць вывучаць адукацыйныя галіны, тэмы, вучэбныя прадметы, вучэбныя дысцыпліны на павышаным узроўні ў межах колькасці вучэбных гадзін, устаноўленых вучэбна-праграмнай дакументацыяй адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі. Навучэнцы дзіцячых школ мастацтваў вывучаюць адукацыйныя галіны, тэмы, вучэбныя прадметы, вучэбныя дысцыпліны на павышаным узроўні.

5. Формамі арганізацыі адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі з'яўляюцца заняткі, урок, вучэбная практыка і іншыя формы.

6. Адукацыйны працэс пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі ва ўстановах адукацыі (акрамя дзіцячых школ мастацтваў), іншых арганізацыях, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, якія рэалізуюць адукацыйную праграму дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, ажыццяўляецца ў аб'яднаннях па інтарэсах або індывідуальна.

Адукацыйны працэс пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі ў дзіцячых школах мастацтваў ажыццяўляецца ў групах і (або) індывідуальна.

7. Аб'яднанне па інтарэсах ствараецца з ліку дзяцей і моладзі на аснове агульнага інтарэсу да канкрэтнага напрамку дзейнасці. Да аб'яднанняў па інтарэсах адносяцца гурток, клуб, секцыя, студыя, майстэрня, лабараторыя, аркестр, хор, ансамбль, тэатр, навуковае таварыства навучэнцаў і іншыя аб'яднанні. Аб'яднанні па інтарэсах могуць быць аднаўзроставымі і рознаўзроставымі. Аб'яднанні па інтарэсах могуць ствараецца для працы з пераменным складам навучэнцаў.

8. Напаўняльнасць аб'яднання па інтарэсах першага года навучання складае не менш за 12 навучэнцаў, другога і наступных гадоў навучання – не менш за 8 навучэнцаў. Пры навучанні асоб ва ўзросце ад двух да шасці гадоў напаўняльнасць аб'яднання па інтарэсах складае ад 8 да 10 навучэнцаў. Напаўняльнасць аб'яднання па інтарэсах для навучэнцаў з ліку асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця складае ад 6 да 8 чалавек. Напаўняльнасць аб'яднання па інтарэсах, у якім адукацыйны працэс арганізаваны для асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця і іншых асоб, колькасць асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця ў ім вызначаюцца Міністэрствам адукацыі.

9. Напаўняльнасць групы складае ад 10 да 12 навучэнцаў, а пры навучанні ў дзіцячай школе мастацтваў, філіяле дзіцячай школы мастацтваў з колькасцю навучэнцаў меншай за 100 вучняў, размешчаных у сельскім населеным пункце, – ад 3 да 6 навучэнцаў.

10. Заснавальнік установы адукацыі, заснавальнік іншай арганізацыі, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, якія рэалізуюць адукацыйную праграму дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, могуць устанаўліваць меншую напаўняльнасць аб'яднання па інтарэсах, групы.

11. У выпадках, прадугледжаных вучэбна-праграмнай дакументацыяй адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, аб'яднанне па інтарэсах, група могуць дзяліцца на падгрупы.

12. Адукацыйны працэс ажыццяўляецца індывідуальна на падставе рашэння кіраўніка ўстановы адукацыі, іншай арганізацыі, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, якія рэалізуюць адукацыйную праграму дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, у адпаведнасці з індывідуальнай праграмай дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі або на падставе тыпавых вучэбных планаў дзіцячых школ мастацтваў.

**Артыкул 230. Агульныя патрабаванні да прыёму (залічэння) асоб для атрымання дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі**

1. Прыём (залічэнне) асобы для атрымання дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі ажыццяўляецца на падставе яе заявы пры прад'яўленні пасведчання аб нараджэнні або дакумента, які сведчыць асобу, калі іншае не вызначана гэтым артыкулам. Ад імені непаўналетняй асобы заява можа быць пададзена яе законным прадстаўніком.

2. Прыём (залічэнне) асоб для засваення зместу адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі па спартыўна-тэхнічным, турысцка-краязнаўчым, фізкультурна-спартыўным і ваенна-патрыятычным профілях ажыццяўляецца на падставе дакументаў, указаных у пункце 1 гэтага артыкула, і медыцынскай даведкі аб стане здароўя.

3. Прыём (залічэнне) асоб для засваення зместу адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі па мастацкім профілі, акрамя напрамку дзейнасці «Харэаграфія», ажыццяўляецца на падставе дакументаў, указаных у пункце 1 гэтага артыкула, і па выніках праверкі здольнасцей, што праводзіцца ў парадку, які вызначаецца Палажэннем аб установе дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі або яе відзе.

4. Прыём (залічэнне) асоб для засваення зместу адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі па напрамку дзейнасці «Харэаграфія» мастацкага профілю ажыццяўляецца на падставе дакументаў, указаных у пункце 1 гэтага артыкула, медыцынскай даведкі аб стане здароўя і па выніках праверкі здольнасцей, што праводзіцца ў парадку, які вызначаецца Палажэннем аб установе дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі або яе відзе.

5. Прыём (залічэнне) асоб для засваення зместу адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі з павышаным узроўнем вывучэння адукацыйнай галіны, тэмы, вучэбнага прадмета або вучэбнай дысцыпліны ў Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь ажыццяўляецца на падставе дакументаў, указаных у пункце 1 гэтага артыкула, рэкамендацыі з месца навучання і рэкамендацыі мясцовага выканаўчага і распарадчага органа або ўпаўнаважанага ім структурнага падраздзялення і па выніках праверкі здольнасцей, што праводзіцца ў парадку, які вызначаецца Міністэрствам адукацыі.

6. Прыём (залічэнне) асоб для атрымання дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі ў частцы, не ўрэгуляванай гэтым Кодэксам, ажыццяўляецца ў адпаведнасці з Палажэннем аб установе дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі або яе відзе.

**Артыкул 231. Атрыманне дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі дома**

1. Для навучэнцаў, якія атрымліваюць агульную сярэднюю або спецыяльную адукацыю дома, ствараюцца ўмовы для атрымання дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі дома.

2. Адукацыйны працэс для атрымання дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі дома арганізуецца ўстановай адукацыі, што рэалізуе адукацыйную праграму дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, па месцы жыхарства (месцы знаходжання) навучэнца.

3. Рашэнне аб атрыманні дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі дома прымаецца ўстановай адукацыі, якая арганізуе адукацыйны працэс для атрымання агульнай сярэдняй або спецыяльнай адукацыі дома, на падставе заявы навучэнца, законнага прадстаўніка непаўналетняга навучэнца.

4. Парадак арганізацыі атрымання дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі дома вызначаецца Палажэннем аб установе дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі або яе відзе.

### Артыкул 232. Атрыманне дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі ў санаторна-курортных і аздараўленчых арганізацыях

1. Навучэнцам, якія знаходзяцца на лячэнні або аздараўленні ў санаторна-курортных або аздараўленчых арганізацыях, ствараюцца ўмовы для атрымання дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі.

2. Адукацыйны працэс для атрымання дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі ў санаторна-курортных і аздараўленчых арганізацыях арганізуецца ўстановай дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі па месцы знаходжання санаторна-курортнай або аздараўленчай арганізацыі або санаторна-курортнай або аздараўленчай арганізацыяй.

3. Парадак арганізацыі атрымання дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі ў санаторна-курортных і аздараўленчых арганізацыях вызначаецца Палажэннем аб установе дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі або яе відзе.

### Артыкул 233. Атэстацыя навучэнцаў пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі

1. Бягучую, прамежкавую і выніковую атэстацыю пры атрыманні дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі праходзяць навучэнцы толькі пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі з павышаным узроўнем вывучэння адукацыйнай галіны, тэмы, вучэбнага прадмета або вучэбнай дысцыпліны.

2. Формы, парадак ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці і правядзення бягучай, прамежкавай і выніковай атэстацыі навучэнцаў, акрамя навучэнцаў дзіцячых школ мастацтваў, пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі вызначаюцца Міністэрствам адукацыі.

3. Формы, парадак ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці і правядзення бягучай, прамежкавай і выніковай атэстацыі навучэнцаў пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі ў дзіцячых школах мастацтваў вызначаюцца Міністэрствам культуры па ўзгадненні з Міністэрствам адукацыі.

## ГЛАВА 47
## НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ ДАДАТКОВАЙ АДУКАЦЫІ ДЗЯЦЕЙ І МОЛАДЗІ

### Артыкул 234. Сістэма навукова-метадычнага забеспячэння дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі

1. Навукова-метадычнае забеспячэнне дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі ўключае ў сябе:

1.1. вучэбна-праграмную дакументацыю адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі;

1.2. праграмна-планавальную дакументацыю выхавання;

1.3. вучэбна-метадычную дакументацыю;

1.4. вучэбныя і іншыя выданні;

1.5. інфармацыйна-аналітычныя матэрыялы;

1.6. метадычныя ўказанні па распрацоўцы вучэбна-праграмнай дакументацыі адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі.

2. Навукова-метадычнае забеспячэнне дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі ажыццяўляюць:

2.1. арганізацыі, што ажыццяўляюць навукова-метадычнае забеспячэнне дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі ў сферы культуры;

2.2. установы дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі;

2.3. установы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі;

2.4. іншыя ўстановы адукацыі, што рэалізуюць адукацыйную праграму дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі;

2.5. іншыя арганізацыі, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, якія рэалізуюць адукацыйную праграму дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі;

2.6. арганізацыі, якія ўдзельнічаюць у рэалізацыі адукацыйных праграм праз сеткавую форму ўзаемадзеяння;

2.7. органы дзяржаўнага кіравання, іншыя арганізацыі, падпарадкаваныя Ураду Рэспублікі Беларусь, іншыя арганізацыі і фізічныя асобы ў межах іх паўнамоцтваў у сферы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі.

**Артыкул 235. Вучэбна-праграмная дакументацыя адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі**

1. Вучэбна-праграмная дакументацыя адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі ўключае ў сябе:

1.1. тыпавыя праграмы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі;

1.2. тыпавыя вучэбныя планы дзіцячых школ мастацтваў;

1.3. эксперыментальныя вучэбныя планы дзіцячых школ мастацтваў;

1.4. тыпавыя вучэбныя праграмы дзіцячых школ мастацтваў;

1.5. эксперыментальныя вучэбныя праграмы дзіцячых школ мастацтваў;

1.6. праграмы аб’яднанняў па інтарэсах;

1.7. эксперыментальныя праграмы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі;

1.8. індывідуальныя праграмы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі.

2. Тыпавая праграма дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі з’яўляецца тэхнічным нарматыўным прававым актам і вызначае мэты і задачы вывучэння адукацыйных галін, тэм, вучэбных прадметаў, вучэбных дысцыплін адпаведнага профілю, узроўні іх вывучэння, тэрмін атрымання дадатковай адукацыі, вучэбна-тэматычны план, час на вывучэнне адукацыйных галін, тэм, вучэбных прадметаў, вучэбных дысцыплін, віды заняткаў, рэкамендаваныя формы і метады навучання і выхавання пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, акрамя яе рэалізацыі ў дзіцячых школах мастацтваў.

Тыпавыя праграмы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі распрацоўваюцца Міністэрствам адукацыі сумесна з арганізацыямі, што ажыццяўляюць навукова-метадычнае забеспячэнне дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, і зацвярджаюцца Міністэрствам адукацыі.

3. Тыпавы вучэбны план дзіцячых школ мастацтваў з’яўляецца тэхнічным нарматыўным прававым актам і ўстанаўлівае пералік, паслядоўнасць і аб’ём вывучэння вучэбных прадметаў, вучэбных дысцыплін, тэрмін атрымання дадатковай адукацыі ў дзіцячых школах мастацтваў, парадак праходжання вучэбнай практыкі.

Тыпавыя вучэбныя планы дзіцячых школ мастацтваў распрацоўваюцца Міністэрствам культуры сумесна з арганізацыямі, што ажыццяўляюць навукова-метадычнае забеспячэнне дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, і зацвярджаюцца Міністэрствам культуры па ўзгадненні з Міністэрствам адукацыі пры наяўнасці

заключэнняў Міністэрства аховы здароўя аб іх адпаведнасці заканадаўству ў сферы санітарна-эпідэміялагічнага дабрабыту насельніцтва.

4. Эксперыментальны вучэбны план дзіцячай школы мастацтваў апрабоўваецца ў дзіцячай школе мастацтваў, на базе якой ажыццяўляецца эксперыментальная дзейнасць.

Эксперыментальныя вучэбныя планы дзіцячых школ мастацтваў распрацоўваюцца арганізацыямі, што ажыццяўляюць навукова-метадычнае забеспячэнне дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, і зацвярджаюцца Міністэрствам культуры.

5. Тыпавая вучэбная праграма дзіцячых школ мастацтваў з'яўляецца тэхнічным нарматыўным прававым актам і вызначае мэты і задачы вывучэння адукацыйных галін, тэм, вучэбных прадметаў, вучэбных дысцыплін, узроўні іх вывучэння, віды заняткаў, рэкамендаваныя формы і метады навучання і выхавання ў дзіцячых школах мастацтваў.

Тыпавыя вучэбныя праграмы дзіцячых школ мастацтваў распрацоўваюцца Міністэрствам культуры сумесна з арганізацыямі, што ажыццяўляюць навукова-метадычнае забеспячэнне дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі ў сферы культуры, і зацвярджаюцца Міністэрствам культуры.

6. Эксперыментальная вучэбная праграма дзіцячых школ мастацтваў апрабоўваецца ў дзіцячай школе мастацтваў, на базе якой ажыццяўляецца эксперыментальная дзейнасць.

Эксперыментальныя вучэбныя праграмы дзіцячых школ мастацтваў распрацоўваюцца дзіцячымі школамі мастацтваў, на базе якіх ажыццяўляецца эксперыментальная дзейнасць, і зацвярджаюцца Міністэрствам культуры.

7. Праграма аб'яднання па інтарэсах вызначае мэты і задачы вывучэння адукацыйных галін, тэм, вучэбных прадметаў, вучэбных дысцыплін адпаведнага профілю, узроўні іх вывучэння, тэрмін атрымання дадатковай адукацыі, вучэбна-тэматычны план, час на вывучэнне адукацыйных галін, тэм, віды заняткаў, рэкамендаваныя формы і метады навучання і выхавання.

Праграмы аб'яднанняў па інтарэсах распрацоўваюцца ўстановамі адукацыі, іншымі арганізацыямі, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, якія рэалізуюць адукацыйную праграму дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, на аснове тыпавых праграм дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі.

Праграмы аб'яднанняў па інтарэсах з павышаным узроўнем вывучэння адукацыйнай галіны, тэмы, вучэбнага прадмета або вучэбнай дысцыпліны зацвярджаюцца Міністэрствам адукацыі пры наяўнасці станоўчых заключэнняў арганізацыі, што ажыццяўляе навукова-метадычнае забеспячэнне дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі.

Праграмы аб'яднанняў па інтарэсах з базавым узроўнем вывучэння адукацыйнай галіны, тэмы, вучэбнага прадмета або вучэбнай дысцыпліны зацвярджаюцца кіраўніком установы адукацыі, іншай арганізацыі, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, якія рэалізуюць адукацыйную праграму дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, па ўзгадненні з яе заснавальнікам (для дзяржаўных устаноў адукацыі), са структурным падраздзяленнем мясцовага выканаўчага і распарадчага органа, што ажыццяўляе дзяржаўна-ўладныя паўнамоцтвы ў сферы адукацыі па месцы рэалізацыі адукацыйнай праграмы (для прыватных устаноў адукацыі і іншых арганізацый), у парадку, які вызначаецца Міністэрствам адукацыі.

8. Эксперыментальная праграма дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі апрабоўваецца ва ўстанове адукацыі, што рэалізуе адукацыйную праграму дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, на базе якой ажыццяўляецца эксперыментальная дзейнасць.

Эксперыментальныя праграмы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі распрацоўваюцца арганізацыямі, што ажыццяўляюць навукова-метадычнае забеспячэнне дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, і зацвярджаюцца Міністэрствам адукацыі.

9. Індывідуальная праграма дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі вызначае асаблівасці атрымання дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі адоранымі навучэнцамі, навучэнцамі з ліку асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, а таксама навучэнцамі, якія па ўважлівай прычыне не могуць пастаянна або часова наведваць заняткі (урокі).

Індывідуальныя праграмы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі распрацоўваюцца на аснове тыпавых праграм дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі або тыпавых вучэбных планаў дзіцячых школ мастацтваў, тыпавых вучэбных праграм дзіцячых школ мастацтваў установамі адукацыі, іншымі арганізацыямі, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, якія рэалізуюць адукацыйную праграму дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, і зацвярджаюцца іх кіраўнікамі.

# РАЗДЗЕЛ XIV
# ДАДАТКОВАЯ АДУКАЦЫЯ АДОРАНЫХ ДЗЯЦЕЙ І МОЛАДЗІ

## ГЛАВА 48
## СІСТЭМА ДАДАТКОВАЙ АДУКАЦЫІ АДОРАНЫХ ДЗЯЦЕЙ І МОЛАДЗІ

### Артыкул 236. Сістэма дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі

1. Дадатковая адукацыя адораных дзяцей і моладзі – від дадатковай адукацыі, накіраваны на выяўленне і развіццё ў навучэнцаў здольнасцей да навукова-даследчай і вынаходніцкай дзейнасці.

2. Сістэма дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі ўключае ў сябе:

2.1. удзельнікаў адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі;

2.2. адукацыйную праграму дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі;

2.3. установы дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі;

2.4. дзяржаўныя арганізацыі адукацыі, якія забяспечваюць функцыянаванне сістэмы адукацыі;

2.5. арганізацыі, якія ўдзельнічаюць у рэалізацыі адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі праз сеткавую форму ўзаемадзеяння;

2.6. рэспубліканскія органы дзяржаўнага кіравання, іншыя арганізацыі, падпарадкаваныя Ураду Рэспублікі Беларусь, мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы ў межах іх паўнамоцтваў у сферы дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі.

### Артыкул 237. Удзельнікі адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі

Удзельнікамі адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі з’яўляюцца навучэнцы, якія засвойваюць змест адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі, законныя прадстаўнікі гэтых непаўналетніх навучэнцаў, педагагічныя работнікі.

### Артыкул 238. Адукацыйная праграма дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі

1. Адукацыйная праграма дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі рэалізуецца па напрамках, якія вызначаюцца дзіцячым тэхнапаркам па ўзгадненні з наглядальным саветам.

2. Адукацыйная праграма дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі рэалізуецца ў спалучэнні дзённай і дыстанцыйнай формаў атрымання адукацыі.

### Артыкул 239. Тэрмін атрымання дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі

Тэрмін атрымання дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі вызначаецца Міністэрствам адукацыі. Тэрмін атрымання дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі

па канкрэтным напрамку вызначаецца вучэбна-праграмнай дакументацыяй адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі.

## ГЛАВА 49
## УСТАНОВЫ ДАДАТКОВАЙ АДУКАЦЫІ АДОРАНЫХ ДЗЯЦЕЙ І МОЛАДЗІ

### Артыкул 240. Установы дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі

1. Установа дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі – установа адукацыі, якая рэалізуе адукацыйную праграму дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі, ажыццяўляе навукова-метадычнае забеспячэнне адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі і адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, а таксама можа рэалізоўваць адукацыйную праграму дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, адукацыйную праграму павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, адукацыйную праграму стажыроўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, адукацыйную праграму навучальных курсаў (лекторыяў, тэматычных семінараў, практыкумаў, трэнінгаў, афіцэрскіх курсаў і іншых відаў навучальных курсаў), праграму выхавання дзяцей, што маюць патрэбу ў аздараўленні.

2. Установай дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі з’яўляецца дзіцячы тэхнапарк.

3. У дзіцячым тэхнапарку могуць ствараццa структурныя падраздзяленні: навучальная лабараторыя, навукова-даследчыя, лабараторна-практычныя комплексы, іншыя структурныя падраздзяленні.

### Артыкул 241. Кіраванне ўстановай дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі. Наглядальны савет

1. Непасрэднае кіраўніцтва ўстановай дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі ажыццяўляе яе дырэктар.

2. Дырэктар установы дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі прызначаецца на пасаду і вызваляецца ад пасады заснавальнікам установы дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі або ўпаўнаважаным ім органам.

3. Асноўным органам самакіравання ўстановы дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі з’яўляецца педагагічны савет, які ўзначальваецца дырэктарам гэтай установы адукацыі.

4. Ва ўстанове дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі могуць ствараццa савет і апекавальніцкі савет.

5. З мэтай вызначэння перспектыўных напрамкаў развіцця дзіцячага тэхнапарка ствараецца наглядальны савет, склад, задачы, функцыі і кампетэнцыя якога ўстанаўліваюцца Урадам Рэспублікі Беларусь.

## ГЛАВА 50
## АРГАНІЗАЦЫЯ АДУКАЦЫЙНАГА ПРАЦЭСУ ПРЫ РЭАЛІЗАЦЫІ АДУКАЦЫЙНАЙ ПРАГРАМЫ ДАДАТКОВАЙ АДУКАЦЫІ АДОРАНЫХ ДЗЯЦЕЙ І МОЛАДЗІ

### Артыкул 242. Агульныя патрабаванні да арганізацыі адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі

1. Адукацыйны працэс пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы адораных дзяцей і моладзі ў дзённай форме атрымання адукацыі арганізуецца ў дзіцячым тэхнапарку па зменах. Змена – перыяд знаходжання навучэнцаў у дзіцячым тэхнапарку.

2. Адукацыйны працэс пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы адораных дзяцей і моладзі ў дзённай форме атрымання адукацыі ажыццяўляецца ў вучэбных групах і (або) індывідуальна.

Адукацыйны працэс пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы адораных дзяцей і моладзі ў дзённай форме атрымання адукацыі ажыццяўляецца індывідуальна на падставе рашэння кіраўніка ўстановы дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі ў адпаведнасці з індывідуальнай вучэбнай праграмай дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі для дзённай формы атрымання адукацыі або індывідуальнай вучэбнай праграмай дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі або ў выпадках і парадку, якія вызначаюцца Міністэрствам адукацыі.

Адукацыйны працэс пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы адораных дзяцей і моладзі ў дыстанцыйнай форме атрымання адукацыі ажыццяўляецца індывідуальна ў адпаведнасці з індывідуальнай вучэбнай праграмай дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі для дыстанцыйнай формы атрымання адукацыі.

3. Асноўнай формай арганізацыі адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы адораных дзяцей і моладзі з'яўляюцца заняткі.

4. Напаўняльнасць вучэбнай групы вызначаецца Міністэрствам адукацыі.

5. У працэсе засваення зместу адукацыйнай праграмы адораных дзяцей і моладзі навучэнцы рэалізуюць праекты даследчага або вынаходніцкага характару.

**Артыкул 243. Агульныя патрабаванні да прыёму (залічэння) асоб для атрымання дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі**

1. Ва ўстанову дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі для атрымання дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі прымаюцца (залічваюцца) асобы, якія засвойваюць змест адукацыйнай праграмы базавай адукацыі, адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі, адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі.

2. У дыстанцыйнай форме атрымання адукацыі змест адукацыйнай праграмы адораных дзяцей і моладзі могуць засвойваць асобы, якія засвоілі змест часткі гэтай праграмы ў дзённай форме атрымання адукацыі.

3. Прыём (залічэнне) асобы, якая дасягнула ўзросту чатырнаццаці гадоў, ва ўстанову дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі для атрымання дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі ажыццяўляецца на падставе яе заявы і са згоды аднаго з яе законных прадстаўнікоў пры прад'яўленні пасведчання аб нараджэнні або дакумента, які сведчыць асобу, калі іншае не вызначана гэтым артыкулам. Ад імені непаўналетняй асобы заява можа быць пададзена яе законным прадстаўніком.

4. Прыём (залічэнне) асобы для засваення зместу адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі ў дзённай форме атрымання адукацыі ажыццяўляецца па конкурсе на падставе вынікаў адбору найбольш падрыхтаваных асоб.

5. Для арганізацыі прыёму (залічэння) асоб, якія выказалі жаданне ўдзельнічаць у конкурсе для засваення зместу адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі ў дзённай форме атрымання адукацыі, фарміравання кантынгенту навучэнцаў па выніках адбору ствараецца прыёмная камісія, якая ўзначальваецца кіраўніком установы адукацыі або ўпаўнаважанай ім асобай.

6. Парадак адбору і прыёму (залічэння) асоб для засваення зместу адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі, тэрміны фарміравання кантынгенту навучэнцаў, пералік дакументаў, якія, апрача прадугледжаных пунктам 3 гэтага артыкула, прад'яўляюцца ў прыёмную камісію ўстановы дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі, парадак дзейнасці прыёмнай камісіі вызначаюцца Міністэрствам адукацыі.

7. Прыём (залічэнне) асоб для атрымання дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі ў частцы, не ўрэгуляванай гэтым Кодэксам, ажыццяўляецца ў адпаведнасці з Палажэннем аб установе дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі.

## ГЛАВА 51
## НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ ДАДАТКОВАЙ АДУКАЦЫІ АДОРАНЫХ ДЗЯЦЕЙ І МОЛАДЗІ

### Артыкул 244. Навукова-метадычнае забеспячэнне дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі

1. Навукова-метадычнае забеспячэнне дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі ўключае ў сябе:

1.1. вучэбна-праграмную дакументацыю адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі;

1.2. праграмна-планавальную дакументацыю выхавання;

1.3. вучэбна-метадычную дакументацыю;

1.4. інфармацыйна-аналітычныя матэрыялы

2. Навукова-метадычнае забеспячэнне дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі ажыццяўляюць:

2.1. установы дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі;

2.2. дзяржаўныя арганізацыі адукацыі, якія забяспечваюць функцыянаванне сістэмы адукацыі;

2.3. арганізацыі, якія ўдзельнічаюць у рэалізацыі адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі праз сеткавую форму ўзаемадзеяння;

2.4. Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, рэспубліканскія органы дзяржаўнага кіравання, іншыя арганізацыі, падпарадкаваныя Ураду Рэспублікі Беларусь.

### Артыкул 245. Вучэбна-праграмная дакументацыя адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі

1. Вучэбна-праграмная дакументацыя адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі ўключае ў сябе:

1.1. тыпавыя вучэбныя праграмы адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі;

1.2. вучэбныя праграмы па напрамках адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі для змен;

1.3. індывідуальныя вучэбныя праграмы дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі для дзённай формы атрымання адукацыі;

1.4. індывідуальныя вучэбныя праграмы дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі для дыстанцыйнай формы атрымання адукацыі;

1.5. індывідуальныя вучэбныя праграмы дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі.

2. Тыпавая вучэбная праграма адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі вызначае мэты, задачы, змест, тэрмін атрымання дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі, вучэбна-тэматычны план, час на вывучэнне адукацыйных тэм, віды заняткаў, рэкамендаваныя формы і метады навучання, рэсурсы, неабходныя для забеспячэння адукацыйнага працэсу.

3. Вучэбная праграма па напрамку адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі для змены вызначае мэты, задачы, змест, тэрмін атрымання дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі, вучэбна-тэматычны план, час на вывучэнне адукацыйных тэм, віды заняткаў, формы і метады навучання, рэсурсы, неабходныя для забеспячэння адукацыйнага працэсу.

4. Індывідуальная вучэбная праграма дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі для дзённай формы атрымання адукацыі вызначае мэты, задачы, змест, тэрмін атрымання дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі, вучэбна-тэматычны план, час на вывучэнне адукацыйных тэм, рэсурсы, неабходныя для забеспячэння адукацыйнага працэсу.

5. Індывідуальная вучэбная праграма дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі для дыстанцыйнай формы атрымання адукацыі вызначае напрамак, мэты, задачы, змест, тэрмін атрымання дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі, вучэбна-тэматычны план, час на вывучэнне адукацыйных тэм, рэсурсы, неабходныя для забеспячэння адукацыйнага працэсу.

6. Індывідуальная вучэбная праграма дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі вызначае асаблівасці атрымання дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі ў дзённай форме атрымання адукацыі навучэнцамі з ліку асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, навучэнцамі, якія па ўважлівай прычыне не могуць пастаянна або часова наведваць заняткі.

7. Вучэбна-праграмная дакументацыя адукацыйнай праграмы адораных дзяцей і моладзі распрацоўваецца і зацвярджаецца ў парадку, які вызначаецца Міністэрствам адукацыі.

## РАЗДЗЕЛ XV
## ДАДАТКОВАЯ АДУКАЦЫЯ ДАРОСЛЫХ

### ГЛАВА 52
### СІСТЭМА ДАДАТКОВАЙ АДУКАЦЫІ ДАРОСЛЫХ

**Артыкул 246. Сістэма дадатковай адукацыі дарослых**

1. Дадатковая адукацыя дарослых – від дадатковай адукацыі, накіраваны на прафесійнае развіццё асобы слухача, стажора, задавальненне іх пазнавальных патрэб, фарміраванне ў іх кампетэнцый, неабходных для ажыццяўлення прафесійнай дзейнасці.

2. Сістэма дадатковай адукацыі дарослых уключае ў сябе:

2.1. удзельнікаў адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адукацыйных праграм дадатковай адукацыі дарослых;

2.2. адукацыйныя праграмы дадатковай адукацыі дарослых;

2.3. установы дадатковай адукацыі дарослых;

2.4. іншыя ўстановы адукацыі, што рэалізуюць адукацыйныя праграмы дадатковай адукацыі дарослых;

2.5. іншыя арганізацыі, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы дадатковай адукацыі дарослых;

2.6. індывідуальных прадпрымальнікаў, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы дадатковай адукацыі дарослых;

2.7. вучэбна-метадычныя аб’яднанні ў сферы дадатковай адукацыі дарослых;

2.8. арганізацыі, якія накіроўваюць работнікаў для засваення зместу адукацыйных праграм дадатковай адукацыі дарослых;

2.9. дзяржаўныя арганізацыі адукацыі, якія забяспечваюць функцыянаванне сістэмы адукацыі;

2.10. арганізацыі, якія ўдзельнічаюць у рэалізацыі адукацыйных праграм праз сеткавую форму ўзаемадзеяння;

2.11. дзяржаўныя органы, падпарадкаваныя і (або) падсправаздачныя Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь, рэспубліканскія органы дзяржаўнага кіравання, іншыя арганізацыі, падпарадкаваныя Ураду Рэспублікі Беларусь, мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы, іншыя арганізацыі ў межах іх паўнамоцтваў у сферы дадатковай адукацыі дарослых.

3. Дадатковая адукацыя дарослых пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць вышэйшую адукацыю,

адукацыйнай праграмы перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць сярэднюю спецыяльную адукацыю, дае права на працаўладкаванне па атрыманай спецыяльнасці і прысвоенай кваліфікацыі на пасады служачых у адпаведнасці з Адзіным кваліфікацыйным даведнікам пасад служачых.

### Артыкул 247. Удзельнікі адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адукацыйных праграм дадатковай адукацыі дарослых

Удзельнікамі адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адукацыйных праграм дадатковай адукацыі дарослых з’яўляюцца слухачы, стажоры, законныя прадстаўнікі непаўналетніх слухачоў, педагагічныя работнікі.

### Артыкул 248. Адукацыйныя праграмы дадатковай адукацыі дарослых

1. Адукацыйныя праграмы дадатковай адукацыі дарослых падраздзяляюцца на:

1.1. адукацыйную праграму павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў;

1.2. адукацыйную праграму перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць вышэйшую адукацыю;

1.3. адукацыйную праграму перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць сярэднюю спецыяльную адукацыю;

1.4. адукацыйную праграму стажыроўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў;

1.5. адукацыйную праграму спецыяльнай падрыхтоўкі, неабходнай для займання асобных пасад служачых;

1.6. адукацыйную праграму павышэння кваліфікацыі рабочых (служачых);

1.7. адукацыйную праграму перападрыхтоўкі рабочых (служачых);

1.8. адукацыйную праграму прафесійнай падрыхтоўкі рабочых (служачых);

1.9. адукацыйную праграму падрыхтоўкі вадзіцеляў механічных транспартных сродкаў, самаходных машын;

1.10. адукацыйную праграму перападрыхтоўкі вадзіцеляў механічных транспартных сродкаў, самаходных машын;

1.11. адукацыйную праграму павышэння кваліфікацыі вадзіцеляў механічных транспартных сродкаў, самаходных машын;

1.12. адукацыйную праграму навучальных курсаў (лекторыяў, тэматычных семінараў, практыкумаў, трэнінгаў, афіцэрскіх курсаў і іншых відаў навучальных курсаў);

1.13. адукацыйную праграму курсаў мэтавага прызначэння;

1.14. адукацыйную праграму ўдасканалення магчымасцей і здольнасцей асобы;

1.15. адукацыйную праграму падрыхтоўкі асоб да паступлення ва ўстановы адукацыі Рэспублікі Беларусь;

1.16. адукацыйную праграму рэпетыцыйнага тэсціравання.

2. Адукацыйная праграма павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў – адукацыйная праграма, накіраваная на прафесійнае ўдасканаленне работнікаў.

3. Адукацыйная праграма перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць вышэйшую адукацыю, – адукацыйная праграма, накіраваная на прысваенне новай кваліфікацыі на ўзроўні вышэйшай адукацыі.

4. Адукацыйная праграма перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць сярэднюю спецыяльную адукацыю, – адукацыйная праграма, накіраваная на прысваенне новай кваліфікацыі на ўзроўні сярэдняй спецыяльнай адукацыі.

5. Адукацыйная праграма стажыроўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў – адукацыйная праграма, якая забяспечвае засваенне кіруючымі работнікамі і спецыялістамі новых метадаў, тэхналогій і элементаў прафесійнай дзейнасці. На праходжанне

стажыроўкі, неабходнай для займання пасад служачых і прадугледжанай заканадаўчымі актамі, нормы гэтага Кодэкса не распаўсюджваюцца.

6. Адукацыйная праграма спецыяльнай падрыхтоўкі, неабходнай для займання асобных пасад служачых, – адукацыйная праграма, накіраваная на паглыбленне ведаў і набыццё практычных прафесійных навыкаў асобамі, што прэтэндуюць на займанне пасад служачых, для прызначэння на якія заканадаўчымі актамі прадугледжана праходжанне спецыяльнай падрыхтоўкі.

7. Адукацыйная праграма павышэння кваліфікацыі рабочых (служачых) – адукацыйная праграма, накіраваная на прафесійнае ўдасканаленне:

7.1. рабочых з прысваеннем больш высокіх разрадаў па прафесіі рабочага;

7.2. служачых, акрамя кіраўнікоў і спецыялістаў.

8. Адукацыйная праграма перападрыхтоўкі рабочых (служачых) – адукацыйная праграма, накіраваная на:

8.1. набыццё прафесіі рабочага асобамі, якія маюць іншую прафесію рабочага;

8.2. фарміраванне кампетэнцый, неабходных для выканання працоўнай функцыі па пасадзе служачага, акрамя кіраўніка і спецыяліста, асобамі, якія раней прайшлі прафесійную падрыхтоўку па іншай пасадзе служачага.

9. Адукацыйная праграма прафесійнай падрыхтоўкі рабочых (служачых) – адукацыйная праграма, накіраваная на:

9.1. набыццё прафесіі рабочага асобамі, якія не маюць прафесіі рабочага;

9.2. фарміраванне кампетэнцый, неабходных для выканання працоўнай функцыі па пасадзе служачага, акрамя кіраўніка і спецыяліста.

10. Адукацыйная праграма падрыхтоўкі вадзіцеляў механічных транспартных сродкаў, самаходных машын – адукацыйная праграма, накіраваная на фарміраванне кампетэнцый, неабходных для кіравання механічным транспартным сродкам, самаходнай машынай адпаведнай катэгорыі.

11. Адукацыйная праграма перападрыхтоўкі вадзіцеляў механічных транспартных сродкаў, самаходных машын – адукацыйная праграма, накіраваная на фарміраванне кампетэнцый, неабходных для кіравання механічным транспартным сродкам, самаходнай машынай іншай катэгорыі.

12. Адукацыйная праграма павышэння кваліфікацыі вадзіцеляў механічных транспартных сродкаў, самаходных машын – адукацыйная праграма, накіраваная на ўдасканаленне кампетэнцый вадзіцеляў механічных транспартных сродкаў, самаходных машын па катэгорыі.

13. Адукацыйная праграма навучальных курсаў (лекторыяў, тэматычных семінараў, практыкумаў, трэнінгаў, афіцэрскіх курсаў і іншых відаў навучальных курсаў) – адукацыйная праграма, накіраваная на задавальненне пазнавальных патрэб у пэўнай сферы прафесійнай дзейнасці або галіны ведаў.

14. Адукацыйная праграма курсаў мэтавага прызначэння – адукацыйная праграма, накіраваная на фарміраванне кампетэнцый у пэўнай сферы прафесійнай дзейнасці, вывучэнне новай тэхнікі, абсталявання, матэрыялаў, тэхналагічных працэсаў, прагрэсіўных формаў арганізацыі працы, правіл тэхнічнай эксплуатацыі абсталявання, патрабаванняў па ахове працы, пытанняў, звязаных з павышэннем якасці прадукцыі, і іншых пытанняў, накіраваных на вырашэнне канкрэтных тэхнічных, эканамічных і іншых задач.

15. Адукацыйная праграма ўдасканалення магчымасцей і здольнасцей асобы – адукацыйная праграма, накіраваная на духоўнае, культурнае і фізічнае развіццё асобы, фарміраванне навыкаў, неабходных у штодзённым жыцці.

16. Адукацыйная праграма падрыхтоўкі асоб да паступлення ва ўстановы адукацыі Рэспублікі Беларусь – адукацыйная праграма, накіраваная на вывучэнне вучэбных прадметаў, неабходных для паступлення ва ўстановы адукацыі Рэспублікі Беларусь.

17. Адукацыйная праграма рэпетыцыйнага тэсціравання – адукацыйная праграма, накіраваная на абагульненне, сістэматызацыю і паглыбленне ведаў па навучальных

прадметах, неабходных для паступлення ва ўстановы адукацыі Рэспублікі Беларусь пры праходжанні ўступных іспытаў у форме цэнтралізаванага тэсціравання.

18. Адукацыйныя праграмы дадатковай адукацыі дарослых рэалізуюцца ў вочнай, завочнай і дыстанцыйнай формах атрымання адукацыі, акрамя адукацыйнай праграмы павышэння кваліфікацыі рабочых (служачых), адукацыйнай праграмы перападрыхтоўкі рабочых (служачых), адукацыйнай праграмы прафесійнай падрыхтоўкі рабочых (служачых), адукацыйнай праграмы падрыхтоўкі вадзіцеляў механічных транспартных сродкаў, самаходных машын, адукацыйнай праграмы перападрыхтоўкі вадзіцеляў механічных транспартных сродкаў, самаходных машын, адукацыйнай праграмы павышэння кваліфікацыі вадзіцеляў механічных транспартных сродкаў, самаходных машын, якія рэалізуюцца толькі ў вочнай форме атрымання адукацыі.

19. Адукацыйныя праграмы дадатковай адукацыі дарослых рэалізуюцца ва ўстановах дадатковай адукацыі дарослых, а таксама могуць рэалізоўвацца ў сярэдніх школах, гімназіях, ліцэях, спецыялізаваных ліцэях, школах-інтэрнатах для дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекавання бацькоў, спецыяльных школах, спецыяльных школах-інтэрнатах для навучэнцаў з інтэлектуальнай недастатковасцю, установах сярэдняй спецыяльнай, вышэйшай адукацыі, установах дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі, спецыяльных навучальна-выхаваўчых установах, спецыяльных лячэбна-выхаваўчых установах, цэнтрах (палацах), іншых арганізацыях, у індывідуальных прадпрымальнікаў, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, у арганізацыях, што ажыццяўляюць навукова-метадычнае забеспячэнне адукацыі.

Віды рэалізуемых адукацыйных праграм дадатковай адукацыі дарослых ва ўстановах адукацыі, іншых арганізацыях, у індывідуальных прадпрымальнікаў, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, у арганізацыях, што ажыццяўляюць навукова-метадычнае забеспячэнне адукацыі, указаныя ў частцы першай гэтага пункта, вызначаюцца гэтым Кодэксам.

Адукацыйная праграма стажыроўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў можа рэалізоўвацца ў аб’яднаннях, злучэннях, воінскіх часцях і арганізацыях Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь, органах пагранічнай службы.

Адукацыйная праграма рэпетыцыйнага тэсціравання рэалізуецца ў інстытутах кантролю ведаў.

### Артыкул 249. Адукацыйныя стандарты перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць вышэйшую адукацыю, кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць сярэднюю спецыяльную адукацыю

1. Адукацыйныя стандарты перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць вышэйшую адукацыю, кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць сярэднюю спецыяльную адукацыю, распрацоўваюцца па кожнай спецыяльнасці і ўстанаўліваюць патрабаванні да вынікаў засваення зместу адпаведных адукацыйных праграм дадатковай адукацыі дарослых, зместу іх вучэбна-праграмнай дакументацыі, формаў і тэрмінаў атрымання дадатковай адукацыі дарослых, арганізацыі адукацыйнага працэсу, узроўню асноўнай адукацыі асоб, якія паступаюць для атрымання дадатковай адукацыі дарослых, максімальнага дапушчальнага аб’ёму вучэбнай нагрузкі слухачоў, выніковай атэстацыі. Патрабаванні да вынікаў засваення зместу адпаведных адукацыйных праграм дадатковай адукацыі дарослых уключаюць фарміруемыя кампетэнцыі навучэнцаў.

2. Адукацыйныя стандарты перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць вышэйшую адукацыю, кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць сярэднюю спецыяльную адукацыю, распрацоўваюцца дзяржаўнымі органамі, падпарадкаванымі і (або) падсправаздачнымі Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь, рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання, іншымі арганізацыямі, падпарадкаванымі Ураду Рэспублікі Беларусь, акрамя органа, указанага ў частцы другой

гэтага пункта, і (або) Міністэрствам адукацыі і зацвярджаюцца імі па ўзгадненні з Міністэрствам адукацыі, іншымі зацікаўленымі рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання, іншымі арганізацыямі, падпарадкаванымі Ураду Рэспублікі Беларусь. Пералік дзяржаўных органаў, падпарадкаваных і (або) падсправаздачных Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь, рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, іншых арганізацый, падпарадкаваных Ураду Рэспублікі Беларусь, якія арганізуюць распрацоўку і зацвярджэнне адукацыйных стандартаў перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць вышэйшую адукацыю, кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць сярэднюю спецыяльную адукацыю, а таксама спецыяльнасцей, па якіх яны арганізуюць распрацоўку і ажыццяўляюць зацвярджэнне адукацыйных стандартаў, устанаўліваецца Міністэрствам адукацыі па ўзгадненні з гэтымі дзяржаўнымі органамі. Адукацыйныя стандарты перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць вышэйшую адукацыю, кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць сярэднюю спецыяльную адукацыю, распрацоўваюцца сумесна з арганізацыямі, што ажыццяўляюць навукова-метадычнае забеспячэнне дадатковай адукацыі дарослых, вучэбна-метадычнымі аб’яднаннямі ў сферы дадатковай адукацыі дарослых.

Адукацыйныя стандарты перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць вышэйшую адукацыю, кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць сярэднюю спецыяльную адукацыю, па спецыяльнасцях для ўстаноў адукацыі, якія знаходзяцца ў падпарадкаванні органаў дзяржаўнай бяспекі, распрацоўваюцца і зацвярджаюцца Камітэтам дзяржаўнай бяспекі па ўзгадненні з Міністэрствам адукацыі.

**Артыкул 250. Тэрмін атрымання дадатковай адукацыі дарослых**

1. Тэрмін атрымання дадатковай адукацыі дарослых пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, адукацыйнай праграмы перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць вышэйшую адукацыю, адукацыйнай праграмы перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць сярэднюю спецыяльную адукацыю, адукацыйнай праграмы стажыроўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў вызначаецца Урадам Рэспублікі Беларусь, калі іншае не ўстаноўлена Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

2. Тэрмін атрымання дадатковай адукацыі дарослых пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы спецыяльнай падрыхтоўкі, неабходнай для займання асобных пасад служачых, складае да двух гадоў.

3. Тэрмін атрымання дадатковай адукацыі дарослых пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы павышэння кваліфікацыі рабочых (служачых) складае ад аднаго тыдня да трох месяцаў.

4. Тэрмін атрымання дадатковай адукацыі дарослых пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы перападрыхтоўкі рабочых (служачых) складае ад двух тыдняў да адзінаццаці месяцаў.

5. Тэрмін атрымання дадатковай адукацыі дарослых пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы прафесійнай падрыхтоўкі рабочых (служачых) складае ад двух тыдняў да дванаццаці месяцаў. Тэрмін атрымання дадатковай адукацыі дарослых пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы прафесійнай падрыхтоўкі рабочых (служачых) па кожнай прафесіі рабочага і разрады, якія прысвойваюцца па ёй, а таксама па кожнай пасадзе служачага, акрамя пасад кіраўнікоў і спецыялістаў, вызначаюцца пералікам прафесій для падрыхтоўкі рабочых, пералікам пасад для падрыхтоўкі па пасадах служачых, акрамя пасад кіраўнікоў і спецыялістаў. Тэрмін атрымання дадатковай адукацыі дарослых пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы прафесійнай падрыхтоўкі рабочых (служачых) слухачамі ва ўстановах дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, а таксама навучэнцамі, якія адначасова засвойваюць змест адукацыйнай праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі або адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй

адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю, можа быць павялічаны ў рамках колькасці вучэбных гадзін, прадугледжаных вучэбна-праграмнай дакументацыяй адукацыйнай праграмы прафесійнай падрыхтоўкі рабочых (служачых).

6. Тэрмін атрымання дадатковай адукацыі дарослых пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы падрыхтоўкі вадзіцеляў механічных транспартных сродкаў, самаходных машын, адукацыйнай праграмы перападрыхтоўкі вадзіцеляў механічных транспартных сродкаў, самаходных машын, адукацыйнай праграмы павышэння кваліфікацыі вадзіцеляў механічных транспартных сродкаў, самаходных машын вызначаецца заканадаўствам у сферы дарожнага руху і транспартнай дзейнасці.

7. Тэрмін атрымання дадатковай адукацыі дарослых пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы навучальных курсаў (лекторыяў, тэматычных семінараў, практыкумаў, трэнінгаў, афіцэрскіх курсаў і іншых відаў навучальных курсаў), адукацыйнай праграмы курсаў мэтавага прызначэння, адукацыйнай праграмы ўдасканалення магчымасцей і здольнасцей асобы вызначаецца ўстановамі адукацыі, іншымі арганізацыямі, індывідуальнымі прадпрымальнікамі, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы дадатковай адукацыі дарослых.

8. Тэрмін атрымання дадатковай адукацыі дарослых пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы падрыхтоўкі асоб да паступлення ва ўстановы адукацыі Рэспублікі Беларусь складае да дзесяці месяцаў.

9. Тэрмін атрымання дадатковай адукацыі дарослых пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы рэпетыцыйнага тэсціравання складае да васьмі месяцаў.

## ГЛАВА 53
## УСТАНОВЫ ДАДАТКОВАЙ АДУКАЦЫІ ДАРОСЛЫХ, ІНШЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ, ІНДЫВІДУАЛЬНЫЯ ПРАДПРЫМАЛЬНІКІ, ШТО АЖЫЦЦЯЎЛЯЮЦЬ АДУКАЦЫЙНУЮ ДЗЕЙНАСЦЬ, ЯКІЯ РЭАЛІЗУЮЦЬ АДУКАЦЫЙНЫЯ ПРАГРАМЫ ДАДАТКОВАЙ АДУКАЦЫІ ДАРОСЛЫХ

### Артыкул 251. Установы дадатковай адукацыі дарослых

1. Установа дадатковай адукацыі дарослых – установа адукацыі, якая рэалізуе адну або некалькі адукацыйных праграм дадатковай адукацыі дарослых, адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, а таксама можа рэалізоўваць адукацыйную праграму магістратуры, адукацыйныя праграмы прафесійна-тэхнічнай адукацыі, адукацыйныя праграмы сярэдняй спецыяльнай адукацыі, адукацыйную праграму дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі.

2. Установы дадатковай адукацыі дарослых могуць быць наступных відаў:

2.1. акадэмія адукацыі;

2.2. акадэмія паслядыпломнай адукацыі;

2.3. інстытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі;

2.4. інстытут развіцця адукацыі;

2.5. інстытут прафесійнай адукацыі;

2.6. інстытут кантролю ведаў;

2.7. цэнтр падрыхтоўкі, павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў.

3. Акадэмія адукацыі – установа дадатковай адукацыі дарослых, якая рэалізуе адукацыйную праграму павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, адукацыйную праграму перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць вышэйшую адукацыю, адукацыйную праграму стажыроўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, выконвае фундаментальныя і прыкладныя навуковыя даследаванні ў галіне педагогікі, карэкцыйнай педагогікі, псіхалогіі, спецыяльнай псіхалогіі, узроставай фізіялогіі, сацыялогіі, філасофіі адукацыі, прыватных методык навучання і выхавання, тэорыі кіравання адукацыяй і сумежных з імі навук як асновы ўдасканалення адукацыі,

іншых напрамках, ажыццяўляе эксперыментальную і інавацыйную дзейнасць у сферы адукацыі, доследную праверку падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў, распрацоўку і ўкараненне ў практыку інавацыйных структурных элементаў навукова-метадычнага забеспячэння, вучэбна-метадычных комплексаў, сродкаў навучання і выхавання, сістэматычнае назіранне за станам адукацыі і дынамікай змяненняў яго вынікаў, умоў ажыццяўлення адукацыйнай дзейнасці, кантынгенту навучэнцаў, іх вучэбных і невучэбных дасягненняў, сеткі ўстаноў адукацыі, у тым ліку ў рамках міжнародных параўнальных даследаванняў у сферы адукацыі, выконвае экспертныя, прагназавальныя, інфармацыйна-аналітычныя, навукова-метадычныя і іншыя функцыі, накіраваныя на забеспячэнне атрымання адукацыі і павышэння яе якасці, каардынуе дзейнасць арганізацый, што ажыццяўляюць навукова-метадычнае забеспячэнне дашкольнай, агульнай сярэдняй спецыяльнай адукацыі, дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, а таксама можа рэалізоўваць іншыя віды адукацыйных праграм дадатковай адукацыі дарослых, адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, адукацыйную праграму дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі.

4. Акадэмія паслядыпломнай адукацыі – установа дадатковай адукацыі дарослых, якая рэалізуе адукацыйную праграму павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, адукацыйную праграму перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць вышэйшую адукацыю, адукацыйную праграму перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць сярэднюю спецыяльную адукацыю, выконвае фундаментальныя і (або) прыкладныя навуковыя даследаванні, экспертныя, прагназавальныя, інфармацыйна-аналітычныя і навукова-метадычныя функцыі ў сферы адукацыі, а таксама можа рэалізоўваць іншыя віды адукацыйных праграм дадатковай адукацыі дарослых, адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, адукацыйную праграму дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, каардынаваць дзейнасць арганізацый, што ажыццяўляюць навукова-метадычнае забеспячэнне дашкольнай, агульнай сярэдняй, спецыяльнай адукацыі, дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі.

5. Інстытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі – установа дадатковай адукацыі дарослых, якая рэалізуе адукацыйную праграму павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, адукацыйную праграму перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць вышэйшую адукацыю, адукацыйную праграму перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць сярэднюю спецыяльную адукацыю, выконвае прыкладныя навуковыя даследаванні ў сферы дадатковай адукацыі дарослых, навукова-метадычныя функцыі ў сферы адукацыі, а таксама можа рэалізоўваць іншыя віды адукацыйных праграм дадатковай адукацыі дарослых, адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі.

6. Інстытут развіцця адукацыі – установа дадатковай адукацыі дарослых, якая рэалізуе адукацыйную праграму павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, адукацыйную праграму стажыроўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, выконвае інфармацыйна-аналітычную, навукова-метадычную, арганізацыйна-метадычную функцыі ў сферы адукацыі, каардынуе дзейнасць арганізацый, што ажыццяўляюць навукова-метадычнае забеспячэнне дашкольнай, агульнай сярэдняй, спецыяльнай адукацыі, дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, што функцыянуюць на раённым (гарадскім) узроўні, а таксама можа рэалізоўваць іншыя віды адукацыйных праграм дадатковай адукацыі дарослых, адукацыйную праграму дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, выконваць фундаментальныя і (або) прыкладныя навуковыя даследаванні.

7. Інстытут прафесійнай адукацыі – установа дадатковай адукацыі дарослых, якая рэалізуе адукацыйную праграму павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, адукацыйную праграму перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць вышэйшую адукацыю, адукацыйную праграму перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць сярэднюю спецыяльную адукацыю, выконвае фундаментальныя і (або) прыкладныя навуковыя даследаванні, экспертныя,

прагназавальныя, інфармацыйна-аналітычныя і навукова-метадычныя функцыі ў сферы адукацыі, каардынуе дзейнасць арганізацый, што ажыццяўляюць навукова-метадычнае забеспячэнне прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай адукацыі, і вучэбна-метадычных аб'яднанняў у сферы прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай адукацыі, а таксама можа рэалізоўваць іншыя віды адукацыйных праграм дадатковай адукацыі дарослых, адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі, адукацыйную праграму магістратуры, адукацыйныя праграмы прафесійна-тэхнічнай адукацыі, адукацыйныя праграмы сярэдняй спецыяльнай адукацыі, адукацыйную праграму дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі.

8. Інстытут кантролю ведаў – установа дадатковай адукацыі дарослых, якая рэалізуе адукацыйную праграму рэпетыцыйнага тэсціравання, адукацыйную праграму навучальных курсаў (лекторыяў, тэматычных семінараў, практыкумаў, трэнінгаў, афіцэрскіх курсаў і іншых відаў навучальных курсаў), адукацыйную праграму ўдасканалення магчымасцей і здольнасцей асобы, а таксама можа ўдзельнічаць у правядзенні атэстацыі навучэнцаў, ажыццяўляць метадычнае і (або) арганізацыйнае забеспячэнне правядзення атэстацыі навучэнцаў, уступных іспытаў, адукацыйных мерапрыемстваў, у тым ліку алімпіяд, арганізацыю распрацоўкі кантрольна-вымяральных матэрыялаў, крытэрыяў ацэнкі (ацэньвання) іх выканання, цэнтралізаваную праверку прац навучэнцаў пры праходжанні атэстацыі, абітурыентаў пры правядзенні ўступных іспытаў, фарміраванне, улік і суправаджэнне банкаў кантрольна-вымяральных матэрыялаў для атэстацыі навучэнцаў, правядзення ўступных іспытаў, баз даных навучэнцаў, якія праходзяць атэстацыю, абітурыентаў, выконваць іншыя функцыі, накіраваныя на ўдасканаленне формаў кантролю вынікаў вучэбнай дзейнасці навучэнцаў і забеспячэнне якасці адукацыі.

9. Цэнтр падрыхтоўкі, павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў – установа дадатковай адукацыі дарослых, якая рэалізуе адукацыйную праграму павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, і (або) адукацыйную праграму спецыяльнай падрыхтоўкі, неабходнай для займання асобных пасад служачых, і (або) адукацыйную праграму павышэння кваліфікацыі рабочых (служачых), і (або) адукацыйную праграму перападрыхтоўкі рабочых (служачых), і (або) адукацыйную праграму прафесійнай падрыхтоўкі рабочых (служачых), а таксама можа рэалізоўваць адукацыйную праграму падрыхтоўкі вадзіцеляў механічных транспартных сродкаў, самаходных машын, адукацыйную праграму перападрыхтоўкі вадзіцеляў механічных транспартных сродкаў, самаходных машын, адукацыйную праграму павышэння кваліфікацыі вадзіцеляў механічных транспартных сродкаў, самаходных машын, адукацыйную праграму навучальных курсаў (лекторыяў, тэматычных семінараў, практыкумаў, трэнінгаў, афіцэрскіх курсаў і іншых відаў навучальных курсаў), адукацыйную праграму курсаў мэтавага прызначэння, адукацыйную праграму ўдасканалення магчымасцей і здольнасцей асобы. Паводле рашэння Міністэрства адукацыі цэнтр падрыхтоўкі, павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў можа рэалізоўваць адукацыйную праграму перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць вышэйшую адукацыю, адукацыйную праграму перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць сярэднюю спецыяльную адукацыю.

10. Ва ўстанове дадатковай адукацыі дарослых могуць стварацца структурныя падраздзяленні: факультэт, кафедра, іншыя структурныя падраздзяленні.

### Артыкул 252. Іншыя арганізацыі, індывідуальныя прадпрымальнікі, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы дадатковай адукацыі дарослых

1. Іншыя арганізацыі, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, могуць рэалізоўваць наступныя адукацыйныя праграмы дадатковай адукацыі дарослых:

1.1. адукацыйную праграму павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў;

1.2. адукацыйную праграму стажыроўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў;

1.3. адукацыйную праграму спецыяльнай падрыхтоўкі, неабходнай для занятку асобных пасад служачых;

1.4. адукацыйную праграму павышэння кваліфікацыі рабочых (служачых);

1.5. адукацыйную праграму перападрыхтоўкі рабочых (служачых);

1.6. адукацыйную праграму прафесійнай падрыхтоўкі рабочых (служачых);

1.7. адукацыйную праграму падрыхтоўкі вадзіцеляў механічных транспартных сродкаў, самаходных машын;

1.8. адукацыйную праграму перападрыхтоўкі вадзіцеляў механічных транспартных сродкаў, самаходных машын;

1.9. адукацыйную праграму павышэння кваліфікацыі вадзіцеляў механічных транспартных сродкаў, самаходных машын;

1.10. адукацыйную праграму навучальных курсаў (лекторыяў, тэматычных семінараў, практыкумаў, трэнінгаў, афіцэрскіх курсаў і іншых відаў навучальных курсаў);

1.11. адукацыйную праграму курсаў мэтавага прызначэння;

1.12. адукацыйную праграму ўдасканалення магчымасцей і здольнасцей асобы.

2. У іншых арганізацыях, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, рэалізацыя адукацыйнай праграмы прафесійнай падрыхтоўкі рабочых (служачых), адукацыйнай праграмы павышэння кваліфікацыі рабочых (служачых), адукацыйнай праграмы перападрыхтоўкі рабочых (служачых) ажыццяўляецца:

па заяўках арганізацый – заказчыкаў кадраў за кошт сродкаў арганізацый – заказчыкаў кадраў;

для ўласных патрэб іншай арганізацыі, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, з ліку работнікаў гэтай арганізацыі ў адпаведнасці з лакальнымі прававымі актамі, а таксама з ліку іншых асоб за кошт сродкаў іншай арганізацыі, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць.

Пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы прафесійнай падрыхтоўкі рабочых (служачых), адукацыйнай праграмы перападрыхтоўкі рабочых (служачых), адукацыйнай праграмы павышэння кваліфікацыі рабочых (служачых) на аснове дагавора аб прафесійнай падрыхтоўцы, перападрыхтоўцы, павышэнні кваліфікацыі рабочага (служачага) у іншай арганізацыі, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, за кошт сродкаў іншай арганізацыі, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, слухачам праводзяцца выплаты, якія ўстанаўліваюцца Урадам Рэспублікі Беларусь.

3. Іншым арганізацыям, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, з ліку камерцыйных арганізацый у парадку і з выкананнем умоў, якія вызначаюцца Урадам Рэспублікі Беларусь, Міністэрствам эканомікі прадастаўляецца статус бізнес-школы, што дае ім права рэалізоўваць адукацыйную праграму перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць вышэйшую адукацыю, накіраваную на фарміраванне ведаў, уменняў, навыкаў і кампетэнцый, неабходных для выканання функцый кіравання ў камерцыйных арганізацыях.

4. Індывідуальныя прадпрымальнікі, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, могуць рэалізоўваць наступныя адукацыйныя праграмы дадатковай адукацыі дарослых:

4.1. адукацыйную праграму навучальных курсаў (лекторыяў, тэматычных семінараў, практыкумаў, трэнінгаў, афіцэрскіх курсаў і іншых відаў навучальных курсаў);

4.2. адукацыйную праграму курсаў мэтавага прызначэння;

4.3. адукацыйную праграму ўдасканалення магчымасцей і здольнасцей асобы.

**Артыкул 253. Кіраванне ўстановай дадатковай адукацыі дарослых**

1. Непасрэднае кіраўніцтва ўстановай дадатковай адукацыі дарослых ажыццяўляе яе кіраўнік (рэктар, дырэктар, начальнік).

2. Кіраўнік установы дадатковай адукацыі дарослых прызначаецца на пасаду і вызваляецца ад пасады заснавальнікам установы дадатковай адукацыі дарослых або ўпаўнаважаным ім органам.

3. Асноўным органам самакіравання ўстановы дадатковай адукацыі дарослых з’яўляецца савет, які ўзначальваецца кіраўніком гэтай установы адукацыі.

4. Ва ўстанове дадатковай адукацыі дарослых могуць ствараецца апекавальніцкі савет, навукова-метадычны савет.

**Артыкул 254. Статус установы адукацыі, якая рэалізуе адукацыйныя праграмы дадатковай адукацыі дарослых**

1. Установе адукацыі, якая рэалізуе адукацыйныя праграмы дадатковай адукацыі дарослых, з мэтай далейшага ўдасканалення сістэмы дадатковай адукацыі дарослых, узмацнення яе ролі ў вырашэнні навукова-тэхнічных і іншых задач у сістэме дадатковай адукацыі дарослых, садзейнічання развіццю напрамкаў навуковых даследаванняў у канкрэтнай галіне, каардынацыі дзейнасці вучэбна-метадычных аб’яднанняў у сферы дадатковай адукацыі дарослых і распрацоўкі сучасных адукацыйных тэхналогій і сродкаў навучання можа быць прадастаўлены статус «вядучая ўстанова адукацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы дадатковай адукацыі дарослых».

2. Статус «вядучая ўстанова адукацыі, якая рэалізуе адукацыйныя праграмы дадатковай адукацыі дарослых» прадастаўляецца, калі іншае не ўстаноўлена Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, Міністэрствам адукацыі на падставе прапановы дзяржаўнага органа, арганізацыі, у падпарадкаванні якіх знаходзіцца ўстанова адукацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы дадатковай адукацыі дарослых.

## ГЛАВА 54
## АРГАНІЗАЦЫЯ АДУКАЦЫЙНАГА ПРАЦЭСУ ПРЫ РЭАЛІЗАЦЫІ АДУКАЦЫЙНЫХ ПРАГРАМ ДАДАТКОВАЙ АДУКАЦЫІ ДАРОСЛЫХ

**Артыкул 255. Агульныя патрабаванні да арганізацыі адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адукацыйных праграм дадатковай адукацыі дарослых, да прыёму (залічэння) асоб для атрымання дадатковай адукацыі дарослых**

1. Адукацыйны працэс пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, адукацыйнай праграмы перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць вышэйшую адукацыю, адукацыйнай праграмы перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць сярэднюю спецыяльную адукацыю, адукацыйнай праграмы павышэння кваліфікацыі рабочых (служачых), адукацыйнай праграмы перападрыхтоўкі рабочых (служачых), адукацыйнай праграмы прафесійнай падрыхтоўкі рабочых (служачых), адукацыйнай праграмы падрыхтоўкі асоб да паступлення ва ўстановы адукацыі Рэспублікі Беларусь арганізуецца ў адпаведнасці з патрабаваннямі да арганізацыі адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі, адукацыйных праграм сярэдняй спецыяльнай адукацыі, адукацыйных праграм прафесійна-тэхнічнай адукацыі, адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі з улікам асаблівасцей, якія ўтрымліваюцца ў гэтай главе, Палажэнні аб бесперапыннай прафесійнай адукацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў і Палажэнні аб бесперапынным прафесійным навучанні па прафесіях рабочых, пасадах служачых, акрамя пасад кіраўнікоў і спецыялістаў, якія зацвярджаюцца Урадам Рэспублікі Беларусь.

Адукацыйны працэс для рэалізацыі адукацыйнай праграмы павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў ва ўстановах дадатковай адукацыі дарослых дзяржаўнай сістэмы аховы здароўя можа быць арганізаваны ў іншых дзяржаўных

арганізацыях, падпарадкаваных Міністэрству аховы здароўя, у парадку, які вызначаецца гэтым Міністэрствам.

2. Адукацыйны працэс пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы прафесійнай падрыхтоўкі рабочых (служачых) у спецыяльных школах, спецыяльных школах-інтэрнатах, акрамя спецыяльнай школы, спецыяльнай школы-інтэрната для навучэнцаў з інтэлектуальнай недастатковасцю, арганізуецца для навучэнцаў X (XI) – XI (XII) класаў, а ў спецыяльнай школе, спецыяльнай школе-інтэрнаце для навучэнцаў з інтэлектуальнай недастатковасцю – для навучэнцаў XI, XI–XII класаў паглыбленай сацыяльнай і прафесійнай падрыхтоўкі.

Адукацыйны працэс пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы прафесійнай падрыхтоўкі рабочых (служачых) для навучэнцаў X (XI) – XI (XII) класаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі, X (XI) – XI (XII) класаў спецыяльных школ, спецыяльных школ-інтэрнатаў, акрамя спецыяльных школ, спецыяльных школ-інтэрнатаў для навучэнцаў з інтэлектуальнай недастатковасцю, ажыццяўляецца ва ўстановах агульнай сярэдняй, спецыяльнай, сярэдняй спецыяльнай, вышэйшай адукацыі, дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, дадатковай адукацыі дарослых.

Адукацыйная праграма прафесійнай падрыхтоўкі рабочых (служачых) для навучэнцаў X (XI) – XI (XII) класаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі, X (XI) – XI (XII) класаў спецыяльных школ, спецыяльных школ-інтэрнатаў, XI, XI–XII класаў паглыбленай сацыяльнай і прафесійнай падрыхтоўкі спецыяльных школ, спецыяльных школ-інтэрнатаў для навучэнцаў з інтэлектуальнай недастатковасцю ажыццяўляецца за кошт сродкаў рэспубліканскага і (або) мясцовых бюджэтаў.

Рэалізацыя адукацыйнай праграмы прафесійнай падрыхтоўкі рабочых (служачых) у філіялах дзяржаўных каледжаў, якія знаходзяцца на тэрыторыі папраўчых устаноў крымінальна-выканаўчай сістэмы Міністэрства ўнутраных спраў, рэспубліканскіх унітарных вытворчых прадпрыемстваў, падпарадкаваных Дэпартаменту выканання пакаранняў Міністэрства ўнутраных спраў, лячэбна-працоўных прафілакторыяў Міністэрства ўнутраных спраў, у спецыяльных навучальна-выхаваўчых прафесійна-тэхнічных вучылішчах закрытага тыпу, спецыяльных лячэбна-выхаваўчых прафесійна-тэхнічных вучылішчах закрытага тыпу ажыццяўляецца за кошт сродкаў рэспубліканскага і (або) мясцовых бюджэтаў.

3. Адукацыйны працэс пры рэалізацыі адукацыйных праграм дадатковай адукацыі дарослых ажыццяўляецца ў вучэбных групах або індывідуальна.

Напаўняльнасць вучэбнай групы пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, адукацыйнай праграмы перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць вышэйшую адукацыю, адукацыйнай праграмы перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць сярэднюю спецыяльную адукацыю, адукацыйнай праграмы павышэння кваліфікацыі рабочых (служачых), адукацыйнай праграмы перападрыхтоўкі рабочых (служачых), адукацыйнай праграмы прафесійнай падрыхтоўкі рабочых (служачых), адукацыйнай праграмы рэпетыцыйнага тэсціравання вызначаецца ўстановай адукацыі, іншай арганізацыяй, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, зыходзячы з патрэб эканомікі, сацыяльнай сферы ў адпаведных спецыялістах і складае на момант яе фарміравання ад 4 да 30 навучэнцаў. Пры рэалізацыі ўказаных адукацыйных праграм у Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь напаўняльнасць вучэбнай групы вызначаецца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

Пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы прафесійнай падрыхтоўкі рабочых (служачых) для навучэнцаў X (XI) – XI (XII) класаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі за кошт сродкаў рэспубліканскага і (або) мясцовых бюджэтаў напаўняльнасць вучэбнай групы не павінна перавышаць 20 слухачоў, для навучэнцаў X (XI) – XI (XII) класаў спецыяльных школ, спецыяльных школ-інтэрнатаў, XI, XI–XII класаў паглыбленай

сацыяльнай і прафесійнай падрыхтоўкі спецыяльных школ, спецыяльных школ-інтэрнатаў для навучэнцаў з інтэлектуальнай недастатковасцю – 12 навучэнцаў.

У выпадках, якія вызначаюцца Урадам Рэспублікі Беларусь, напаўняльнасць вучэбных груп можа быць зменшана паводле рашэння дзяржаўнага органа, падпарадкаванага і (або) падсправаздачнага Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь, рэспубліканскага органа дзяржаўнага кіравання, іншай арганізацыі, падпарадкаванай Ураду Рэспублікі Беларусь, у падпарадкаванні якіх знаходзяцца ўстанова адукацыі, іншая арганізацыя, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, узгодненага з Міністэрствам фінансаў, Міністэрствам працы і сацыяльнай абароны і Міністэрствам адукацыі.

Напаўняльнасць вучэбнай групы пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы падрыхтоўкі асоб да паступлення ва ўстановы адукацыі Рэспублікі Беларусь вызначаецца ўстановай адукацыі і не павінна перавышаць 12 слухачоў.

Напаўняльнасць вучэбнай групы пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы павышэння кваліфікацыі вадзіцеляў механічных транспартных сродкаў, самаходных машын, адукацыйнай праграмы перападрыхтоўкі вадзіцеляў механічных транспартных сродкаў, самаходных машын, адукацыйнай праграмы падрыхтоўкі вадзіцеляў механічных транспартных сродкаў, самаходных машын вызначаецца заканадаўствам у сферы дарожнага руху і транспартнай дзейнасці.

Напаўняльнасць вучэбных груп пры рэалізацыі адукацыйных праграм дадатковай адукацыі дарослых, не прадугледжаных гэтым пунктам, вызначаецца ўстановай адукацыі, іншай арганізацыяй, індывідуальным прадпрымальнікам, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўчымі актамі.

4. Адукацыйны працэс пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы падрыхтоўкі вадзіцеляў механічных транспартных сродкаў, самаходных машын, адукацыйнай праграмы перападрыхтоўкі вадзіцеляў механічных транспартных сродкаў, самаходных машын, адукацыйнай праграмы павышэння кваліфікацыі вадзіцеляў механічных транспартных сродкаў, самаходных машын арганізуецца ў парадку, які вызначаецца заканадаўствам у сферы дарожнага руху і транспартнай дзейнасці.

5. Адукацыйны працэс пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы стажыроўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў арганізуецца ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам і Палажэннем аб бесперапыннасці прафесійнай адукацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў.

6. Адукацыйны працэс пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы курсаў мэтавага прызначэння арганізуецца ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам і Палажэннем аб курсах мэтавага прызначэння, якія зацвярджаюцца Урадам Рэспублікі Беларусь.

7. Адукацыйны працэс пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы спецыяльнай падрыхтоўкі, неабходнай для займання асобных пасад служачых, арганізуецца ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам у парадку, які вызначаецца заканадаўчымі актамі, якімі прадугледжана праходжанне спецыяльнай падрыхтоўкі.

8. Адукацыйны працэс пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы навучальных курсаў (лекторыяў, тэматычных семінараў, практыкумаў, трэнінгаў, афіцэрскіх курсаў і іншых відаў навучальных курсаў) арганізуецца ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам, Палажэннем аб навучальных курсах дадатковай адукацыі дарослых, якім вызначаецца парадак рэалізацыі адукацыйнай праграмы навучальных курсаў (лекторыяў, тэматычных семінараў, практыкумаў, трэнінгаў, афіцэрскіх курсаў і іншых відаў навучальных курсаў), якія зацвярджаюцца Міністэрствам адукацыі, іншымі актамі заканадаўства.

9. Адукацыйны працэс пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы падрыхтоўкі асоб да паступлення ва ўстановы адукацыі Рэспублікі Беларусь арганізуецца ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам і Палажэннем аб факультэце даўніверсітэцкай падрыхтоўкі, падрыхтоўчым аддзяленні, падрыхтоўчых курсах, якія зацвярджаюцца Урадам Рэспублікі Беларусь.

10. Адукацыйны працэс пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы рэпетыцыйнага тэсціравання арганізуецца інстытутам кантролю ведаў.

11. Пачатак вучэбных заняткаў пры рэалізацыі адукацыйных праграм дадатковай адукацыі дарослых, акрамя адукацыйнай праграмы падрыхтоўкі асоб да паступлення ва ўстановы адукацыі Рэспублікі Беларусь, адукацыйнай праграмы стажыроўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, вызначаецца тэрмінамі камплектавання вучэбных груп. Пры гэтым вучэбныя заняткі пры рэалізацыі адукацыйных праграм дадатковай адукацыі дарослых на платнай аснове пачынаюцца не пазней чым праз тры месяцы пасля даты заключэння адпаведнага дагавора.

Пачатак вучэбных заняткаў пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы падрыхтоўкі асоб да паступлення ва ўстановы адукацыі Рэспублікі Беларусь вызначаецца тэрмінамі камплектавання вучэбных груп з улікам часу, неабходнага для засваення яе зместу. Пры гэтым вучэбныя заняткі пачынаюцца не пазней чым за два месяцы да заканчэння тэрміну прыёму (залічэння) асоб для атрымання адпаведнай адукацыі.

Пачатак вучэбных заняткаў пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы стажыроўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў устанаўліваецца арганізацыяй, што накіроўвае работніка на навучанне, па ўзгадненні з арганізацыяй, у якой рэалізуецца адукацыйная праграма стажыроўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў.

12. Слухачам, якія засвойваюць змест адукацыйнай праграмы перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць вышэйшую адукацыю, адукацыйнай праграмы перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць сярэднюю спецыяльную адукацыю, адукацыйнай праграмы падрыхтоўкі асоб да паступлення ва ўстановы адукацыі Рэспублікі Беларусь, выдаецца на ўвесь перыяд атрымання дадатковай адукацыі дарослых заліковая кніжка слухача, узор якой устанаўліваецца Міністэрствам адукацыі.

13. Прыём (залічэнне) навучэнца X (XI) – XI (XII) класаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі, X (XI) – XI (XII) класаў спецыяльных школ, спецыяльных школ-інтэрнатаў, XI, XI–XII класаў паглыбленай сацыяльнай і прафесійнай падрыхтоўкі спецыяльных школ, спецыяльных школ-інтэрнатаў для навучэнцаў з інтэлектуальнай недастатковасцю для засваення зместу адукацыйнай праграмы прафесійнай падрыхтоўкі рабочых (служачых) за кошт сродкаў рэспубліканскага і (або) мясцовых бюджэтаў ажыццяўляецца на падставе яго заявы. Ад імені непаўналетняй асобы заява можа быць пададзена яе законным прадстаўніком. Прыём (залічэнне) непаўналетняй асобы для засваення зместу іншых адукацыйных праграм дадатковай адукацыі дарослых ажыццяўляецца на падставе заявы яе законнага прадстаўніка са згоды непаўналетняга.

**Артыкул 256. Атрыманне дадатковай адукацыі дарослых дома**

1. Для слухачоў з ліку асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, якія па стане здароўя часова або пастаянна не могуць наведваць установы адукацыі, ствараюцца ўмовы для атрымання дадатковай адукацыі дарослых па адукацыйнай праграме прафесійнай падрыхтоўкі рабочых (служачых) па асобных прафесіях рабочых, пасадах служачых, акрамя кіраўнікоў і спецыялістаў, дома.

Пералік медыцынскіх паказанняў для атрымання дадатковай адукацыі дарослых дома вызначаецца Міністэрствам аховы здароўя.

Пералік прафесій рабочых, пасад служачых, акрамя кіраўнікоў і спецыялістаў, для атрымання дадатковай адукацыі дарослых дома вызначаецца Міністэрствам адукацыі, Міністэрствам аховы здароўя і Міністэрствам працы і сацыяльнай абароны.

2. Адукацыйны працэс для атрымання дадатковай адукацыі дарослых дома арганізуецца ўстановай адукацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы дадатковай адукацыі дарослых, па паказанай прафесіі рабочага, пасадзе служачага, акрамя кіраўнікоў і спецыялістаў, месца знаходжання якой максімальна набліжана да месца жыхарства (месца знаходжання) слухача.

3. Рашэнне аб атрыманні дадатковай адукацыі дарослых дома прымаецца ўстановай адукацыі на падставе заявы слухача, законнага прадстаўніка непаўналетняга слухача і заключэння ўрачэбна-кансультацыйнай камісіі.

4. Парадак арганізацыі атрымання дадатковай адукацыі дарослых дома вызначаецца Міністэрствам адукацыі па ўзгадненні з Міністэрствам аховы здароўя.

## ГЛАВА 55
## АТЭСТАЦЫЯ СЛУХАЧОЎ, СТАЖОРАЎ ПРЫ ЗАСВАЕННІ ЗМЕСТУ АДУКАЦЫЙНЫХ ПРАГРАМ ДАДАТКОВАЙ АДУКАЦЫІ ДАРОСЛЫХ

### Артыкул 257. Бягучая і прамежкавая атэстацыя слухачоў пры засваенні зместу адукацыйных праграм дадатковай адукацыі дарослых

1. Слухачы праходзяць бягучую атэстацыю пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць вышэйшую адукацыю, адукацыйнай праграмы перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць сярэднюю спецыяльную адукацыю.

Рашэнне аб правядзенні бягучай атэстацыі слухачоў пры засваенні зместу іншых адукацыйных праграм дадатковай адукацыі дарослых прымаецца ўстановай адукацыі, іншай арганізацыяй, індывідуальным прадпрымальнікам, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць.

Слухачы праходзяць прамежкавую атэстацыю пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць вышэйшую адукацыю, адукацыйнай праграмы перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць сярэднюю спецыяльную адукацыю, адукацыйнай праграмы павышэння кваліфікацыі рабочых (служачых), адукацыйнай праграмы перападрыхтоўкі рабочых (служачых), адукацыйнай праграмы прафесійнай падрыхтоўкі рабочых (служачых), адукацыйнай праграмы падрыхтоўкі вадзіцеляў механічных транспартных сродкаў, самаходных машын, адукацыйнай праграмы перападрыхтоўкі вадзіцеляў механічных транспартных сродкаў, самаходных машын, адукацыйнай праграмы павышэння кваліфікацыі вадзіцеляў механічных транспартных сродкаў, самаходных машын, адукацыйнай праграмы падрыхтоўкі асоб да паступлення ва ўстановы адукацыі Рэспублікі Беларусь, у іншых выпадках, прадугледжаных актамі заканадаўства.

Рашэнне аб правядзенні прамежкавай атэстацыі слухачоў пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы курсаў мэтавага прызначэння прымаецца ўстановай адукацыі, іншай арганізацыяй, індывідуальным прадпрымальнікам, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць.

2. Формы бягучай і прамежкавай атэстацыі слухачоў і парадак яе правядзення пры засваенні зместу адукацыйных праграм дадатковай адукацыі дарослых, акрамя адукацыйнай праграмы курсаў мэтавага прызначэння, адукацыйнай праграмы падрыхтоўкі вадзіцеляў механічных транспартных сродкаў, самаходных машын, адукацыйнай праграмы перападрыхтоўкі вадзіцеляў механічных транспартных сродкаў, самаходных машын, адукацыйнай праграмы павышэння кваліфікацыі вадзіцеляў механічных транспартных сродкаў, самаходных машын, вызначаюцца Правіламі правядзення атэстацыі слухачоў, стажораў пры засваенні зместу адукацыйных праграм дадатковай адукацыі дарослых.

Формы прамежкавай і бягучай атэстацыі слухачоў і парадак яе правядзення пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы падрыхтоўкі вадзіцеляў механічных транспартных сродкаў, самаходных машын, адукацыйнай праграмы перападрыхтоўкі вадзіцеляў механічных транспартных сродкаў, самаходных машын, адукацыйнай праграмы павышэння кваліфікацыі вадзіцеляў механічных транспартных сродкаў, самаходных машын вызначаюцца заканадаўствам у сферы дарожнага руху і транспартнай дзейнасці.

Формы прамежкавай і бягучай атэстацыі слухачоў і парадак яе правядзення пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы курсаў мэтавага прызначэння вызначаюцца

ўстановай адукацыі, іншай арганізацыяй, індывідуальным прадпрымальнікам, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць.

### Артыкул 258. Выніковая атэстацыя слухачоў, стажораў пры засваенні зместу адукацыйных праграм дадатковай адукацыі дарослых

1. Выніковую атэстацыю не праходзяць слухачы, якія засвойваюць змест адукацыйнай праграмы навучальных курсаў (лекторыяў, тэматычных семінараў, практыкумаў, трэнінгаў, афіцэрскіх курсаў і іншых відаў навучальных курсаў), адукацыйнай праграмы ўдасканалення магчымасцей і здольнасцей асобы, адукацыйнай праграмы рэпетыцыйнага тэсціравання, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўчымі актамі.

Неабходнасць правядзення выніковай атэстацыі слухачоў пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы курсаў мэтавага прызначэння вызначаецца ўстановай адукацыі, іншай арганізацыяй, індывідуальным прадпрымальнікам, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць.

2. Формы выніковай атэстацыі слухачоў, стажораў і парадак яе правядзення пры засваенні зместу адукацыйных праграм дадатковай адукацыі дарослых, акрамя адукацыйнай праграмы курсаў мэтавага прызначэння, адукацыйнай праграмы падрыхтоўкі вадзіцеляў механічных транспартных сродкаў, самаходных машын, адукацыйнай праграмы перападрыхтоўкі вадзіцеляў механічных транспартных сродкаў, самаходных машын, адукацыйнай праграмы павышэння кваліфікацыі вадзіцеляў механічных транспартных сродкаў, самаходных машын, адукацыйнай праграмы спецыяльнай падрыхтоўкі, неабходнай для займання асобных пасад служачых, вызначаюцца Правіламі правядзення атэстацыі слухачоў, стажораў пры засваенні зместу адукацыйных праграм дадатковай адукацыі дарослых.

Формы выніковай атэстацыі слухачоў і парадак яе правядзення пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы падрыхтоўкі вадзіцеляў механічных транспартных сродкаў, самаходных машын, адукацыйнай праграмы перападрыхтоўкі вадзіцеляў механічных транспартных сродкаў, самаходных машын, адукацыйнай праграмы павышэння кваліфікацыі вадзіцеляў механічных транспартных сродкаў, самаходных машын вызначаюцца заканадаўствам у сферы дарожнага руху і транспартнай дзейнасці.

Формы выніковай атэстацыі слухачоў і парадак яе правядзення пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы курсаў мэтавага прызначэння вызначаюцца ўстановай адукацыі, іншай арганізацыяй, індывідуальным прадпрымальнікам, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць.

Формы выніковай атэстацыі слухачоў і парадак яе правядзення пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы спецыяльнай падрыхтоўкі, неабходнай для займання асобных пасад служачых, вызначаюцца заканадаўчымі актамі, якімі прадугледжана праходжанне спецыяльнай падрыхтоўкі.

## ГЛАВА 56
## НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ ДАДАТКОВАЙ АДУКАЦЫІ ДАРОСЛЫХ

### Артыкул 259. Сістэма навукова-метадычнага забеспячэння дадатковай адукацыі дарослых

1. Навукова-метадычнае забеспячэнне дадатковай адукацыі дарослых уключае ў сябе:

1.1. вучэбна-праграмную дакументацыю адукацыйных праграм дадатковай адукацыі дарослых;

1.2. праграмна-планавальную дакументацыю выхавання;

1.3. вучэбна-метадычную дакументацыю;

1.4. вучэбныя і іншыя выданні;

1.5. інфармацыйна-аналітычныя матэрыялы;

1.6. метадычныя ўказанні па распрацоўцы вучэбна-праграмнай дакументацыі адукацыйных праграм дадатковай адукацыі дарослых.

2. Навукова-метадычнае забеспячэнне дадатковай адукацыі дарослых ажыццяўляюць:

2.1. арганізацыі, што ажыццяўляюць навукова-метадычнае забеспячэнне дадатковай адукацыі дарослых;

2.2. установы дадатковай адукацыі дарослых;

2.3. іншыя ўстановы адукацыі, што рэалізуюць адукацыйныя праграмы дадатковай адукацыі дарослых;

2.4. іншыя арганізацыі, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы дадатковай адукацыі дарослых;

2.5. індывідуальныя прадпрымальнікі, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы дадатковай адукацыі дарослых;

2.6. арганізацыі, якія накіроўваюць работнікаў для засваення зместу адукацыйных праграм дадатковай адукацыі дарослых;

2.7. вучэбна-метадычныя аб'яднанні ў сферы дадатковай адукацыі дарослых;

2.8. арганізацыі, якія ўдзельнічаюць у рэалізацыі адукацыйных праграм праз сеткавую форму ўзаемадзеяння;

2.9. дзяржаўныя органы, падпарадкаваныя і (або) падсправаздачныя Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь, рэспубліканскія органы дзяржаўнага кіравання, іншыя арганізацыі, падпарадкаваныя Ураду Рэспублікі Беларусь, мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы, іншыя арганізацыі і фізічныя асобы ў межах іх паўнамоцтваў у сферы дадатковай адукацыі дарослых.

**Артыкул 260. Вучэбна-праграмная дакументацыя адукацыйных праграм дадатковай адукацыі дарослых**

1. Вучэбна-праграмная дакументацыя адукацыйнай праграмы павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўчымі актамі, уключае ў сябе:

вучэбна-тэматычныя планы;

вучэбныя праграмы павышэння кваліфікацыі.

Вучэбна-тэматычны план устанаўлівае паслядоўнасць засваення зместу адукацыйнай праграмы павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, формы, віды і тэрміны правядзення вучэбных заняткаў, выніковай атэстацыі.

Вучэбная праграма павышэння кваліфікацыі вызначае мэты і задачы адукацыйнай праграмы павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, яе змест, час на вывучэнне асобных тэм, віды вучэбных заняткаў, асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці слухачоў, фарміруемыя кампетэнцыі.

Вучэбна-праграмная дакументацыя адукацыйнай праграмы павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў распрацоўваецца ўстановамі адукацыі, іншымі арганізацыямі, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, якія рэалізуюць адукацыйную праграму павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, і зацвярджаецца іх кіраўнікамі, калі іншае не ўстаноўлена актамі заканадаўства.

2. Вучэбна-праграмная дакументацыя адукацыйнай праграмы перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць вышэйшую адукацыю, адукацыйнай праграмы перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць сярэднюю спецыяльную адукацыю, уключае ў сябе:

прыкладныя вучэбныя планы па спецыяльнасцях перападрыхтоўкі;

вучэбныя планы па спецыяльнасцях перападрыхтоўкі;

эксперыментальныя вучэбныя планы па спецыяльнасцях перападрыхтоўкі;

вучэбныя праграмы па вучэбных дысцыплінах, модулях.

Вучэбныя планы ўключаюць дзяржаўны кампанент і кампанент установы адукацыі. Вучэбныя планы адлюстроўваюць прафілізацыю – варыянт рэалізацыі адпаведнай адукацыйнай праграмы перападрыхтоўкі па спецыяльнасці, абумоўлены асаблівасцямі прафесійнай дзейнасці спецыяліста. У найменне вучэбнага плана пры яго распрацоўцы можа ўключацца кароткае найменне прафілізацыі.

Патрабаванні да зместу і рэалізацыі кампанентаў вучэбнага плана, а таксама іх суадносіны адлюстроўваюцца ў адпаведных адукацыйных стандартах перападрыхтоўкі.

Прыкладны вучэбны план па спецыяльнасці перападрыхтоўкі распрацоўваецца на аснове адукацыйнага стандарту перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць вышэйшую адукацыю, кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць сярэднюю спецыяльную адукацыю, па адпаведнай спецыяльнасці.

Прыкладны вучэбны план па спецыяльнасці перападрыхтоўкі распрацоўваецца ў якасці прыкладу рэалізацыі адукацыйных стандартаў перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць вышэйшую адукацыю, кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць сярэднюю спецыяльную адукацыю, па форме (макеце) прыкладнага вучэбнага плана па спецыяльнасці перападрыхтоўкі, якая вызначаецца Міністэрствам адукацыі. Прыкладны вучэбны план па спецыяльнасці перападрыхтоўкі ўключае прыклад рэалізацыі дзяржаўнага кампанента ў адпаведнасці з адукацыйным стандартам па спецыяльнасці перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць вышэйшую адукацыю, кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць сярэднюю спецыяльную адукацыю, і прыклад рэалізацыі кампанента ўстановы адукацыі.

Прыкладны вучэбны план па спецыяльнасці перападрыхтоўкі ўстанаўлівае формы атрымання адукацыі, працягласць атрымання дадатковай адукацыі (у колькасці тыдняў аўдыторных заняткаў, самастойнай працы, прамежкавай і выніковай атэстацыі, пры неабходнасці – стажыроўкі і дыпломнага праектавання), пералік і аб'ём вучэбных дысцыплін, модуляў, абавязковых для вывучэння, з размеркаваннем колькасці вучэбных гадзін на аўдыторныя заняткі і самастойную працу і ўказаннем формы прамежкавай атэстацыі, колькасць вучэбных гадзін, якія адводзяцца на кампанент установы адукацыі, іншай арганізацыі, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, якая рэалізуе адукацыйную праграму перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць вышэйшую адукацыю, форму выніковай атэстацыі.

Прыкладныя вучэбныя планы па спецыяльнасцях перападрыхтоўкі распрацоўваюцца дзяржаўнымі органамі, падпарадкаванымі і (або) падсправаздачнымі Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь, рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання, іншымі арганізацыямі, падпарадкаванымі Ураду Рэспублікі Беларусь, акрамя органа, указанага ў частцы восьмай гэтага пункта, і (або) Міністэрствам адукацыі і зацвярджаюцца імі па ўзгадненні з іншымі зацікаўленымі рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання, іншымі арганізацыямі, падпарадкаванымі Ураду Рэспублікі Беларусь. Пералік дзяржаўных органаў, падпарадкаваных і (або) падсправаздачных Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь, рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, іншых арганізацый, падпарадкаваных Ураду Рэспублікі Беларусь, якія арганізуюць распрацоўку і зацвярджэнне прыкладных вучэбных планаў па спецыяльнасцях, а таксама спецыяльнасцей, па якіх яны арганізуюць распрацоўку і ажыццяўляюць зацвярджэнне прыкладных вучэбных планаў па спецыяльнасцях перападрыхтоўкі, устанаўліваецца Міністэрствам адукацыі па ўзгадненні з гэтымі органамі і арганізацыямі.

Прыкладныя вучэбныя планы па спецыяльнасцях перападрыхтоўкі для ўстаноў адукацыі, якія знаходзяцца ў падпарадкаванні органаў дзяржаўнай бяспекі, распрацоўваюцца і зацвярджаюцца Камітэтам дзяржаўнай бяспекі.

Вучэбны план па спецыяльнасці перападрыхтоўкі распрацоўваецца па пэўнай форме атрымання адукацыі на аснове адукацыйнага стандарту перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць вышэйшую адукацыю, кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць сярэднюю спецыяльную адукацыю, і прыкладнага вучэбнага

плана па адпаведнай спецыяльнасці перападрыхтоўкі і ўключае структуру адукацыйнага працэсу з размеркаваннем аўдыторных заняткаў, самастойнай працы, прамежкавай атэстацыі, стажыроўкі, дыпломнага праектавання і графік адукацыйнага працэсу, які адлюстроўвае формы прамежкавай атэстацыі па вучэбных дысцыплінах, модулях (з указаннем яе формаў), размеркаванне вучэбных гадзін па відах вучэбных заняткаў (з указаннем іх відаў) і этапах навучання ў межах кожнага навучальнага года, устанаўлівае форму (формы) выніковай атэстацыі і агульную колькасць формаў прамежкавай атэстацыі па этапах навучання ў межах кожнага навучальнага года.

Вучэбныя планы па спецыяльнасцях перападрыхтоўкі распрацоўваюцца ўстановамі адукацыі, іншымі арганізацыямі, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, якія рэалізуюць адукацыйную праграму перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць вышэйшую адукацыю, і зацвярджаюцца іх кіраўнікамі.

Эксперыментальны вучэбны план па спецыяльнасці перападрыхтоўкі апрабуецца ва ўстанове адукацыі, на базе якой ажыццяўляецца эксперыментальная дзейнасць.

Эксперыментальныя вучэбныя планы па спецыяльнасцях перападрыхтоўкі распрацоўваюцца ўстановамі адукацыі, на базе якіх ажыццяўляецца эксперыментальная дзейнасць, і зацвярджаюцца Міністэрствам адукацыі па ўзгадненні з зацікаўленымі дзяржаўнымі органамі, падпарадкаванымі і (або) падсправаздачнымі Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі, рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання, іншымі арганізацыямі, падпарадкаванымі Ураду Рэспублікі Беларусь, у падпарадкаванні якіх знаходзяцца ўстановы адукацыі і (або) для якіх ажыццяўляецца перападрыхтоўка кадраў, акрамя эксперыментальных вучэбных планаў устаноў адукацыі па спецыяльнасцях перападрыхтоўкі напрамкаў адукацыі «Ахова здароўя» і «Сельская гаспадарка». Эксперыментальныя вучэбныя планы па спецыяльнасцях перападрыхтоўкі напрамку адукацыі «Ахова здароўя» зацвярджаюцца Міністэрствам аховы здароўя і Міністэрствам адукацыі. Эксперыментальныя вучэбныя планы па спецыяльнасцях перападрыхтоўкі напрамку адукацыі «Сельская гаспадарка» зацвярджаюцца Міністэрствам сельскай гаспадаркі і харчавання і Міністэрствам адукацыі.

Эксперыментальныя вучэбныя планы па спецыяльнасцях перападрыхтоўкі могуць распрацоўвацца для кожнай формы атрымання адукацыі.

Вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне, модулі распрацоўваецца ўстановай адукацыі, іншай арганізацыяй, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, якая рэалізуе адукацыйную праграму перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць вышэйшую адукацыю, і вызначае мэты, задачы і змест вучэбнай дысцыпліны, модуля, час на вывучэнне асобных тэм, асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці слухачоў, рэкамендаваныя віды вучэбных заняткаў, метады навучання, пералік неабходных вучэбных выданняў і сродкаў навучання і зацвярджаецца кіраўніком установы адукацыі, іншай арганізацыі, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць.

3. Вучэбна-праграмная дакументацыя адукацыйнай праграмы стажыроўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў уключае ў сябе вучэбныя праграмы стажыроўкі.

Вучэбная праграма стажыроўкі вызначае мэты, задачы і змест адукацыйнай праграмы стажыроўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, тэрміны яе рэалізацыі, асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці стажораў, фарміруемыя кампетэнцыі.

Вучэбныя праграмы стажыроўкі распрацоўваюцца арганізацыямі, якія накіроўваюць работнікаў для засваення зместу адукацыйнай праграмы стажыроўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, і зацвярджаюцца іх кіраўнікамі па ўзгадненні з кіраўнікамі арганізацый, у якіх рэалізуецца адукацыйная праграма стажыроўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў.

4. Вучэбна-праграмная дакументацыя адукацыйнай праграмы павышэння кваліфікацыі рабочых (служачых) уключае ў сябе:

вучэбныя планы павышэння кваліфікацыі рабочых (служачых) устаноў адукацыі, іншых арганізацый, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, якія рэалізуюць адукацыйную праграму павышэння кваліфікацыі рабочых (служачых);

вучэбныя праграмы па вучэбных дысцыплінах, модулях устаноў адукацыі, іншых арганізацый, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, якія рэалізуюць адукацыйную праграму павышэння кваліфікацыі рабочых (служачых).

Вучэбны план павышэння кваліфікацыі рабочых (служачых) установы адукацыі, іншай арганізацыі, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, якія рэалізуе адукацыйную праграму павышэння кваліфікацыі рабочых (служачых), распрацоўваецца на аснове тарыфна-кваліфікацыйных характарыстык адпаведных прафесій рабочых, кваліфікацыйных характарыстык пасад служачых, акрамя кіраўнікоў і спецыялістаў, і ўстанаўлівае пералік, аб’ём і паслядоўнасць вывучэння вучэбных дысцыплін, модуляў, віды вучэбных заняткаў, формы і тэрміны атэстацыі слухачоў.

Вучэбныя планы павышэння кваліфікацыі рабочых (служачых) устаноў адукацыі, іншых арганізацый, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, якія рэалізуюць адукацыйную праграму павышэння кваліфікацыі рабочых (служачых), распрацоўваюцца гэтымі ўстановамі адукацыі, іншымі арганізацыямі, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, і зацвярджаюцца іх кіраўнікамі.

Вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне, модулі ўстановы адукацыі, іншай арганізацыі, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, якая рэалізуе адукацыйную праграму павышэння кваліфікацыі рабочых (служачых), вызначае мэты і задачы вывучэння вучэбнай дысцыпліны, модуля, яе змест, час на вывучэнне асобных тэм, асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці слухачоў, рэкамендаваныя формы і метады навучання, пералік неабходных вучэбных выданняў і сродкаў навучання.

5. Вучэбна-праграмная дакументацыя адукацыйнай праграмы перападрыхтоўкі рабочых (служачых) уключае ў сябе:

прыкладныя вучэбныя планы перападрыхтоўкі рабочых (служачых);

вучэбныя планы перападрыхтоўкі рабочых (служачых) па прафесіях рабочых, пасадах служачых, акрамя кіраўнікоў і спецыялістаў, устаноў адукацыі, іншых арганізацый, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, якія рэалізуюць адукацыйную праграму перападрыхтоўкі рабочых (служачых);

вучэбныя праграмы ўстаноў адукацыі, іншых арганізацый, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, якія рэалізуюць адукацыйную праграму перападрыхтоўкі рабочых (служачых), па вучэбных дысцыплінах, модулях.

Прыкладны вучэбны план перападрыхтоўкі рабочых (служачых) распрацоўваецца для груп прафесій з адным тэрмінам атрымання дадатковай адукацыі і ўстанаўлівае пералік кампанентаў, адукацыйных галін, абавязковых для вывучэння, колькасць вучэбных гадзін на іх вывучэнне.

Распрацоўку прыкладных вучэбных планаў перападрыхтоўкі рабочых (служачых) арганізуе Міністэрства адукацыі і ажыццяўляе яе сумесна з арганізацыямі, што ажыццяўляюць навукова-метадычнае забеспячэнне дадатковай адукацыі дарослых.

Прыкладныя вучэбныя планы перападрыхтоўкі рабочых (служачых) зацвярджаюцца Міністэрствам адукацыі па ўзгадненні з зацікаўленымі дзяржаўнымі органамі, падпарадкаванымі і (або) падсправаздачнымі Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь, рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання, іншымі арганізацыямі, падпарадкаванымі Ураду Рэспублікі Беларусь.

Вучэбны план перападрыхтоўкі рабочых (служачых) установы адукацыі, іншай арганізацыі, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, якая рэалізуе адукацыйную праграму перападрыхтоўкі рабочых (служачых), распрацоўваецца на аснове прыкладнага вучэбнага плана перападрыхтоўкі рабочых (служачых), тарыфна-кваліфікацыйных характарыстык па прафесіях рабочых, кваліфікацыйных характарыстык па пасадах служачых, акрамя кіраўнікоў і спецыялістаў, і ўстанаўлівае пералік, аб’ём і паслядоўнасць вывучэння вучэбных дысцыплін, модуляў, віды вучэбных заняткаў, формы і тэрміны атэстацыі слухачоў.

Вучэбныя планы перападрыхтоўкі рабочых (служачых) устаноў адукацыі, іншых арганізацый, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, якія рэалізуюць адукацыйную праграму перападрыхтоўкі рабочых (служачых), распрацоўваюцца гэтымі ўстановамі адукацыі, іншымі арганізацыямі, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, і зацвярджаюцца іх кіраўнікамі.

Вучэбная праграма ўстановы адукацыі, іншай арганізацыі, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, якая рэалізуе адукацыйную праграму перападрыхтоўкі рабочых (служачых), па вучэбнай дысцыпліне, модулі вызначае мэты і задачы вывучэння вучэбнай дысцыпліны, модуля, яе змест, час на вывучэнне асобных тэм, асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці слухачоў, рэкамендаваныя формы і метады навучання, пералік неабходных вучэбных выданняў і сродкаў навучання.

Вучэбныя праграмы ўстаноў адукацыі, іншых арганізацый, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, якія рэалізуюць адукацыйную праграму перападрыхтоўкі рабочых (служачых), па вучэбных дысцыплінах, модулях распрацоўваюцца гэтымі ўстановамі адукацыі, іншымі арганізацыямі, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, і зацвярджаюцца іх кіраўнікамі.

6. Вучэбна-праграмная дакументацыя адукацыйнай праграмы прафесійнай падрыхтоўкі рабочых (служачых) уключае ў сябе:

прыкладныя вучэбныя планы прафесійнай падрыхтоўкі рабочых (служачых);

вучэбныя планы ўстаноў адукацыі, іншых арганізацый, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, якія рэалізуюць адукацыйную праграму прафесійнай падрыхтоўкі рабочых (служачых);

вучэбныя праграмы ўстаноў адукацыі, іншых арганізацый, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, якія рэалізуюць адукацыйную праграму прафесійнай падрыхтоўкі рабочых (служачых), па вучэбных дысцыплінах, модулях.

Прыкладны вучэбны план прафесійнай падрыхтоўкі рабочых (служачых) распрацоўваецца для груп прафесій рабочых з адным тэрмінам атрымання дадатковай адукацыі і ўстанаўлівае пералік кампанентаў, адукацыйных галін, абавязковых для вывучэння, колькасць вучэбных гадзін на іх вывучэнне.

Распрацоўку прыкладных вучэбных планаў прафесійнай падрыхтоўкі рабочых (служачых) арганізуе Міністэрства адукацыі і ажыццяўляе яе сумесна з арганізацыямі, што ажыццяўляюць навукова-метадычнае забеспячэнне дадатковай адукацыі дарослых.

Прыкладныя вучэбныя планы прафесійнай падрыхтоўкі рабочых (служачых) зацвярджаюцца Міністэрствам адукацыі па ўзгадненні з зацікаўленымі дзяржаўнымі органамі, падпарадкаванымі і (або) падсправаздачнымі Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь, рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання, іншымі арганізацыямі, падпарадкаванымі Ураду Рэспублікі Беларусь.

Вучэбны план установы адукацыі, іншай арганізацыі, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, якая рэалізуе адукацыйную праграму прафесійнай падрыхтоўкі рабочых (служачых), распрацоўваецца на аснове прыкладнага вучэбнага плана прафесійнай падрыхтоўкі рабочых (служачых), тарыфна-кваліфікацыйнай характарыстыкі па прафесіі рабочага, кваліфікацыйнай характарыстыкі па пасадзе служачага, акрамя кіраўніка і спецыяліста, і ўстанаўлівае пералік, аб’ём і паслядоўнасць вывучэння вучэбных дысцыплін, модуляў, віды вучэбных заняткаў, формы і тэрміны атэстацыі слухачоў.

Вучэбныя планы ўстаноў адукацыі, іншых арганізацый, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, якія рэалізуюць адукацыйную праграму прафесійнай падрыхтоўкі рабочых (служачых), распрацоўваюцца гэтымі ўстановамі адукацыі, іншымі арганізацыямі, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, і зацвярджаюцца іх кіраўнікамі.

Вучэбная праграма ўстановы адукацыі, іншай арганізацыі, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, якая рэалізуе адукацыйную праграму прафесійнай падрыхтоўкі рабочых (служачых), па вучэбнай дысцыпліне, модулі вызначае мэты і задачы вывучэння вучэбнай дысцыпліны, модуля, яе змест, час на вывучэнне асобных тэм, асноўныя

патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці слухачоў, рэкамендаваныя формы і метады навучання, пералік неабходных вучэбных выданняў і сродкаў навучання.

Вучэбныя праграмы ўстаноў адукацыі, іншых арганізацый, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, якія рэалізуюць адукацыйную праграму прафесійнай падрыхтоўкі рабочых (служачых), па вучэбных дысцыплінах распрацоўваюцца гэтымі ўстановамі адукацыі, іншымі арганізацыямі, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, і зацвярджаюцца іх кіраўнікамі.

7. Пералік вучэбна-праграмнай дакументацыі адукацыйнай праграмы падрыхтоўкі вадзіцеляў механічных транспартных сродкаў, самаходных машын, адукацыйнай праграмы перападрыхтоўкі вадзіцеляў механічных транспартных сродкаў, самаходных машын, адукацыйнай праграмы павышэння кваліфікацыі вадзіцеляў механічных транспартных сродкаў, самаходных машын, парадак яе распрацоўкі і зацвярджэння вызначаюцца заканадаўствам у сферы дарожнага руху і транспартнай дзейнасці.

8. Вучэбна-праграмная дакументацыя навучальных курсаў (лекторыяў, тэматычных семінараў, практыкумаў, трэнінгаў, афіцэрскіх курсаў і іншых відаў навучальных курсаў) уключае ў сябе вучэбныя праграмы навучальных курсаў (лекторыяў, тэматычных семінараў, практыкумаў, трэнінгаў, афіцэрскіх курсаў і іншых відаў навучальных курсаў), калі іншае не ўстаноўлена заканадаўчымі актамі.

Вучэбная праграма навучальных курсаў (лекторыяў, тэматычных семінараў, практыкумаў, трэнінгаў, афіцэрскіх курсаў і іншых відаў навучальных курсаў) вызначае мэты, задачы і змест адукацыйнай праграмы навучальных курсаў (лекторыяў, тэматычных семінараў, практыкумаў, трэнінгаў, афіцэрскіх курсаў і іншых відаў навучальных курсаў), тэрміны яе рэалізацыі.

Вучэбныя праграмы навучальных курсаў (лекторыяў, тэматычных семінараў, практыкумаў, трэнінгаў, афіцэрскіх курсаў і іншых відаў навучальных курсаў) распрацоўваюцца ўстановамі адукацыі, іншымі арганізацыямі, індывідуальнымі прадпрымальнікамі, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, якія рэалізуюць адукацыйную праграму навучальных курсаў (лекторыяў, тэматычных семінараў, практыкумаў, трэнінгаў, афіцэрскіх курсаў і іншых відаў навучальных курсаў), і зацвярджаюцца іх кіраўнікамі, індывідуальнымі прадпрымальнікамі, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўчымі актамі.

9. Вучэбна-праграмная дакументацыя адукацыйнай праграмы падрыхтоўкі асоб да паступлення ва ўстановы адукацыі Рэспублікі Беларусь уключае ў сябе:

вучэбныя планы ўстаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйную праграму падрыхтоўкі асоб да паступлення ва ўстановы адукацыі Рэспублікі Беларусь;

вучэбныя праграмы ўстаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйную праграму падрыхтоўкі асоб да паступлення ва ўстановы адукацыі Рэспублікі Беларусь, па вучэбных дысцыплінах.

Вучэбны план установы адукацыі, якая рэалізуе адукацыйную праграму падрыхтоўкі асоб да паступлення ва ўстановы адукацыі Рэспублікі Беларусь, устанаўлівае пералік і аб'ём вучэбных дысцыплін, паслядоўнасць і тэрміны іх вывучэння, віды вучэбных заняткаў, формы і тэрміны атэстацыі слухачоў.

Вучэбная праграма ўстановы адукацыі, якая рэалізуе адукацыйную праграму падрыхтоўкі асоб да паступлення ва ўстановы адукацыі Рэспублікі Беларусь, па вучэбнай дысцыпліне вызначае мэты і задачы вывучэння навучальнай дысцыпліны, яе змест, час на вывучэнне асобных тэм, асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці слухачоў, рэкамендаваныя формы і метады навучання, пералік неабходных вучэбных выданняў і сродкаў навучання.

Вучэбна-праграмная дакументацыя адукацыйнай праграмы падрыхтоўкі асоб да паступлення ва ўстановы адукацыі Рэспублікі Беларусь распрацоўваецца ўстановамі адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйную праграму падрыхтоўкі асоб да паступлення ва ўстановы адукацыі Рэспублікі Беларусь, і зацвярджаецца іх кіраўнікамі.

10. Вучэбна-праграмная дакументацыя адукацыйнай праграмы рэпетыцыйнага тэсціравання ўключае ў сябе вучэбныя планы і вучэбныя праграмы.

Вучэбны план устанаўлівае пералік і аб’ём вучэбных дысцыплін, віды вучэбных заняткаў.

Вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне вызначае мэты і задачы вывучэння навучальнай дысцыпліны, яе змест, асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці слухачоў, пералік неабходных вучэбных выданняў.

Вучэбна-праграмная дакументацыя адукацыйнай праграмы рэпетыцыйнага тэсціравання распрацоўваецца інстытутамі кантролю ведаў і зацвярджаецца іх кіраўнікамі.

11. Пералік вучэбна-праграмнай дакументацыі адукацыйнай праграмы спецыяльнай падрыхтоўкі, неабходнай для займання асобных пасад служачых, парадак яе распрацоўкі і зацвярджэння вызначаюцца заканадаўчымі актамі, якімі прадугледжана праходжанне спецыяльнай падрыхтоўкі.

12. Пералікі вучэбна-праграмнай дакументацыі адукацыйнай праграмы курсаў мэтавага прызначэння і адукацыйнай праграмы ўдасканалення магчымасцей і здольнасцей асобы вызначаюцца ўстановамі адукацыі, іншымі арганізацыямі, індывідуальнымі прадпрымальнікамі, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, якія рэалізуюць адукацыйную праграму курсаў мэтавага прызначэння, адукацыйную праграму ўдасканалення магчымасцей і здольнасцей асобы, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўчымі актамі.

Вучэбна-праграмная дакументацыя адукацыйнай праграмы курсаў мэтавага прызначэння, адукацыйнай праграмы ўдасканалення магчымасцей і здольнасцей асобы распрацоўваецца ўстановамі адукацыі, іншымі арганізацыямі, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, індывідуальнымі прадпрымальнікамі, якія рэалізуюць адукацыйную праграму курсаў мэтавага прызначэння, адукацыйную праграму ўдасканалення магчымасцей і здольнасцей асобы, і зацвярджаецца іх кіраўнікамі, індывідуальнымі прадпрымальнікамі, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўчымі актамі.

13. Агульныя патрабаванні да вучэбна-праграмнай дакументацыі, на падставе якой ажыццяўляюцца павышэнне кваліфікацыі і перападрыхтоўка кіруючых работнікаў і спецыялістаў, рабочых (служачых), прафесійная падрыхтоўка рабочых (служачых), парадак яе распрацоўкі і прымянення ўстанаўліваюцца Правіламі распрацоўкі і прымянення вучэбна-праграмнай дакументацыі адукацыйных праграм дадатковай адукацыі дарослых, зацверджанымі Міністэрствам адукацыі.

**Артыкул 261. Вучэбна-метадычныя аб’яднанні ў сферы дадатковай адукацыі дарослых**

1. Для ўдасканалення навукова-метадычнага забеспячэння дадатковай адукацыі дарослых Міністэрствам адукацыі на базе ўстаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы дадатковай адукацыі дарослых, могуць ствараюцца вучэбна-метадычныя аб’яднанні ў сферы дадатковай адукацыі дарослых.

2. Вучэбна-метадычныя аб’яднанні ў сферы дадатковай адукацыі дарослых ствараюцца па групах спецыяльнасцей.

3. У склад вучэбна-метадычных аб’яднанняў у сферы дадатковай адукацыі дарослых могуць уваходзіць педагагічныя работнікі, навуковыя работнікі ўстаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы дадатковай адукацыі дарослых і акрэдытаваны на адпаведнасць заяўленаму віду ўстановы адукацыі, прадстаўнікі дзяржаўных органаў і іншых арганізацый.

4. Асноўнымі функцыямі вучэбна-метадычных аб’яднанняў у сферы дадатковай адукацыі дарослых з’яўляюцца:

4.1. удзел у распрацоўцы і ўдасканаленні адукацыйных стандартаў перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў;

4.2. удзел у распрацоўцы, экспертызе і ўдасканаленні вучэбна-праграмнай дакументацыі адукацыйных праграм дадатковай адукацыі дарослых;

4.3. узгадненне рукапісаў падручнікаў, вучэбных і вучэбна-метадычных дапаможнікаў.

5. Рашэнні вучэбна-метадычных аб'яднанняў у сферы дадатковай адукацыі дарослых носяць рэкамендацыйны характар.

6. Палажэнне аб вучэбна-метадычным аб'яднанні ў сферы дадатковай адукацыі дарослых зацвярджаецца Міністэрствам адукацыі.

## РАЗДЗЕЛ XVI
## СПЕЦЫЯЛЬНАЯ АДУКАЦЫЯ

### ГЛАВА 57
### СІСТЭМА СПЕЦЫЯЛЬНАЙ АДУКАЦЫІ

**Артыкул 262. Сістэма спецыяльнай адукацыі**

1. Спецыяльная адукацыя накіравана на падрыхтоўку асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця да працоўнай дзейнасці, сямейнага жыцця, іх сацыялізацыю і інтэграцыю ў грамадства, фарміраванне неабходных ім у самастойным жыцці кампетэнцый.

2. Сістэма спецыяльнай адукацыі ўключае ў сябе:

2.1. удзельнікаў адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адукацыйных праграм спецыяльнай адукацыі;

2.2. адукацыйныя праграмы спецыяльнай адукацыі;

2.3. установы спецыяльнай адукацыі;

2.4. іншыя ўстановы адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы спецыяльнай адукацыі;

2.5. іншыя арганізацыі, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы спецыяльнай адукацыі;

2.6. вучэбна-метадычныя аб'яднанні ў сферы спецыяльнай адукацыі;

2.7. арганізацыі, якія ўдзельнічаюць у рэалізацыі адукацыйных праграм спецыяльнай адукацыі праз сеткавую форму ўзаемадзеяння;

2.8. індывідуальных прадпрымальнікаў, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы спецыяльнай адукацыі;

2.9. дзяржаўныя арганізацыі адукацыі, якія забяспечваюць функцыянаванне сістэмы адукацыі;

2.10. рэспубліканскія органы дзяржаўнага кіравання, іншыя арганізацыі, падпарадкаваныя Ураду Рэспублікі Беларусь, мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы, іншыя арганізацыі ў межах іх паўнамоцтваў у сферы спецыяльнай адукацыі.

**Артыкул 263. Адукацыйныя праграмы спецыяльнай адукацыі**

1. Адукацыйныя праграмы спецыяльнай адукацыі падраздзяляюцца на:

1.1. адукацыйную праграму спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі;

1.2. адукацыйную праграму спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі;

1.3. адукацыйную праграму спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю;

1.4. адукацыйную праграму спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю.

2. Адукацыйныя праграмы спецыяльнай адукацыі распрацоўваюцца на аснове адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі і адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі.

3. Адукацыйныя праграмы спецыяльнай адукацыі рэалізуюцца ў вочнай і завочнай формах атрымання адукацыі. Атрыманне адукацыі ў вячэрняй і завочнай формах атрымання адукацыі дапускаецца толькі ў вячэрніх класах у спецыяльнай школе, спецыяльнай школе-інтэрнаце.

4. Адукацыйныя праграмы спецыяльнай адукацыі рэалізуюцца ва ўстановах спецыяльнай адукацыі, а таксама могуць рэалізоўвацца ва ўстановах дашкольнай адукацыі, установах агульнай сярэдняй адукацыі, універсітэтах, акадэміях (кансерваторыях), дзіцячых дамах, спецыяльных навучальна-выхаваўчых установах, спецыяльных лячэбна-выхаваўчых установах, адукацыйна-аздараўленчых цэнтрах, іншых арганізацыях, індывідуальнымі прадпрымальнікамі, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць. Віды адукацыйных праграм спецыяльнай адукацыі, што рэалізуюцца ва ўказаных установах адукацыі, іншых арганізацыях, у індывідуальных прадпрымальнікаў, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, вызначаюцца гэтым Кодэксам.

**Артыкул 264. Адукацыйныя стандарты спецыяльнай адукацыі**

1. Адукацыйныя стандарты спецыяльнай адукацыі ўключаюць:

1.1. адукацыйны стандарт спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі;

1.2. адукацыйны стандарт спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі;

1.3. адукацыйны стандарт спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю;

1.4. адукацыйны стандарт спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю.

2. Адукацыйныя стандарты спецыяльнай адукацыі, акрамя адукацыйнага стандарту на ўзроўні дашкольнай адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю, устанаўліваюць патрабаванні да вынікаў засваення зместу адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі, адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі, адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю, да зместу вучэбна-праграмнай дакументацыі адпаведнай адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі, арганізацыі адукацыйнага працэсу, максімальнага допушчальнага аб'ёму вучэбнай нагрузкі выхаванцаў, якія навучаюцца, абавязковай колькасці вучэбных гадзін на правядзенне карэкцыйных заняткаў. Патрабаванні да вынікаў засваення зместу адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі, адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі, адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю ўключаюць фарміруемыя кампетэнцыі навучэнцаў.

Адукацыйны стандарт спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю ўстанаўлівае патрабаванні да зместу вучэбна-праграмнай дакументацыі адпаведнай адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі, арганізацыі адукацыйнага працэсу, максімальнага допушчальнага аб'ёму вучэбнай нагрузкі выхаванцаў, абавязковай колькасці вучэбных гадзін на правядзенне карэкцыйных заняткаў.

3. Распрацоўку адукацыйных стандартаў спецыяльнай адукацыі арганізуе Міністэрства адукацыі і ажыццяўляе яе сумесна з арганізацыямі, што ажыццяўляюць вучэбна-метадычнае забеспячэнне спецыяльнай адукацыі.

4. Адукацыйныя стандарты спецыяльнай адукацыі зацвярджаюцца Міністэрствам адукацыі.

### Артыкул 265. Тэрмін атрымання адукацыі асобамі, якія засвойваюць змест адукацыйных праграм спецыяльнай адукацыі

1. Тэрмін атрымання адукацыі асобай, якая засвойвае змест адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі, адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю, адпавядае тэрміну атрымання дашкольнай адукацыі і на падставе заключэння дзяржаўнага цэнтра карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі можа быць павялічаны на тэрмін ад аднаго года да двух гадоў.

2. Тэрмін атрымання адукацыі асобай, якая засвойвае змест адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі, залежыць ад магчымасці засваення яе зместу, а таксама ад структуры і ступені цяжару парушэнняў у фізічным і (або) псіхічным развіцці такой асобы і складае для атрымання:

2.1. пачатковай адукацыі – ад чатырох да пяці гадоў;

2.2. агульнай базавай адукацыі – ад дзевяці да дзесяці гадоў;

2.3. агульнай сярэдняй адукацыі – ад адзінаццаці да дванаццаці гадоў;

2.4. агульнай сярэдняй адукацыі ў вячэрніх класах у спецыяльнай школе, спецыяльнай школе-інтэрнаце – ад дванаццаці да трынаццаці гадоў.

3. Тэрміны навучання і выхавання асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця на ступенях агульнай сярэдняй адукацыі складаюць:

3.1. на I ступені – ад чатырох да пяці гадоў;

3.2. на II ступені – пяць гадоў;

3.3. на III ступені – два гады (у вячэрніх класах у спецыяльнай школе, спецыяльнай школе-інтэрнаце – тры гады).

4. Тэрмін атрымання адукацыі асобай, якая засвойвае змест адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю, залежыць ад яе пазнавальных магчымасцей і складае:

4.1. у першым аддзяленні спецыяльнай школы, спецыяльнай школы-інтэрната для навучэнцаў з інтэлектуальнай недастатковасцю – ад дзесяці да дванаццаці гадоў;

4.2. у другім аддзяленні спецыяльнай школы, спецыяльнай школы-інтэрната для навучэнцаў з інтэлектуальнай недастатковасцю, у цэнтры карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі – дзесяць гадоў.

## ГЛАВА 58
## УСТАНОВЫ АДУКАЦЫІ, ІНШЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ, ІНДЫВІДУАЛЬНЫЯ ПРАДПРЫМАЛЬНІКІ, ШТО АЖЫЦЦЯЎЛЯЮЦЬ АДУКАЦЫЙНУЮ ДЗЕЙНАСЦЬ, ЯКІЯ РЭАЛІЗУЮЦЬ АДУКАЦЫЙНЫЯ ПРАГРАМЫ СПЕЦЫЯЛЬНАЙ АДУКАЦЫІ

### Артыкул 266. Установы адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы спецыяльнай адукацыі

Да ўстаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы спецыяльнай адукацыі, адносяцца:

установы спецыяльнай адукацыі;

іншыя ўстановы адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы спецыяльнай адукацыі.

### Артыкул 267. Установы спецыяльнай адукацыі

1. Установа спецыяльнай адукацыі – установа адукацыі, якая рэалізуе адну або некалькі адукацыйных праграм спецыяльнай адукацыі і можа рэалізоўваць адукацыйную праграму дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, праграму выхавання дзяцей, што маюць

патрэбу ў аздараўленні, адукацыйную праграму прафесійнай падрыхтоўкі рабочых (служачых).

2. Установы спецыяльнай адукацыі могуць быць наступных відаў:

2.1. спецыяльны дзіцячы сад;

2.2. спецыяльная школа, спецыяльная школа-інтэрнат;

2.3. цэнтр карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі;

2.4. іншыя ўстановы спецыяльнай адукацыі.

3. Установы спецыяльнай адукацыі, акрамя спецыяльнага дзіцячага сада, у залежнасці ад структуры і ступені цяжару парушэнняў у фізічным і (або) псіхічным развіцці асоб ствараюцца для навучэнцаў:

3.1. з інтэлектуальнай недастатковасцю;

3.2. з цяжкімі парушэннямі маўлення;

3.3. з парушэннем слыху;

3.4. з парушэннямі зроку;

3.5. з цяжкасцямі ў навучанні;

3.6. з парушэннямі функцый апорна-рухальнага апарату;

3.7. з цяжкімі, шматлікімі парушэннямі ў фізічным і (або) псіхічным развіцці;

3.8. з расстройствамі аўтыстычнага спектра. Расстройствы аўтыстычнага спектра – розныя па ступені праяўлення парушэнні паводзін, камунікацыі і сацыяльнага ўзаемадзеяння.

**Артыкул 268. Спецыяльны дзіцячы сад**

1. Спецыяльны дзіцячы сад – установа спецыяльнай адукацыі для асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця ранняга і дашкольнага ўзросту, у якой рэалізуюцца адукацыйная праграма спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі, адукацыйная праграма спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю, а таксама можа рэалізоўвацца адукацыйная праграма дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі.

2. У спецыяльных дзіцячых садах групы адкрываюцца ў залежнасці ад структуры і ступені цяжару парушэнняў у фізічным і (або) псіхічным развіцці асоб і іх узросту для навучэнцаў:

2.1. з інтэлектуальнай недастатковасцю;

2.2. з цяжкімі парушэннямі маўлення;

2.3. з парушэннем слыху;

2.4. з парушэннямі зроку;

2.5. з цяжкасцямі ў навучанні;

2.6. з парушэннямі функцый апорна-рухальнага апарату;

2.7. з расстройствамі аўтыстычнага спектра.

3. У спецыяльных дзіцячых садах выхаванцам з інтэлектуальнай недастатковасцю, парушэннем слыху, кампенсаваным кахлеарным імплантам, парушэннямі зроку, цяжкасцямі ў навучанні, парушэннямі функцый апорна-рухальнага апарату, тым, у каго ёсць парушэнні маўлення, аказваецца лагапедычная дапамога. Парадак аказання лагапедычнай дапамогі вызначаецца Міністэрствам адукацыі.

4. У спецыяльным дзіцячым садзе могуць ствараецца рэсурсныя цэнтры, іншыя структурныя падраздзяленні.

**Артыкул 269. Спецыяльная школа, спецыяльная школа-інтэрнат**

1. Спецыяльная школа, спецыяльная школа-інтэрнат – установы спецыяльнай адукацыі, у якіх рэалізуюцца адукацыйная праграма спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі, адукацыйная праграма спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю, ствараюцца

ўмовы для гарманічнага развіцця і сацыялізацыі навучэнцаў, а таксама могуць рэалізоўвацца адукацыйная праграма спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі, адукацыйная праграма спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю, адукацыйная праграма дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, праграма выхавання дзяцей, што маюць патрэбу ў аздараўленні, адукацыйная праграма прафесійнай падрыхтоўкі рабочых (служачых). У спецыяльнай школе-інтэрнаце ствараюцца ўмовы для пражывання і харчавання навучэнцаў, ажыццяўляецца постынтэрнатнае суправаджэнне выпускнікоў з ліку дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекавання бацькоў, асоб з ліку дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекавання бацькоў.

2. У спецыяльных школах для аказання дапамогі сям'і ў навучанні і выхаванні навучэнцаў, стварэння ўмоў для развіцця іх творчых здольнасцей могуць адкрывацца групы прадоўжанага дня для навучэнцаў I–IX (X) класаў, палажэнне аб якіх зацвярджаецца Міністэрствам адукацыі.

3. У спецыяльных школах, спецыяльных школах-інтэрнатах навучэнцам з інтэлектуальнай недастатковасцю, парушэннем слыху, кампенсаваным кахлеарным імплантам, парушэннямі зроку, цяжкасцямі ў навучанні, парушэннямі функцый апорна-рухальнага апарату, тым, у каго ёсць парушэнні маўлення, аказваецца лагапедычная дапамога. Парадак аказання лагапедычнай дапамогі вызначаецца Міністэрствам адукацыі.

4. У спецыяльнай школе, спецыяльнай школе-інтэрнаце для навучэнцаў з парушэннем слыху ствараецца кабінет слыхавой працы.

5. У спецыяльнай школе, спецыяльнай школе-інтэрнаце для навучэнцаў з цяжкімі парушэннямі маўлення могуць адкрывацца класы для навучэнцаў з цяжкасцямі ў навучанні. У спецыяльнай школе, спецыяльнай школе-інтэрнаце для навучэнцаў з цяжкасцямі ў навучанні могуць адкрывацца класы для навучэнцаў з цяжкімі парушэннямі маўлення.

6. У спецыяльнай школе, спецыяльнай школе-інтэрнаце могуць адкрывацца класы для навучэнцаў з расстройствамі аўтыстычнага спектра.

7. У спецыяльнай школе, спецыяльнай школе-інтэрнаце могуць стварацца структурныя падраздзяленні: навучальна-вытворчая майстэрня, навучальна-доследная гаспадарка, рэсурсны цэнтр, іншыя структурныя падраздзяленні.

### Артыкул 270. Цэнтр карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі

1. Цэнтр карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі – установа спецыяльнай адукацыі, у якой арганізуецца аказанне ранняй комплекснай дапамогі дзецям ва ўзросце да трох гадоў, карэкцыйна-педагагічнай дапамогі, рэалізуюцца адукацыйная праграма спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю, адукацыйная праграма спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю, забяспечваюцца меры па іх сацыялізацыі і інтэграцыі ў грамадства, авалоданні жыццёвымі кампетэнцыямі, а таксама могуць рэалізоўвацца адукацыйная праграма дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, праграма выхавання дзяцей, што маюць патрэбу ў аздараўленні.

Цэнтр карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі забяспечвае стварэнне комплекснай сістэмы псіхолага-медыка-педагагічнай дапамогі асобам з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця і ажыццяўляе адукацыйную, у тым ліку ў рамках аказання ранняй комплекснай дапамогі дзецям ва ўзросце да трох гадоў, карэкцыйна-педагагічную, сацыяльную, метадычную, кансультацыйную і інфармацыйна-аналітычную дзейнасць, аказанне псіхалагічнай дапамогі.

Ранняя комплексная дапамога – сістэма мер, якая ўключае выяўленне дзяцей з парушэннямі развіцця і рызыкай іх з'яўлення, абследаванне, рэабілітацыю, карэкцыю парушэнняў у фізічным і (або) псіхічным развіцці, індывідуалізаванае навучанне дзіцяці

з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця ва ўзросце да трох гадоў з псіхолага-педагагічным суправаджэннем у сям'і, установе адукацыі, арганізацыі аховы здароўя.

Дзяржаўны цэнтр карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі ажыццяўляе таксама дыягнастычную дзейнасць, стварае банк даных аб дзецях з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, каардынуе дзейнасць у сферы спецыяльнай адукацыі на тэрыторыі адпаведнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі.

2. У цэнтрах карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі могуць стварацца структурныя падраздзяленні: дыягностыка-кансультацыйнае аддзяленне, аддзяленне ранняй комплекснай дапамогі, пункт карэкцыйна-педагагічнай дапамогі, рэсурсны цэнтр, іншыя структурныя падраздзяленні.

3. У дзяржаўным цэнтры карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі ствараецца псіхолага-медыка-педагагічная камісія для правядзення псіхолага-медыка-педагагічнага абследавання. Склад і парадак дзейнасці псіхолага-медыка-педагагічнай камісіі вызначаюцца Міністэрствам адукацыі.

Па выніках псіхолага-медыка-педагагічнага абследавання афармляюцца пратакол абследавання і заключэнне дзяржаўнага цэнтра карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі. Заключэнне ўтрымлівае рэкамендацыі аб навучанні і выхаванні асобы з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця па адпаведнай адукацыйнай праграме, аказанні ёй карэкцыйна-педагагічнай дапамогі, аб тыпе або відзе ўстановы адукацыі, стварэнні спецыяльных умоў для атрымання адукацыі.

Навучанне і выхаванне дзіцяці з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця ў адпаведнасці з рэкамендацыямі, якія ўтрымліваюцца ў заключэнні дзяржаўнага цэнтра карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі, ажыццяўляюцца з пісьмовай згоды яго законнага прадстаўніка.

Законнаму прадстаўніку дзіцяці з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця ў выпадку яго нязгоды з рэкамендацыямі дзяржаўнага цэнтра карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі павінны быць растлумачаны магчымыя наступствы такой адмовы.

Адмова законнага прадстаўніка афармляецца ў пісьмовай форме ў заключэнні дзяржаўнага цэнтра карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі і падпісваецца законным прадстаўніком і кіраўніком дзяржаўнага цэнтра карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі, а ў выпадку адмовы законнага прадстаўніка паставіць подпіс – членамі псіхолага-медыка-педагагічнай камісіі.

4. У цэнтры карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі атрымліваюць адукацыю асобы з цяжкімі, шматлікімі парушэннямі ў фізічным і (або) псіхічным развіцці. Парадак аднясення відаў парушэнняў у фізічным і (або) псіхічным развіцці да цяжкіх і шматлікіх вызначаецца Міністэрствам адукацыі па ўзгадненні з Міністэрствам аховы здароўя.

5. У цэнтры карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі можа быць створаны кабінет вучэбнага абсталявання.

6. У дзяржаўны цэнтр карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі, які каардынуе дзейнасць у сферы спецыяльнай адукацыі на тэрыторыі адпаведнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай (тэрытарыяльнай) адзінкі, арганізацыямі аховы здароўя пры наяўнасці клінічнага дыягназу з прыкметамі яўных парушэнняў у фізічным і (або) псіхічным развіцці са згоды законнага прадстаўніка дзіцяці прадстаўляюцца звесткі аб дзіцяці з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця.

### Артыкул 271. Іншыя ўстановы адукацыі, іншыя арганізацыі, індывідуальныя прадпрымальнікі, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы спецыяльнай адукацыі

1. Да іншых устаноў адукацыі, іншых арганізацый, індывідуальных прадпрымальнікаў, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы спецыяльнай адукацыі, адносяцца:

1.1. установы дашкольнай адукацыі;
1.2. установы агульнай сярэдняй адукацыі;
1.3. універсітэты;
1.4. акадэміі (кансерваторыі);
1.5. дзіцячыя дамы;
1.6. спецыяльныя навучальна-выхаваўчыя ўстановы;
1.7. спецыяльныя лячэбна-выхаваўчыя ўстановы;
1.8. адукацыйна-аздараўленчыя цэнтры;
1.9. іншыя арганізацыі, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць;
1.10. індывідуальныя прадпрымальнікі, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць.

2. Універсітэты могуць рэалізоўваць адукацыйныя праграмы спецыяльнай адукацыі пры ўмове рэалізацыі ў іх адной з адукацыйных праграм агульнай вышэйшай і (або) спецыяльнай вышэйшай адукацыі па спецыяльнасцях профілю адукацыі «Педагогіка» і па ўзгадненні з Міністэрствам адукацыі.

3. Акадэміі (кансерваторыі) могуць рэалізоўваць адукацыйныя праграмы спецыяльнай адукацыі пры ўмове рэалізацыі ў іх адной з адукацыйных праграм агульнай вышэйшай і (або) спецыяльнай вышэйшай адукацыі па спецыяльнасцях напрамку адукацыі «Мастацтва» і па ўзгадненні з Міністэрствам адукацыі.

4. Іншыя арганізацыі, індывідуальныя прадпрымальнікі, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, могуць рэалізоўваць адукацыйную праграму спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі, адукацыйную праграму спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю пры ўмове рэалізацыі імі адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі.

5. Ва ўстановах дашкольнай адукацыі, установах агульнай сярэдняй адукацыі, іншых арганізацыях, у індывідуальных прадпрымальнікаў, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы спецыяльнай адукацыі, ажыццяўляюцца інтэграванае навучанне і выхаванне.

Інтэграванае навучанне і выхаванне – арганізацыя спецыяльнай адукацыі, пры якой навучанне і выхаванне асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця ажыццяўляюцца з асобамі, якія не адносяцца да асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця.

**Артыкул 272. Кіраванне ўстановай спецыяльнай адукацыі**

1. Непасрэднае кіраўніцтва ўстановай спецыяльнай адукацыі ажыццяўляе яе кіраўнік (дырэктар, загадчык).

2. Кіраўнік установы спецыяльнай адукацыі прызначаецца на пасаду і вызваляецца ад пасады заснавальнікам установы спецыяльнай адукацыі або ўпаўнаважаным ім органам.

3. Асноўным органам самакіравання ўстановы спецыяльнай адукацыі з’яўляецца педагагічны савет, які ўзначальваецца кіраўніком гэтай установы адукацыі.

4. Ва ўстанове спецыяльнай адукацыі могуць ствараца апекавальніцкі савет, бацькоўскі камітэт.

## ГЛАВА 59
## АРГАНІЗАЦЫЯ АДУКАЦЫЙНАГА ПРАЦЭСУ ПРЫ РЭАЛІЗАЦЫІ АДУКАЦЫЙНЫХ ПРАГРАМ СПЕЦЫЯЛЬНАЙ АДУКАЦЫІ

**Артыкул 273. Агульныя патрабаванні да арганізацыі адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адукацыйных праграм спецыяльнай адукацыі**

1. Адукацыйны працэс пры рэалізацыі адукацыйных праграм спецыяльнай адукацыі можа быць арганізаваны:
1.1. ва ўстановах адукацыі;
1.2. у іншых арганізацыях, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць;

1.3. у індывідуальных прадпрымальнікаў, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць;

1.4. дома;

1.5. у арганізацыях аховы здароўя;

1.6. у санаторна-курортных і аздараўленчых арганізацыях;

1.7. ва ўстановах сацыяльнага абслугоўвання.

2. Адукацыйны працэс пры рэалізацыі адукацыйных праграм спецыяльнай адукацыі носіць карэкцыйную накіраванасць і арганізуецца з улікам структуры і ступені цяжару парушэнняў у фізічным і (або) псіхічным развіцці і ўзросту навучэнцаў на падставе вучэбна-праграмнай дакументацыі адукацыйных праграм спецыяльнай адукацыі.

3. Ва ўстановах спецыяльнай адукацыі адукацыйны працэс пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі, адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю ажыццяўляецца ў групах, а пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі, адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю – у класах, групах (пры дзяленні класа на групы). Парадак дзялення класаў на групы пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі, адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю вызначаецца Палажэннем аб установе спецыяльнай адукацыі або яе відзе.

4. Адукацыйны працэс пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі, адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю арганізуецца ў адпаведнасці з патрабаваннямі да арганізацыі адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі з улікам асаблівасцей, якія ўтрымліваюцца ў гэтай главе. Карэкцыя парушэнняў у фізічным і (або) псіхічным развіцці асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця ажыццяўляецца на карэкцыйных занятках (групавых, падгрупавых, індывідуальных).

5. Адукацыйны працэс пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі, адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю арганізуецца ў адпаведнасці з патрабаваннямі да арганізацыі адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі з улікам асаблівасцей, якія ўтрымліваюцца ў гэтай главе. Карэкцыя парушэнняў у фізічным і (або) псіхічным развіцці асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця ажыццяўляецца на карэкцыйных занятках (групавых, падгрупавых, індывідуальных).

Адукацыйны працэс пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі, адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю можа быць арганізаваны з выкарыстаннем падручнікаў, вучэбных дапаможнікаў і іншых вучэбных выданняў для спецыяльных школ і (або) устаноў агульнай сярэдняй адукацыі.

Выхаваўчая праца ў невучэбны час з навучэнцамі, якія засвойваюць змест адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі, адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю, ажыццяўляецца педагагічнымі работнікамі, у тым ліку тымі, хто выконвае функцыі класнага кіраўніка.

6. У спецыяльных школах, спецыяльных школах-інтэрнатах для навучэнцаў з парушэннем слыху, навучэнцаў з інтэлектуальнай недастатковасцю адукацыйны працэс ажыццяўляецца ў класах першага і другога аддзяленняў. Першае і другое аддзяленні ствараюцца ў залежнасці ад ступені страты слыху, ступені цяжару інтэлектуальнай недастатковасці.

7. У спецыяльных школах, спецыяльных школах-інтэрнатах для навучэнцаў з цяжкімі парушэннямі маўлення, парушэннем слыху, парушэннямі зроку, цяжкасцямі ў навучанні, парушэннямі функцый апорна-рухальнага апарату могуць адкрывацца вячэрнія класы, напаўняльнасць якіх складае 10 навучэнцаў.

Вячэрнія класы ў спецыяльнай школе, спецыяльнай школе-інтэрнаце – класы, якія ствараюцца на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі, у якіх адукацыйная праграма спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі рэалізуецца ў вячэрняй і завочнай формах атрымання адукацыі. Пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі ў завочнай форме атрымання адукацыі ў вячэрніх класах у спецыяльнай школе, спецыяльнай школе-інтэрнаце ў навучальным годзе арганізуюцца сесіі, падчас якіх праводзяцца вучэбныя заняткі, заняткі, кансультацыі, а таксама атэстацыя навучэнцаў. Парадак арганізацыі адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі ў вячэрніх класах у спецыяльнай школе, спецыяльнай школе-інтэрнаце ў вячэрняй і завочнай формах атрымання адукацыі вызначаецца Палажэннем аб спецыяльнай школе, спецыяльнай школе-інтэрнаце.

8. У спецыяльных школах, спецыяльных школах-інтэрнатах для навучэнцаў з інтэлектуальнай недастатковасцю могуць адкрывацца XI, XI–XII класы паглыбленай сацыяльнай і прафесійнай падрыхтоўкі, напаўняльнасць якіх складае 12 навучэнцаў.

Класы паглыбленай сацыяльнай і прафесійнай падрыхтоўкі – XI, XI–XII класы, у якіх адначасова з адукацыйнай праграмай спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю рэалізуецца адукацыйная праграма прафесійнай падрыхтоўкі рабочых (служачых).

9. Пры арганізацыі інтэграванага навучання і выхавання адукацыйны працэс пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі, адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю ажыццяўляецца ў спецыяльных групах, санаторных спецыяльных групах, групах інтэграванага навучання і выхавання, санаторных групах інтэграванага навучання і выхавання, а пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі, адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю – у спецыяльных класах, класах інтэграванага навучання і выхавання.

Спецыяльныя групы – групы, у якіх навучаюцца і выхоўваюцца асобы з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, якія засвойваюць змест адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі, адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю.

Санаторныя спецыяльныя групы – групы, у якіх навучаюцца і выхоўваюцца, а таксама атрымліваюць аздараўленне асобы з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, якія засвойваюць змест адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі, адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю.

Спецыяльныя групы, санаторныя спецыяльныя групы ствараюцца для дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця ва ўзросце да трох гадоў і для дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця ва ўзросце ад трох да васьмі гадоў, для дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця ва ўзросце ад аднаго года да сямі (васьмі) гадоў.

Групы інтэграванага навучання і выхавання – групы, у якіх навучаюцца і выхоўваюцца асобы з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, якія засвойваюць змест адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі, адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю, і асобы, якія не маюць такіх асаблівасцей, якія засвойваюць змест адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі.

Санаторныя групы інтэграванага навучання і выхавання – групы, у якіх сумесна навучаюцца і выхоўваюцца, а таксама атрымліваюць аздараўленне асобы з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, якія засвойваюць змест адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі, адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю, і асобы, якія не маюць такіх асаблівасцей, якія засвойваюць змест адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі.

Спецыяльныя класы – класы, у якіх навучаюцца і выхоўваюцца асобы з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, якія засвойваюць змест адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі, адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю.

Класы інтэграванага навучання і выхавання – класы, у якіх навучаюцца і выхоўваюцца асобы з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, якія засвойваюць змест адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі, адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю, і асобы, якія не маюць такіх асаблівасцей, якія засвойваюць змест адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі.

Парадак стварэння спецыяльных груп, санаторных спецыяльных груп, груп інтэграванага навучання і выхавання, санаторных груп інтэграванага навучання і выхавання, спецыяльных класаў, класаў інтэграванага навучання і выхавання і арганізацыі адукацыйнага працэсу ў іх вызначаецца Міністэрствам адукацыі.

10. Напаўняльнасць груп, спецыяльных груп, санаторных спецыяльных груп складае:

10.1. для дзяцей з цяжкімі парушэннямі маўлення ва ўзросце да трох гадоў – 6 выхаванцаў, ва ўзросце ад трох да васьмі гадоў – 12 выхаванцаў, ва ўзросце ад аднаго года да сямі (васьмі) гадоў – 10 выхаванцаў;

10.2. для дзяцей, якія не чуюць, – 6 выхаванцаў;

10.3. для дзяцей, якія слаба чуюць, ва ўзросце да трох гадоў – 6 выхаванцаў, ва ўзросце ад трох да васьмі гадоў – 8 выхаванцаў, ва ўзросце ад аднаго года да сямі (васьмі) гадоў – 6 выхаванцаў;

10.4. для невідушчых дзяцей, невідушчых і слабавідушчых дзяцей – 6 выхаванцаў;

10.5. для слабавідушчых дзяцей ва ўзросце да трох гадоў – 6 выхаванцаў, ва ўзросце ад трох да васьмі гадоў – 10 выхаванцаў, ва ўзросце ад аднаго года да сямі (васьмі) гадоў – 8 выхаванцаў;

10.6. для дзяцей з амбліяпіяй ва ўзросце да трох гадоў – 6 выхаванцаў, ва ўзросце ад трох да васьмі гадоў – 10 выхаванцаў, ва ўзросце ад аднаго года да сямі (васьмі) гадоў – 8 выхаванцаў;

10.7. для дзяцей з касавокасцю ва ўзросце да трох гадоў – 6 выхаванцаў, ва ўзросце ад трох да васьмі гадоў – 10 выхаванцаў, ва ўзросце ад аднаго года да сямі (васьмі) гадоў – 8 выхаванцаў;

10.8. для слепаглухіх дзяцей – 2 выхаванцы;

10.9. для дзяцей з цяжкасцямі ў навучанні ва ўзросце да трох гадоў – 6 выхаванцаў, ва ўзросце ад трох да васьмі гадоў – 10 выхаванцаў, ва ўзросце ад аднаго года да сямі (васьмі) гадоў – 8 выхаванцаў;

10.10. для дзяцей з расстройствамі аўтыстычнага спектра – 4 выхаванцы;

10.11. для дзяцей з парушэннямі функцый апорна-рухальнага апарату ва ўзросце да трох гадоў – 6 выхаванцаў, ва ўзросце ад трох да васьмі гадоў – 8 выхаванцаў, ва ўзросце ад аднаго года да сямі (васьмі) гадоў – 6 выхаванцаў;

10.12. для дзяцей з парушэннямі функцый апорна-рухальнага апарату (са значным і рэзка выяўленым парушэннем перамяшчэння або яго адсутнасцю) – 3 выхаванцы;

10.13. для дзяцей з лёгкай інтэлектуальнай недастатковасцю – 6 выхаванцаў;

10.14. для дзяцей з сярэдняй, цяжкай інтэлектуальнай недастатковасцю – 4 выхаванцы;

10.15. для дзяцей з цяжкімі, шматлікімі парушэннямі ў фізічным і (або) псіхічным развіцці – 4 выхаванцы, а ў выпадку, калі ў гэтай групе ёсць адзін выхаванец з парушэннямі функцый апорна-рухальнага апарату (са значным і рэзка выяўленым парушэннем перамяшчэння або яго адсутнасцю), – 3 выхаванцы.

11. Напаўняльнасць груп інтэграванага навучання і выхавання, санаторных груп інтэграванага навучання і выхавання для дзяцей ва ўзросце да трох гадоў складае ад 8 да 10 выхаванцаў, з іх:

11.1. адно дзіця з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця з парушэннямі аднароднага характару – пры навучанні і выхаванні дзяцей з інтэлектуальнай недастатковасцю, або дзяцей, якія не чуюць, або невідушчых дзяцей, або дзяцей з парушэннямі функцый апорна-рухальнага апарату (са значным і рэзка выяўленым парушэннем перамяшчэння або яго адсутнасцю), або дзяцей з расстройствамі аўтыстычнага спектра;

11.2. не больш за тры асобы з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця з парушэннямі аднароднага характару – пры навучанні і выхаванні дзяцей, якія слаба чуюць, або слабавідушчых дзяцей, або дзяцей з цяжкімі парушэннямі маўлення, або дзяцей з цяжкасцямі ў навучанні;

11.3. не больш за дзве асобы з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця з рознымі (не больш за два) парушэннямі развіцця.

12. Напаўняльнасць груп інтэграванага навучання і выхавання, санаторных груп інтэграванага навучання і выхавання для дзяцей ва ўзросце ад трох да васьмі гадоў складае ад 10 да 12 выхаванцаў, з іх:

12.1. не больш за дзве асобы з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця з парушэннямі аднароднага характару – пры навучанні і выхаванні дзяцей з інтэлектуальнай недастатковасцю, або дзяцей, якія не чуюць, або невідушчых дзяцей, або дзяцей з парушэннямі функцый апорна-рухальнага апарату (са значным і рэзка выяўленым парушэннем перамяшчэння або яго адсутнасцю), або дзяцей з расстройствамі аўтыстычнага спектра;

12.2. не больш за чатыры асобы з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця з парушэннямі аднароднага характару – пры навучанні і выхаванні дзяцей, якія слаба чуюць, або слабавідушчых дзяцей, або дзяцей з цяжкімі парушэннямі маўлення, або дзяцей з цяжкасцямі ў навучанні;

12.3. не больш за тры асобы з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця з рознымі (не больш за два) парушэннямі развіцця.

13. Напаўняльнасць груп інтэграванага навучання і выхавання, санаторных груп інтэграванага навучання і выхавання для дзяцей ва ўзросце ад аднаго года да сямі (васьмі) гадоў складае ад 6 да 8 выхаванцаў, з іх:

13.1. адно дзіця з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця з парушэннямі аднароднага характару – пры навучанні і выхаванні дзяцей з інтэлектуальнай недастатковасцю, або дзяцей, якія не чуюць, або невідушчых дзяцей, або дзяцей з парушэннямі функцый апорна-рухальнага апарату (са значным і рэзка выяўленым парушэннем перамяшчэння або яго адсутнасцю), або дзяцей з расстройствамі аўтыстычнага спектра;

13.2. не больш за тры асобы з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця з парушэннямі аднароднага характару – пры навучанні і выхаванні дзяцей, якія слаба чуюць, або слабавідушчых дзяцей, або дзяцей з цяжкімі парушэннямі маўлення, або дзяцей з цяжкасцямі ў навучанні;

13.3. не больш за дзве асобы з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця з рознымі (не больш за два) парушэннямі развіцця.

14. Напаўняльнасць класаў, спецыяльных класаў складае:

14.1. для дзяцей, якія слаба чуюць, з адносна развітым маўленнем – 10 навучэнцаў;

14.2. для дзяцей, якія не чуюць, дзяцей, якія слаба чуюць, з грубым недаразвіццём маўлення – 8 навучэнцаў;

14.3. для невідушчых дзяцей, невідушчых і слабавідушчых дзяцей – 8 навучэнцаў;

14.4. для слабавідушчых дзяцей – 12 навучэнцаў;

14.5. для слепаглухіх дзяцей – 3 навучэнцы;

14.6. для дзяцей з цяжкасцямі ў навучанні – 12 навучэнцаў;

14.7. для дзяцей з цяжкімі парушэннямі маўлення – 12 навучэнцаў;

14.8. для дзяцей з парушэннямі функцый апорна-рухальнага апарату – 10 навучэнцаў, а ў выпадку, калі ў гэтым класе ёсць адзін навучэнец з парушэннямі функцый апорна-рухальнага апарату (са значным і рэзка выяўленым парушэннем перамяшчэння або яго адсутнасцю), – 6 навучэнцаў;

14.9. для дзяцей з лёгкай інтэлектуальнай недастатковасцю – 12 навучэнцаў;

14.10. для дзяцей з сярэдняй, цяжкай інтэлектуальнай недастатковасцю – 6 навучэнцаў;

14.11. для дзяцей з цяжкімі, шматлікімі парушэннямі ў фізічным і (або) псіхічным развіцці – 6 навучэнцаў;

14.12. для дзяцей з расстройствамі аўтыстычнага спектра – 6 навучэнцаў.

15. Напаўняльнасць класаў інтэграванага навучання і выхавання не павінна перавышаць 20 навучэнцаў, з іх:

15.1. не больш за тры асобы з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця з парушэннямі аднароднага характару – пры навучанні і выхаванні дзяцей з інтэлектуальнай недастатковасцю, або дзяцей, якія не чуюць, або невідушчых дзяцей, або дзяцей з парушэннямі функцый апорна-рухальнага апарату (са значным і рэзка выяўленым парушэннем перамяшчэння або яго адсутнасцю), або дзяцей з расстройствамі аўтыстычнага спектра;

15.2. не больш за шэсць асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця з парушэннямі аднароднага характару – пры навучанні і выхаванні дзяцей, якія слаба чуюць, або слабавідушчых дзяцей, або дзяцей з цяжкімі парушэннямі маўлення, або дзяцей з цяжкасцямі ў навучанні;

15.3. не больш за чатыры асобы з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця з рознымі (не больш за два) парушэннямі развіцця.

16. Ва ўстанове адукацыі, размешчанай у сельскім населеным пункце, спецыяльны клас можа адкрывацца пры наяўнасці аднаго навучэнца з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця пры адсутнасці магчымасці арганізацыі навучання і выхавання ў класе інтэграванага навучання і выхавання.

17. Напаўняльнасць груп прадоўжанага дня ў спецыяльных школах, установах агульнай сярэдняй адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйную праграму спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі, адукацыйную праграму спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю, адпавядае напаўняльнасці класаў, спецыяльных класаў і класаў інтэграванага навучання і выхавання.

18. Ва ўстановах адукацыі, іншых арганізацыях, у індывідуальных прадпрымальнікаў, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, пры рэалізацыі адукацыйных праграм спецыяльнай адукацыі паводле рашэння заснавальніка, індывідуальнага прадпрымальніка можа быць устаноўлена меншая напаўняльнасць спецыяльных груп, санаторных спецыяльных груп, груп, груп інтэграванага навучання і выхавання, санаторных груп інтэграванага навучання і выхавання, спецыяльных класаў, класаў, класаў інтэграванага навучання і выхавання, вячэрніх класаў у спецыяльнай школе, спецыяльнай школе-інтэрнаце, XI, XI–XII класаў паглыбленай сацыяльнай і прафесійнай падрыхтоўкі.

19. Адукацыйны працэс пры рэалізацыі адукацыйных праграм спецыяльнай адукацыі для навучэнцаў з парушэннямі зроку арганізуецца з выкарыстаннем тыфлатэхнічных сродкаў, спецыяльнага абсталявання, асістыўных устройстваў і тэхналогій, тактыльнай

рэльефнай графікі, вучэбных выданняў, якія выдаюцца для невідушчых рэльефна-кропкавым шрыфтам Брайля, для слабавідушчых – павялічаным шрыфтам.

20. Адукацыйны працэс пры рэалізацыі адукацыйных праграм спецыяльнай адукацыі для навучэнцаў з парушэннем слыху арганізуецца з выкарыстаннем гукаўзмацняльнай апаратуры калектыўнага і (або) індывідуальнага карыстання, тэхнічных сродкаў, якія забяспечваюць перадачу вучэбнага матэрыялу і іншай інфармацыі на зрокавай аснове.

21. Пры арганізацыі адукацыйнага працэсу для асобы з расстройствамі аўтыстычнага спектра з улікам структуры і ступені цяжару парушэння забяспечваецца яе персанальнае суправаджэнне педагагічным работнікам установы адукацыі. Неабходнасць і форма персанальнага суправаджэння вызначаюцца псіхолага-медыка-педагагічнай камісіяй дзяржаўнага цэнтра карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі.

22. Адукацыйны працэс пры рэалізацыі адукацыйных праграм спецыяльнай адукацыі для навучэнцаў з парушэннем слыху, якія навучаюцца ў другім аддзяленні спецыяльнай школы, спецыяльнай школы-інтэрната, арганізуецца на беларускай або рускай (пісьмовая, вусная, дактыльная формы) мове і на жэставай мове.

23. Адукацыйны працэс пры рэалізацыі адукацыйных праграм спецыяльнай адукацыі для навучэнцаў з цяжкімі парушэннямі маўлення арганізуецца на беларускай або рускай мове.

24. Вывучэнне замежнай мовы на базавым і павышаным узроўнях у другім аддзяленні спецыяльнай школы, спецыяльнай школы-інтэрната для навучэнцаў з парушэннем слыху, у спецыяльнай школе, спецыяльнай школе-інтэрнаце для навучэнцаў з цяжкімі парушэннямі маўлення ажыццяўляецца па жаданні навучэнца, законнага прадстаўніка непаўналетняга навучэнца.

### Артыкул 274. Агульныя патрабаванні да прыёму (залічэння) асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця для засваення зместу адукацыйных праграм спецыяльнай адукацыі

1. Прыём (залічэнне) асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця для засваення зместу адукацыйных праграм спецыяльнай адукацыі ажыццяўляецца на падставе заключэння дзяржаўнага цэнтра карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі ў парадку, устаноўленым для прыёму (залічэння) асоб для засваення зместу адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі, адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі.

2. Прыём (залічэнне) асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця для засваення зместу адукацыйных праграм спецыяльнай адукацыі ў частцы, не ўрэгуляванай гэтым Кодэксам, ажыццяўляецца ў адпаведнасці з Палажэннем аб установе спецыяльнай адукацыі або яе відзе.

### Артыкул 275. Атрыманне спецыяльнай адукацыі дома, спалучэнне вучэбных заняткаў, заняткаў дома і ва ўстанове адукацыі

1. Для асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, якія па стане здароўя часова або пастаянна не могуць наведваць установы адукацыі, ствараюцца ўмовы для атрымання спецыяльнай адукацыі дома. Пералік медыцынскіх паказанняў для атрымання спецыяльнай адукацыі дома вызначаецца Міністэрствам аховы здароўя.

2. Адукацыйны працэс для атрымання спецыяльнай адукацыі дома арганізуецца дзяржаўнай установай адукацыі па месцы жыхарства (месцы знаходжання) асобы з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця або дзяржаўнай установай адукацыі, у якой яна навучалася да ўзнікнення медыцынскіх паказанняў для атрымання спецыяльнай адукацыі дома.

З мэтай сацыялізацыі асобы з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, якая атрымлівае спецыяльную адукацыю дома, вучэбныя заняткі, заняткі могуць арганізоўвацца дома або

ў спалучэнні вучэбных заняткаў, заняткаў дома і ва ўстанове адукацыі, якая арганізавала навучанне і выхаванне дома.

3. Рашэнне аб атрыманні спецыяльнай адукацыі дома, арганізацыі вучэбных заняткаў, заняткаў дома або дома і ва ўстанове адукацыі прымаецца структурным падраздзяленнем мясцовага выканаўчага і распарадчага органа, які ажыццяўляе дзяржаўна-ўладныя паўнамоцтвы ў сферы адукацыі, па месцы жыхарства (месцы знаходжання) асобы з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця на падставе яе заявы, заявы законнага прадстаўніка непаўналетняй асобы, заключэння дзяржаўнага цэнтра карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі, а таксама заключэння ўрачэбна-кансультацыйнай камісіі.

4. Парадак арганізацыі атрымання спецыяльнай адукацыі дома вызначаецца Міністэрствам адукацыі па ўзгадненні з Міністэрствам аховы здароўя.

**Артыкул 276. Навучанне і выхаванне асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, аказанне карэкцыйна-педагагічнай дапамогі ў арганізацыях аховы здароўя**

1. Асобам з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, якія засвойваюць змест адукацыйных праграм спецыяльнай адукацыі і якім аказваецца медыцынская дапамога ў стацыянарных умовах у арганізацыях аховы здароўя, ствараюцца ўмовы для навучання і выхавання ў парадку, які вызначаецца Міністэрствам адукацыі па ўзгадненні з Міністэрствам аховы здароўя.

2. Адукацыйны працэс для асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця ў арганізацыі аховы здароўя арганізуецца ўстановай адукацыі па месцы знаходжання арганізацыі аховы здароўя.

3. Рашэнне аб навучанні і выхаванні асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця ў арганізацыі аховы здароўя прымаецца структурным падраздзяленнем мясцовага выканаўчага і распарадчага органа, які ажыццяўляе дзяржаўна-ўладныя паўнамоцтвы ў сферы адукацыі, па месцы знаходжання арганізацыі аховы здароўя на падставе звестак, што прадастаўляюцца гэтай арганізацыяй аховы здароўя.

4. У арганізацыях аховы здароўя можа аказвацца карэкцыйна-педагагічная дапамога асобам, якія маюць парушэнні маўлення, зроку, слыху і іншыя парушэнні. Карэкцыйна-педагагічная дапамога аказваецца педагагічнымі работнікамі, што ўваходзяць у штат арганізацыі аховы здароўя.

**Артыкул 277. Навучанне і выхаванне асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця ў санаторна-курортных і аздараўленчых арганізацыях**

1. Асобам з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, якія засвойваюць змест адукацыйных праграм спецыяльнай адукацыі і накіраваным у складзе арганізаваных груп у санаторна-курортныя і аздараўленчыя арганізацыі, ствараюцца ўмовы для навучання і выхавання ў парадку, які вызначаецца Міністэрствам адукацыі.

2. Адукацыйны працэс у санаторна-курортных і аздараўленчых арганізацыях арганізуецца ўстановамі адукацыі, якія накіроўваюць такія групы.

**Артыкул 278. Атрыманне спецыяльнай адукацыі асобамі з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, якія знаходзяцца ва ўстановах сацыяльнага абслугоўвання, аказанне ім карэкцыйна-педагагічнай дапамогі**

1. Для асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, якія знаходзяцца ва ўстановах сацыяльнага абслугоўвання і маюць медыцынскія проціпаказанні, пералік якіх устанаўліваецца Міністэрствам аховы здароўя, для атрымання дашкольнай, агульнай сярэдняй і спецыяльнай адукацыі ва ўстановах адукацыі з улікам асаблівасцей іх

псіхафізічнага развіцця ствараюцца ўмовы для аказання карэкцыйна-педагагічнай дапамогі і атрымання спецыяльнай адукацыі ў гэтых установах сацыяльнага абслугоўвання.

2. Адукацыйны працэс для атрымання спецыяльнай адукацыі, аказанне карэкцыйна-педагагічнай дапамогі ва ўстанове сацыяльнага абслугоўвання арганізуецца ўстановай адукацыі па месцы знаходжання ўстановы сацыяльнага абслугоўвання.

3. Рашэнне аб атрыманні спецыяльнай адукацыі, аказанні карэкцыйна-педагагічнай дапамогі ва ўстанове сацыяльнага абслугоўвання прымаецца структурным падраздзяленнем мясцовага выканаўчага і распарадчага органа, які ажыццяўляе дзяржаўна-ўладныя паўнамоцтвы ў сферы адукацыі, па месцы знаходжання ўстановы сацыяльнага абслугоўвання на падставе звестак, што прадастаўляюцца гэтай установай сацыяльнага абслугоўвання.

4. Парадак арганізацыі атрымання спецыяльнай адукацыі, аказання карэкцыйна-педагагічнай дапамогі ва ўстанове сацыяльнага абслугоўвання вызначаецца Міністэрствам адукацыі і Міністэрствам працы і сацыяльнай абароны.

## ГЛАВА 60
## АТЭСТАЦЫЯ АСОБ З АСАБЛІВАСЦЯМІ ПСІХАФІЗІЧНАГА РАЗВІЦЦЯ ПРЫ ЗАСВАЕННІ ЗМЕСТУ АДУКАЦЫЙНЫХ ПРАГРАМ СПЕЦЫЯЛЬНАЙ АДУКАЦЫІ

### Артыкул 279. Атэстацыя асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця пры засваенні зместу адукацыйных праграм спецыяльнай адукацыі

1. Асобы з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі, адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю праходзяць бягучую, прамежкавую і выніковую атэстацыю ў адпаведнасці з патрабаваннямі да правядзення атэстацыі пры рэалізацыі адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі з улікам тэрмінаў атрымання адукацыі, вывучэння моў, асаблівасцей, якія ўтрымліваюцца ў гэтай главе.

2. Парадак правядзення бягучай, прамежкавай і выніковай атэстацыі навучэнцаў пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі, у тым ліку нормы ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці навучэнцаў па вучэбных прадметах пры правядзенні бягучай, прамежкавай і выніковай атэстацыі, вызначаецца Правіламі правядзення атэстацыі навучэнцаў пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі. Парадак правядзення атэстацыі навучэнцаў пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю, у тым ліку нормы ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці навучэнцаў па вучэбных прадметах пры правядзенні бягучай, прамежкавай і выніковай атэстацыі, вызначаецца Правіламі правядзення атэстацыі навучэнцаў пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю.

### Артыкул 280. Асаблівасці выніковай атэстацыі навучэнцаў пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі

1. Выніковая атэстацыя навучэнцаў пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі пасля завяршэння навучання і выхавання на II і III ступенях агульнай сярэдняй адукацыі праводзіцца па выніках выніковай атэстацыі па завяршэнні вучэбных заняткаў у навучальным годзе і выніковых іспытаў па асобных вучэбных прадметах, модулях.

Пералік вучэбных прадметаў, модуляў, па якіх праводзяцца выніковыя іспыты па завяршэнні навучання і выхавання на II і III ступенях агульнай сярэдняй адукацыі, віды выніковых іспытаў штогод да пачатку навучальнага года ўстанаўліваюцца Міністэрствам адукацыі.

2. Віды выніковых іспытаў па завяршэнні навучання і выхавання на II і III ступенях агульнай сярэдняй адукацыі для навучэнцаў другога аддзялення спецыяльнай школы, спецыяльнай школы-інтэрната для навучэнцаў з парушэннем слыху, навучэнцаў спецыяльнай школы, спецыяльнай школы-інтэрната для навучэнцаў з цяжкімі парушэннямі маўлення вызначаюцца з улікам асаблівасцей вывучэння імі беларускай або рускай мовы.

3. Навучэнцы з парушэннем слыху, парушэннямі зроку, парушэннямі функцый апорна-рухальнага апарату па завяршэнні навучання і выхавання на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі па іх выбары праходзяць выніковыя іспыты ў выглядзе цэнтралізаванага экзамену або ў іншым выглядзе выніковага іспыту, які вызначаецца Правіламі правядзення атэстацыі навучэнцаў пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі.

4. Навучэнцам другога аддзялення спецыяльнай школы, спецыяльнай школы-інтэрната для навучэнцаў з парушэннем слыху на выніковых іспытах, якія патрабуюць вуснага адказу, дазваляецца выкарыстоўваць адказы ў пісьмовай форме.

### Артыкул 281. Асаблівасці атэстацыі навучэнцаў пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю

1. Выніковая атэстацыя навучэнцаў першага аддзялення спецыяльнай школы, спецыяльнай школы-інтэрната для навучэнцаў з інтэлектуальнай недастатковасцю праводзіцца ў форме выніковага іспыту па працоўным навучанні.

2. Парадак правядзення бягучай, прамежкавай і выніковай атэстацыі навучэнцаў класаў другога аддзялення спецыяльнай школы, спецыяльнай школы-інтэрната для навучэнцаў з інтэлектуальнай недастатковасцю, навучэнцаў, якія засвойваюць змест адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю ў цэнтры карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі, вызначаецца Правіламі правядзення атэстацыі навучэнцаў пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю.

## ГЛАВА 61
## НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ СПЕЦЫЯЛЬНАЙ АДУКАЦЫІ

### Артыкул 282. Сістэма навукова-метадычнага забеспячэння спецыяльнай адукацыі

1. Навукова-метадычнае забеспячэнне спецыяльнай адукацыі ўключае ў сябе:

1.1. вучэбна-праграмную дакументацыю адукацыйных праграм спецыяльнай адукацыі;

1.2. праграмна-планавальную дакументацыю выхавання;

1.3. вучэбна-метадычную дакументацыю;

1.4. вучэбныя і іншыя выданні;

1.5. кантрольна-вымяральныя матэрыялы;

1.6. інфармацыйна-аналітычныя матэрыялы;

1.7. метадычныя ўказанні па распрацоўцы вучэбна-праграмнай дакументацыі адукацыйных праграм спецыяльнай адукацыі.

2. Навукова-метадычнае забеспячэнне спецыяльнай адукацыі ажыццяўляюць:

2.1. арганізацыі, што ажыццяўляюць вучэбна-метадычнае забеспячэнне спецыяльнай адукацыі;

2.2. установы адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы спецыяльнай адукацыі;

2.3. іншыя арганізацыі, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы спецыяльнай адукацыі;

2.4. вучэбна-метадычныя аб'яднанні ў сферы спецыяльнай адукацыі;

2.5. арганізацыі, якія ўдзельнічаюць у рэалізацыі адукацыйных праграм спецыяльнай адукацыі праз сеткавую форму ўзаемадзеяння;

2.6. індывідуальныя прадпрымальнікі, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы спецыяльнай адукацыі;

2.7. рэспубліканскія органы дзяржаўнага кіравання, іншыя арганізацыі, падпарадкаваныя Ураду Рэспублікі Беларусь, мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы, іншыя арганізацыі і фізічныя асобы ў межах іх паўнамоцтваў у сферы спецыяльнай адукацыі.

**Артыкул 283. Вучэбна-праграмная дакументацыя адукацыйных праграм спецыяльнай адукацыі**

1. Вучэбна-праграмная дакументацыя адукацыйных праграм спецыяльнай адукацыі ўключае ў сябе:

1.1. вучэбныя планы спецыяльнай адукацыі;

1.2. праграмы спецыяльнай адукацыі.

2. Да вучэбных планаў спецыяльнай адукацыі адносяцца:

2.1. вучэбныя планы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі;

2.2. вучэбныя планы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі;

2.3. эксперыментальныя вучэбныя планы;

2.4. індывідуальныя вучэбныя планы.

3. Да вучэбных планаў спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі адносяцца:

3.1. тыпавы вучэбны план спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі;

3.2. вучэбныя планы спецыяльных дзіцячых садоў, іншых арганізацый, індывідуальных прадпрымальнікаў, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, якія рэалізуюць адукацыйную праграму спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі, адукацыйную праграму спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю, на бягучы навучальны год;

3.3. вучэбны план цэнтра карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі для выхаванцаў з цяжкімі, шматлікімі парушэннямі ў фізічным і (або) псіхічным развіцці;

3.4. вучэбны план цэнтра карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі для выхаванцаў з цяжкімі, шматлікімі парушэннямі ў фізічным і (або) псіхічным развіцці на бягучы навучальны год;

3.5. вучэбныя планы інтэграванага навучання і выхавання на ўзроўні дашкольнай адукацыі на бягучы навучальны год.

4. Да вучэбных планаў спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі адносяцца:

4.1. вучэбныя планы спецыяльных школ, спецыяльных школ-інтэрнатаў;

4.2. вучэбныя планы спецыяльных школ, спецыяльных школ-інтэрнатаў на бягучы навучальны год;

4.3. вучэбны план цэнтра карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі для навучэнцаў з цяжкімі, шматлікімі парушэннямі ў фізічным і (або) псіхічным развіцці;

4.4. вучэбны план цэнтра карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі для навучэнцаў з цяжкімі, шматлікімі парушэннямі ў фізічным і (або) псіхічным развіцці на бягучы навучальны год;

4.5. вучэбны план цэнтра карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі для навучэнцаў з расстройствамі аўтыстычнага спектра;

4.6. вучэбны план цэнтра карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі для навучэнцаў з расстройствамі аўтыстычнага спектра на бягучы навучальны год;

4.7. вучэбныя планы інтэграванага навучання і выхавання на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі на бягучы навучальны год.

5. Тыпавы вучэбны план спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі з'яўляецца тэхнічным нарматыўным прававым актам, распрацоўваецца на аснове тыпавога вучэбнага плана дашкольнай адукацыі з улікам структуры і ступені цяжару парушэнняў у фізічным і (або) псіхічным развіцці дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця і ўстанаўлівае пералік адукацыйных галін, колькасць вучэбных гадзін на іх вывучэнне па групах выхаванцаў, колькасць вучэбных гадзін на правядзенне карэкцыйных заняткаў, максімальны дапушчальны аб'ём вучэбнай нагрузкі і агульную колькасць вучэбных гадзін у тыдзень.

Пералік адукацыйных галін і колькасць вучэбных гадзін на вывучэнне асобных адукацыйных галін у тыпавым навучальным плане спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі вызначаюцца ў залежнасці ад магчымасцей засваення зместу адукацыйных галін асобнымі катэгорыямі выхаванцаў з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця і могуць не супадаць з пералікам адукацыйных галін і колькасцю вучэбных гадзін на вывучэнне асобных адукацыйных галін, вызначанымі тыпавым вучэбным планам дашкольнай адукацыі.

Вучэбныя гадзіны, вызначаныя на правядзенне карэкцыйных заняткаў, не ўлічваюцца ў максімальную дапушчальную вучэбную нагрузку ў тыдзень на аднаго выхаванца.

6. Вучэбны план спецыяльнага дзіцячага сада, іншай арганізацыі, індывідуальнага прадпрымальніка, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, на бягучы навучальны год распрацоўваецца спецыяльным дзіцячым садам, іншай арганізацыяй, індывідуальным прадпрымальнікам, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, на аснове тыпавога вучэбнага плана спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі, праграм спецыяльнай адукацыі і зацвярджаецца кіраўніком спецыяльнага дзіцячага сада, іншай арганізацыі, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, індывідуальным прадпрымальнікам, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць.

7. Вучэбныя планы спецыяльных школ, спецыяльных школ-інтэрнатаў уключаюць у сябе:

7.1. вучэбны план другога аддзялення спецыяльнай школы, спецыяльнай школы-інтэрната для навучэнцаў з інтэлектуальнай недастатковасцю;

7.2. вучэбны план першага аддзялення спецыяльнай школы, спецыяльнай школы-інтэрната для навучэнцаў з інтэлектуальнай недастатковасцю;

7.3. вучэбны план спецыяльнай школы, спецыяльнай школы-інтэрната для навучэнцаў з цяжкімі парушэннямі маўлення;

7.4. вучэбны план другога аддзялення спецыяльнай школы, спецыяльнай школы-інтэрната для навучэнцаў з парушэннем слыху;

7.5. вучэбны план першага аддзялення спецыяльнай школы, спецыяльнай школы-інтэрната для навучэнцаў з парушэннем слыху;

7.6. вучэбны план спецыяльнай школы, спецыяльнай школы-інтэрната для навучэнцаў з парушэннямі зроку;

7.7. вучэбны план спецыяльнай школы, спецыяльнай школы-інтэрната для навучэнцаў з цяжкасцямі ў навучанні;

7.8. вучэбны план спецыяльнай школы, спецыяльнай школы-інтэрната для навучэнцаў з парушэннямі функцый апорна-рухальнага апарату.

8. Вучэбныя планы спецыяльных школ, спецыяльных школ-інтэрнатаў, акрамя вучэбнага плана другога аддзялення спецыяльнай школы, спецыяльнай школы-інтэрната для навучэнцаў з інтэлектуальнай недастатковасцю, з'яўляюцца тэхнічнымі нарматыўнымі

прававымі актамі, распрацоўваюцца на аснове тыпавога вучэбнага плана сярэдняй школы з улікам асаблівасцей фізічнага і (або) псіхічнага развіцця навучэнцаў і ўключаюць у сябе пералік абавязковых для вывучэння вучэбных прадметаў, модуляў па класах, устанаўліваюць колькасць вучэбных гадзін на іх вывучэнне, колькасць вучэбных гадзін на правядзенне карэкцыйных і факультатыўных заняткаў, абавязковы аб’ём і максімальны дапушчальны аб’ём вучэбнай нагрузкі ў тыдзень на аднаго навучэнца ў кожным класе і агульную колькасць вучэбных гадзін на клас. Вучэбныя гадзіны, прадугледжаныя вучэбнымі планамі спецыяльных школ, спецыяльных школ-інтэрнатаў, акрамя вучэбнага плана другога аддзялення спецыяльнай школы, спецыяльнай школы-інтэрната для навучэнцаў з інтэлектуальнай недастатковасцю, у дзяржаўных установах адукацыі фінансуюцца за кошт сродкаў рэспубліканскага і (або) мясцовых бюджэтаў.

Пералік вучэбных прадметаў, модуляў і колькасць вучэбных гадзін на вывучэнне асобных вучэбных прадметаў, модуляў у навучальных планах спецыяльных школ, спецыяльных школ-інтэрнатаў, акрамя вучэбнага плана другога аддзялення спецыяльнай школы, спецыяльнай школы-інтэрната для навучэнцаў з інтэлектуальнай недастатковасцю, вызначаюцца ў залежнасці ад магчымасцей засваення зместу вучэбных прадметаў, модуляў асобнымі катэгорыямі асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця і могуць не супадаць з пералікам вучэбных прадметаў, модуляў і колькасцю вучэбных гадзін на вывучэнне асобных вучэбных прадметаў, модуляў, вызначанымі тыпавым вучэбным планам сярэдняй школы.

Вучэбныя гадзіны, прадугледжаныя тыпавым вучэбным планам сярэдняй школы на вывучэнне вучэбных прадметаў, модуляў, не ўключаных ва ўказаныя ў частцы другой гэтага пункта вучэбныя планы спецыяльных школ, спецыяльных школ-інтэрнатаў, пераразмяркоўваюцца на вывучэнне іншых вучэбных прадметаў, модуляў і (або) правядзенне факультатыўных заняткаў. Вучэбныя гадзіны, вызначаныя на правядзенне карэкцыйных заняткаў, не ўлічваюцца ў максімальным дапушчальным аб’ёме вучэбнай нагрузкі ў тыдзень на аднаго навучэнца.

9. Вучэбны план цэнтра карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі для выхаванцаў з цяжкімі, шматлікімі парушэннямі ў фізічным і (або) псіхічным развіцці, цэнтра карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі для навучэнцаў з цяжкімі, шматлікімі парушэннямі ў фізічным і (або) псіхічным развіцці і вучэбны план другога аддзялення спецыяльнай школы, спецыяльнай школы-інтэрната для навучэнцаў з інтэлектуальнай недастатковасцю з’яўляюцца тэхнічнымі нарматыўнымі прававымі актамі і ўключаюць у сябе пералік адукацыйных галін, вучэбных прадметаў, якія ўтрымліваюць асновы ведаў аб навакольным свеце, даступныя для засваення ўказанымі асобамі, а таксама забяспечваюць набыццё імі навыкаў самаабслугоўвання і элементарных працоўных навыкаў, устанаўліваюць колькасць вучэбных гадзін на іх вывучэнне, колькасць вучэбных гадзін на правядзенне карэкцыйных заняткаў і агульную колькасць вучэбных гадзін на групу, клас. Вучэбныя гадзіны, прадугледжаныя вучэбным планам цэнтра карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі для выхаванцаў з цяжкімі, шматлікімі парушэннямі ў фізічным і (або) псіхічным развіцці, вучэбным планам цэнтра карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі для навучэнцаў з цяжкімі, шматлікімі парушэннямі ў фізічным і (або) псіхічным развіцці, вучэбным планам другога аддзялення спецыяльнай школы, спецыяльнай школы-інтэрната для навучэнцаў з інтэлектуальнай недастатковасцю, у дзяржаўных установах адукацыі фінансуюцца за кошт сродкаў рэспубліканскага і (або) мясцовых бюджэтаў. Вучэбныя гадзіны, вызначаныя на правядзенне карэкцыйных заняткаў, не ўлічваюцца ў максімальным дапушчальным аб’ёме вучэбнай нагрузкі ў тыдзень на аднаго выхаванца, навучэнца.

10. Тыпавы вучэбны план спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі, вучэбны план цэнтра карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі для выхаванцаў з цяжкімі, шматлікімі парушэннямі ў фізічным і (або) псіхічным развіцці, вучэбныя планы спецыяльных школ, спецыяльных школ-інтэрнатаў, вучэбны план цэнтра карэкцыйна-

развіваючага навучання і рэабілітацыі для навучэнцаў з цяжкімі, шматлікімі парушэннямі ў фізічным і (або) псіхічным развіцці распрацоўваюцца Міністэрствам адукацыі сумесна з арганізацыямі, што ажыццяўляюць навукова-метадычнае забеспячэнне спецыяльнай адукацыі, і зацвярджаюцца Міністэрствам адукацыі.

11. На аснове адпаведнага вучэбнага плана цэнтра карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі для выхаванцаў з цяжкімі, шматлікімі парушэннямі ў фізічным і (або) псіхічным развіцці, вучэбнага плана цэнтра карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі для навучэнцаў з цяжкімі, шматлікімі парушэннямі ў фізічным і (або) псіхічным развіцці, адпаведных вучэбных планаў спецыяльных школ, спецыяльных школ-інтэрнатаў цэнтры карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі, спецыяльныя школы, спецыяльныя школы-інтэрнаты распрацоўваюць адпаведныя вучэбныя планы на бягучы навучальны год.

Пры распрацоўцы вучэбнага плана цэнтра карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі для навучэнцаў з цяжкімі, шматлікімі парушэннямі ў фізічным і (або) псіхічным развіцці на бягучы навучальны год, вучэбных планаў спецыяльных школ на бягучы навучальны год, спецыяльных школ-інтэрнатаў на бягучы навучальны год агульная колькасць вучэбных гадзін, якія фінансуюцца за кошт сродкаў рэспубліканскага (або) мясцовых бюджэтаў, на правядзенне вучэбных заняткаў, заняткаў у выпадках, прадугледжаных Палажэннем аб установе спецыяльнай адукацыі або яе відзе, павялічваецца заснавальнікам установы адукацыі.

12. Вучэбныя планы інтэграванага навучання і выхавання на ўзроўні дашкольнай адукацыі на бягучы навучальны год распрацоўваюцца:

12.1. на аснове тыпавога вучэбнага плана спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі ўстановамі адукацыі, іншымі арганізацыямі, індывідуальнымі прадпрымальнікамі, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, якія стварылі спецыяльныя групы для рэалізацыі адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі, адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю, і зацвярджаюцца кіраўнікамі гэтых устаноў адукацыі, іншых арганізацый, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, індывідуальнымі прадпрымальнікамі, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, па ўзгадненні з дзяржаўным цэнтрам карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі, які каардынуе дзейнасць у сферы спецыяльнай адукацыі на тэрыторыі адпаведнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай (тэрытарыяльнай) адзінкі, заснавальнікамі гэтых устаноў адукацыі;

12.2. на аснове тыпавога вучэбнага плана дашкольнай адукацыі і тыпавога вучэбнага плана спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі ўстановамі адукацыі, іншымі арганізацыямі, індывідуальнымі прадпрымальнікамі, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, якія стварылі групы інтэграванага навучання і выхавання для рэалізацыі адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі і адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі, адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю, і зацвярджаюцца кіраўнікамі гэтых устаноў адукацыі, іншых арганізацый, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, індывідуальнымі прадпрымальнікамі, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, па ўзгадненні з дзяржаўным цэнтрам карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі, які каардынуе дзейнасць у сферы спецыяльнай адукацыі на тэрыторыі адпаведнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай (тэрытарыяльнай) адзінкі, заснавальнікамі гэтых устаноў адукацыі.

13. Вучэбныя планы інтэграванага навучання і выхавання на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі на бягучы навучальны год распрацоўваюцца:

13.1. на аснове адпаведных вучэбных планаў спецыяльных школ, спецыяльных школ-інтэрнатаў установамі агульнай сярэдняй адукацыі, у якіх створаны спецыяльныя класы для рэалізацыі адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй

адукацыі, адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю, і зацвярджаюцца кіраўнікамі гэтых устаноў адукацыі па ўзгадненні з дзяржаўным цэнтрам карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі, які каардынуе дзейнасць у сферы спецыяльнай адукацыі на тэрыторыі адпаведнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай (тэрытарыяльнай) адзінкі, заснавальнікамі гэтых устаноў адукацыі;

13.2. на аснове тыпавога вучэбнага плана сярэдняй школы і адпаведных вучэбных планаў спецыяльных школ, спецыяльных школ-інтэрнатаў установамі агульнай сярэдняй адукацыі, у якіх створаны класы інтэграванага навучання і выхавання для рэалізацыі адпаведнага віду адукацыйнай праграмы агульнай сярэдняй адукацыі і адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі, адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю, і зацвярджаюцца кіраўнікамі гэтых устаноў адукацыі па ўзгадненні з дзяржаўным цэнтрам карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі, які каардынуе дзейнасць у сферы спецыяльнай адукацыі на тэрыторыі адпаведнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай (тэрытарыяльнай) адзінкі, заснавальнікамі гэтых устаноў адукацыі.

14. Эксперыментальны вучэбны план апрабуецца ва ўстановах адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы спецыяльнай адукацыі, на базе якіх ажыццяўляецца эксперыментальная дзейнасць.

Эксперыментальныя вучэбныя планы распрацоўваюцца Міністэрствам адукацыі сумесна з арганізацыямі, што ажыццяўляюць навукова-метадычнае забеспячэнне спецыяльнай адукацыі, і зацвярджаюцца Міністэрствам адукацыі.

15. Індывідуальны вучэбны план устанаўлівае пералік адукацыйных галін, вучэбных прадметаў і іх аб'ём для асобы з цяжкімі, шматлікімі парушэннямі ў фізічным і (або) псіхічным развіцці, з расстройствамі аўтыстычнага спектра, з інтэлектуальнай недастатковасцю з улікам структуры і ступені цяжару наяўных у яе парушэнняў.

Індывідуальны вучэбны план распрацоўваецца ўстановай адукацыі, іншай арганізацыяй, індывідуальным прадпрымальнікам, што ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы спецыяльнай адукацыі, у якіх (у якой) асоба з цяжкімі, шматлікімі парушэннямі ў фізічным і (або) псіхічным развіцці, асоба з расстройствамі аўтыстычнага спектра, асоба з інтэлектуальнай недастатковасцю атрымлівае адукацыю, на аснове вучэбнага плана цэнтра карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі для выхаванцаў з цяжкімі, шматлікімі парушэннямі ў фізічным і (або) псіхічным развіцці, вучэбнага плана другога аддзялення спецыяльнай школы, спецыяльнай школы-інтэрната для дзяцей з інтэлектуальнай недастатковасцю, вучэбнага плана першага аддзялення спецыяльнай школы, спецыяльнай школы-інтэрната для дзяцей з інтэлектуальнай недастатковасцю, тыпавога вучэбнага плана цэнтра карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі для навучэнцаў з цяжкімі, шматлікімі парушэннямі ў фізічным і (або) псіхічным развіцці і зацвярджаецца кіраўніком установы адукацыі, іншай арганізацыі, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, індывідуальным прадпрымальнікам, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, па ўзгадненні з дзяржаўным цэнтрам карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі, які каардынуе дзейнасць у сферы спецыяльнай адукацыі на тэрыторыі адпаведнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай (тэрытарыяльнай) адзінкі.

16. Да праграм спецыяльнай адукацыі адносяцца:

16.1. праграмы ранняй комплекснай дапамогі;

16.2. вучэбныя праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі;

16.3. вучэбныя праграмы па вучэбных прадметах, модулях;

16.4. вучэбныя праграмы факультатыўных заняткаў;

16.5. праграмы карэкцыйных заняткаў вучэбных планаў спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі;

16.6. эксперыментальныя вучэбныя праграмы па вучэбных прадметах, модулях;
16.7. індывідуальныя вучэбныя праграмы.
17. Праграма ранняй комплекснай дапамогі з’яўляецца тэхнічным нарматыўным прававым актам, распрацоўваецца для дзіцяці з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця ва ўзросце да трох гадоў, накіравана на стымуляванне яго развіцця, актывізацыю механізмаў адаптацыі, кампенсацыі, выпраўленне і (або) аслабленне наяўных у яго парушэнняў у фізічным і (або) псіхічным развіцці, нармалізацыю яго жыццёвага цыкла і зацвярджаецца Міністэрствам адукацыі.
18. Вучэбная праграма спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі з’яўляецца тэхнічным нарматыўным прававым актам, распрацоўваецца на аснове вучэбнай праграмы дашкольнай адукацыі, вызначае змест спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі, змест карэкцыйных заняткаў для асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця з улікам структуры і ступені цяжару іх парушэнняў у фізічным і (або) псіхічным развіцці і зацвярджаецца Міністэрствам адукацыі.
19. Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце, модулі з’яўляецца тэхнічным нарматыўным прававым актам, распрацоўваецца на аснове адукацыйных стандартаў агульнай сярэдняй адукацыі і (або) адукацыйных стандартаў спецыяльнай адукацыі з улікам структуры і ступені цяжару парушэнняў у фізічным і (або) псіхічным развіцці асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, вызначае змест спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі і зацвярджаецца Міністэрствам адукацыі.
20. Вучэбная праграма факультатыўных заняткаў з’яўляецца тэхнічным нарматыўным прававым актам, вызначае мэты і задачы факультатыўных заняткаў, іх змест, час на іх правядзенне, рэкамендаваныя формы і метады навучання і выхавання і зацвярджаецца Міністэрствам адукацыі.
21. Праграмы карэкцыйных заняткаў вучэбных планаў спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі з’яўляюцца тэхнічнымі нарматыўнымі прававымі актамі і накіраваны на карэкцыю пазнавальнай дзейнасці, маторыкі, прасторавай і сацыяльна-бытавой арыенціроўкі, сродкаў сувязі і іншай дзейнасці.
Праграмы карэкцыйных заняткаў вучэбных планаў спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі распрацоўваюцца на аснове сістэмна-структурнага падыходу да выпраўлення і (або) аслаблення парушэнняў у фізічным і (або) псіхічным развіцці і зацвярджаюцца Міністэрствам адукацыі.
22. Эксперыментальная вучэбная праграма па вучэбным прадмеце, модулі апрабуецца ва ўстанове адукацыі, што рэалізуе адукацыйныя праграмы спецыяльнай адукацыі, на базе якой ажыццяўляецца эксперыментальная дзейнасць.
Эксперыментальныя вучэбныя праграмы па вучэбных прадметах, модулях распрацоўваюцца Міністэрствам адукацыі сумесна з арганізацыямі, што ажыццяўляюць навукова-метадычнае забеспячэнне спецыяльнай адукацыі, і зацвярджаюцца Міністэрствам адукацыі.
23. Індывідуальная вучэбная праграма распрацоўваецца для асобы з цяжкімі, шматлікімі парушэннямі ў фізічным і (або) псіхічным развіцці з улікам структуры і ступені цяжару наяўных у яе парушэнняў і зацвярджаецца кіраўніком установы адукацыі, іншай арганізацыі, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, індывідуальным прадпрымальнікам, што ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць, у якіх (у якога) асоба з цяжкімі, шматлікімі парушэннямі ў фізічным і (або) псіхічным развіцці атрымлівае адукацыю, па ўзгадненні з дырэктарам дзяржаўнага цэнтра карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі, што каардынуе дзейнасць у сферы спецыяльнай адукацыі на тэрыторыі адпаведнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай (тэрытарыяльнай) адзінкі.

**Артыкул 284. Вучэбна-метадычныя аб’яднанні ў сферы спецыяльнай адукацыі**

1. Для ўдасканалення навукова-метадычнага забеспячэння спецыяльнай адукацыі могуць стварацца вучэбна-метадычныя аб’яднанні ў сферы спецыяльнай адукацыі

на рэспубліканскім, абласным (горада Мінска) і (або) раённым узроўнях і (або) ва ўстановах адукацыі.

2. Вучэбна-метадычныя аб’яднанні ў сферы спецыяльнай адукацыі могуць ствараюцца па відах адукацыйных праграм спецыяльнай адукацыі, якія рэалізуюцца ва ўстановах адукацыі, вучэбным прадмеце і (або) вучэбных прадметах, а таксама па пытаннях ажыццяўлення інтэграванага навучання і выхавання і (або) аказання карэкцыйна-педагагічнай дапамогі, рэалізацыі прынцыпу інклюзіі ў адукацыі.

3. У склад вучэбна-метадычных аб’яднанняў у сферы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні раёна могуць уваходзіць педагагічныя работнікі ўстаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы спецыяльнай адукацыі, адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, інстытутаў развіцця адукацыі, навуковыя работнікі, прадстаўнікі арганізацый адукацыі, якія забяспечваюць функцыянаванне сістэмы адукацыі, і іншых арганізацый.

4. Функцыямі вучэбна-метадычных аб’яднанняў у сферы спецыяльнай адукацыі з’яўляюцца:

4.1. удзел у распрацоўцы і ўдасканаленні структурных элементаў вучэбна-метадычнага забеспячэння спецыяльнай адукацыі;

4.2. распрацоўка прапаноў па ўдасканаленні павышэння кваліфікацыі педагагічных работнікаў па пытаннях распрацоўкі і выкарыстання структурных элементаў вучэбна-метадычнага забеспячэння адпаведнай адукацыі;

4.3. распрацоўка метадычных рэкамендацый па ўдасканаленні адукацыйнага працэсу пры ажыццяўленні інтэграванага навучання і выхавання, рэалізацыя прынцыпу інклюзіі ў адукацыі ў дачыненні да асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця;

4.4. распрацоўка метадычных рэкамендацый па ўдасканаленні адукацыйнага працэсу пры вывучэнні зместу адпаведнага вучэбнага прадмета, модуля;

4.5. распрацоўка метадычных рэкамендацый па ўдасканаленні працы па аказанні карэкцыйна-педагагічнай дапамогі асобам з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця;

4.6. іншыя функцыі, накіраваныя на павышэнне якасці адукацыі.

5. Рашэнні вучэбна-метадычных аб’яднанняў у сферы спецыяльнай адукацыі носяць рэкамендацыйны характар.

6. Ва ўстанове адукацыі для каардынацыі дзейнасці вучэбна-метадычных аб’яднанняў у сферы спецыяльнай адукацыі, ажыццяўлення ўзаемадзеяння з арганізацыямі, што ажыццяўляюць вучэбна-метадычнае забеспячэнне спецыяльнай адукацыі, можа ствараюцца метадычны савет.

7. Палажэнні аб вучэбна-метадычных аб’яднаннях у сферы спецыяльнай адукацыі, палажэнне аб метадычным савеце ўстановы адукацыі зацвярджаюцца Міністэрствам адукацыі.

## РАЗДЗЕЛ XVII
## ПАДТРЫМКА ДЗЯЦЕЙ, ЯКІЯ ДАСЯГНУЛІ ВЫСОКІХ ПАКАЗЧЫКАЎ У ВУЧЭБНАЙ І ГРАМАДСКАЙ ДЗЕЙНАСЦІ, ДЗЯЦЕЙ, ШТО МАЮЦЬ ПАТРЭБУ Ў АЗДАРАЎЛЕННІ, ДЗЯЦЕЙ, ПРЫЗНАНЫХ ДЗЕЦЬМІ, ЯКІЯ ЗНАХОДЗЯЦЦА Ў САЦЫЯЛЬНА НЕБЯСПЕЧНЫМ СТАНОВІШЧЫ, ДЗЯЦЕЙ, ПРЫЗНАНЫХ ДЗЕЦЬМІ, ШТО МАЮЦЬ ПАТРЭБУ Ў ДЗЯРЖАЎНАЙ АБАРОНЕ, І ДЗЯЦЕЙ, ШТО МАЮЦЬ ПАТРЭБУ Ў АСАБЛІВЫХ УМОВАХ ВЫХАВАННЯ

### ГЛАВА 62
### СІСТЭМА ПРАЦЫ ПА ПАДТРЫМЦЫ ДЗЯЦЕЙ, ЯКІЯ ДАСЯГНУЛІ ВЫСОКІХ ПАКАЗЧЫКАЎ У ВУЧЭБНАЙ І ГРАМАДСКАЙ ДЗЕЙНАСЦІ, ДЗЯЦЕЙ, ШТО МАЮЦЬ ПАТРЭБУ Ў АЗДАРАЎЛЕННІ, ДЗЯЦЕЙ, ПРЫЗНАНЫХ ДЗЕЦЬМІ, ЯКІЯ ЗНАХОДЗЯЦЦА Ў САЦЫЯЛЬНА НЕБЯСПЕЧНЫМ СТАНОВІШЧЫ, ДЗЯЦЕЙ, ПРЫЗНАНЫХ ДЗЕЦЬМІ, ШТО МАЮЦЬ ПАТРЭБУ Ў ДЗЯРЖАЎНАЙ АБАРОНЕ, І ДЗЯЦЕЙ, ШТО МАЮЦЬ ПАТРЭБУ Ў АСАБЛІВЫХ УМОВАХ ВЫХАВАННЯ

#### Артыкул 285. Сістэма працы па падтрымцы дзяцей, якія дасягнулі высокіх паказчыкаў у вучэбнай і грамадскай дзейнасці, дзяцей, што маюць патрэбу ў аздараўленні, дзяцей, прызнаных дзецьмі, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы, дзяцей, прызнаных дзецьмі, што маюць патрэбу ў дзяржаўнай абароне, і дзяцей, што маюць патрэбу ў асаблівых умовах выхавання

1. Падтрымка дзяцей, якія дасягнулі высокіх паказчыкаў у вучэбнай і грамадскай дзейнасці, і дзяцей, што маюць патрэбу ў аздараўленні, – комплекс мер, якія ўстанаўліваюцца дзяржавай і накіраваных на развіццё інтэлектуальных, творчых здольнасцей, лідарскіх якасцей дзяцей, умацаванне іх здароўя.

2. Дзеці, якія дасягнулі высокіх паказчыкаў у вучэбнай і грамадскай дзейнасці, – асобы ва ўзросце ад шасці да васямнаццаці гадоў, якія добра паспяваюць у вучэбнай дзейнасці, або ўзнагароджаныя па выніках раённых (гарадскіх), абласных (Мінскай гарадской), рэспубліканскіх і (або) міжнародных алімпіяд, конкурсаў, турніраў, фестываляў, канферэнцый, сімпозіумаў, іншых адукацыйных мерапрыемстваў, спартыўных спаборніцтваў, або ўдзельнічаюць у працы органаў самакіравання ўстановы адукацыі, маладзёжных і дзіцячых грамадскіх аб'яднанняў.

3. Дзеці, што маюць патрэбу ў аздараўленні, – асобы ва ўзросце ад шасці да васямнаццаці гадоў, якіх прымаюць для засваення праграмы выхавання дзяцей, што маюць патрэбу ў аздараўленні.

4. Падтрымка дзяцей, прызнаных дзецьмі, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы, дзяцей, прызнаных дзецьмі, што маюць патрэбу ў дзяржаўнай абароне, і дзяцей, што маюць патрэбу ў асаблівых умовах выхавання, – комплекс мер, што ўстанаўліваюцца дзяржавай і накіраваных на абарону правоў і законных інтарэсаў дзяцей, прызнаных дзецьмі, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы, дзяцей, прызнаных дзецьмі, што маюць патрэбу ў дзяржаўнай абароне, і дзяцей, што маюць патрэбу ў асаблівых умовах выхавання.

5. Прызнанне дзяцей дзецьмі, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы, маюць патрэбу ў дзяржаўнай абароне, маюць патрэбу ў асаблівых умовах выхавання, ажыццяўляецца ў адпаведнасці з актамі заканадаўства.

6. Сістэма працы па падтрымцы дзяцей, якія дасягнулі высокіх паказчыкаў у вучэбнай і грамадскай дзейнасці, дзяцей, што маюць патрэбу ў аздараўленні, дзяцей, прызнаных дзецьмі, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы, дзяцей, прызнаных дзецьмі, што маюць патрэбу ў дзяржаўнай абароне, і дзяцей, што маюць патрэбу ў асаблівых умовах выхавання, уключае ў сябе:

6.1. вызначэнне і рэалізацыю дзяржаўнай палітыкі па падтрымцы дзяцей, якія дасягнулі высокіх паказчыкаў у вучэбнай і грамадскай дзейнасці, дзяцей, што маюць патрэбу ў аздараўленні, дзяцей, прызнаных дзецьмі, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы, дзяцей, прызнаных дзецьмі, што маюць патрэбу ў дзяржаўнай абароне, і дзяцей, што маюць патрэбу ў асаблівых умовах выхавання;

6.2. выяўленне і ўлік дзяцей, якія дасягнулі высокіх паказчыкаў у вучэбнай і грамадскай дзейнасці, дзяцей, прызнаных дзецьмі, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы, дзяцей, прызнаных дзецьмі, што маюць патрэбу ў дзяржаўнай абароне, і дзяцей, што маюць патрэбу ў асаблівых умовах выхавання;

6.3. прыняцце і рэалізацыю праграмы выхавання дзяцей, якія дасягнулі высокіх паказчыкаў у вучэбнай і грамадскай дзейнасці;

6.4. прыняцце і рэалізацыю праграмы выхавання дзяцей, што маюць патрэбу ў аздараўленні;

6.5. удзел у рэалізацыі мерапрыемстваў па ліквідацыі прычын і ўмоў, якія выклікалі стварэнне неспрыяльнай для дзяцей абстаноўкі;

6.6. удзел у рэалізацыі плана абароны правоў і законных інтарэсаў дзіцяці;

6.7. прыняцце і рэалізацыю праграмы выхавання дзяцей, што маюць патрэбу ў асаблівых умовах выхавання;

6.8. стварэнне ўстаноў адукацыі, якія спецыялізуюцца на рэалізацыі праграм выхавання, аказанні сацыяльна-педагагічнай падтрымкі і псіхалагічнай дапамогі ўдзельнікам адукацыйнага працэсу, і развіццё сеткі такіх устаноў;

6.9. арганізацыю адукацыйнага працэсу ва ўстановах адукацыі, якія спецыялізуюцца на рэалізацыі праграм выхавання, і выхаваўчага працэсу ва ўстановах адукацыі;

6.10. навукова-метадычнае забеспячэнне праграм выхавання;

6.11. каардынацыю ўзаемадзеяння рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, іншых арганізацый, падпарадкаваных Ураду Рэспублікі Беларусь, мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, іншых арганізацый па падтрымцы дзяцей, якія дасягнулі высокіх паказчыкаў у вучэбнай і грамадскай дзейнасці, дзяцей, што маюць патрэбу ў аздараўленні, і дзяцей, што маюць патрэбу ў асаблівых умовах выхавання, у рамках іх паўнамоцтваў.

**Артыкул 286. Дзяржаўная палітыка па падтрымцы дзяцей, якія дасягнулі высокіх паказчыкаў у вучэбнай і грамадскай дзейнасці, дзяцей, што маюць патрэбу ў аздараўленні, дзяцей, прызнаных дзецьмі, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы, дзяцей, прызнаных дзецьмі, што маюць патрэбу ў дзяржаўнай абароне, і дзяцей, што маюць патрэбу ў асаблівых умовах выхавання**

1. Дзяржаўная палітыка па падтрымцы дзяцей, якія дасягнулі высокіх паказчыкаў у вучэбнай і грамадскай дзейнасці, і дзяцей, што маюць патрэбу ў аздараўленні, – сістэма сацыяльных, прававых і іншых мер, якія ўстанаўліваюцца дзяржавай і накіраваных на стварэнне аптымальных умоў для актывізацыі стваральнай дзейнасці дзяцей, іх самарэалізацыі і ўмацавання здароўя.

2. Дзяржаўная палітыка па падтрымцы дзяцей, прызнаных дзецьмі, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы, дзяцей, прызнаных дзецьмі, што маюць патрэбу ў дзяржаўнай абароне, і дзяцей, што маюць патрэбу ў асаблівых умовах выхавання, – сістэма сацыяльных, прававых і іншых мер, якія ўстанаўліваюцца дзяржавай і накіраваны на выяўленне і ліквідацыю прычын і ўмоў, з-за якіх дзеці трапляюць у абстаноўку, якая ўяўляе небяспеку для іх жыцця або здароўя ці не адпавядае патрабаванням да іх выхавання або ўтрымання, або якія выклікалі ўчыненне дзецьмі злачынстваў або іншых антыграмадскіх дзеянняў, а таксама на рэабілітацыю дзяцей, прызнаных дзецьмі, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы, дзяцей, прызнаных дзецьмі, што маюць патрэбу ў дзяржаўнай абароне, і дзяцей, што маюць патрэбу ў асаблівых умовах выхавання.

**Артыкул 287. Выяўленне і ўлік дзяцей, якія дасягнулі высокіх паказчыкаў у вучэбнай і грамадскай дзейнасці, дзяцей, прызнаных дзецьмі, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы, дзяцей, прызнаных дзецьмі, што маюць патрэбу ў дзяржаўнай абароне, і дзяцей, што маюць патрэбу ў асаблівых умовах выхавання**

Выяўленне і ўлік дзяцей, якія дасягнулі высокіх паказчыкаў у вучэбнай і грамадскай дзейнасці, дзяцей, прызнаных дзецьмі, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы, дзяцей, прызнаных дзецьмі, што маюць патрэбу ў дзяржаўнай абароне, і дзяцей, што маюць патрэбу ў асаблівых умовах выхавання, ажыццяўляюцца ў адпаведнасці з актамі заканадаўства.

**Артыкул 288. Праграмы выхавання і план абароны правоў і законных інтарэсаў дзіцяці**

1. Праграма выхавання – дакумент, які вызначае мэты, задачы, формы і метады працы з выхаванцамі з улікам іх асаблівасцей, патрэб і інтарэсаў.

2. Праграмы выхавання падраздзяляюцца на:

2.1. праграму выхавання дзяцей, якія дасягнулі высокіх паказчыкаў у вучэбнай і грамадскай дзейнасці;

2.2. праграму выхавання дзяцей, што маюць патрэбу ў аздараўленні;

2.3. праграму выхавання дзяцей, што маюць патрэбу ў асаблівых умовах выхавання.

3. Праграма выхавання дзяцей, якія дасягнулі высокіх паказчыкаў у вучэбнай і грамадскай дзейнасці, вызначае мэты, задачы, формы і метады працы з дзецьмі, якія дасягнулі высокіх паказчыкаў у вучэбнай і грамадскай дзейнасці, і накіравана на забеспячэнне ўмоў для актывізацыі іх стваральнай дзейнасці і самарэалізацыі, а таксама на развіццё камунікатыўных, арганізатарскіх і іншых здольнасцей.

4. Праграма выхавання дзяцей, што маюць патрэбу ў аздараўленні, вызначае мэты, задачы, формы і метады працы з дзецьмі, што маюць патрэбу ў аздараўленні, і накіравана на ўмацаванне іх здароўя, у тым ліку на фарміраванне навыкаў здаровага ладу жыцця, бяспечных і адказных паводзін.

5. Праграма выхавання дзяцей, што маюць патрэбу ў асаблівых умовах выхавання, вызначае сродкі, формы і метады выхавання, якія забяспечваюць выпраўленне і сацыяльную рэабілітацыю дзяцей, што маюць патрэбу ў асаблівых умовах выхавання, і накіравана на іх выпраўленне, сацыяльную рэабілітацыю і выхаванне.

6. Праграма выхавання дзяцей, якія дасягнулі высокіх паказчыкаў у вучэбнай і грамадскай дзейнасці, рэалізуецца ў адукацыйна-аздараўленчых цэнтрах.

7. Праграма выхавання дзяцей, што маюць патрэбу ў аздараўленні, рэалізуецца ў выхаваўча-аздараўленчых установах адукацыі, спецыяльных навучальна-выхаваўчых установах, спецыяльных лячэбна-выхаваўчых установах, а таксама можа рэалізоўвацца ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі, установах спецыяльнай адукацыі, акрамя спецыяльных дашкольных устаноў, цэнтрах (палацах), дзіцячым тэхнапарку, іншых арганізацыях, якім у адпаведнасці з заканадаўствам прадастаўлена права ажыццяўляць рэалізацыю праграмы выхавання дзяцей, што маюць патрэбу ў аздараўленні.

Іншая арганізацыя, якой у адпаведнасці з заканадаўствам прадастаўлена права ажыццяўляць рэалізацыю праграмы выхавання дзяцей, што маюць патрэбу ў аздараўленні, абавязана да пачатку рэалізацыі праграмы выхавання дзяцей, што маюць патрэбу ў аздараўленні, паведаміць аб гэтым у структурнае падраздзяленне мясцовага выканаўчага і распарадчага органа, якое ажыццяўляе дзяржаўна-ўладныя паўнамоцтвы ў сферы адукацыі па месцы рэалізацыі праграмы.

8. Праграма выхавання дзяцей, што маюць патрэбу ў асаблівых умовах выхавання, рэалізуецца ў спецыяльных навучальна-выхаваўчых установах, спецыяльных лячэбна-выхаваўчых установах як адначасова з адукацыйнымі праграмамі, так і асобна.

9. Праграмы выхавання распрацоўваюцца і зацвярджаюцца Міністэрствам адукацыі.

10. План абароны правоў і законных інтарэсаў дзіцяці зацвярджаецца кіраўніком раённага (гарадскога) выканаўчага камітэта, мясцовай адміністрацыі раёна ў горадзе не пазней за два тыдні з дня вынясення рашэння аб прызнанні дзіцяці дзіцем, што мае патрэбу ў дзяржаўнай абароне.

## ГЛАВА 63
## УСТАНОВЫ АДУКАЦЫІ, ЯКІЯ РЭАЛІЗУЮЦЬ ПРАГРАМЫ ВЫХАВАННЯ, ПРЫМАЮЦЬ УДЗЕЛ У РЭАЛІЗАЦЫІ МЕРАПРЫЕМСТВАЎ ПА ЛІКВІДАЦЫІ ПРЫЧЫН І ЎМОЎ, ШТО ВЫКЛІКАЛІ СТВАРЭННЕ НЕСПРЫЯЛЬНАЙ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ АБСТАНОЎКІ, У РЭАЛІЗАЦЫІ ПЛАНА АБАРОНЫ ПРАВОЎ І ЗАКОННЫХ ІНТАРЭСАЎ ДЗІЦЯЦІ, ІНШЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ, ЯКІМ У АДПАВЕДНАСЦІ З ЗАКАНАДАЎСТВАМ ПРАДАСТАЎЛЕНА ПРАВА АЖЫЦЦЯЎЛЯЦЬ РЭАЛІЗАЦЫЮ ПРАГРАМЫ ВЫХАВАННЯ ДЗЯЦЕЙ, ШТО МАЮЦЬ ПАТРЭБУ Ў АЗДАРАЎЛЕННІ

### Артыкул 289. Установы адукацыі, якія рэалізуюць праграмы выхавання, прымаюць удзел у рэалізацыі мерапрыемстваў па ліквідацыі прычын і ўмоў, што выклікалі стварэнне неспрыяльнай для дзяцей абстаноўкі, у рэалізацыі плана абароны правоў і законных інтарэсаў дзіцяці, іншыя арганізацыі, якім у адпаведнасці з заканадаўствам прадастаўлена права ажыццяўляць рэалізацыю праграмы выхавання дзяцей, што маюць патрэбу ў аздараўленні

1. Да ўстаноў адукацыі, якія рэалізуюць праграмы выхавання, адносяцца ўстановы адукацыі, што спецыялізуюцца на рэалізацыі праграм выхавання, прымаюць удзел у рэалізацыі мерапрыемстваў па ліквідацыі прычын і ўмоў, якія выклікалі стварэнне неспрыяльнай для дзяцей абстаноўкі, у рэалізацыі плана абароны правоў і законных інтарэсаў дзіцяці, і іншыя ўстановы адукацыі, якія рэалізуюць праграмы выхавання, прымаюць удзел у рэалізацыі мерапрыемстваў па ліквідацыі прычын і ўмоў, што выклікалі стварэнне неспрыяльнай для дзяцей абстаноўкі, у рэалізацыі плана абароны правоў і законных інтарэсаў дзіцяці.

2. Да ўстаноў адукацыі, што спецыялізуюцца на рэалізацыі праграм выхавання, прымаюць удзел у рэалізацыі мерапрыемстваў па ліквідацыі прычын і ўмоў, якія выклікалі стварэнне неспрыяльнай для дзяцей абстаноўкі, у рэалізацыі плана абароны правоў і законных інтарэсаў дзіцяці, адносяцца:

2.1. выхаваўча-аздараўленчыя ўстановы адукацыі;

2.2. сацыяльна-педагагічныя ўстановы;

2.3. спецыяльныя навучальна-выхаваўчыя ўстановы;

2.4. спецыяльныя лячэбна-выхаваўчыя ўстановы.

3. Выхаваўча-аздараўленчая ўстанова адукацыі – установа адукацыі, якая рэалізуе праграму выхавання дзяцей, што маюць патрэбу ў аздараўленні, адукацыйную праграму дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, а таксама можа рэалізоўваць праграму выхавання дзяцей, якія дасягнулі высокіх паказчыкаў у вучэбнай і грамадскай дзейнасці, адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, адукацыйную праграму спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі. У выхаваўча-аздараўленчых установах адукацыі могуць стварацца структурныя падраздзяленні: аддзяленні, рэсурсныя цэнтры, іншыя структурныя падраздзяленні.

4. Выхаваўча-аздараўленчыя ўстановы адукацыі могуць быць наступных відаў:

4.1. адукацыйна-аздараўленчы цэнтр;

4.2. аздараўленчы лагер.

5. Адукацыйна-аздараўленчы цэнтр – выхаваўча-аздараўленчая ўстанова адукацыі, якая рэалізуе праграму выхавання дзяцей, што дасягнулі высокіх паказчыкаў у вучэбнай

і грамадскай дзейнасці, праграму выхавання дзяцей, што маюць патрэбу ў аздараўленні, адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, адукацыйную праграму спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі, адукацыйную праграму дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, стварае ўмовы для пражывання і харчавання дзяцей, якія дасягнулі высокіх паказчыкаў у вучэбнай і грамадскай дзейнасці, дзяцей, што маюць патрэбу ў аздараўленні, аказвае садзейнічанне аздараўленчым лагерам у ажыццяўленні навукова-метадычнага забеспячэння адукацыі, навукова-метадычнага забеспячэння праграм выхавання і размешчана на тэрыторыі, прыдатнай для арганізацыі аздараўлення і адпачынку.

6. Аздараўленчы лагер – выхаваўча-аздараўленчая ўстанова адукацыі, якая рэалізуе праграму выхавання дзяцей, што маюць патрэбу ў аздараўленні, адукацыйную праграму дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, стварае ўмовы для пражывання і харчавання дзяцей, што маюць патрэбу ў аздараўленні, і размешчана на тэрыторыі, прыдатнай для арганізацыі аздараўлення і адпачынку.

7. Сацыяльна-педагагічная ўстанова – установа адукацыі, якая прымае ўдзел у рэалізацыі мерапрыемстваў па ліквідацыі прычын і ўмоў, што выклікалі стварэнне неспрыяльнай для дзяцей абстаноўкі, у рэалізацыі плана абароны правоў і законных інтарэсаў дзіцяці, рэалізуе адукацыйную праграму дашкольнай адукацыі, а таксама можа рэалізоўваць адукацыйныя праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі, адукацыйную праграму дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, адукацыйную праграму навучальных курсаў (лекторыяў, тэматычных семінараў, практыкумаў, трэнінгаў, афіцэрскіх курсаў і іншых відаў навучальных курсаў).

8. Сацыяльна-педагагічныя ўстановы могуць быць наступных відаў:

8.1. сацыяльна-педагагічны цэнтр;

8.2. дзіцячы дом;

8.3. дзіцячая вёска, дзіцячы гарадок.

9. Сацыяльна-педагагічны цэнтр – сацыяльна-педагагічная ўстанова, якая прымае ўдзел у рэалізацыі мерапрыемстваў па ліквідацыі прычын і ўмоў, што выклікалі стварэнне неспрыяльнай для дзяцей абстаноўкі, у рэалізацыі плана абароны правоў і законных інтарэсаў дзіцяці, рэалізуе адукацыйную праграму дашкольнай адукацыі, адукацыйную праграму спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі, адукацыйную праграму спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю, адукацыйную праграму дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, адукацыйную праграму навучальных курсаў (лекторыяў, тэматычных семінараў, практыкумаў, трэнінгаў, афіцэрскіх курсаў і іншых відаў навучальных курсаў), аказвае сацыяльна-педагагічную падтрымку і псіхалагічную дапамогу законным прадстаўнікам навучэнцаў і прызначана для часовага пражывання (не больш за шэсць месяцаў) і сацыяльнай рэабілітацыі дзяцей ва ўзросце ад трох да васямнаццаці гадоў да іх вяртання ў сям’ю або вызначэння іх далейшага жыццеўладкавання.

Сацыяльна-педагагічны цэнтр у парадку, які вызначаецца Урадам Рэспублікі Беларусь, праводзіць мерапрыемствы па аказанні сацыяльна-педагагічнай падтрымкі і псіхалагічнай дапамогі дзецям, спажыванне якімі наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў, іх аналагаў, таксічных або іншых адурманьвальных рэчываў, ужыванне алкагольных, слабаалкагольных напіткаў або піва вызначаны ў адпаведнасці з заканадаўствам.

Сацыяльна-педагагічны цэнтр каардынуе дзейнасць іншых устаноў адукацыі ў межах адміністрацыйна-тэрытарыяльнай (тэрытарыяльнай) адзінкі па выяўленні і ўліку дзяцей, прызнаных дзецьмі, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы, і дзяцей, прызнаных дзецьмі, што маюць патрэбу ў дзяржаўнай абароне, па аказанні ім сацыяльна-педагагічнай падтрымкі і псіхалагічнай дапамогі, а таксама сем’ям, якія прынялі на выхаванне дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекавання бацькоў, па рэалізацыі мерапрыемстваў комплекснай рэабілітацыі непаўналетніх, спажыванне якімі наркатычных

сродкаў, псіхатропных рэчываў, іх аналагаў, таксічных або іншых адурманьвальных рэчываў, ужыванне алкагольных, слабаалкагольных напіткаў або піва ўстаноўлены ў адпаведнасці з заканадаўствам.

10. Дзіцячы дом – сацыяльна-педагагічная ўстанова, якая прымае ўдзел у рэалізацыі плана абароны правоў і законных інтарэсаў дзіцяці, рэалізуе адукацыйную праграму дашкольнай адукацыі, адукацыйную праграму спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі, адукацыйную праграму спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю, адукацыйную праграму дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі і прызначана для пражывання дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекавання бацькоў, ва ўзросце ад трох да васямнаццаці гадоў, асоб з ліку дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекавання бацькоў, што вучацца ва ўстановах адукацыі ў дзённай форме атрымання адукацыі, а таксама ажыццяўляе постынтэрнатнае суправаджэнне выпускнікоў, якія адносяцца да катэгорыі дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекавання бацькоў, асоб з ліку дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекавання бацькоў. У выпадку адсутнасці медыцынскіх проціпаказанняў дапускаецца пражыванне ў дзіцячым доме дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекавання бацькоў, ва ўзросце ад аднаго года да трох гадоў.

11. Дзіцячая вёска, дзіцячы гарадок – сацыяльна-педагагічныя ўстановы, якія прымаюць удзел у рэалізацыі плана абароны правоў і законных інтарэсаў дзіцяці, рэалізуюць адукацыйную праграму дашкольнай адукацыі і прызначаны для пражывання дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекавання бацькоў, ва ўзросце ад аднаго года да васямнаццаці гадоў, у якіх абавязкі па іх навучанні і выхаванні выконваюць яго работнікі (бацькі-выхавальнікі), ажыццяўляюць постынтэрнатнае суправаджэнне выпускнікоў, што адносяцца да катэгорыі дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекавання бацькоў, асоб з ліку дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекавання бацькоў.

12. Спецыяльная навучальна-выхаваўчая ўстанова – установа адукацыі, якая рэалізуе праграму выхавання дзяцей, што маюць патрэбу ў асаблівых умовах выхавання, адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, адукацыйную праграму прафесійна-тэхнічнай адукацыі, што забяспечвае атрыманне кваліфікацыі рабочага (служачага), адукацыйную праграму прафесійна-тэхнічнай адукацыі, што забяспечвае атрыманне кваліфікацыі рабочага (служачага) і агульнай сярэдняй адукацыі, адукацыйную праграму спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі, адукацыйную праграму спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю, адукацыйную праграму дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, адукацыйную праграму прафесійнай падрыхтоўкі рабочых (служачых), праграму выхавання дзяцей, што маюць патрэбу ў аздараўленні, ствараецца паводле прынцыпу раздзельнага ўтрымання, навучання і выхавання асоб рознага полу і аказвае медыцынскую дапамогу выхаванцам, у тым ліку з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, а таксама выхаванцам, якія пакутуюць на захворванні, пералік якіх вызначаецца Міністэрствам аховы здароўя.

13. Спецыяльныя навучальна-выхаваўчыя ўстановы могуць быць наступных відаў:

13.1. спецыяльная школа закрытага тыпу;

13.2. спецыяльнае прафесійна-тэхнічнае вучылішча закрытага тыпу.

14. Спецыяльная школа закрытага тыпу – спецыяльная навучальна-выхаваўчая ўстанова, якая рэалізуе праграму выхавання дзяцей, што маюць патрэбу ў асаблівых умовах выхавання, адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, адукацыйную праграму спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі, адукацыйную праграму спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю, адукацыйную праграму дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, праграму выхавання дзяцей, што маюць патрэбу ў аздараўленні, ствараецца паводле прынцыпу раздзельнага ўтрымання, навучання і выхавання асоб рознага полу ва ўзросце

ад адзінаццаці да пятнаццаці гадоў і аказвае медыцынскую дапамогу выхаванцам, у тым ліку з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, а таксама асобам, што пакутуюць на захворванні, пералік якіх вызначаецца Міністэрствам аховы здароўя. У спецыяльнай школе закрытага тыпу могуць стварацца структурныя падраздзяленні: навучальна-вытворчая майстэрня, навучальна-доследная гаспадарка, іншыя структурныя падраздзяленні.

15. Спецыяльнае прафесійна-тэхнічнае вучылішча закрытага тыпу – спецыяльная навучальна-выхаваўчая ўстанова, якая рэалізуе праграму выхавання дзяцей, што маюць патрэбу ў асаблівых умовах выхавання, адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, адукацыйную праграму прафесійна-тэхнічнай адукацыі, што забяспечвае атрыманне кваліфікацыі рабочага (служачага), адукацыйную праграму прафесійна-тэхнічнай адукацыі, што забяспечвае атрыманне кваліфікацыі рабочага (служачага) і агульнай сярэдняй адукацыі, адукацыйную праграму спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі, адукацыйную праграму спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю, адукацыйную праграму дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, адукацыйную праграму прафесійнай падрыхтоўкі рабочых (служачых), праграму выхавання дзяцей, што маюць патрэбу ў аздараўленні, ствараецца паводле прынцыпу раздзельнага ўтрымання, навучання і выхавання асоб рознага полу ва ўзросце ад адзінаццаці да васямнаццаці гадоў і аказвае медыцынскую дапамогу выхаванцам, у тым ліку з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, а таксама асобам, якія пакутуюць на захворванні, пералік якіх вызначаецца Міністэрствам аховы здароўя. Для выхаванцаў ва ўзросце ад адзінаццаці да пятнаццаці гадоў у спецыяльным прафесійна-тэхнічным вучылішчы закрытага тыпу ствараюцца аддзяленні. У спецыяльным прафесійна-тэхнічным вучылішчы закрытага тыпу могуць ствараться таксама структурныя падраздзяленні: вучэбна-вытворчая майстэрня, навучальная гаспадарка, іншыя структурныя падраздзяленні.

16. Спецыяльная лячэбна-выхаваўчая ўстанова – установа адукацыі, якая рэалізуе праграму выхавання дзяцей, што маюць патрэбу ў асаблівых умовах выхавання, адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, адукацыйную праграму прафесійна-тэхнічнай адукацыі, што забяспечвае атрыманне кваліфікацыі рабочага (служачага), адукацыйную праграму прафесійна-тэхнічнай адукацыі, што забяспечвае атрыманне кваліфікацыі рабочага (служачага) і агульнай сярэдняй адукацыі, адукацыйную праграму спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі, адукацыйную праграму спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю, адукацыйную праграму дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, адукацыйную праграму прафесійнай падрыхтоўкі рабочых (служачых), праграму выхавання дзяцей, што маюць патрэбу ў аздараўленні, ствараецца паводле прынцыпу раздзельнага ўтрымання, навучання і выхавання асоб рознага полу і ажыццяўляе комплексную рэабілітацыю выхаванцаў, спажыванне якімі наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў, іх аналагаў, таксічных або іншых адурманьвальных рэчываў, ужыванне алкагольных, слабаалкагольных напіткаў або піва ўстаноўлены ў адпаведнасці з заканадаўствам.

17. Спецыяльныя лячэбна-выхаваўчыя ўстановы могуць быць наступных відаў:

17.1. спецыяльная лячэбна-выхаваўчая школа закрытага тыпу;

17.2. спецыяльнае лячэбна-выхаваўчае прафесійна-тэхнічнае вучылішча закрытага тыпу.

18. Спецыяльная лячэбна-выхаваўчая школа закрытага тыпу – спецыяльная лячэбна-выхаваўчая ўстанова, якая рэалізуе праграму выхавання дзяцей, што маюць патрэбу ў асаблівых умовах выхавання, адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, адукацыйную праграму спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі, адукацыйную праграму спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю, адукацыйную праграму дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, праграму выхавання дзяцей, што маюць патрэбу ў аздараўленні,

ствараецца паводле прынцыпу раздзельнага ўтрымання, навучання і выхавання асоб рознага полу ва ўзросце ад адзінаццаці да пятнаццаці гадоў і ажыццяўляе комплексную рэабілітацыю выхаванцаў, спажыванне якімі наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў, іх аналагаў, таксічных або іншых адурманьвальных рэчываў, ужыванне алкагольных, слабаалкагольных напіткаў або піва ўстаноўлены ў адпаведнасці з заканадаўствам. У спецыяльнай лячэбна-выхаваўчай школе закрытага тыпу могуць стварацца структурныя падраздзяленні: навучальна-вытворчая майстэрня, навучальна-доследная гаспадарка, іншыя структурныя падраздзяленні.

19. Спецыяльнае лячэбна-выхаваўчае прафесійна-тэхнічнае вучылішча закрытага тыпу – спецыяльная лячэбна-выхаваўчая ўстанова, якая рэалізуе праграму выхавання дзяцей, што маюць патрэбу ў асаблівых умовах выхавання, адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, адукацыйную праграму прафесійна-тэхнічнай адукацыі, што забяспечвае атрыманне кваліфікацыі рабочага (служачага), адукацыйную праграму прафесійна-тэхнічнай адукацыі, што забяспечвае атрыманне кваліфікацыі рабочага (служачага) і агульнай сярэдняй адукацыі, адукацыйную праграму спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі, адукацыйную праграму спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю, адукацыйную праграму дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, адукацыйную праграму прафесійнай падрыхтоўкі рабочых (служачых), праграму выхавання дзяцей, што маюць патрэбу ў аздараўленні, ствараецца паводле прынцыпу раздзельнага ўтрымання, навучання і выхавання асоб рознага полу ва ўзросце ад адзінаццаці да васямнаццаці гадоў і ажыццяўляе комплексную рэабілітацыю выхаванцаў, спажыванне якімі наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў, іх аналагаў, таксічных або іншых адурманьвальных рэчываў, ужыванне алкагольных, слабаалкагольных напіткаў або піва ўстаноўлены ў адпаведнасці з заканадаўствам. Для выхаванцаў ва ўзросце ад адзінаццаці да пятнаццаці гадоў у спецыяльным лячэбна-выхаваўчым прафесійна-тэхнічным вучылішчы закрытага тыпу ствараюцца аддзяленні. У спецыяльным лячэбна-выхаваўчым прафесійна-тэхнічным вучылішчы закрытага тыпу могуць стварацца таксама структурныя падраздзяленні: вучэбна-вытворчая майстэрня, навучальная гаспадарка, іншыя структурныя падраздзяленні.

20. У спецыяльныя лячэбна-выхаваўчыя ўстановы, спецыяльныя навучальна-выхаваўчыя ўстановы не могуць быць змешчаны дзеці, якія маюць захворванні, што перашкаджаюць іх утрыманню, навучанню і выхаванню ў гэтых установах. Пералік захворванняў, якія перашкаджаюць утрыманню, навучанню і выхаванню дзяцей у спецыяльных лячэбна-выхаваўчых установах, спецыяльных навучальна-выхаваўчых установах, вызначаецца Міністэрствам аховы здароўя.

21. Да іншых устаноў адукацыі, якія рэалізуюць праграмы выхавання, адносяцца ўстановы дашкольнай, агульнай сярэдняй, спецыяльнай, сярэдняй спецыяльнай, вышэйшай адукацыі.

22. Іншыя арганізацыі, якім у адпаведнасці з заканадаўствам прадастаўлена права ажыццяўляць рэалізацыю праграмы выхавання дзяцей, што маюць патрэбу ў аздараўленні, – арганізацыі, якія рэалізуюць праграму выхавання дзяцей, што маюць патрэбу ў аздараўленні.

### Артыкул 290. Правы і абавязкі ўстаноў адукацыі, іншых арганізацый, якім у адпаведнасці з заканадаўствам прадастаўлена права ажыццяўляць рэалізацыю праграмы выхавання дзяцей, што маюць патрэбу ў аздараўленні, пры рэалізацыі праграм выхавання

1. Установы адукацыі, іншыя арганізацыі, якім у адпаведнасці з заканадаўствам прадастаўлена права ажыццяўляць рэалізацыю праграмы выхавання дзяцей, што маюць патрэбу ў аздараўленні, пры рэалізацыі праграм выхавання самастойныя ў дзейнасці

па рэалізацыі і навукова-метадычным забеспячэнні праграм выхавання, падборы і расстаноўцы кадраў і іншай дзейнасці ў межах, устаноўленых актамі заканадаўства.

2. Установы адукацыі, іншыя арганізацыі, якім у адпаведнасці з заканадаўствам прадастаўлена права ажыццяўляць рэалізацыю праграмы выхавання дзяцей, што маюць патрэбу ў аздараўленні, пры рэалізацыі праграм выхавання маюць права:

2.1. удзельнічаць у навуковай дзейнасці, дзейнасці па навукова-метадычным забеспячэнні праграм выхавання;

2.2. ажыццяўляць міжнароднае супрацоўніцтва, у тым ліку знешнегандлёвую дзейнасць.

3. Іншыя правы ўстаноў адукацыі, іншых арганізацый, якім у адпаведнасці з заканадаўствам прадастаўлена права ажыццяўляць рэалізацыю праграмы выхавання дзяцей, што маюць патрэбу ў аздараўленні, пры рэалізацыі праграм выхавання ўстанаўліваюцца гэтым Кодэксам, іншымі актамі заканадаўства, устаноўчымі дакументамі гэтых устаноў і арганізацый.

4. Установы адукацыі, іншыя арганізацыі, якім у адпаведнасці з заканадаўствам прадастаўлена права ажыццяўляць рэалізацыю праграмы выхавання дзяцей, што маюць патрэбу ў аздараўленні, пры рэалізацыі праграм выхавання абавязаны забяспечваць:

4.1. удасканаленне навукова-метадычнага забеспячэння праграм выхавання;

4.2. распрацоўку і зацвярджэнне ва ўстаноўленым парадку структурных элементаў навукова-метадычнага забеспячэння праграм выхавання;

4.3. матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне выхаваўчага працэсу ў адпаведнасці з санітарна-эпідэміялагічнымі патрабаваннямі;

4.4. падбор, прыём на працу і расстаноўку кадраў, павышэнне іх кваліфікацыі;

4.5. маральнае і матэрыяльнае стымуляванне выхаванцаў, педагагічных работнікаў;

4.6. распрацоўку і прыняцце правіл унутранага распарадку для выхаванцаў;

4.7. стварэнне бяспечных умоў пры арганізацыі выхаваўчага працэсу;

4.8. стварэнне ўмоў для арганізацыі харчавання, а ў выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам, – і для пражывання выхаванцаў.

5. Іншыя абавязкі ўстаноў адукацыі, іншых арганізацый, якім у адпаведнасці з заканадаўствам прадастаўлена права ажыццяўляць рэалізацыю праграмы выхавання дзяцей, што маюць патрэбу ў аздараўленні, устанаўліваюцца гэтым Кодэксам, іншымі актамі заканадаўства, устаноўчымі дакументамі гэтых устаноў і арганізацый.

### Артыкул 291. Кіраванне выхаваўча-аздараўленчай установай адукацыі, сацыяльна-педагагічнай установай, спецыяльнай навучальна-выхаваўчай установай, спецыяльнай лячэбна-выхаваўчай установай

1. Непасрэднае кіраўніцтва выхаваўча-аздараўленчай установай адукацыі, сацыяльна-педагагічнай установай, спецыяльнай навучальна-выхаваўчай установай, спецыяльнай лячэбна-выхаваўчай установай ажыццяўляецца дырэктарам.

2. Дырэктар выхаваўча-аздараўленчай установы адукацыі, сацыяльна-педагагічнай установы, спецыяльнай навучальна-выхаваўчай установы, спецыяльнай лячэбна-выхаваўчай установы прызначаецца на пасаду і вызваляецца ад пасады заснавальнікам выхаваўча-аздараўленчай установы адукацыі, сацыяльна-педагагічнай установы, спецыяльнай навучальна-выхаваўчай установы, спецыяльнай лячэбна-выхаваўчай установы або ўпаўнаважаным ім органам.

3. Органам самакіравання выхаваўча-аздараўленчай установы адукацыі, сацыяльна-педагагічнай установы, спецыяльнай навучальна-выхаваўчай установы, спецыяльнай лячэбна-выхаваўчай установы з’яўляецца педагагічны савет, які ўзначальваецца дырэктарам гэтай установы.

4. У выхаваўча-аздараўленчай установе адукацыі, сацыяльна-педагагічнай установе, спецыяльнай навучальна-выхаваўчай установе, спецыяльнай лячэбна-выхаваўчай установе можа ствараецца апекавальніцкі савет.

## ГЛАВА 64
## АДУКАЦЫЙНЫ ПРАЦЭС, НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ АДУКАЦЫІ Ў ВЫХАВАЎЧА-АЗДАРАЎЛЕНЧЫХ УСТАНОВАХ АДУКАЦЫІ, САЦЫЯЛЬНА-ПЕДАГАГІЧНЫХ УСТАНОВАХ, СПЕЦЫЯЛЬНЫХ НАВУЧАЛЬНА-ВЫХАВАЎЧЫХ УСТАНОВАХ, СПЕЦЫЯЛЬНЫХ ЛЯЧЭБНА-ВЫХАВАЎЧЫХ УСТАНОВАХ. АСОБЫ, ЯКІЯ ЗАСВОЙВАЮЦЬ ПРАГРАМЫ ВЫХАВАННЯ, АСОБЫ, У ДАЧЫНЕННІ ДА ЯКІХ РЭАЛІЗУЮЦЦА ПЛАНЫ АБАРОНЫ ПРАВОЎ І ЗАКОННЫХ ІНТАРЭСАЎ ДЗЯЦЕЙ, ІХ ПРАВЫ І АБАВЯЗКІ. ВЫХАВАЎЧЫ ПРАЦЭС. НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ ПРАГРАМ ВЫХАВАННЯ

### Артыкул 292. Адукацыйны працэс у выхаваўча-аздараўленчых установах адукацыі, сацыяльна-педагагічных установах, спецыяльных навучальна-выхаваўчых установах, спецыяльных лячэбна-выхаваўчых установах

1. Адукацыйны працэс у выхаваўча-аздараўленчых установах адукацыі, сацыяльна-педагагічных установах, спецыяльных навучальна-выхаваўчых установах, спецыяльных лячэбна-выхаваўчых установах арганізуецца ў адпаведнасці з патрабаваннямі, якія прад'яўляюцца да арганізацыі адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адпаведных адукацыйных праграм, з улікам асаблівасцей, прадугледжаных гэтым артыкулам.

2. Адукацыйны працэс у адукацыйна-аздараўленчых цэнтрах ажыццяўляецца ў класах, якія фарміруюцца з улікам узросту дзяцей, мовы навучання і выхавання і вывучаемай замежнай мовы. Напаўняльнасць класа не павінна перавышаць 25 навучэнцаў. Класы адкрываюцца і закрываюцца на працягу навучальнага года.

3. Тэрміны выніковай атэстацыі выхаванца спецыяльнай навучальна-выхаваўчай установы, спецыяльнай лячэбна-выхаваўчай установы могуць быць перанесены яе дырэктарам па ўзгадненні з Міністэрствам адукацыі.

4. Адукацыйны працэс у спецыяльных навучальна-выхаваўчых установах, спецыяльных лячэбна-выхаваўчых установах накіраваны на выпраўленне і сацыяльную рэабілітацыю выхаванцаў, арганізуецца з улікам іх індывідуальных асаблівасцей, спецыяльных умоў выхавання і ўключае ў сябе вытворчую працу.

Арганізацыя адукацыйнага працэсу ў спецыяльных навучальна-выхаваўчых установах, спецыяльных лячэбна-выхаваўчых установах пры рэалізацыі адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі ажыццяўляецца ў адпаведнасці з вучэбнымі планамі гэтых устаноў адукацыі, якія распрацоўваюцца імі на аснове тыпавога вучэбнага плана сярэдняй школы, у якім за кошт колькасці вучэбных гадзін на правядзенне факультатыўных заняткаў вызначаецца колькасць вучэбных гадзін на арганізацыю вытворчай працы.

5. Напаўняльнасць класаў, вучэбных груп у спецыяльных навучальна-выхаваўчых установах, спецыяльных лячэбна-выхаваўчых установах не павінна перавышаць 12 навучэнцаў. Класы, вучэбныя групы фарміруюцца з улікам узроўню асноўнай адукацыі выхаванцаў, адкрываюцца і закрываюцца на працягу навучальнага года.

Класы, вучэбныя групы ў спецыяльных навучальна-выхаваўчых установах, спецыяльных лячэбна-выхаваўчых установах могуць дзяліцца на групы, падгрупы ў выпадках і парадку, якія вызначаюцца Палажэннем аб спецыяльнай навучальна-выхаваўчай установе або яе аддзе, Палажэннем аб спецыяльнай лячэбна-выхаваўчай установе або яе аддзе.

### Артыкул 293. Навукова-метадычнае забеспячэнне адукацыі ў выхаваўча-аздараўленчых установах адукацыі, сацыяльна-педагагічных установах, спецыяльных навучальна-выхаваўчых установах, спецыяльных лячэбна-выхаваўчых установах

Навукова-метадычнае забеспячэнне адукацыі ў выхаваўча-аздараўленчых установах адукацыі, сацыяльна-педагагічных установах, спецыяльных навучальна-выхаваўчых установах, спецыяльных лячэбна-выхаваўчых установах вызначаецца навукова-метадычным забеспячэннем адукацыі адпаведнага ўзроўню асноўнай адукацыі і (або) віду дадатковай адукацыі.

### Артыкул 294. Асобы, якія засвойваюць праграмы выхавання, і асобы, у дачыненні да якіх рэалізуюцца планы абароны правоў і законных інтарэсаў дзяцей, іх правы і абавязкі

1. Асобы, якія засвойваюць праграмы выхавання, і асобы, у дачыненні да якіх рэалізуюцца планы абароны правоў і законных інтарэсаў дзяцей ва ўстановах адукацыі, што спецыялізуюцца на рэалізацыі такіх праграм і планаў, з’яўляюцца выхаванцамі.

Выхаванцы карыстаюцца правамі, прадугледжанымі гэтым Кодэксам для асоб, якія засвойваюць змест адпаведнай адукацыйнай праграмы.

Выхаванцы сацыяльна-педагагічных устаноў, спецыяльных навучальна-выхаваўчых устаноў, спецыяльных лячэбна-выхаваўчых устаноў дадаткова да правоў, прадугледжаных гэтым Кодэксам, валодаюць правамі, прадугледжанымі заканадаўствам аб прафілактыцы безнагляднасці і правапарушэнняў непаўналетніх.

2. Выхаванцы спецыяльных навучальна-выхаваўчых устаноў, спецыяльных лячэбна-выхаваўчых устаноў у адпаведнасці з гэтым Кодэксам і іншымі актамі заканадаўства маюць правa на:

2.1. атрыманне адукацыі ў адпаведнасці з адукацыйнымі праграмамі;

2.2. навучанне і выхаванне па індывідуальным навучальным плане ў межах зместу адукацыйнай праграмы, які засвойваецца;

2.3. стварэнне спецыяльных умоў для атрымання адукацыі з улікам асаблівасцей іх псіхафізічнага развіцця;

2.4. ахову жыцця і здароўя падчас адукацыйнага працэсу;

2.5. бясплатнае псіхолага-медыка-педагагічнае абследаванне ў дзяржаўных цэнтрах карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі;

2.6. атрыманне сацыяльна-педагагічнай падтрымкі і псіхалагічнай дапамогі з боку спецыялістаў установы адукацыі;

2.7. медыцынскую дапамогу;

2.8. забеспячэнне бясплатнымі месцамі для пражывання;

2.9. бясплатнае карыстанне бібліятэкай, фізкультурна-спартыўнымі збудаваннямі, вучэбнай, вытворчай і навуковай базай установы адукацыі;

2.10. бясплатнае карыстанне падручнікамі і вучэбнымі дапаможнікамі;

2.11. заахвочванне за поспехі ў вучэбнай і грамадскай дзейнасці, удзел у спартыўна-масавых мерапрыемствах;

2.12. удзел у кіраванні ўстановай адукацыі;

2.13. азнаямленне з пасведчаннем аб дзяржаўнай рэгістрацыі, статутам, інфармацыяй аб наяўнасці ліцэнзіі на адукацыйную дзейнасць, сертыфікатамі аб дзяржаўнай акрэдытацыі, а таксама з вучэбна-праграмнай дакументацыяй;

2.14. удзел у маладзёжных і іншых грамадскіх аб’яднаннях, дзейнасць якіх не супярэчыць заканадаўству;

2.15. знаходжанне ў спецыяльнай навучальна-выхаваўчай установе, спецыяльнай лячэбна-выхаваўчай установе па сканчэнні гранічнага тэрміну ўтрымання для завяршэння навучання.

3. Іншыя правы выхаванцаў спецыяльных навучальна-выхаваўчых устаноў, спецыяльных лячэбна-выхаваўчых устаноў вызначаюцца гэтым Кодэксам, іншымі актамі заканадаўства, статутамі і іншымі лакальнымі прававымі актамі гэтых устаноў.

4. Абавязкі выхаванцаў вызначаюцца абавязкамі, прадугледжанымі гэтым Кодэксам для асоб, якія засвойваюць змест адпаведнай адукацыйнай праграмы, установчымі дакументамі і іншымі лакальнымі прававымі актамі ўстаноў адукацыі, іншых арганізацый, якім у адпаведнасці з заканадаўствам прадастаўлена права ажыццяўляць рэалізацыю праграмы выхавання дзяцей, што маюць патрэбу ў аздараўленні, а выхаванцаў сацыяльна-педагагічных устаноў, спецыяльных навучальна-выхаваўчых устаноў, спецыяльных лячэбна-выхаваўчых устаноў – і заканадаўствам аб прафілактыцы безнагляднасці і правапарушэнняў непаўналетніх.

**Артыкул 295. Выхаваўчы працэс**

1. Выхаваўчы працэс – дзейнасць устаноў адукацыі, іншых арганізацый, якім у адпаведнасці з заканадаўствам прадастаўлена права ажыццяўляць рэалізацыю праграмы выхавання дзяцей, што маюць патрэбу ў аздараўленні, па рэалізацыі праграм выхавання.

2. Установы адукацыі, іншыя арганізацыі, якім у адпаведнасці з заканадаўствам прадастаўлена права ажыццяўляць рэалізацыю праграмы выхавання дзяцей, што маюць патрэбу ў аздараўленні, ажыццяўляюць рэалізацыю праграм выхавання ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам, іншымі актамі заканадаўства, установчымі дакументамі гэтых устаноў і арганізацый.

3. Выхаваўчы працэс арганізуецца на аснове:

3.1. дзяржаўнай палітыкі па падтрымцы дзяцей, якія дасягнулі высокіх паказчыкаў у вучэбнай і грамадскай дзейнасці, і дзяцей, што маюць патрэбу ў аздараўленні;

3.2. дзяржаўнай палітыкі па падтрымцы дзяцей, прызнаных дзецьмі, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы, дзяцей, прызнаных дзецьмі, што маюць патрэбу ў дзяржаўнай абароне, і дзяцей, што маюць патрэбу ў асаблівых умовах выхавання;

3.3. педагагічна абгрунтаванага выбару формаў, метадаў і сродкаў выхавання;

3.4. культурных традыцый і каштоўнасцей беларускага народа, дасягненняў сусветнай культуры;

3.5. сучасных выхаваўчых і інфармацыйных тэхналогій;

3.6. прыярытэту сямейных формаў далейшага жыццеўладкавання дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекавання бацькоў;

3.7. стварэння ўмоў утрымання выхаванцаў, набліжаных да сямейных.

4. Асноўнымі патрабаваннямі да арганізацыі выхаваўчага працэсу з'яўляюцца:

4.1. забеспячэнне рэалізацыі праграм выхавання, удзел у рэалізацыі мерапрыемстваў па ліквідацыі прычын і ўмоў, якія выклікалі стварэнне неспрыяльнай для дзяцей абстаноўкі, у рэалізацыі плана абароны правоў і законных інтарэсаў дзіцяці;

4.2. рэалізацыя сістэмнасці і адзінства педагагічных патрабаванняў;

4.3. адпаведнасць зместу, формаў і метадаў выхавання яго мэтам і задачам;

4.4. рэалізацыя асобасна-арыентаванага падыходу;

4.5. стварэнне ўмоў для развіцця творчых здольнасцей выхаванцаў, уцягнення іх у розныя віды сацыяльна значнай дзейнасці;

4.6. прафілактыка проціпраўных паводзін выхаванцаў;

4.7. педагагічная падтрымка дзіцячых, маладзёжных і іншых грамадскіх аб'яднанняў;

4.8. ахова жыцця і здароўя выхаванцаў;

4.9. выкананне санітарна-эпідэміялагічных патрабаванняў;

4.10. стварэнне бяспечных умоў пры арганізацыі выхаваўчага працэсу. Патрабаванні да мер бяспекі пры рэалізацыі праграм выхавання ўстанаўліваюцца Правіламі бяспекі арганізацыі адукацыйнага працэсу, арганізацыі выхаваўчага працэсу, Правіламі расследавання і ўліку няшчасных выпадкаў, якія адбыліся з навучэнцамі пры засваенні зместу адукацыйных праграм (акрамя няшчасных выпадкаў, якія адбыліся пры прыцягненні

да выканання работ у арганізацыях у перыяд праходжання практыкі, вытворчага навучання, стажыроўкі, а таксама падчас правядзення заняткаў фізічнай культурай і спортам), з выхаванцамі пры рэалізацыі праграм выхавання. Арганізацыя бяспекі правядзення заняткаў фізічнай культурай і спортам з навучэнцамі ажыццяўляецца ў адпаведнасці з Правіламі бяспекі правядзення заняткаў фізічнай культурай і спортам.

5. У спецыяльных навучальна-выхаваўчых установах, спецыяльных лячэбна-выхаваўчых установах ствараюцца спецыяльныя ўмовы выхавання.

Спецыяльныя ўмовы выхавання ў спецыяльнай навучальна-выхаваўчай установе, спецыяльнай лячэбна-выхаваўчай установе ўключаюць у сябе ахову тэрыторыі гэтых устаноў, забеспячэнне асабістай бяспекі выхаванцаў і іх максімальнай абароненасці ад негатыўнага ўплыву, абмежаванне свабоднага ўваходу на тэрыторыю гэтых устаноў чужых асоб, свабоднага выхаду выхаванцаў, кругласутачны кантроль за імі, у тым ліку ў час, адведзены для сну, іншыя меры, устаноўленыя актамі заканадаўства.

6. Выхаваўчы працэс ажыццяўляецца бесперапынна на працягу каляндарнага года, акрамя выхаваўчага працэсу, які арганізуецца ў аздараўленчых лагерах. Выхаваўчы працэс у аздараўленчых лагерах ажыццяўляецца ў канікулярны перыяд, устаноўлены пры засваенні зместу адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі.

7. Выхаваўчы працэс пры рэалізацыі праграмы выхавання дзяцей, якія дасягнулі высокіх паказчыкаў у вучэбнай і грамадскай дзейнасці, праграмы выхавання дзяцей, што маюць патрэбу ў аздараўленні, арганізуецца на працягу змены. Працягласць змены не павінна перавышаць 21 каляндарны дзень.

8. Формамі арганізацыі выхаваўчага працэсу з'яўляюцца гутарка, выхаваўчае мерапрыемства, інфармацыйная гадзіна, агульны сход. У спецыяльнай навучальна-выхаваўчай установе, спецыяльнай лячэбна-выхаваўчай установе пры рэалізацыі праграмы выхавання дзяцей, што маюць патрэбу ў асаблівых умовах выхавання, арганізуецца вытворчая праца.

9. Выхаваўчы працэс у выхаваўча-аздараўленчых установах адукацыі ажыццяўляецца ў атрадах або індывідуальна. Напаўняльнасць атрада не павінна перавышаць 25 выхаванцаў. Выхаваўчы працэс у сацыяльна-педагагічных установах, спецыяльных навучальна-выхаваўчых установах, спецыяльных лячэбна-выхаваўчых установах ажыццяўляецца ў групах або індывідуальна. Напаўняльнасць групы не павінна перавышаць 12 выхаванцаў.

10. Прыём (залічэнне) асоб ва ўстановы агульнай сярэдняй адукацыі, установы спецыяльнай адукацыі, цэнтры, палацы, іншыя арганізацыі, якім у адпаведнасці з заканадаўствам прадастаўлена права ажыццяўляць рэалізацыю праграмы выхавання дзяцей, што маюць патрэбу ў аздараўленні, для засваення праграмы выхавання дзяцей, што маюць патрэбу ў аздараўленні, ажыццяўляецца ў парадку, які вызначаецца Палажэннем аб выхаваўча-аздараўленчай установе адукацыі або яе відзе.

### Артыкул 296. Навукова-метадычнае забеспячэнне праграм выхавання, планавальная дакументацыя па працы з дзецьмі, прызнанымі дзецьмі, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы, дзецьмі, прызнанымі дзецьмі, што маюць патрэбу ў дзяржаўнай абароне, і дзецьмі, што маюць патрэбу ў асаблівых умовах выхавання

1. Навукова-метадычнае забеспячэнне праграм выхавання ўключае ў сябе:

1.1. планавальную дакументацыю праграм выхавання;

1.2. метадычную дакументацыю праграм выхавання;

1.3. вучэбна-метадычныя дапаможнікі;

1.4. інфармацыйна-метадычныя матэрыялы.

2. Да планавальнай дакументацыі праграм выхавання адносяцца:

2.1. план выхаваўчай працы па развіцці інтэлектуальных, творчых здольнасцей, лідарскіх якасцей дзяцей, якія дасягнулі высокіх паказчыкаў у вучэбнай і грамадскай дзейнасці, умацаванні іх здароўя;

2.2. план выхаваўчай працы з дзецьмі, што маюць патрэбу ў аздараўленні;

2.3. план выхаваўчай працы з дзецьмі, што маюць патрэбу ў асаблівых умовах выхавання.

3. Да метадычнай дакументацыі праграм выхавання адносяцца методыкі выхавання, метадычныя рэкамендацыі, інструктыўна-метадычныя пісьмы.

4. Вучэбна-метадычны дапаможнік – выданне, якое ўтрымлівае сістэматызаваныя звесткі навуковага або прыкладнога характару, неабходныя для рэалізацыі праграм выхавання і выкладзеныя ў форме, зручнай для арганізацыі выхаваўчага працэсу, і ўлічвае ўзроставыя асаблівасці выхаванцаў.

Да выкарыстання ў выхаваўчым працэсе дапускаюцца вучэбна-метадычныя дапаможнікі і іншыя выданні, рэкамендаваныя Міністэрствам адукацыі.

5. Інфармацыйна-метадычныя матэрыялы – матэрыялы, якія ўтрымліваюць статыстычную і аналітычную інфармацыю аб рэалізацыі праграм выхавання, выніках рэабілітацыйнага працэсу, метадычныя матэрыялы па арганізацыі выхаваўчых мерапрыемстваў.

6. Вучэбна-метадычнае забеспячэнне праграм выхавання ажыццяўляюць:

6.1. арганізацыі, што ажыццяўляюць навукова-метадычнае забеспячэнне адукацыі;

6.2. установы адукацыі;

6.3. навуковыя арганізацыі;

6.4. вучэбна-метадычныя аб’яднанні ў сферы адукацыі;

6.5. іншыя арганізацыі, якім у адпаведнасці з заканадаўствам прадастаўлена права ажыццяўляць рэалізацыю праграмы выхавання дзяцей, што маюць патрэбу ў аздараўленні;

6.6. рэспубліканскія органы дзяржаўнага кіравання, іншыя арганізацыі, падпарадкаваныя Ураду Рэспублікі Беларусь, мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы, іншыя арганізацыі і фізічныя асобы ў межах іх паўнамоцтваў.

7. Да планавальнай дакументацыі па працы з дзецьмі, прызнанымі дзецьмі, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы, дзецьмі, прызнанымі дзецьмі, што маюць патрэбу ў дзяржаўнай абароне, і дзецьмі, што маюць патрэбу ў асаблівых умовах выхавання, адносяцца:

7.1. план рэалізацыі мерапрыемстваў па ліквідацыі прычын і ўмоў, якія выклікалі стварэнне неспрыяльнай для дзяцей абстаноўкі;

7.2. план абароны правоў і законных інтарэсаў дзіцяці;

7.3. індывідуальны план абароны правоў і законных інтарэсаў дзіцяці, што мае патрэбу ў асаблівых умовах выхавання.

**Артыкул 297. Асаблівасці планавальнай дакументацыі праграм выхавання, планавальнай дакументацыі па працы з дзецьмі, прызнанымі дзецьмі, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы, дзецьмі, прызнанымі дзецьмі, што маюць патрэбу ў дзяржаўнай абароне, і дзецьмі, што маюць патрэбу ў асаблівых умовах выхавання**

1. План выхаваўчай працы па развіцці інтэлектуальных, творчых здольнасцей, лідарскіх якасцей дзяцей, якія дасягнулі высокіх паказчыкаў у вучэбнай і грамадскай дзейнасці, умацаванні іх здароўя ўстанаўлівае мэты, задачы, формы, метады працы і мерапрыемствы па працы з дзецьмі, якія дасягнулі высокіх паказчыкаў у вучэбнай і грамадскай дзейнасці, распрацоўваецца адукацыйна-аздараўленчым цэнтрам на аснове праграмы выхавання дзяцей, якія дасягнулі высокіх паказчыкаў у вучэбнай і грамадскай дзейнасці, і зацвярджаецца яго кіраўніком.

2. План выхаваўчай працы з дзецьмі, што маюць патрэбу ў аздараўленні, устанаўлівае мэты, задачы, формы, метады працы і мерапрыемствы па працы з дзецьмі, што маюць патрэбу ў аздараўленні, распрацоўваецца ўстановай адукацыі, іншай арганізацыяй, якой у адпаведнасці з заканадаўствам прадастаўлена права ажыццяўляць рэалізацыю праграмы выхавання дзяцей, што маюць патрэбу ў аздараўленні, на аснове праграмы выхавання дзяцей, што маюць патрэбу ў аздараўленні, і зацвярджаецца кіраўніком установы адукацыі, іншай арганізацыі па ўзгадненні з яе заснавальнікам (для дзяржаўных устаноў адукацыі), са структурным падраздзяленнем мясцовага выканаўчага і распарадчага органа, што ажыццяўляе дзяржаўна-ўладныя паўнамоцтвы ў сферы адукацыі па месцы рэалізацыі адукацыйнай праграмы (для прыватных устаноў адукацыі і іншых арганізацый), у парадку, які вызначаецца Міністэрствам адукацыі.

3. План выхаваўчай працы і абароны правоў і законных інтарэсаў дзяцей, што маюць патрэбу ў асаблівых умовах выхавання, устанаўлівае мэты, задачы, формы, метады працы і мерапрыемствы па стварэнні асаблівых умоў выхавання, абароне правоў і законных інтарэсаў дзяцей, што маюць патрэбу ў асаблівых умовах выхавання, распрацоўваецца спецыяльнай навучальна-выхаваўчай установай, спецыяльнай лячэбна-выхаваўчай установай на аснове праграмы выхавання дзяцей, што маюць патрэбу ў асаблівых умовах выхавання, і зацвярджаецца яе кіраўніком.

4. План рэалізацыі мерапрыемстваў па ліквідацыі прычын і ўмоў, якія выклікалі стварэнне неспрыяльнай для дзяцей абстаноўкі, вызначае мэты, задачы, формы і метады працы з дзіцем, прызнаным дзіцем, якое знаходзіцца ў сацыяльна небяспечным становішчы, і яго бацькамі, распрацоўваецца ўстановай адукацыі, якая спецыялізуецца на рэалізацыі праграм выхавання, іншай установай адукацыі, што рэалізуе праграмы выхавання, якія прымаюць удзел у рэалізацыі мерапрыемстваў па ліквідацыі прычын і ўмоў, што выклікалі стварэнне неспрыяльнай для дзяцей абстаноўкі, у рэалізацыі плана абароны правоў і законных інтарэсаў дзіцяці, і зацвярджаецца яе кіраўніком.

5. План абароны правоў і законных інтарэсаў дзіцяці вызначае комплекс мерапрыемстваў па аднаўленні сям'і, у тым ліку па стварэнні неабходных умоў жыцця і выхавання дзіцяці, якія прадугледжваюць сацыяльна-педагагічную рэабілітацыю дзіцяці і сацыяльны патранат сям'і.

6. Індывідуальны план абароны правоў і законных інтарэсаў дзіцяці, што мае патрэбу ў асаблівых умовах выхавання, прадугледжвае комплекс мерапрыемстваў, накіраваных на рэабілітацыю і рэсацыялізацыю дзіцяці. Індывідуальны план абароны правоў і законных інтарэсаў дзіцяці, што мае патрэбу ў асаблівых умовах выхавання, распрацоўваецца спецыяльнай навучальна-выхаваўчай установай, спецыяльнай лячэбна-выхаваўчай установай і зацвярджаецца яе кіраўніком.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь**

**А.Лукашэнка**

(Неафіцыйны пераклад). Распаўсюджваецца згодна з пунктам 14 Палажэння аб дзейнасці па распаўсюджванні (прадастаўленні) прававой інфармацыі, зацверджанага Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 30 снежня 2010 г. № 712 «О совершенствовании государственной системы правовой информации Республики Беларусь».